ПАМ'ЯТЬ

БРАГІНСКІ РАЁН

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
2003

УДК 94(476.2)
ББК 63.3(4Беи)
П15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

І. Ф. ГАНЖУРАЎ, М. С. КУСЯНКОЎ, Г. В. МАРЧУК, У. А. МАЧУЛЬСКІ,
І. А. ПРОЦКІН, Р. А. СЦЕФАНОВІЧ, Б. В. УЛЬЯНКА

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

Г. М. БАБРЫНЁВА (старшыня камісіі), І. Ф. ГАНЖУРАЎ (намеснік старшыні),
П. Ц. ВЕТЧАНКА, Н. А. ІСАЧКІНА, І. В. КУЛАЙ, В. М. НЯДЗЕЛЬКА,
С. І. ПРЫХОДЗЬКА

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ:

Б. В.УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У. І. ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М. З. БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р. А. ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Укладальнік І. Ф. ГАНЖУРАЎ

Мастак Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В. А. РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-02-0521-0

© ВРУП «Мастацкая літаратура», 2003



Герб Брагіна, зацверджаны 30.3.2001 г.

1147 г.	Першае ўпамінанне Брагіна ў летапісах
1360-я гг.	Брагін у складзе Вялікага княства Літоўскага

Цэнтральная плошча ў Брагіне

1505 г.	Набегі крымскіх татар на Брагіншчыну і Камарыншчыну
1569 г.	Брагін у складзе Рэчы Паспалітай

Хрысціянская царква ў в. Малажын

1574 г.	Брагін з валасцямі і замкам перайшоў ва ўладанне польскіх магнатаў Вішнявецкіх
1648 г.	Разгром польскага войска ў раёне Брагіна

Будынак райвыканкама ў Брагіне

1793 г.	У выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай Брагіншчына ўключана ў склад Расійскай імперыі
1863 г.	Адкрыццё першых народных вучылішчаў у Брагіне, вёсках Мікулічы, Ёлча, Астрагляды, Старыя Хракавічы

В. Краснае. Дамы, пабудаваныя з фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. 1990 г.

1903 г.	У Брагіне створана першая сацыял-дэ макратычная група
Снежань1905 г.	Сялянскае выступленне ў в. Хатуча
1 мая 1906 г.	Палітычная забастоўка ў Брагіне

Новая раённая бальніца ў Брагіне

Красавік 1917 г.	Утварэнне Саветаў сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў у Брагіне, вёсках Верхнія Жары, Ёлча, Крыўча, Мікулічы, Ручаёўка, Савічы
12 лістапада 1917 г.	Устанаўленне Савецкай улады ў Брагіне

Брагінскі метэарыт

Люты—снежань 1918 г. Брагін акупіраваны германскімі войскамі

1 студзеня 1919 г. Уваходжанне Брагіншчыны ў склад БССР

Брагінскі раённы Дом культуры

1 верасня 1924 г.	Утвораны Брагінскі раён
1930 г.	Арганізаваны Брагінская і Камарынская (Ялчанская) машынна-трактарныя станцыі

Малажынскі калектыў мастацкай самадзейнасці. 2001 г.

1940 г.	Калгас імя Тэльмана атрымаў вышэйшую ўзнагароду Радзімы — ордэн Леніна
28 жніўня 1941 г.	Брагін акупіраваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі

Карціна В. Ф. Шматава «Вясна ў чарнобыльскай зоне». 2000 г.

23 лістапада 1943 г.	Вызваленне Брагіна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў
Красавік 1944 г.	На будаўніцтва авіяэскадрыллі "Палескі партызан" жыхары Брагінскага раёна сабралі 277 350 рублёў

Мастак Васіль Мінавіч Шаўчэнка. В. Асарэвічы

Канец 50-х гадоў	Пачатак інтэнсіўнага развіцця сельскай гаспадаркі і прамысловасці раёна
26 красавіка 1986 г.	Адбылася аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, у выніку якой тэрыторыя Брагінскага раёна забруджана шкоднымі радыенуклідамі

Рака Днепр. Граніца Брагінскага раёна з Украінай

1987 г.

У Брагіне ўведзена ў строй радыётэлевізійная станцыя і адкрыта новая паліклініка

РАПАРТ УПРАЎЛЯЮЧАГА ЭКАНОМІЯЙ ЛОЕЎСКАГА АПЯКУНСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў РЭЧЫЦКІ ЗЕМСКІ СУД МІНСКАЙ ГУБЕРНІ АБ АДМОВЕ СЯЛЯН ВЁСАК ЧАМЯРЫСЫ І ПРОСМЫЧЫ ВЫКОНВАЦЬ ПАНШЧЫНУ Ў ГАСПАДАРЦЫ ПАМЕШЧЫКА ДАНІЛОВІЧА

27 жніўня 1844 г.

В Лоевском опекунском управлении от традиционного владельца фольварка Хракович г-на кол. ас. и ковалера Даниловича, 16-го пущениым, а 22 августа сего 1844 г. за № 220 отношение полученным, изъяснено, что крестьяне дер. Чемерис и Просмыч уклоияются от повиновения, прежде не давали женщин на инвентарную барщину, а теперь уже и мужской пол не только не выходит на упомянутую барщину, но вовсе отказался от послушания, даже и войты не приходят для нарядов в недельные барщины.

Упомянутый владелец изъясняет в оном мне отношении, что от 15 июня доводил о неповиновении крестьян до сведения г-ну становому приставу тит. сов. Хитону, а от 11 июия г-ну предводителю дворянства гр. Рокицкому и дворянской Речицкой опеке от 24 июля сего 1844 г. делал донесение. Но хотя г-н становой пристав предписал чемерисскому сотскому выгнать на барщину крестьян, но сего не послушались, а г-н уездный предводитель хотя словесно уговаривал их, внушал крестьянам, дабы повиновались своему владельцу в отбывании инвентарной барщины и о том предложить изволил становому приставу, а дворянская опека хотя предложила земскому суду с 25 июля за № 649 привесть ослушных в должное повиновение, но все остается без успеха.

За получением же чемерисскою грамодою от 1-го стаия указа Минского губернского правления насчет дачи крестьянам законной защиты для отыскания свободы решительно все мужчины и женщины дер. Чемерис отказались от законного повиновения сего августа 15 числа, толкуя, что им по высочайшей воле разрешеиа свобода и для ограждения оной повелена защита, не принимая никакого вразумления в том, что защита повелеиа только дабы не было чинимо для них препятствия в отыскании свободы законным порядком, что через экономию и не чинимых, а требуемых только инвентарных повинностей.

В таковом крайнем положении и затруднении находясь, Храковичская экономия в посеве хлеба, собрании оного и обеспечении народного продовольствия и в прочих экономических работах, а также посему не предвидит возможности в выручке показанного инвентарного дохода, собрания податей и исполнения казенных и земских повинностей без необходимой помощи начальства в приведении крестьян в должное повиновение, просит Главной лоевской опекунской экономии законной защиты и помощи.

А потому честь имею оного земского суда покорнейще просить, взяв законные меры о внушении и подтвердительного приказа крестьянам чемерисским и просмыслицким, дабы не отваживались противно толковать губернского правления указа и в отбывании инвентарной повинности и дабы не были ослушниками протнв своего владельца впредь до разрешения правительством поискиваемой для них свободы.

Управляющий Лоевского опекунского имения дворянин *Новицкий*

Друкуецца па кн.: Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т. 4. С. 231—232.

ЗАПІСКА РЭЧЫЦКАГА ЗЕМСКАГА СПРАЎНІКА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ ВІЛЕНСКАМУ ВАЕННАМУ ГУБЕРНАТАРУ АБ ХВАЛЯВАННЯХ СЯЛЯН МАЁНТКА ЖАРЫ ЯЛЧАНСКАЙ ВОЛАСЦІ

7 лістапада 1844 г.

Крестьяне вотчинного владения помещика Александра Горвата имения Жары, в коем заключается по ревизии 720 мужского пола душ, оказавшие в июие месяце с. г. неповиновенне своему владельцу, о причине коего произведено было временным отделением Речицкого земского суда дело, и потом по распоряжению начальства приведены в должное послушание; когда же по решению такового дела Речицкий уездный суд признал виновными зачинщиков такового возмущения, учинил распоряжение о подверженин 8 человек тюремному заключению, что посредством станового пристава н исполнено, то прочие крестьяне Жаровского имения, выправленные было экономиею на байдак, осведомились о таковом подтверженни 8 человек аресту, оставив байдак, возвратились в домы и 27-го истекаемого октября, собравшись толпою во двор в числе 50 человек, с дерзостью, в лице находившегося там по делам службы станового пристава, отозвались, что куда взяты вышеписанные 8 человек, то пусть берут и их, объявили экономическому управлению, что

ДА ЧЫТАЧОЎ

Шаноўныя чытачы! Чарговая кніга серыі гісторыка-дакументальных хронік Памяці, якія выдаюцца ў Рэспубліцы Беларусь, прысвечана Брагінскаму раёну — яго далёкаму і нядаўняму мінуламу. Наш край мае сапраўды багатую і слаўную гісторыю, у чым найперш пераканаліся ўсе, хто збіраў, сістэматызаваў і рыхтаваў да друку матэрыялы кнігі Памяці. Гэта былі прафесійныя гісторыкі і энтузіясты-краязнаўцы, журналісты і супрацоўнікі архіваў, бібліятэк і музеяў, прадстаўнікі дзяржаўных органаў і ваенкаматаў, выдавецкія работнікі. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, у Дзяржаўным архіве Гомельскай вобласці, у архівах Расійскай Федэрацыі адшуканы многія унікальныя дакументы, з якіх цяпер і вы, шаноўныя чытачы, даведаецеся пра тыя гістарычныя падзеі, якія адбываліся на Брагіншчыне, але мелі далёка не мясцовае значэнне.

Самым суровым выпрабаваннем для нашых бацькоў і дзядоў стала Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гг., таму і ў кнізе расказ пра падзеі, якія адбываліся ў той час на Брагіншчыне, займае цэнтральнае месца. Гэтак жа яе ядром сталі спісы нашых землякоў — воінаў Савецкай Арміі, партызан і падпольшчыкаў, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі — як на Брагіншчыне, так і за яе межамі; гэта і спісы ўраджэнцаў многіх рэгіёнаў былога Савецкага Саюза, якія вызвалялі ад ворага тэрыторыю цяперашняга Брагінскага раёна, тут загінулі і на нашай зямлі пахаваныя; нарэшце, гэта і спісы мірных жыхароў Брагіншчыны — ахвяр фашысцкага акупацыйнага рэжыму.

Напэўна, спіс герояў і ахвяр вайны ў кнізе Памяці яшчэ не поўны — пошукі будуць працягвацца. Гэтак жа не падводзіцца рыса і пад трагічным спісам ахвяр масавага палітычнага тэрору 30 — 50-х гадоў XX ст., які і на Брагіншчыне пакінуў свой жахлівы след.

На вялікі жаль, і мірны перыяд краіны быў азмрочаны трагічнымі падзеямі, якія закранулі і Брагіншчыну. Так, на нашай зямлі шчодра пасеяла нябачную смерць злавесная чарнобыльская хмара. Аднак і трагічнае ў нашым пасляваенным жыцці было ў той жа час і гераічным — у гэтым пераканаецца чытач апошняга раздзела кнігі.

Хочацца спадзявацца, што гэтая кніга дапаможа кожнаму з вас, шаноўныя чытачы, прасякнуцца пачуццём глыбокай удзячнасці мінулым пакаленням, бо, нягледзячы на іхнія часам трагічныя памылкі і заблуджэнні, якія ў многім абумовілі і драматызм нашага сённяшняга жыцця, яны здзейснілі ў свой час галоўнае — зберагліі і перадалі нам у спадчыну самае дарагое, што цяпер ёсць у нас на свеце,— нашу беларускую зямлю, нашу родную Брагіншчыну.

Брагінскі раён размешчаны на паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці. Утвораны 1.9.1924 г. Плошча 1,9 тыс. кв. км. Да катастрофы на Чарнобыльскай АЭС (26.4.1986) у раёне было 127 населеных пунктаў, цяпер – 83, у тым ліку гарадскія пасёлкі Брагін (цэнтр р-на) і Камарын. Пасля катастрофы на ЧАЭС 2 пасялковыя і 12 сельскіх Саветаў: Асарэвіцкі, Астраглядаўскі, Верхнежараўскі, Вуглоўскі, Крыўчанскі, Малажынскі, Малейкаўскі, Мікуліцкі, Новаялчанскі, Спярыжскі, Хракавіцкі, Чамярыскі.

Тэрыторыя раёна размешчана на слабахвалістай раўніне з раскіданымі высокімі ўзгоркамі. На ўсходзе да яго прылягае шырокая дняпроўская нізіна, на захадзе размешчана Мазырская града – рэшткі старажытнага марэннага ўзвышша. Вышэйшы пункт яе ў

раёне дасягае 110 метраў над узроўнем мора. Рачная сістэма Брагіншчыны адносіцца да басейна Чорнага мора і прадстаўлена рэкамі Днепр (на мяжы з Чарнігаўскай вобл.) і Брагінка. На тэрыторыі раёна 65 азёраў басейна Дняпра.

Карысныя выкапні: торф, пясок, глина і суглінкі.

Сярэдняя тэмпература студзеня — 6,3 градуса; ліпеня — + 18,6 градуса. Ападкаў 533 мм за год. Вегетацыйны перыяд 196 дзён.

Пад лесам 30 % тэрыторыі раёна, пад сельгасугоддзямі — 69,9 % (32,7 % ворных земляў, 35,9 % сенажацей і пашаў). Асноўныя землекарыстальнікі — 14 калгасаў і 2 саўгасы, якія спецыялізуюцца па вытворчасці бульбы, збожжавых, развіцці мясамалочнай жывёлагадоўлі.

Дзейнічаюць прадпрыемствы харчовай, лёгкай прамысловасці, райаб'яднанні «Сельгастэхніка» і «Сельгасхімія», ПМК трэста «Калінкавічыводбуд», лясгас, дарожнае рамонтна-будаўнічае ўпраўленне, аўтапарк, раённы вузел сувязі, тэлерэтранслятар.

У раёне 12 сярэдніх, 2 базавыя, 4 пачатковыя школы, 2 музычныя школы, 2 Дамы дзіцячай творчасці, 14 дзіцячых дашкольных устаноў, краязнаўчы музей і карцінная галерэя, 23 клубныя ўстановы, 26 масавых бібліятэк, 18 кінаўстановак, у тым ліку 17 стацыянарных, 2 бальнічныя ўстановы, 16 фельчарска-акушэрскіх пунктаў.

Праз паўднёвую частку раёна праходзіць чыгунка Чарнігаў — Оўруч. Аўтамабільныя дарогі Брагін — Хойнікі, Брагін — Лоеў, Брагін — Холмеч — Гомель, Брагін — Камарын — Чарнігаў.

Выдаецца раённая газета «Маяк Палесся» (з 1931 г.).

Днепр у раёне прыстані Бабка

На Брагіншчыне амаль у кожнай вёсцы ёсць брацкая магіла воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На здымку: помнік воінам-вызваліцелям і землякам у в. Крыўча

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Водгалас далёкай мінуўшчыны

Першабытны чалавек на Брагіншчыне

У эпоху Вялікага зледзянення магутны ледавіковы панцыр насунуўся з горных масіваў Скандынавіі на ўсю тэрыторыю цяперашняй Беларусі. Суровыя і працяглыя халады скавалі вечнай мерзлатой прыродны ландшафт. Прайшлі тысячагоддзі, перш чым пачалося паступовае пацяпленне, якое выклікала раставанне і адступленне паўднёвага краю ледавіка ў паўночным напрамку. Мяркуецца, што ў ліку першых з ледавіковага палону вызвалілася брагінска-хойніцкая мясцовасць. Беларускі вучоны У. Ф. Ісаенка лічыць, што «каля 270—250 тыс. гадоў назад, пры чарговым пахаладанні (Мазырская фаза), ледавік затрымаўся тут на некалькі тысячагоддзяў. У выніку ўтварылася Хойніцка-Брагінскае ўзвышша, якое далей на захад працягваецца Юравіцкай і Мазырскай марэннымі градамі»[1].

Мазырская града з'яўлялася моцнай прыроднай перашкодай на шляху шыракаплыннага водапатоку кірункам на поўдзень. «Оказывается, что в доисторические времена и отчасти, может быть, в исторические на месте Полесской низменности был огромный водный бассейн, что подтверждается как геологическими данными (береговыми озерными отложениями), так и различными находками вроде якорей и пр. Это обширное озеро образовалось после того, как ледяной покров в конце ледниковой эпохи стал постепенно отодвигаться к северу. При этом масса вод наполнила Полесскую котловину, образовав здесь огромное водное вместилище, питавшееся потоками, которые скатывались с соседних возвышенностей, снося вниз продукты размывания горных пород и отлагая их сверху...»[1]

Вучоныя мяркуюць, што ў перыяд апошняга (паазёрскага) зледзянення, прыкладна 50—40 тыс. гадоў таму, адбыўся прарыў Прыпяці праз Мазырскую граду паблізу в. Юравічы Калінкавіцкага раёна. Пры гэтым нязначны ўхіл мясцовасці не выклікаў асаблівых паводкавых бедстваў. Водныя патокі з юравіцкай прамывіны неслі велізарную масу прыродных асадкаў і лёгка размываемых пародаў (торф, суглінкі, пясок), якія засмечвалі рэчышчы больш дробных водных артэрый, ператвараючы цякучыя воды ў стаячыя, а з цягам часу і ў балоты. Такіх балот і нізін, пакрытых урадлівымі глебамі, утвораных у асноўным з лёсападобных суглінкаў, вельмі многа каля падножжа Брагінска-Хойніцкага ўзвышша.

У выніку шырокіх даследаванняў вучоныя Інстытута геахіміі і геафізікі НАН Беларусі даказалі, што на дне мора,

[1] Ісаенка У. Ф. Зямля нашых продкаў // Памяць. Хойніцкі раён. Мн., 1993. С. 20.

[1] Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. СПб., 1905. Т. 9. С. 9.

якое ў дэвонскі перыяд запаўняла Прыпяцкую ўпадзіну, у раёне Лоева — Брагіна адбываліся моцныя вывяржэнні вулканаў. У больш позні час паявіліся вулканы наземныя. Яны паводзілі сябе больш спакойна. Але там, дзе цяпер Пінск і Лунінец, адбываліся падзеі, якіх, паводле старажытных летапісаў, «ужасащася вси людье...» — вогнедышныя горы выкідвалі фантаны вады, газу, попелу. У раёне Глуска і Бабруйска можна і сёння знайсці «маладыя» вулканіты з украпваннямі вулканічнага шкла.

Праз некалькі тысячагоддзяў сплыла вада з Палескай катлавіны, завяршылася фарміраванне рэльефу, рачной сеткі. Рэкі і рэчкі праклалі свой шлях у Днепр і Прыпяць, аформіліся тысячы азёраў.

Лічыцца, што першапачатковае пранікненне чалавека ў паўднёва-ўсходнюю частку Беларусі адбылося ў перыяд верхняга палеаліту (прыкладна 25—26 тысячагоддзяў таму). Якраз тады з наступленнем адноснага пацяплення клімату адбылося аблясенне глебы хмызнякамі і дрэвамі, пераважна лісцёвых парод. Адначасова больш разнастайным станавіўся жывёльны свет. Аднак да суровых кліматычных умоў змаглі прыстасавацца толькі буйныя, больш моцныя і выносліавыя жывёліны — маманты[1], калматыя насарогі, зубрападобныя быкі, паўночныя алені, коні. Прыблізна да верхнепалеалітычнай эпохі аднесены адкрытыя археолагамі стаянкі першабытнага чалавека каля вёсак Бердыж Чачэрскага і Юравічы Калінкавіцкага раёнаў. Першымі насельнікамі тут былі неандэртальцы або людзі мусцьерскай эпохі (назва паводле р. Неандэр і пячоры Ла-Мусцье ў Заходняй Еўропе, дзе былі выяўлены рэшткі першабытных людзей).

Крыху пазней (35 — 38 тысячагоддзяў таму) сфарміраваўся краманьёнец[1]. Знешнім воблікам ён ужо амаль не адрозніваўся ад сучаснага чалавека.

Людзі мусцьерскай эпохі аб'ядноўваліся ў мацярынскія родавыя абшчыны, займаліся паляваннем, рыбалоўствам, бортніцтвам, зборам ягад, грыбоў, арэхаў, малюскаў. Неандэртальцы ўмелі здабываць агонь і прымяняць яго не толькі для абагрэву жылля, але і для гатавання ежы. Яны будавалі прымітыўныя цёплыя жытлы з костак і скур буйных звяроў, выраблялі грубую скураную вопратку. У якасці прылад працы выкарыстоўвалі рубілы, востраканечнікі, скрэблы, нажы э крамянёвых адшчэпаў.

Каля 18 тысячагоддзяў таму насоўванне ледавіка на Беларусь да мясціи сучасных Гродна і Вілейкі зноў ператварыла наш край у бязлюдную зледзянелую пустэльню, у якой ён знаходзіўся да самага канца ледавіковай эпохі — да сярэдзіны 9-га тысячагоддзя да н. э. Менавіта тады, у эпоху мезаліту (сярэдняга каменнага веку) пачалося актыўнае засяленне далін буйных рэк і прыазёрных мясцін Беларусі шматлікімі групамі паляўнічых з поўдня і паўднёвага захаду. Гэта быў час, калі першабытныя родавыя групы аб'ядноўваліся ў плямёны і пераходзілі да аседлага спосабу жыцця. У эпоху мезаліту чалавек пачынае шырока ўжываць лук і стрэлы, каменную сякеру, прыручае сабаку і інш.

Важнейшай рысай неаліту — новага каменнага веку (прыкладна 8—3-е тысячагоддзі да н. э.) у дастасаванні да тагачасных плямён поўдня Беларусі былі асваенне вырабу керамічнага посуду і высокі ўзровень вытворчасці каменных прылад працы і быту (з'яўленне двухбакова апрацаваных рубілаў, трохкутных наканечнікаў стрэл і коп'яў, сякер, долатаў і інш.) Па матэрыялах раскопак

[1] Аб існаванні мамантаў на тэрыторыі верхнепалеалітычнай Брагіншчыны сведчыць знаходка бівня маманта ў пясчаным кар'еры ў в. Чырвоная Гара каля Брагіна.

[1] Назва ад пячоры Кра-Маньён у Францыі, дзе знойдзены рэшткі чалавека гэтага тыпу.

месцаў пасялення старажытных людзей вядома, што гліняны хатні посуд выраблялуся імі грубай лепкай уручную і абпальваўся на агні.

У другой палавіне 5-га — напрыканцы 3-га тысячагоддзяў да н. э. правабярэжжа Дняпра і басейн ніжняй Прыпяці засялялі неалітычныя плямёны днепрадонецкай культуры, якая, на думку вучоных, адыграла важную ролю ў фарміраванні старажытнаславянскіх плямёнаў. Тагачаснае насельніцтва Брагіншчыны, відавочна, як адно з адгалінаванняў гэтай культуры, з'яўлялася актыўным удзельнікам «неалітычнай рэвалюцыі» — пераходу ад збіральніцтва да прымітыўнага земляробства і жывёлагадоўлі. Гэтыя выключнай важнасці змены ў жыццядзейнасці людзей (адначасова з вынаходствам посуду для гатавання і захоўвання ежы і прадуктаў, істотным павелічэннем іх колькасці і якасці) прыкметна садзейнічалі паляпшэнню ўмоў жыцця, а значыць, і ўзбуйненню родавых мацярынскіх абшчын. У далейшым гэта ў пэўнай меры паслужыла аб'яднанню абшчынных груп у буйныя роднасныя па звычках, мове і культуры плямёны. Фарміраванне і тэрытарыяльнае абасабленне неалітычных археалагічных культур адбывалася не толькі на глебе эвалюцыйнага ўдасканальвання, але і, перш за ўсё, на аснове багатых традыцый папярэдніх пакаленняў.

Як сведчаць многія даследаванні, у тыя часы рэкі Днепр, Прыпяць, Сож і іх прытокі з'явіліся своеасаблівымі магістральнымі шляхамі асваення старажытнымі насельнікамі зямлі новых тэрыторый, у тым ліку Камарыншчыны і Брагіншчыны. Відавочна, па гэтай прычыне нашы далёкія прашчуры часта выбіралі месцамі пражывання берагі рэк і звязаных з імі (нярэдка і адасобленых) азёраў. Зразумела, што водныя басейны высока цаніліся і як багатыя рыбалоўныя ўгоддзі. Нядзіўна, што самыя даўнія селішчы першабытнага чалавека тут выяўлены менавіта паблізу Дняпра і яго затокаў, каля рэчышчаў Верхняй і Ніжняй Брагінкі, Несвічы, Пясчанкі і іншых дробных рэчак.

Знаходкі з раскопак Брагіна

На пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э. на поўдні Беларусі пачаўся бронзавы век. У той час гэты рэгіён насялялі плямёны палескай групы культуры шнуравой керамікі, якія прымянялі лук і стрэлы, сякеры-кліны з прасвердленымі адтулінамі і серпападобныя нажы. Медныя і бронзавыя прылады і вырабы людзі гэтых плямён атрымлівалі пераважна шляхам абмену з плямёнамі Прыкарпацця і Каўказа.

На тэрыторыі, у якую ў другой палавіне бронзавага веку ўваходзіла Брагіншчына, распаўсюджваліся плямёны тшцінецкай культуры[1]. Некаторыя даследчыкі выказваюць меркаванне аб праславянскай прыналежнасці тшцінецкіх плямёнаў. На такую выснову іх наводзіць тое, што гэтыя плямёны насялялі мясціны са старажытнейшымі славянскімі назвамі рэк.

[1] Ад назвы паселішча Тшцінец у Пулаўскім павеце, Польшча.



Кафля-"гарадок" XVII ст. з Брагінскага замка



Гаршковая кафля XVI ст. і паліхромная кафля XVII ст. з Брагінскага замка

У абагульненым плане бронзавы век характарызаваўся прынцыповымі зменамі ў вытворчасці: асваеннем людзьмі металургіі медзі і бронзы, панаваннем эфектыўных форм гаспадаркі, заснаванай на прымітыўнай жывёлагадоўлі і першабытным земляробстве. Тагачасны чалавек займаўся развядзеннем кароў, авечак, коз, свіней, коней, вырошчваў пшаніцу, ячмень, лён, каноплі і інш. Гэта абумовіла першы буйны грамадскі падзел працы і прывяло да ўзнікнення рэгулярнага абмену прадукцыяй паміж вытворцамі-аграрнікамі і старажытнымі рамеснікамі — майстрамі па вырабе каменных ці металічных (бронзавых) прылад працы і зброі, прадметаў з косці і рогу. Абменныя аперацыі спрыялі канцэнтрацыі матэрыяльных каштоўнасцей у руках мацнейшых родавых абшчын. Так зарадзілася маёмасная няроўнасць.

Самай жа істотнай з'явай у грамадскім жыцці плямён бронзавага веку з'явілася паступовая замена мацярынска-родавых адносін патрыярхальнымі.

Да сярэдзіны 2-га тысячагоддзя да н. э. на левабярэжжы Дняпра, у т. л., відавочна, і на Брагіншчыне, у выніку зліцця плямён сярэднедняпроўскай культуры з нашчадкамі позненеалітычных плямён (1500—1200 гадоў да н. э.) складвалася сосніцкая культура[1]. Пры раскопках у яе культурным пласце на рэштках пасяленняў і ў пахаваннях з трупапалажэннем сустракаюцца каменныя прылады працы і металічныя вырабы (в. Мохаў Лоеўскага і в. Гарошкаў Рэчыцкага, суседніх з Брагіншчынай раёнаў).

У VII ст. да н. э. на тэрыторыі Беларусі, у т. л. у нашых палескіх мясцовасцях, пачаўся ранні жалезны век, калі людзі навучыліся атрымліваць жалеза з балотнай руды. Пачатак жалезнага веку з'явіўся сапраўдным пераваротам у эканамічным і грамадска-палітычным жыцці тагачасных людзей. Метал выплаўлялі ў печах-домніцах, а месцы іх размяшчэння называліся руднямі. Ад гэтага пайшлі найменні паселішчаў. Напрыклад, на Брагіншчыне вёска Рудня Жураўлёва.

Выкарыстанне больш дасканалых металічных прылад працы садзейнічала больш прадукцыйнаму вядзенню лядна-га (падсечнага) земляробства, якое істотна спрыяла развіццю жывёлагадоўлі.

[1] Ад назвы паселішча каля г. п. Сосніца Чарнігаўскай вобл.



Глінянае прасліца і абломак скіфскай стралы з гарадзішча Асарэвічы



Замчышча ў г. п. Брагін

Абедзве гэтыя галіны з'яўляліся асновай мясцовай эканомікі тагачаснага насельніцтва. Ад ляднага земляробства вядуць пачатак назвы такіх населеных пунктаў Брагіншчыны, як Ляды, Капоранскія Ляды, урочышча Ляднае і інш.

Уздым на якасна новую ступень гаспадарча-эканамічнай дзейнасці старажытных людзей ранняга жалезнага веку ўсёй сваёй сутнасцю прадвызначыў узмацненне маёмаснай няроўнасці, паразвіццё сацыяльных класаў і ўзнікненне перадумоў для стварэння дзяржавы. Імкненне да сілавога перазмеркавання запасаў прадукцыі земляробства і жывёлагадоўлі, рамесніцкіх тавараў, што ствараліся ў пэўных родаў ці плямёнаў у выніку накаплення або абмену, прыводзіла да ўзброеных сутыкненняў за матэрыяльныя каштоўнасці. У выніку ваенных нападаў пераможцам даставаліся не толькі трафеі, але і палонныя людзі, якія потым траплялі ў поўную залежнасць ад захопнікаў. Так узнікла патрыярхальнае рабства.

Распад першабытнаабшчынных адносін, узброеныя сутыкненні паміж абасобленымі групамі старажытных жыхароў вымушалі родавыя ці племянныя аб'яднанні людзей выбіраць для будаўніцтва ўмацаваных пасёлкаў — гарадзішчаў мысавага або балотнага тыпаў мясціны з найбольш непрыступнымі ўмовамі рэльефу. У прыватнасці, на Брагіншчыне гэта гарадзішчы каля вёсак Асарэвічы, Савічы, Чыкалавічы і інш. Значна пазней на месцах такіх гарадзішчаў узніклі самастойныя гаспадарчыя адзінкі — селішчы.

Па прычыне неаднолькавасці саставу насельніцтва па роднасных, сваяцкіх і іншых сувязях у раннім жалезным веку адбылася змена патрыярхальна-родавай абшчыны сельскай (тэрытарыяльнай) абшчынай. Развіўся лад ваеннай дэмакратыі.

На пачатку ранняга жалезнага веку поўдзень Беларусі засялялі плямёны мілаградскай[1] (VII—III стст. да н. э.) і паморскай (IV—II стст. да н. э.) культур, якія знаходзіліся на розных узроўнях распаду першабытнаабшчыннага ладу. Пазней (сярэдзіна III ст. да н. э.) на месцы гэтых культур склалася зарубінецкая культура[2]. На Брагіншчыне тады жылі плямёны яе лакальнага палескага варыянта.

[1] Ад назвы гарадзішча каля в. Мілаград Рэчыцкага р-на.

[2] Ад назвы могільніка каля с. Зарубінцы на Кіеўшчыне.

Ад мілаградскай культуры зарубінецкую выгадна адрознівала больш высокая дасканаласць і разнастайнасць прылад працы, зброі, посуду, упрыгожанняў. Насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, рыбалоўствам, выплаўляла і апрацоўвала жалеза, развівала рамёствы. Яно падтрымлівала сувязі з народамі Паўднёвага Прычарнамор'я, паўночнымі ўскраінамі Рымскай імперыі. Аб гэтым сведчаць археалагічныя знаходкі. На думку многіх даследчыкаў, зарубінецкая культура ўжо належала славянам.

Усходнеславянскія плямёны прыйшлі з поўдня і паўднёвага захаду, аж з-пад Дуная. Вось што сведчыць аб рассяленні славян на тэрыторыі Беларусі старажытнарускі летапіс: «А еще другие сели между Припятью и Двиной и назвались дреговичами... И так разошелся славянский народ, а по его имени и грамота называлась «славянская», а говорят по-славянски на Руси: поляне, древляне, дреговичи...»[1]

Але ж і папярэднікамі дрыгавічоў у VI—VIII стст. на сярэдняй Прыпяці былі плямёны славянскага паходжання. Ці не пра іх (яшчэ ў VI ст.) упамінаў готскі гісторык Іярдан у сваёй працы «Геціка». А яшчэ ў I і II стст. н. э. Тацыт і Пталамей называлі тутэйшае славянскае насельніцтва венедамі (венетамі).

Даследчыкі сцвярджаюць, што дрыгавічы належалі да найбольш развітых у сацыяльных адносінах плямён, якія знаходзіліся на заключнай стадыі распаду родаплемяннога ладу і яшчэ да ўключэння іх у Кіеўскую Русь мелі і сваё палітычнае аб'яднанне — «княжанне». Да прыняцця хрысціянства яны былі язычнікамі. На тэрыторыі дрыгавічоў напрыканцы 1-га тысячагоддзя склалася Тураўскае княства. Толькі на пачатку XI ст. яно было ўключана ў склад Кіеўскай Русі.

Асновай гаспадаркі дрыгавічоў, як і крывічоў, радзімічаў, былі ляднае земляробства і жывёлагадоўля, а дадатковым заняткам — паляванне, рыбалоўства, бортніцтва і гандаль. Аб апошнім сведчаць знойдзеныя пры раскопках разнастайныя ўпрыгожанні і асобныя прадметы быту немясцовага паходжання. Самыя старажытныя помнікі дрыгавічоў — курганныя могільнікі з трупаспаленнем і пахаваннем у урнах. Курганы з пахаваннем па такім абрадзе знойдзены ў нас на Брагіншчыне каля вёсак Пажаркі і Шкураты Вуглоўскага сельсавета.

Пераход ад першабытнаабшчыннага ладу да феадалізму ў плямён, якія насялялі тэрыторыю Беларусі, працягваўся да VI—IX стст. Развіццё прадукцыйных сіл абумовіла змену ляднага (падсечнага) земляробства больш эфектыўным — ворным. Узнікненне ж прыватнай уласнасці ў выніку адасаблення дробнасямейных гаспадарак выклікала распад патрыярхальна-сельскай і ўзнікненне тэрытарыяльнай сельскай абшчыны, аснову якой складалі эканамічныя сувязі. Маёмаснае расслаенне насельніцтва паклала пачатак усталяванню феадальнай уласнасці на асноўныя сродкі вытворчасці (зямлю, жывёлу, прылады працы).

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Тапаніміка родных мясцін

Кожны населены пункт, кожная мясціна: луг, поле, лес, вялікая рака і маленькі ручаёк маюць у народзе сваю назву. І людзей заўсёды цікавіла: чаму менавіта так называецца паселішча, у якім яны жывуць, тое або іншае ўрочышча. Сведчаннем такой цікавасці з'яўляюцца, у прыватнасці, шматлікія версіі паходжання назваў вёсак. Часам гэтыя назвы вельмі даўнія, перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Геаграфічныя назвы ўзнікаюць у цеснай сувязі з жыццём і дзейнасцю людзей. Вось чаму тапонімы — назвы паселішчаў, рэк, азёраў (гідронімы),

1 Повесть временных лет. Полное собрание русских летописей. М., 1962. Т. 2. С. 5.

урочышчаў, формаў рэльефу — нясуць у сабе самую разнастайную інфармацыю аб нашым мінулым. Тапаніміка дапамагае вызначаць месцы важных падзей, часам шматвяковай даўнасці. Спашлёмся на прыклад з гісторыі вызваленчай вайны ўкраінскага і беларускага народаў супраць польскіх феадалаў у сярэдзіне XVII стагоддзя. Так, дакладна вызначыць месца бітвы казацкага войска пад кіраўніцтвам запарожскага палкоўніка Ільі Галоты э сіламі польскага магната Радзівіла вясной 1646 года дапамагла тапаніміка. Вядома, што прыціснутыя палякамі да балота казакі рабілі гаці, каб па іх выйсці з акружэння. Адно з урочышчаў каля Загалля (цяпер у Хойніцкім раёне) і па сённяшні дзень называецца Казацкай грэбляй.

А цяпер аб назвах населеных пунктаў Брагіншчыны. Пераважная большасць іх утварылася ад імёнаў і прозвішчаў людзей, што жылі тут у момант узнікнення паселішчаў, некаторыя — па прозвішчах іх уладальнікаў. Цікавае ў гэтых адносінах паходжанне назвы Брагіна. Калі адкінуць версіі — легенды аб братах-разбойніках і брагаварах, то магчыма, назва паходзіць ад асабістага імя Брага — мянушкі чалавека. Аб сувязі назвы з асабістым імем сведчыць і суфікс (-ін, -ын), і шырокае распаўсюджанне адпаведных асабістых імён і прозвішчаў, а таксама населеных пунктаў «Брагін», «Брагіна», якіх некалькі на геаграфічнай карце былога Савецкага Саюза.

Верагодна такога ж паходжання (ад асабістага імя) і назва другога нашага гарпасёлка — Камарын (Камар — Камарын). Той жа суфікс прыналежнасці. Магчымы і іншы варыянт — непасрэдная сувязь з характарыстыкай месца (камарынае).

Да ліку населеных пунктаў, назвы якіх утварыліся ад імёнаў і прозвішчаў, адносяцца, у першую чаргу, усе назвы на -ічы. Гэта — Глухавічы, Мікулічы, Савічы, Юркавічы (у асноўным ад адпаведных імёнаў), Асарэвічы, Астрагляды (у сярэдзіне XIX стагоддзя — Астраглядавічы), Хракавічы — ад адпаведных мянушак і прозвішчаў (Асарэвіч, Астраглядавіч, Хракавіч) і г. д.

Старажытнарускае імя Мікула (успомніце быліннага Мікулу Селянінавіча) магло даць назву вёсцы Мікулічы. Аб тым, што гэта сапраўды старажытнае паселішча, сведчыць не толькі назва, але і наяўнасць каля яго курганоў, што адносяцца да X—XI стагоддзяў.

Асабістыя прозвішчы ляжаць у аснове назваў населеных пунктаў Аляксандраўка, Аляксееўка, Карлаўка, Міхалоў, Міхалёўка, Рафалаў, Сцепаноў і інш. Аналагічнага паходжання і назвы вёсак Петрыцкае, Іванкі. Ад даўняга імя Богуш вядзе сваю назву вёска Багушы, ад прозвішчаў Бакун, Кулага, Крук, Шчэрба, Чыкалаў, Рыжка і г. д. — вёскі Бакуны, Кулажын, Крукі, Шчарбіны, Чыкалавічы, Рыжкаў...

Назвы цэлага раду населеных пунктаў Брагіншчыны і Камарыншчыны вядуць свой пачатак ад пародаў дрэў, якія раслі каля іх у свой час (Бярозкі, Грушнае, Дуброўнае, Ясяні). Размешчаная ў лясным масіве вёска ад яго і атрымала назву — Вялікі Лес, Залессе.

Прыродна-геаграфічныя ўмовы, дзе размешчаны населеныя пункты, адлюстраваны ў такіх назвах, як Залессе, Зарэчча, Жары, Ляды, Макрэц, Новая Грэбля, Пажаркі. Макрэц — ад мокрага, гразкага месца. А калі вёску назвалі Новай Грэбляй, то дзесьці павінна быць і старая грэбля. Аказваецца, за некалькі кіламетраў ад цяперашняй вёскі Новая Грэбля захаваліся рэшткі старой грэблі, якая вяла да колішняга моста цераз раку Брагінку. Вёску за Брагінкай людзі назвалі Зарэччам.

Цікавае паходжанне назвы вёскі Ляды. На мове нашых далёкіх продкаў слова «ляда» азначала ўчастак ворыва, які ўзнік на месцы высечанага і спаленага лесу. Гэта слова і да цяперашняга часу захавалася на Беларусі ў назвах урочышчаў. А назва мясцовасці дала найменне і вёскам, што ўзніклі паблізу на Брагіншчыне: гэта Капоранскія Ляды і Ялчанскія Ляды.

Узнікшыя на месцах лясных выгараў вёскі атрымалі адпаведныя назвы — Жары, Пажаркі. Шэраг населеных пунктаў узнік на месцы старажытных гарадзішчаў, селішчаў і атрымаў ад іх свае назвы (вёскі Гарадзішча, Гарадок). Цэламу шэрагу вёсак назвы даў род заняткаў, характар гаспадарчай дзейнасці іх першажыхароў. Гэта вёскі Кавалі, Пасека, Млынок, Рудня Жураўлёва, Лубенікі, Печы і г. д. Характэрна, што вёскі Рудня (польскае Гута) ёсць у многіх раёнах рэспублікі. Яны ўзніклі на месцах, дзе калісьці выплаўлялі жалеза з балотнай руды. Аб тым, што такая вытворчасць існавала ў нашай мясцовасці, сведчаць пісьмовыя крыніцы. У прыватнасці, у «Топографическом описании Минской губернии о количестве городов, деревень, монастырей, церквей, дорог, почтовых станций и промышленных предприятий», выдадзеным у 1800 годзе, па Рэчыцкім павеце згадваецца жалезны завод (Рудня), які належаў графам Алозію і Людвігу Ракіцкім — тагачасным уладальнікам Брагіна і шэрагу навакольных вёсак.

Некаторыя неселеныя пункты Брагіншчыны атрымалі сваю назву ад характару ці размераў забудовы (Вуглы, Сялец — невялікае сяло) і інш.

Як ужо адзначалася, многія вёскі раёна вельмі старажытныя. За шматвяковую гісторыю іх назвы ў радзе выпадкаў страцілі сваё першапачатковае значэнне або зусім змяніліся. Характэрная ў гэтых адносінах гісторыя назвы вёскі Галкі. Ёсць вельмі цікавы дакумент, які ставіць пад сумненне цяперашнюю версію назвы гэтага населенага пункта. Называецца ён «Абмежавальны акт Брагінскага графства», складзены 7 сакавіка 1512 года дзякам Кніцічавым. У гэтым апісанні паўднёвая мяжа графства праведзена ад Кажушкаў, Дронькаў да вусця Брагінкі і затым па Дняпры «до села Брагинскаго Галэк».

Гэта або слова «галкі» ў родным склоне ў тагачасным беларускім вымаўленні, якога прытрымліваўся і аўтар апісання, або нешта зусім іншае, што затым трансфарміравалася ў «Галкі», можна толькі меркаваць. Важна другое — гэта невялікая брагінская вёсачка існуе ўжо амаль пяць стагоддзяў.

Аб тым, якія назвы мелі вёскі ў сярэдзіне XVII стагоддзя, сведчыць апісанне брагінскага маёнтка польскіх магнатаў Канецпольскіх, якія валодалі Брагінам пасля князёў Вішнявецкіх. Гэта былі вёскі: Бабчын, Спарыж, Нудзічы, Дублін, Галкі, Сувіды, Мікулічы, Веляцін, Гамовічы, Сялец, Малыйкі, Катловіца, Скураты, Мокіш, Еўлашы, Глухавічы, Губарэвічы, Сцежарна, Хатуча, Юркавічы, Юлча, Ліствін, а таксама хутары Маскі, Ільічы, Буркі, Крыўча, Дамброўскі, Варацец, Каноны, Чэхі, Заблоцце, Ясяноў, Звінярскае, Бандары (Архив Юго-Западной России. Т. 2. С. 148—158).

Названы дакумент сведчыць аб тым, што цяперашняя назва вёскі Спярыжжа не зусім адпавядае першапачатковаму сэнсу слова. У народзе спарыжом называюць зрослыя арэхі ляшчыны. Чаму вёска так называлася раней, меркаваць цяжка. Магчыма, такую назву населенага пункта сцвердзіла яго першапачатковая забудова або мянушка жыхара.

Цікавіць таксама назва такога буйнога населенага пункта Брагіншчыны, як Чамярысы. Можа здацца, быццам у аснову назвы вёскі пакладзена ядавітая трава чамярыца, якая расце ў нашых балотах. Аднак гісторыя сведчыць аб іншым. Вёска ў далёкім мінулым мела не такую назву. У адказе Мінскага генерал-губернатара Рэдзінга на прадпісанне міністэрства ўнутраных спраў з нагоды хвалявання прыгонных сялян памешчыка Юдзіцкага, якое мела месца ў 1808 годзе, вёскі, што належалі яму, называліся Чарамісы і Просмычы.

А між тым чарамісы — старая, дарэвалюцыйная назва марыйцаў, цяперашніх жыхароў Рэспублікі Марый-Эл. Як маглі выхадцы з Паволжа заснавацца ў той час на Беларусі? Вядома толькі адно: чарамісы прыцягваліся царскімі ўладамі для нясення ваеннай службы. Зусім магчыма, што гэтую службу чара-

місы адбывалі ў той час на Дняпры — на мяжы паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Магчымыя і іншыя версіі іх з'яўлення ў нашых мясцінах.

Тапонімы — жывая гісторыя народа, люстра яго мінулага і цяперашняга жыцця. У назвах шэрагу населеных пунктаў адлюстравалася цёмнае, забітае жыццё беларускага селяніна-палешука. Менавіта аб гэтым сведчаць назвы такіх вёсак, як Нудзічы, Шкураты і інш. Апошняя ў недалёкім мінулым называлася Скураты. А скураты ў мясцовых сялян азначалі невялікія кавалкі нявырабленай скуры, якая выкарыстоўвалася для падшыву самаробнага абутку, а ў іншых выпадках — валёнкі з падшытымі заднікамі або па падэшвах кавалкамі скуры.

Вядомыя факты, калі ў даўнія часы назвы некаторых населеных пунктаў мяняліся ў афіцыйным парадку, у сувязі з пэўнымі абставінамі. Так, цяперашняя вёска Аляксееўка Крыўчанскага сельсавета яшчэ нават на пачатку XX стагоддзя называлася Цюцькамі. У 1908 годзе тут пабудавалі царкву, і ўзнікла праблема з назвай царкоўнага прыхода. Цюцькоўскім яго называць было не вельмі мілагучна. Таму па вышэйшым рашэнні царкоўных вярхоў вёску «ахрысцілі» па назве Аляксееўскай царквы — Аляксееўкай.

Кастрычніцкая рэвалюцыя ўнесла істотныя змены ў эканамічнае, палітычнае і культурнае жыццё народа, выклікала да жыцця і новыя паняцці. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ў тапонімах. Нямала новых назваў, звязаных з паслякастрычніцкай рэчаіснасцю, з'явілася і на тэрыторыі Брагіншчыны. Як правіла, гэта былі пасёлкі, што ўзнікалі на былых памешчыцкіх землях. У ліку іх — Ленінск, Ленінскі, Чырвонае Поле, Чырвоная Гара, Першамайскі. У перыяд калектывізацыі і ў наступныя гады ўзніклі назвы калектыўных сялянскіх гаспадарак «Чырвоны Кастрычнік», «Чырвоны араты», «Чырвоная ніва», «Надзея» і інш.

Ю. Я. Залатарэнка

Археалагічныя даследаванні на Брагіншчыне

Пачатак археалагічным даследаванням на Брагіншчыне быў пакладзены яшчэ ў XIX ст. вядомым археолагам-энтузіястам У. З. Завітневічам. Аднак сістэматычнае вывучэнне матэрыяльных помнікаў старажытных вякоў прыпадае ў нас на XX ст., і пераважна на пасляваенны час. Ніжэй, у храналагічным парадку, прыводзяцца асноўныя звесткі пра археолагаў, уклад якіх у вывучэнне першабытнага мінулага Брагіншчыны найбольш значны.

Завітневіч Уладзімір Зянонавіч, н. 2(14).4.1853 г. у в. Літвяны Мінскага павета, беларускі археолаг. Прафесар Кіеўскай духоўнай акадэміі (1904). З сям'і святара. Скончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію (1878). Працаваў настаўнікам у Варшаве, з 1884 г. у Кіеўскай духоўнай акадэміі. Даследаваў каля 700 курганоў дрыгавічоў у 82 могільніках, найбольш у Мазырскім, Рэчыцкім і Бабруйскім паветах Мінскай губерні. Вызначыў межы рассялення дрыгавічоў, іх этнавызначальныя прадметы. Вывучаў старажытнарускую гісторыю.

На тэрыторыі Брагіншчыны ў 1880 г. выявіў і абследаваў 13 дрыгавіцкіх курганоў Мікуліцкага курганнага могільніка; выявіў і даследаваў (раскапаў) у 1890 г. 25 насыпаў курганнага могільніка каля в. Пажаркі, які належаў палянам і датуецца X—XII стст.

Матэрыялы даследаванняў У. З. Завітневіча зберагаюцца ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве.

З навуковых прац У. З. Завітневіча найбольш вядомыя: «Область дреговичей как предмет археологического исследования» ў кн.: «Труды Киевской духовной академии». Кн. 8. Киев, 1886; «Из археологической экскурсии в Припятское Полесье». Киев, 1890; «Вторая археологическая экскурсия в Припятское Полесье». Киев, 1891; «Форма погребального обряда в могильных курганах Минской губернии» ў кн.: «Труды

IX археологического съезда в Вильне». М., 1895. Т. 1.

Памёр у сакавіку 1927 г.

Мельнікоўская Вольга Мікалаеўна, н. 14.9.1921 г. у г. Сасава Разанскай вобл., савецкі археолаг. Кандыдат гістарычных навук (1965). Пасля сканчэння Маскоўскага універсітэта (1946) працавала ў Інстытуце археалогіі СССР. У 1951—1961 гг. вывучала помнікі археалогіі паўднёва-ўсходняй Беларусі — праводзіла раскопкі гарадзішчаў, селішчаў, могільнікаў. Абследавала каля 200 археалагічных помнікаў. Вялікі матэрыял абагуліла ў мілаградскую культуру. Вызначыла культурна-гандлёвыя сувязі плямёнаў мілаградскай культуры з іншымі плямёнамі. Распрацавала пытанні абсалютнай і адноснай храналогіі культуры, звязала яе насельніцтва з неўрамі, славянамі.

У 1954—1965 гг. даследавала гарадзішчы ва ўрочышчах Пад'ямец, Гарадок, Высокае, Салавіца, Газбуч, Хістына каля в. Асарэвічы, Гдзень, Чыкалавічы, Савічы, Калыбань, Хракавічы; бескурганны і курганны могільнікі ва ўрочышчы Пад'ямец Асарэвіцкага і каля в. Пажаркі Вуглоўскага сельсаветаў. Матэрыялы абследаванняў па Асарэвіцкіх гарадзішчы і бескурганным могільніку зберагаюцца ў Інстытуце археалогіі РФ і ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі, па Гдзенскім, Калыбанскім, Салавіцкім, Хракавіцкім і Чыкалавіцкім археалагічных помніках — у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Побаль Леанід Давыдавіч, н. 28.5.1924 г. у в. Мікалаева Іўеўскага р-на, беларускі археолаг. Доктар гістарычных навук (1978), прафесар (1990). Член міжнароднай уніі славянскай археалогіі, Польскага археалагічнага таварыства, Беларускага таварыства аховы помнікаў. Скончыў Інстытут фізічнай культуры (1950), БДУ (1951). У 1950—1955 гг. працаваў ва ўстановах народнай асветы. З 1958 г. супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР, з 1970 г. загадчык сектара, з 1980 г.— загадчык аддзела археалогіі першабытнага грамадства, з 1991 г.— вядучы супрацоўнік. Асноўны кірунак навуковай дзейнасці — вывучэнне гісторыі старажытных славян у Еўропе, у т. л. на Беларусі і інш.

У 1956 і 1965 гг. абследаваў гарадзішчы ва ўрочышчах Куркова, Салавіца, Высокае, Хістына каля в. Пасудава, Савічы, Чыкалавічы, Хракавічы; выявіў і абследаваў гарадзішча на правым беразе р. Брагінка каля в. Чэрнеў. Матэрыялы абследаванняў зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Собаль Валянцін Енісеевіч, н. 4.3.1949 г. у г. Паставы, беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук (1988). Скончыў БДУ (1972). З 1974 г. навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР, з 1988 г. археолаг Беларускага рэстаўрацыйнага праектнага інстытута Міністэрства культуры Беларусі. Даследуе помнікі архітэктуры археалагічнымі метадамі, храналогію культурных пластоў, матэрыяльную культуру гарадоў Беларусі XIV—XVIII стст. Прымаў удзел у даследаванні помнікаў архітэктуры Полацка, Гродна, Мінска, Міра і інш.

У 1975 г. абследаваў гарадзішча на правым беразе р. Брагінка каля в. Гарадзішча Малейкаўскага сельсавета, каля в. Чэрнеў і ва ўрочышчах Пад'ямец, Газбуч, Востраў каля в. Асарэвічы, Калыбань, Капоранка; гарадзішчы з мясцовай назвай Гарадок каля в. Гдзень, Каманоў, Кулажын, Пасудава, Савічы, Старая Ёлча, Хракавічы; селішча каля в. Капоранка; бескурганны могільнік каля асновы гарадзішча побач з в. Асарэвічы; курганныя могільнікі каля в. Мікулічы, Калыбань, Пажаркі; селішча каля в. Галкі. Матэрыялы абследаванняў зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Ткачоў Міхаіл Аляксандравіч, н. 10.3.1942 г. у г. Мсціслаў, беларускі археолаг, гісторык-медыявіст. Доктар гістарычных навук (1987), прафесар (1989). Скончыў БДУ (1964). Працаваў настаўнікам у Жодзіне. З 1968 г. у Інстытуце гісторыі АН БССР, з 1978 г.—

у Гродзенскім універсітэце; у 1983—1985 гг. загадчык кафедры. З 1989 г. загадчык рэдакцыі гісторыі Беларусі, з красавіка 1992 г. галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя» імя П. Броўкі. Вывучаў ваенную гісторыю Беларусі, абарончае дойлідства, матэрыяльную культуру і архітэктуру гарадоў Беларусі X—XVIII стст. У 1977 г. правёў невялікія раскопкі на Брагінскіх гарадзішчы і замчышчы.

Памёр 3.10.1992 г.

Ксяндзоў Уладзімір Паўлавіч, н. 25.7.1951 г. у в. Чарнаўчыцы Брэсцкага р-на, беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук (1980). Скончыў Магілёўскі педінстытут (1973), выкладаў гісторыю ў сярэдняй школе. З 1978 г. супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР. Даследаваў помнікі палеаліту і мезаліту на тэрыторыі Беларускага Падняпроўя і басейна Заходняй Дзвіны. Вылучыў 2 этапы засялення тэрыторыі Беларусі ў каменным веку, выявіў у мезаліце Падняпроўя і Падзвіння помнікі грэнскай, яніславіцкай і кунда археалагічных культур.

У 1977 г. выявіў і абследаваў паселішча каля в. Галкі Асарэвіцкага сельсавета, 5 паселішчаў каля в. Хракавічы, з якіх 3 абследаваў. Матэрыялы зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Лашаікоў Міхаіл Іванавіч, н. 18.11.1951 г. у в. Новае Харабрава Аршанскага р-на, беларускі археолаг. Кандыдат гістарычных навук (1991). Скончыў Мінскі педінстытут (1977). З 1978 г. супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР. Вывучае помнікі мілаградскай культуры. Устанавіў, што ранні пласт на ўсходнепалескіх гарадзішчах адносіцца да 2-й паловы VII ст. да н. э. У 1979—1980 гг. выкладаў у Мінскім педінстытуце, у 1980—1983 гг. кіраваў археалагічнай практыкай студэнтаў Гомельскага універсітэта.

У 1977 г. абследаваў гарадзішча і паселішча ва ўрочышчы Востраў каля в. Капоранка, гарадзішча каля в. Макрэц і Сялец Малейкаўскага сельсавета. Матэрыялы зберагаюцца ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Даследчык помнікаў старажытнасці

Адным з нашых знакамітых землякоў з'яўляецца ўраджэнец вёскі Верхнія Жары Іван Харытонавіч Юшчанка

У дваццаціпасцігадовым узросце, закончыўшы ў 1896 годзе Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, малады педагог навучаў дзяцей у некалькіх школах Гомельшчыны.

Сур'ёзна захапляцца археалогіяй І. Х. Юшчанка пачаў у канцы 20-х гадоў, калі настаўніцкая доля прывяла яго ў родныя прыдняпроўскія мясціны. Шэсць гадоў працаваў у Камарынскай працоўнай школе 1-й ступені. Пасля 1928 года — у мясцовай сямігадовай школе. Іван Харытонавіч удала спалучаў педагагічную дзейнасць з работай па вывучэнні помнікаў глыбокай старажытнасці. Гэтаму захапленню аддаваў вольны час школьных канікулаў і выхадныя дні. З 1929 года ён пачаў займацца гэтай справай сістэматычна. Займаўся і пазней, будучы навуковым супрацоўнікам Гомельскага краязнаўчага музея.

У 1929 годзе даследчык-аматар выявіў Асарэвіцкае гарадзішча і побач з ім бескурганны могільнік, селішча ва ўрочышчы Стонча, Гдзенскае гарадзішча ва ўрочышчы Гарадок, Калыбанскае гарадзішча і курганны могільнік ва ўрочышчы Газбуч, Пасудаўскае, Капоранскае (з селішчам), Стараялчанскае, Хракавіцкае, Кулажынскае, Савіцкае, Каманоўскае, Чыкалавіцкае гарадзішчы ва ўрочышчах Куркова, Востраў, Гарадок, Хістына, Гарадзец, Высокае. З іх даследаваў у 1929 годзе Хракавіцкае гарадзішча ва ўрочышчы Хістына і ў 1930-м — вядомае з 1873 года Малейкаўскае гарадзішча.

На правабярэжжах Дняпра і правага прытока Брагінкі — Лебедзеўкі на 43-кіламетровым працягу ад Асарэвічаў да Ніжніх Жароў І. Х. Юшчанка выявіў

13 стаянак, 10 паселішчаў, апісаў 2 гарадзішчы, 3 курганныя групы. Вялікую работу правёў даследчык і на другім правым прытоку Брагінкі — рэчцы Несвіч. Тут на яе 19-кіламетровым працягу левабярэжжа ад Чыкалавічаў да Кулажына ён абследаваў адну стаянку, адно паселішча, апісаў два гарадзішчы і адну курганную групу.

Усяго ж наш зямляк-археолаг выявіў (і частку абследаваў) 67 помнікаў сівой старажытнасці — гарадзішчаў, паселішчаў, стаянак, курганоў. Першапачатковая апрацоўка знойдзеных прылад працы і зброі з каменю, бронзы, жалеза дала магчымасць аднесці стаянкі да культуры бронзавага і ранняй пары жалезнага вякоў. На паселішчах адзначаны прыкметы даславянскай і славянскай культур.

Што датычыць гарадзішчаў, то ў іх выразна прасочваюцца дзве культуры, адна з якіх адносіцца прыблізна да 1-га тысячагоддзя н. э., а другая ўжо выдзяляецца славянскай керамікай курганнага перыяду, да якога можна аднесці і курганы.

Вынікі археалагічных абследаванняў І. Х. Юшчанка абагульніў у такіх сваіх манаграфіях, як «Археалагічныя даследы ў Гомельскай акрузе», змешчанай у «Запісках аддзела гуманітарных навук Беларускай Акадэміі навук» (1930, кн. II), «Працы археалагічнай камісіі» (т. 2), а таксама «Археалагічнае абследаванне р. Брагінкі (вадазбор ніжняй Прыпяці)», змешчанай у кнізе «Працы секцыі археалогіі» (Мн., 1932. Т. 3).

Матэрыялы абследаванняў і даследаванняў І. Х. Юшчанкі зберагаюцца ў Інстытуце археалогіі РФ, Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук РБ і часткова ў Гомельскім абласным краязнаўчым музеі.

Іван Харытонавіч Юшчанка загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны, удзельнічаючы ў партызанскім руху на часова акупіраванай нямецка-фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі прыдняпроўскага Палесся.

І. Ф. Ганжураў

Археалагічныя помнікі Брагіншчыны

Вёска Асарэвічы, цэнтр сельсавета

Гарадзішча. За 2 км ад вёскі, на правым беразе ракі Лебедзеўкі, ва ўрочышчы Пад'ямец. Датуецца VI ст. да н. э.— II ст. н. э.

Бескурганны могільнік. Каля асновы гарадзішча. Датуецца тым жа перыядам.

Абодва археалагічныя помнікі адносяцца да мілаградскай і ранняга этапу зарубінецкай культур ранняга жалезнага веку.

Вёска Галкі Асарэвіцкага сельсавета

Паселішча. За 250 м на паўднёвы захад ад вёскі, на пясчаным узвышшы першай надпоймавай тэрасы правага берага Дняпра. Адносіцца да эпохі неаліту, датуецца 5—3-м тысячагоддзямі да н. э.

Селішча. За 0,5 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Стонча. Адносіцца да ранняга жалезнага веку і да эпохі Кіеўскай Русі.

Вёска Гарадзішча Малейкаўскага сельсавета

Гарадзішча. За 0,1 км на поўдзень ад вёскі, на невялікім узвышэнні правага берага ракі Брагінкі. Адносіцца да эпохі Кіеўскай Русі і больш позняга часу.

Вёска Гдзень, былы цэнтр сельсавета

Гарадзішча. На паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі, на правым беразе ракі

Гарадзішча ў в. Гдзень


АРХЕАЛАГІЧНЫЯ
ПОМНІКІ
БРАГІНСКАГА РАЁНА
Гарадскія пасёлкі
Цэнтры сельсаветаў
Населеныя пункты,
якія перасталі існаваць
у выніку катастрофы
на Чарнобыльскай АЭС
Мяжа Палескага
радыяцыйна-экалагічнага
запаведніка
Гарадзішчы
Паселішчы
Курганныя могільнікі
р.Брагінка
Мікулічы
Буркі
Вуглы
Малейкі
БРАГІН
Дублін
Крыўча
Малажын
Чамярысы
Н.Хракавічы
Асарэвічы
Краснае
КАМАРЫН
В.Жары
р.Брагінка
р.Днепр

Брагінкі, ва ўрочышчы Гарадок. Побач з гарадзішчам прасочваюцца рэшткі селішча. Адносіцца да ранняга жалезнага веку і да эпохі Кіеўскай Русі.

Вёска Калыбань, былы цэнтр сельсавета

Гарадзішча. За 4 км на поўдзень ад вёскі, ва ўрочышчы Газбуч, на правым беразе ракі Брагінкі. Побач прасочваюцца сляды паселішча. Адносіцца да пачатку 1-га тысячагоддзя н. э.

Курганны могільнік. За 2 км на паўднёвы захад ад вёскі, ва ўрочышчы Замосце.

Вёска Каманоў Вуглоўскага сельсавета

Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадок. За 2 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на левым беразе ракі Брагінкі. Адносіцца да ранняга жалезнага веку (мілаградская і зарубінецкая культуры), датуецца канцом 1-га тысячагоддзя да н. э.— пачаткам 1-га тысячагоддзя н. э.

Вёска Капоранка Новаялчанскага сельсавета

Гарадзішча. За 5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Востраў. Адносіцца да мілаградскай (VII—III стст. да н. э.) і ранняга этапу зарубінецкай культур (II ст. да н. э.)

Вёска Кулажын былога Крукаўскага сельсавета

Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадок. За 1 км на захад ад вёскі, на левым беразе ракі Несвіч. Адносіцца да ранняга жалезнага веку. Датуецца канцом 1-га тысячагоддзя да н. э.— пачаткам 1-га тысячагоддзя н. э.

Вёска Макрэц Малейкаўскага сельсавета

Гарадзішча. За 0,4 км ад вёскі, на невысокім узвышэнні, сярод балотаў.

Вёска Марытон Астраглядаўскага сельсавета

Курганны могільнік. За 0,1 км ад дарогі з вёскі Марытон у вёску Звеняцкае.

Вёска Мікулічы, цэнтр сельсавета

Курганны могільнік. За 0,3 км на захад ад вёскі, за калгасным садам. Належаў палянам. Датуецца X—XII стст.

Вёска Пажаркі Вуглоўскага сельсавета

Курганны могільнік. За 2 км на захад ад вёскі. Належаў палянам. Датуецца X—XII стст.

Вёска Пасудава былога Калыбанскага сельсавета

Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадок. За 3—4 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Куркова. Адносіцца да ранняга жалезнага веку.

Вёска Савічы былога Савіцкага сельсавета

Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадок. За 1 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Салавіца. Адносіцца да ранняга жалезнага веку.

Пляцоўка і абарончы вал гарадзішча ў в. Савічы

Вёска Старая Ёлча Новаялчанскага сельсавета

Гарадзішча. У вёсцы, на правым беразе ракі Брагінкі, ва ўрочышчы Гарадок. Адносіцца да ранняга жалезнага веку і сярэднявечча. Датуецца канцом 1-га тысячагоддзя да н. э.— пачаткам 1-га тысячагоддзя н. э. і больш познім часам.

Абарончы вал гарадзішча ў в. Старая Ёлча

Вёска Сялец Малейкаўскага сельсавета

Гарадзішча. За 3 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Бярозавік, у пойме ракі Брагінкі.

Вёска Хракавічы, цэнтр сельсавета

Паселішча 1. За 0,4 км на ўсход ад вёскі на першай надпоймавай тэрасе, на дзюнавых пясках. Адносіцца да перыяду бронзавага веку.

Паселішча 2. За 0,7 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на першай надпоймавай тэрасе правага берага Дняпра, на дзюнавых пясках. Адносіцца да перыяду бронзавага веку і ранняга жалезнага веку.

Паселішча 3. За 0,8 км на паўднёвы ўсход ад вёскі на астанцы першай надпоймавай тэрасы правага берага Дняпра. Адносіцца да перыяду бронзавага веку.

Паселішча 4. За 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі на першай надпоймавай тэрасе правага берага Дняпра. Адносіцца да перыяду неалітычнага веку і эпохі мілаградскай культуры.

Паселішча 5. За 5 км на ўсход ад вёскі, на першай надпоймавай тэрасе правага берага Дняпра. Адносіцца да позняга неаліту.

Вёска Чыкалавічы былога Калыбанскага сельсавета

Гарадзішча. Мясцовая назва Гарадок. За 5 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Высокае.

Вёска Чэрнеў былога Піркаўскага сельсавета

Гарадзішча. За 1,5 км на паўднёвы захад ад вёскі, на правым беразе ракі Брагінкі. Адносіцца да часу неаліту, бронзавага веку раннефеадальнага часу.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць. Мн., 1985. С. 91—105.

У складзе Кіеўскай Русі

У IX ст. у жыцці старажытнага насельніцтва Брагіншчыны пачаўся перыяд, які называецца эпохай Кіеўскай Русі, або ранняга феадалізму. Гэта быў час, калі пры ўладанні вялікіх князёў Алега (882—912), Ігара (912—945), Святаслава (957—972) адбывалася ўзрастанне магутнасці і аўтарытэту старажытнарускай дзяржавы, асабліва пасля прыняцця ёю хрысціянства як дзяржаўнай рэлігіі, закліканай стаць надзейнай апорай велікакняскай улады, ідэалагічным афармленнем феадальных адносін. Кіеў, такім чынам, сцвердзіў сябе палітычным цэнтрам усходнеславянскіх плямёнаў, аб'яднаўшы вакол сябе драўлян, севяран, улічаў, сіверцаў. Брагін жа ўзнік у зоне змяшання дрыгавічоў,

палян і севяран, магчыма, дзесьці ў межах XI ст., бо як горад быў ужо вядомы ў Турава-Пінскім княстве, а потым адышоў да Кіева. Аб гэтым разважае гісторык: «...в более к нам близкое время, когда в XII столетии летописи первый раз упоминают о Брагине, бывшем тогда уже центральным пунктом всей местности, последняя входила в состав Киевского княжества. Очевидно, крайний отрог дреговичских поселений, вследствие близкого соседства с Киевом, был оторгнут от своего древнего центра Турова и присоединен к волости стольного города, неразрывную связь с которым сохранил потом в продолжении долгого времени, до конца XVII столетия»[1].

Першае ўпамінанне аб Брагіне часоў Кіеўскай Русі (у Іпацьеўскім летапісе) адносіцца да 1147 г. Яно звязана з узмацненнем распаду Кіеўскай Русі на асобныя феадальныя княствы, ростам княскіх міжусобіц. Некаторыя даследчыкі старажытнасці, у тым ліку А. Ф. Рогалеў, напэўна, не беспадстаўна лічаць, што адной з прычын міжкняскага варагавання з-за Брагіна з'яўлялася яго важнае стратэгічнае, гаспадарчае і гандлёвае значэнне[2]. А летапісец зазначае, што чарнігаўска-северскія князі ў 1147 г. сумесна з полаўцамі раптоўна напалі на кіеўскія землі Ізяслава Мсціслававіча, у якія ўваходзіў і Брагін, у адплату за разбурэнне ім некалькіх чарнігаўскіх гарадоў. Чытаем у летапісе: «...по тому же времени, како уже рекы сташа, пославше Ольгович и Довыдовича дружину свою с половцы воеваша Брягинь»[3].

Жорская была бітва. Дні і ночы працягвалася спусташэнне. Да самых аблокаў узнімаўся дым пажарышчаў. Горад Брагін і яго абаронцы былі знішчаны, а ваколіцы — разрабаваны. Частку насельніцтва захопнікі пагналі ў палон. За няпоўнае паўстагоддзе на месцы руін і папялішчаў зноў узняўся Брагін. У другі раз Іпацьеўскі летапіс згадвае пра яго ў 1187 г. Запіс зроблены з нагоды таго, што кіеўскі князь Рурык (Раман) Расціслававіч жаніў свайго дзесяцігадовага сына Расціслава на васьмігадовай Верхуславе — дачцэ суздальскага князя Усевалада Юр'евіча, які ўвайшоў у гісторыю пад прозвішчам Усевалад Вялікае Гняздо. Летапісец яркa апісвае сцэну развітання Усевалада з дачкой і вяселле, што адбылося ў Белгарадзе ў Ефрасіннін дзень: «Сотвори же Рюрик Ростиславу велми сильну свадьбу, яка же несть бывала в Руси; и быша на свадьбе князи многы, за 20 князей. Сносе же своей дал многы дары и город Брягинь»[1].

Пасля згаданых падзей працягваўся часова перапынены працэс раздробленасці старажытнарускай дзяржавы ў выніку міжусобнай барацьбы ўдзельных князёў за кіеўскі трон. К сярэдзіне XII ст. Кіеўская Русь распалася на некалькі самастойных і паўсамастойных княстваў. Нават пагроза мангола-татарскага нападу, а затым і варожае нашэсце, паражэнне старажытнарускага войска ў бітве з полчышчамі Батыя на рацэ Калцы ў 1223 г. не спынілі згубных княскіх міжусобіц. Гэта значна аблегчыла задачу заваёўнікаў па авалоданні Кіевам.

Лёс стольнага горада раздзялілі тады Мазыр, Тураў, Пінск, Брагін і іншыя мясціны беларускага Палесся, заваяваныя мангола-татарамі пад кіраўніцтвам іхніх ханаў Гаюка і Кайдгана. Пры гэтым Камарыншчына і Брагіншчына разам з суседнімі мясцовасцямі апынулася пад уладай Залатой арды ў складзе Кіеўскага княства.

З 1243 г. Кіеў (з дазволу манголь-скага хана) знаходзіўся пад уладай Уладзімір-Суздальскага князя Яраслава Усеваладавіча, які меў тут свайго намесніка, а з 1249 г. па ярлыку Залатой

[1] Архив Юго-Западной России. СПб., 1868. Ч. 3. Т. 2. С. 148 — 156.

[2] Рогалеў А. Ф. Сцежкі ў даўніну. Мн., 1992. С. 64.

[3] Полное собраиие русских летописей. СПб., 1846. Т. 2. С. 36.

[1] Полное собрание русских летописей. СПб., 1846. Т. 2. С. 36.

арды стольным горадам валодаў яго сын Аляксандр Неўскі. Затым у Кіеве княжылі нашчадкі ўладзімірскіх князёў.

Частыя феадальныя войны і барацьба са знешнімі ворагамі вымусілі беларускія і ўкраінскія княствы пайсці ў 1360 г. на ваенна-эканамічны саюз з даволі моцнай тагачаснай дзяржавай — Вялікім княствам Літоўскім.

І. Ф. Ганжураў

У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай

У сярэдзіне XIII—XIV стст. усе землі Беларусі паступова ўвайшлі ў склад поліэтнічнай феадальнай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ), ядром якога была летапісная Літва, што займала тэрыторыю паміж Нёманам і Віліяй з цэнтрам у Навагрудку (з 1323 г.— Вільня) і заселеная славянскім (пераважна ў гарадах), балцкім і славянізаваным балта-славянскім насельніцтвам. Падчас княжання вялікага князя літоўскага Гедыміна (1316–1341) ВКЛ распаўсюдзіла сваю ўладу на ўсходнюю частку Беларусі, а пры Альгердзе і Вітаўце (1330–1430) у склад Вялікага княства Літоўскага ўвайшлі землі, размешчаныя па Дняпры і Сажы, у 1360-я гг.— землі басейна ніжняй Прыпяці (Мазырская і Брагінская воласці).

Шляхамі і спосабамі ўваходжання беларускіх зямель у ВКЛ з'яўляліся пераважна пагадненні з мясцовымі феадаламі, якія такім чынам імкнуліся забяспечыць абарону моцнай дзяржавай іх уладанняў ад знешніх і ўнутраных замахаў, стварэнне больш спрыяльных умоў для развіцця іх гаспадаркі, гандлю і інш.

Пасля заключэння Крэўскай дынастычнай уніі (1385) паміж Літвой і Польшчай на тэрыторыю Беларусі і Украіны пачалі пранікаць польскія феадалы, а з імі і каталіцтва, бо пры жаніцьбе з польскай каралевай Ядвігай вялікі князь літоўскі Ягайла (а з наступнага года і кароль Польшчы) абавязаўся акаталічыць усіх сваіх падданых, у тым ліку і беларускае насельніцтва. Літоўскія і мясцовыя феадалы, прыняўшы каталіцтва, пачалі актыўна насаджаць новую веру і, па прыкладу польскіх паноў, узмацняць прыгнёт народа.

У 1500 г., побач з іншымі падняпроўскімі мясцовасцямі, Брагінская воласць упамінаецца ва Устаўной грамаце польскага караля і вялікага князя літоўскага Сігізмунда I Старога, дадзенай намеснікам і іншым управіцелям каралеўскіх уладанняў аб віннасцях і памерах пабораў, што падлягалі спагнанню. Грамата, з якой быў накіраваны каралеўскі пісар, намеснік Пералайскі Богуш Багавіцінавіч, прадпісвала брагінцам і насельнікам іншых гарадоў Падняпроўя поўны збор нядоімкі «абы ни один грош дани нашое у вас не остал». З гэтага дакумента відаць, што побач з данінай у выглядзе шкур баброў і куніц, мёду насельніцтва абкладвалася і грашовымі пабораміі. У выпадку адсутнасці футра ці мёду грамата ўстанаўлівала памеры грашовай уплаты.

На пачатку XVI ст. (асабліва ў 1505 г.) адбыліся спусташальныя набегі крымскіх татар на ўкраінскія і беларускія землі. Найбольш цярпелі ад іх Палессе і Случчына. Не абмінула гэтая варожая навала і Брагіншчыну з Камарыншчынай.

Аб далейшым узмацненні прыгнёту, злоўжываннях зборшчыкаў падаткаў сведчыць каралеўская грамата ад 1511 г. У ёй, побач з іншымі валасцямі, адкуль часта прыходзілі скаргі ад падаткаплацельшчыкаў, упамінаецца і Брагін. «Польскі кароль і вялікі князь літоўскі Сігізмунд I даравў Брагіну грамату, якая забяспечвала правы жы-

хароў і давала ім усялякія льготы. Такія граматы забытым богам мястэчкам не даваліся»[1]. У ліку прывілеяў быў новы парадак уплаты падаткаў. У адпаведнасці з ім брагінцы атрымалі права рабіць плацяжы непасрэдна ў каралеўскую казну, а не мясцовым старостам ці дзяржаўцам, якія дапускалі злоўжыванні.

Падрабязнае апісанне брагінскіх мясцін утрымліваецца ў абмежавальным акце Брагінскага графства, складзеным 7 сакавіка 1512 г. Дакумент уяўляе сабой запіс у актавую кнігу Мазырскага гарадскога суда ад 2 жніўня 1776 г. Апісанне межаў Брагінскай воласці, якая раней належала каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму Сігізмунду I Старому, было зроблена па загаду караля і вялікага князя Сігізмунда II Аўгуста дзякам Іванам Кніцічавым. Гэтае апісанне цікавае тым, што дае прыблізнае ўяўленне аб тэрыторыі, якая на пачатку XVI ст. уваходзіла ў Брагінскую воласць. Паўднёвая мяжа яе праходзіла ад вусця ракі Брагінкі, па Дняпры «...до села брагинского Галэк», паўночная — па рацэ Пясчанка, заходняя — «Хвойничак (Хойнікі), Дроньки, Кожушки... брагинское село Листвин»[2].

Выгаднае размяшчэнне Брагіншчыны на водных шляхах (сярэднедняпроўская частка шляху «з варагаў у грэкі») садзейнічала яе прыкметнаму эканамічнаму і культурнаму развіццю. Па рэках Брагінка і Днепр вёўся сплаў лесу ў Чарнігаў, Кіеў, Екацярынаслаў, Крамянчуг, Херсон. Уніз і ўверх па гэтых транспартных артэрыях кіраваліся гандляры, асабліва з поўдня, у напрамку Смаленска, Ноўгарада, Полацка, прыбалтыйскіх гарадоў.

У 1534—1537 гг. адбылася чацвёртая па ліку вайна Маскоўскай дзяржавы з Вялікім княствам Літоўскім, у ходзе якой моцна пацярпела і наша мясцовасць. У прыватнасці, у 1535 г. адна з расійскіх армій на зваротным шляху ад Навагрудка спаліла Тураў, Мазыр і Брагін.

Пасля прыняцця ў 1557 г. польскім каралём і вялікім князем літоўскім Сігізмундам II Аўгустам «Уставы на валокі» на Беларусі ўводзілася фальваркавая сістэма гаспадаркі, што абумовіла канчатковы распад сялянскай абшчыны і яшчэ больш узмацніла прыгнёт сялян. Найбольш буйныя на Брагіншчыне фальваркі былі ў вёсках Астрагляды, Гарадзішча, Ёлча, Касачоў, Крукі, Рудакоў, Савічы і інш.

Паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы 1564—1566 гг. на тэрыторыі Гомельшчыны былі ўтвораны (1566) Мазырскі павет у Кіеўскім і Рэчыцкі павет у Мінскім ваяводствах. У 1569 г. у Мінскае ваяводства перададзены і Мазырскі павет.

З мэтай больш паспяховага процістаяння з Расіяй Вялікае княства Літоўскае ў 1569 г. падпісала Люблінскую унію з Польшчай аб стварэнні федэратыўнай дзяржавы — Рэчы Паспалітай. Пасля Лівонскай вайны (1558—1583) асобныя падняпроўскія землі перайшлі ва ўласнасць польска-літоўскіх феадалаў і каталіцкай царквы. У выніку мясцовае насельніцтва апынулася пад цяжкім трайным прыгнётам. Дзеля акаталічвання праваслаўнага беларускага люду ва ўладаннях паспалітага панства абнаўляліся існаваўшыя і ўзводзіліся новыя, пераважна драўляныя касцёлы. Так, у вёсцы Астрагляды быў абноўлены пабудаваны ў 1526 г. памешчыкам Харлінскім драўляны касцёл. Затым з'явіліся асобныя каталіцкія культавыя будынкі ў некаторых іншых месцах Брагіншчыны, уладальнікамі якіх з'яўляліся польскія феадалы. Аднак многія землі на поўдні Беларусі заставаліся ўласнасцю ўплывовых уладальнікаў суседняй Украіны. Так, у 1570—1580 гг. некаторыя абшары ўздоўж Прыпяці, у т. л. вёскі Баршчоўка, Ма-

[1] Рогалеў А. Ф. Сцежкі ў даўніну. Мн., 1992. С. 63.

[2] Дзяржаўны гістарычны архіў у г. Гродна. Ф. 1308. Воп. 1. Л. 1049—1050.

саны на Камарыншчыне, належалі кіеўскаму Міхайлаўскаму Залатаверхаму манастыру.

У 1574 г. Брагін з валасцямі і замкам быў падараваны каралём ва ўласнасць буйнейшым польскім магнатам Аляксандру і Міхаілу Вішнявецкім.

Напрыканцы XVI ст. гаспадаром брагінскага палаца быў Адам Вішнявецкі — спадчыннік украінскага і польскага магната Міхаіла Вішнявецкага. Амаль рускі па паходжанні, але падданы караля польскага, выхаванец віленскіх іезуітаў, аднак дбайны сын праваслаўнай царквы і чалавек набожны, Адам Вішнявецкі ўсё ж не быў прыхільнікам масквіцян.

Аб памерах тагачасных землеўладанняў Вішнявецкіх сведчыць пералік тытулаў князя Міхаіла з яго універсалу ад 17 чэрвеня 1737 г.: «Михаил Серванций Корибут Вишневецкий, князь Збаража и Вишневца, граф Дольска, Домбровицы, Брагина и Комарна, воевода виленский, юхольский, кирсненский, симиенский и метельский и т. д.»[1].

Аб тым, што атмасфера ў раёне межавання земляў Вішнявецкіх і Расійскай дзяржавы была далёкай ад добрасуседскай, сведчыць, у прыватнасці, дэпеша кіеўскага генерал-губернатара Генеральнай вайсковай канцылярыі ад 14 мая 1751 г. аб прыняцці мер супраць нападаў на ўладанні шляхты ў раёне Брагіна, Бабічаў і Багуслава. У ёй чытаем: «Сего дня 12 числа каковы присланы ко мне из разных мест с жалобами на российских подданых польские письма, а именно: 1) из Брагина от ротмистра Рокицкого... которые по переводе явились, что показанные в тех письмах многие предерзости и грабежи не от запорожских казаков, но от пограничных малороссиян»[2].

[1] Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильно, 1807. Т. 3. С. 220.

[2] Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны г. Кіеў. Ф. 59. Воп. 1, 1750—1751. Спр. 1972. Л. 3—4.

Рэшткі сцяны замка Вішнявецкіх у в. Гарадзішча

У немалой меры пачуццё панскай ганарлівасці і ўладарнасці праяўлялася ў князёў Вішнявецкіх не толькі ў тытулах. Першай праявай сваёй магнацкай годнасці дваюрадныя браты Адам і Канстанцін Вішнявецкія лічылі раскошныя жытлы, у грунтоўнасці якіх адчувалі сваю моц і непахіснасць.

У Брагіне, на месцы старога гарадзішча, дзе цяпер цэнтральная плошча, узвышаліся палац і іншыя пабудовы князя Адама Вішнявецкага. Гэта быў «...комплекс драўляных умацаванняў сярэдневяковага замка XV—XVII стст. Размяшчаўся на месцы дзядзінца старажытнага Брагіна. Пляцоўка памерам 90 × 70 м, умацавана валам вышынёй 5—6 м. Паводле інвентара 1574 г., на вале былі сцены-гародні з усходамі на бланкаванне, абарончая вежа з боку Брагінкі, 2-ярусная драўляная вежа-брама з вялікай святліцай наверсе. Злева ад уваходу ў лініі гародняў стаяла драўляная царква св. Тройцы «за всем нарядом, розным церковным золотом и серебром и книгами». На падворку былі падклецці, спіжарні, пограб і «светлицы в стене». Да замкавай брамы вёў мост на палях, апошняе звяно якога было «ўзводам», г. зн. падымалася да брамы на ланцугах»[1].

Новы двор князя Вішнявецкага

[1] Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 93.

Земляны вал каля былога замка Вішнявецкіх у в. Гарадзішча

размяшчаўся ў маляўнічай мясціне каля Брагінкі, у вёсцы Гарадзішча. Мяркуюць, што гарадзішчанскі замак быў пабудаваны ў стылі грамадзянскай архітэктуры перыяду барока. І суседні парк таксама меў характэрныя прыкметы барочнага паркабудаўніцтва[1].

З князямі Вішнявецкімі звязаны некалькі авантурных гісторый. Разам з іншымі польскімі феадаламі яны імкнуліся выкарыстаць розных самазванцаў і авантурыстаў дзеля ажыццяўлення сваіх драпежніцкіх планаў захопу і падпарадкавання рускіх земляў. У князёў Адама і Канстанціна на гэта былі асобыя прычыны. Яны тлумачыліся сур'ёзнымі неладамі з маскоўскім царом Барысам Гадуновым з-за спрэчных памежных гарадкоў па левабярэжжы Дняпра. Тыя зямельныя спрэчкі часам нават выклікалі ўзброеныя сутыкненні. У сувязі з гэтым становіцца зразумелым, чаму менавіта ад кіяскіх палацаў у Брагіне і Гарадзішчы пачаўся шлях на Маскву першага самазванца Ілжэдзмітрыя, які на самой справе з'яўляўся беглым чарняцом Чудавага манастыра Рыгорам (Юрыем) Атрэп'евым.

Выступіўшы ў якасці прадстаўніка апазіцыйна настроенага маскоўскага баярства і падтрыманы рэакцыйнымі каталіцкімі коламі Рэчы Паспалітай, Ілжэдзмітрый I у 1604 г. на чале атрадаў польскай, літоўскай і беларускай шляхты, запарожскіх і данскіх казакоў уварваўся ў межы Расіі. Затым, выкарыстаўшы антыфеадальныя выступленні сялян і казацтва, незадаволенасць баяр палітыкай цара Барыса Гадунова, у чэрвені 1605 г. захапіў Маскву і быў каранаваны на царства. Грабяжы польска-літоўскіх інтэрвентаў і ўзмацненне прыгнёту выклікалі ў маі 1606 г. народнае паўстанне, падчас якога самазванец быў забіты, а палякі ўцяклі.

Праз год пасля таго (1606) з Брагіна выйшаў яшчэ адзін польскі авантурыст — Аляксандр Юзаф Лісоўскі, у далейшым паплечнік чарговага самазванца Ілжэдзмітрыя II.

Лісоўскі быў адным з дзевяці сыноў небагатага літоўскага шляхціца. У 1595 г. ён паступіў салдатам у харугву Яна Патоцкага, старосты Камянецкага. Затым ён пераходзіць ужо ў чыне паручніка на службу ў польскую армію, якая змагалася ў Лівоніі са шведамі. Калі супраць польскага караля ўспыхнуў мяцеж, у ім прыняў удзел і Лісоўскі ў якасці ротмістра казацкай харугвы.

[1] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць. Мн., 1985. С. 22.

«Но уже в половине 1606 года мы его встречаем в Брагине на службе у князя Адама Вишневецкого; Лисовский, человек бывалый и офицер, занимал пост старшего слуги; он распоряжался остальною прислугою, заведовал княжескою казною, его лошадьми и арсеналом. Но доверия своего нового патрона Лисовский далеко не оправдал; зная, что за недалеким Московским рубежом происходит смута, обещавшая богатую поживу людям опытным в военном деле и неразборчивым в средствах, он решился перенести туда свою деятельность. Подговорив всех слуг, состоявших под его начальством, Лисовский с вооруженною толпою вломился ночью 27 июля в Брагинский замок. Князь Вишневецкий заперся в своей комнате и отсиделся в ней, но его казна была разбита, его деньги, драгоценности, гардероб, оружие расхищены грабителями, которые затем захватили в поле лошадей, принадлежавших Брагинским мещанам, и на них ускакали за Московский рубеж, где впоследствии приобрели печальную славу образцовых грабителей»[1].

Пасля гэтага імя ўладальнікаў брагінскага замка амаль не сустракаецца ў выяўленых пісьмовых крыніцах таго часу. Ёсць толькі ўпамінанне аб князёўне Вішнявецкай, якое засведчыў «Документ Христины Малинской, урожденной Княжны Вишневецкой, на отдачу Игуменье Олимпиаде Рогозиной и инокиням ея Спасского и Благовещенского Монастырей в Брагинском ключе» ад 24 лютага 1632 г.[2].

Насельніцтва Брагіншчы, карыстаючыся блізкасцю мяжы з Расіяй (па Дняпры), падтрымлівала з ёй цесныя сувязі. У выданні «Акты южной и западной России» за 1875 г. прыводзіцца пісьмо брагінскага старосты ад 12 мая 1669 г. чарнігаўскаму падкаморніку Лысенку са звесткамі аб мясцовых і польскіх справах: «Ведаю о том гораздо, что вашему царскому пресветлому величеству дали ведать боярин и воевода Киевский и наместник Смоленский Петр Васильевич Шереметев, что войска Ляцкие зде близко Днепра с Маховским в немалом собрании около Днепра стали; а сказывают 6000, того подлинно не ведаю; и те войска стали по над Днепром в Чернобыли, в Брагине, в Лоеве у пристаней Днепровых...»[1]

Уся другая палавіна XVII ст. з'явілася адным з найбольш цяжкіх перыядаў у гісторыі нашага краю. У выніку частых войнаў і сялянскіх паўстанняў былі спустошаны многія гарады і мястэчкі, у т. л. Брагін. Пасля другога моцнага разбурэння войскамі Рэчы Паспалітай, калі горад быў поўнасцю спалены, а матэрыяльныя і культурныя каштоўнасці зрабаваны і вывезены, ён перастаў выконваць ролю апорнага абарончага пункта на ўкраінска-расійскай мяжы і ператварыўся ў маёнткавую сядзібу яго ўладароў. Паступова Брагін страціў і значэнне даволі важнага раней звяна на гандлёвым шляху па Дняпры, а таксама па сушы — праз Мазыр, Хойнікі і далей на Лоеў, Любеч.

Адначасова з узмацненнем нацыянальнага і рэлігійнага прыгнёту пагоршыліся ўмовы для развіцця культуры карэннага насельніцтва. Беларуская мова ў дзяржаўных сферах яе ўжывання замянялася польскай. Закрываліся і без таго нешматлікія школы, знішчаліся кнігі, укладзеныя па-беларуску. Асвета станавілася манаполіяй каталіцкай і уніяцкай цэркваў.

У гэты ж перыяд Брагін і навакольныя мясцовасці перайшлі ад Вішнявецкіх ва ўласнасць буйнейшых па тым часе польскіх магнатаў Канецпольскіх. Так, у 1687 г. ён належаў ваяводзічу бэлзскаму — Яну Канецпольскаму. У склад Брагінскага маёнтка

1 Архив Юго-Западной России. СПб., 1863. Ч. 3. Т. 1. С. 149 — 151.

2 Сборник древних грамот и актов Минской губернии, православных монастырей, церквей... Мн., 1848. С. 24.

1 Акты, относящиеся к истории южной и западной России. (Дела Малороссийского приказа 1669 г.). СПб., 1875. Т. 8. Кн. 1. С. 175.

(ключа) уваходзілі тады 22 населеныя пункты: Бабчын, Спарыж (Спярыжжа), Нудзічы, Дублін, Галкі, Сувіды, Мікулічы, Веляцін, Гамолічы, Сялец, Малыйкі (Малейкі), Катловіца, Скураты, Мокіш, Еўлашы, Глухавічы, Губарэвічы, Сцежарна, Хатуча, Юркавічы, Юлча (Ёлча), Ліствін, а таксама хутары Маскі, Ілычы, Буркі, Крыўча, Дамброўскі, Варацец, Каноны, Чэхі, Забалацце, Ясяноў (Ясяні), Звінярскае, Бандары[1].

Напрыканцы XVII ст. у Брагінскую воласць уваходзіла і мястэчка Хойнікі з яго ваколіцамі, якія некалі «...принадлежали кн. Вишневецким, потом кн. Шуйским, а затем через брак по женской линии перешли к Прозорам»[2].

Да пачатку XVIII ст. адносіцца цікавы гістарычны факт: у апошнія дні чэрвеня 1706 г. у нашых мясцінах пабываў расійскі цар Пётр I. З невялікай флатыліяй рачных суднаў ён праследаваў па Дняпры ў Кіеў. У народзе бытуе легенда пра тое, нібыта ў гонар той падзеі на паштовым тракце Брагін — Лоеў быў пабудаваны памятны «царскі» (Пятроў) домік, а неўзабаве каля яго заснавана вёска, якая атрымала назву Петрыцкае.

На пачатку XVIII ст. Брагін зноў перайшоў да новых уладальнікаў. У 1715—1721 гг. мястэчка і частка воласці належалі падкаморыю дзерпцкаму Аляксандру Бандзінелі, другая палова воласці з рэзідэнцыяй у Губарэвічах — мазырскаму маршалку Антонію Аскерку, а потым — Сігізмунду Шукту. Гэтыя ўладальнікі часта варагавалі паміж сабой. «Так, Оскерко размежевал приходы по своему усмотрению и насильно заставил крестьян повиноваться его распоряжению; Шукта отнял Диаконовское поле, подаренное церкви св. Михаила князьями Вишневецкими, и приказал своим крестьянам гнать из него насильно священника; Бонджелли, задумав устроить итальянский сад у своего дома, приказал разорить кладбище, бывшее у церкви св. Николая, выбросить из него покойников и на месте бывшего кладбища разбил аллеи и цветочные гряды»[1].

У Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве ў Мінску захоўваецца інвентарны вопіс маёнтка Хойнікі ад 20 сакавіка 1721 г. (фонд 320), паводле якога да маёнтка адносіўся фальварак Астрагляды разам з вёскамі Астрагляды, Вязок, Плоскае, Варацец. Забягаючы наперад, скажам, што па інвентары 1884 г. да Хойніцкага вотчыннага маёнтка памешчыка В. К. Прозара адносіўся і фальварак Марытон з брагінскімі вёскамі Дуброўнае і Шчарбіны.

Сярэдзіна XVIII ст. была адзначана шырокім размахам сялянскага руху на мазырскім Палессі. Са зброяй у руках выступалі прыгонныя людзі ў вёсках каля Брагіна, Лоева, Нароўлі і ў іншых месцах. Гэтыя разрозненыя сялянскія хваляванні, вядома, не маглі змяніць цяжкага становішча збяднелага і бяспраўнага люду, але ўсё ж вымушалі мясцовых памешчыкаў хоць у нейкай меры лічыцца з настроямі прыгонных.

У другой палове XVIII ст. Брагін са значнай часткай воласці і вёска Мікулічы набылі ці атрымалі ў спадчыну графы Людвіг Міхайлавіч і Алозій (Алоіз) Міхайлавіч Ракіцкія. Яшчэ да пачатку іх уладарання тут (50-я гг. XVIII ст.) брагінскі маёнтак быў даволі буйным. Па даных «Словаря географического Королевства Польского» ў яго ўваходзілі 37 вёсак з 3319 душамі прыгонных мужчынскага полу.

Аб тым, што ва ўладаннях Ракіцкіх не абыходзілася без сялянскіх бунтаў, сведчыць пісьмо ротмістра графа Ракіцкага да рускіх уладаў у Кіеве і пісьмо кіеўскага генерал-губернатара на адрас Генеральнай вайсковай канцылярыі ад 14 мая 1751 г. аб прыняцці сілавых

[1] Архив Юго-Западной России. СПб., 1868. Ч. 3. Т. 2. С. 148 — 158.

[2] Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. СПб., 1905. Т. 9. С. 568.

[1] Архив Юго-Западной России. СПб., 1871. Ч. 1. Т. 4. С. 378, 401, 407.

захадаў супраць нападаў сялян на ўладанні шляхты ў раёне Брагіна. У ім генерал-губернатар, паведамляючы аб удзеле ў гэтых хваляваннях сялян памежных раёнаў Украіны, патрабаваў «...всепрележнейшей таковых вновь появившихся злодеев-разбойников поимки ... и искоренения».

І. Ф. Ганжураў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

УСТАЎНАЯ ГРАМАТА КАРАЛЯ НАМЕСНІКАМ І ІНШЫМ УПРАВІЦЕЛЯМ КАРАЛЕЎСКІХ ВАЛОДАННЯЎ АБ ВІДАХ І ПАМЕРАХ ПАБОРАЎ, ЯКІЯ НАЛЕЖЫЦЬ БРАЦЬ У ПАДНЯПРОЎСКІХ ПАВЕТАХ

1500 г., чэрвень

Намесником нашим и старцом и всим мужом Поднепровским и волостем нашим Свислоцким, Любошанским, Бобруйским обема половицам — Вилеиское половицы и Троцкое, Кричевским, Пропойским, Чечерским, Горвальским, Речицким, Брагинским, Мозырским, Бчицким.

Што есте дани нашое грошовое, бобров и куниц не отнесли до скарбу нашого и меду пресного не отвезли до ключов наших до Вилии, до Троков, а которые з вас хотя будуть и дань нашу до скарбу нашого грошовую и бобры и куницы отнесли. и мед пресный до ключов наших привезли не сполна. где ся што будеть у волостех наших остало и мы для всих тых дел послали там до вас, на волости наши, писара нашого намесника Перелайского Богуша Боговитиновича, и казали есмо ему тую дань нашу на вас сполна справити. грошовую и бобры, и куницы, и мед пресный, подлуг давного обычая: за рубль грошей по 2 копе грошей, а за бобра чорного по копе грошей, а за карого бобра по 40 грошей, а за куницу по 6 грошей, где не будеть — шерстью; а за встав меду пресного по 4 руб. грошей, а за колоду по 2 гроша. И вы бы все сполна из его доходом выдали конечно, по тому как перед тем бывало. А которые з вас будуть земли пустовские або люди голтяйные, осбо себе роскинули, на большого большей, как здавна бывало, абы ни один грош дани нашое у вас не остал. Такеж, которых промеж вас дела обидные будут кому о чем мы казали ему ж о том промежы вас досмотрети и справедливость тому вчинити.

Писан в Менску июнь... день, индикт 3 (1500).

Любавский М. К. Областное деление и местное самоуправление Литовско-Русского государства. М., 1892. Прил. XII–XIII.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Княскі род Вішнявецкіх

Вішнявецкія (Карыбут-Вішнявецкія), старадаўні княжацкі род; радаслоўная ад літоўскага князя Карыбута Альгердавіча. Іх продак Міхаіла Васілевіч Збаражскі (? — пасля 1516) валодаў замкам Вішнявец (на Валыні), адсюль і прозвішча. Вішнявецкім належалі вялізныя зямельныя абшары і маёнткі на Украіне і Беларусі, у тым ліку з 1509 г. Брагінская воласць.

Сярод Вішнявецкіх найбольш вядомыя прадстаўнікі старэйшай лініі (пайшла ад старосты прапойскага, чачэрскага і варнянскага князя Івана Міхайлавіча (? — 1542):

Змітро (Дзмітрый) Іванавіч (? — 1563), з 1551 г. староста чаркаскі. Адзін з кіраўнікоў барацьбы запарожскіх казакоў супраць туркаў, крымскіх татар і малдаўскіх гаспадароў, для гэтага на дняпроўскім востраве Малая Хорціца пабудаваў крэпасць (каля 1554—1555). Пад імем Байда стаў прататыпам героя народных песень. У знак пратэсту супраць загаду польскага караля Жыгімонта II Аўгуста спыніць напады на Крым і Турцыю ў 1557 г. перайшоў на службу да рускага цара Івана IV Грознага, які даў яму ў валоданне г. Бялёў. Двойчы ўдзельнічаў у паходах рускага войска ў Крым. У час Лівонскай вайны 1558—

1583 гг. вярнуўся ў Рэч Паспалітую. У 1563 г. запрошаны баярамі на малдаўскі трон, але яго атрад быў разбіты ў бітве з войскамі гаспадара Стэфана IX. Вішнявецкі трапіў у палон, у Канстанцінопалі (Стамбуле) пакараны смерцю.

Канстанцін Іванавіч (? – 1574), брат Дзмітрыя Іванавіча, староста жытомірскі. На Люблінскім сейме 1569 г., прымаючы прысягу на далучэнне Валыні да Польшчы, ад імя валынскіх магнатаў папярэдзіў Жыгімонта Аўгуста аб неабходнасці захаваць у ваяводстве праваслаўнае веравызнанне і ўкраінскую мову ў справаводстве.

Канстанцін Канстанцінавіч (1564–1641), ваявода бэлзскі (1636) і рускі (1638), староста чаркаскі (з 1623) і крамянецкі. У 1595 г. перайшоў у каталіцтва, пазнаёміў Ілжэдзмітрыя I са сваім сваяком Юрыем Мнішакам. З атрадам добраахвотнікаў з шляхты і вайсковых людзей удзельнічаў у паходзе Ілжэдзмітрыя I на Маскву (1604–1605). Пасля гібелі апошняга вярнуўся на Украіну, але неўзабаве з новым атрадам удзельнічаў у аблозе Троіца-Сергіева манастыра, у 1613–1618 гг. – у паходзе каралевіча Уладзіслава на Маскву. Калі ў 1631 г. згас род князёў Збаражскіх, атрымаў іх зямельныя ўладанні на Украіне.

Януш Антоні (1678–18.1.1741), староста пінскі, падчашы літоўскі (1697), маршалак надворны літоўскі (1699), кашталян віленскі (1702–1703), ваявода віленскі (1704), ваявода кракаўскі (1706), кашталян кракаўскі (1726). Удзельнічаў у барацьбе шляхты Літвы і Беларусі супраць засілля Сапегаў у Вялікім княстве Літоўскім.

Міхаіл Серванцы (13.5.1680 – 16.9.1744), брат Януша Антонія. Маршалак канфедэрацыі (1700), гетман польны літоўскі (1702–1703, 1707–1735), кашталян віленскі (1703–1706), ваявода віленскі (1706–1707, з 1735), канцлер вялікі літоўскі (з 1720), рэгіментар войска ВКЛ (1730), староста пінскі, ваўкавыскі, мярэцкі, вілкавіскі. У 1707 г. паводле пагаднення з каралём Станіславам Ляшчынскім адмовіўся ад булавы гетмана вялікага і пасады ваяводы віленскага, застаўшыся гетманам польным. У 1709 г. быў арыштаваны і вывезены ў Расію, у 1710 г. вярнуўся ў Рэч Паспалітую і эмігрыраваў. На радзіму вярнуўся ў 1716 г. Пісьменнік і паэт. Апошні мужчына ў старэйшай лініі роду і ў родзе. Пасля яго смерці ўладанні Вішнявецкіх перайшлі да Агінскіх і Замойскіх, потым да Плятэраў, Пшаздзецкіх, Бжастоўскіх і Вяльгорскіх.

Да другой лініі Вішнявецкіх належаць:

Адам Аляксандравіч (? – 1622), уладальнік маёнткаў на Беларусі і Украіне, актыўны прыхільнік праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай. У 1601–1603 гг. у яго маёнтку ў Брагіне знаходзіўся Ілжэдзмітрый I, які ўпершыню «прызнаўся» менавіта Адаму Аляксандравічу, што ён царэвіч Дзмітрый, сын Івана IV Грознага, цудам уратаваны ад смерці ва Углічы. Апошні прызнаў Ілжэдзмітрыя I царэвічам, падтрымаў яго і пазнаёміў з князем Канстанцінам Канстанцінавічам Вішнявецкім і іншымі магнатамі. Удзельнічаў у паходзе Ілжэдзмітрыя I на Маскву. У маі 1606 г. трапіў у палон і высланы ў Кастраму. У 1607 г. вярнуўся на радзіму. Разам з праваслаўным магнатам князем Раманам Кірыкавічам Ружынскім далучыўся да атрада ў некалькі тысяч коннікаў, які разам з Ілжэдзмітрыем II пайшоў на Маскву. Аднак Адам Аляксандравіч у хуткім часе вярнуўся.

Іерамія Міхал Міхайлавіч (1612–20.8.1651, украінскія казакі звалі яго Ярэма), пляменнік Адама Аляксандравіча. Буйны магнат на Украіне, ваявода рускі (1646), староста гадзяцкі, канеўскі, пшэмыскі. Першапачаткова праваслаўны, падчас вучобы ў езуіцкай школе ў Львове перайшоў у каталіцтва (1631), стаў гарачым прыхільнікам яго распаўсюджвання, але карыстаўся і польскай і ўкраінскай мовамі. Яго валоданні («панства», «дзяржава») на

Украіне складаліся з 56 гарадоў, мястэчак і вёсак (цэнтр г. Лубны) і займалі большую частку цяперашняй Палтаўскай вобласці. Меў таксама маёнткі і крэпасці на Валыні і Палессі, 12-тысячнае войска, прымаў замежных паслоў. Удзельнічаў у вайне Расіі з Рэччу Паспалітай 1632—1634 гг. Узначальваў групоўку магнатаў, якая выступала супраць цэнтралізацыі ўлады ў Рэчы Паспалітай, патрабаваў ад караля Рэчы Паспалітай рашучых дзеянняў па задушэнні антыфеадальнай вайны 1648—1651 гг., у выніку якой страціў большасць сваіх маёнткаў. На пачатку вызваленчай вайны на Украіне фактычна ўзначальваў процідзеянне паўстанцам-казакам і сялянам, вёў з імі жорсткую барацьбу. Памёр пасля перамогі над арміяй Б. Хмяльніцкага каля Берастэчка.

Міхал (31.7.1640—10.11.1673), сын Ераміі Міхала. Кароль Рэчы Паспалітай (1669—1673). Падчас яго кіравання дзяржавай узмацніліся феадальныя міжусобіцы (4 з 6 сеймаў сарваны шляхецкімі дэпутатамі паводле права «ліберум вета»), і толькі напад Турцыі вясной 1672 г. і захоп турэцкім войскам Камянца-Падольскага прадухілілі грамадзянскую вайну. Туркі вымусілі караля Рэчы Паспалітай заключыць ганебны Бучацкі мір 1672 г., паводле якога Падолія адыходзіла да Турцыі. Але сейм Рэчы Паспалітай не зацвердзіў мірнага дагавора, і вайна аднавілася. Па дарозе ў войска, якое збіралася каля Хоціна, памёр у Львове.

Паводле кн.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мн., 1994. Т. 2. С. 344.

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З ДАРАВАЛЬНАЙ ГРАМАТЫ КНЯЗЯ І КНЯГІНІ ВІШНЯВЕЦКІХ ЗАСНАВАНЫМ ІМІ ЦЭРКВАМ І МАНАСТЫРАМ З НАКАЗАМ НЯЎХІЛЬНАГА ЗАХАВАННЯ Ў ІХ ПРАВАСЛАЎНАГА АБРАДУ

Во имя Божие и к вечной памяти. Я, Адам Корибутович-Вишневецкий. А я, Александра Ходкевичевна Вишневецкая. Будучи, по милости Божией, при добром и полном уме, в хорошем и полном рассудке нашем, в обоюдном согласии свидетельствуя своим добровольным письмом себе и потомкам своим будущим, всем вообще и каждому в отдельности, кому то ведать надлежало, ибо мы хотели бы, чтобы слава милого Бога во веки веков укреплялась, тем больше расцветала и по всем концам света множилась и на этой низкой земле беспрестанно расширялась. Во славу, во имя его святаго заложивши, уфундушевали и построили в имении нашем Брагинском, в Сельце церковь святаго Спаса, которой, во славу Божию, еще придали моиастырь чернецкий мужской, лишь бы там уставная служба Божия велась и святая его слава не кончалась.

На монастырь наш церкви святаго Спаса, который в Сельце, заодно придали мы село наше, с давних времен к имению нашему Брагинскому принадлежавшее, со всеми доходами и имуществом, во все времена имевшимся, ничего из того ни себе не имея, ни потомкам своим не покидая. Кроме того, что на содержание того монастыря при службе Божьей чернецам, в нем сообща проживающим, даем еще сим листом мельницу щовбенскую с помольными сборами и рыбные ловы. Кроме ранее данной пашни церковной, сим листом нашим даем земли обробленной пашенной, одним концом в ширину начинающейся от става селецкого до дороги, ведущей из Сельца до Брагина, а в длину — от села до дороги городищенской, над прудом селецким. Кроме сенокосов, данных уже той церкви святаго Спаса, сим листом даем остров на реке Брагинке, прозываемый Бухоловиком. К тому же, для овощеводства дали тому монастырю церкви святаго Спаса огород подданных наших Михаленков.

А что касаемо пожертвований наших во славу Божию, то чтобы в церкви и монастыре порядок был и сим листом позволяем, чтобы всегда чернецы, вся братия, в нем проживающая, сами согласно избирали старшого прозбитера Архимандрита, человека доброго, верыгодного, в научении и во слове Божием уместного, который бы в вере своей крепко следовал против фальшивых сектантских проповедников святого письма и веры древней греческой, и учением своим людям правдивую веру показывал...

Если бы при церкви святаго Спаса, в монастыре Брагинском в Сельце, как между старшими, так и меньшими богомольцами-чернецами в какое время имело отступление от

издавна существующей христианской греческой веры, вопреки письму этому..., я, предупреждая того, могу и должен буду таковых карать, отлучая от церкви святаго Спаса, не терпя таковых в том монастыре нашем. Также не могут они таковых к себе принимать. А если бы по смерти нашей потомки наши, отступившие от веры христианской греческой, хотели службу Божию в той церкви и монастыре рушить и портить, тогда пусть на них падет клятва святых отцов и моя родительская... Но мы-то теперь, как при жизни, так и после смерти нашей, верим в силу и защиту перед господом Богом, а так же подаем и поручаем святому патриарху Константину польскому и иному, который в кои времена патриархом будет, то защищали бы церковь святаго Спаса и ее монастыря и стремились бы, чтобы уставная служба Божия в них во все времена не была порушена...

А еще мы, выше помененные особы, в той же местности Брагинской, неподалеку от того же монастыря в Сельце, построили еще монастырь женский и церковь Благовещения пресвятой Богородицы, который настоящим письмом нашим присоединяем к церкви святаго Спаса. И так же презбитер архимандрит и вся братия монастыря женского должны заботиться..., чтобы в той церкви служба Божия согласно уставу была, а дохода и имущества на содержание монастыря святаго Спаса со всех доходов, от нас наданных всей братии, во всем третья часть должна быть.

Прося господа Бога за нас и моля о его милости, дали мы наш лист с нашими печатями и подписом руки нашей. Писано в Брагине ... года 1609 месяца июня 29 дня.

Собрание древних грамот и актов Минской губернии, православных монастырей, церквей... 1848. С. 24.

Выявіў і падрыхтаваў да друку *І. Ф. Ганжураў*

Тут Ілжэдзмітрый баляваў...

З князямі Вішнявецкімі, з палацам аднаго з іх — Канстанціна — у Гарадзішчы звязана авантурная гісторыя, што дайшла да нас у рамантычным паданні. У прыватнасці, у народнай памяці захавалася легенда пра тое, што ў парку, каля так званага Каменя кахання сустракаліся Дзмітрый Самазванец з Марынай Мнішак, сястрой Канстанцінавай жонкі — Грызелі, дачкой сандамірскага ваяводы Ежы Мнішака. Таго самага ініцыятара польскай інтэрвенцыі ў Расію, пасля якой польскі кароль Сігізмунд III Ваза прызнаў Ілжэдзмітрыя I рускім царом. Марына была езуіткай, сапраўднай авантурысткай. Каталіцкае святарства ўхваліла яе шлюб са Ілжэдзмітрыем I. Яно тым самым

«Камень кахання» ў тэльманаўскім парку

мела на мэце захоп Расіі і акаталічванне праваслаўнай царквы.

Сустрэча і знаёмства Марыны з Ілжэдзмітрыем I адбыліся ў палацы князя Канстанціна ў Гарадзішчы. Альтанка каля замкавага вала, дзе быццам сустракаліся гэтыя маладыя прайдзісветы, захоўвалася да 1917 года. Каля яе ж знаходзіўся і Камень кахання. У далейшым ён быў перамешчаны ў цэнтр парку, дзе знаходзіцца і цяпер.

Сярод мясцовых жыхароў бытавала павер'е: калі ўступаючыя ў шлюб маладыя людзі пасядзяць на гэтым камені, то будуць моцна кахаць адзін аднаго. І асабліва калі абмяняюцца кавалачкамі каменя. Нядзіўна, што за час свайго існавання камень-валун значна зменшыўся ў аб'ёме.

З даўніх часоў дайшоў да нас верш невядомага аўтара пра тагачасныя гарадзішчанскія падзеі:

В Городище есть преданье:
У реки, где панский сад,
Были встречи и свиданья
Много лет тому назад.
Там в чаду минувшей славы,
В темной зелени ветвей,
В тихом сумраке дубравы
Пел Марине соловей.
Там, насмешкой тешась рока,
Смелый юноша мечтал.
Он невесте черноокой
О любви своей шептал.
Там, среди полесских топей,
Вишневецкий пан-магнат
Стан разбил свой из холопей,
Из шляхетства и солдат.
Вижу я сквозь даль немую:
В замке князя блеск палат.
Вижу Мнишек молодую,
Слышу в честь ее: «Виват!»
Время смуты и крамолы
Пронеслось, как тяжкий миг,
Лихолетья сон тяжелый
На Руси великой стих.
Нет ни замка у Брагинки,
Где Лжедмитрий пировал,
Ни безбожницы Маринки,—
Лишь один остался вал.
Дышит тайной он холодной
И молчит, не говоря,
Что здесь выходец безродный
Звался именем царя.
В Городище есть преданье:
У реки, где панский сад,
Были встречи и свиданья
Много лет тому назад.

У 1608 годзе з'явіўся чарговы палітычны авантурыст, які выдаў сябе за сына Івана IV — Дзмітрыя. Стаўленік агрэсіўных колаў Рэчы Паспалітай, Ілжэдзмітрый II узначаліў адкрытую інтэрвенцыю супраць Расіі і дайшоў са сваімі войскамі да падмаскоўнага сяла Тушына. Марына Мнішак паспяшалася прызнаць другога самазванца сваім мужам, які нібыта два гады таму цудам уратаваўся ў Маскве. У 1610 годзе Ілжэдзмітрый II быў забіты ў Калузе, а Марына разам з казацкім атаманам Заруцкім уцякла на Урал, да яіцкіх казакоў, спадзеючыся атрымаць у іх падтрымку. Аднак казакі схапілі яе, і авантурыстка была пасаджана ў турму. Там яна і памерла ў 1614 годзе.

І. Ф. Ганжураў

Брагін у антыфеадальнай вайне 1648—1654 гг.

Напрыканцы XVI ст. адбыўся шэраг казацкіх выступленняў і паўстанняў на Украіне, накіраваных супраць польска-шляхецкага прыгнёту. Найбольш буйное з іх, у паласу актыўных баявых дзеянняў якога ў 1594—1596 гг. трапіла і Беларусь, з'явілася паўстанне пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі. У ім прымалі ўдзел мясцовыя сяляне, мяшчане і дробная шляхта.

Новаму магутнаму ўздыму антыфеадальнага руху на Украіне і Беларусі, ператварэнню яго ў сапраўдную антыфеадальную нацыянальна-вызваленчую вайну садзейнічала паўстанне пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. Яно сустрэла гарачую падтрымку з боку народных мас нашага краю — напачатку на поўдні, а затым — паўсюдна, дзе вялі баявыя дзеянні паўстанцы. Нягледзячы на вялікую сілу, грозны і жорсткі нораў свайго ўладара Іерамія Вішнявецкага, брагінцы, «...подобно населению всего поречья Припяти, дружно примкнули в 1648 г. к казацко-

му движению Хмельницкого, несколько десятков шляхтичей было перебито в Брагине, и жители местечка и окруж. местности составили казацкий полк под начальством Макеры, в котором числилось 6000 казаков»[1].

Для аказання дапамогі беларусам у іх барацьбе за вызваленне ад польскіх феадалаў і каталіцкай царквы, недапушчэння пагрозы Кіеву ў канцы мая 1648 г. гетман Украіны накіраваў на поўдзень Беларусі казацкія загоны (атрады) пад кіраўніцтвам палкоўніка Галавацкага. Ад Турава, Мазыра, Брагіна, які «В 1648 г., во время казацких войн, ... добровольно отворил свои ворота перед вождями Хмельницкого Небабой, Напаличем и Хвеськом»[2], гэтыя атрады разам з мясцовымі сялянамі, што далучыліся да іх, пайшлі ўглыб Беларусі. Да канца лета 1648 г. на яе поўдні ўжо дзейнічалі загоны на чале з Марцінам Нябабай, Сцяпанам Падбайлам, Філонам Гаркушам і іншымі казацкімі палкоўнікамі і сотнікамі. Паўстанцы руйнавалі магнацкія і шляхецкія маёнткі, грамілі касцёлы і манастыры, у т. л. каля Брагіна, Лоева, Гомеля, знішчалі дакументы на феадальныя павіннасці. Летам 1648 г. Галавацкі разграміў польскае войска ў раёне Брагіна.

Польскія феадалы не хацелі мірыцца са стратай у выніку вайны сваіх маёнткаў. У студзені 1649 г. яны рушылі на Беларусь вялікае войска на чале з гетманам літоўскім Янушам Радзівілам. Былі ўзяты штурмам і разбураны Мазыр, Бабруйск, Рэчыца, Брагін. Радзівіл рыхтаваўся нанесці ўдар у тыл украінскаму казацкаму войску. Таму Б. Хмяльніцкі вясной 1649 г. накіраваў на Беларусь загон запарожскіх казакоў палкоўніка Галоты. Сялянскі рух супраць польскіх і літоўскіх феадалаў на поўдні Беларусі, у т. л. на Брагіншчыне, разгарнуўся з новай сілай. Дзесяцітысячны казацка-сялянскі атрад Ілыі Галоты разбіў праціўніка на левабярэжжы Прыпяці. Аднак затым шляхецкае войска Віцэнта Ганеўскага, узмоцненае нямецкімі наёмнікамі, адцясніла разрозненыя групы атрада Галоты да непраходных балот у раёне вёскі Загалле (каля Хойнікаў) і разграміла іх. Казацкі атаман Хвясько трапіў у рукі палякаў. Аб гэтым паведамлялася ў пісьме ад 28 красавіка 1649 г. невядомай асобы, якая знаходзілася ў польскіх войсках: «В Речицу привезен Фесько, сотник брагинский, который на допросе показал, что в Великую субботу полковник Небаба вступил в Гомель с 2500 казаков, что у него наиболее опытной пехоты, у полковника Макеры до 6000 чел. в Лазове и Брагине...»[1]

Летам 1649 г. на Беларусь зноў прыйшлі ўкраінскія казацкія атрады на чале з Ф. Гаркушам, С. Падбайлам, М. Крычэўскім і інш. Да іх зноў паўсюдна далучаліся беларускія сяляне. Магчыма, баявыя дзеянні мелі б для паўстанцаў нядрэнную перспектыву, але пад націскам крымскага хана Іслам-Гірэя III і польскага караля Яна II Казіміра Б. Хмяльніцкаму быў навязаны Зборaўскі мірны дагавор (жнівень 1699 г.), паводле якога Украіна, паўднёвыя раёны Беларусі, у тым ліку Брагіншчына і Камарыншчына, заставаліся пад уладай Рэчы Паспалітай. Аднак барацьба супраць польскіх феадалаў не спынялася. Адбыліся сялянскія паўстанні ў раёне Гомеля, Горваля, Брагіна, жорстка задушаныя летам 1651 г. пасля аднаўлення баявых дзеянняў з боку Рэчы Паспалітай. Войскі Б. Хмяльніцкага пацярпелі паражэнне пад Берасцечкам. У адпаведнасці з Белацаркоўскім пагадненнем (18 верасня 1651 г.) казацкія атрады былі выведзены з Беларусі. Пакінутыя без моцнай падтрымкі і дапамогі паў-

[1] Nichaloski. Xiega pamiatnicza. С. 509. Памятники Киевской археографической комиссии. 1848. Т. 1. Ч. 3. С. 383.

[2] Россия. Полное географическое описание нашего Отечества. СПб., 1905. Т. 9. С. 568–569.

[1] Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов. Мн., 1979. Т. 2. С. 38.

стаўшыя беларускія сяляне і гарадскія нізы былі задушаны добра ўзброеным і шматлікім шляхецкім апалчэннем і войскамі наёмнікаў. Восенню 1651 г. на Беларусі былі задушаны апошнія паўстанцкія выступленні.

Уз'яднанне Украіны з Расіяй, уступленне апошняй у вайну з Польшчай за свае страчаныя тэрыторыі і за Беларусь прывяло да новага ажыўлення нацыянальна-вызваленчага руху беларускага народа. На дапамогу рускім войскам, якія дзейнічалі на Беларусі, Б. Хмяльніцкі накіраваў у маі 1654 г. 20 тысяч казакоў пад агульным камандаваннем гетмана Івана Залатарэнкі. Паўднёвыя раёны Беларусі, Гомель зноў былі вызвалены ад ворага.

І ўсё ж гераічная барацьба ўкраінскага і беларускага народаў не прывяла да канчатковага вызвалення нашага краю з-пад прыгнёту феадальна-каталіцкай Рэчы Паспалітай. Па заключаным у Андрусаве ў 1667 г. расійска-польскім перамір'і, амаль уся тэрыторыя Беларусі, а таксама правабярэжная Украіна засталіся пад уладай Польшчы.

І. Ф. Ганжураў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З УНІВЕРСАЛА КН. МІХ. ВІШНЯВЕЦКАГА СІНАГОГАМ І КАГАЛАМ БЕЛАРУСІ АБ ПРАЗМЕРНЫМ АБКЛАДАННІ ІМІ ЯЎРЭЙСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ПРЫКАГАЛКАЎ ПАГАЛОЎНЫМ ПАДАТКАМ

1737 г. июня 17

Михаил Сервацій Корибут Вишневецкий, князь Збаража и Вишневца, граф Дольска, Домбровицы, Брагина и Комарна, воевода виленский, великий гетман Вел. кн. Лит., староста глинянский, юхольскнй, вилковышский, вилькишский, кирсненский, симненский и метельский и т. д.

Довожу до сведения всех синагог и кагалов Белоруссии, находящихся в Вел. кн. Лит., следующее:

Как мне сообщают излагающие свои обиды жители этого Белорусского края, они несут несправедливые тяготы при обложении кагалами прикагалков поголовной податью, установленной постановлением сейма 1717 г., которая раскладывается таким образом, что некоторые из прикагалков не в состоянии ее выполнить...

Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Вильно, 1807. Т. 3. С. 220.

З ПРАМЕНАРЫІ КІЕЎСКАГА ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТАРА ГЕНЕРАЛЬНАЙ ВАЙСКОВАЙ КАНЦЫЛЯРЫІ АБ ПРЫНЯЦЦІ МЕР СУПРАЦЬ НАПАДАЎ НА ЎЛАДАННІ ШЛЯХТЫ, ЯКІЯ АДБЫВАЮЦЦА Ў РАЁНЕ БРАГІНА, БАБІЧАЎ І БАГУСЛАЎЛЯ

1751 г. мая 14

Сего дня 12 числа каковы присланы ко мне из разных мест с жалобами на российских подданых польские письма, а именно: 1) из Брагина от ротмистра Рокицкого... которые по переводе явились, что показанные в тех письмах многие предерзости и грабежи произошли не от запорожских казаков, но от пограничных малороссиян...

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны г. Кіеў. Ф. 59. Воп. 1. 1750–1751. Спр. 1972. Л. 3–4.

З ПІСЬМА НЕВЯДОМАГА, ЯКІ ЗНАХОДЗІЎСЯ Ў ПОЛЬСКІХ ВОЙСКАХ

Пераклад з польскай

1649 г., красавіка 28

По краткости времени не пишу вам о наших нуждах; расскажу только, что случилось. Полк е. м. пана гетмана стоит в Речице (куда и отправлен был от своего товарищества по- советоваться о нашем горе, о том, что мы служим, а платы не получаем). В Речицу приве- ден Фесько, сотник Брагинский, который на допросе показал, что в великую субботу пол- ковник Небаба вступил в Гомель с 2500 казаков, что у него наиболее опытной пехоты: у полковника Макеры до 6000 чел., в Лазове и Брагине. В Говнице Напальщиц имеет до 6000 чел. и с ним шляхтич Горностай сотник. Вышеупомянутый сотник с 80 чел. пришел было к Гельману, где был поставлен для защиты ловчий стародубский Соколовский с от- рядом из 150 чел. Неприятель хотел напасть ночью, но прежде сам сотник пошел против отряда, отправленного из Речицы для разъездов. Сотника взяли, однако ж с трудом, а другие не дали взять себя и сгорели вместе с избою. Вышеупомянутый сотник оставил бы- ло своих людей на острове, но принужден был объявить о них, и туда послали 200 чел. немецкой пехоты, которая перестреляла казаков. Тот же сотник говорил, что хотя Хмель- ницкий и хотел бы помириться, но не может, ибо чернь так разъярена, что решилась или уничтожить шляхту, или погибнуть; тем временем из полка Речицкого погибло до 100 чел. Мы уже удостоверились, что мужики, уходя, разными способами ловят наших, от чего множество поселян гибнет в лесах и пр.

Памятники, изданные Киевской временной комиссией для разбора древних актов. Т. 1. Изд. 2. Отдел 3. Материалы для истории Малороссии. 1848. С. 390—392.

ЗАПІСКА КІЕЎСКАГА ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТАРА ГЕНЕРАЛЬНАЙ ВАЙСКОВАЙ КАНЦЫЛЯРЫІ АБ ПРЫНЯЦЦІ МЕР СУПРАЦЬ НАПАДУ НА ВАЛОДАННІ ШЛЯХТЫ, ЯКІЯ МАЮЦЬ МЕСЦА Ў РАЁНЕ БРАГІНА, БАБІЧАЎ І БАГУСЛАЎЛЯ

1751 г., мая 14

...Сего мая 12 числа каковы присланы ко мне из разных мест с жалобами на российских подданных польские письма, а имянно: 1). из Брагина от ротмистра Рокицкого, 2). из Бабич от Богуслава Оскерки, которые по переводе явились, что показанные в тех письмах многие предерзости и грабежи произошли не от запорожских казаков, но от пограничных малороссиян; и того ради с оных переводов точные копии в Генеральную войсковую кон- целярию при сем сообщены. И о том Генеральной войсковой концелярии да благоволит быть известно и о искоренении, и о поимке таковых злодеев куда надлежит строгими указами предложит, как о том вся императорского величества указаны повелевают и что учи- нено будет, о том меня уведомят, а о всеприлежнейшей таковых вновь появившихся зло- деев разбойников поимке и предостерегании и искоренении кои обретающимся вверху и внизу р. Днепра на форпостах штап и обер-офицером найкрепчайшим образом и с Киев- ской генерал-губернамесской концелярии указами подтверждено в Киево-Печерском Мая 14 дня 1751 г.

Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны г. Кіеў. Ф. 59. Воп. 1, 1750—1751. Спр. 1972. Л. 3—4 зв.

Друкуецца па кн.: Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 398.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

У складзе Расійскай імперыі

У выніку вострых палітычных ін- трыг і барацьбы паміж магнатамі і шля- хецкай знаццю да канца XVIII ст. у Рэчы Паспалітай узнік цяжкі эканамічны і палітычны крызіс. Аслабленне Вялікага княства Літоўскага і Польшчы выкарысталі Расія, Прусія і Аўстрыя, якія ў тры этапы падзялілі паміж сабой

Рэч Паспалітую. Так, да Расіі ў 1772 г. адышла ўсходняя частка Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства (з Рагачовам, Чачэрскам, Гомелем), у 1793 г.— астатняя тэрыторыя Гомельшчыны. У 1777 г. Брагін, а ў наступным, 1778 г.— Камарын атрымалі статус мястэчкаў.

У адпаведнасці з праведзенай у 1796 г. губернскай рэформай на далучаных беларускіх землях уводзіўся павятовы падзел. Паводле яго, Беліцкі (з 1852 г. Гомельскі) і Рагачоўскі паветы ўвайшлі ў Магілёўскую, Мазырскі і Рэчыцкі (у яго складзе і Брагіншчына з Камарыншчынай) — у Мінскую губерню. На тэрыторыі сучаснай Брагіншчыны затым былі ўтвораны Брагінская, Мікуліцкая, Савіцкая і Ялчанская воласці.

Уз'яднанне з Расіяй у адзіную цэнтралізаваную дзяржаву мела важнае значэнне для палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі. У складзе дзяржавы з моцнай вярхоўнай уладай забяспечвалася палітычная стабільнасць. У мясцовых уладаннях забаранялася мець войскі і крэпасці, перасталі адбывацца ўзброеныя канфлікты паміж феадаламі. Уключаныя ў агульнарасійскую гаспадарку беларускія землі пашырылі рынак збыту прадукцыі земляробства. Гэта, у сваю чаргу, спрыяла больш хуткаму распаду феадальна-прыгонных адносін, развіццю мануфактур, рамёстваў, гандлю. Дастаткова сказаць, што тады ў Брагіне, Камарыне, буйнейшых вёсках узніклі і развіваліся розныя прамысловыя прадпрыемствы. У канцы XVIII ст. працавалі перагонныя заводы па вырабе спірту-сырцу (Брагін, Крыўча, Глухавічы, Двор-Савічы, Ёлча, Людзвіноў, Верхнія Жары), крухмальна-патачныя заводы (Малейкі, Калыбань, Кавака), ваўначоскі (Кавака, Старая Ёлча, Сувіды), крупадзёркі і алейніцы (Брагін, Кавака, Ілычы, Камарын, Крукі, Чыкалавічы, Крыўча, Хракавічы), цагельні (Брагін, Гарадзішча, Грушнае, Ясяні, Ёлча, Камарын), смалакурні ў Рудні Жураўлёвай, гарбарні ў Брагіне і Камарыне.

На род працоўна-гаспадарчых заняткаў насельніцтва нашай мясцовасці аказвала ўплыў яе прыродна-геаграфічнае размяшчэнне. Пераважна гэта былі галіны сельскагаспадарчай вытворчасці — земляробства і жывёлагадоўля. Рамёствы таксама мелі непасрэдную сувязь з гэтымі галінамі. Асноўная частка насельніцтва з'яўлялася прыгоннымі сялянамі. Яны карысталіся зямельнымі надзеламі, за якія плацілі аброк ці адбывалі працоўныя павінасці. Але асноўнымі землеўладальнікамі былі напачатку магнаты Вішнявецкія, а ў далейшым — мясцовыя памешчыкі. Імкнучыся ўзняць рэнтабельнасць сваіх маёнткаў, яны прыстасоўвалі іх гаспадарку да патрэб рынку, асвойвалі новыя вытворчасці. Так, на пачатку 1800 г. па Рэчыцкім павеце ў друкаваных крыніцах упамінаюцца два паташныя заводы ў вёсках Петрыцкае і Амелькаўшчына, жалезная рудня ў вёсцы Пясчанка, якія належалі графам Л. і А. Ракіцкім. Аўтары апісання зазначаюць, што «...во всех выше описаных заводах и руднях выделанные вещи употребляются для домашнего обихода, частью и на продажу, на коих производят работу мастеровые посторонние по договоренным ценам и крестьяне сих помещиков»[1].

Асновай местачковай эканомікі быў гандаль і, як ужо зазначалася, развіццё саматужных промыслаў. Самыя буйныя гандлёвыя здзелкі рабіліся на кірмашах у Брагіне, Камарыне, Савічах і інш. Галоўным прадметам гандлю былі жывёла, разнастайныя харчовыя прадукты і тавары, вырабы саматужнікаў, мыла, мёд, воск, фаянсавы, шкляны і гліняны посуд, жалеза, фарбы і г. д. «В статьях привоза единственную крупную цифру составляет соль, ценность которой простирается до 65,8 % всего привоза»[2].

[1] Топографическое описание Минской губернии о количестве городов, сел, монастырей, церквей, дорог, почтовых станций и промышленных предприятий. Мн., 1800.

[2] Труды Минской статистической комиссии. М., 1870. Вып. 1. С. 415–416.

Тлумачылася гэта тым, што значная колькасць солі выкарыстоўвалася ў якасці кансерванту для хатняга саленія, захоўвання насельніцтвам скур забітых жывёлін, а таксама на гарбарных прадпрыемствах у Брагіне і Камарыне.

Большая частка тавараў і прадуктаў немясцовага паходжання прывозілася з Кіева, Чарнігава, Гомеля, Мазыра, Рэчыцы, нават з прыбалтыйскіх гарадоў. Збываючы вінагарэлачныя вырабы (дарэчы, яны з'яўляліся другім па значнасці, пасля лесу і вырабаў з драўніны, таварам, у ліку тых, што вывозіліся з Рэчыцкага павета), жывёлу і прадукты жывёлагадоўлі, збожжа, лён, мёд і г. д., мясцовыя жыхары атрымлівалі грошы для набыцця суконных, баваўняных тканін, абутку, цукру і інш. У працэсе гандлю частка тавараў рэалізоўвалася і набывалася шляхам простага рынкавага абмену.

Мелі пэўны прыбытак ад кірмашоў, гандлёвых дзён і мясцовыя мяшчане, асабліва яўрэі, якія здавалі ў часовае карыстанне заезным гандлярам жыллё, свірны, скляпы, іншыя памяшканні для захоўвання тавараў, утрымання гужавога транспарту, прадастаўлялі для яго фураж і інш.

У «Ведомостях о ярмарках Минской губернии» за 1828 г. паведамляецца, што ў Брагіне двойчы на працягу года — з 1 студзеня і 29 чэрвеня (па старым стылі) праводзіліся трох-, чатырохдзённыя кірмашы і адзін гандлёвы дзень у тыдзень. На кірмашы ў Брагін «...привозятся товары и изделия купщиками, промышленниками и жителями окрестности с других и местных уездов и ближайших городов...»[1]. Агульная сума рэалізаваных на кірмашах тавараў дасягала чатырох тысяч рублёў. На кірмашы ў Брагін, адзначаюць аўтары апісання, з'язджалася каля 500 чалавек.

Пасля далучэння беларускіх земляў да Расіі царскі ўрад пакінуў іх усё тым жа польскім памешчыкам, якія панавалі раней. У разрад дзяржаўных былі аднесены інвентарызацыйнымі камісіямі толькі землі найбольш буйных землеўладальнікаў. Панскі прыгнёт захаваўся. Толькі цяпер на шыю сялян, у дадатак да ранейшых прыгнятальнікаў, селі яшчэ і рускія памешчыкі, якія атрымалі ад цара рэквізаваныя землі ў якасці дару за верную службу або набылі маёнткі ў ранейшых гаспадароў польскага паходжання.

У той жа час на дзяржаўным узроўні ажыццяўлялася палітыка абмежавання ўплыву польска-літоўскіх феадалаў і каталіцтва на эканамічнае, грамадска-палітычнае і рэлігійнае жыццё на далучаных да Расіі тэрыторыях. Аб гэтым, напрыклад, сведчыць імператарскі ўказ ад 10 снежня 1865 г.: «Государь император... высочайше повелеть сонзволил: впредь до окончательного устройства Западного края, посредством достаточного усиления в оном числа русских землевладельцев, воспретить лицам польского происхождения вновь приобретать помещичьи имения в девяти западных губерниях...»[1]

У час прыгону памешчыкі імкнуліся расшырыць свае ўладанні за кошт сялянскіх надзелаў. Напрыклад, калі ў 1809 г. у графа Юдзіцкага (в. Хракавічы, Чамярысы, Просмычы і інш.) было 360 дзесяцін ворнай зямлі, то праз два дзесяцігоддзі — ужо 789 дзесяцін. На Брагіншчыне на пачатак XX ст. было 27 памешчыцкіх маёнткаў і фальваркаў. Памешчыкі Бубнавы, Ваньковічы, Гардзялкоўскія, Зямлянскія, Кербедзі, Любамірскія, Новікавы, Патоны, Рыбінкавы, Рындзіны, Селюковы і іншыя валодалі трыма чвэрцямі ўсёй ворнай зямлі Брагіншчыны. Лясы, сенакосы, паша, заводы, млыны, алейніцы і інш. — усё гэта таксама належала ім.

[1] Ведомости канцелярии Минского генерал-губернатора о ярмарках в Минской губернии. Мн., 1837.

[1] Календарь Северо-Западного края на 1890 г. Мн., 1890. С. 5.

У шэрагу маёнткаў (у сувязі з разпіццём рынку) памешчыкі павялічвалі пасяўныя плошчы, уводзілі паншчыну. Узмацненне эксплуатацыі выклікала сялянскія хваляванні ў радзе вёсак Брагіншчыны. Так, у 1808 г. адбыліся выступленні прыгонных памешчыка Юдзіцкага. Тады сяляне-бабылі вёсак Чамярысы і Просмычы адмаўляліся ад апрацоўкі панскай зямлі, бо гэтага раней яны не рабілі, а давалі толькі «чинш и платили ссыпку хлебную и сверх того употреблялись на нужные по делам посылки».

Падаўленнем гэтых сялянскіх выступленняў па даручэнні 3-га жандарскага аддзялення міністэрства ўнутраных спраў займаўся мінскі генерал-губернатар Рэдзінг. У сваім адказе на прадпісанне міністэрства ад 5 ліпеня 1808 г. губернатар паведамляў, што «...главные возмутители к сему преданы законному осуждению, и хотя все прочие тех же имений крестьяне упорствуют быть в полном повиновении владельцев своих, однако оные приводятся к сему пособием воинских команд и все предпринявшие прежде всего намерения к побегам удержаны в прежних жилищах»[1].

У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ёсць цікавыя звесткі, якія датычаць Мікуліцкай воласці перыяду першай паловы XIX ст. У прыватнасці, з інвентарнага вопісу маёнтка Рудакоў ад 1 лістапада 1844 г. вядома, што ён належаў Уладзіславу Аскерку і разам з вёскай Рудыя (13 сем'яў) адносіўся да Мікуліцкай воласці. Усяго ў маёнтку было 7157 дзесяцін зямлі, 492 мужчыны і 466 жанчын. Гэты дакумент складзены на валоданне маёнткам нашчадкамі памешчыка, у ліку якіх быў і 14-гадовы сын Аляксандр, ураджэнец вёскі Рудакоў.

Цікавы лёс гэтага неардынарнага чалавека. У 1853–1857 гг. ён знаходзіўся на вайсковай службе. Затым у якасці члена Мінскага губернскага камітэта па ўладкаванні побыту сялян удзельнічаў у распрацоўцы ўмоў сялянскай рэформы 1861 г., у рабоце рэдакцыйнай камісіі ў Пецярбургу, выступаў у друку па пытаннях земскага крэдыту. Аляксандр Уладзіслававіч з'яўляўся адным з кіраўнікоў партыі «белых» сялянскага паўстання 1863–1864 гг. на Беларусі і ў Літве. У чэрвені 1863 г. арыштаваны і сасланы на катаргу ў Сібір. Пасля ссылкі жыў у Варшаве. Памёр у 1911 г. у вёсцы Візы-Лаўчынскія (цяпер Браслаўскі раён Віцебскай вобласці).

У 1861 г. уладальнікам брагінскага маёнтка Касачоў быў граф Міхаіл Ракіцкі. За жорсткасць у адносінах да сялян яго называлі Шалёным. Маёнтак з'яўляўся галоўнай рэзідэнцыяй памешчыка, які жыў у раскошы, нават звыш сваіх прыбыткаў. На сваім двары Ракіцкія ўтрымлівалі вялікую дворню з прыгонных брагінцоў і жыхароў навакольных вёсак. Рукамі гэтых бяспраўных людзей у касачоўскім парку былі выкапаны прыгожыя сажалкі, у якіх гаспадары разводзілі звычайную і некаторыя віды экзатычнай рыбы — вугра, сіга і інш.

Наёмныя сяляне з мястэчка Брагін жылі на маленькіх кавалачках зямлі, плацілі чынш, адбывалі паншчыну. Найбольш заможныя сяляне наймалі іншых працаваць за сябе, а самі займаліся рознымі рамёствамі. Так адбывалася дыферэнцыяцыя сялянства: з яго асяроддзя, праз эксплуатацыю менш заможных ці зусім бедных людзей, паступова выходзілі новыя «гаспадары», якія бессаромна прысвойвалі плён чужой працы.

У Ракіцкіх былі дваровыя майстэрні. У іх прыгонныя сяляне выраблялі многае з таго, што патрэбна было для хатняга ўжытку памешчыка і яго дворні. Тут валялі высакаякаснае двухаршыннае сукно, валёнкі і інш.

Панскі дом і сядзібу ў Касачове акаляла глыбокія равы, напоўненыя вадой. У касачоўскім парку, куды ніхто,

[1] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў. Ф. 1808. Воп. 1. Спр. 112. Л. 18.

апрача паноў і служак, не дапускаўся, на спецыяльнай эстрадзе каля прыгожых сажалак у нядзельныя і святочныя дні іграў аркестр з ліку прыгонных. Музыкаў навучаў наняты графам немец, які нават за нязначныя памылкі накіроўваў сваіх «вучняў» для пакарання на канюшню. Затое, як сведчылі старажылы, аркестр графа Ракіцкага быў адным з лепшых у акрузе. Паслухаць яго ў вольны час прыязджалі памешчыкі з суседніх маёнткаў.

І. Ф. Ганжураў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З ВЕДАМАСЦІ КАНЦЫЛЯРЫІ МІНСКАГА ГЕНЕРАЛ-ГУБЕРНАТАРА АБ КІРМАШАХ У ГУБЕРНІ ЗА 1837 г.

10 лютага 1838 г.

В каких городах, уездах и селениях ярмарки бывают	С которого числа начинаются и которого кончаются	Какие товары бывают в привозе	На какую сумму приблизит. было в привозе товаров (руб.)	На какую сумму примерно простирается продажа (руб.)	Сколько примерно стекается народа, число людей
... 15. (в) Брагине — Васильевская	с 1 по 5 января	На сии ярмарки привозятся товары и изделия купцами, промышленниками и жителями окрестными с других и местных уездов и ближайших городов: шерстяные сукна среднего сорта, крестьянские изделия, бумажные изделия, нанка, шелковые и полушелковые изделия, кожи и изделия из оных, фаянсовая посуда, железо, рыба, сахар, мыло, свечи, воск, табак, бумага простая, кофе, чай и прочие малозначащие, лошади и рогатый скот домашней породы.	6000	4000	550

Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 610. Л. 69.

РАПАРТ УПРАЎЛЯЮЧАГА ЭКАНОМІЯЙ ЛОЕЎСКАГА АПЯКУНСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў РЭЧЫЦКІ ЗЕМСКІ СУД МІНСКАЙ ГУБЕРНІ АБ АДМОВЕ СЯЛЯН ВЁСАК ЧАМЯРЫСЫ І ПРОСМЫЧЫ ВЫКОНВАЦЬ ПАНШЧЫНУ Ў ГАСПАДАРЦЫ ПАМЕШЧЫКА ДАНІЛОВІЧА

27 жніўня 1844 г.

В Лоевском опекунском управлении от традиционного владельца фольварка Хракович г-на кол. ас. и ковалера Даниловича, 16-го пущенным, а 22 августа сего 1844 г. за № 220 отношение полученным, изъяснено, что крестьяне дер. Чемерис и Просмыч уклоняются от повиновения, прежде не давали женщин на инвентарную барщину, а теперь уже и мужской пол не только не выходит на упомянутую барщину, но вовсе отказался от послушания, даже и войты не приходят для нарядов в недельные барщины.

Упомянутый владелец изъясняет в оном мне отношении, что от 15 июня доводил о неповиновении крестьян до сведения г-ну становому приставу тит. сов. Хитону, а от 11 июня г-ну предводителю дворянства гр. Рокицкому и дворянской Речицкой опеке от 24 июля сего 1844 г. делал донесение. Но хотя г-н становой пристав предписал чемерисскому сотскому выгнать на барщину крестьян, но сего не послушались, а г-н уездный предводитель хотя словесно уговаривал их, внушал крестьянам, дабы повиновались своему владельцу в отбывании инвентарной барщины и о том предложить изволил становому приставу, а дворянская опека хотя предложила земскому суду с 25 июля за № 649 привесть ослушных в должное повиновение, но все остается без успеха.

За получением же чемерисскою грамодою от 1-го стана указа Минского губернского правления насчет дачи крестьянам законной защиты для отыскания свободы решительно все мужчины и женщины дер. Чемерис отказались от законного повиновения сего августа 15 числа, толкуя, что им по высочайшей воле разрешена свобода и для ограждения оной повелена защита, не приннмая никакого вразумления в том, что защита повелеиа только дабы не было чинимо для них препятствия в отыскании свободы законным порядком, что через экономию и не чинимых, а требуемых только инвентарных повинностей.

В таковом крайнем положении и затруднении находясь, Храковичская экономия в посеве хлеба, собрании оного н обеспечении народного продовольствия и в прочих экономических работах, а также посему не предвидит возможности в выручке показанного инвентарного дохода, собрания податей и исполнения казенных и земских повинностей без необходимой помощи начальства в приведении крестьян в должное повиновение, просит Главной лоевской опекунской экономии законной защиты и помощи.

А потому честь имею оного земского суда покорнейще просить, взяв законные меры о внушении и подтвердительного приказа крестьянам чемерисским и просмыслицким, дабы не отваживались противно толковать губернского правления указа и в отбывании инвентарной повинности и дабы не были ослушниками против своего владельца впредь до разрешения правительством поискиваемой для них свободы.

Управляющий Лоевского опекунского имения дворянин *Новицкий*

Друкуецца па кн.: Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т. 4. С. 231—232.

ЗАПІСКА РЭЧЫЦКАГА ЗЕМСКАГА СПРАЎНІКА МІНСКАЙ ГУБЕРНІ ВІЛЕНСКАМУ ВАЕННАМУ ГУБЕРНАТАРУ АБ ХВАЛЯВАННЯХ СЯЛЯН МАЁНТКА ЖАРЫ ЯЛЧАНСКАЙ ВОЛАСЦІ

7 лістапада 1844 г.

Крестьяне вотчинного владения помещика Александра Горвата имения Жары, в коем заключается по ревизни 720 мужского пола душ, оказавшие в июне месяце с. г. неповиновение своему владельцу, о причине коего произведено было временным отделением Речицкого земского суда дело, и потом по распоряжению начальства приведены в должное послушание; когда же по решению такового дела Речицкий уездный суд признал виновными зачинщиков такового возмущения, учинил распоряжение о подвержении 8 человек тюремному заключению, что посредством станового пристава и исполнено, то прочие крестьяне Жаровского имения, выправленные было экономиею на байдак, осведомились о таковом подтвержении 8 человек аресту, оставив байдак, возвратились в домы и 27-го истекаемого октября, собравшись толпою во двор в числе 50 человек, с дерзостью, в лице находившегося там по делам службы станового пристава, отозвались, что куда взяты вышеписанные 8 человек, то пусть берут и их, объявили экономическому управлению, что

вовсе не будут повиноваться владельцу и не выйдут с того числа на барщину; затем, хотя становым приставом чинимо было внушение, однако они, не услышав, от должного повиновения двору отказались.

Вследствие поступивших о сем в Речицкий земский суд текущего месяца 5-го числа рапорта пристава 2-го стана за № 3983 и прошения помещика Горвата, для усмирения неповинующихся и восстановления должного порядка, а также открытия причин неповиновения и, быть может, подстрекателей, по состоявшемуся в суде постановлению назначено временное отделение, которое вслед за сим к предпринятию законных мер отправляется.

Земский исправник *(подпись неразборчива)*

Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 378. Воп. 52. Спр. 1790. Л. 11.

Друкуецца па кн.: Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т. 4. С. 233.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Брагіншчына ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле дзяржаў, у якія яна ўваходзіла ў канцы IX — пачатку XIX стст.

Напрыканцы IX — пачатку X стст. Брагіншчына ў складзе Тураўскага княства ўваходзіла ў Кіеўскую Русь. З 50—60-х гг. XIV ст. Брагінская і Мазырская воласці разам з Беларускім Падняпроўем знаходзіліся ў Вялікім княстве Літоўскім. Пасля рэформы 1564—1566 гг. тут былі ўтвораны ваяводствы па польскім узоры. У 1564 г. Мазырскі павет разам з яго брагінскімі валасцямі (Брагінскай, Мікуліцкай, Савіцкай і інш.) стаў адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай Кіеўскага ваяводства. У складзе Рэчы Паспалітай (з 1569 г.) Брагіншчына заставалася воласцю Мазырскага павета Мінскага ваяводства.

Напрыканцы XVIII ст., у выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай, яна ў складзе Мазырскага павета адносілася да Мінскай губерні — адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Расійскай імперыі.

Пасля 1796 г., калі да Мінскай губерні быў далучаны Рэчыцкі павет (раней уваходзіў у Чарнігаўскую губерню), Брагіншчына была перададзена ў яго склад з Мазырскага павета.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Адмена прыгону на Брагіншчыне

Да сярэдзіны XIX ст. у Расіі, у тым ліку на Беларусі, выявіўся востры крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы, якая стрымлівала развіццё прадукцыйных сіл краіны. Па-першае, развіццё яе эканомікі па экстэнсіўным шляху ўжо не толькі вычарпала свае магчымасці, але і не адпавядала запатрабаванням часу. Крызіс прыгонніцкай сістэмы асабліва выразна праявіўся ў выніках Крымскай вайны (1853—1856), у якой Расія не здолела супрацьстаяць высокаразвітым краінам Заходняй Еўропы. Па-другое, узрастанне антыпрыгонніцкага руху, асабліва сярод сялянства, пагражала моцным сацыяльным патрасеннем. Царскі ўрад нарэшце зразумеў, што пара адмяніць прыгоннае права «зверху», каб не дачакацца гэтага ў выніку рэвалюцыйнага выбуху.

Па абвешчанай у лютым 1861 г. рэформе сяляне атрымалі асабістую свабоду, права распараджацца свайй маёмасцю, выкупіць сядзібу і, са згоды памешчыка, невялікі зямельны надзел. Аднак зямля заставалася ўласнасцю памешчыкаў. Сяляне маглі атрымаць у карыстанне сядзібны і зямельны надзелы за выкананне павіннасцей (панщчына або аброк), застаючыся пры гэтым часова абавязанымі да пераходу на выкуп. Па сутнасці «вызваленыя» ад прыгону сяляне заставаліся ў поўнай залежнасці ад памешчыкаў.

Такі рабаўніцкі характар сялянскай рэформы выклікаў незадаволенасць і абурэнне ў народзе. У выніку пачаліся сялянскія хваляванні і бунты, якія не абмінулі і Брагіншчыну.

Хоць Палажэнні аб рэформе не былі прасякнуты асаблівымі клопатамі аб сялянах, брагінскія памешчыкі ўсё ж спрабавалі ўтаіць ад мужыкоў сапраўдную сутнасць Маніфеста ад 19 лютага 1861 г. Так, з нагоды абвяшчэння гэтага дакумента ў брагінскай царкве быў адслужаны малебен, але большасць сялян не зразумелі яго сэнсу. Слугі Ракіцкіх прымушалі мужыкоў «падпісваць» крыжыкамі складзеную памешчыкам паперу аб тым, што прыгонныя нібыта не жадаюць рэформы. Сяляне адмаўляліся ад такой прапановы. Тады найбольш непакорных высцебалі розгамі.

У адпаведнасці з Агульным палажэннем аб рэформе, у Брагіне прыкладна на 300 двароў было нарэзана 50 надзелаў па 12 дзесяцін зямлі ў кожным. Астатнія сялянскія двары атрымалі толькі сядзібную зямлю ды невялікія кавалачкі сенакоснай на грузкім і купістым балоце.

І ў сацыяльным плане пасля рэформы мала што змянілася. Сяляне паранейшаму адчувалі непасільны памешчыцкі і кулацкі прыгнёт, заставаліся забітымі і бяспраўнымі. Так, у маёнтках памешчыкаў Гардзялкоўскага (в. Астрагляды) і графа Юдзіцкага (в. Хракавічы, Чамярысы) сялян каралі розгамі. Такое бяспраўе, жорсткі прыгнёт выклікалі сялянскія бунты. На тоі час яны мелі месца ў вёсках Дублін, Петрыцкае, Крукі, Міхалёўка і г. д. На ўціхаміранне бунтаўшчыкоў была накіравана воінская каманда. Прадвадзіцель дваранства Рэчыцкага павета хойніцкі памешчык Мечыслаў Прозар паведамляў павятоваму начальству 29 красавіка 1861 г.: «В Брагинском имении после поставления на квартирование 50 человек бессрочных (маецца на ўвазе — салдат) пришли просить прощения (сяляне) не только у нас, но и у помещика».

Пасля адмены прыгоннага права развіццё капіталізму на Беларусі паскорылася. Усё шырэй уцягвалася ў рынкавыя адносіны і сельская гаспадарка глухіх палескіх мясцін. У імкненні да павышэння эфектыўнасці вытворчасці на аснове інтэнсіўных метадаў гаспадарання ў маёнтках пачалі актыўней прымяняць новыя машыны, земляробчыя прылады, больш прадуктыўныя сарты сельгаскультур і пародную жывёлу. Укаранялася шматпольная сістэма севазваротаў, адкрываліся новыя прадпрыемствы па перапрацоўцы сельскагаспадарчай прадукцыі: вінакурні, сыраварні, невялікія заводы па вырабе павідла і сокаў. У шэрагу месцаў з'явіліся складаныя машыны — паравыя лакамабілі, якія прыводзілі ў рух агрэгаты млыноў, малатарняў, маслабоек і г. д. Так, у 1876 г. працавалі прадпрыемствы: вадзяная сукнавальня, шэсць конных і два ветраныя млыны графа Ракіцкага ў вёсцы Мікулічы, паравы, два вадзяныя і конны млыны купца Ф. А. Селюкова ў вёсцы Ёлча, жалезны завод, сукнавальня, два вадзяныя, конны і ветраны млыны Прозараў у вёсцы Гарадзішча, вадзяны млын двараніна А. І. Горвата ў вёсцы Верхнія Жары, вінакурня і маслабойня памешчыка Рыбінкава ў вёсцы Астрагляды і інш. Памешчыкам Ваньковічам (в. Рудакоў) была створана ферма пародзістай буйной рагатай жывёлы.

Як і ў ранейшыя часы, у Брагіне і Камарыне працавалі прадпрыемствы па вырабе скур і мыла, цагельні з колькасцю рабочых ад 5 да 10 – 15 чалавек.

У парэформенны перыяд сярод сялян на Брагіншчыне атрымалі развіццё мясцовыя промыслы: сталярны, бандарны, кавальскі, па пашыве адзення і абутку. Тыя ж людзі, хто не валодаў такімі прафесіямі, займаліся адыходніцтвам — сезонна працавалі на будаўніцтве чыгуначных і шасейных дарог, на лагельных, прамысловых прадпрыемствах у суседняй Украіне, займаліся лесасплавам і інш.

Развіццё дапаможных вытворчасцей

садзейнічала не толькі ўзбагачэнню іх уладальнікаў, даючы ім магчымасць выгадней рэалізоўваць сваю прадукцыю ў аддаленых буйных гарадах, але і спрыяла большай занятасці мясцовага насельніцтва. Напрыклад, многія сяляне з Брагіна, вёсак Буркі, Хатуча працавалі ў гаспадарках і майстэрнях касачоўскага, астраглядаўскага, гарадзішчанскага, рудакоўскага і іншых маёнткаў.

Адмена прыгоннага права садзейнічала далейшаму паскоранаму развіццю эканамічнага і культурнага жыцця краіны, аднак і ў 70—90-я гг. XIX ст. Брагіншчына заставалася глухім кутком беларускага краю. У кнізе Н. Стаўпянскага «Девять губерний Западно-Русского края», выдадзенай у 1886 г., прыведзены наступныя звесткі: «Брагин, местечко при реке Брагинке, на берегу озера среди болот. Жителей 1628 душ об. п., дворов 261, православных церквей три, католический костел, две ярмарки в год».

І ўсё ж агульнае эканамічнае ажыўленне, расшырэнне гандлю, звязаныя з развіццём капіталізму, спрыялі павелічэнню колькасці насельніцтва. У канцы 70-х гг., па даных «Памятной книги Минской губернии за 1878 год», у мястэчку Брагін (без Касачова) налічвалася 2722 жыхары.

Аднак у парэформенныя гады не ўсе памешчыкі змаглі перабудаваць сваю гаспадарку на капіталістычны лад. Так здарылася і з Ракіцкімі, хоць яны і рабілі захады па павышэнні эфектыўнасці гаспадарання. Бяда была ў тым, што пачатыя новаўвядзенні яны не даводзілі да канца. Як гэта было і раней, калі ў 1873 г. з-за фінансавага разладу частка іх уладанняў з фальваркамі Буда Петрыцкая, Глухавічы, Міхалоў, Рафалаў, Хатуча былі прададзены купцу А. С. Канопліну. Пэўны гаспадарчы заняпад у Ракіцкіх выклікаўся ў асноўным іх імкненнем жыць у вялікай раскошы. Ацэньваючы становішча астатняй часткі гаспадаркі Ракіцкіх, аўтары «Словаря географического Королевства Польского», выдадзенага ў 1880 г., пісалі: «Брагинские владения вообще славятся хорошей землей, множеством лесов и лугами, но все это из-за полной запущенности эксплуатируется очень неэкономно».

Неўзабаве Ракіцкія прадалі і частку маёнтка Касачоў нейкаму Кербедзю. Новы ўладальнік хутка перабудаваў гаспадарку на капіталістычны лад, перайшоў да шырокага прымянення наёмнай працы. Для забеспячэння большай прыбытковасці фальварка пачаў абзаводзіцца найноўшымі сельскагаспадарчымі машынамі (двухлемяховымі плугамі, сеялкамі, жняяркамі, паравой малатарняй і інш.). Гэта яшчэ больш падзешавіла рабочую сілу, узмацніла эксплуатацыю сялян. Яны вымушаны былі за 20 капеек у дзень (на сваіх харчах) з ранку да вечара гнуць спіну на памешчыка. Іншага выйсця не было, бо рабочай сілы хапала. Нават нізкааплачваемай работы ў памешчыцкім фальварку ці гаспадарках мясцовых свяшчэннікаў шукалі не толькі жыхары Брагіна, але і навакольных вёсак. Напрыклад, сяляне вёскі Багушы былі пастаяннымі батракамі і здольшчыкамі ў землеўладальнікаў Аскеркі, Шукты і інш.

І. Ф. Ганжураў

Бунт ашуканых рэформай

Пасля распрыгоньвання памешчыкі павінны былі даць усім сваім дваровым людзям пакрысе зямлі. Гарадзішчанцам Канецпольскія абавязаны былі выдзеліць 125 гектараў і 80 гектараў сенажацей, пэўную плошчу выпасаў для жывёлы. Ворыўныя ўчасткі адводзіліся насупраць Гарадзішча, па цяперашняй дарозе на Такліноў. А выпасы размяшчаліся ў пойме ракі Брагінкі, да самай вёскі Сялец.

Гэтыя землі былі ўрадлівыя, і таму памешчык не жадаў пазбаўляцца іх. А сялянам нечым было апрацоўваць свае надзелы: на ўсю вёску былі два кані ды адзін вол. А кароў мелася ўсяго

наўдзесятка. Памешчык вырашыў узяць хітрасцю. Тых, хто адмовіцца ад зямлі на яго карысць, паабяцаў узяць на пастаянную работу за грошы, двухразовае бясплатнае харчаванне і вялікі магарыч. Алошняе падкупляла больш за ўсё. І вось у нядзелю на сярэдзіну панскага двара былі выцягнуты бочка бражкі і выстаўлена гарэлка. Калі ўсе перапіліся — і мужыкі, і жанчыны — памешчык паклікаў міравога суддзю, старшыну, панятых і ў іх прысутнасці ўзаконіў «добраахвотную» перадачу зямлі яе ранейшаму ўладальніку бясплатна. Усе п'яныя паставілі свае «подпісы» крыжыкамі, а некаторыя нават двойчы.

Калі прайшло пахмелле і вярнуўся розум, сяляне па-іншаму паглядзелі на дакумент, які «падпісалі». А ў ім нічога не сказана ні аб абяцанай рабоце, ні аб бясплатным харчаванні. І калі зазваніў званок, што склікаў дворню на абед, сяляне таксама рушылі да халопскай сталоўкі. Але іх туды не пусцілі. А калі найбольш актыўныя паспрабавалі прабіцца сілай,— усіх выгналі вон са двара. Гарадзішчанцы і сяльцоўцы пазбавіліся і зямлі, і абяцанай дворніцкай працы.

Яшчэ Прозарамі была рэканструявана плаціна вадзяных млыноў на Брагінцы, каля Гарадзішча. Заставы яе знаходзіліся якраз на тым месцы, дзе да вайны быў жалезабетонны мост. Тады ж, а менавіта ў 1870 годзе, Прозары распачалі будаўніцтва двухпавярховага корпуса вінакурнага завода і яго дапаможных будынкаў. Першую прадукцыю вінакурня выдала ў 1880 годзе. Асобныя мураванкі таго прадпрыемства ў значным відазмененым выглядзе захаваліся да цяперашняга часу.

Пасля ўзвядзення новай млынавай плаціны ўзровень вады ў Брагінцы ўзняўся на 1,5—2 метры. Адбылося затапленне навакольных балот і іншых паніжаных мясцін. У сувязі з тым, што побач з падтапляемымі сялянскімі сенакоснымі ўчасткамі знаходзіліся і панскія сенажаці, на летні перыяд заставы млынавай плаціны ўзнімаліся і вада сыходзіла. Сяляне маглі бесперашкодна ўбіраць траву на сена. Вяскоўцы, як працавіты народ, прывялі ў парадак набытыя ў паслярэформенны час землі і сенакосы. Ад частага падтаплення вадой спрадвечныя хмызнякі на непраходных балотах пасля сходу паводкі высыхалі. Гэтую акалічнасць скарыстоўвалі найбольш разваротлівыя сяляне для расшырэння сваіх сенакосных угоддзяў, што, у сваю чаргу, садзейнічала павелічэнню колькасці жывёлы.

Памешчыкам млыны прыносілі нядрэнныя барышы. Да таго ж іх сенакосы моцна не падтапляліся. Таму, у пагоні за прыбыткамі, яны амаль перасталі адкрываць шлюзы плаціны на лета. У выніку на добрай палове сенажацей сяляне не маглі ўбіраць траву на сена. З-за недахопу кармоў зменшылася колькасць жывёлы ў сялянскіх гаспадарках. Гарадзішчанцы падалі на памешчыка ў суд. Але той адмовіў ім у іску, матывуючы гэта тым, што млыны і плаціна размешчаны на памешчыцкай зямлі. Народ хваляваўся, накіроўваў хадакоў на перамовы да памешчыцкага ўпраўляючага і нават да саміх Прозараў у Хойнікі, але ніхто не жадаў іх слухаць.

Гэты канфлікт працягваўся некалькі гадоў. Тым часам вада дайшла да сялянскіх агародаў. У вяскоўцаў з'явілася магчымасць лавіць рыбу на пойме. У рэчцы ж займацца рыбалоўствам забаранялася.

Так працягвацца далей не магло. Гарадзішчанцы вырашылі спаліць галоўны млын. Па ініцыятыве сялян Ясенаўца, Коцура, Журава ў 1886 годзе ў Гарадзішчы адбыўся тайны сялянскі сход, на якім было вырашана сабраць грошы на набыццё газы, смалы і на магарыч падпальшчыку. На другім сходзе ўжо прысутнічалі амаль усе мясцовыя мужыкі. Жанчыны на падобныя мерапрыемствы не дапускаліся. Сабралі грошы, падабралі выканаўцу сваёй тайнай задумы. Ім быў гарадзішчанскі прымак, ураджэнец вёскі Піркі Іван Шубянок па мянушцы Кармялюк. На гэтым сходзе ў

галасаванні не прымалі ўдзелу сяляне Ясенавец і Коцур, хоць былі ініцыятарамі і грошы ў агульны збор унеслі.

Тут жа, на сходзе, было вырашана: калі Кармялюк выпадкова трапіць у рукі памешчыцкіх вартаўнікоў ці будзе выкрыты ў злачынстве, то сям'ю яго (жонку і пяцёра пасынкаў) вёска стане карміць, пакуль малыя не падрастуць. Дарэчы, адзін з гэтых дзяцей, Коцур Карп, дажыў да 1966 года.

Кармялюк спаліў млын, але і сам быў выкрыты з-за сваёй сквапнасці. Падчас падпалу прыхапіў на млыне пілу, з якой быў злоўлены. Напрыканцы 1886 года яму быў аб'яўлены прыгавор: 25 гадоў катаржных работ. Напачатку Кармялюк усю віну ўзяў на сябе, але, калі асобныя вяскоўцы адмовіліся дапамагаць яго сям'і, выдаў некаторых з іх. Да катаржных работ з высылкай на вечнае пасяленне ў Сібір былі прыгавораны гарадзішчанцы Е. Жураў, Д. Краўчанка, В. і Д. Нікіценкі. Многіх сялян білі бізуном.

Пасля таго вяскоўцы яшчэ доўга варагавалі з памешчыкамі з-за плаціны, пакуль канчаткова не знішчылі яе. Аднак сялянскія суды з землеўладальнікамі (Канецпольскімі раней і Прозарамі, Патонамі) працягваліся амаль паўстагоддзя, да самай рэвалюцыі.

Пасля канфіскацыі памешчыцкай маёмасці ў Гарадзішчы мясцовы селянін Жураў Фёдар Ілыч знайшоў у былой панскай бібліятэцы патаемную схованку, а ў ёй і «План земли дарственной» з сялянскімі подпісамі-крыжыкамі. Той самы абманны дакумент аб «добраахвотнай» адмове вяскоўцаў ад парэформеннага надзялення іх зямлёй.

І. Ф. Ганжураў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

БУЙНЕЙШЫЯ ЗЕМЛЕКАРЫСТАЛЬНІКІ БРАГІНШЧЫНЫ І КАМАРЫНШЧЫНЫ ПА СТАНЕ НА 1876 ГОД

Баглей Иван Григ., купец. Прав /ославный/. Имение Михалово, 3590 десятин. По купчей крепости с 12 июля 1871 г. Хозяйством занимается владелец. Оброчная статья дохода — воловая мельница, 20 р. в год;

Буш Белинга Наршизовна, двор /янка/. Р.-кат. Имение Желибор, 4780 десятин. По наследству, общее с 10 другими лицами. Хоз. заним. владелица;

Василевский Осип Рафаилович, двор. Р.-кат. Имение Чемков, 100 десятин. По купчей крепости. Хоз. заним. владелец.

Вильямовский Викентий Адамович. Двор. Р.-кат. Имение Желибор (см. Буш Б. Н.).

Горват Александр Игнатьевич. Двор. Р.-кат. Имение В. Жары, 16 860 дес. По купчей крепости с 1883 г. Управляющий в В. Жарах. Водяная мельница, 100 р. в год;

Грузевич Рафаил Александрович. Крестьянин. Р.-кат. Имения Масаны, Борщевка, 278 дес. По наследству. Хоз. заним. владелец.

Грузевич Геронис Рафаилович. Двор. Р.-Кат. Имение Борщевка, 130 дес. По наследству. Хоз. заним. владелец.

Грузевич Иван Феликсович. Двор., р.-кат. Имение Масаны, 269 дес. По наследству. Сдает в аренду.

Данилевич Теобольд Викентьевич. Двор., р.-кат.

Данилевич Иван Викентьевич. Имение Храковичи, 2280 дес. По наследству. Хоз. заним. владельцы.

Дмишевич Адольф Карлович. Двор., р.-кат. Имение Храковичи. 433 дес. По наследству. Хоз. заним. владелец.

Еленская Виктория Ивановна. Двор. Прав. Имение Борщевка, 250 дес. По наследству. Сдает в аренду;

Кобелицкая Варвара Ивановна. При деревне Жиличах два острова Дричев и Лебедовский, 662 дес. По дарств. записи 23 марта 1848 г. Сдает в аренду;

Конопляи Аким Семенов. 1-й гильдии купец. Прав. Имение: мест. Брагин с фольварками Михолово, Глуховичи, Рофалово, Хатуча, Буда Петрицкая, Новоселки, Игнатин и Теребовка, 20 000 дес. По купчей креп. 9 янв. 1873 г. Хоз заним. владелец;

Любичанковская Леонида Нарцизовна. Двор., р.-кат. Имение Желибор (см. Буш Б. Н.);

Местер Иван Иванович. Двор., р.-кат. Имения: Желибор, Колыбань, 1282 + 1971 = = 3253 дес. По наследству, общее с Адольфом Местер. В Колыбани: водяная мельница — 80 р., конная — 50 р. в год. Хоз. заним. управляющий;

Местер Адольф Иванович. Двор., р.-кат. Имения: Желибор, Колыбань (см. Местер И. И.);

Новожицкая Евелина Адамовна. Двор., р.-кат. Имение Желибор (см. Буш Б. Н.);

Поссакен Ефр. Александ. Имения: Асаревичи и Вялье, 3558 дес. По наследству. Конная мельница — 80 р. в год. Хоз. заним. владелец;

Обухович Роза Иван. Двор., р.-кат. Имение Желибор (см. Буш Б. Н.);

Оскерко Елена Генриховна. Оскерко Мария Генриховна. Имение Рудаков, 7416 дес. По наследству. Две воловых мельницы — 80 р. в год. Хоз. заним. владелицы;

Пиотровская Эмилия Адамовна. Имение Желибор (см. Буш Б. Н.); она же. Имение Желибор, 162 дес. По наследству. Хоз. заним. владелица;

Прозор Константин Мечиславович, Прозор Мария Мечиславовна, Прозор Софья Мечиславовна, Прозор Станислава Мечиславовна. Двор., р.-кат. Имения: Хойники (43 522 дес.), Городище, Остроглядовичи, Савичи (31 581 дес.). Всего 75 103 дес. По наследству. В Городище: две водяные мельницы — 1260 р., конная — 50 р., ветряная — 100 р. в год мельницы, сукновальня — 60 р., железный завод — 70 р. в год; в Хойниках: два смоляных завода — 200 р., две ветряные — 150 р., три воловые — 73 р. в год мельницы, две корчмы — 225 р. в год. Хоз. заним. управляющий;

Рокицкий Людвиг Михайлович. Граф., р.-кат. Имения: Брагин, Микуличи, 26 650 дес. По наследству. Две ветряные — 240 р., шесть конных — 290 р., водяная — 200 р. мельницы, сукновальня — 50 р. в год. Хоз. заним. управляющий;

Рымша Олимпия Иван. Двор., р.-кат. Имение Желибор (см. Буш Б. Н.);

Селюков Яков Александрович, Селюков Флор Александрович, Селюков Андрей Александрович. Купцы, прав. Имение Иолча, 13 597 дес. По купчей крепости 27 октября 1869 г. Паровая — 2000 р., две водяных — 200 р., конная — 80 р. мельницы, две корчмы — 160 р. в год. Хоз. заним. управляющий;

Солтон Люциян Иванович. Поручик, р.-кат. Имения: Пересвятов, Желибор, 469 дес. По наследству;

Солтон Федор Нарцизович. Двор., р.-кат., Солтон Нарциз Нарцизович. Двор., р.-кат., Солтон Витольд Нарцизович. Двор., р.-кат. Имение Желибор (см. Буш Б. Н.);

Солтон Федор. Двор., р.-кат. Имение Желибор, 1221 дес. По наследству;

Стравинская Марья Казимировна. Двор., р.-кат. Имение Масаны, 380 дес. По наследству. Хоз. заним. владелица.

Паводле кн.: Список землевладельцев Минской губернии за 1876 г. Мн., 1877. С. 2—156.

Гарадзішча — маёнтак Патонаў

У 1890 годзе землі і маёмасць у Гарадзішчы набыў рускі аташэ ў Швейцарыі Аскар Патон. Сам новы гаспадар з-за мяжы амаль не прыязджаў, і ў маёнтку распараджалася яго маці.

У Патонаў было трое сыноў. Старэйшы з іх быў на вайсковай службе, у перыяд рэвалюцыі і грамадзянскай вайны прымкнуў да белагвардзейцаў. Потым выехаў за мяжу, дзе і памёр. У малодшага з Патонаў — Пятра Аскаравіча — жонкай была немка. Расказваюць, што, будучы азартным карцёжнікам, ён аднойчы ў 1913 годзе прайграў маёнтак у карты. Ад усёй маёмасці жонцы засталася толькі так званая Малейкаўская дача — потым у гэтым драўляным будынку размесціцца Малейкаўскі сельсавет. Фраў Патон выехала на радзіму ў Германію, а Пётр Аскаравіч працаваў у Рэчыцы павятовым камісарам. З гэтае пасады быў зняты бальшавікамі ў 1917 годзе. Загінуў у водавароце паслякастрычніцкіх падзей.

***

Сярэдні сын Патонаў — Яўген Аскаравіч, н. у 1870 г. Вядомы як буйны ўкраінскі савецкі вучоны, заснавальнік айчыннай школы электразваркі, акадэ-

мік АН Украіны (1929), заслужаны дзеяч навукі УССР (1940), Герой Сацыялістычнай Працы (1943). У 1904–1938 гг.– прафесар Кіеўскага політэхнічнага інстытута, у 1921–1931 гг. кіраваў Кіеўскай моставыпрабавальнай станцыяй. З 1929 г. распрацоўваў пытанні электразваркі, па яго ініцыятыве пры АН Украіны была арганізавана электразварачная лабараторыя, на базе якой у 1934 г. створаны Інстытут электразваркі АН УССР. У 1934–1953 гг. Я. А. Патон – дырэктар гэтага інстытута, у 1945–1952 гг.– віцэ-прэзідэнт АН УССР. Пад яго кіраўніцтвам вынайдзены спосаб аўтаматычнай скараснай зваркі пад флюсам. Падчас Вялікай Айчыннай вайны распрацаваў тэхналогію зваркі спецыяльных сталей і ўкараніў яе ў абаронную прамысловасць. Па праекце Я. А. Патона яшчэ ў 1915 г. пабудаваны аднаарковы мост, які злучае Першамайскі і Піянерскі паркі ў Кіеве.

Вучоны прымаў непасрэдны ўдзел у праектаванні і будаўніцтве моста цераз Днепр (уведзены ў эксплуатацыю ў 1953 г.). Мосту нададзена імя Я. А. Патона. Яўген Аскаравіч – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1941). Памёр у 1953 г. Пахаваны на Байковых могілках у Кіеве[1].

Па слядах бацькі пайшоў сын – Барыс Яўгенавіч Патон (н. у 1918). Ён – акадэмік АН СССР (1962), АН УССР (1958), узначальваў Інстытут электразваркі.

Царкоўны звон над краем

Царкоўная гісторыя цікавая для нас не толькі яе памятнымі падзеямі, прыкладамі духоўнага падзвіжніцтва служкаў царквы, а і тым, што яна з даўнейшых часоў з'яўлялася першым асяродкам народнага пісьменства. І хоць суровы гістарычны лёс з яго шматлікімі войнамі і пажарамі, рэвалюцыйнымі ўзрушэннямі, разбуральнымі наступствамі балышавіцкага атэістычнага нігілізму не захаваў на тэрыторыі Брагіншчыны амаль ніводнага архітэктурнага царкоўнага помніка, мы ўсё ж нямала чаго ведаем аб рэлігійным, духоўным жыцці нашых далёкіх прашчураў дзякуючы звесткам з рукапісных і друкаваных архіўных дакументаў.

Найбольш старажытным сведчаннем гэтага ў дастасаванні да раёна з'яўляецца фундушная (ахвяравальная) грамата 1609 г. князя Адама Вішнявецкага і ягонай жонкі Аляксандры мясцовым Прэабражэнскаму і Благавешчанскаму манастырам[1]. Галоўнай умовай гэтага завяшчальнага дакумента з'яўлялася патрабаванне строгага захавання ў манастырскім і царкоўным жыцці веры старажытнагрэчаскай, праваслаўнай.

Што датычыць каталіцкай рэлігійнай плыні, то яе ўціск, размыванне праваслаўнага асяроддзя больш адчуваліся ў перыяд XII – першай паловы XVII стагоддзяў, калі Брагіншчына ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Вядома, што ў тутэйшых мясцінах быў толькі адзін каталіцкі касцёл у вёсцы Астрагляды. У далейшым праваслаўныя вернікі і нешматлікія католікі суіснавалі ў міры і ўзаемнай павазе.

Больш шырокія звесткі аб царкоўным жыцці тычацца XVIII–XIX стагоддзяў. На працягу гэтага часу на Брагіншчыне былі пабудаваны каля 20 праваслаўных прыходскіх і прыпісаных да іх цэркваў і капліц у буйнейшых вёсках.

На тэрыторыі, якую займае цяперашняя Брагіншчына, былі царкоўныя прыходы з цэнтрамі: м. Брагін, 345 двароў, 3 праваслаўныя царквы, 1 яўрэйская сінагога; в. Сялец, 24 двары, 1 царква; Глухавічы, 75 двароў, 1 царк-

[1] Київ. Энциклопедичный довідник. Київ: Видовецтво Українськоі Радянськоі Энциклопедії, 1981. С. 458–459.

[1] Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Мн., 1848. С. 24.

ва; Грушнае, 18 двароў, 1 царква; в. Ёлча, 32 двары, 1 царква; в. Верхнія Жары, 50 двароў, 1 царква; в. Мікулічы, 61 двор, 1 царква; в. Астрагляды, 71 двор, 1 царква, 1 касцёл; в. Хракавічы, 67 двароў, 1 царква.

Праваслаўныя прыходы Брагіншчыны (па архіўных матэрыялах XVII—XIX стст.)

М. Брагін от губ. г. 370 в., от уездн. г. 75 в.

1. Церковь Свято-Николаевская, дер., постр. 1784 г.; приписная к ней дер. церковь во имя Святителя Тихона в том же местечке. Приход сост. часть м. Брагина, 4 дер. и 2 хут.; прихожан 1119 м., 1172 ж. Церковной земли 2193 дес. 1929 кв. с. Причтовыя постройки дер., не в дост. колич. и ветх.

2. Церковь Рождество-Богородичная, дер., постр. 1790 г., к ней принадл. домовая Петро-Павловская церковь в здании двухклассной школы. Приход сост. часть м. Брагина и 4 дер.; прихожан 1747 м., 1746 ж. Церковной земли 247 дес. 311 кв. с. Причтовыя постройки: им. для причта дер. дома. Брагинская двухклассная церковно-приходская школа (церковь-школа) с дополнительным женским учительским классом. Почт. адрес: Брагин.

С. Брагино-Селец от губ. г. 420 в., от уездн. г. 75 в. Церковь Спасо-Преображенская, дер. с приделом на хорах в честь Казанской иконы Божьей Матери, постр. в 1609 г.; в церкви имеется местно-чтимая чудотворная икона Богоматери; прип. дер. ц. в д. Юрковичах. Приход сост. из 17 селений; прихожан 2705 м., 2777 ж. Церковной земли 147 дес. 1793 кв. с. Причтовыя постройки дер. новыя. Церковно-приходская школа в с. Брагино-Сельце. Почт. адрес: Брагин.

С. Глуховичи от губ. г. 424 в., от уездн. г. 70 в. Церковь Михайловская, дер., постр. 1842 г. Приход сост. из 4 селений; прихожан 1103 м., 1112 ж. Церковной земли 99 дес. 1324 кв. с. Причтовыя постройки дер., новыя. Церковно-приходская школа в с. Глуховичах. Почт. адрес: Брагин.

С. Грушно/е/ от губ. г. 405 в., от уездн. г. 125 в. Церковь Покровская, дер., постр. 1792 г. Приход сост. из 9 селений; прихожан 1897 м., 1889 ж. Церковной земли 242 дес. 1377 кв. с. (100 дес. дровяного лесу). Причтовыя постройки: им. дер. дома для причта. Церковно-приходская школа в с. Грушно. Почт. адрес: Брагин.

С. Жары от губ. г. 400 в., от уездн. г. 172 в. Церковь Успенская, дер., постр. 1885 г.; приписная к ней дер. ц. в д. Гдень. Приход сост. из 4 селений; прихожан 1360 м., 1397 ж. Церковной земли 271 дес. 267 кв. с. (143 дес. 844 кв. с. лесу). Причтовыя постройки дер., в недост. колич. и ветх. Церковно-приходская школа в с. Жарах. Почт. адрес: Комарин.

С. Иолча от губ. г. 400 в., от уездн. г. 150 в. Церковь Михайловская, дер., когда постр. неизвестно; приписная к ней дер. ц. в м. Комарин. Приход сост. из 9 селений; прихожан 1617 м., 1595 ж. Церковной земли 105 дес. 2172 кв. с. (28 дес. 140 кв. с. дровяного лесу). Причтовыя постройки: им. для причта дер., ветхия дома. Церковно-приходская школа в с. Иолче. Почт. адрес: Комарин.

С. Микуличи от губ. г. 375 в., от уездн. г. 70 в. Церковь Богоявленская, дер., постр. 1834 г. Приход сост. из 12 селений; прихожан 1476 м., 1338 ж. Церковной земли 65 дес. 375 кв. с. Причтовыя постройки им. дер. Почт. адрес: Брагин.

С. Остроглядовичи от губ. г. 400 в., от уездн. г. 84 в. Церковь Свято-Троицкая, дер., постр. 1779 г. Приход сост. из 8 селений; прихожан 1346 м., 1492 ж. Церковной земли 98 дес. 1095 кв. с. Причтовыя постройки дер., новыя. Почт. адрес: Брагин.

С. Храковичи от губ. г. 400 в., от уездн. г. 100 в. Церковь Свято-Николаевская, дер., постр. 1776 г., треб. ремон-

та. Приход сост. из 7 селений; прихожан 1995 м., 1946 ж. Церковной земли до 200 дес. Причтовыя постройки частью церковныя им. только для священника. Почт. адрес: Брагин.

С. Чиколовичи от губ. г. 450 в., от уездн. г. 150 в. Церковь Воскресенская, дер., постр. 1886 г.; приписная к ней дер. ц. в д. Крюках. Приход сост. из 9 селений; прихожан 1607 м., 1692 ж. Церковной земли 77 дес. 791 кв. с. Причтовыя постройки: им. дом для свящ. и холодн. строения для свящ. и псол. Церковно-приходская школа в с. Чиколовичах. Почт. адрес: Комарин.

Товаров В. А. Историко-статистическая справочная книга Минской епархии. Мн., 1903. С. 141–144.

Матэрыялы на с. 60–64 падрыхтаваў
І. Ф. Ганжураў

Першыя школы, вучылішчы...

Да пачатку 60-х гг. XIX ст. школьная сістэма на Брагіншчыне і Камарыншчыне наогул адсутнічала. Функцыяніравалі толькі асобныя царкоўнапрыходскія школы. Напрыклад, у вёсках Хракавічы, Ёлча і іншых яны месціліся ў наёмных, малапрыстасаваных вясковых хатах. Пераважная большасць вясковага насельніцтва заставалася непісьменнай. Толькі ў сувязі з праведзенай у 60–70-я гг. школьнай рэформай, якая ўводзіла сістэму асветы для ўсіх саслоўяў, становішча змянілася ў лепшы бок. Але, маючы сваёй галоўнай мэтай шляхам школьнай асветы вызваліць вучняў, сялян беларуска-літоўскіх губерняў ад польскага ўплыву, гэтая рэформа надавала прыярытэт толькі рускай мове. Навучанне на нацыянальнай мове забаранялася.

Першыя народныя вучылішчы на Брагіншчыне былі адкрыты ў 1863 г. у валасных цэнтрах Брагін, Мікулічы, Ёлча, а таксама ў буйнейшых населеных пунктах Астрагляды, Старыя Хракавічы[1]. Яны размяшчаліся ў грамадскіх будынках, утрымліваліся за кошт дзяржаўнай казны і мясцовай сельскай грамады. Жалаванне настаўніка складала ад 160 да 200 рублёў, ён забяспечваўся кватэрай пры школе або ў асобным доме. У ліку першых настаўнікаў у вышэйназваных вучылішчах працавалі адпаведна Іван Юшко, Вікенцій Баханько, Марк Шуліцкі, Сцяпан Бюруковіч і Феакціст Шулейка, якія прайшлі курс навучання ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Пазней на выкладчыцкай рабоце ў Брагіне працавалі Аляксей Забродскі і Ганна Каспяровіч, у Мікулічах — Іван Пакроўскі, якія мелі настаўніцкае званне, і іншыя.

Затым земскія народныя вучылішчы пачалі працаваць у вёсках Савічы (1872 г., настаўнік Сямён Рудзік), Старыя Лукаеды (перад 1879 г.). Хаця доступ да навучання быў дазволены ўсім саслоўям, на самой справе наведваць школу маглі пераважна дзеці больш заможных бацькоў, ды і то ў асноўным хлопчыкі. У прыватнасці, у першым вучэбным годзе ў Мікуліцкай вучэльні ў ліку больш чым 40 вучняў было толькі 2 дзяўчынкі. Ніводнай дзяўчынкі не было сярод навучэнцаў Хракавіцкага земскага народнага вучылішча ў 1886 г. Нядзіўна, што нават праз 10 гадоў пасля пачатку школьнай рэформы працэнт пісьменнасці сярод вяскоўцаў быў нязначным. Па звестках кнігі «Описание деревень и приходов Минской епархии (Речицкий уезд)». Мн., 1879, ён складаў у Хракавіцкім царкоўным прыходзе — не больш як 2, у Глухавіцкім — каля 5 і толькі ў Грушнянскім каля 10 працэнтаў.

Па-ранейшаму многія вясковыя дзеці спасцігалі пісьменства ў царкоўнапрыходскіх школах. Да дзеючых Глухавіцкай, Грушнянскай, Хракавіцкай такіх школ у 1882 г. дабавіліся Калыбанская (у наёмным памяшканні) і Крукаў-

[1] Труды Минского губернского статистического комитета. Вып. 1. Мн., 1870. С. 420.

ская, у аднапакаёвым памяшканні якой адначасова займаліся вучні некалькіх класаў. Першай загадчыцай Калыбанскай школы была на працягу 1882—1893 гг. М. Ф. Ступінская. Пасля яе працавалі настаўнікі І. Ф. Барзаў, Карпаў, Бацанаў і іншыя.

Істотнай праблемай тагачаснай школы з'яўляўся востры недахоп педагагічных кадраў. У радзе месц пачатковым навучаннем дзяцей займаліся большменш пісьменныя асобы. Так, у 1885 г. у родную вёску Чамярысы пасля 25 гадоў ваеннай службы вярнуўся стары салдат Васіль Ільіч Галка. Ён лічыўся пісьменным — умеў чытаць, пісаць, ведаў чатыры дзеянні арыфметыкі. Вяскоўцы запрасілі адстаўнога салдата вучыць дзяцей. Той згадзіўся на ўмовах аплаты, роўнай салдацкаму пайку: карміць, апранаць і грошы на табаку даваць. Пасля В. І. Галкі ў Чамярысах настаўнічаў адстаўны унтэр-афіцэр.

Паводле статыстычных даных Рэчыцкага павета за 1895 г., у Брагінскай, Мікуліцкай, Савіцкай, Ялчанскай валасцях пісьменных было толькі 4,3 працэнта ад агульнай колькасці насельніцтва. Школьная сетка заставалася слабай. Некаторае павелічэнне яе назіралася на пачатку XX ст. Тады ў нашых мясцінах налічвалася 9 народных вучылішчаў: 2 брагінскія (мужчынскае і жаночае), Астраглядаўскае, Мікуліцкае, Радзінскае, Ручаёўскае, Савіцкае, Хракавіцкае, Ялчанскае, 13 царкоўнапрыходскіх школ і 4 хедэры — яўрэйскія рэлігійныя школы.

У 1913 г. пачалі працаваць Вуглоўскае і Ніжнежараўскае (настаўнікі Іўління Мазанік і Уладзімір Савіцкі), а таксама Малажынскае земскія народныя вучылішчы. Тады ж у гісторыі Брагіна адбылася значная падзея. Замест двухкласнага вучылішча было адчынена вышэйшае пачатковае чатырохкласнае. Яно размяшчалася ў перабсталяваным складскім памяшканні былога вінакурнага завода. Але ў гэтую навучальную ўстанову маглі паступаць пераважна дзеці заможных бацькоў.

У 1913 г. школьная сетка Брагіншчыны ўключала ў сябе: вышэйшае чатырохкласнае вучылішча (27 навучэнцаў), 11 земскіх народных вучылішчаў і пачатковых школ — 337 навучэнцаў, 9 царкоўнапрыходскіх школ — 373 вучні.

Удзячная народная памяць данесла да нас імёны тых, хто шчодрай рукой сеяў у дзіцячых душах насенні ведаў, паступова і настойліва рухаў наперад асветніцкую справу ў асяродку простага народа. У 1882 г. з вёскі Доўжыкі Канатопскага павета Чарнігаўскай губерні ў толькі што адкрытую Крукаўскую царкоўнапрыходскую школу Савіцкай воласці прыехала на работу настаўніца Надзея Кірылаўна Ляпеха. Яна з вялікім энтузіязмам узялася за работу, за што здабыла любоў і павагу вучняў і іх бацькоў, большасці вяскоўцаў. Стаўшы з цягам часу членам сацыял-дэмакратычнай арганізацыі, настаўніца актыўна прапагандавала сацыялістычныя ідэі сярод мясцовага насельніцтва. Гэта ў многім дзякуючы ёй сталі пераканаными барацьбітамі за справу рэвалюцыі і Савецкую ўладу бацька і сын Аланас і Трафім Старахатнія, у хаце якіх кватаравала Надзея Кірылаўна. За агітацыйна-прапагандысцкую дзейнасць Н. К. Ляпеха была арыштавана і асуджана да высылкі ў Сібір[1].

Прапагандавалі ідэі сацыял-дэмакратыі сярод сялян настаўнікі Брагінскага народнага вучылішча І. П. Дубіна, Калыбанскай царкоўнапрыходскай школы С. П. Карагодаў. Агітацыйна-прапагандысцкую і растлумачальную работу сярод эканамічных рабочых Жараўскага маёнтка праводзіў настаўнік Леляўскі і іншыя.

Добрым плёнам педагагічнай дзейнасці, актыўным удзелам у грамадскім жыцці запомніліся людзям настаўнікі таго часу Лідзія Сямёнаўна Касценка, Марыя Іванаўна Рудзянок, Марыя Во-

[1] Товаров А. В. Историко-статистическая справочная книга Минской епархии. Мн., 1903. С. 179.

сіпаўна Скараход (Брагін), Міхаіл Каспяровіч (Астрагляды), Мікалай Буднік (Хракавічы), Андрэй Кандратавіч Язерскі (Мікулічы), Станіслаў Караткевіч (Ёлча) і іншыя.

І. Ф. Ганжураў

Падзеі 1905—1907 гг. на Брагіншчыне

Прамысловы крызіс пачатку XX ст. суправаджаўся ўзмацненнем капіталістычнай эксплуатацыі рабочых, рамеснікаў, сялян, абвастрэннем класавай барацьбы. Эканамічны прыгнёт і палітычнае бяспраўе выклікалі ў народа імкненне да супраціўлення самадзяржаўю. Гэта асабліва адчувалася пасля паражэння расійскай арміі ў Маньчжурыі і расстрэлу мірнай дэманстрацыі рабочых у Пецярбургу 9 студзеня 1905 года. Крыху больш чым праз тыдзень пасля «крывавай нядзелі» рабочыя Рэчыцы правялі аднадзённую забастоўку пратэсту. Па іх закліку такія ж акцыі адбыліся ў шэрагу месц павета. «В начале марта в Брагине, Микуличах, Комарине, Савичах состоялись многолюдные митинги и собрания, на которых были приняты резолюции, разоблачавшие новые злодеяния царизма, его попытку задушить революционное движение русского пролетариата»[1].

Гатоўнасць народа да актыўных дзеянняў супраць сваіх крыўдзіцеляў і прыгнятальнікаў падтрымлівалі сацыял-дэмакраты, гурткі і групы якіх ствараліся ў палескай глыбінцы. У прыватнасці, яшчэ ў 1903 годзе заявіла аб сабе першая на Брагіншчыне сацыял-дэмакратычная група, што арганізацыйна ўваходзіла ў Палескі камітэт РСДРП. Узначальваў яе настаўнік Брагінскага народнага вучылішча Іван Пятровіч Дубіна.

Рэвалюцыйныя выступленні рабочага класа ўскалыхнулі сялянства. Летам і восенню 1905 года сялянскімі хваляваннямі была ахоплена амаль трэць усіх паветаў Расіі. Яны ўспыхнулі і ў Рэчыцкім павеце, у прыватнасці, у тых валасцях, якія знаходзіліся ў межах цяперашняга Брагінскага раёна. У Брагіне і навакольных вёсках распаўсюджваліся лістоўкі і пракламацыі «После Мукденского разгрома», «К крестьянам», «Чего хотят люди с красными знаменами?» і інш. Гэта была справа рук мясцовых сацыял-дэмакратаў.

24 жніўня 1905 года мінскі генерал-губернатар Курлоў даносіў міністэрству ўнутраных спраў аб сялянскім руху ў Мінскай губерні:

«В Речицком уезде брожение среди крестьян началось в имениях Ваньковичи Микуличской волости, графини Юлии Рокицкой Брагинской волости, где выразилось в самовольной пастьбе скота, самовольных порубках леса»[1].

І яшчэ адно данясенне таго ж генерал-губернатара аб рэвалюцыйным руху ў Мінскай губерні э 1 па 18 снежня 1905 года:

«...В Речицком у. продолжается общее волнение среди крестьян и идет усиление агитации с целью захватов помещичьих земель, но к активным действиям крестьяне приступают пока весьма осторожно; так были незначительные волнения в мест. Брагине... и в им. Жары, где забастовали все рабочие, предъявив к экономии ряд требований...»[2]

«Сур'ёзныя інцыдэнты адбыліся ў Ялчанскай воласці, а таксама ў Савічах,— успамінала член партыі бальшавікоў з 1919 года Бэла Рыўкіна.— У прыватнасці, у вёсцы Калыбань на сялянскай сходцы быў забіты сельскі староста Трацяк за тое, што настойваў на ўплаце падаткаў, а адпускныя салдаты адмаўляліся плаціць, сцвярджаючы, што запазычанасці з іх спісаны».

Найбольш распаўсюджанай формай сялянскага руху-пратэсту па ўсёй Беларусі былі патравы пасеваў, пасьба жывёлы на памешчыцкіх угоддзях, вы-

[1] Полесский коммунар, 1925. № 3. С. 106.

[1] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. ДП. 00, 1905. Спр. 1350. Ч. 110. Л. 129—130.

[2] Революционное движение в Белоруссии. 1905—1907 гг. Мн., 1955. С. 421.

сечкі лесу, захоп ураджаю, адмова ад уплаты падатковых запазычанасцей і інш. Так, у снежні 1905 года жыхары вёскі Хатуча Брагінскай воласці дамовіліся забраць з паплавоў панскае сена. Так і зрабілі. Памешчык Новікаў, баючыся, што пасля гэтага сяляне пойдуць нішчыць яго сядзібу, збег да суседняга астраглядаўскага памешчыка.

На ўціхаміранне «бунтаўшчыкоў» 25 лютага 1906 года быў накіраваны карны атрад на чале з прыставам Красоўскім і ротмістрам Панячэўскім. Казакі жорстка збівалі сялян, якія напачатку разгубіліся, а потым схапіліся за сякеры, вілы і ўступілі ў бойку з карнікамі. Вяскоўцы Кузьма Балобан, Іван Піліпенка ў гэтай схватцы дзейнічалі асабліва смела. Бачачы, што сяляне могуць пацясніць казакоў, ротмістр аддаў загад страляць. Напавал былі забіты хатучанец Аляксандр Каваленка, цяжка паранены Іван Піліпенка, Ігнат Тамашэнка, Якаў Максіменка і інш.

Пасля падаўлення «бунту» дванаццаць хатучанцаў, у тым ліку Кузьма Балобан, Лукаш Мартыненка, Якаў Максіменка, Іван Піліпенка, Мануіл, Рыгор і Савелій Тамашэнкі, былі прыгавораны ў Рэчыцы да розных тэрмінаў турэмнага зняволення, а кіраўнікі сялянскага хвалявання Харытон Барысенка, які, дарэчы, у 1917 годзе стане членам партыі бальшавікоў, і Цімафей Заранік — да катаржных работ.

У рэвалюцыйнай агітацыйна-прапагандысцкай дзейнасці сярод насельніцтва прымалі ўдзел асобныя члены розных партый. Напрыклад, у Круках у 1905 годзе вёў гутаркі з вяскоўцамі аб заваяванні зямлі і волі, звяржэнні царскага самадзяржаўя агітатар-сацыяліст Іван Крывулька, які да таго працаваў у Маскве, прымаў удзел у рабочым руху. У гэтай справе Крывульку падтрымлівалі найбольш сацыяльна актыўныя жыхары Крукоў Іван Карпянок, Фама Салавей, Яфім Нікалаенка, настаўнік Крукаўскай царкоўнапрыходскай школы Іван Савельевіч Іваненка, жыхар вёскі Міхалёўка Кандрат Іпалітавіч Лабянок.

Не застаўся ў баку ад агітацыйна-прапагандыскай работы сярод сялян і былы навучэнец Кіеўскай духоўнай семінарыі Арыстарх Мігай, які за ўдзел у рэвалюцыйных падзеях 1905 года быў асланы ў вёску Перасяцінец Савіцкай воласці.

Пад уздзеяннем масавага рабочага руху, уздыму рэвалюцыйнай барацьбы ў вёсцы і растлумачальнай работы бальшавікоў восенню 1905 года на Беларусі, у тым ліку і ў палескіх мясцінах, узнікла сапраўды народная арганізацыя — сялянскі саюз. Пасля Рэчыцкага павятовага з'езда сялянскіх саюзаў найбольш актыўна працавалі такія аб'яднанні вяскоўцаў у Брагінскай, Мікуліцкай і некаторых нашых іншых валасцях. Не без уплыву іх адбыліся забастоўкі ў населеных пунктах Брагіншчыны. «В Брагинской и Микуличской волостях бастовали паденщики деревень Команов, Хатуча, Бытчин. Здесь выступления батраков и крестьян направляла сельская организация РСДРП»[1].

Па ініцыятыве бальшавікоў першамайскі дзень 1906 года ў Брагіне быў адзначаны забастоўкай. Аб гэтым сведчыць данясенне мінскага губернатара Курлова ў дэпартамент паліцыі:

«Несмотря на чрезвычайные полицейские меры, 1 мая 1906 года бастует часть рабочих в Гомеле, политические забастовки в Брагине, Речице, Мозыре, Рогачеве, Паричах и других пунктах»[2].

У 1906 годзе быў створаны Гомельскі акруговы камітэт РСДРП, які аб'яднаў сацыял-дэмакратычныя групы ў павятовых гарадах і мястэчках Гомельскага і суседніх паветаў. Пад уплывам гэтага актывізавала сваю дзейнасць Брагінская сацыял-дэмакратычная група. Але, як кажуць, не драмаў і палі-

[1] Шабуня И. К. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905 – 1907 гг. Мн., 1962. С. 226.

[2] Революционные события в Гомеле и Гомельской области в годы первой русской революции 1905 – 1907 гг. Гомель, 1955. С. 106.

цэйска-жандарскі корпус. З дакументаў дэпартамента паліцыі відаць, што 17 студзеня 1906 года начальнік Мінскага галоўнага жандарскага ўпраўлення ўступіў у хадайніцтва перад міністэрствам унутраных спраў аб прыцягненні да дазнання Брагінскай групы сацыял-дэмакратаў за арганізацыю сходак у вёсцы Бабчын і іншых населеных пунктах. У ліку членаў гэтай групы значыліся Савелій Крупадзёраў, Ціхан Крысенка, Іван Дубіна, Вера Казіміроўская, Дзям'ян Дарошчанка, Веніямін Рабоўскі, Ксенафонт Баханько, Піліп Скараход і іншыя.

Дарэчы, пра Рабоўскага. 13 лютага 1906 года дазнанне па Брагінскай сацыял-дэмакратычнай групе было закончана, але Рабоўскі знік. Начальнік Данскога ахоўнага аддзялення 14 лютага 1908 года паведаміў у асобы аддзел дэпартамента паліцыі аб ліквідацыі ў ноч на 25 снежня 1907 года Бахмуцкага акруговага камітэта сацыял-дэмакратаў, у ліку кіраўнікоў якога быў і рабочы жалезапракатнага завода Веніямін Рабоўскі. Але і на гэты раз паліцыі не ўдалося арыштаваць яго. Толькі ў маі 1911 года прыгаворам Віленскай судовай палаты Рабоўскага асудзілі па 129-м артыкуле крымінальнага ўлажэння (агітацыя і распаўсюджванне нелегальнай літаратуры) да трох гадоў пазбаўлення волі з адбыццём пакарання ў Бабруйскай крэпасці.

Пасля паражэння снежаньскага ўзброенага паўстання рэвалюцыйны рух на пачатку 1906 года стаў паступова затухаць. У абстаноўцы такога спаду і рэпрэсій з боку царызму стаў страчваць сваю вастрыню і сялянскі рух. Але ў сялянскіх масах захаваліся рэвалюцыйныя настроі. У асобных выпадках яны давалі сябе адчуць у розных праявах непадпарадкавання закону. І тады ўлады накіроўвалі на «бунтаўшчыкоў» узброеных ахоўнікаў парадку і салдат, як гэта было, напрыклад, у маленькай вёсачцы Стары Кацічаў на Камарышчыне.

Ажыўленне рабочых выступленняў у перыяд пасяджэння 2-й Дзяржаўнай думы выклікала вясной і летам 1907 года прыкметнае ўзмацненне сялянскіх хваляванняў на ўсёй Расіі, у тым ліку і ў нашым краі. Нягледзячы на аграрныя мерапрыемствы ўрада, сялянства заставалася непрымірымым ворагам памешчыкаў. На Брагіншчыне гэта паказалі сялянскія пратэсты супраць памешчыцкай эксплуатацыі, нанясенне наўмыснай шкоды памешчыцкай эканоміцы, як, напрыклад, падпалы памешчыцкіх гаспадарчых пабудоў у вёсцы Верхнія Жары, пашкоджанне млына касачоўскай памешчыцы Юліі Ракіцкай, падпалы лясоў у ялчанскага памешчыка, што мелі месца ў 1907—1908 гг.

Рэвалюцыйная работа мясцовых бальшавікоў у вёсцы аказвала ўплыў на павышэнне палітычнай свядомасці сялянства. Гэтага ж асабліва баяліся афіцыйныя ўлады. Царызм бязлітасна распраўляўся з прапагандыстамі рэвалюцыйных ідэй, з арганізатарамі сялянскіх хваляванняў і іх удзельнікамі. У бібліяграфічным даведніку членаў таварыства паліткатаржан і ссыльнапасяленцаў значацца В. С. Казіміроўская (падпольная мянушка Вера-Маруся), якая была асуджана да шасці гадоў катаргі і адбывала пакаранне ў Енісейскай губерні[1], ураджэнец вёскі Мікулічы А. Ц. Крысенка, які пасля суда на працягу двух гадоў утрымліваўся ў турме Бабруйскай крэпасці, настаўнік Брагінскай земскай школы І. П. Дубіна, які адбываў прысуд у Яраслаўскай губерні, і іншыя. Усе яны былі членамі РСДРП.

Хоць і радзей, з меншай сілай, але сялянскія выступленні працягваліся і пасля паражэння рэвалюцыі 1905—1907 гадоў. Цяпер ужо іх завадатарамі нярэдка былі ідэйна пераканаюыя людзі, якія прайшлі школу палітычнай барацьбы, з'яўляючыся непасрэднымі ўдзельнікамі рэвалюцыйных падзей. Адным з такіх сялянскіх арганізатараў і

[1] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 533. Воп. 2. Спр. 1428.

бунтароў быў ураджэнец вёскі Верхнія Жары, былы матрос, удзельнік паўстання на браняносцы «Потемкин» у 1905 годзе Дзмітрый Ющчанка. Захаваўся архіўны матэрыял, у якім расказваецца аб сялянскіх выступленнях супраць памешчыка ў вёсцы Верхнія Жары Ялчанскай воласці:

«В длинной цепи крестьянских посягательств на помещичью собственность поучительно выступление жителей д. Верхние Жары Речицкого уезда. Обострение отношений между крестьянами и соседним помещиком Рыбинковым началось в 1911 году, когда последний стал взыскивать деньги по исполнительным листам за самовольную пастьбу скота и порубки леса. С этого времени у помещика начались поджоги. Горели хозяйственные постройки, скирды сена, запасы хлеба, принадлежавшие не только Рыбинкову, но и его служащим, преследовавшим крестьян за самовольные порубки и потравы.

Организаторами поджогов были местные крестьяне Михаил Блудчий и особенно Дмитрий Ющенко, служивший матросом на броненосце «Потемкин» и прошедший школу политической борьбы.

Полиция доносила, что Ющенко «участвовал в бунте матросов этого броненосца, но был выручен товарищами». Далее в донесении отмечалось, что «по возвращении из военной службы Ющенко привез много брошюр и прокламаций революционного содержания, собирал неоднократно молодежь... говорил противоправительственные речи и пел с ними революционные песни», агитировал против помещиков и говорил, что «надо сравнять богатых и бедных».

По инициативе Ющенко была создана группа крестьян, производившая поджоги, причем для нее собирались деньги со всего населения в виде добровольных пожертвований. Когда зажиточный крестьянин Кулик отказался внести деньги на организацию поджогов, Ющенко сказал ему с укоризной: «Вы не хотите положить своей жизни за народ?»

Вслед за этим в имении Рыбинкова были сожжены скирды овса, сенопрессовальный завод и постройки трех служащих — крестьянина Кулика, лесников К. Блудчего и И. Ющенко.

По решению полицейских властей пятеро крестьянских «главарей», в том числе и Д. Ющенко, были сосланы на два года в северные губернии России»[1].

У матэрыялах Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Літвы, у фондзе «Віленская судовая палата», знаходзіцца абвінаваўчы акт ад 27 сакавіка 1913 года, у якім расказваецца, што сяляне вёскі Дублін Брагінскай воласці даўно вялі спрэчкі з графіняй Юліяй Ракіцкай з-за земляў маёнтка Міхалоў, які рашэннем судовай палаты быў прызнаны ўласнасцю памешчыцы. Але і пасля гэтага судовага ўстанаўлення сяляне ў 1905 годзе самаўладна завалодалі амаль усімі памешчыцкімі ўрочышчамі, што прылягалі да іхніх палосак, разбурылі адзін з будынкаў маёнтка.

Новым рашэннем судовай палаты ад 4 верасня 1912 года правы Ракіцкай на маёнтак Міхалоў былі пацверджаны. Туды прызначылі прыказчыкам аднаго са служачых шкуратоўскага маёнтка Восіпа Цэхановіча. Для аслупавання памешчыцкіх земляў і абмежавання іх канавай былі наняты рабочыя. Даведаўшыся аб гэтым, дублінскія сяляне выступілі з сякерамі, рыдлёўкамі і запатрабавалі спыніць землеўпарадкавальныя работы. Прыказчык Цэхановіч загадаў сялянам разысціся, запалохваючы «бунтаўшчыкоў» ссылкай на катаргу. Пасля гэтага дублінцы прымянілі сілу. У бойцы памешчыцкі прыказчык быў забіты.

У верасні 1913 года Віленская судовая палата разгледзела справу аб выступленні дублінскіх сялян супраць памешчыцы, забойстве яе прыказчыка. Былы вясковы староста Піліп Дзям'янавіч Кур'ян, селянін Кірыла Самуілавіч Кур'ян былі асуджаны на шэсць гадоў катаржных работ кожны. За ўдзел у бунце суд прыгаварыў трыццаць сялян да розных тэрмінаў зняволення і пастанавіў спагнаць ад маёмасці асуджанага Кірылы Кур'яна на карысць жыхаркі маёнтка Шкураты Фяцыліі Лук'янаўны Цэхановіч тры тысячы рублёў.

Яшчэ не паспелі аціхнуць вірлівыя падзеі 1905—1907 гадоў, як у ліпені 1914 года на краіну, яе народ цяжкім горам, незлічонымі пакутамі звалілася першая сусветная вайна. Вельмі многія сем'і пазбавіліся сваіх карміцеляў, прызваных у дзеючую армію і накіраваных

[1] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 295. Спр. 1905 – 1907. Л. 38 – 39.

на фронт. Выкліканая вайной разруха, заняпад і спусташэнне сялянскіх гаспадарак, голад і галеча народных нізоў з'явіліся чарговым штуршком да разгортвання новых выступленняў пралетарыяту і сялянства, а таксама салдат у акопах. Пад лозунгамі патрабавання міру, волі, зямлі і хлеба з кожным днём нарастаў і шырыўся народны пратэст супраць вайны і царызму. Усё гэта сведчыла аб наспяванні ў Расіі новай рэвалюцыйнай сітуацыі.

І. Ф. Ганжураў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З ПРАДСТАЎЛЕННЯ ПРАКУРОРА МІНСКАГА АКРУГОВАГА СУДА ПРАКУРОРУ ВІЛЕНСКАЙ СУДОВАЙ ПАЛАТЫ АД 12 КАСТРЫЧНІКА 1905 ГОДА

На основании п. 1 § 17 Наказа чинам прокурорского надзора доношу в. п., что 22 сентября с. г. утром управляющий им. Городище-Патона дворянин Бронислав Вословух заявил приставу 1-го стана Речицкого у., что трое крестьян дер. Комоново Брагинской вол. явились на поле им. Городище, что работало свыше 150 чел., на уборке картофеля, и угрозами насилия принудило оставить работы и разойтись.

По прибытии на место названного пристава некоторые крестьяне возвратились на работу и заявили приставу, что с работы их согнали крестьяне Андрей Мелешко, Степан Терещенко и Павел Ребенок. В этот день названные подстрекатели к беспорядку разысканы ие были и лишь по обыску, произведенному в их жилищах, у Ребенка найдены нагайка с проволочным наконечником и 2 болта, из которых и прикреплен к резиновой кишке.

На следующий день те же Мелешко, Терещенко и Ребенок с толпой молодых парней опять явились в им. Городище и вновь прогнали с работ около 300 чел. экономических рабочих. На этот раз пристав успел задержать Мелешко и Терещенко, Ребенок же скрылся.

Задержанные были отправлены в мест. Брагино, куда явилось 16 чел. крестьян, которые по подстрекательству сына содержателя аптеки Нафтолия Яффе стали требовать от пристава освобождения арестованных, что, однако, исполнено не было, и брожение мало-помалу улеглось...

Прокурор Минского окружного суда *Бибиков*

Дзяржаўны гістарычны архіў Літвы. Ф. 1405. Воп. 530. Спр. 141. Л. 118.

З АБВІНАВАЎЧАГА АКТА ТАВАРЫША ПРАКУРОРА МІНСКАГА АКРУГОВАГА СУДА АД 1 САКАВІКА 1906 ГОДА

...1 марта 1906 года в хут. Старый Катичев Иолчанской вол. Речицкого у. явился волостной старшина Игнатий Малиновский для отправления на публичную продажу, которая по предложению земского начальника 4-го уч. должна была состояться в этот день в мест. Комарине, разного скота местных крестьян, описанного 11 февраля 1906 г. на пополнение недоимок по мирским сборам, установленным приговорами волостного схода с 1901 по 1905 гг.

В сопровождении приглашенных для оказания содействия полицейского урядника Григория Макаренко, сельских старост и десятских старшина направился ко двору Матвея Томилко, у которого нужно было забрать описанные для продажи кобылицу и корову. Ворота усадьбы Томилко оказались запертыми на внутренний засов, а когда старшина и прибывшие с ним лица подошли к воротам, то собралась большая толпа крестьян, человек около 100, состоящая как из местных крестьян, так и из крестьян соседних хуторов: Нового Катичева и Александровки. Вооруженные кольями и палками крестьяне стали плотной стеной перед воротами Томилко, не дозволяя старшине пройти к воротам, крича, что он явился грабить их имущество и угрожая убить каждого, кто будет трогать их скот. Когда же, несмотря на эти угрозы, старшина и урядник попытались проникнуть во двор Томилко и приблизились к толпе, то крестьяне обступили их и, толкая их в грудь руками, отбрасывали назад. Среди крестьян, производивших насилие, особенно выделялись криками и учинением насилия Павел Томилко, Игнатий Мельник, Петр Дегтяренко, Иван Кудоман, Василий Абелец, Григорий Мишко, Климентий Ждан, Петр Пономаренко, Сав-

ва Курач и Денис Дегтяренко. Все эти лица постоянно наступали на старшину и сопровождавших его чинов полиции, когда последние подходили близко ко двору Томилко, толкали их и оттесняли назад. В происшедшей свалке Григорий Мишко и Климентий Ждан набросились на урядника, стали толкать его руками, и в это время Григорий Мишко сорвал с урядника шашку, оборвав на ней кожаную портупею, хотел сломать ее о свое колено, но старшина выхватил от него шашку. Тогда на помощь Мишко и Ждану подбежали Павел Томилко, Денис Дегтяренко, Петр Пономаренко, Василий Абелец и Савва Курач, которые схватили старшину и урядника за грудь и оттащили их со двора Томилко на улицу. Видя возбужденное настроение крестьян и опасаясь их угроз, старшина уехал, не забрав скота. Привлеченные к следствию в качестве обвиняемых Павел Томилко, Григорий Мишко, Денис и Петр Дегтяренко, Савва Курач, Василий Абелец и Иван Кудоман виновными себя не признали и объяснили, что они только не допустили старшину забрать скот, но никаких насилий не делали: при этом Курач, Абелец, Кудоман показали, что еще до приезда старшины крестьяне сходом порешили не выдавать ему скота.

Товарищ прокурор *(подпіс неразборлівы)*

Революционное движение в Белоруссии. 1905 — 1907 гг. Мн., 1955. С. 522 — 523.

Пражыў свабодна, ярка...

Рэвалюцыя 1905 — 1907 гг., мэтай якой былі дэмакратычныя пераўтварэнні ў грамадстве, на ўскраінах Расійскай імперыі абудзіла разам з тым і нацыянальна-вызваленчы рух. І пасля таго як рэвалюцыя была задушана, свой працяг на Беларусі яна мела ў легальнай або нелегальнай дзейнасці нацыянальна свядомай інтэлігенцыі. Адным з яркіх яе прадстаўнікоў быў наш зямляк С. Е. Палуян. Брагіншчына можа ганарыцца гэтым выдатным сваім сынам, дружбаю з якім у свой час даражылі Янка Купала, Максім Багдановіч, Цішка Гартны і іншыя відныя дзеячы нацыянальнага адраджэння. Дастаткова сказаць, што адзін са сваіх шэдэўраў, паэму «Курган», Янка Купала прысвяціў памяці С. Е. Палуяна. Яму ж прысвечаны і адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў М. Багдановіча «Вянок». У пэўным сэнсе жыццёвы лёс С. Е. Палуяна стаў для М. Багдановіча ўзорным, пра што ён сказаў у вершы, які так ім і названы — «С. Е. Палуяну»:

Так свабодна, так ярка пражыць —
Лепшай долі няма на зямлі.

Сяргей Еўфанавіч Палуян нарадзіўся 7(19) кастрычніка 1890 г. у мястэчку Брагін. Яго маці Аляксандра Дзмітрыеўна Бахонка паходзіла з заможнага брагінскага сялянства. Бацька будучага

С. Е. Палуян. Партрэт работы М. Будавея

Бацькі Палуяна Аляксандра Дзмітрыеўна і Еўфан Іванавіч. Кіеў, пачатак XX ст.

літаратара Епіфан Іванавіч быў арандатарам, а ў 1897 г. купіў зямлю ў маёнтку Крышычы (цяпер Калінкавіцкі раён). У Крышычах прайшло свядомае маленства С. Е. Палуяна, тут у ягоным сэрцы абудзілася любоў да роднай прыроды і да ўсяго беларускага. Вучыўся будучы публіцыст у Мазырскай і Мітаўскай (цяпер Елгава, Латвія) гімназіях. У гады вучобы С. Е. Палуян далучыўся да рэвалюцыйнай дзейнасці, і можна з поўнай падставай сказаць, што як грамадзянін і літаратар ён быў народжаны рэвалюцыяй 1905—1907 гг.

У савецкі час імя С. Е. Палуяна (трагічна загінуў 7(20) красавіка 1910 г.) па ідэалагічных прычынах было амаль што забытае. Сёння творчасць выдатнага публіцыста стала для ўсіх даступнай — пасля таго як у 1986 г. выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла яго кнігу «Лісты ў будучыню». Вядомыя даследчыкі беларускай літаратуры Т. В. Кабржыцкая і В. П. Рагойша правялі шматгадовую скрупулёзную работу, вынікам якой і стала названая кніга. Уступны артыкул да яе ў скарочаным выглядзе, а таксама іншыя матэрыялы кнігі змяшчаюцца ніжэй.

Ускрылены рэвалюцыяй

...З маленства пасяліліся ў Сяргеевым сэрцы любоў да родных мясцін, бацькоўскай мовы, працоўных людзей. Роздум пра чалавечы лёс, пра тое, што адны жывуць багата, а другія, як ні працуюць, галеюць без хлеба, прыйдзе потым, разам з пасталеннем. Цяпер жа ён проста здзіўляў бацькоў неспадзяванымі пытаннямі: «Чаму ў нас больш зямлі, чым у крышыцкіх мужыкоў?», «Ці праўда, што мужык такі самы чалавек, як і пан?», «Чаму дома паміж сабой мы гаворым па-нашаму, а як прыедуць госці — па-руску ці па-польску?»

Не знайшоўшы ў бацькоў на гэтыя пытанні яснага адказу, Сяргей шукаў яго ў не такім далёкім ад Крышыч Мазыры, куды бацька адвёз яго вучыцца ў шасцікласную прагімназію. У прагімназіі вучылася тады 146 дзяцей, плата была параўнальна невялікая — 40 рублёў у год. Але не ў настаўнікаў прагімназіі, а ў мазырскіх рабочых пачаў Сяргей нарэшце знаходзіць жаданы адказ на свае пытанні. Пасябраваўшы з сынам аднаго рабочага, падлетак пачаў хадзіць на маёўкі, слухаць гарачыя прамовы ў абарону працоўных, разносіць пракламацыі. Пачутае і вычытанае стаў пераказваць сваім аднакласнікам. Пра гэта стала вядома дырэктару прагімназіі. Над Сяргеем навісла пагроза выключэння. А тут яшчэ, прыязджаючы на пабыўку дадому, ён прыхоплівае з сабою рэвалюцыйныя брашуры, вядзе рэвалюцыйную агітацыю сярод моладзі ў суседніх Юравічах, ие на жарт палохаючы тым самым мясцовае начальства. Бацька тэрмінова забірае Сяргея з Мазыра і адвозіць яго ў Прыбалтыку, у Мітаву (цяпер Елгава, Латвія). Там працуюць гімназічнымі выкладчыкамі два дзядзькі Сяргея, Сцяпан Дзмітрыевіч і Вікенцій Дзмітрыевіч, дзякуючы ім у Мітаўскай гімназіі вучацца Сяргеевы сёстры. Хоць далёка, затое надзейна: дзеці пад добрым наглядам, ды ільготы ў вучобе пэўныя маюць як родзічы выкладчыкаў.

Аднак Сяргей трапіў, як кажуць, з агню ды ў полымя. Пачынаецца рэвалюцыя 1905 года. Рабочыя Мітавы ўзводзяць барыкады. Бастуюць гімназісты, студэнты. Сяргей — у самай гушчыні рэвалюцыйных падзей: удзельнічае ў мітынгах, дэманстрацыях, забастоўках. Яго строга папярэджвае дырэкцыя гімназіі. Але хіба можна астудзіць запал пятнаццацігадовага юнака нейкім, нават «вельмі строгім», папярэджаннем? Дырэкцыя ідзе на крайнія меры: збіраецца выключаць «нядобранадзейнага» гімназіста. Дзядзькі Сяргея папярэджваюць аб гэтым Епіфана Іванавіча. Бацька, не чакаючы, калі яго сыну дадуць «воўчы білет», прыязджае ў Мітаву, забірае яго дадому.

Дома — скандал. Як жа, бацька штосілы выбіваецца «ў людзі», з мужыкоў зрабіўся «панам», а тут — сын-рэвалюцыянер! Начальства пачынае пазіраць скоса... Прыстаў папярэджвае: «Толькі паважаючы вас, пане Палуян...» Усё, хопіць! Ніякай больш табе, Сяргей, навукі! Будзеш сядзець дома, памагаць гаспадарыць, ва ўсякім разе — пакуль аціхне гэтая палітычная завіруха.

Але не такі быў ён, Сяргей Палуян, каб, ходзячы нават за плугам, апускаць вочы долу, нічога больш не бачыць навокал. Ён не мог абысціся без зорак! Позірк яго сягаў угару, за нізкі небакрай, туды, дзе займалася зара новага жыцця.

А зара займалася!

...Ён едзе ў Кіеў. Гэта самы блізкі ад Крышыч вялікі горад, культурны і палітычны цэнтр, дабрацца да якога прасцей за ўсё: ад Юравіч — параходам, спачатку па Прыпяці, а пасля па Дняпры. Там жыве дзядзька Акім, дваюрадны брат Іван, які вучыцца ў політэхнічным інстытуце.

У Кіеве Сяргей Палуян пасяляецца спачатку ў дзядзькі, а пасля наймае невялікі пакойчык. Збіраецца здаць экстэрнам экзамены за восем класаў гімназіі, каб пасля паступіць ва універсітэт. Жыве на выпадковыя заробкі: то падзаробіць крыху ва Упраўленні Паўднёва-Заходняй чыгункі, дзе працуе яго дзядзька, то сачыненне гультаю-гімназісту напіша, за якое той

самую высокую адзнаку атрымае, то вычытае чарговую карэктуру ў «Киевских вестях»... Праз брата Івана звязваецца з мясцовымі сацыял-дэмакратамі, удзельнічае ў кіеўскім падполлі (потым Цішку Гартнаму ў Вільні па сакрэту будзе расказваць, што «належыць да ўкраінскіх сацыял-дэмакратаў»).

Нягледзячы на матэрыяльныя цяжкасці, Сяргей Палуян — высокі, русавалосы, чырванашчокі юнак — увесь поўны энергіі, аптымізму. Восенню 1908 і вясной 1909 гг. яго неаднойчы бачаць у кіеўскай кнігарні, дзе ёсць і беларускі аддзел. Пры ім нязменна — нумары «Нашай нівы», «Жалейка» Янкі Купалы, іншыя першыя беларускія выданні. Тады ж спрабуе свае сілы ў літаратуры. І адразу, мінуючы стадыю пачаткоўства, дасягае значнага творчага плёну.

...У Вільню Сяргей Палуян прыехаў на пачатку лета. Яшчэ ў чэрвені газета змясціла яго невялікі допіс з Кіева пад крыптанімам «П.» і «Ліст з Украіны» з пометкай «Кіеў». Але ўжо два наступныя чэрвеньскія «лісты» паметкі такой не мелі, хоць і былі таксама «з Украіны».

...Сяргей Палуян адразу сышоўся і пасябраваў з Янкам Купалам, які ў той час працаваў у «Нашай ніве» і стаў яму самым блізкім сябрам. Увосень 1909 года, з надзеяй атрымаць працу ў «Нашай ніве», у Вільню прыязджае Цішка Гартны. Палуян і Гартны знаёмяцца, абменьваюцца думкамі па многіх пытаннях грамадскага жыцця, супастаўляюць свае сацыялістычныя ідэалы — таксама становяцца сябрамі.

Але ў рэдакцыі «Нашай нівы» ў 1909 г. далёка не ўсе былі такія, як Янка Купала і Цішка Гартны. Па трапнай характарыстыцы С. Палуяна, рэдакцыя тады складалася з дзвюх «палат» — верхняй і ніжняй. «Верхняя палата» (а сюды ўваходзілі рэдактар А. Уласаў, І. Луцкевіч, Я. Манькоўскі, А. Бульба і інш.) імкнулася вяршыць «высокія палітычныя матэрыі»: у ёй ішла актыўная гульня з ганарарамі з боку царквы і некаторых буйных мясцовых чыноўнікаў, змаганне за фінансавыя падачкі, уплывы, рэкламы... «Ніжняя палата» (а яна складалася з Янкі Купалы, С. Палуяна, Ядвігіна Ш., мастака Я. Драздовіча) рабіла ўсю штодзённую работу рэдакцыі: пісала большасць матэрыялаў, апрацоўвала розныя допісы ў газету, падтрымлівала сувязь з чытачамі і падпісчыкамі газеты і г. д.

...Да палітыканства і калялітаратурнай валтузні «верхнепалатнікаў» далучалася нярэдка іх эстэтычная глухата. Ды што яны, калі нават Ядвігін Ш., сам пісьменнік таленавіты, не прымае вершаў М. Багдановіча, лічыць іх «дэкадэншчынай», творамі «не для народа». З Ядвігіным Ш. лёгка згадзіўся рэдактар А. Уласаў, прапанаваўшы здаць вершы «ў архіў». Так і не друкуецца ў газеце М. Багдановіч пасля мая месяца, як былі апублікаваны з цяжкасцю адваяваныя Янкам Купалам і падпісаныя псеўданімам Максім Крыніца яго «Дзве песні, пераклад з Ю. Святагора».

Палуян, з аднаго боку, падтрымлівае Багдановіча, піша яму шчырыя лісты, у якіх захвочвае да творчасці, да працы над формаю верша, яго мовай, заклікае паглыбляць і пашыраць грамадзянскія матывы паэзіі, інфармуе пра бягучыя падзеі беларускага літаратурнага жыцця (потым у архіве М. Багдановіча будуць зберагацца восем палуянаўскіх лістоў, страчаных, на жаль, у гады Вялікай Айчыннай вайны). Нават аднойчы праз газетную «Паштовую скрынку» вырашыў яго падтрымаць: «Яраслаў на Волзе, Максіму Б.— вічу: Вашы вершы, тлумачаныя з Гейнэ, чытацелі «Нашае нівы» будуць толькі вітаць. Гейнэ найвялікшы пясняр людскі, і перакладаць яго на беларускую мову — нават заслуга!» (10 верасня 1909 г.)

З другога боку, С. Палуян ваюе — адзін! — супраць усёй рэдакцыі за прызнанне М. Багдановіча. І перамагае! К канцу 1909 г. беларускі пясняр выходзіць на старонкі «Нашай нівы», каб ужо ніколі з іх не сыходзіць. Удзячны Палуяну за падтрымку, М. Багдановіч у снежні 1909 г. друкуе ў «Нашай ніве» прысвечаны яму верш, а 9 лютага 1910 г. дасылае яму сваю фатаграфію з прачулым вершаваным надпісам: «Я, нядужы, бясскрыдлы паэт, Помню, раз пазабыў сваё гора, Бо ў той час атрымаў ваш прывет...» Нават свой адзіны зборнік «Вянок» (1913) выдае з прысвячэннем: «Вянок на магілу С. Палуяна».

...У пачатку 1910 г. С. Палуян зноў выехаў у Кіеў. «Верхнепалатнікі» нават іраніэавалі з гэтага (нідзе не дзенецца, вернецца!), змясціўшы ў «Паштовай скрынцы» газеты адкрыты адказ на запытанне Ц. Гартнага: «Магілёў. Нашаму прыяцелю Цішцы. «Адзін» ізноў у Кіеве...» (18 сакавіка 1910 г.)

Аднак С. Палуян у Вільню так ужо і не вярнуўся.

У ноч з 7 на 8 сакавіка ў невялікім цёмным пакойчыку ў доме па Гогалеўскай, 37, у страшэннай беднасці і адзіноце, С. Палуян пакончыў жыццё самагубствам.

«Я так люблю жыццё, светласць і красу, ды не на маю долю выпала гэта».— напісаў ён у перадсмяротным лісце.

• • •

...Першая друкаваная праца Сяргея Палуяна — гэта яго артыкул «Пра нацыянальную школу на Беларусі», змешчаны ў часопісе «Українська хата» (1909, № 5). З гэтага артыкула, як з пачатковага пункта, разыходзяцца два вызначальныя жанравыя вектары яго творчасці — публіцыстыка і крытыка. Артыкул гэты — як бы водгук на першы нумар культурна-асветнага часопіса «Белорусский учитель», які выйшаў у Пецярбурзе ў 1909 годзе. Але па сутнасці гэта — палкае публіцыстычнае выступленне ў абарону нацыянальнай школы, роднай мовы, напісанае з выпалку выхаду ў свет названага часопіса.

...Пашырэнне грамадзянскага статусу роднай мовы — адна з найгалоўнейшых тэм палуянаўскай публіцыстыкі, якая знайшла ўвасабленне ў многіх публікацыях і перш за ўсё — у цыкле артыкулаў «З нашага жыцця». Родную мову С. Палуян называе «народнай», бо галоўны яе

захавальнік — працоўныя народныя масы. У той час як вышэйшыя слаі грамадства здрадзілі народу, вельмі хутка перайшлі пануючую культуру, апалячыліся ці абруселі, народ, «забіты беднасцю і непамернай працай...» усё ж такі глыбока захаваў у сваіх брудных вёсках бацькоўскую мову». Мова — галоўны фактар духоўнага жыцця нацыі. Таму «беларускі нацыянальны рух, як вялікая жыццёвая гістарычная сіла, можа жыць толькі тады, калі пад яго будзе падведзены такі фундамент, як гібка апрацаваная мова, дый літаратура і навука ў гэтай мове».

...Духоўнае адраджэнне роднага народа было сэнсам існавання С. Палуяна. Пачатак яго ён звязваў з першай рускай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыяй («палітычнай завірухай», «завірухай», «часам свабоды» — паводле эзопавай мовы С. Палуяна), якая «ад краю да краю скалыхнула ўсё Расейскае гасударства» («Аб беларускім нацыянальным адраджэнні»). Сацыяльнаму і нацыянальнаму разняволенню народа ён служыў як мог. Аднак С. Палуян ніколі не замыкаўся ў нацыянальных межах, ніколі не праяўляў нацыяналістычнай абмежаванасці і высакамер'я. Наадварот, ён, больш за ўсё любячы родны край і народ, нястомна заклікаў вучыцца ў іншых народаў. Раскатурхваючы нацыю ад летаргічнага духоўнага сну, нязменна звяртаўся да вопыту суседзяў — рускіх і ўкраінцаў, палякаў і літоўцаў. С. Палуян першы ў беларускім дарэвалюцыйным друку напісаў пра чувашоў («Нацыянальнае адраджэнне чувашоў») і якутаў («Якуцкі нацыянальны рух»), пра якіх увогуле мала хто ведаў у тагачаснай Беларусі.

...Зразумела, асаблівае месца ў сэрцы С. Палуяна займалі Украіна, украінская культура, справы нацыянальнага адраджэння ўкраінскага народа. Пяру яго належаць шэсць «Лістоў з Украіны» — палова з сістэматызаванага газетна-публіцыстычнага цыкла, пачатага Я. Журбою. С. Палуян пастаянна інфармаваў беларусаў пра ўкраінскае грамадска-палітычнае і культурнае жыццё, новыя ўкраінскія выданні, цікавасць украінцаў да беларускай літаратуры і г. д. Яго допісы насычаны багатым фактычным матэрыялам, прасякнуты духам братэрскай павагі да Украіны і яе народа, напоўнены пачуццём удзячнасці за разуменне і дапамогу. С. Палуян дае характарыстыку навуковаму і літаратурнаму жыццю тагачаснага Кіева, выказвае сваю перакананасць у тым, што «Кіеў можа і павінен зрабіцца (пакуль у нас на беларускай зямлі не будзе высшых школ, у каторых наша моладзь магла б вучыцца, не выязджаючы з роднага краю) адным з цэнтраў беларускай нацыянальнай работы». Звяртаючыся да моладзі з заклікам яднаць свае сілы, каб дапамагчы свайму народу «выбіцца з цемнаты адвечнай», здабыць светлае і шчаслівае будучае, С. Палуян заканчвае адзін са сваіх лістоў словамі вялікага Кабзара:

І чужому научайтесь,
Й свого не цурайтесь,
Бо хто матір забуває,
Того бог карае...

...Публіцыстыкай і крытыкай творчасць С. Палуяна не абмяжоўвалася. Паводле сведчання сучаснікаў, ён пісаў «вершы з багатым зместам, апавяданні на сучасны лад», п'есы для тэатра, складаў «зборнік цудоўных малюнкаў-сімвалаў» для дзяцей, хрэстаматыю па гісторыі Беларусі, навукова-папулярныя кніжкі для народа. З усяго гэтага захавалася толькі апавяданне «Вёска» і верш у прозе «Хрыстос уваскрос!», апублікаваныя ў свой час на старонках «Нашай нівы». У «Вёсцы» ў алегарычнай форме паказваецца разарэнне, гібель старой беларускай вёскі, асуджанай на смерць варожаю ёй сілаю. Сіла ж гэта (хоць яе Палуян прама не называе, але яна лёгка ўгадваецца) — жорсткі сацыяльны і нацыянальны прыгнёт. Супрацьлеглы «Вёсцы» па настрою і танальнасці верш у прозе «Хрыстос уваскрос!». У ім пісьменнік, пераасэнсоўваючы агульнавядомы міф аб уваскрэсенні Хрыста, гаворыць пра непазбежнасць духоўнага адраджэння Беларусі, называе свята вялікадня — «святам адвечнага ажыўлення», выказвае цвёрдую ўпэўненасць, што родны край уваскрэсне, скіне «з шыі ярмо адвечнага гора і нуды». Рэлігійны міф, як бачым, напаўняецца новым алегарычным зместам.

...С. Палуян (...) быў нястомны «сявец у родных слоў сяўбе» (Я. Купала). Ён рассяваў зерне светлых думак — нібы слаў лісты ў будычыню, наладжваў трывалую сувязь з патомкамі, з намі. І мы шчасліва адклікаемся на яго вечна малады і шчыры голас.

З творчай спадчыны Сяргея Палуяна

ХРЫСТОС УВАСКРОС!

...Хрыстос уваскрос!

З вялікім святам адвечнага аджыўлення віншую цябе, Вялікі Беларускі Народ!

Гэтай вялікай ночы страсі з сябе ўсю пагарду, увесь бруд, каторым аблепліваюць цябе ад вякоў. Чыста вымыйся, прыбярыся ў найлепшую апратку, каб хоць на адзін дзень стаў ты роўным з усімі. Ідзі туды, дзе пачуеш гэтыя вялікія словы:

— Хрыстос уваскрос!

Услухайся ў іх. Якая вялікая сіла, які ўсёажыўляючы змест захаваны ў іх. Ці не чуеш, як радасцю надзеі, радасцю скорага ўваскрэсення вее на цябе ад гэтых слоў:

— Хрыстос уваскрос!

Радуйся, мой родны край. Надзея, як жывучая вада, ліецца ў тваю душу. Скора і ты ўваскрэснеш ад доўгага мёртвага сну. Вясна прыйшла і да цябе.

— Хрыстос уваскрос!

Над ім здзекаваліся. Яго білі па твары, сцябалі бізуном. Плявалі на яго. Кпілі з яго. У канцы распялі і распятага не пераставалі мучыць. Спечаныя смагай вусны звільжывалі

воцатам і жоўцю. Ён памёр на крыжы паміж двух разбойнікаў. Але ўсё ж ткі.

— Хрыстос уваскрос!

Уваскрос Хрыстос, і крыж, раней знак пагарды і сораму, зрабіўся святыняй усяго свету. Мукі Хрыстовы змылі ўсё з яго. І штогоду вялікай вясенняй ночы тысячы цэркваў і касцёлаў свецяцца агнямі свечак, ліецца радасны пераклік званоў, крыж падымаецца над мільёнамі схінёных галоў і ў паветры носіцца радасны шэпт:

— Хрыстос уваскрос!

Што гавораць табе званы, Беларускі Народ? Ці не віншуюць яны цябе і з тваім уласным вялікім святам? Скора ж і ты ўваскрэснеш!

Ад вякоў пагарджалі табой, тваей мовай; ад вякоў мелі за быдла, годнае толькі на цяжкую, надсільную работу. Не давалі табе расці і развівацца. Воцатам чужой культуры звільжалі твае спячоныя смагай свету вусны. Лепшых тваіх сыноў адрывалі ад цябе, прымушалі іх зрабіцца здраднікамі. А цяпер пышаюцца імі, называюць іх сваімі. І яны так іхнія.

А хіба ж яны не любілі цябе? Хіба лепшы жар свайго сэрца афяравалі яны не табе? А гдзе яны?

Іх няма з табой. З самага малку адарвалі ад роднай глебы, атруцілі эдрадай. І іх, тваіх дзяцей, маюць за зброю проці цябе.

Цябе катавалі. Ты цярпеў мукі, але не ўмёр. Глыбока, глыбока ты захаваў сваю душу.

Хрыстос быў з табой у тваіх муках; і ён разам з табой цярпеў іх. Колькі разоў распіналі яго разам з табой! Больш разоў, чым ёсць пясчынак на дне мора! Але кожнага году па ўсёй Беларускай зямлі разносіцца кліч

— Хрыстос уваскрос!

...І ты ўваскрэснеш, мой родны край! Скінеш з шыі ярмо адвечнага гора і нуды.

Дагэтуль мы плачам, дагэтуль мы стогнем,
Адвечных не можам пазбыцiся слёз...

Ты ўжо перастаеш плакаць. Ты падняў свой твар, з надзеяй ловіш зыкі званоў:

«Бом! Бом!.. Прачынайся ад сну, Беларусь! Годзе стагнаць ды жаліцца, жальба нічога не дасць табе. Уставай! Ідзі будаваць эруйнаваную бацькаўшчыну!»

Наперад па шчасце! Хай злое ўсё дрогне!
Вясна ўжо на свеце — Хрыстос уваскрос!

Я бачу, як святлее твой твар, мой родны краю. І, поўны сілы і веры, я крычу ва ўсю моц тваім нівам, лясам і балотам, тваім панурым вёскам, тваім пакрыўджаным сынам:

— З вялікім святам віншую! З вялікім святам, Вялікі Беларускі Народ!

— Хрыстос уваскрос!

З прысвячэнняў С. Е. Палуяну

ЯНКА КУПАЛА

З ВЕРША «ПАМЯЦІ С. ПАЛУЯНА»

Сышоў ваяк за долю, волю і народ,
Пяском засыпалі жвіровым.
Спі, мой таварыш, спі! надойдзе новы ўсход,
І брат заплаце добрым словам.

Спі, дружа мой, сявец у родных слоў сяўбе
Па нашай дрэмлючай староицы!
Няхай зямелька будзе лёгкай для цябе,
Як лёгка рваўся ты да сонца.

МАКСІМ БАГДАНОВІЧ

С. ПАЛУЯНУ

(Трыялет)

Ты быў, як месяц, адзінокі:
Самотна жыў, самотна ўмёр.
Хоць свет і людны, і шырокі, —
Ты быў, як месяц, адзінокі.
Красу, і светласць, і прастор
Шукаў — і, ад усіх далёкі,
Ты быў, як месяц, адзінокі:
Самотна жыў, самотна ўмёр.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Палуян С. Лісты ў будучыню. Мн., 1986. С. 8—30, 38 — 40, 137, 145.

Падрыхтавалі
І. М. Паланейчык, М. С. Сяргееў

Паўстоўскі на Брагіншчыне

Будучы гімназістам Першая кіеўскай класічнай гімназіі выдатны рускі пісьменнік Канстанцін Георгіевіч Паўстоўскі (1892 — 1968) прыязджаў на Брагіншчыну ў маёнтак Ёлчу, дзе ў чэрвені — ліпені 1910 г. жыў у сваіх далёкіх сваякоў. Вядома, што ў 1876 г. маёнтак належаў купцам братам Андрэю, Флору і Якаву Селюковым, аб чым сведчыць «Список землевладельцев Минской губернии за 1876 г.», выдадзены ў 1877 г. у Мінску. Яны мелі 13 597 дзесяцін зямлі, 4 млыны (2 вадзяныя, конны і паравы) і 2 карчмы. У 1910 г. у маёнтку, відаць, ужо гаспадарылі іх дзеці.

Прабыўшы ў Ёлчы да сярэдзіны ліпеня, Канстанцін Паўстоўскі вярнуўся

ў Кіеў. Але паездка на Палессе настолькі ўразіла і запомнілася васемнаццацігадоваму юнаку, што ў хуткім часе ён напісаў аб тым сваё першае апавяданне, якое было надрукавана вясной 1911 г. у кіеўскім літаратурным часопісе «Агні».

Пазней, працуючы над аўтабіяграфічнымі старонкамі «Аповесці пра жыццё» (ч. 1 — 6, 1946 — 1963), над першай яе часткай «Далёкія гады», пісьменнік зноў згадаў гэту паездку і падрабязна, з любоўю апісаў яе ў раздзеле «Карчма на Брагінцы», дзе расказаў пра маёнтак Ёлчу, яе гасцінных гаспадароў Сеўрукоў (так назваў у кнізе Паўстоўскі сваіх сваякоў), пра паездку ў мястэчка Камарын і сяло Пагоннае (цяпер Хойніцкі раён), з сімпатыяй налісаў пра Андрэя Гона і яго смелыя налёты на панскія маёнткі, з рамантычнай узнёсласцю распавёў пра «магілёўскіх дзядоў» (сляпых жабракоў) і, вядома ж, пра палескія краявіды. «Палессе захавалася ў маёй памяці як самотная і крыху загадкавая краіна. Яна цвіла кураслепам і аерам, шумела вольхамі і густымі вербамі...» — пісаў Паўстоўскі ў сваім шырокавядомым творы.

Аўтабіяграфічныя старонкі з «Аповесці пра жыццё» К. Г. Паўстоўскага

КОРЧМА НА БРАГИНКЕ

...В то лето по Черниговской губернии и по всему Полесью бродили неуловимые разбойничьи шайки. Они налетали на фольварки, на поместья, грабили вочту, нападали на поезда.

Самым смелым и быстрым из всех атаманов был Андрей Гон. Отряды драгун и стражников обкладывали его в лесах, загоняли в непроходимые полесские топи, но Андрей Гон всегда вырывался на волю, и зарева пожаров снова шли следом за ним в темные ночи.

Вокруг Андрея Гона уже плела свою сеть легенда. Говорили, что Андрей Гон — защитник бедняков, всех обездоленных и сирых, что нападает он только на помещиков, что сам он не то черниговский гимназист, не то сельский кузнец. Его имя стало символом народного мщения.

Я ехал на лето как раз в те места, где хозяйничал Андрей Гон, к дальним моим родственникам Севрюкам. У них в Полесье была небогатая маленькая усадьба Ольча. Поездку эту мне устроил Боря. Севрюков я совершенно не знал.

— Ты отдохнешь в Ольче, — сказал он. — Севрюки люди со странностями, но очень простые. Они будут рады.

Я согласился поехать в Ольчу, потому что другого выхода у меня не было. Я перешел в восьмой класс гимназии. Только что я сдал экзамены, и мне предстояло томительное лето в Киеве...

На второй день к вечеру пароход подвалил к низкому полесскому берегу Днепра. Тучи комаров зудели в вышине. Багровое солнце опускалось в беловатый пар над рекой. Из зарослей тянуло холодом. Горел костер. Около костра стояли поджарые верховые лошади.

На берегу меня ждали Севрюки: худой человек в сапогах и чесучовом пиджаке — хозяин поместья, невысокая молодая женщина — его жена и студент — ее брат.

Меня усадили на телегу. Севрюки вскочили на верховых лошадей и, гикая, помчались вперед размашистой рысью.

Они быстро скрылись, и я остался один с молчаливым возницей. Я соскочил с телеги и пошел рядом по песчаной дороге. Трава по обочинам стояла в темной болотной воде. В этой воде тлел, не потухая, слабый закат. Равномерно посвистывая тяжелыми крыльями, пролетали дикие утки. Из кустов серыми лохмотьями, припадая к земле, выползал туман.

Потом сразу закричали сотни лягушек, и телега загрохотала по бревенчатой гати. Показалась усадьба, окруженная частоколом. На поляне в лесу стоял странный восьмиугольный деревянный дом со множеством веранд и пристроек.

Вечером, когда мы сидели за скромным ужином, в столовую вошел сутулый старик в постолах и картузе с оторванным козырьком. Он снял с плеча длинное охотничье ружье и прислонил к стенке. За стариком, кляцая когтями по полу, вошел пегий пойнтер, сел у порога и начал колотить по полу хвостом. Хвост стучал так сильно, что старик сказал:

— Тихо, Галас! Понимай, где находишься!

Галас перестал бить хвостом, зевнул и лег.

— Ну, что слышно, Трофим? — спросил Севрюк и, обернувшись ко мне, сказал: — Это наш лесник, обходчик.

— А что слышно? — вздохнул Трофим, садясь к столу. — Все то же. В Лядах подпалили фольварк, а за Старой Гутой вбылы до смерти пана Капуцинского, царствие ему небесное. Тоже, правду сказать, был вредный и подлый старик. Кругом всех убивают и рушат, только вас одних милуют. Странное дело! И чего он вас не трогает, тот Андрей Гон? Неизвестно. Может, прослышал, что вы к простому люду доверчивые. А может, еще не дошли до вас руки.

Жена Севрюка, Марина Павловна, засмеялась.

— Вот так он все время, Трофим, — заметила она. — Все удивляется, что мы еще живы.

— И живите себе на здоровье, — сказал Трофим. — Я не против. А за поводыря слыхали?

— Нет, — живо ответила Марина Павловна. — А что?

— Да что? Завтра его ховать будут. В Погонном. Поехать бы следовало.

— Мы поедем, — сказала Мария Павловна. — Непременно.

— За то вам бог много прегрешений отпустит, — вздохнул Трофим. — И меня с собой прихватите. Мне туда идти через силу.

Трофим огляиулся на окно и спросил вполголоса:

— Никого лишнего нету?

— Все свои, — ответил Севрюк. — Говори.

— Так вот, — таинственно сказал Трофим, — в корчме у Лейзера на Брагинке собрались майстры.

— Кто? — спросил студент.

— Ну, майстры, могилевские деды.

— Погоди, Трофим, — сказал Севрюк. — Дай людям объяснить. Они про могилевских дедов ничего не знают.

Тогда я впервые услыхал удивительный рассказ о знаменитых могилевских дедах. После этого рассказа время сдвинулось и перенесло меня на сто лет назад, а может быть, и еще дальше — в средние века.

Издавна, еще со времен польского владычества, в Могилеве на Днепре начала складываться община нищих и слепцов. У этих нищих — их звали в народе «могилевскими дедами» — были свои старшины и учителя — майстры.

Они обучали вновь принятых в общину сложному своему ремеслу — пению духовных стихов, умению просить милостыню — и внушали им твердые правила нищенского общежития.

Нищие расходились по всему Полесью, Белоруссии и Украине, но майстры собирались каждый год в тайных местах — в корчмах на болотах или в покинутых лесных сторожках — для суда и приема в общину новых нищих.

У могилевских дедов был свой язык, непонятный для окружающих.

В неспокойные времена, в годы народных волнений, эти нищие представляли грозную силу. Они не давали погаснуть народному гневу. Они поддерживали его своими песиями о несправедливости паиской власти, о тяжкой доле замордованного сельского люда.

После этого рассказа Полесье, куда я сейчас попал, представилось мне совершенно иным, чем раньше. Оказалось, что в этом краю болот, чахлых лесов, туманов и безлюдья тлеет, не погасая, подобно длинным здешним закатам, огонь мести и обиды. С тех пор мне казалось, что сермяги нищих пахнут не хлебом и пылью дорог, а порохом и гарью.

Я иачал присматриваться к слепцам, к убогим и понял, что это особое племя не только несчастных, но талантливых и сильных волей людей.

— Зачем они собрались в корчме на Брагинке? — спросил Севрюк.

— Их дело, — неохотно ответил Трофим. — Что ии год, то они собираются. Стражники тут шныряли?

— Нет, — ответил Севрюк. — Говорят, были вчера в Комарине.

— Ну так! — Трофим встал. — Спасибо. Пойду на сеновал, отдохну.

Трофим ушел, но не иа сеновал, а в лес и появился только на следующий день утром.

Марииа Павловиа рассказала мие историю мальчика-поводыря.

Два дня назад слепец с поводырем забрели в усадьбу богатого помещика Любомирского. Его погнали со двора. Когда слепец вышел за ворота, сторож-ингуш (тогда многие богатые помещики держали у себя в имениях наемную стражу из ингушей) спустил на слепца цепного пса-волкодава.

Слепец остановился, а поводырь испугался и бросился бежать. Волкодав догнал его и задушил. Слепец спасся только тем, что стоял неподвижно. Волкодав обнюхал его, порычал и ушел.

Крестьяне подобрали мертвого мальчика и принесли в село Погонное. Завтра мальчика будут хороиить.

Мие нравились Севрюки. Марина Павловиа была великолепной иаездницей и охотницей. Маленькая, очень сильная, с протяжным голосом, оиа ходила быстро и легко, судила обо всем резко, по-мужски, и любила читать длинные исторические романы вроде «Беглые в Новороссии» Данилевского.

Севрюк казался человеком больным. Он был очень худой, насмешливый. Он не дружил ни с кем из соседей, предпочитал общество крестьян-полещуков и занимался своим небольшим хозяйством. А брат Марины, студент, все дни пропадал на охоте. В свободные часы он набивал патроны, отливал дробь и чистил свою бельгийскую двустволку.

На следующий день мы поехали в село Погоиное. Мы переправились на пароме через глубокую и холодную Брагинку. Ивовые берега шумели от ветра.

За рекой песчаная дорога пошла по опушке соснового леса. По другую сторону дороги тянулось болото. Оно терялось за горизонтом в тускловатом воздухе, светилось окнами воды, желтело островами цветов, шумело сероватой осокой.

Я никогда еще ие видел таких огромных болот. Вдали от дороги среди зеленых и пышных трясии чернел покосившийся крест — там миого лет назад утонул в болоте охотиик.

Потом мы услышали похоронный звон, долетавший из Погонного. Линейка въехала в пустынное село с низкими хатами, крытыми гнилой соломой. Куры, вскрикивая, вылетали из-под лошадиных копыт.

Около деревяниой церкви толпился народ. Через открытые двери были видны язычки свечей. Огни освещали гирлянды из бумажных роз, висевшие около икон.

Мы вошли в церковь. Толпа молча раздалась, чтобы дать нам дорогу.

В узком сосновом гробу лежал мальчик с льняными, тщательно расчесаниыми волосами. В сложенных на груди бескровных руках он держал высокую и тонкую свечу. Она согнулась и горела, потрескивая. Воск капал на желтые пальцы мальчика. Косматый священник в черной ризе торопливо махал кадилом и читал молитвы.

Я смотрел на мальчика. Казалось, что он старается что-то припомнить, но никак не может.

Севрюк тронул меня за руку. Я оглянулся. Он показал мне глазами в сторону от гроба. Я посмотрел. Там шеренгой стояли старые нищие.

Все они были в одинаковых коричневых свитках, с блестящими от старости деревянными посохами в руках. Седые их головы были подняты. Нищие смотрели вверх на царские врата. Там был образ седобородого бога Саваофа. Он странно походил на этих нищих. У него были такие же впалые и грозные глаза на сухом темном лице.

— Майстры! — шепотом сказал мне Севрюк.

Нищие стояли неподвижно, не крестясь и не кланяясь. Вокруг них было пусто. Позади нищих я увидел двух мальчиков-поводырей с холщовыми сумками за спиной. Один из них тихонько плакал и вытирал нос рукавом свитки. Другой стоял, опустив глаза, и усмехался.

Вздыхали женщины. Иногда с паперти доносился глухой гул мужских голосов. Тогда священник подымал голову и начинал громче читать молитву. Гул стихал.

Потом нищие сразу двинулись к гробу, молча подняли его на руки и понесли из церкви. Сзади поводыри вели слепцов.

На кладбище с поваленными крестами гроб опустили в могилу. На дно ее уже натекла вода. Священник прочел последнюю молитву, снял ризу, свернул ее и ушел, хромая, с кладбища.

Двое пожилых полещуков, поплевав на ладони, взялись за лопаты. Тогда к могиле подошел слепец с ястребиным лицом и сказал:

— Погодите, люди!

Толпа затихла. Слепец, щупая палкой землю, поклонился гробу, потом выпрямился и, глядя перед собой белыми глазами, заговорил нараспев:

Под сухою вербой коло мелкой криницы
Сел господь отдохнуть от тяжелой дороги.
И подходят ко господу всякие люди
И приносят ему всё, что только имеют...

Толпа придвинулася к слепцу.

Бабы — пряжу и мед, а невесты — монисто,
Старики — черный хлеб, а старухи — иконы.
А одна молодица пришла с барвинками
И поклала у ног, а сама убежала
И сховалась за скрыней. А бог усмехнулся
И спросил: «Кто же мне принесет свое сердце?
Кто мне сердце свое подарить не жалеет?»

Молодая женщина в белом платке тихо вскрикнула. Слепец замолчал, обернулся в сторону женщины и сказал:

И тогда положил ему на руки хлопчик
Свое сердце — трепещет оно, как голубка.
Глянул бог, а то сердце пробито и кровью
Запеклось и совсем, как земля, почернело.
Почериело от слез и от вечной обиды,
Оттого, что тот хлопчик по свету бродяжил
Со слепцами и счастья не видел ни разу...

После похорон поводыря в усадьбу Севрюков вселилась тревога. Вечером двери запирали на железные засовы. Каждую ночь Севрюк со студентом вставали и обходили усадьбу. Они брали с собой заряженные ружья.

Однажды ночью в лесу загорелся костер. Он горел до рассвета. Утром Трофим рассказал, что у костра ночевал неизвестный человек.

— Надо думать, гоновец, — добавил он. — Ходят кругом, как волки.

Днем после этого в усадьбу зашел босой парень в солдатских черных штанах с выгоревшим красным кантом. Сапоги висели у него за спиной. У парня было облупленное от загара лицо. Глаза его смотрели хмуро и цепко.

Парень попросил напиться. Марина Павловна вынесла ему кувшин молока и краюху хлеба. Парень жадно выпил молоко и сказал:

— Смелые господа. Не страшитесь жить в таком месте.

— Нас никто не тронет, — ответила Марина Павловна.

— Это почему? — усмехнулся парень.

— Мы никому не делаем плохого.

— Со стороны виднее, — загадочно ответил парень и ушел.

Поэтому Марина Павловна с неохотой отпустила на следующий день мужа в соседнее местечко, где надо было купить продукты и порох. Севрюк взял с собой меня. Мы должны были вернуться в тот же день к вечеру.

Мне понравилась эта поездка по безлюдному краю. Дорога шла среди болот, по песчаным буграм, поросшим низким сосновым лесом. Песок все время сыпался с колес тонкими струйками. Через дорогу переползали ужи.

Было знойно и потому хорошо видно, как над болотами мреет нагретый воздух.

В местечке по заросшим мхом крышам еврейских домов ходили козы. Деревянная звезда Давида была приколочена над входом в синагогу.

На площади, засыпанной трухой от сена, дремали расседланные драгунские лошади. Около них лежали на земле красные от жары драгуны. Мундиры их были расстегнуты. Драгуны лениво пели:

Солдатушки, бравы ребятушки,
Где же ваши жены?
Наши жены — пушки заряжены,
Вот где наши жены!

Драгунский офицер сидел на крылечке постоялого двора и пил мутный хлебный квас.

Мы ходили по магазинам — «склепам». В них было темно и прохладно. Голуби склевывали зерна с десятичных весов. Евреи-торговцы в черных лосящихся картузах жаловались, что торговать нет резона, потому что весь барыш идет на

угощение исправника. Они рассказали, что третьего дня Андрей Гон налетел на соседний фольварк и угнал четверку хороших лошадей.

В одном из «склепов» нас напоили чаем. Он попахивал керосином. К чаю подали розовый постный сахар.

Мы запоздали. Когда мы выехали из местечка, Севрюк начал гнать лошадей. Но лошади выбились из сил на песках и могли идти только шагом.

Тучи слепней висели над конскими крупами. Непрерывно свистели жидкие конские хвосты.

С юга заходила гроза. Болота почернели. Начал налетать ветер. Он трепал листву и нес запах воды. Мигали молнии. Земля вдалеке громыхала.

— Придется свернуть в корчму на Брагинке,— сказал Севрюк.— Там заночуем. Завознились мы в местечке.

Мы свернули на едва заметную лесную дорогу. Телегу било по корням.

Начало быстро темнеть. Лес поредел. В лицо дохнуло сыростью, и мы подъехали к черной корчме.

Она стояла на самом берегу Брагинки, под ивами. Позади корчмы берег зарос крапивой и высокими зонтичными цветами болиголова. Из этих пахучих зарослей слышался тревожный писк — там, очевидно, прятались испуганные грозой цыплята.

На кривое крылечко вышел пожилой тучный еврей — хозяин корчмы Лейзер. Он был в сапогах. Его широкие, как у цыгана, штаны были подпоясаны красным кушаком.

Лейзер сладко улыбнулся и закрыл глаза.

— Какой гость! — воскликнул он и покачал головой.— Легче найти в лесу бриллиант, чем заманить до себя такого приятного гостя. Сделайте любезность, заходите прямо в чистое помещенне.

Несмотря на сладкую улыбку, Лейзер осторожно поглядывал на нас из-под набрякших красных век.

— Я знаю, Лейзер,— сказал ему Севрюк,— что у вас в корчме живут майстры. Не беспокойтесь. Нам до этого нет никакого дела. Мало ли кто ночует в корчме!

— Что я могу! — тяжело вздохнул Лейзер.— Кругом лес, болото. Разве я выбираю себе постояльцев? Я сам их иногда опасаюсь, пане Севрюк.

Мы вошли в чистую половину. Скрипели выскобленные полы. Комната перекосилась, и все в ней стояло криво. На кровати сидела распухшая седая женщина, обложенная розовыми подушками.

— Моя мамаша,— объяснил Лейзер.— У нее водянка. Двойра! — крикнул он.— Становь самовар!

Из-за занавески выглянула и поздоровалась с нами маленькая женщина с тоскливым лицом — жена Лейзера.

Окна из-за грозы были закрыты. О стекла бились мухи. Засиженный мухами портрет генерала Куропаткина висел на стене.

Лейзер принес сена и постелил нам на полу. Сено он накрыл толстым рядном.

Мы сели к столу и начали пить чай. Тотчас ударил такой гром, что на столе подпрыгула голубая тарелка. С тяжелым ровным шумом налетел на корчму ливень. Серая тьма лилась потоками за окном. Ее непрерывно разрывали мутные молнии.

Ливень заглушал писк самовара. Мы пили чай с баранками. Давно уже чай не казался мне таким вкусным. Мне нравилась эта корчма, вся эта глушь, шум дождя, грохот грома в лесах. Из-за стены едва слышно доносились голоса нищих.

Я устал от тряски в телеге и длинного жаркого дня и тотчас после чая уснул на полу, на сене. Проснулся я ночью весь в испарине. Керосиновая духота висела слоями. Мигал ночник. Стонала старуха. Севрюк сидел на сене рядом со мной.

— Ляжем лучше в телеге,— сказал он.— У меня будет разрыв сердца от этой духоты.

Мы осторожно вышли. Телега стояла под навесом. Мы разворошили сено, легли на него и укрылись рядном.

Гроза прошла. Над лесом светились влажные звезды.

С крыши еще текли, постукивая, капли дождя. Запах мокрого бурьяна проникал под навес.

Скрипнула дверь. Из корчмы кто-то вышел. Севрюк сказал мне шепотом:

— Не шумите. Это, должно быть, майстры.

Кто-то сел на колоду около навеса и начал высекать кремнем огонь. Запахло махоркой.

— Как заполыхает, мы разом и помандруем,— сказал скрипучий голос.— А то еще засунут нас в торбу.

— Просто,— ответил хриплый голос.— Зажились у Лейзера. Архангелы рыщут.

— Доси ничего не видно,— тревожно произнес третий голос, совсем еще молодой.— Может, от дождя все намокло.

— Для гоновцев нет ни мокроты, ни беды,— ответил скрипучий.

— Сбудется,— сказал хриплый.— Они нашу обиду замстят. Увидим божью кару. Пока очи еще не померкли.

Нищие замолчали.

— Петро,— спросил скрипучий,— а все люди готовые?

— Все,— ответил молодой.

— Так пусть выйдут с корчмы. И чтобы Лейзер не торкался. Его дело стороннее. Гроши свои он взял. Проезжие сплять?

— Сплять. Чего им делается?

Голоса снова затихли. Я зашевелился. Севрюк тронул меня за руку. Из корчмы вышли еще несколько человек.

— Я на Чернобыль да на Овруч буду с Кузьмой подаваться,— сказал знакомый голос.— Может, знайду под Чернобылем поводыря. Там народ голодует.

Это говорил тот слепец, что пел в Погонном над могилой поводыря. Сиова стало тихо. У меня колотилось сердце.

Мне казалось, что прошло очень много времени, прежде чем я услышал тихий возглас:

— Занялось!

Нищие зашевелились.

— Ну, братья,— сказал хриплый,— помолимся господу, да и в дорогу.

— «Отче наш, иже еси на небесех,— вполголоса запели нищие.— Да святится имя твое, да приидет царствие твое...»

Нищие поднялись и пошли.

— О чем они говорили? — спросил я Севрюка.

— Не знаю,— ответил он.— Пойду покурю подальше от сена.

Он встал и вышел из-под навеса.

— Что такое! — сказал он удивленно из темноты.— Идите-ка сюда.

Я вскочил. За черной Брагинкой, за зарослями верболоза, дымилось и розовело небо. Высокие снопы искр вылетали как будто из-за соседних кустов. Зарево тускло отражалось в реке.

— Что же это горит? — спросил Севрюк.

— Любомирский горит,— ответил из темноты Лейзер. Мы не заметили, как он подошел к нам.

— Пане Севрюк,— сказал он умоляющим голосом,— пожалейте себя и бедного корчмаря. Я вам запрягу коней, и поезжайте себе с богом. Неудобно вам тут оставаться.

— А что?

— Могут наскочить из местечка драгуны. Или стражники. С корчмаря им нечего взять. Корчмарь ничего не бачил и ничего не чул.

— Мы тоже ничего не видели,— сказал Севрюк.

— Пане! — воскликнул Лейзер.— Заклинаю вас богом вашим православным! Уезжайте. Не надо мне ваших денег. Мне спокой дороже. Видите, что делается кругом!

— Ну ладно, ладно,— согласился Севрюк.— Слабонервный вы человек, Лейзер. Запрягайте коней.

Лейзер быстро запрягал лошадей. Мы уехали.

Дорога шла вдоль берега Брагинки. Севрюк не правил. Он отпустил вожжи. И лошади шли сами. Зарево разгоралось. По лицу хлестали мокрые ветки...

Зарево качалось в небе. Шумела в затопленных кустах река, скрипели оси. Потом из болот нанесло холодный туман.

Только на рассвете мы, мокрые и озябшие, добрались до усадьбы.

После этого случая потянулись неспокойные дни. Мне они нравились. Мне нравилось постоянное ожидание опасностей, разговоры вполголоса и слухи, что приносил Трофим о внезапном появлении Андрея Гона то тут, то там.

Мне нравилась холодная Брагинка, разбойничьи заросли, загадочные следы подков на дороге, которых не было вчера. Мне, признаться, даже хотелось, чтобы Андрей Гон налетел на усадьбу Севрюка, но без поджога и убийства.

Но вместо Андрея Гона как-то в сумерки в усадьбе появились драгуны. Они спешились около ворот. Офицер в пыльных сапогах подошел к веранде, где мы пили чай, извинился и спросил:

— Вы господин Севрюк?

— Да, я,— ответил Севрюк.— Чем могу служить?

Офицер обернулся к солдатам.

— Эй, Марченко! — крикнул он.— Подведи-ка его сюда!

Из-за лошади двое драгун вывели босого человека. Руки его были скручены за спиной. На человеке были черные солдатские штаны с выгоревшими красными кантами.

Человека подвели к веранде. Он смотрел на Марию Павловну пристально, будто хотел что-то ей сказать.

— Вы знаете этого парня? — спросил офицер.

Все молчали.

— Приглядитесь получше.

— Нет,— сказала Марина Павловна и побледнела.— Я никогда не видела этого человека.

Человек вздрогнул и опустил глаза.

— А вы? — спросил офицер Севрюка.

— Нет. Я его не знаю.

— Что ж ты, братец,— офицер обернулся к человеку,— все врешь, что ты здешний и что ты у господ Севрюков работал в усадьбе? Теперь твое дело табак!

— Ладно уж! — сказал человек.— Ведите! Ваша сила, только не ваша правда.

Марина Павловна вскочила и ушла в комнату.

— Без разговоров! — сказал офицер.— Марш за ворота!

Драгуны уехали. Марина Павловна долго плакала.

— Он же так смотрел на меня,— говорила она сквозь слезы.— Как же я не догадалась! Надо было сказать, что я его знаю и что он работал у нас.

— Где там догадаться! — сокрушался Трофим.— Хоть бы он знак какой дал. А Любомирского тот человек спалил до последней косточки. Знаменито спалил. За убиенного хлопчика.

Вскоре я уехал в Киев.

Полесье сохранилось у меня в памяти как печальная и немного загадочная страна. Она цвела лютиками и аиром, шумела ольхой и густыми ветлами, и тихий звон ее колоколов, казалось, никогда не возвестит молчаливым полещукам о кануне светлого народного праздника.

Друкуецца са скарачэннем па кн.: Паустоўскі К. Г. Собрание сочинений. М., 1967. Т. 4.

Матэрыял на с. 75—80 падрыхтаваў

М. З. Башлакоў

У гады першай сусветнай

Яшчэ не аціхлі ў сэрцах людзей боль і сум ад страты родных і блізкіх у руска-японскіх бітвах, як у ліпені 1914 года выбухнула новая імперыялістычная бойня — першая сусветная вайна. Яна звалілася на краіну і народ вялікім горам і незлічонымі пакутамі. Заходняя вобласць Беларусі, як і іншыя яе мясцовасці, была аб'яўлена на ваенным становішчы. А гэта азначала, што вёска страчвала шмат рабочай сілы ў асобе мабілізаваных у войска мужчын, што насельніцтву трэба было несці вялікі цяжар рэквізіцый коней, мясной жывёлы, фуражу на патрэбы арміі. Добрая палавіна хлебаробаў-карміцеляў была адарвана ад свайго спрадвечнага занятку і кінута ў знішчальнае полымя бітваў з аўстра-венграмі.

Многія ўраджэнцы Брагіншчыны і Камарыншчыны адважна ваявалі ў складзе войск Заходняга фронту, склалі галовы ў баях «за веру, царя и отечество» ў акружэнні каля Аўгустоўскай пушчы, пад Сапоцкінам і ў іншых месцах крывапралітных бітваў на Гродзеншчыне. У ліку тых, хто вызначыўся на франтах першай імперыялістычнай вайны, былі нашы землякі. Сярод іх — ураджэнец в. Стары Макрэц, салдат Сямірэчанскага пяхотнага палка, удзельнік Брусілаўскага прарыву Ф. Ф. Петракоў. За храбрасць і адвагу, праяўленыя ў бітвах першай сусветнай вайны, ён быў узнагароджаны двума Георгіеўскімі крыжамі. Гэтай жа высокай адзнакі за воінскую доблесць удастоены тады ўраджэнцы вёскі Сабалі П. Н. Зачатка, А. І. Куценка, М. П. Стрыбук і іншыя.

Адважна змагаліся таксама маладыя франтавікі П. В. Герасіменка з Перасяцінца, А. С. Мартыненка з Дубліна, М. Р. Піліпенка з Дубліна, Д. В. Прышчэпаў з Новага Макраца, П. А. Самойленка з Міхалёўкі, каму ў ліку іншых ацалелых на вайне салдат пашчасціла вярнуцца да родных ніў. Але не вельмі абрадавала ўчарашніх франтавікоў убачанае дома. Сялянскія гаспадаркі былі разораны ваеннай разрухай і спусташэннямі. Людзі пакутавалі ад непамерна высокіх цэн. Лютавалі хваробы і галеча. Гэтыя і іншыя прычыны і абставіны выклікалі абвастрэнне супярэчнасцей у грамадстве. У скалечаных, траўміраваных вайной франтавікоў узмацнялася ўзніклая яшчэ ў акопах нянавісць да тых, хто развязаў згубную вайну, давёў працоўны люд да невыносна цяжкага становішча. Невыпадкова, што ў далейшым франтавікі аказаліся ў шэрагах свядомых барацьбітоў супраць вайны і сацыяльнай несправядлівасці.

Ад лютага да кастрычніка

У першыя дні сакавіка 1917 года да Брагіншчыны дайшла вестка аб перамозе ў Петраградзе Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, у выніку якой самадзяржаўе было скінута, а ўлада ў краіне перайшла да Часовага ўрада. Па-рознаму ўспрынялі гэтую падзею розныя пласты насельніцтва: адных ахапілі разгубленасць і страх, другія ўгледжвалі ў наступствах рэвалюцыйнага патрасення пэўную заканамернасць грамадскага развіцця. Што ж датычыць бяднейшага сялянства і рамеснікаў, то яны ў пераважнай большасці сваёй станоўча ўспрынялі лютаўскі пераварот.

12 сакавіка 1917 года ў Брагіне адбылася дэманстрацыя мясцовых вучняў і местачкоўцаў, арганізатарамі якой з'явіліся настаўнік брагінскай Загарадскай школы В. С. Белабровік і некаторыя яго калегі па рабоце. Шэсце завяршылася шматлюдным мітынгам. На ім з расказам аб рэвалюцыйных падзеях у Петраградзе выступіў бальшавік М. Л. Несцярок. Такія ж мітынгі адбыліся ў валасных цэнтрах Ёлча, Мікулічы, Ручаёўка, Савічы, у буйнейшых вёсках.

28 сакавіка ў Брагіне па кіраўніцтвам бальшавікоў Савелія Крупадзёрава, Сяргея Краўчанкі, Адама Мажэйкі, Ціта

Манжоса, Ціта Назаранкі і Мітрафана Ярмольчыка была праведзена палітычная дэманстрацыя рамеснікаў і сялян пад лозунгамі: «Уся ўлада Саветам!», «Зямля — народу!». У тым жа месяцы ва ўсіх валасцях сяляне стварылі новыя органы ўлады — выканаўчыя камітэты і міліцыю. У Брагіне першым начальнікам валасной міліцыі быў П. В. Скараход.

У красавіку па ўказанні Палескага камітэта РСДРП(б) у Брагіне, Верхніх Жарах, Ёлчы, Крыўчы, Мікулічах, Ручаёўцы, Савічах былі створаны Саветы сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў. Аднак пры гэтым не ўдалося пазбегнуць пранікнення ў іх склад ранейшых чыноўнікаў і кулакоў.

З першых дзён пасля лютаўскіх падзей у Петраградзе бальшавікі, як у цэнтры, у буйных гарадах, так і на перыферыі, прыкладалі максімум намаганняў, каб перашкодзіць меншавікам і эсэрам у распаўсюджванні іх уплыву на сялянскія масы і вызваліць малазямельных вяскоўцаў з-пад уздзеяння заможнікаў. Адным з важнейшых фактараў у дасягненні гэтых мэт з'ўлялася экспрапрыяцыя маёмасці эксплуататарскіх класаў (фабрык, заводаў, зямлі, маёнткаў і інш.). Вырашаць такую задачу было вельмі няпроста ва ўмовах двоеўладдзя: адначасова ж з валаснымі выканаўчымі камітэтамі напачатку існавалі валасныя земскія ўправы і іх выканаўчыя органы.

Новай формай арганізацыі працоўных вёскі і ўключэння іх у актыўную грамадска-палітычную работу з'явілася стварэнне сялянскіх Саветаў, сялянскіх і батрацкіх камітэтаў, якія на Брагіншчыне і Камарыншчыне пачалі ўзнікаць у красавіку — маі 1917 года.

21 — 23 мая (3 — 5 чэрвеня) 1917 года ў Рэчыцы адбыўся павятовы сялянскі з'езд, які абмеркаваў распараджэнне Часовага ўрада аб прапарцыянальнай рэквізіцыі жывёлы для патрэб арміі, прыняў рашэнне аб раздачы часткі памешчыцкіх зямель і сенакосаў сялянам, якія мелі ў гэтым патрэбу, распусціў павятовую думу і зняў з пасады павятовага камісара Пятра Патона[1].

Актыўны ўдзел у рабоце з'езда прынялі прадстаўнікі валасцей Брагіншчыны і Камарыншчыны — бальшавікі Пётр Герасіменка, Ісай Гракун, Андрэй Крысенка, Ціт Манжос, Рыгор Мігай, Даніла Музычэнка і іншыя.

Валасныя сялянскія камітэты прынялі рашэнні павятовага з'езда да кіраўніцтва і няўхільнага выканання. «Сялянскі рух за адабранне і падзел памешчыцкіх зямель паміж вясковымі беднякамі, які нарадзіўся яшчэ перад пачаткам павятовага сялянскага з'езда, пасля яго набыў яшчэ большы размах, — зазначаў ва ўспамінах тагачасны загадчык аддзела Брагінскага валвыканкама С. Я. Дабрынскі. — У прыватнасці, у маёнтку Людзвіноў Ялчанскай воласці сяляне адабралі зямлю ў памешчыка Рыбінкава і ўзаралі яе. Тое ж самае было зроблена ў маёнтку Кулажын памешчыка Бубнава. У маёнтку Верхнія Жары забралі жывёлу, вывезлі сена і пачалі пасвіць свой статак на так званай Панскай дачы. У маёнтку Калыбань мясцовыя мужыкі завалодалі збожжавымі прыпасамі памешчыка Зенькава і падзялілі іх паміж беднякамі. Жыхары фальварка Ляды зааралі зямлю, секлі лес на свае патрэбы ў Сцепаноўскай дачы і г. д.»[2].

«Далейшае развіццё падзей пасля лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, — успамінаў член РКП(б) з 1917 г., член Брагінскага рэўкама і валаснога Савета В. А. Валасенка, — праходзіла ў атмасферы барацьбы бальшавікоў за павелічэнне ўплыву на шырокія народныя масы і заваяванне палітычнай улады — дыктатуры пралетарыяту. На Брагіншчыне на пачатку жніўня 1917 г. бальшавікі запатрабавалі перавыбрання выканаўчых камітэтаў, але кулакі, асабліва эсэрствуючыя, не пагадзіліся. Тады бальшавікі самі правялі ў вёсках сходы,

[1] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 406. Воп. 2. Спр. 202. Л. 30, 45.

[2] Тамсама. Спр. 73, 423. Л. 502.

на якіх абралі ўпаўнаважаных дэлегатаў на валасныя сходы.

У той жа час у Брагіне і Камарыне былі праведзены сходы саматужнікаў. На ўсіх сходах бальшавікі выбіраліся аднагалосна, але разам з імі ў якасці дэлегатаў трапілі сяляне і саматужнікі, якія вагаліся пад уплывам заможнай часткі жыхароў вёсак і мястэчкаў.

У чэрвені 1917 г. пры дапамозе Рэчыцкай павятовай арганізацыі бальшавікоў на Брагіншчыне і Камарыншчыне былі створаны валасныя партыйныя ячэйкі. Брагінскую склалі члены партыі С. Я. Краўчанка, Ц. А. Манжос, П. В. Скараход, М. Л. Несцярок, С. Ц. Крупадзёраў. Мікуліцкую партячэйку ўзначаліў Р. В. Мігай, Ялчанскую — І. С. Кляпец.

У канцы жніўня 1917 г. у Брагіне адбыўся сход упаўнаважаных дэлегатаў ад сялян, батракоў і рамеснікаў з пытаннем аб перавыбранні валасных выканкамаў. Прысутнічалі дэлегаты ад Брагінскай, Мікуліцкай, Дзяражыцкай, Ручаёўскай, Савіцкай і Ялчанскай валасцей. У якасці галоўных былі разгледжаны два пытанні:

1. Аб раздзеле царкоўнай і памешчыцкай зямлі. (З дакладам выступіў Сяргей Яўстратавіч Краўчанка.)

2. Аб арганізацыі валасных Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў. (З дакладам выступіў Рыгор Восіпавіч Мігай.)

На сходзе прысутнічаў прадстаўнік Рэчыцкага павятовага камітэта РСДРП(б) А. С. Касценка»[1].

Імкнучыся на справе ажыццяўляць сваю праграму-мінімум у аграрнай сферы, бальшавікі праз свае органы ў Саветах, у т. л. сялянскія камітэты, ажыццяўлялі кантроль за вырашэннем пытанняў аб зямлі і іншай маёмасці, канфіскаванай у памешчыкаў і царкоўнікаў. У чэрвені 1917 года ў 27 маёнтках і фальварках Брагіншчыны і Камарыншчыны былі прызначаны бальшавіцкія камісары для ўпарадкавання гэтых гаспадарак: Аляксей Міхаленка (Астрагляды), Аляксандр Пашкевіч (Савічы), Каленік Мігай (Чырвонае Поле), Давыд Васільеў (Касачоў), Пётр Шынкароў (Гарадзішча), Савелій Крупадзёраў (Глухавічы), Харытон Юшчанка (Верхнія Жары), Іван Грышан (Ёлча), Павел Старахатні (Кулажын), Трафім Старахатні (Вельямоў) і г. д.

Камісары стварылі вакол сябе актыў з ліку батракоў, які па сутнасці з'яўляўся своеасаблівым «саветам» маёнткавых гаспадарак пры камісары. Сумесна праводзілі ўлік усёй рухомай і нерухомай маёмасці ў маёнтках і фальварках. Батрацкі актыў аказваў дапамогу і на ўборцы ўраджаю 1917 года. Камісары папярэдзілі былых уладальнікаў узятага на ўлік дабра (улічваючы нават хатнюю птушку), што яны нічога не могуць аддаць за межы маёнтка ці фальварка без дазволу сялянска-батрацкага камітэта. Гэтым распараджэннем быў ажыццёўлены вялікай сацыяльнай важнасці і юрыдычнага значэння дзяржаўны акт — памешчыкі ў нашых мясцінах перасталі валодаць, а значыць, і распараджацца дабром, нажытым на эксплуатацыі чужой працы.

Частка сабранага на памешчыцкіх землях ураджаю 1917 года па распараджэнні камісараў была перададзена сельскай беднаце ў якасці бязвыплатнай пазыкі. Ёй жа раздалі дробны сельскагаспадарчы інвентар, а тыя, хто не меў цягла, атрымалі па каню на двор.

Органы Часовага ўрада на месцах спрабавалі перашкодзіць дзейнасці Саветаў і сялянскіх камітэтаў, нават накіроўвалі ў вёску воінскія часці для задушэння сялянскага руху. Так, калі Мікуліцкі валасны рэўкам узяў пад свой кантроль панскі маёнтак і пачаў надзяляць зямлёй бедных сялян, памешчыца паскардзілася на гэта ў Брагін земскаму начальству. У вёску Рудакоў былі накіраваны рота салдат і кавалерыйскі эскадрон. Адбыўся бой. Але спробы сілай спыніць узмацненне сялянскага руху не

[1] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 406. Воп. 2. Спр. 73, 423. Л. 502.

мелі поспеху. Барацьба беднякоў за зямлю стала школай рэвалюцыйнага выхавання працоўных вёскі. Яна ўсё больш набывала палітычны характар. Гэта яскрава відаць на прыкладзе так званай Мікуліцкай рэспублікі[1].

Яшчэ ў сакавіку 1917 года Мікуліцкі валасны Савет, абапіраючыся на ўзброеныя сялянскія групы, стаў паўнаўладным гаспадаром у воласці. У ёй былі распушчаны старыя органы ўлады, узяты на сябе судовыя функцыі, устаноўлены кантроль над маёнткамі[2]. Пазней на валасным сходзе ўпаўнаважаных распусцілі ранейшы выканаўчы камітэт і абралі новы на чале з бальшавіком Ярмольчыкам Мітрафанам Пятровічам.

У створаную ў чэрвені 1917 года мікуліцкую партыйную ячэйку апрача яе кіраўніка Р. В. Мігая ўваходзілі Сямён Апанасенка, Аляксандр Гардзейчык, Канстанцін Дыгун, Фёдар Кірчанка, Сямён Кліменка, Аляксей Міхаленка і іншыя. Партыйцы разгарнулі работу сярод насельніцтва воласці па растлумачэнні палітыкі бальшавікоў і першачарговых задач Саветаў. Пры Мікуліцкім валасным выканаўчым камітэце актыўна працаваў зямельны камітэт. У склад яго абралі дзевяць чалавек — членаў партыі і сельскіх актывістаў, у т. л. Савелія Крупадзёрава, Адама Дзейкуна (старшыня), Дзмітрыя Васілеўскага, Дамеця Зелянкоўскага, Кузьму Ганчара, Канстанціна Крысенку і іншых.

Па рашэнні партыйнай ячэйкі і валвыканкама зямельны камітэт сваёй пастановай пачаў перадачу сялянам зямлі мясцовай памешчыцы Алены Ваньковіч, раздзяліўшы частку яе па вызначанай колькасці дзесяцін на двор, дазволіў сялянам карыстацца выпасамі на памешчыцкіх угоддзях, рабіць высечку лесу для будаўніцтва або рамонту жылля і гаспадарчых пабудоў.

Дзень 1 мая 1917 года ў Мікулічах быў праведзены асабліва ўрачыста. На вулічнай арцы ў цэнтры вёскі, будынку валвыканкама, суседніх хатах палымнелі бальшавіцкія лозунгі. У святочнай дэманстрацыі прынялі ўдзел многія жыхары Мікулічаў і навакольных населеных пунктаў. Гэта сведчыла аб павышэнні ўплыву бальшавікоў на сялянскія масы. Вакол ячэйкі ўтварыўся актыў, у які ўваходзілі Антон Крысенка, Аляксандр Любачка, Давыд Васільеў, Каленік Мігай і іншыя вяскоўцы.

12(25) чэрвеня 1917 года Мікуліцкі валасны выканаўчы камітэт вырашыў адабраць частку пасеваў у памешчыцы Алены Ваньковіч у яе маёнтку Рудакоў. Члены валвыканкама ўзялі маёнтак і панскія землі пад свой кантроль. З мэтай узмацнення нагляду за захаваннем канфіскаванай памешчыцкай маёмасці, за надзяленнем бедных сялян зямлёй партыйная ячэйка накіравала сваіх прадстаўнікоў у якасці камісараў Яфіма Дабрынскага ў маёнтак Рудакоў, Рыгора Мігая ў фальварак Унігаўка. У саміх Мікулічах для гэтай справы быў пакінуты Мітрафан Ярмольчык, якому дапамагалі сельскія актывісты Кузьма Ганчар, Канстанцін Крысенка, Аляксандр Любачка.

Не на жарт напалоханая такім развіццём падзей, памешчыца праз свайго даверанага звярнулася да Галоўнакамандуючага Заходнім фронтам А. І. Дзянікіна са скаргай на дзеянні Мікуліцкага валаснога выканкама і просьбай прыняць да яго адпаведныя меры ўздзеяння.

У ліпені 1917 года памешчыцкія і царкоўныя землі на тэрыторыі Мікуліцкай воласці былі падзелены паміж сялянамі.

Успамінаючы праз шмат гадоў падзеі перыяду Мікуліцкай рэспублікі, многія мясцовыя старажылы ў большасці раздзялялі тагачасную трывогу і заклапочанасць памешчыцы, па праўдзе кажучы, варварскімі адносінамі да ўсяго панскага з боку сялян, нібы

[1] Документы и материалы по истории Белоруссии. Мн., 1959. Т. 4. С. 93 – 95.

[2] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 406. Воп. 5. Спр. 49. Л. 69; Воп. 6. Спр. 459. Л. 21.

ап'янелых на той час ад атмасферы ўсёдазволенасці і беспакаранасці. Месцамі ў лясах замест гонкіх меднаствольных (у народзе іх называлі карабельнымі) соснаў засталіся адны пні. Амаль поўнасцю зніклі ад высыхання унікальныя ліпавыя і бярозавыя гаі, дрэвы ў якіх былі па-драпежніцку абадраны сялянамі на лыка і бяросту. Ад бессістэмнага вытоптвання травянога покрыву на пашах з лёгкім механічным саставам глебы ў пясчаныя выдмы ператварыліся квітнеўшыя раней пашы і сенажаці. Затым яны так і не адрадзіліся ў сваім ранейшым выглядзе.

І. Ф. Ганжураў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З ЗАЯВЫ ДАВЕРАНАГА ПАМЕШЧЫЦЫ А. Р. ВАНЬКОВІЧ АД 15(28) ЧЭРВЕНЯ 1917 г. У ШТАБ ГАЛОЎКАЗАХА АБ НЕПАДПАРАДКАВАННІ СЯЛЯН МІКУЛІЦКАЙ ВОЛАСЦІ РЭЧЫЦКАГА ПАВЕТА ЎЛАДЗЕ ЧАСОВАГА ЎРАДА

Имеиие Рудаков Речицкого у. Минской губ. расположено в Микуличской вол., которая ныне составляет отдельную от России республику, не подчиняющуюся Временному правительству, не признающую иных законов, кроме изданных волостным комитетом. Продовольственная комиссия, избранная в той волости, была комитетом разогнана, а члены от землевладельцев, назначенные земской управой, совершенно не были допущеиы. Члены комитета и их подголоски не дают даже оглашать циркуляров и распоряжений как Временного правительства, так и комиссара. На днях еле ие растерзали старика-учителя, который начал читать распоряжение министра внутренних дел, и оскорбили его действием. Микуличский комитет отменяет сенатские решения, принял на себя судебные функции, присуждает землю и взыскания, разрешает пастьбу и рубку леса крестьянам, иакладывает подати, издает приказы о реквизиции хлеба, присылает распоряжения землевладельцам, какие производить работы, а какне нет, раздает сенокосы и присылает приказы, кому давать таковые. Комитет выдал распоряжение о праве всем ловить рыбу в прудах, вследствие в садах при усадьбе выловили всю разводимую рыбу у землевладельцев. Благодаря «Микуличской республике» в имении моей доверительницы крестьяие деревень: Плоское, Рудые, Воротец и Вязок, с разрешения 3 членов продов. комитета, в том числе священника с. Микуличи, приехавших иа место, выпасли 50 дес. двухгодичного белого клевера с тимофеевкой, в фольварке Бабчии — 27 дес. тимофеевки и в фольварке Мокиш — 16, итого 93 дес. на сумму 13 800 руб.

Кроме того, в фольварке Рудаков крестьяне дер. Рудаков заставили отдать им на выпас 30 дес. белого семенного клевера на сумму 10 000 руб., и когда выпасли своими табунами целую площадь, то пошли пасти дальше и выпасли 4 дес. красного клевера на сумму 1200 руб. и пошли дальше в белый клевер.

Крестьяне дер. Бабчин выпасли сенокос «Поплав» на сумму 2400 руб., дер. Мокиш — сенокос «Кисловщину» на такую же сумму и пасли по остальным сеиокосам до 9 мая, стоптав нх и уничтожив молодую траву, что при поздней осени и засухе не только зиачительно уменьшило сбор сена, но и отодвинуло на 3 иедели, чем его подочного к жниву[1].

Распоряжение о праве даром пользоваться лесом «сухостойным» и воспрещение владельцам рубить и продавать сырой лес повело к тому, что мне не дают пользоваться лесом для своей надобности, а крестьяне всех окружающих сел, никогда в имения не входивших, рубят не только сухостойный лес, которого почти не было, но и сырой всяких пород и делают запасы материала и топлива. В моем лесу была липа, единственная в крае, которую я 30 лет оберегал ревниво, теперь ии одиой и бересты тоже. На верст 40—50 кругом Рудаков все села ехали и драли липу и бересту и тысячи подвод вывозили. Леса у меия уничтожено более чем на 100 000 руб., а придет осень и зима, то все разберут и уничтожат.

Считая, что существование Микуличской республики недопустимо вообще в государстве и что благодаря ее существованию я несу огромные убытки, прошу ваш штаб принять меры к обузданию Микуличского волостиого комитета, а равно иазначить комиссию для оценки убытков, нанесенных моей доверительнице, для возмещения их, согласно распоряжению Временного правительства.

[1] Приблизило к жатве.

На решение Микуличского вол. комитета об отобрании от моей доверительницы части поля в имении Рудаков, которое лет 25 тому окончательно закреплено за ней указом Сената и находилось в ее пользовании, а равно о других судебных решениях, незаконно выносимых комитетом, мною заявлено прокурорскому надзору.

Тоже на Микул. комитет сильно повлияло Решение Речицкого крест. союза, который по предложению нынешнего председателя Кончера решил не слушаться распоряжения правительства о пропорциональной реквизиции скота у населения и взять у помещиков 3/4 скота, а если это не покроет требуемого количества, то недостающее количество разверстать между крестьянами и 1/4 оставшегося у владельца скота.

При этом постановили, что скот породистый, взятый у помещиков, крестьяне имеют право заменить на свой, а помещикам платить установленную ныне ими цену по 3 руб. 50 коп. за пуд.

Плохое влияние оказал тоже Хойникский революционный комитет своими противозаконными действиями, а тоже несколько солдат, пришедших с фронта с проповедью немедленного захвата всего у помещичьих классов.

Подпись.

Резолюция Главкозаха: Я получаю в день десятки подобных заявлений, что с ними делать? Мы не в состоянии всем помочь, да и не наше в конце концов это дело. 22 июня.

Подпись.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 406. Воп. 2. Спр. 70. Л. 145—146.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

За ўладу Саветаў

Пасля Кастрычніка

Пасля Кастрычніцкага ўзброенага пераваротy ўлада ў Рэчыцкім павеце перайшла ў рукі Саветаў рабочых і сялянскіх дэпутатаў 12 лістапада 1917 г. За няпоўны месяц ад 25 кастрычніка да 20 лістапада яна стала рэальнасцю на ўсёй тэрыторыі Гомельшчыны і Мазыршчыны, у т. л. у Брагінскай і іншых мясцовых валасцях. Павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт адразу накіраваў сваіх прадстаўнікоў у воласці і буйнейшыя населеныя пункты для выбараў Саветаў.

Былі створаны Брагінскі валасны рэўкам на чале з П. В. Скараходам, а таксама Мікуліцкі, Дзяражыцкі, Ручаёўскі, Савіцкі, Ялчанскі валасныя рэўкамы. Па даручэнні Рэчыцкага павятовага рэўкама ў Мікуліцкай воласці работу па стварэнні Саветаў, сялянскіх камітэтаў праводзіў М. П. Ярмольчык.

Крыху пазней, 28—29 снежня 1917 г., у Рэчыцы адбыўся павятовы сялянскі з'езд, у рабоце якога прымалі ўдзел 334 дэлегаты ад усіх валасцей. Ён прыняў пастанову аб скасаванні павятовай і валасных управаў і арганізацыі замест іх валасных Саветаў. З'езд распусціў таксама павятовую земскую ўправу і зняў з пасады павятовага камісара памешчыка П. Патона. На з'ездзе быў створаны сялянскі камітэт і прынята рашэнне аб арганізацыі валасных зямельных камітэтаў для ажыццяўлення Дэкрэта аб зямлі. У сувязі з гэтым з кожным днём узмацняўся ўплыў Саветаў на народныя масы. У такіх умовах адбывалася бальшавізацыя новых органаў улады.

На пачатку 1918 г. на Брагіншчыне і Камарыншчыне праводзіліся выбары валасных і сельскіх Саветаў пры адначасовым роспуску валасных земстваў, адхіленні ад пасад сельскіх старастаў і г. д. У валасцях з членаў камісій выбіраўся прэзідыум валвыканкамаў, ствараліся камісіі: зямельная, харчовая, культурна-асветная, санітарна-асветная і інш. Найбольш актыўна праводзілася гэтая работа ў Брагінскай, Мікуліцкай, Савіцкай валасцях.

Аб'яднанне ў студзені 1918 г. Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў з сялянскімі дэпутатамі стварыла трывалую палітычную аснову пралетарскай дзяржавы, вызваліла сялянства з-пад уплыву эсэраў, расшырыла сацыяльную

базу дыктатуры пралетарыяту. Першая Савецкая канстытуцыя 1918 г. узаконіла Саветы як дзяржаўную форму гэтай дыктатуры. Чарговым важным крокам ва ўмацаванні Саветаў на вёсцы з'явілася стварэнне ў лістападзе — снежні 1918 г. камітэтаў вясковай беднаты, якія адыгрывалі рашаючую ролю ў размеркаванні зямлі, адабранай у памешчыкаў і царкоўнікаў, канфіскацыі лішкаў хлеба ў кулакоў, забеспячэнні хлебапрадуктамі Чырвонай Арміі, насельніцтва гарадоў і прамысловых цэнтраў. У Брагіне, Мікулічах, Савічах, Ёлчы і іншых населеных пунктах былі створаны валасныя, а ў буйнейшых з іх — сельскія камітэты беднаты. Мэтай Саветаў было прыцягнуць на бок Савецкай улады беднякоў і сераднякоў, умацаваць саюз рабочага класа і сялянства, каб агульнымі намаганнямі падарваць эканамічную моц і палітычны ўплыў кулацтва.

Камбеды, як правіла, ствараліся на сходах вясковай беднаты. Першымі старшынямі камбедаў у нашых мясцінах былі абраны Сцяпан Волкаў (в. Калыбань), Міхаіл Зубрыцкі (м. Камарын), Ігнат Касцючэнка (в. Крукі), Пётр Мартыненка (в. Спярыжжа), Даніла Процка (м. Брагін), Дзмітрый Прышчэпаў (в. Макрэц), Іван Шчука (в. Савічы), Андрэй Яжгуновіч (в. Глухавічы) і іншыя.

Пры садзейнічанні партыйных ячэек стварэннем і ўмацаваннем органаў Савецкай улады ў радзе месцаў кіравалі дэмабілізаваныя салдаты і матросы. Так, у снежні 1917 г. у вёску Малажын вярнуўся матрос рэвалюцыйнага крэйсера «Амур», член яго суднавога камітэта, член партыі бальшавікоў Ісак Данілавіч Новік. Як актыўны ўдзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі (а затым і грамадзянскай вайны), ён быў абраны першым старшынёй мясцовага Савета, працаваў старшынёй Дзяржыцкага валаснога выканаўчага камітэта.

У вёсцы Аляксееўка першым старшынёй Савета з'яўляўся былы салдат Прэабражэнскага палка, член партыі з 1917 г. Восіп Аляксеевіч Валасенка. Па яго ініцыятыве сход сялян гэтага населенага пункта скасаваў пасаду сельскага старасты, пазбавіў мандатаў зямельных галосных і выбраў Савет. В. А. Валасенка многае зрабіў для арганізацыі ў 1918 г. партызанскай барацьбы супраць аўстра-германскіх акупантаў. У 1920 г. ён быў абраны старшынёй Брагінскага валаснога Савета.

У вёсцы Крукі першым старшынёй Савета з'яўляўся бальшавік Павел Апанасавіч Старахатні. Мікуліцкі валасны Савет тады ўзначаліў член партыі бальшавікоў з 1917 г. Сямён Лаўрэнавіч Апанасенка. У сваіх успамінах ён, у прыватнасці, зазначаў «...будучы ў водпуску з старой, царскай арміі, у кастрычніку 1917 года мы, група таварышаў,— таксама адпускнікоў, калі дайшла вестка аб звяржэнні буржуазнага Часовага ўрада, тэрмінова стварылі Мікуліцкі рэвалюцыйны камітэт. Узялі пад ахову маёмасць уцёкшых ад рэвалюцыі памешчыкаў і арандатараў».

Прыкметную ролю ў арганізацыі Савецкай улады ў брагінскіх і камарынскіх мясцінах адыгралі бальшавікі П. В. Герасіменка (в. Сцепаноў) і А. С. Мартыненка (в. Дублін). У в. Новы Макрэц на пачатку 1918 г. першым старшынёй Савета працаваў член партыі з 1905 г. Іван Міхайлавіч Жыхараў, у мінулым рабочы кіеўскага завода «Арсенал». З Брагіншчыны партыя накіравала яго ў Багунскі рэвалюцыйны полк 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса. У 1918 г. І. М. Жыхараў загінуў у баі з пятлюраўскай бандай.

Бальшавіцкія арганізацыі аказвалі паўсядзённы ўплыў на дзейнасць Саветаў, праводзілі актыўную работу сярод насельніцтва. Аднак наступленне ў лютым 1918 г. аўстра-германскіх войск і акупацыя імі значнай часткі Беларусі замарудзіла развіццё Саветаў.

У адказ на дэкрэт Савета народных камісараў «Сацыялістычная Айчына ў

небяспецы!» на месцах пачалася мабілізацыя ў рэвалюцыйныя часці і атрады Заходняга фронту. Брагінская валасная партыйная ячэйка накіравала ў рады Чырвонай Арміі лепшых сваіх камуністаў, а таксама групу камсамольцаў. У ліку іх былі Сямён Ціханчук, Сямён Апанасенка, Мітрафан Ярмольчык, Міхаіл Зубрыцкі, Сямён Парэмскі, Сяргей Таміловіч-Данчанка і іншыя. Групы добраахвотнікаў былі сфарміраваны партыйнымі і савецкімі органамі іншых валасцей Брагіншчыны і Камарыншчыны. Усе яны адважна змагаліся затым на розных франтах грамадзянскай вайны. Напрыклад, за гераізм і мужнасць, праяўленыя ў баях за Самару і Касторнае пры разгроме калчакаўскіх войск на Усходнім фронце, а затым у бітвах з дзянікінцамі камандзір палка сувязі 25-й чапаеўскай дывізіі затым камісар 3-га палка 72-й дывізіі М. П. Ярмольчык удастоены самых высокіх па тым часе ўзнагарод Савецкай Рэспублікі — двух ордэнаў Чырвонага Сцяга.

Узоры воінскай доблесці праявіў у змаганні з дзянікінцамі і калчакаўцамі другі прадстаўнік Брагіншчыны, ураджэнец вёскі Крыўча Сямён Ціханчук, які затым прайшоў шлях ад чырвонаармейца да генерал-лейтэнанта. Сямён Аўрамавіч у грамадзянскую вайну ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Да сакавіка гераічнымі намаганнямі Чырвонай Арміі ўдалося спыніць ворага на лініі Орша — Магілёў — Гомель. Не маючы сіл для абароны, Савецкая Рэспубліка вымушана была 3 сакавіка 1918 г. падпісаць грабежніцкі Брэсцкі мірны дагавор, па якім большая частка Беларусі, у т. л. Брагіншчына і Камарыншчына, трапілі ў зону германскай акупацыі. З прыходам кайзераўцаў у акупіраваных мясцовасцях былі ліквідаваны рэвалюцыйныя парадкі. Акупанты разагналі Саветы, адмянілі прыватную ўласнасць на зямлю і іншую маёмасць. У былых маёнтках з'явіліся ранейшыя гаспадары-памешчыкі ці іх упраўляючыя. Акупантам паслужліва дапамагалі мясцовыя чарнасоценцы, правыя эсэры, кулакі. Часта па іх даносах кайзераўцы тварылі тэрор і насілле, бязлітасна распраўляліся з сельскімі актывістамі: па-зверску замучылі дэпутата Верхнежараўскага сельсавета Карнея Міхайлавіча Шульгу, расстралялі за прыналежнасць да бальшавіцкай партыі старшыню камітэта беднаты вёскі Кацічаў Аляксея Тамілку, дэпутата Савета з Савіцкай воласці Вікенція Дусянка. За непадпарадкаванне нямецкім уладам у Верхніх Жарах быў пакараны смерцю вясковец Іван Юшчанка. Немцы трымалі пяць дзён пад замком і без ежы старшыню Брагінскага валаснога выканкама Сяргея Краўчанку і сакратара партыйнай ячэйкі Мікалая Несцярка, а бацьку апошняга — Льва Несцярка павесілі на тэлеграфным слупе. Акупанты амаль поўнасцю спалілі вёску Кулажын — агнём было знішчана 25 сялянскіх хат.

Кайзераўцы рабавалі насельніцтва, вывозілі жывёлу, збожжа, лес і г. д. У такіх умовах бальшавікі, савецкія актывісты вымушаны былі пайсці ў падполле, каб пачаць арганізаваную барацьбу супраць акупантаў. Вясной 1918 г. у Брагіне аформіўся падпольны камітэт РКП(б)[1], які кіраваў дзейнасцю падпольных партыйных ячэек і камуністаў-падпольшчыкаў, партызанскіх атрадаў, арганізоўваў агітацыйна-прапагандысцкую работу сярод нямецкіх салдат і насельніцтва.

З мэтай мабілізацыі насельніцтва на барацьбу з акупантамі і паляпшэння кіраўніцтва дзеяннямі партызанскіх фарміраванняў валасныя партыйныя камітэты стварылі спецыяльныя баявыя органы — рэвалюцыйныя камітэты. Актыўна дзейнічалі такія падпольныя органы ў Брагіне і іншых валасцях[2].

---

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 22. Л. 45.

[2] Иностранная военная интервенция в Белоруссии (1917 – 1920). Мн., 1990. С. 124.

У іх склад увайшлі кіраўнікі партыйных ячэек, найбольш аўтарытэтныя мясцовыя партыйцы таго часу С. Я. Краўчанка (м. Брагін), Р. В. Мігай (в. Мікулічы), А. М. Вароненка (в. Савічы), Аляксандр Гардзейчык (в. Ёлча), а таксама В. А. Валасенка, С. І. Кліменка, І. С. Кляпец, С. Ц. Крупадзёраў, Ц. А. Манжос, М. Н. Несцярок, П. В. Скараход, П. А. Старахатні і іншыя. Каардынаваў дзейнасць падпольшчыкаў начальнік Рэчыцкай павятовай міліцыі Адам Андрэевіч Мажэйка. Ён меў паўнамоцтвы на гэта ад Рэчыцкага павятовага камітэта партыі.

Самай актыўнай формай супраціўлення ворагу быў партызанскі рух. У тутэйшых мясцінах былі створаны і дзейнічалі пяць атрадаў народных мсціўцаў. Так, пасля прыходу аўстрагерманцаў адзін з першых партызанскіх атрадаў стварыў член Рэчыцкага павятовага рэвалюцыйнага камітэта, ураджэнец вёскі Крыўча Восіп Аляксеевіч Валасенка. Адразу ж пад яго камандаванне сталі землякі з вёсак Крыўча і Аляксееўка Несцер Аўрамавіч Ціханчук, Піліп Нікіфаравіч Кіслоў, Адам Пракопавіч Маручок, Ціхан Яфрэмавіч Вароненка, Сяргей Міхайлавіч Стрыбульскі і многія іншыя.

Тады ж баявымі справамі заявілі аб сабе партызанскія атрады на чале з П. В. Скараходам у Брагінскай воласці, у Мікуліцкай, Савіцкай, Ялчанскай валасцях (камандзіры Рыгор Мігай, Кандрат Мельнік, Іван Скараход). Дарэчы, К. Мельнік у 1920 г. з'яўляўся камандзірам аднаго з бранякатэраў Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

На пачатку жніўня 1918 г. быў створаны спецыяльны падпольны штаб па кіраўніцтве баявымі аперацыямі партызан супраць нямецкіх войск і гайдамакаў — украінскіх нацыяналістаў. У наступным месяцы партызаны Брагіншчыны нанеслі шэраг добра спланаваных і моцных удараў па акупантах, у т. л. па іх апорных пунктах у вёсках Астрагляды, Асарэвічы, Крукі, Кацічаў, Верхнія Жары. У выніку яны захапілі нямала зброі і боепрыпасаў, нарабаванай акупантамі жывёлы, якая была раздадзена насельніцтву[1].

Падбадзёраныя адноснай абаронай з боку партызан, не жадалі мірыцца з парадкамі, усталяванымі акупантамі, жыхары іншых населеных пунктаў Брагіншчыны і Камарыншчыны. Употай ад ворага аказвалі ўсялякую падтрымку лясным салдатам жыхары вёсак Чамярысы, Хракавічы, Асарэвічы. Арганізатарам сялянскай моладзі на барацьбу з акупантамі з'явіўся жыхар вёскі Чамярысы Апанас Сафронавіч Кіслоў. Ён разам з Рыгорам Мінатавічам Прыходзькам, які прыйшоў з фронту па раненні, наладзіў сувязь з размешчаным у раёне Унеча — Навазыбкаў партызанскім атрадам пад камандаваннем рабочага кіеўскага завода «Арсенал» В. Н. Бажэнкі. Кіслоў прывёў да партызан цэлую групу хлопцаў, у ліку якіх былі Мікіта Судаленка, Радзівон Чэх, Давыд Прыходзька, Павел Чэх, Купрэй Радчыкаў, Аўрам Сніцарэнка, Захар Гацка, Васіль Малочка, Лазар Залужны, Іван Кіслоў і іншыя. Гэты атрад удзельнічаў у баях з нямецкімі акупантамі і бандамі ўкраінскіх нацыяналістаў.

У верасні 1918 г. па рашэнні Рэчыцкага падпольнага павятовага камітэта партыі ў вёсцы Крыўча адбыўся нелегальны з'езд прадстаўнікоў Брагінскага, Мікуліцкага, Савіцкага, Ялчанскага, Хойніцкага, Лоеўскага, Ручаёўскага і Дзяражыцкага валасных рэўкамаў. З асноўным дакладам — аб мабілізацыі ўсіх сіл на барацьбу з нямецкімі акупантамі, аб рэкамендацыях павятовага паўстанцкага камітэта па разгортванні партызанскага руху на акупіраваных паўднёва-заходніх тэрыторыях рэспублікі выступіў прадстаўнік Рэчыцкага падпольнага павятовага камітэта партыі Л. Х. Васілявіцкі. Былі

[1] Расійскі цэнтр захавання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі. Ф. 17. Воп. 4. Спр. 93. Л. 14.

пастаўлены канкрэтныя задачы ў сувязі з будучым наступленнем Чырвонай Арміі па ўсім савецка-германскім фронце.

Пасля крыўчанскага з'езда дзеянні Брагінскага, Мікуліцкага, Савіцкага, Ялчанскага і Крыўчанскага партызанскіх атрадаў, на чале якіх былі П. В. Скараход, Р. В. Мігай, І. М. Скараход, К. П. Мельнік і В. А. Валасенка, набылі яшчэ большую ўзгодненасць, а рады народных мсціўцаў папоўніліся дзесяткамі адважных байцоў.

«У час правядзення з'езда ў Крыўчы з'явіўся са сваёй бандай крымінальных злачынцаў і кулацкіх элементаў эсэр манархічнага ўхілу Беразняцкі, які здрадліва супрацоўнічаў з нямецкімі ўладамі,— успамінаў Л. Х. Васілявіцкі.— Беразняцкі меў намер арыштаваць удзельнікаў з'езда, але, пасля раззбраення банды, быў арыштаваны сам і расстраляны па прысуду ваенна-рэвалюцыйнага трыбунала»[1].

6 верасня 1918 г. Рэчыцкі павятовы Савет звярнуўся да ўрада РСФСР з просьбай дапамагчы ў вызваленні ад нямецкай акупацыі. Гэтая пазіцыя мела гарачую падтрымку сярод насельніцтва ўсіх валасцей павета. Жыхары Брагіншчыны падмацавалі яе актывізацыяй барацьбы супраць ворага, аб чым сведчыць бой партызан за вёскі Крыўча, Новая Аляксееўка і Савічы, у якім адважна дзейнічалі камуністы В. Канчар, Т. Лявоненка, Ф. Хаменка і С. Вароненка[2], а таксама дзёрзкая баявая аперацыя партызан атрада Піліпа Скарахода супраць германска-гетманаўскага гарнізона ў Брагіне і Касачове 6 кастрычніка 1918 г.

Дзень быў кірмашовы, і на рынкавую плошчу з'ехалася многа людзей, асабліва падвод з сенам. Прыкладна ў палавіне дня з гэтых вазоў вылезлі ўзброеныя партызаны і пачалі вылоўліваць паліцэйскіх казачкоў і нямецкіх салдат. Аперацыя прайшла паспяхова. Але раптам з боку маёнтка Касачоў немцы адкрылі моцны кулямётны абстрэл. Партызаны павялі наступленне на ворага і пасля бою, які доўжыўся да самага вечара, адступілі. У гэтым баі народныя мсціўцы захапілі нямала зброі і боепрыпасаў, хоць і самі страцілі 10 чалавек забітымі і параненымі.

Сваю злосць за смелую партызанскую акцыю акупанты нярэдка зрывалі на мірным насельніцтве.

Паражэнне аўстра-германскага блока ў 1-й імперыялістычнай вайне і ліста-падаўская рэвалюцыя ў Германіі стварылі спрыяльныя ўмовы для вызвалення акупіраваных кайзераўцамі тэрыторый. У лістападзе УЦВК анулiраваў Брэсцкі мірны дагавор. Акупанты вымушаны былі пакінуць Брагіншчыну і навакольныя мясцовасці, баючыся быць уцягнутымі ў баявыя дзеянні з партызанамі да падыходу чырвонаармейскіх часцей. 13 снежня 1918 г. у тэлеграме рэўваенсавета Заходняга фронту старшыні УЦВК Я. М. Свярдлову паведамлялася, што «В Речицком уезде до прихода Красной Армии Советская власть установилась в Брагине, Хойниках, Слободе, Малодуше и других населенных пунктах»[1].

16 снежня 1918 г. усю ўладу ў валасцях Брагіншчыны і Камарыншчыны ўзялі ў свае рукі рэвалюцыйныя камітэты. Іх узначальвалі Сяргей Краўчанка (Брагін), Раман Дыгун (Мікулічы), Павел Старахатні (Савічы), Аляксандр Гардзейчык (Ёлча), Ісак Новік (Дзяражычы) і г. д.

1 студзеня 1919 г. Часовы рабоча-сялянскі ўрад Беларусі абнародаваў маніфест, які абвясціў наш край суверэннай Беларускай Савецкай Рэспублікай. Набыццё беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці стварыла спрыяль-

[1] Гомельскі краязнаўчы музей. Ф. 5. Спр. 6. 1968.

[2] Иностранная военная интервенция в Белоруссии (1917—1920). Мн., 1990. С. 132.

[1] Крах немецкой оккупации в Белоруссии в 1918 году. Мн., 1947. С. 181.

ныя ўмовы для развіцця самасвядомасці працоўных рэспублікі, згуртавання іх сіл для барацьбы са знешняй і ўнутранай контррэвалюцыяй.

У гэты час балышавікі ўдзялялі неаслабную ўвагу ўмацаванню Савецкай улады на вёсцы. Задача часткова была рэалізавана праз сялянскія камітэты беднаты, якія ў лістападзе — снежні 1918 г. ствараліся ў цэнтрах валасцей, а затым і ў буйнейшых населеных пунктах Брагіншчыны і Камарыншчыны. Камбеды аказвалі дапамогу мясцовым Саветам у згуртаванні бяднейшага сялянства вакол Савецкай улады, актыўна садзейнічалі выкананню заданняў па харчразвёрстцы, правядзенню мабілізацыі, набору добраахвотнікаў у Чырвоную Армію і інш.

Стварэнне камбедаў абвастрыла барацьбу класаў і ўзмацніла сацыяльнае расслаенне ў вёсцы. Бо праз гэтыя ініцыятыўныя самадзейныя сялянскія аб'яднанні дзяржава пазбавіла ёю ж надзеленых зямлёй вяскоўцаў законнага права па сваім угледжанні распараджацца прадуктамі ўласнай працы. Актыўныя сілавыя метады работы асобных бядняцкіх камітэтаў, як гэта мела месца ў Савіцкай, Ялчанскай і некаторых іншых валасцях, нярэдка з'яўляліся прычынай пераходу значнай часткі сялян у апазіцыю да ўлады і абвастрэння становішча на вёсцы. Асобныя варожыя да Савецкай улады буржуазна-кулацкія элементы ствараліпадпольныя ўзброеныя групы, якія шляхам запалохвання і шантажу, а пазней і жорсткага тэрору імкнуліся распаліць сярод сялян антыбальшавіцкія настроі.

К пачатку 1919 г. міжнароднае становішча Савецкай дзяржавы ўскладнілася. На ўсходзе наступала армія Калчака, на захадзе пагрозу ствараліпройскі Юдзеніча і актыўная падрыхтоўка да ваенных дзеянняў буржуазна-памешчыцкай Польшчы, якая мела намер расшырыць свае тэрыторыі за кошт захопу беларускіх і ўкраінскіх зямель. У гэтай цяжкай сітуацыі партыйныя і савецкія органы праводзілі арганізацыйную і палітычна-масавую работу па аказанні ўсебаковай дапамогі Чырвонай Арміі. У неакупіраваных раёнах, у т. л. на Брагіншчыне і Камарыншчыне, праводзіліся кампаніі па мабілізацыі моладзі, збору прадуктаў для патрэб фронту і інш. Асабліва актыўна вялася гэтая работа ў Мікуліцкай воласці, дзе насельніцтвам добраахвотна і датэрмінова былі выкананы заданні па харчразвёрстцы. Аб гэтым упамінаецца ў загадзе Кашалёўскага валаснога рэўкама Гомельскай губерні ад 11 снежня 1919 г.: «Волревком приказывает объявить населению следующее: село Рудаково Микуличской волости Речицкого уезда сдало излишки к сроку, добровольно, за что, согласно распоряжения председателя Совнаркома товарища Ленина и наркома продовольствия товарища Цюрупы, названное село освобождено от всяких воинских продовольственных реквизиций и обысков, от натурального помольного сбора и премировано отпуском товаров в двойном размере»[1].

Вясной 1919 г. імперыялісты краін Антанты арганізавалі чарговы паход супраць Савецкай Расіі. Дзяржава аказалася ў кальцы белагвардзейскіх (Калчак, Дзянікін, Юдзеніч), інтэрвенцкіх (англа-франка-амерыканцы з поўначы, польскія легіянеры з захаду) армій. У паўднёва-заходніх раёнах Гомельшчыны актывізаваліся банды ўкраінскіх нацыяналістаў — пятлюраўцаў, якія спрабавалі распаўсюдзіць уладу Цэнтральнай украінскай рады на гэтыя тэрыторыі. З мэтай аб'яднання сіл для барацьбы з іншаземнай інтэрвенцыяй яшчэ ў першыя дні лютага 1919 г. Літва і Беларусь вымушаны былі аб'яднацца ў Літоўска-Беларускую ССР (ЛітБел ССР) на тэрыторыі Віленскай, Мінскай, Ковенскай, Гродзенскай і часткі Сувалкаўскай губерняў. 8 красавіка ЦВК ЛітБел ССР аб'явіў рэспубліку на ваенным становішчы.

[1] Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 392. Воп. 1. Спр. 10. Л. 30.

У канцы сакавіка 1919 г. прадстаўнікі рэўкамаў мясцовых валасцей сабраліся ў Брагіне на з'езд, які абмеркаваў пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай выбараў у валасныя выканаўчыя камітэты. На ім прысутнічалі 42 дэлегаты. Заслухаўшы даклад сакратара партыйнай ячэйкі Мікалая Несцярка аб праграме і тактыцы Савецкай улады і бягучым моманце, з'езд адпаведна прыняў рэзалюцыю, у якой вітаў Савецкую ўладу, як адзіна здольную адстойваць інтарэсы рабочага класа і сялянства[1]. Затым на валасных з'ездах у Брагіне, Мікулічах, Савічах, Ёлчы, Дзяражычах, Ручаёўцы рэвалюцыйныя камітэты склалі свае паўнамоцтвы і перадалі іх выканаўчым камітэтам Саветаў. Было зроблена самае галоўнае — створаны савецкі апарат[2].

Пасля выгнання акупантаў найпершым клопатам выканкамаў Саветаў былі пытанні барацьбы з разрухай, размеркаванне памешчыцкіх зямель, будаўніцтва жыцця на новы лад. Тут добра праявілася арганізуючая і мабілізуючая роля камуністаў, рады якіх паступова папаўняліся за кошт найбольш свядомых і адданых рэвалюцыйнай справе рабочых і сялян. Кіраўнік тагачаснай Рэчыцкай павятовай партыйнай арганізацыі А. С. Касценка адзначаў: «У жніўні 1919 года павятовая партыйная арганізацыя налічвала ў сваіх радах 200 чалавек і вялікую групу спачуваючых. Асабліва моцная партыйная арганізацыя была на Брагіншчыне. Яе ўзначальвалі Краўчанка, Несцярок, Мігай, Крупадзёраў, Скараход і інш.»[3].

Сілы ўнутранай контррэвалюцыі, імперыялістычныя колы Захаду не жадалі пазбавіцца ад сваіх ранейшых намераў задушыць Савецкую ўладу. У сакавіку 1919 г. у Гомелі ўспыхнуў мяцеж, узняты эсэрам Стракапытавым у 67-м і 68-м палках Тульскай брыгады. Але неўзабаве мяцежнікі былі разгромлены.

Даведаўшыся аб мяцяжы ў Гомелі і Рэчыцы, брагінская буржуазная інтэлігенцыя ў асобе настаўніка мясцовага народнага вучылішча, былога царскага афіцэра Івана Каноды, адваката Цыркіна, начальніка пошты Пятра Ганчарэнкі, землямера Фёдара Раманенкі, гандляроў Рэзнікава і Равіковіча паспрабавалі захапіць уладу, стварыўшы «Камітэт бяспекі». Па даручэнні выканкама Брагінскага валаснога Савета начальнік мясцовай міліцыі К. П. Мельнік прабраўся ў акупіраваны палякамі Брагін з групай партызан на чале з П. В. Скараходам і разагнаў самазваную ўладу.

2 мая 1919 г. адбылася 1-я Гомельская губернская партыйная канферэнцыя, у якой прымалі ўдзел і дэлегаты з Брагіншчыны: С. Краўчанка, А. Гардзейчык, С. Кліменка, Р. Мігай, Ц. Манжос, М. Несцярок, П. Старахатні. Канферэнцыя абмеркавала дзейнасць губернскай партарганізацыі. У прынятых рашэннях былі прадугледжаны мерапрыемствы па павелічэнні дапамогі фронту, узмацненні работы па аднаўленні народнай гаспадаркі[1].

У жніўні 1919 г., наступаючы з поўдня, войскі Дзянікіна захапілі Чарнігаў і стварылі сур'ёзную пагрозу Гомельскай губерні. Сабраўшыся з сіламі, у сярэдзіне верасня Чырвоная Армія разграміла асноўныя часці Дзянікіна. Але на захадзе фронт стаяў на Бераліне да вясны наступнага года.

У верасні 1919 г. польскія войскі прарваліся ў раён Бабруйска праз Беразіну і пачалі наступленне на Рагачоў, Жлобін у абход Гомельскага ўмацаванага раёна. Затым чарговае цяжкае выпрабаванне чакала нашу краіну вясной 1920 г. — палякі захапілі Мазыр, Калінкавічы, Рэчыцу.

---

[1] Звязда, 1919. 15 сак.
[2] Известия Речицкого Совета, 1919. 20 сак.
[3] Гомельскі краязнаўчы музей. Ф. 5. Спр. 10. Інв. № 83.

[1] Гомельскі краязнаўчы музей. Ф. 5. Спр. 15. Інв. № 89.

На Палессі польскія легіянеры сустрэлі ўпартае супраціўленне Чырвонай Арміі і апалчэнскіх фарміраванняў. У прыватнасці, 8 мая 1920 г. байцы Пралетарскага (Камуністычнага) батальёна з ліку рэчыцкіх, брагінскіх і лоеўскіх камуністаў і камсамольцаў разам з чырвонаармейцамі каля чатырох гадзін вялі бой з ворагам каля вёскі Воўчая Гара. За гэты час з Рэчыцы была эвакуіравана каштоўная дзяржаўная маёмасць, часці 57-й дывізіі Чырвонай Арміі пераправіліся на левы бераг Дняпра і занялі там абарону. Большасць байцоў апалчэнскага батальёна, у т. л. Залман Гуцьянтаў з вёскі Рудня Жураўлёва, Якаў Кур'ян з вёскі Дублін і іншыя загінулі[1].

У красавіку войскі акупантаў уступілі на Брагіншчыну і Камарыншчыну. Як і раней, пры германцах, улада ў валасцях перайшла да земскіх управаў, якія сталі марыянеткамі ў руках акупантаў.

Вораг устанавіў жорсткі рэжым тэрору, грабяжу і насілля. Так, па загаду польскага каменданта былі расстраляны актыўны ўдзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, старшыня Брагінскага валвыканкама Іван Мінавіч Федарэнка з вёскі Вуглы, член (дэпутат) Астраглядаўскага сельскага Савета Сяргей Кананок, да смерці замучана жонка партызана Арцёма Радчанкі — Фядора Радчанка і г. д. Антынародная палітыка акупантаў выклікала рашучыя пратэсты працоўных. Людзі ўсё актыўней узнімаліся на барацьбу з ворагам.

У адпаведнасці з патрабаваннямі Палітбюро ЦК КП(б) Літвы і Беларусі падпольныя партыйныя арганізацыі акупіраваных тэрыторый прыступілі да разгортвання ўсенароднай барацьбы супраць акупантаў. Па рашэнні Гомельскага губернскага камітэта ўся паўната ўлады ў цэнтры і на месцах зноў была перададзена рэвалюцыйным камітэтам. У тыле акупантаў разгортваўся партызанскі рух. Асабліва шырокі размах ён набыў у Брагінскай воласці, а таксама на Камарыншчыне[1]. Ужо 5 мая партызанскія атрады пад камандаваннем П. В. Скарахода і В. А. Валасенкі ўступілі ў бой з акупантамі каля вёсак Гарадзішча і Малейкі. На мосце праз Брагінку партызаны ўстанавілі кулямёты. Іх агнём была разбіта варожая рота. Пры гэтым загінуў польскі афіцэр. Потым, узарваўшы мост, партызаны адступілі і, каб захаваць сілы, пераправіліся на ўсходні бераг Дняпра[2].

У лютым — красавіку 1920 г. партызаны грамілі варожыя гарнізоны ў Мазырскім і Пінскім паветах. Добрая слава ішла пра конны партызанскі атрад П. В. Скарахода, які налічваў на той час больш як 300 байцоў. У яго радах пад Тонежам, Давыд-Гарадком і ў іншых месцах вызначыліся брагінцы і камарынцы Кузьма Баброўнік, Мікіта Бандарэнка, Іван Бельчанка, Аляксей Вароненка, Давыд Васільеў, Іван Галка, Ціхан Ганчар, Аляксандр Голуб, Андрэй Кабанчук, Фёдар Камандзірчык, Юрый Каплан, Пімен Кіслоў, Піліп Кіслы, Іван Кляпец, Восіп Крот, Зэлік Левін, Адам Маручок, Антон Мартыненка, Яўсей Міркін, Даніла Музычэнка, Аляксандр Несцярок, Яфім Палуян, Аляксандр Перавознікаў, Дзмітрый Посмык, Мікалай Прымак, Рыгор Прыходзька, Піліп Слепакоў, Фёдар Уласенка, Мікіта Хвошчанка, Несцер Ціханчук, Лявон Ярмоленка і іншыя партызаны.

Нягледзячы на тое, што польскія войскі захапілі Мінск і некаторыя навакольныя раёны, для маладой Савецкай Рэспублікі летам 1919 г. галоўным з усіх франтоў быў усё ж Паўднёвы, дзе наступала белагвардзейская армія Дзянікіна. Калі восенню таго ж года прагучаў заклік: «Усе на барацьбу з Дзянікіным!», на яго дружэ-

[1] Гомельскі краязнаўчы музей. Ф. 5. Спр. 12. Інв. № 83.

[1] Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 200. Воп. 2. Спр. 491. Л. 19–20.

[2] Трыбуна калгасніка, 1935. № 59.

на адгукнуліся камуністы і камсамольцы Брагіншчыны і Камарыншчыны. На фронт пайшлі Пётр Асядач, Навум Генін, Ісак Каплан, Сямён Ціханчук, Пётр Шынкарэнка, Ануфрый Ятчанка і іншыя. Затым у Чырвоную Армію былі накіраваны партыйцы Восіп Крот, Аляксандр Несцярок, Уладзімір Румянцаў з Брагінскай, Іван Грышан, Пятро Грышан, Даніла Музычэнка, Фёдар Нячоса з Ялчанскай партячэек, а таксама Пётр Волкаў (в. Вельямоў), Юрый Каплан, Павел Кушняроў (м. Брагін), Іван Кіслоў (в. Крыўча), Рыгор Кузьменка і Рыгор Прыходзька (в. Дуброўнае), Пётр Паўлючэнка (в. Багушы), Арцём Пікуль (в. Вялікі Лес), Давыд Скарупскі, Андрэй Скідан (м. Брагін), Васіль Снежка (в. Астрагляды) і іншыя нашы землякі.

У баях супраць белапалякаў, пятлюраўцаў і белагвардэйцаў у 1919 — 1920 гг. прымалі актыўны ўдзел байцы Тарашчанскага і Багунскага палкоў 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі Карней Мартышук (м. Камарын), Адам Раманавец (п. Новы Пуць), Укол Ефіменка, Макар Шупан (в. Хракавічы), Аляксандр Краўчанка (п. Садовы), Сямён Парэмскі, Ціт Манжос (м. Брагін), Рыгор Прыходзька (в. Хракавічы) Адам Прымачэнка (в. Ляды) і іншыя. Дарэчы, Р. Прыходзька быў ад'ютантам у камандзіра Тарашчанскага палка В. Н. Бажэнкі. А жыхар вёскі Крыўча Фёдар Кіслы ў тым жа палку камандаваў батальёнам.

У складзе Багунскага палка ў перыяд летняга наступлення Чырвонай Арміі ў 1920 г. вызначыўся ўраджэнец вёскі Дуброўнае Сяргей Таміловіч-Данчанка. 1 мая 1921 г. перад строем аднапалчан у г. Жытоміры камандзір дывізіі І. Н. Дубавы ўручыў адважнаму байцу ордэн Чырвонага Сцяга. Такой жа ўзнагароды быў удастоены аднапалчанін Таміловіча-Данчанкі, у далейшым старшыня Брагінскага вылвыканкама П. І. Купрыянаў.

Пад сцягам праслаўленай 14-й дывізіі, якой камандаваў герой грамадзянскай вайны Аляксандр Пархоменка, ваяваў наш зямляк Уладзімір Сушчанка (в. Шкураты). За смеласць і адвагу ён быў узнагароджаны Граматай, якую падпісалі С. М. Будзённы і К. Я. Варашылаў. Па партыйнай мабілізацыі ў кастрычніку 1919 г. разам з групай камуністаў-землякоў у складзе камуністычнага палка 57-й дывізіі на фронт пайшоў старшыня Мікуліцкага валвыканкама С. І. Кліменка. Добраахвотнікамі змагаліся на франтах грамадзянскай вайны многія камсамольцы Брагіна і Камарына, вёсак Аляксееўка, Крыўча, Верхнія і Ніжнія Жары і г. д. 67 членаў РКСМ з Брагіншчыны ваявалі ў складзе Багунскага і Тарашчанскага палкоў 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса.

І. Ф. Ганжураў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

СА ЗВАРОТУ САВЕТА РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І САЛДАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ СЯЛА ТУЛЬГАВІЧЫ РЭЧЫЦКАГА ПАВЕТА ДА ПРАДСТАЎНІКОЎ РСФСР

6 снежня 1918 г.

Народ стал иметь глубокую веру, что... не сегодня — завтра большевики займут наш уезд и избавят народ от германского и гетманского ярма. Но накануне освобождения, 21 ноября (ст. стиля) державная варта, руководимая «доблестными» русскими офицерами, при поддержке немецкой кавалерии поехала в Брагин поймать лиц, разгромивших варту в имении Косачев, встретили на своем пути народ, шедший из церкви на базар, и, ничтоже

сумняшеся, открыли по крестьянам ружейно-пулеметный огонь. Результатом оказалось убитых 42 человека невиниых людей. Кроме того, у всех ограбили обувь, одежду и деньги, хоронить убитых воспрещали и не давали желавшим взять покойников и избивали...

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 3405. Воп. 1. Спр. 8. Л. 40—41.

З ЗАГАДА КАШАЛЁЎСКАГА ВАЛАСНОГА РЭЎКАМА ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЕРНІ

11 снежня 1919 г.

Волревком приказывает объявить населению следующее: село Рудаково Микуличской волости Речицкого уезда сдало излишки к сроку, добровольно, за что, согласно распоряжения председателя Совнаркома товарища Ленина и наркома продовольствия товарища Цюрупы, названное село освобождено от всяких воинских продовольственных реквизиций и обысков, от натурального помольного сбора и премировано отпуском товаров в двойном размере.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 392. Воп. 1. Спр. 10. Л. 30.

Актыўныя ўдзельнікі першай расійскай (1905—1907), Лютаўскай, Кастрычніцкай рэвалюцый (1917) і грамадзянскай вайны (1918—1920)

Асарэвіцкі сельсавет

Царанок Андрэй Несцеравіч, н. у 1895 г. у в. Асарэвічы. Член РКП(б) з 1919 г. Актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны. Вызначыўся ў барацьбе з унутранай контррэвалюцыяй, кайзераўскімі і польскімі акупантамі. З'яўляўся коннікам партызанскага атрада П. В. Скарахода. Першы старшыня Асарэвіцкай сельскагаспадарчай камуны імя К. Маркса (1920). Памёр у 1981 г., пахаваны ў г. Кіеў.

Астраглядаўскі сельсавет

Каробкін Адам Міхайлавіч, н. у 1891 г. у в. Бакуны. Член РКП(б) з 1924 г. У Чырвонай Арміі ў 1918—1922 гг. Актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны. Праявіў сябе ў баях супраць войск Дзянікіна, Урангеля і Калчака. З 1923 г. першы старшыня сельсавета, з 1929 г.— старшыня калгаса ў роднай вёсцы. У 1931 г. старшыня Брагінскага раённага савета Асаавіяхіма. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў партызанах. Загінуў у 1942 г. у г. п. Брагін.

Крупадзёраў Савелій Цімафеевіч, н. у 1876 г. у в. Хатуча. Член РСДРП з 1917 г. Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг. Па прыгавору царскага суда адбываў двухгадовы тэрмін зняволення ў турме Бабруйскай крэпасці. У 1907 г. узначальваў Брагінскую сацыял-дэмакратычную групу. Удзельнічаў у партызанскім руху на Брагіншчыне супраць нямецкіх і польскіх акупантаў. У 1920—1924 гг. працаваў намеснікам старшыні Брагінскага валвыканкама. З 1924 г. працаваў у органах унутраных спраў. Памёр у 1954 г. Пахаваны ў г. Днепрапятроўск.

Смусянок Фёдар Яфімавіч, н. у 1893 г. у в. Вязок. У Чырвонай Арміі ў 1919—1922 гг. Удзельнічаў у баях супраць войск Дзянікіна, бандаў Антонава, Булак-Балаховіча. Да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Снежка Васіль Ільіч, н. у 1899 г. у в. Астрагляды. У 1918 г. байцом пралетарскага камуністычнага батальёна ў складзе Чалябінскага камуністычнага палка, падчас наступлення калчакаўскіх войск, браў удзел у вывазе дзяржаўнага залатога запасу з Іркуцка. Памёр у 70-я гг.

Таміловіч-Данчанка Сяргей Аляксандравіч, н. у 1894 г. у в. Дуброўнае. У 1918 г. добраахвотнікам уступіў у Чырвоную Армію. Праходзіў службу і

С. А. Таміловіч-Даичанка

Я. Е. Палуян

ваяваў у складзе Багунскага палка 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса. За гераізм і мужнасць у 1919 г. узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У 1938 г. працаваў намеснікам старшыні Брагінскага райвыканкама. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР першага склікання. Да 60-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі за заслугі ў гады грамадзянскай вайны ўзнагароджаны ордэнам Леніна. Памёр на пачатку 80-х гг. Пахаваны ў роднай вёсцы.

Брагінскі пасялковы Савет

Дубіна Іван Пятровіч, н. у 1886 г. у м. Брагін. Член РСДРП з 1904 г. Настаўнік Брагінскай земскай школы. За ўдзел у рэвалюцыі 1905—1907 гг. быў сасланы на пажыццёвую катаргу. Пасля Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый удзельнічаў ва ўстанаўленні ўлады Саветаў у родных мясцінах, узначальваў аддзел міліцыі ў Камарыне. Настаўнічаў у Брагіне.

Казіміроўская-Канеўская Вера Самойлаўна, н. у 1885 г. у м. Брагін. Член РСДРП з 1904 г. За ўдзел у рэвалюцыі 1905—1907 гг. у 1908 г. асуджана да шасці гадоў катаргі і затым выслана на вечнае пасяленне ў Енісейскую губерню. З 1917 г. на прафсаюзнай, партыйнай, савецкай рабоце ў Брагіне і Днепрапятроўску. Памерла ў 1960 г.

Краўчанка Сяргей Яўстратавіч, н. у 1890 г. у м. Брагіи. Член РСДРП з красавіка 1917 г. У кастрычніку таго ж года стаў першым старшынёй Брагінскага рэўкама. Член Рэчыцкага павятовага камітэта партыі. Арганізатар партызанскай барацьбы супраць нямецкіх акупантаў у 1918 г. У 1919 г.— старшыня Брагінскага валаснога выканаўчага камітэта. Памёр у 1920 г.

Купрыянаў Пётр Іванавіч, н. у 1897 г. Член РКП(б) з 1917 г. Актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны. Служыў і ваяваў у 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У 1921—1923 гг.— старшыня Брагінскага валвыканкама. Загінуў у Вялікую Айчынную вайну.

Манжос Ціт Антонавіч, н. у 1894 г. у м. Брагін. Член РКП(б) з 1917 г. Удзельнік грамадзянскай вайны, партызанскага руху ў 1918—1920 гг. У 1921—1925 гг. узначальваў Брагінскую валасную партячэйку, працаваў старшынёй Ручаёўскага валвыканкама, у Рэчыцкім павятовым камітэце партыі. Пасля заканчэння ў 1931 г. Ленінградскага інжынерна-эканамічнага інстытута працаваў загадчыкам вытворчасці абуткоўай фабрыкі «Скараход», ва Усерасійскім савеце народнай гаспадаркі (ВСНХ). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Загінуў у верасні 1944 г. пад г. Тарту, Эстонія. Узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, Айчыннай вайны I ступені (пасмяротна). Імем Ц. А. Манжоса названа адна з вуліц у Брагіне.

Палуян Яфім Ерамеевіч, н. у 1893 г. Матрос балтыйскага крэйсера «Храбры». У складзе зводнай каманды матросаў Кранштацкага гарнізона прымаў удзел у штурме Зімняга палаца ў дні Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Петраградзе. Чырвоны партызан атрада П. В. Скарахода ў перыяд барацьбы з нямецкімі і польскімі акупантамі ў 1918—1919 гг.

У 1919—1921 гг. начальнік Камарынскай, старшы міліцыянер Савіцкай валасной міліцыі. Памёр у 1981 г.

Пікас Трафім Міхеевіч, н. у 1888 г. у в. Бывалькі на Лоеўшчыне. Член РКП(б) з 1918 г. У Чырвонай Арміі ў 1918—1920 гг. Браў удзел у грамадзянскай вайне. Камісар 34-га кавалерыйскага палка 1-й коннай арміі С. М. Будзённага. У 1921—1922 гг.— старшыня Ручаёўскага валвыканкама. У 1922—1923 гг. узначальваў атрад па барацьбе з бандытызмам у родных мясцінах. З 1925 г. жыў і працаваў у Брагіне. Памёр у 1962 г.

Рабоўскі Веніямін Яфімавіч, н. у 1885 г. у м. Брагін. Член РСДРП з 1905 г. Рабочы сталепракатнага завода, адзін з кіраўнікоў Бахмуцкага акруговага камітэта сацыял-дэмакратаў. Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг. Арыштаваны ў 1911 г. і асуджаны Віленскай судовай палатай. Тры гады ўтрымліваўся ў турме Бабруйскай крэпасці. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне. Пазией працаваў у міліцыі ў Гомелі, старшынёй калгаса ў в. Глухавічы. Памёр у 1962 г.

Самсонаў Ірма Міхайлавіч, н. у 1891 г. Член ВКП(б) з 1929 г. З 1917 г. у Чырвонай гвардыі, у 1918—1922 гг.— у Чырвонай Арміі. Прымаў удзел ва ўзброеным паўстанні ў Петраградзе, у разгроме войск Дзянікіна. З 1929 г. старшыня калгаса «Новы свет» у Брагіне. Памёр у 1975 г.

Скараход Іван Мікітавіч, н. у 1895 г. у м. Брагін. Член РКП(б) з 1919 г. Удзельнічаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайне. У 1919—1925 гг.— начальнік камарынскай міліцыі. Ваяваў супраць нямецкіх і польскіх акупантаў у 1918—1919 гг., узначальваў лятучы атрад па разгроме бандаў Струка, Галака. Памёр у 1927 г. Пахаваны ў г. п. Камарын.

Скараход Піліп Восіпавіч, н. у 1885 г. у м. Брагін. Член РСДРП з 1917 г. Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг. і грамадзянскай вайны. У 1918—1921 гг. узначальваў конны партызанскі атрад па барацьбе з нямецкімі, польскімі акупантамі, з унутранай контррэвалюцыяй. У 1921 г.— начальнік Брагінскай валасной міліцыі. Памёр у 1922 г.

Слепакоў Піліп Паўлавіч, н. у 1891 г. у в. Каравацічы Рэчыцкага павета. У перыяд грамадзянскай вайны ў складзе Тарашчанскага палка 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса прымаў удзел у баях з пятлюраўцамі. У 1922—1923 гг.— сакратар Гомельскага губернскага ваеннага трыбунала. У 1923—1959 гг.— на савецкай рабоце ў Брагінскім раёне. Памёр у 1959 г.

Верхнежараўскі сельсавет

Юшчанка Дзмітрый, н. у 1884 г. у в. Верхняя Жары. Матрос рэвалюцыйнага браняносца «Пацёмкін». Цудам пазбег расправы за ўдзел разам з камандай у паўстанні 1905 г. Пасля таго ў родных мясцінах узначальваў барацьбу сяляні супраць памешчыка Рыбінкава. За гэта разам з таварышам, вяскоўцам Міхаілам Блудчым асуджаны і сасланы на два гады на поўнач Расіі.

Вуглоўскі сельсавет

Раманавец Адам Ісакавіч, н. у 1900 г. у в. Шкураты. У Чырвонай Арміі з 1919 г. У 1919—1920 гг. артылерыст А. І. Раманавец змагаўся супраць унутранай контррэвалюцыі і польскіх войск. У 1927—1929 гг. член (дэпутат) Шкуратоўскага сельсавета, адзін з аргаізатараў калгаса «Парыжская камуна». Забіты кулакамі 4.12.1929 г. у в. Новы Пуць. Пахаваны ў в. Шкураты.

Сушчанка Уладзімір Іванавіч, н. у 1898 г. у в. Шкураты. Актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны. Чырвоны кавалерыст 14-й дывізіі пад камандаваннем А. Я. Пархоменкі. Ваяваў з белагвардзейцамі Урангеля, махноўцамі. Узнагароджаны Граматай за подпісамі К. Я. Варашылава і С. М. Бу-

дзённага. Браў удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Памёр у 1976 г. Пахаваны ў в. Шкураты.

Камарынскі пасялковы Савет

Каплан Ісак Майсеевіч, н. у 1902 г. у м. Камарын. Член ВКП(б) з 1927 г. У перыяд грамадзянскай вайны ў складзе 1-га Камуністычнага палка ўдзельнічаў у разгроме бандаў Пятлюры і Марусі Зялёнай. У 1929—1932 гг.— старшыня Камарынскага райспажыўсаюза, у 1933—1941 гг. і 1945—1955 гг.— старшыня Гомельскага аблспажыўсаюза. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Памёр у 1957 г. Пахаваны ў г. Гомель.

Мартышук Карней Андрэевіч, н. у 1897 г. на Гродзеншчыне. Член РСДРП з красавіка 1917 г. У 1912 г. працаваў у зброевых майстэрнях Сестрарэцкага завода ў Пецярбургу. У 1915—1917 гг. на фронце першай сусветнай вайны. Пасля ранення пад Перамышлем лячыўся ў пецярбургскім шпіталі. Потым прымаў удзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ваяваў на Заходнім фронце. Летам 1918 г. удзельнічаў у ліквідацыі мяцяжу чэхаславацкага корпуса на Урале. На пачатку 1919 г. ваяваў у Багунскім палку 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса. У 1920—1923 гг.— сакратар Камарынскай і Ялчанскай партыйных ячэек. З 1924 г. сакратар Падольскага райкама партыі г. Кіева, з 1938 г.—сакратар Луцкага гаркама КП(б) Украіны. У 1942 г. загінуў у баях пад Сталінградам.

Трызна Мікалай Аляксандравіч, член РКП(б) з 1917 г. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. У 1935—1936 гг.— першы сакратар Камарынскага райкама КП(б)Б. Браў удзел у Вялікай Айчыннай вайне. У жніўні 1941 г. узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга (пасмяротна).

Крукаўскі сельсавет

Касцючэнка Міхаіл Міронавіч, н. у 1893 г. у в. Крукі. У 1916—1917 гг.— балтыйскі матрос, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Ваяваў супраць дзянікінцаў і бандаў Пятлюры. У 1923 г. старшыня Крукаўскага сельсавета. У 1938 г. стаў ахвярай палітычных рэпрэсій.

П. А. Самойленка

Самойленка Піліп Алімпіевіч, н. у 1898 г. у в. Міхалёўка. У складзе 273-й кулямётнай роты Смаленскай пяхотнай дывізіі браў удзел у першай сусветнай вайне. На пачатку 1918 г. накіраваны ў Пецяргофскі артылерыйскі полк. У кастрычніку 1917 г. у складзе 34-га чырвонага палка 7-й арміі прымаў удзел у баях з войскамі Юдзеніча пад Царскім Сялом, у 1921 г. у складзе 79-й брыгады — у падаўленні Кранштацкага мяцяжу. Пасля дэмабілізацыі ў снежні 1921 г. працаваў на будоўлях Мінска, на пачатку 30-х гг.— старшынёй, а ў далейшым калгаснікам калгаса «XII Кастрычнік» у роднай вёсцы. Да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі ўзнагароджаны медалём «За баявыя заслугі». Памёр у 1968 г. Пахаваны ў роднай вёсцы.

Старахатні Павел Апанасавіч, н. у 1876 г. у в. Жалібор. Член РСДРП з 1916 г. Удзельнік руска-японскай вайны 1904—1905 гг. За актыўны ўдзел у рэвалюцыі 1905—1907 гг. адбываў двухгадовае зняволенне ў Екацярынаслаўскай турме. Як член Брагінскай сацыял-дэмакратычнай групы ўдзельнічаў у палітычных масоўках. У перыяд грамадзянскай вайны змагаўся з унутранай контррэвалюцыяй, затым з нямецкімі і

Т. П. Старахатні

В. А. Валасенка

польскімі акупантамі. У 1919 г. старшыня Савіцкага валвыканкама. Загінуў ад бандыцкай кулі ў 1921 г. Пахаваны ў в. Жалібор.

Старахатні Трафім Паўлавіч, н. у 1898 г. у в. Жалібор. Член РКП(б) з 1919 г. Балтыйскі матрос, прымаў удзел у разгроме войск Юдзеніча пад Петраградам. У 1920—1921 гг.— загадчык зямельнага аддзела Савіцкага валвыканкама. Па-зверску замучаны кулакамі. П. А. і Т. П. Старахатнія пахаваны ў в. Жалібор. На могілках у гонар іх устаноўлена надмагільная пліта з надпісам: «Героям Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны».

Крыўчанскі сельсавет

Валасенка Восіп Аляксеевіч, н. у 1891 г. у в. Крыўча. Член РСДРП з 1917 г. Член Брагінскага рэўкама. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1918—1920 гг. камандзір чырвонапартызанскага атрада па барацьбе з нямецкімі і польскімі акупантамі, унутранай контррэвалюцыяй. У 1922 г. старшыня Брагінскага валвыканкама. У 1924—1933 гг. працаваў у наркамаце земляробства БССР. Памёр у 1944 г. Пахаваны ў г. Львоў.

Кіслоў Апанас Сафронавіч, н. у 1897 г. у в. Крыўча. Удзельнік грамадзянскай вайны. У складзе партызанскага атрада В. Н. Бажэнкі, які затым стаў Тарашчанскім палком 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса, прымаў удзел у баях супраць нямецкіх акупантаў, пятлюраўскіх бандаў, у вызваленні Кіева, Жытоміра. Загінуў у 1919 г.

Кіслоў Іван Сафронавіч, н. у 1899 г. у в. Крыўча. У Чырвонай Арміі з 1918 г. Прымаў удзел у разгроме контррэвалюцыйных бандаў Махно, Шкуро. Загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Малажынскі сельсавет

Новік Ісак Данілавіч, н. у 1889 г. у в. Бераснёўка. Член РСДРП з 1917 г. Матрос балтыйскага крэйсера «Амур». У 1917 г. з'яўляўся членам суднавога камітэта. Удзельнічаў у штурме Зімняга палаца ў першы дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1918—1921 гг. браў актыўны ўдзел у барацьбе з бандытызмам на Брагіншчыне. У 1929—1930 гг.— старшыня сельсавета ў родных мясцінах. Памёр у 1962 г. Пахаваны ў в. Бераснёўка.

Малейкаўскі сельсавет

Жыхараў Іван Міхайлавіч, н. у 1886 г. у в. Макрэц. Член РСДРП. Працаваў на кіеўскім заводзе «Арсенал». У 1918 г. накіраваны Брагінскай партыйнай ячэйкай у Багунскі рэвалюцыйны полк 44-й Чырванасцяжнай Кіеўскай стралковай дывізіі М. А. Шчорса. Загінуў у тым жа годзе ў баі з пятлюраўскай бандай.

Крыўчык Пётр Аляксандравіч, н. у 1900 г. у в. Сялец. Член РКП(б) з 1919 г. У Чырвонай Арміі ў 1918—1920 гг. Камандзір артылерыйскай батарэі, удзельнічаў у разгроме войск Дзянікіна, Юдзеніча, Урангеля. У 1921 г. старшыня Сялецкага сельсавета. Адзін са стваральнікаў першай на Брагіншчыне сельскагаспадарчай камуны «Надзея» ў в. Гарадзішча. Браў удзел у Вялікай Айчыннай вайне.

Петракоў Фядос Фёдаравіч, н. у 1888 г. у в. Макрэц. Член РКП(б) з

1918 г. Салдатам Сямірэчанскага палка браў удзел у першай сусветнай вайне, у тым ліку ў славутым Брусілаўскім прарыве. У 1917 г. абраны членам палкавога камітэта салдацкіх дэпутатаў. У 1918—1919 гг. удзельнічаў у грамадзянскай вайне. З 1920 г.— старшыня Малейкаўскага сельсавета, з 1926 г.— старшыня Асвейскага райвыканкама (Віцебская вобл.). У 1938 г. стаў ахвярай палітычных рэпрэсій.

Прышчэпаў Дзмітрый Васільевіч, н. у 1897 г. у в. Макрэц. Член ВКП(б) з 1931 г. Прымаў удзел у 1-й імперыялістычнай і грамадзянскай войнах. У лютым 1917 г. абраны ў склад камітэта салдацкіх дэпутатаў 499-га Клінскага палка 124-й пяхотнай дывізіі. У 1918—1919 гг. у складзе 1-га пяхотнага палка 3-й Эстонскай дывізіі ўдзельнічаў у разгроме ўнутранай контррэвалюцыі, войск Дзянікіна. У 1920 г. радавым 508-га палка 57-й дывізіі ваяваў супраць польскіх інтэрвентаў. Браў удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1982 г. Пахаваны ў г. п. Брагін.

Мікуліцкі сельсавет

Крысенка Канстанцін Малахавіч, н. у 1881 г. у в. Мікулічы. Удзельнік рэвалюцыі 1905 — 1907 гг., Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. У 1917 г.— дэпутат дывізійнага салдацкага камітэта. У 1917—1920 гг. прымаў удзел у разгроме войск Юдзеніча, Карнілава, белаказакаў. Памёр у 1956 г. Пахаваны ў в. Мікулічы.

Крысенка Ціхан Іванавіч, н. у 1885 г. у в. Мікулічы. Член РКП(б) з 1919 г. Актыўны ўдзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг., Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. У Чырвонай Арміі ў 1918—1921 гг. Ваяваў супраць войск Дзянікіна, Урангеля, белаказакаў. Памёр у 1953 г. Пахаваны ў г. Арол.

Мігай Рыгор Восіпавіч, н. у 1894 г. у в. Вялікі Лес, жыў у Брагіне. Член РСДРП з 1917 г., з часу працы на Пуцілаўскім заводзе ў Пецярбургу. Удзельнік грамадзянскай вайны. Першы старшыня Мікуліцкага рэўкама. Узначальваў партызанскі атрад у перыяд нямецкай і польскай акупацыі Брагіншчыны ў 1918—1919 гг. У 1921—1923 гг. працаваў ва ўпраўленні Рэчыцкага павятовага выканаўчага камітэта. Пасля заканчэння Прамакадэміі ў Маскве да пачатку Айчыннай вайны знаходзіўся на рабоце ў Наркамаце цяжкай прамысловасці. Загінуў на фронце ў 1941 г.

Ярмольчык Мітрафан Пятровіч, н. у 1895 г. у в. Рудыя. Член РКП(б) з 1918 г. У 1917—1918 гг. член Мікуліцкага рэўкама. У Чырвонай Арміі з 1918 г., ваенны камісар 5-га палка Самарскай дывізіі, 3-га палка сувязі 72-й дывізіі. За гераізм і мужнасць на франтах грамадзянскай вайны ўзнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга. З 1925 г.— намеснік начальніка палітаддзела 25-й чапаеўскай дывізіі, затым — ваенны камісар 24-й і 20-й імя Фрунзе авіяэскадрылляў, камісар, начальнік палітаддзела 6-й авіябрыгады Беларускай ваеннай акругі. Рэпрэсіраваны ў 1938 г.

Новаялчанскі сельсавет

Фядосенка Пётр Уладзіміравіч, н. у 1890 г. у в. Капоранка. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. У 1917 г. прымаў удзел у штурме Зімняга палаца ў Пецярбургу, у 1918—1919 гг.— у разгроме калчакаўскіх і дзянікінскіх войск. У 1920 г. пачаў працаваць старшынёй Ялчанскага валаснога выканкама. У 1938 г. стаў ахвярай палітычных рэпрэсій.

Піркаўскі сельсавет

Мельнік Кандрат Піліпавіч, н. у 1892 г. у в. Чэрнеў Ялчанскай воласці. Член РСДРП з 1917 г. Балтыйскі матрос, удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях. У 1921 г. камандзір бранякатэра

Дняпроўскай ваеннай флатыліі, прымаў удзел у баях з нямецкімі і польскімі акупантамі, у барацьбе з контррэвалюцыяй. У 1938 г. стаў ахвярай палітычных рэпрэсій.

Прымачэнка Адам Іванавіч, н. у 1898 г. у в. Ляды Ялчанскай воласці. У Чырвонай Арміі ў 1919—1922 гг. Ваяваў у складзе Тарашчанскага палка 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса. У 1919 г. браў удзел у разгроме бандаў Пятлюры, вызваленні Кіева, Васількова, Фастава, Жытоміра, а таксама ў баях за Оўруч, Корасцень. У 1921—1924 гг.— старшыня Хракавіцкага сельсавета, загадчык аддзела народнай асветы Савіцкай воласці. Памёр у 1968 г. Пахаваны ў в. Ляды.

Савіцкі сельсавет

Герасіменка Пётр Восіпавіч, н. у в. Перасяцінец. Член РСДРП з 1917 г. Салдатам Кексгольмскага палка ўдзельнічаў у штурме Зімняга палаца 25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. Член палкавога камітэта салдацкіх дэпутатаў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі быў накіраваны на радзіму для ўдзелу ва ўстанаўленні ўлады Саветаў. У 1919—1921 гг. працаваў загадчыкам ваеннага аддзела Савіцкай воласці. Памёр у 1980 г. Пахаваны ў в. Старыя Ярылавічы Чарнігаўскай вобл.

Мельнікаў Васіль Мацвеевіч, н. у 1889 г. у в. Перасяцінец. Матрос балтыйскага лінейнага карабля «Слава». Удзельнічаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі. Памёр у 1961 г. Пахаваны ў в. Перасяцінец.

Спярыжскі сельсавет

Мартыненка Антон Сідаравіч, н. у 1888 г. у в. Дублін. Удзельнічаў у Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. У 1918—1919 гг. у радах партызанскага атрада П. В. Скарахода змагаўся з нямецкімі і польскімі акупантамі. Разам з вясковым актывістам Мікітам Бандарэнкам і Андрэем Гардзеенкам ствараў калгас у роднай вёсцы. Памёр у 1965 г. Пахаваны ў в. Дублін.

Р. М. Прыхолзька

Хракавіцкі сельсавет

Ефіменка Укол Яфрэмавіч, н. у 1897 г. у в. Хракавічы. У 1918—1921 гг. ваяваў у складзе 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса. З 1922 да 1924 г.— старшыня Хракавіцкага сельсавета. Браў удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалямі. Памёр у 60-я гг. Пахаваны на радзіме.

Прыходзька Рыгор Мінатавіч (Мікітавіч), н. у в. Хракавічы. У 1919—1921 гг. ваяваў у складзе Багунскага палка 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса, з'яўляўся ад'ютантам камандзіра палка.

Шупан Макар Пятровіч, н. у 1898 г. у в. Хракавічы. У 1918—1921 гг. ваяваў у складзе 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса. Актыўна ўдзельнічаў у калектывізацыі сельскай гаспадаркі на радзіме. Ваяваў на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Удзельнік абароны Ленінграда ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Чамярыскі сельсавет

Краўчанка Аляксандр Акімавіч, н. у 1897 г. у п. Садовы. Член ВКП(б) з 1932 г. У Чырвонай Арміі ў 1918—

1920 гг. У складзе 2-га Багунскага палка 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса ўдзельнічаў у баях з бандамі Пятлюры і Махно, у барацьбе з унутранай контрэвалюцыяй. На працягу многіх гадоў працаваў старшынёй калгаса на радзіме. Да 50-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі і за заслугі ў грамадзянскай вайне ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Памёр у сярэдзіне 80-х гг. Пахаваны ў п. Садовы.

Барацьба з бандытызмам

Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя стварылі для Савецкай Рэспублікі сур'ёзныя цяжкасці ў забеспячэнні Чырвонай Арміі і насельніцтва гарадоў прадуктамі, а харчовай прамысловасці — сельскагаспадарчай сыравінай. У гэтых умовах у студзені 1919 г., у адпаведнасці з дэкрэтам СНК, у якасці метаду нарыхтоўкі сельгаспрадуктаў у краіне ўводзілася харчразвёрстка. Сутнасць яе заключалася ў абавязковай здачы сялянамі лішкаў і нават часткі неабходных ім самім прадуктаў у фонд дзяржавы па цвёрдых цэнах. Паколькі такі парадак нарыхтоўкі сельгаспрадуктаў ніяк не заахвочваў іх вытворцу, дзяржава ў асобе органаў Наркамхарчу вымушана была ў прымусовым парадку забіраць збожжа ў заможных сялян (кулакоў) і сераднякоў. Непасрэдна ажыццяўлялі гэтую работу ўзброеныя харчатрады і сельскія камітэты беднаты пад кіраўніцтвам валасных харчовых камісій. У Брагіне яе ўзначальваў С. Л. Парэмскі.

Гвалтоўнае адабранне лішкаў збожжа, беспадстаўныя рэпрэсіі да тых, хто спрабаваў ігнараваць харчразвёрстку, злоўжыванні ажыццяўляўшых яе савецкіх і партыйных чыноўнікаў у сваіх карыслівых мэтах, бясконцыя наборы і рэквізіцыі на патрэбы арміі і масавыя мабілізацыі ў яе рады ставілі значную частку сельскага насельніцтва ў варожую апазіцыю да новай улады. Такую крызісную сітуацыю імкнуліся выкарыстаць у сваіх інтарэсах аб'яўленыя па-за законам ці ўшчэмленыя ў палітычных правах разнамасныя партыйныя праціўнікі бальшавікоў, дэкласіраваныя элементы і нават крымінальнікі. Яны падбухторвалі вяскоўцаў да адкрытага і тайнага процідзеяння харчатрадам, мясцовым уладам. Нават запрашалі ў актыўную сваю падтрымку розныя бандыцкія шайкі. Менавіта ў выніку такой злачыннай кулацка-бандыцкай змычкі былі захоплены і замучаны кіраўнік харчатрада, загадчык аддзела Савіцкай воласці Т. П. Старахатні і член харчатрада, міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі Уладзімір Чарнецкі.

Нярэдка бандыты не грэбавалі звычайным разбоем, узброеным рабаўніцтвам мірнага насельніцтва, якое суправаджалася жорсткімі забойствамі з мэтай запалохвання людзей. Так, у красавіку 1919 г. пятлюраўская банда пад кіраўніцтвам былога палкоўніка царскай арміі Струка захапіла Камарын, Лоеў і шэраг іншых населеных пунктаў Падняпроўя[1]. У ходзе яўрэйскага пагрому ў Камарыне бандыты абрабавалі насельніцтва, разрабавалі гандлёвыя кропкі, склады, забілі 49 і параніл 25 чалавек. У ліку загінуўшых былі аказаўшыя рашучае супраціўленне забойцам камуністы Барыс і Якаў Капусціны, сельскі актывіст Навум Фінкельберг і іншыя. Але і бандыты не пазбеглі пакарання — неўзабаве яны былі разгромлены ў Чарнобыльскім павеце. Тады ж быў захоплены ў палон і расстраляны паплечнік Струка, былы царскі ўрадзік з нашых мясцін Платон Грыб[2].

Падчас гэтай баявой аперацыі адважна дзейнічалі начальнік Камарынскай міліцыі І. М. Скараход, міліцыянер Савіцкай воласці Я. В. Палуян, старшы міліцыянер з Камарына Я. С. Міркін, камуністы І. П. Бельчанка (в. Бярозкі), З. С. Левін (м. Бра-

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 22. Л. 6; Расійскі цэнтр захавання і вывучэння дакументаў навейшай гісторыі. Ф. 17. Воп. 5. Спр. 151. Л. 43.

[2] Гомельскі краязнаўчы музей. Ф. 5. Л. 66.

гін), А. І. Маручок, Несцер Ціханчук (в. Крыўча) і іншыя.

Нават пасля падпісання ў кастрычніку 1920 г. дагавора аб перамір'і з Польшчай мір і спакой яшчэ не прыйшлі на шматпакутную зямлю паўднёвай і заходняй частак Беларусі. Імперыялістычныя сілы і іх памагатыя ў асобе белагвардзейскага афіцэрства пачалі засылаць на тэрыторыю Савецкай Рэспублікі ўзброеныя атрады і групы, арганізоўваць дыверсіі і шпіянаж. 6 лістапада 1920 г. з раёна Турава перайшло ў наступленне створанае на тэрыторыі Польшчы белагвардзейскае вайсковае фарміраванне — так званая «руская народна-добраахвотніцкая армія» (15 тыс. чал.) на чале з эсэрам С. Н. Булак-Балаховічам. На зыходзе восені яна захапіла Мазыршчыну і большую частку Рэчыцкага павета, у т. л. Брагіншчыну і Камарыншчыну. Бандыты разагналі органы Савецкай улады, пачалі расстрэлы партыйна-савецкіх актывістаў, радавых грамадзян, знішчалі сельскагаспадарчыя камуны, рабавалі дзяржаўную і прыватную маёмасць. У сувязі з гэтым на ўсёй тэрыторыі Гомельшчыны было абвешчана ваеннае становішча. У Чырвоную Армію прызываліся камуністы, камсамольцы і члены прафсаюзаў. Сфарміраваныя з іх ліку спецыяльныя камуністычныя батальёны, партызанскія атрады акупіраваных палякамі раёнаў сумесна з 16-й арміяй Заходняга фронту ў канцы лістапада 1920 г. разгромілі асноўныя сілы бандытаў у раёне Мазыра, Калінкавічаў і Рэчыцы. Сам генерал Булак-Балаховіч з рэшткамі свайго «воінства» ўцёк у Польшчу і больш не з'яўляўся[1].

Аднак істотныя цяжкасці выклікала ў той час такая ганебная з'ява, як крымінальны бандытызм з яўна палітычнай афарбоўкай. Бандыцкія выступленні мелі на мэце не толькі адкрытыя разбой і грабяжы, але, перш за ўсё, агульную дэстабілізацыю абстаноўкі. Варожыя элементы не без поспеху спекулявалі на гаспадарчых цяжкасцях, выкліканых наступствамі грамадзянскай вайны, на незадаволенасці значнай часткі сялянства палітыкай «ваеннага камунізму», распальваючы варожасць да органаў Савецкай улады і яе рашэнняў, да мясцовых актывістаў і нагнятаючы на людзей страх сваімі бандыцкімі вылазкамі. У лютым 1921 г. у шэрагу валасцей Гомельшчыны, у т. л. на Брагіншчыне, гнюсными крывавымі справамі заявіла аб сабе адна з бандаў разгромленай раней балаховіцкай «арміі» пад кіраўніцтвам ураджэнца нашых мясцін, маёра забойцы Івана Галака. Так, яна напала на сельскагаспадарчую камуну «Праца» ў фальварку Унігаўка Мікуліцкай воласці. Бандыты дашчэнту разрабавалі і спалілі ўсю маёмасць, расстралялі 49 камунараў разам з іх кіраўніком, членам РКП(б) з 1919 г. Савулам Дабрынскім. Пахаванне ахвяр бандыцкага нападу адбылося ў Брагіне.

У маі таго ж года галакаўцы захапілі на Дняпры, каля вёскі Радуль, параход «Ценешаў», які ішоў рэйсам з Кіева на Гомель, абрабавалі і замучылі 84 яго пасажыраў. У ліку загінуўшых былі 27 ураджэнцаў камарынска-брагінскага Прыдняпроўя. У няроўнай схватцы з бандытамі тады загінулі супрацоўнікі Камарынскай міліцыі Аркадзь (Гдаля) Бейлін і Ялчанскай валасной міліцыі — камуніст Мордух Гонікман[1]. Апрача таго, гэтая ж банда затрымала цягнік на станцыі Аўрамаўскае, непадалёку ад Хойнікаў, абрабавала і па-зверску забіла 55 пасажыраў. У схватцы з кулаком загінуў міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі У. Чарнецкі.

Для барацьбы з рэшткамі раней разбітых і новымі бандамі быў умацаваны асабовы састаў валасных аддзелаў міліцыі. На гэты адказны ўчастак яшчэ раней накіравалі надзейных, палітычна загартаваных людзей з ліку савецкіх актывістаў і ўдзельнікаў грамадзянскай вайны. Сярод іх былі намеснікі началь-

[1] Звязда, 1920. 2 снеж.

[1] Известия Гомельского губкома РКП(б). 1921. № 10.

нікаў аддзелаў міліцыі Яўсей Міркін у Камарыне, былы матрос балтыйскага крэйсера «Храбры», удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі Яфім Палуян у Брагіне, а таксама супрацоўнікі Брагінскай валасной міліцыі браты Аляксандр і Пётр Сцельмашэнкі, Канедзі Аўраменка і іншыя. У лютым 1921 г. абодва Сцельмашэнкі і Аўраменка загінулі ў няроўным баі з бандытамі[1].

У барацьбе з бандытызмам, у прыватнасці, у канчатковай ліквідацыі галаварэзаў-галакаўцаў, удзельнічаў наш зямляк, слухач школы сярэдняга каманднага саставу ў г. Рэчыцы Сямён Апанасенка. Пасля разгрому бандытаў Галак, яго паплечнік Бакаша са сваімі бліжэйшымі хаўруснікамі ўцяклі на Украіну. З ліпеня 1921 г. яны былі знішчаны двума чэкістамі, засланымі ў іх бандыцкую бярлогу пад выглядам добраахвотніцкага папаўнення банды[2]. За актыўны ўдзел у разгроме банды Галака і Бакашы С. І. Апанасенка быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

За вялікую работу па мабілізацыі сіл на барацьбу з бандай Галака быў адзначаны старшыня Ручаёўскага валвыканкама (у далейшым працаваў на розных пасадах у Брагіне) Т. М. Пікас, аб чым сведчыць наступны дакумент:

Приказом войскам Западного фронта РСФСР председатель Ручаевского волостного исполнительного комитета т. Пикос Трофим Михеевич за проявленные им выдающиеся работоспособность и широкую инициативу в борьбе с бандитизмом награждается металлическими часами.

Командующий войсками фронта *Егоров*

Член революционного совета фронта *Новиков*[3].

Усё ж дробныя групы бандытаў і пасля гэтага працягвалі нападаць на вёскі, дэзарганізуючы работу мясцовых органаў улады, рабуючы магазіны, склады, не грэбуючы і няхітрым скарбам простых грамадзян. Адну з такіх груп узначальваў адпеты крымінальнік «атаман» Сапляк. Вядомы факт, калі асабіста ён абрабаваў магазін у вёсцы Малажын. Падчас аблавы на балоце, наладжанай чырвонаармейцамі, міліцыянерамі і чонаўцамі, Сапляк быў забіты ў перастрэлцы.

Мала чым адрозніваласа ад саплякоўскай і банда, якую ўзначальваў ураджэнец вёскі Спярыжжа Кузьма Ятчанка. За грабяжы гэты «атаман» быў асуджаны да дзесяці гадоў пазбаўлення волі і высланы на Салаўкі, але неўзабаве адтуль уцёк і зноў з'явіўся на Брагіншчыне. Адразу ж у Брагіне быў забіты вартаўнік і абрабаваны магазін. Аператыўнай групе крымінальнага вышуку ўдалося выйсці на след Ятчанкі і арыштаваць яго ў Манастырку (г. Гомель), дзе ён хаваўся ў адной жанчыны. Выязная сесія Гомельскага губернскага суда прыгаварыла мацёрага бандыта да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу, а чатырох яго саўдзельнікаў — да розных тэрмінаў пазбаўлення волі.

Навядзенню рэвалюцыйнага парадку на тэрыторыі валасцей, паспяховай барацьбе з бандытызмам садзейнічала тое, што адначасова з мерамі па ўмацаванні органаў правапарадку ў кожнай воласці і буйнейшых населеных пунктах (в. Калыбань, Крукі, Асарэвічы, Глухавічы і інш.) з ліку камуністаў і камсамольцаў былі сфарміраваны лятучыя атрады так званых часцей асобага прызначэння (ЧОН). Яны неслі службу па ахове населеных пунктаў ад налётаў кулацкіх бандаў. Такія часці ўзначальвалі: у Брагіне — сакратар валаснога партарганізацыі Павел Фядосавіч Кушняроў, старшыня валвыканкама Аляксандр Мікалаевіч Купрыянаў, у Ёлчы і Камарыне — адпаведна Карней Андрэевіч Мартышук і старшыня валвыканкама Уладзімір Зубрыцкі.

Рашучая і бескампрамісная барацьба з бандытызмам, на вялікі жаль, і ў далейшым не абыходзілася без ахвяр.

[1] Известия Гомельского губкома РКП(б), 1921. № 9.

[2] Філіял Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці ў г. Мазыры. Ф. 8. Воп. 1. Спр. 1. Л. 65.

[3] Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Загад 606 ад 18.1.1922 г. Заходняга фронту РСФСР.

Так, у ліпені 1921 г. у вёсцы Ляды Ялчанскай воласці бандыты павесілі намесніка начальніка Камарынскага аддзела міліцыі Яўсея Самуйлавіча Міркіна. У снежні таго ж года бандытамі былі схоплены і па-зверску замучаны ў пучынскім лесе камсамольцы з мястэчка Камарын Восіп Глозман і Восіп Лабоўскі. Тады ж у баі з бандай загінуў начальнік Мікуліцкай валасной міліцыі Фёдар Ісакавіч Лабоўскі.

Рашаючае значэнне ў мабілізацыі працоўных на барацьбу з бандытызмам мелі рашэнні X з'езда РКП(б), які адбыўся ў сакавіку 1921 г., аб замене харчразвёрсткі харчпадаткам як першы крок новай эканамічнай палітыкі. Дзякуючы шырока праведзенай растлумачальнай рабоце сярод сялян была канчаткова выбіта глеба з-пад ног сіл, якія імкнуліся ўсялякімі спосабамі шкодзіць Савецкай уладзе. Газета «Полесская правда» ў той час пісала: «...савинковцы, работая на польские деньги, со скрежетом зубовным видят, что новая экономическая политика снова укрепляет союз крестьян и рабочих»[1].

У 1919—1922 гг. у барацьбе з бандытызмам прымалі актыўны ўдзел нашы землякі з мясцовых партызанскіх атрадаў і атрадаў ЧОН А. М. Бандарэнка (в. Бярозкі), Д. А. Васільеў (в. Мікулічы), Ц. А. Ганчар (в. Вялікі Лес), Е. С. Крот (м. Брагін), Д. К. Музычэнка (в. Бярозкі), Д. В. Посмык (г. Рэчыца), Ф. Я. Смусянок (в. Вязок), А. Н. Царанок (в. Асарэвічы), А. М. Шэндзяровіч (м. Брагін), Л. М. Ярмоленка (в. Кавака) і іншыя.

Пасля ліквідацыі бандытызму працоўныя Гомельшчыны і Мазыршчыны, у т. л. нашых мясцін, атрымалі магчымасць накіраваць усе сілы на ліквідацыю разрухі, на мірнае культурна-гаспадарчае будаўніцтва.

І. Ф. Ганжураў

[1] Полесская правда, 1921. 6 жн.

Ваявалі і ў мірныя дні

З успамінаў Д. І. Агафоненкі, удзельніка барацьбы з бандытызмам, жыхара в. Петрыцкае

З 1918 да 1921 года я працаваў у Рэчыцкай гарадской міліцыі. То быў вельмі цяжкі перыяд. Паўсюдна панавалі нястача, голад і холад. Таму ў навакольных раёнах з'явіліся банды рабаўнікоў і крымінальных злачынцаў, якія «патрашылі» магазіны, абіралі больш заможных, а часта і бедных сялян.

Помніцца, як 23 лістапада 1921 года па загаду начальніка Рэчыцкай гарадской міліцыі Максіма Дубінскага я прыехаў на работу ў Лоеўскі раён, на тэрыторыі якога дзейнічалі невялікія бандыцкія групы. Спачатку быў агентам міліцыі пры ўчастку, які займаўся лесанарыхтоўкамі. Тут пазнаёміўся з супрацоўнікам міліцыі Уласам Мялешкам, таксама агентам міліцыі. Удвух мы актыўна праводзілі растлумачальную работу сярод рабочых лесаўчастка, бо вельмі важна было прыцягнуць іх на свой бок.

Не ведаю, па чыім даносе аб маёй дзейнасці на лесаўчастку і ў навакольных вёсках даведаўся адзін з кіраўнікоў тутэйшай банды, былы афіцэр царскай арміі Зубец. Дарэчы, мясцовы, нарадзіўся ў вёсцы Казіміраўка, на Лоеўшчыне. І вось раніцай 15 верасня 1922 года ў мой дом уварваліся 26 бандытаў. У гэты час я быў на рабоце, дома заставалася адна жонка. Разбойнікі сталі здзекавацца з яе, выпытваючы, дзе я знаходжуся. Жонка нічога ім не сказала. Збіўшы яе да паўсмерці, бандыты разбурылі ў хаце печ, забралі ўсё лепшае з маёмасці. Вярнуўшыся дадому, я ўбачыў усё гэта і даў сабе слова з яшчэ большай рашучасцю змагацца з бандытамі.

На наступны дзень я пайшоў да камандзіра атрада часцей асобага прызначэння па барацьбе з бандытызмам Трафіма Міхеевіча Пікаса. Чонаўцы дыслацыраваліся ў лесе, непадалёку ад вёскі Карчомка. Камандзір добра ведаў мяне і прыняў гасцінна. А 20 верасня

яго байцы пайшлі на ліквідацыю шайкі Зубца, якая ў той дзень гуляла ў вёсцы Крывін. Бандыты п'янствавалі ў хаце Настассі Ляжак, два сыны якой удзельнічалі ў бандзе.

Падышлі да гульбішча непрыкметна, і мала каму з бандытаў удалося ўратавацца. Праўда, шкада было, што на гулянцы не аказалася кіраўніка банды Зубца, які на той час знаходзіўся ў сваёй сувязной і палюбоўніцы Марыі Коўзік. Амаль поўны разгром банды так напалохаў Зубца, што ён пакінуў сваіх хаўруснікаў, што засталіся ў жывых, і ўцёк. Бачачы, што справа прайграна, астатнія бандыты самі здаліся ўладам.

Не вытрымала націску нашага атрада і другая банда на чале з Іванам Філончыкам. Ратуючыся ад строгай кары, ён сам сагітаваў сваіх саўдзельнікаў і разам з імі ў поўным складзе здаўся ўладам.

Можна было б прывесці і іншыя выпадкі, калі мы ваявалі і ў мірныя дні, з коранем нішчылі бандытызм. Вялікую дапамогу аказвалі нам вяскоўцы. Запомніўся малады і энергічны хлопец Сяргей Палавінка з вёскі Баршчоўка. Ён падтрымліваў з намі пастаянную сувязь. Неўзабаве яго вылучылі на пасаду старшыні сельсавета, і ён яшчэ з большай настойлівасцю дапамагаў ліквідоўваць бандытызм, пакуль ён не быў поўнасцю знішчаны дзесьці ў канцы 1922 года.

На жаль, і мы панеслі незваротныя страты. У баях і налётах гінулі і нашы таварышы. У ліку іншых запомніліся прозвішчы брагінскіх міліцыянераў Канедзі Аўраменкі, Уладзіміра Болатава, Аляксандра Пахолкі, Аляксандра Сцельмашэнкі.

Удзельнікі партызанскага руху, барацьбы з контррэвалюцыяй і бандытызмам у 1918—1922 гг.

Астраглядаўскі сельсавет

Кліменка Сямён Іларыёнавіч, н. у 1891 г. у в. Багушы. Член РКП(б) з 1918 г. Пасля выгнання нямецкіх акупантаў з Брагіншчыны ў 1918 г. абраны першым старшынёй Мікуліцкага валвыканкама. Змагаўся супраць кулацка-бандыцкіх і дробнабуржуазных элементаў. Пры яго ўдзеле раскрыта змова на чале з белагвардзейскім афіцэрам і мясцовым памешчыкам Ваиьковічам у маёнтку в. Рудакоў. У другой палове 1920 г.— ваенны камісар Рэчыцкага павета. Браў удзел у Вялікай Айчыннай вайне. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені і медалямі. Памёр у 1955 г. Пахаваны ў г. Санкт-Пецярбург.

Лабоўскі Яфім Ісакавіч, н. у 1898 г. у в. Багушы. Член РКП(б) з 1919 г. У 1917—1918 гг.— член Брагінскага валаснога рэўкама. Загінуў у баі з бандай Булак-Балаховіча ў 1919 г.

Брагінскі пасялковы Савет

Аўраменка Канедзі Іванавіч, н. у 1896 г. у м. Брагін. У 1918—1921 гг. старшы міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі. Прымаў удзел у разгроме банды І. Галака. Загінуў у лютым 1921 г. у схватцы з бандытамі каля в. Удалёўка на Лоеўшчыне[1]. Пахаваны ў г. п. Брагін.

Крот Ёсіп Сцяпанавіч, н. у м. Брагін. У 1918—1922 гг. працаваў у Брагінскай валасной міліцыі. Прымаў актыўны ўдзел у разгроме контррэвалюцыйных банд, нямецкіх і польскіх акупантаў на Брагіншчыне. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Загінуў на фронце ў 1941 г.

[1] Известия Гомельского губкома РКП(б). 1921. № 9.

Левін Зэлік Сіманавіч, н. у 1891 г. у м. Брагін. У 1918—1922 гг. прымаў удзел у разгроме ўнутранай контррэвалюцыі, нямецкіх і польскіх акупантаў. Памёр у 1975 г. Пахаваны ў г. Мінск.

Мажэйка Адам Андрэевіч, н. у 1888 г. у в. Амелькаўшчына Хойніцкага р-на. Член РКП(б) з 1918 г. Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Рэчыцкім павеце ў 1918—1920 гг. Прымаў актыўны ўдзел у стварэнні партызанскіх атрадаў на Брагіншчыне падчас нямецкай і польскай акупацыі. Памёр у 1975 г. Пахаваны ў г. Масква.

Несцярок Аляксандр Львовіч, н. у 1896 г. у м. Брагін. З 1919 да 1923 г.— намеснік начальніка Брагінскай валасной міліцыі. Браў удзел у партызанскім руху на Брагіншчыне ў 1918—1919 гг., у барацьбе з бандытызмам у 1921—1922 гг. Памёр у 1969 г. Пахаваны ў г. Ступіна Маскоўскай вобл.

Несцярок Мікалай Львовіч, н. у 1890 г. у м. Брагін. Член РСДРП з 1917 г. Першы сакратар Брагінскай валасной партыйнай ячэйкі. Актыўны арганізатар і ўдзельнік барацьбы з контррэвалюцыяй, нямецкімі і польскімі акупантамі на Брагіншчыне. У 1922 г. слухач (курсант) Гомельскай губернскай партыйнай школы. З 1938 г. у апараце ЦК КП(б)Б. У тым жа годзе стаў ахвярай палітычных рэпрэсій.

Парэмскі Сямён Лук'янавіч, н. у 1896 г. у м. Брагін. У 1918 г. коннік партызанскага атрада П. В. Скарахода. Браў актыўны ўдзел у барацьбе з контррэвалюцыяй, нямецкімі і польскімі акупантамі ў родных мясцінах. З 1919 г. старшыня харчовай камісіі Брагінскага валвыкаикама. Памёр у 1962 г. Пахаваны ў г. п. Брагін.

Посмык Дзмітрый Васільевіч, н. у 1892 г. у г. Рэчыца. У 1918—1920 гг. у складзе атрада П. В. Скарахода прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху на Брагіншчыне супраць кайзераўцаў і польскіх легіянераў, у барацьбе з бандытызмам.

Стральбіцкі Сямён Міхайлавіч, н. у 1898 г. у м. Брагін. У 1918—1921 гг. у складзе партызанскага атрада П. В. Скарахода прымаў удзел у барацьбе з контррэвалюцыяй, нямецкімі і польскімі акупантамі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Загінуў на фронце ў 1942 г.

Сцельмашэнка Пётр Мікалаевіч, н. у м. Камарын, міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі. Загінуў у лютым 1921 г. каля в. Удалёўка на Лоеўшчыне ў баі з бандай І. Галака.

Ярмоленка Лявон Міхайлавіч, н. у 1899 г. у в. Кавака. Актыўны ўдзельнік партызанскага руху на Брагіншчыне ў 1918 г. Браў удзел у барацьбе супраць контррэвалюцыйных элементаў і бандыцкіх груп у 1920 — 1921 гг.

Камарынскі пасялковы Савет

Сцельмашэнка Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1895 г. у м. Камарын. У 1918—1921 гг. міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі. Прымаў удзел у разгроме банды І. Галака. Загінуў у лютым 1921 г. у баі з бандытамі каля в. Удалёўка на Лоеўшчыне. Пахаваны ў г. п. Брагін.

Крыўчанскі сельсавет

Маручок Адам Іванавіч, н. у 1898 г. у в. Крыўча. Член ВКП(б) з 1930 г. Актыўны ўдзельнік партызанскага руху на Брагіншчыне ў 1918 — 1919 гг. З 1923 г. старшыня Крыўчанскага сельсавета. У 1930—1939 гг. старшыня калгаса ў в. Крыўча. У 1942 г. замучаны гітлераўцамі ў г. п. Брагін.

Мікуліцкі сельсавет

Ганчар Ціхан Аляксандравіч, н. у 1890 г. у в. Вялікі Лес. Прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху супраць нямецкіх і польскіх акупантаў, а таксама ў ліквідацыі бандытызму на Брагіншчыне ў 1918 — 1921 гг. Загінуў у 1942 г.

Дабрынскі Яўсей Савулавіч, н. у 1898 г. у в. Мікулічы. Член РКП(б) з

1919 г. У 1917—1918 гг. член Мікуліцкага рэўкама. У 1919 — 1922 гг. прымаў удзел у партызанскім руху, барацьбе з бандытызмам. У 1925—1941 гг. на савецкай і партыйнай рабоце ў розных раёнах рэспублікі. Удзельнічаў у партызанскім руху ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны.

Пікуль Ціхан Сямёнавіч, н. у 1896 г. у в. Вялікі Лес. У 1918—1920 гг. у складзе партызанскага атрада П. В. Скарахода прымаў удзел у барацьбе з контррэвалюцыяй, нямецкімі і польскімі акупантамі. Памёр у 1960 г. Пахаваны ў в. Вялікі Лес.

Новаялчанскі сельсавет

Бандарэнка Арцём Міхайлавіч, н. у 1898 г. у в. Бярозкі. У 1918—1920 гг. у складзе коннага партызанскага атрада П. В. Скарахода браў удзел у барацьбе з контррэвалюцыйнымі элементамі, нямецкімі і польскімі акупантамі. Памёр у 1960 г. Пахаваны ў в. Бярозкі.

Музычэнка Даніла Кандратавіч, н. у 1891 г. у в. Бярозкі. Член РКП(б) з 1920 г. У тым жа годзе стаў старшынёй Ялчанскага валаснога выканкама. Прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху ў перыяд нямецкай і польскай акупацыі, у барацьбе з бандытызмам у 1918—1921 гг. У 1938 г. стаў ахвярай палітычных рэпрэсій.

Жыхары Брагінскага і Камарынскага раёнаў, якія загінулі ў гады нямецкай і польскай акупацыі, грамадзянскай вайны і бандыцкага тэрору (1918—1934)

АСАРЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АСАРЭВІЧЫ

КАНЦАВЫ Гаўрыла Акімавіч, н. у 1902, загінуў у грамадзянскую вайну.

АСТРАГЛЯДАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АСТРАГЛЯДЫ

КАНАНОК Сяргей, член (дэпутат) Астраглядаўскага сельсавета. Расстраляны польскімі акупантамі ў 1920.

ВЁСКА БАГУШЫ

ДАВЫДЗЕНКА Каленік Аляксандравіч, загінуў на фронце ў грамадзянскую вайну.

КАРАСЬ Андрэй Ерафеевіч, загінуў на фронце ў грамадзянскую вайну.

ВЁСКА ВЯЗОК

СМУСЯНОК Іван, загінуў у баі з польскімі легіянерамі каля в. Тульгавічы Хойніцкага р-на ў 1920.

БРАГІНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГАРПАСЁЛАК БРАГІН

БАРЦЭВІЧ Станіслаў Казіміравіч, ст. міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі. Забіты бандытамі ў 1923.

БОЛАТАЎ Уладзімір Пятровіч, член РКП(б), былы латышскі стралок, міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі. Забіты бандытамі ў 1923.

ЗАЙЦАЎ Прохар, міліцыянер Брагінскага райаддзела міліцыі. Забіты бандытамі ў 1934 у в. Крыўча.

НЁСЦЯРОК Леў, павешаны немцамі ў 1918.

ПАХОЛКА Аляксандр, н. у п. Новы Пуць (Рагачоўка), міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі. Забіты бандытамі ў 1921.

ЧАРНЕЦКІ Уладзімір, міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі. Загінуў у 1921 у сутычцы з кулакамі пры адабранні ў іх лішкаў збожжа.

ШКВОР Йозеф, чэх, член РКП(б), начальнік Брагінскай валасной міліцыі. Трагічна загінуў у 1928.

ВЕРХНЕЖАРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЕРХНІЯ ЖАРЫ

ЮШЧАНКА Іван, расстраляны нямецкімі акупантамі ў 1918.

ВУГЛОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВУГЛЫ

ФЕДАРЭНКА Іван Мінавіч, член РКП(б), старшыня Брагінскага валвыканкама. Расстраляны палякамі ў 1920.

А. І. Раманавец

ВЁСКА РУДНЯ ЖУРАЎЛЁВА

ГУЦЬЯНТАЎ Залман Маркавіч, н. у 1882, член РКП(б) з 1918, старшыня камітэта беднаты ў в. Лубенікі. Загінуў у маі 1920 у баі э польскімі легіянерамі пад Рэчыцай. Пахаваны на могілках каля в. Воўчая Гара.

ПАСЁЛАК НОВЫ ПУЦЬ (РАГАЧОЎКА)

РАМАНАВЕЦ Адам Ісакавіч, н. у 1900 у в. Шкураты, член (дэпутат) сельсавета. Забіты кулакамі 4.12.1929.

ГДЗЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГДЗЕНЬ

ШУЛЬГА Карней Міхайлавіч, член РКП(б), член (дэпутат) сельсавета. Расстраляны нямецкімі акупантамі ў 1918.

КАМАРЫНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГАРПАСЁЛАК КАМАРЫН

АНАПРЭЕЎ Віктар, міліцыянер Камарынскага аддзела міліцыі. Загінуў у 1930 у в. Піркі ў схватцы з бандытамі.

БЕЙЛІН Аркадзь (Гдаля), член РКП(б) з 1917, міліцыянер Ялчанскай валасной міліцыі. Загінуў у маі 1921 у схватцы з бандай І. Галака, якая захапіла на Дняпры пасажырскі параход «Ценешаў» .

ГЛОЗМАН Ісак (Восіп), н. у в. Навозы Чарнігаўскага р-на, член РКСМ, міліцыянер Камарынскага аддзела міліцыі, баец часці асобага прызначэння. Забіты бандытамі ў снежні 1921.

ГОНІКМАН Мордух, член РКП(б), міліцыянер Ялчанскай валасной міліцыі. Загінуў у маі 1921 на параходзе «Ценешаў» у схватцы з бандытамі.

КАПУСЦІН Барыс, член РКП(б), міліцыянер Камарынскай міліцыі. Загінуў падчас яўрэйскага пагрому, учыненага ў Камарыне ў красавіку 1919 пятлюраўскай бандай на чале з Струкам.

КАПУСЦІН Якаў, член РКП(б), загінуў падчас яўрэйскага пагрому ў Камарыне ў красавіку 1919.

ЛАБОЎСКІ Восіп, член РКСМ, міліцыянер Камарынскай міліцыі, баец атрада ЧОН. Забіты бандытамі ў снежні 1921.

ЛАБОЎСКІ Хаім Ісакавіч, член РКП(б), старшы міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі. Загінуў у баі з польскімі легіянерамі ў маі 1920 пад Рэчыцай.

МІРКІН Яўсей Самуйлавіч, намеснік начальніка Камарынскай міліцыі. Замучаны бандытамі ў ліпені 1921 у в. Ляды Ялчанскай воласці.

ФІНКЕЛЬБЕРГ Навум, сельскі актывіст. Забіты падчас яўрэйскага пагрому ў Камарыне ў красавіку 1919.

ВЁСКА КІРАВА (ЛУКАЕДЫ)

ЛЯВОНЕНКА Сямён Рыгоравіч, міліцыянер Камарынскай міліцыі. Загінуў у схватцы з бандытамі ў студзені 1918.

КРЫЎЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КРЫЎЧА

КІСЛОЎ Апанас Сафронавіч, н. у 1897, баец партызанскага атрада, у далейшым — Тарашчанскага палка 44-й Кіеўскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі М. А. Шчорса. Загінуў у 1919.

МАЛАЖЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА МАЛАЖЫН

ДАВЫДОЎСКІ Піліп Сідаравіч, сакратар камсамольскай ячэйкі в. Малажын. Забіты бандытамі ў 1923.

МАЛЕЙКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА МАКРЭЦ

ГАЛАВАЧОЎ Адам Міхайлавіч, н. у 1898, загінуў на Паўднёвым фронце ў 1919.

ЖЫХАРАЎ Іван Міхайлавіч, н. у 1886, член РКП(б). Загінуў у баі з пятлюраўцамі ў 1918.

МЕНДЗЕЛЕЎ Цярэнцій Саласцянавіч, загінуў у баі з палякамі ў 1921 пад Брэстам.

ВЁСКА МАЛЕЙКІ

ТАТАРЫНАЎ Іван Васільевіч, член РКСМ, сельскі актывіст. Забіты кулакамі ў 1928.

А. М. Галавачоў

Р. І. Грамыка

ВЁСКА ТЭЛЬМАН

ГРАМЫКА Рыгор Іванавіч, н. у 1901, загінуў на Паўднёвым фронце ў 1919.

МІКУЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА МІКУЛІЧЫ

ДАБРЫНСКІ Савул, н. у 1879, кіраўнік сельгаскамуны «Праца» ў фальварку Унігаўка Мікуліцкай воласці. Разам з 49 камунарамі расстраляны бандай І. Галака ў лютым 1921.

ЗДАРАВЕЦ Кузьма, загінуў у баі з польскімі легіянерамі ў 1920 каля в. Тульгавічы Хойніцкага р-на.

КІРЫЧЭНКА Дзмітрый, член Мікуліцкага рэўкама. Забіты бандытамі ў 1918.

КРЫСЕНКА Антон Іванавіч, н. у 1898, член РКП(б). Загінуў у баі з польскімі легіянерамі ў 1920 каля в. Тульгавічы Хойніцкага р-на.

НОВАЯЛЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА НОВАЯ ЁЛЧА

ВАШЧАНКА Рыгор Захаравіч, н. у 1890, загінуў у 1919 пры абароне г. Барысаў ад польскіх войск.

ТОРБІК Міхаіл Міронавіч, міліцыянер Ялчанскай воласці. Забіты бандытамі ў 1918.

ШУМІЛІН Сямён Парфенавіч, н. у Мікалаеўскім р-не Пензенскай вобл., член РКП(б), начальнік Ялчанскай, затым Брагінскай валасной міліцыі. Загінуў у схватцы з бандытамі ў 1926.

ВЁСКА СТАРЫ КАЦІЧАЎ

ТАМІЛКА Аляксей, член РКП(б), старшыня сельскага камітэта беднаты. Расстраляны нямецкімі акупантамі ў 1918.

САВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ПРОСМЫЧЫ

МАЛОЧКА Сямён Тарасавіч, член РКП(б), старшыня Астраглядаўскага сельсавета. Забіты кулакамі ў 1934.

ВЁСКА САВІЧЫ

ДУСЯНОК Вікенцій, член РКП(б), член (дэпутат) сельсавета. Расстраляны нямецкімі акупантамі ў 1918.

СПЯРЫЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДУБЛІН

КУР'ЯН Якаў, член РКП(б), загінуў вясной 1920 у баі з польскімі акупантамі.

На падставе архіўных матэрыялаў, публікацый у друку і сведчанняў насельніцтва спіс падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Брагіншчына ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле рэгіёна ў савецкі перыяд

На пачатку 1918 г. у Беларусі ліквідаваны органы буржуазнага самакіравання — гарадскія думы і ўправы, земскія ўстановы. Іх функцыі ўзялі на сябе Саветы. У гэты час Брагінская, Дзяржыцкая, Мікуліцкая, Ручаёўская, Савіцкая і Ялчанская воласці ўваходзілі ў Рэчыцкі павет Мінскай губерні.

3 мая 1919 г., калі была ўтворана Гомельская губерня БССР, Брагіншчына стала яе часткай у складзе Рэчыцкага павета. У 1924 г. у выніку новай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы ў Беларусі былі ліквідаваны губерні, паветы, воласці і ўведзены акруговы і раённы падзел. Далучаныя да БССР у выніку 2-га ўзбуйнення рэспублікі Гомельскі і Рэчыцкі паветы са снежня 1926 г. сталі акругамі. Тады ж на месцы ранейшых валасцей былі ўтвораны раёны, у тым ліку Брагінскі і Камарынскі Рэчыцкай акругі (скасавана ў 1927 г.).

Абласны падзел у Беларусі ўведзены напрыканцы 30-х гг. З таго часу Брагінскі і Камарынскі раёны знаходзіліся ў складзе ўтворанай у студзені 1938 г.

Палескай вобласці з цэнтрам у Мазыры. Брагіншчына і Камарыншчына знаходзіліся ў ёй да яе скасавання ў 1954 г. і далучэння тэрыторыі Палескай вобласці да Гомельскай вобласці.

У 1962 г. тэрыторыя ліквідаванага Камарынскага раёна была далучана да Брагінскага раёна, Баршчоўскі і Радзінскі сельсаветы адышлі да Хойніцкага, а Ручаёўскі сельсавет да Лоеўскага раёнаў.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

20-я гады: па шляху аднаўлення

На мірныя рэйкі

У канцы жніўня 1920 г. войскі Заходняга фронту (камандуючы М. М. Тухачэўскі, член рэўваенсавета І. С. Уншліхт) вызвалілі ўсю тэрыторыю Беларусі, падышлі да Варшавы і Львова, але неўзабаве ім прыйшлося адысці на ўсход. У кастрычніку 1920 г. быў падпісаны дагавор аб перамір'і, а ў сакавіку 1921 г.— Рыжскі мірны дагавор, у адпаведнасці з якім заходнія раёны Беларусі засталіся пад уладай Польшчы. Савецкая Рэспубліка прыступіла да ліквідацыі белагвардзейскіх войск на Паўднёвым фронце. І на гэты раз не засталіся ўбаку брагінцы і камарынцы. «Известия Гомельского губкома РКП(б)» пісалі тады, што «...добровольцы ежедневно прибывали из уездов с просьбой послать их на борьбу с Врангелем». У ліку гэтых патрыётаў былі таксама камуністы і камсамольцы Брагіншчыны і Камарыншчыны А. Белянок (в. В. Слабада), М. С. Валасенка (в. Крыўча), Я. Л. Гарошка (в. Зарэчча), А. М. Каробкін (в. Буркі), А. Ц. Крысенка (в. Мікулічы), П. А. Крыўчык (в. Сялец), К. І. Палхоўскі (в. Мікулічы) і іншыя нашы землякі.

Барацьба з іншаземнымі інтэрвентамі, грамадзянская вайна каштавалі народу вялікіх ахвяр. Нямала нашых землякоў склалі галовы на палях бітваў як з аўстра-германскімі і польскімі захопнікамі, так і са сваімі суайчыннікамі, што былі на баку белых.

Пераход да мірнага аднаўленчага будаўніцтва пасля грамадзянскай вайны адбываўся ў складанай міжнароднай і ўнутранай абстаноўцы. З аднаго боку, эканамічны і дыпламатычны націск імперыялістычных колаў і, з другога, упартае процідзеянне звергнутых эксплуататарскіх класаў мерапрыемствам Савецкай улады. Народная гаспадарка, асабліва яе сельскагаспадарчы сектар, знаходзілася ў крайне цяжкім становішчы. У сялян не хапала насення, зменшылася колькасць коней. Пасяўныя плошчы скараціліся супраць узроўню папярэдніх гадоў на адну трэць. У дадатак і засуха з'явілася адной з прычын галоднай зімы 1921 — 1922 гг., асабліва ў раёнах Паволжа.

Патрабаваліся радыкальныя меры па вываду эканомікі з цяжкага крызісу, аднаўленні народнай гаспадаркі і пабудове сацыялізму. Гістарычную ролю ў гэтым плане адыграў X з'езд РКП(б) (сакавік 1921 г.), які прыняў рашэнне аб замене харчразвёрсткі харчпадаткам, аб пераходзе ад палітыкі ваеннага камунізму да новай эканамічнай палітыкі (НЭП). Ажыццяўленне яе забяспечвала нармальныя ўзаемаадносіны паміж горадам і вёскай. Ужо ў 1923 г. у сельскагаспадарчай вытворчасці пачаўся перыяд уздыму. Сяляне расшыралі пасяўныя плошчы, павялічвалі вытворчасць сельгаспрадуктаў. Аднаўляліся разбураныя падчас вайны і ўзводзіліся новыя дзяржаўныя і дробныя саматужныя прамысловыя прадпрыемствы. Павышэнню зацікаўленасці сялян у пэўнай меры садзейнічаў і зацверджаны Усерасійскім ЦВК у кастрычніку 1922 г. Зямельны кодэкс, які вызначыў парадак сялянскага землекарыстання і забяспечыў найбольшае задавальненне патрэб сяляк — ліквідацыю цераспалосіцы, дальнаполля і г. д. Да таго ж дзяржава арганізавала агранамічнае і ветэрынарнае абслугоўванне сялянскіх гаспада-

рак, штогод пачала выдаваць ім насенную пазыку і інш. Так і на Брагіншчыне ў 1924 г. на базе сельскагаспадарчай арцелі «Усход-Зара» (в. Глухавічы) пачалі працаваць кароткатэрміновыя курсы па агратэхніцы і ветэрынарыі. Навучанне на іх (выкладчык Фёдар Навіцкі) прайшлі больш за 100 чалавек. У Камарыне такая ж работа вялася пры ветэрынарнай лячэбніцы, пабудаванай у 1923 г. Тут заняткі вёў энтузіяст сваёй справы Міхаіл Манецкі. У 1924—1926 гг. у Брагіне і Камарыне адбыліся сельскагаспадарчыя выстаўкі.

Важным клопатам мясцовых Саветаў і партыйных арганізацый у 1922 г. з'яўлялася правядзенне шырокай кампаніі па аказанні дапамогі насельніцтву ахопленых голадам раёнаў краіны. Дзейнасць створаных на Брагіншчыне і Камарыншчыне камісій па барацьбе з голадам узначалілі сакратары валасных партыйных камітэтаў Ф. П. Кушняроў (м. Брагін), К. А. Мартышук (м. Камарын), Р. В. Мігай (в. Мікулічы). На валасных з'ездах Саветаў у Брагіне, Мікулічах, Савічах, Ёлчы[1] і інш. у 1922 г. быў горача падтрыманы лозунг: «Дзесяць сытых кормяць аднаго галадаючага». Толькі да пачатку 1923 г. па валасцях Брагіншчыны ў дапамогу галадаючым было сабрана 2200 пудоў хлебапрадуктаў[2].

Праўда, не ўсюды і не ўсе з аднолькавым усведамленнем ставіліся да трагедыі галадаючых людзей. Многія з заможнікаў і кулакоў нават імкнуліся сабатаваць дзеянні мясцовых улад па зборы прадуктаў і грашовых сродкаў у фонд галадаючых, часам не спыняючыся перад учыненнем злачынстваў. Так, у 1923 г. былі забіты былы латышскі стралок, міліцыянер Брагінскай валасной міліцыі Уладзімір Болатаў і яго таварыш па рабоце старшы міліцыянер Станіслаў Барцэвіч.

Адначасова з арганізацыяй добраахвотных грашовых адлічэнняў працоўнымі калектывамі ў фонд галадаючых, збору для іх прадуктаў Савецкім урадам вышукваліся і іншыя, часам не зусім прыстойныя, калі не сказаць кашчунныя, крыніцы папаўнення фонду. «Улічваючы разладжанасць фінансавага становішча краіны пасля грамадзянскай вайны,— успамінаў тагачасны загадчык зямельнага аддзела Брагінскага валвыканкама Я. С. Дабрынскі,— УЦВК у лютым 1922 г. прыняў пастанову аб канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей. З пятнаццаці храмаў Брагіншчыны было ўзята больш за дзесяць пудоў срэбра, перададзенага затым у фонд галадаючаму насельніцтву».

Неабходнасць абароны суверэнітэту Савецкай краіны, задачы сацыялістычнага будаўніцтва патрабавалі больш цеснага аб'яднання эканамічных, палітычных і ваенных рэсурсаў савецкіх рэспублік. У студзені 1921 г. быў падпісаны дагавор аб ваенным і гаспадарчым саюзе РСФСР і БССР, паводле якога прызнавалася незалежнасць і суверэннасць кожнага з бакоў. Былі таксама ўстаноўлены цесныя сувязі БССР, УССР і Закаўказскай Федэрацыі. Ідучы насустрач пажаданням працоўных, 1-шы Усесаюзны з'езд Саветаў 30 снежня 1922 г. прыняў Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні Саюза ССР і аб'яднанні ў ім РСФСР, УССР, БССР і ЗСФСР на аснове добраахвотнасці і раўнапраўя.

Стварэнне СССР забяспечвала Беларусі, як і кожнай іншай рэспублікі Саюза, спрыяльныя ўмовы для перабудовы грамадства на сацыялістычных асновах, уздыму эканомікі і культуры, карэннага паляпшэння жыцця грамадзян. Гэта праяўлялася і ў адчувальнай дапамозе з боку дзяржавы валасцям Брагіншчыны і Камарыншчыны тэхнікай і абсталяваннем, спецыялістамі для развіцця мясцовай прамысловасці, кадрамі народнай асветы, аховы здароўя і інш. Асабліва прыкметнай стала гэтая дапамога пасля абвяшчэння партыяй на

[1] У далейшым, з 1923 г. замест Ялчанскай стала Камарынская воласць.

[2] З успамінаў сакратара Брагінскай валасной партарганізацыі Ф. П. Кушнярова.

XIV з'ездзе ВКП(б) курсу на сацыялістычную індустрыялізацыю.

У вырашэнні пытанняў сацыяльна-культурнай сферы мясцовыя органы імкнуліся шырэй прыцягваць да работы ў Саветах сельскую беднату. Найбольш плённа працавалі ў гэтых адносінах выканкамы Брагінскага, Мікуліцкага, Савіцкага Саветаў. Выконваючы ідэалагічныя ўстаноўкі ВКП(б) па павышэнні ролі Саветаў у сацыялістычным будаўніцтве праз умацаванне іх сувязі з працоўнымі масамі, партыйныя і дзяржаўныя органы надавалі вялікае значэнне ўцягненню беднякоў і батракоў, у тым ліку жанчын, у грамадскую дзейнасць шляхам удзелу сельскіх пралетарыяў у рабоце розных камісій, груп садзейнічання, дэлегацкіх сходаў і г. д. Актыўнасцю ў грамадскай рабоце вызначаліся тады маладыя вясковыя дзяўчаты Марыя Гудзянок, Ганна Жураў, Марыя Федасенка, Дар'я Цеслянок і іншыя. У далейшым яны сталі першымі ў сваіх раёнах жанчынамі, якія ўзначалілі выканкамы мясцовых органаў Савецкай улады.

Справе аднаўлення народнай гаспадаркі, уцягнення сельскіх працаўнікоў у сацыялістычнае будаўніцтва служылі кааператыўныя арганізацыі. У гэты час на Брагіншчыне развіваліся прасцейшыя формы кааперацыі, якія выконвалі функцыі забеспячэнска-збытавога характару. Сельскагаспадарчая кааперацыя прадастаўляла сялянам кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя крэдыты на набыццё інвентару, рабочай і прадуктыўнай жывёлы, завозіла ў вёскі сельгасмашыны, нарыхтоўвала збожжа і іншыя віды сельскагаспадарчай прадукцыі.

У 1923 г. былі арганізаваны кааператывы, спажывецкія таварыствы ў Брагіне і Камарыне. Дзейнічалі тры адзіныя спажывецкія таварыствы. У часы нэпа галоўнай задачай кааперацыі з'яўлялася авалоданне рынкам ва ўмовах свабоды гандлю. На тэрыторыі Брагінскага і Камарынскага раёнаў у гэты час дзейнічалі 196 прыватных крам, чайных, закусачных[1].

Вялікую дапамогу працоўным сялянам у аднаўленні гаспадаркі аказвалі сельскія камітэты сялянскай узаемадапамогі. У Брагінскім і Камарынскім раёнах у 1925 г. іх было 57 і аб'ядноўвалі яны 10 тысяч маламоцных сялянскіх двароў[2].

К канцу аднаўленчага перыяду ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы былі дасягнуты значныя поспехі. Аднак у вёсцы склаліся ўмовы, якія пагражалі не толькі аслабленню, а і разрыву саюза рабочага класа і сялянства. Ва ўмовах нэпа працягвалася не толькі асераднячванне сялян, але хутка павялічвалася і колькасць кулацкіх гаспадарак. Кулак эканамічна ўзмацнеў і актывізаваў сваю барацьбу супраць Савецкай улады. Кулацкія элементы імкнуліся выкарыстаць незадавальненне часткі сераднякоў неэквівалентнасцю цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю і прамысловыя тавары, прымянялі адкрытыя формы эксплуатацыі, навязвалі свае палітычныя погляды сераднякам, асабліва падчас выбарных кампаній у Саветы. У радзе месцаў Беларусі пачалі праяўляць актыўнасць кулацка-эсэраўскія арганізацыі. На Брагіншчыне сталі заяўляць аб сабе нацыяналістычныя варожыя групы. Больш за 50 чалавек было ўцягнута ў сіянісцкую арганізацыю[3].

З другой паловы 20-х гг. пачалося згортванне нэпа. Ажыццяўлялася кааператванне дробнай саматужнай прамысловасці. Прыватныя прадпрыемствы (15 алейніц і столькі ж крупадзёрак, 12 ваўначосак і інш.) знікалі, скасоўваліся арэндныя дагаворы. У выніку вымушанага аб'яднання майстроў-прыватнікаў склалася сістэма кааператыўных арцелей. У Брагіне дзейнічалі арцелі «Чырвоная іголка», «Прагрэс»,

[1] Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Спр. 72. Інв. № 99. Л. 156.

[2] Тамсама. Спр. 89. Інв. № 15. Л. 61.

[3] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 2. Спр. 457. Л. 3.

«Чырвоны Кастрычнік». Працавалі тры прамарцелі і ў Камарыне — «Камунар», «Рэкорд», «Чырвоны будаўнік». Гэтыя калектывы наладзілі вытворчасць абутку і швейных вырабаў, цэглы для задавальнення попыту мясцовага насельніцтва. У гэты перыяд вялося будаўніцтва і ўвядзенне ў эксплуатацыю шашы Чарнігаў — Жытомір, частка якой пралягала па Камарынскім раёне. Тады ж праз Днепр і Прыпяць былі пабудаваны два драўляныя масты[1]. Шмат увагі дарожнаму будаўніцтву на Камарыншчыне ўдзялялася і ў наступныя гады, асабліва калі начальнікам дарожнага аддзела райвыканкама працаваў К. Т. Мазураў. Забрукаваны пры ім участак шашы Камарын — чыгуначная станцыя Ёлча і ў напрамку Чарнобыля ў народзе да гэтага часу называюць мазураўскім. У 1926 г. на тэрыторыі Камарынскага раёна разгарнулася будаўніцтва ўчастка чыгункі Чарнігаў — Оўруч. Яна пралягла праз Ёлчу — Капоранку — Пасудава. Паспяхова спраўляўся з заданнямі па забеспячэнні будаўніцтва рабочай сілай і гужавым транспартам выканкам Новаялчанскага сельсавета.

У 1928 г. ялчанска-пасудаўскае навакольле абудзіў першы паравозны гудок.

Брагінскі райвыканкам на працягу 1927—1928 гг. многае рабіў па далейшым землеўпарадкаванні сялянскіх гаспадарак. У раёне лічылася ўпарадкаванай каля 65 працэнтаў усёй зямельнай плошчы. За кошт абрэзкі зямлі ў заможных сялян на працягу гэтых двух гадоў былі надзелены ёю 212 беззямельных і малазямельных вясковых двароў[2].

Такім чынам, 20-я гг. з'явіліся для брагінцоў і камарынцаў перыядам барацьбы і выпрабаванняў, стварэння і ўмацавання асновы для далейшага развіцця раёнаў у вытворча-эканамічнай і сацыяльна-культурнай сферах. А наперадзе іх чакалі новыя здзяйсненні і выпрабаванні.

І. Ф. Ганжураў

Ішла ў рэвалюцыю моладзь

Час са студзеня да чэрвеня 1919 года з'яўляўся перыядам арганізацыйнага станаўлення камсамола Гомелыпчыны. У красавіку ў Брагіне, а затым у Камарыне, Мікулічах, Савічах адбыліся арганізацыйныя сходы моладзі па стварэнні камсамольскіх ячэек. У Брагіне на такім сходзе з дакладам выступіў старшыня Рэчыцкага павятовага выканкама Я. П. Міцкевіч.

Вясною 1919-га першымі камсамольцамі Брагіншчыны сталі Арон Шэндзяровіч, Іван Сташэнка, Давыд Скарупскі, Вольга Кулакоўская, Андрэй Яжгуновіч, Цэзар Хайцын, Апанас Пятрэнка, Іван Пашкевіч, Пётр Іваненка, Аляксей Паўлючэнка і іншыя. Кіраўніком Брагінскай валасной камсамольскай ячэйкі быў абраны найбольш пісьменны і ініцыятыўны хлопец Арон Шэндзяровіч. Тады ж Ялчанскую валасную камсамольскую ячэйку ўзначаліў Міхаіл Скідан. У далейшым ён працаваў у сельскім камітэце беднаты, а напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны — першым сакратаром Нараўлянскага райкама партыі. Загінуў на фронце.

У чэрвені 1919 года ў Гомелі адбыўся 1-шы губернскі з'езд камсамола. У яго рабоце прымалі ўдзел 40 дэлегатаў, у тым ліку па адным прадстаўніку ад Брагінскай і Ялчанскай камсамольскіх ячэек — Арон Шэндзяровіч і малады член РКП(б) Карней Мартышук з Камарына.

У ліпені 1919 года камсамольскія ячэйкі былі створаны не толькі ў валасных цэнтрах, але і ў некаторых найбольш буйных вёсках Брагіншчыны і Камарыншчыны. Антон Коўш, Аляксей і Піліп Паўлючэнкі, Андрэй Яжгуновіч

[1] Абодва знішчаны ў Вялікую Айчынную вайну.

[2] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 3316. Воп. 1. Спр. 625. Л. 228.

сталі ядром створанай у 1922 годзе глухавіцкай камсамольскай ячэйкі. Напачатку яе ўзначальваў Піліп Паўлючэнка, а затым — Антон Коўш. Маладыя энтузіясты тут адразу ж пачалі з канкрэтных спраў — размеркавалі паміж сабой абавязкі і даручэнні. У прыватнасці, Антон Коўш узначаліў вясковае адзінае спажывецкае таварыства, Міхаіл Яжгуновіч быў дэлегаваны ў сельскі камітэт беднаты. Яго брат Андрэй рэдагаваў насценгазету, актыўна вёў работу па ліквідацыі непісьменнасці сярод жыхароў вёскі Ясменцы. Глухавіцкія камсамольцы разам з камуністамі ўступілі ў атрад асобага прызначэння (ЧОН). Разам харчатрадаўцамі збіралі ў насельніцтва харчразвёрстку, адбіралі лішкі хлеба ў кулакоў. Камандаваў чонаўцамі старшыня Брагінскага валвыканкама, былы шчорсавец Пётр Іванавіч Купрыянаў.

Апорнымі пунктамі камсамольскай работы на вёсцы ў 20-я гады з'яўляліся першыя культурна-асветныя ўстановы — хаты-чытальні, клубы пралетарскай культуры і г. д., у якіх праводзіліся ўрокі палітграматы, антырэлігійныя вечары, канцэрты мастацкай самадзейнасці. Так, у Глухавічах камсамолка Вольга Ляўчук узначальвала культурна-масавую работу ў мясцовай хаце-чытальні. Іншыя члены ячэйкі, у тым ліку Ілья Шылец, Іван Шарэпа, узначалілі спартыўны і асаавіяхімаўскі гурткі, праводзілі чыткі газет і г. д.

Глухавіцкія камсамольцы вызначаліся ініцыятыўнасцю і дзелавітасцю, у тым ліку ў справе абароны інтарэсаў мясцовага насельніцтва. Так, калі глухавіцкія беднякі паскардзіліся, што іхні крамнік ашуквае пакупнікоў, камсамольцы вырашылі адкрыць першую савецкую краму. Справа гэтая ім удалася, і па вопыт у Глухавічы прыязджалі з Брагіна, Камарына і іншых месц.

У 1923 годзе членамі глухавіцкай камсамольскай ячэйкі сталі будучы вядомы беларускі пісьменнік Р. К. Сабаленка і яго сябры А. А. Свірыдзенка і Я. М. Сабаленка. Затым яны стварылі сабалеўскую камсамольскую ячэйку. У 30-я гады яе актыўнымі членамі з'яўляліся М. А. Бычкоўскі, У. А. Зелянкоўскі, Ф. Ф. Пашкоўскі, Д. Ф. Стрыбук і іншыя.

Калі маладая Савецкая Рэспубліка абвясціла заклік: «Усе — на барацьбу з Дзянікіным!», у рады Чырвонай Арміі добраахвотнікамі ўступілі амаль усе камсамольцы Брагіна, вёсак Аляксееўка, Астрагляды, Верхнія Жары, Крукі, Крыўча, Малейкі, Шкураты. На Усходні фронт добраахвотнікамі пайшлі члены РКСМ Пётр Галезнік, Навум Генін, Аляксандр Кіслы, Сямён Ціханчук, Пётр Шынкарэнка, Андрэй Ятчанка і іншыя.

На франтах грамадзянскай вайны, у барацьбе з іншаземнымі інтэрвентамі і бандытызмам праславілі свае імёны маладыя камуністы і першыя камсамольцы нашых мясцін Сямён Апанасенка, Пётр Купрыянаў, Сяргей Таміловіч-Данчанка і іншыя, узнагароджаныя тады ордэнам Чырвонага Сцяга.

Калі ў красавіку 1920 года войскі буржуазна-памешчыцкай Польшчы прарваліся на подступы да Гомеля, па партыйна-камсамольскай мабілізацыі супраць акупантаў выступілі маладыя камуністы і члены РКСМ з Брагінскай, Лоеўскай, Рэчыцкай валасцей павета. У першым баі з ворагам загінулі члены партыі Анапрэйчык (в. Крукі), Залман Гуцьянтаў (в. Рудня Жураўлёва), Катлабай (в. Вялле), Пётр Кур'ян (в. Дублін) і іншыя.

У 1920 годзе з Польшчы на Беларусь прабраліся ўзброеныя банды генерала С. Булак-Балаховіча, узнялі галовы мясцовыя кулакі і дробнабуржуазныя элементы. Камуністы і камсамольцы, у тым ліку з нядаўна створаных малажынскай, ніжнежараўскай, сцепаноўскай і іншых ячэек, перайшлі на казарменнае становішча. Як і ў Глухавічах, у Брагіне ўсе камсамольцы былі ўключаны ў склад атрада ЧОН. У барацьбе з булак-балахоўцамі і мясцовымі бандамі, якія лютавалі на Брагіншчыне, Лоеўшчыне і ў іншых мес-

цах, загінулі камсамольцы-міліцыянеры з Брагіна браты Аляксандр і Пётр Сцельмашэнкі, Канедзі Аўраменка. Ад выбуху бомбы, падкладзенай пад будынак міліцыі ў Камарыне, загінулі члены рКСМ міліцыянеры Галубенка з вёскі Ілычы, Міхаленка з вёскі Багушы.

У 1923 годзе па закліку дзяржаўных органаў праводзілася масавая кампанія па барацьбе з самагонаварэннем. Камсамольцы актыўна ўключыліся ў яе. Былі ў гэтай справе істотныя вынікі, але не абышлося і без страт. Так, у адзін з ліпеньскіх дзён сакратар камсамольскай ячэйкі вёскі Малажын Піліп Давыдоўскі высачыў, што на левым беразе Дняпра хтосьці гнаў самагон. Па выкліку прыехаў на кані ўчастковы міліцыянер У. П. Болатаў. Удвух затрымалі самагоншчыка. Калі ж у сельсавет прыйшоў нейкі тып у флоцкай форме і пачаў выгароджваць самагоншчыка, то звязалі абодвух і на падводзе павезлі ў Брагін. У дарозе арыштаваныя непрыкметна развязаліся і забілі Давыдоўскага і Болатава. Абодвух загінуўшых пахавалі ў Брагіне, на тым месцы, дзе зараз пляцоўка перад уваходам у раённы Дом культуры. У 50-я гады астанкі пахаваных, у т. л. бальшавікоў С. Я. Краўчанкі, П. В. Скарахода, былі перазахаваны на тым месцы, дзе цяпер мемарыял Памяці па суседстве з будынкам аддзялення Аграпрамбанка.

У 1922—1923 гады актыўна працягвалася работа па стварэнні камсамольскіх ячэек. Менавіта тады ўзніклі многія нізавыя арганізацыі камуністычнага маладзёжнага саюза ў Багушах, Бурках, Пірках, Спярыжжы і інш. Найбольш ініцыятыўнымі камсамольцамі ў Багушах, напрыклад, з'яўляліся Людміла Міхаленка, Рыгор Паўлючэнка, Іван Сакоўскі, Іван Сташэнка (сакратар), а ў Бурках — Аляксей Мышкавец, Фёдар Раманюк, Аляксей Уласенка, Іван і Сяргей Шкурко.

У Камарынскім райкаме камсамола на добрым рахунку была камсамольская ячэйка вёскі Лукаеды (цяпер Кірава), створаная ў 1925 годзе. Найбольш актыўнымі яе членамі з'яўляліся Сямён Алеўскі, Васіль Леўчанка, Міхаіл Дзянісавіч і Міхаіл Лукіч Леўчанкі, Аляксандр Мацвеенкаў, Сцяпан Мішчанка, Рыгор Навозенка, Мікалай Памазай і іншыя. Камсамольцы растлумачвалі насельніцтву палітыку партыі і ўрада ў тагачаснай унутранай і міжнароднай абстаноўцы, дапамагалі органам мясцовай улады ў правядзенні розных мерапрыемстваў, у тым ліку і ў сацыялістычнай перабудове вёскі.

Першыя сялянскія аб'яднанні

У лютым 1919 г. на землях фальварка Унігаўка Мікуліцкай воласці была створана сельскагаспадарчая камуна «Праца» (старшыня Савул Дабрынскі), тады ж знішчаная бандай І. Галака, у Глухавічах такое ж сялянскае аб'яднанне «Усход-Зара» ўзначальваў Веніямін Рабоўскі. У 1920 г. арганізаваліся ў камуну імя Карла Маркса, пазней — «Светлае жыццё» сяляне-беднякі вёскі Асарэвічы (старшыні Андрэй Царанок, потым — Кірыла Плюшчай).

У канцы 1920 г. у адным з нумароў газеты «Известия» паведамлялася аб стварэнні сельгаскамуны ў вёсцы Гарадзішча: «В Белоруссии, невдалеке от Брагина, создана производственная коммуна. После ухода белополяков, демобилизованные красноармейцы и партизаны решили объединиться для совместного ведения хозяйства. У коммуны было имущество: одна лошадь, одно седло, два ружья. Получив семенную ссуду, коммунары засеяли озимой рожью около 12-ти десятин...

Социальный состав коммуны: рабочих 17 человек, а всех едоков 24...»

На пачатку 20-х гг. на землях памешчыкаў Гардзялкоўскага і Рыбінкава былі створаны ў вёсцы Астрагляды саўгас «Астрагляды», у Камарыне — лугавая гаспадарка «Камарын», якія займаліся жывёлагадоўляй і паляводствам, парыхтоўкай сена для Чырвонай

Арміі, насенняводствам траў. На пачатку масавай калектывізацыі камуны былі пераўтвораны ў калгасы. Яны з'явіліся свайго роду прыкладам арганізацыі калектыўнай працы і новага побыту бядняцкага вясковага пасельніцтва, а затым і сераднякоў.

У 1924 г. арганізаваны сельгасарцелі на былых памешчыцкіх землях у вёсцы Савічы — «Інтэрнацыянал» (старшыня Райзман), у вёсцы Касачоў — «Новы свет» (старшыня бальшавік з Піцера Павел Шынкароў), у вёсцы Краснае Камарынскага раёна — «III-ці Інтэрнацыянал» (старшыня М. П. Прыскока, затым — Н. Гірын).

У 1926 г. у вёсцы Нова-Аляксееўка Крыўчанскага сельсавета сяляне-беднякі аб'ядналіся ў таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі, якое ўзначаліў Рыгор Шаец.

Матэрыялы на с. 115–118 падрыхтаваў
І. Ф. Ганжураў

Пачыналася з «Надзеі»

З успамінаў Шэпшаля Гарадзецкага, аднаго з арганізатараў і першых кіраўнікоў сельгаскамуны ў в. Гарадзішча

Гэта было ў кастрычніку — лістападзе 1919 года. Напачатку нас было пяць чалавек: я, Глухоўскі Янкель, Райхман Шэел, Бернштэйн, Міляўскі Янкель. Мы падалі ў валвыканкам заяву аб дазволе арганізаваць сельскагаспадарчую камуну на базе сялібы былога памешчыка Пятра Патона ў вёсцы Гарадзішча. Нам дазволілі. І вось сабралася нас чалавек каля дваццаці, такіх, як я, беднякоў, і пачалі раіцца, як лепш агульнымі намаганнямі выбрацца з беднасці. Шмат было розных меркаванняў, але ўрэшце сышліся на адным: працаваць разам, у калектыве, а ўсё, што заробім,— дзяліць між сабой у адпаведнасці з укладам працы кожнага.

Неўзабаве да нас далучыліся яшчэ 50 сем'яў. Напачатку кіраўніком абралі Глухоўскага Янкеля. Ён на гэтай пасадзе быў да 1921 года. Я ж з'яўляўся яго намеснікам і працаваў брыгадзірам. Сваёй камуне аднадушна далі назву «Надзея».

Усе сем'і ў камуне былі яўрэйскія. Прымалі ўсіх, хто рабіў узнос грашыма або даваў каня з фурманкай. Першапачаткова ў гаспадарцы былі толькі коні, іншай жывёлы не мелі. Мы не былі сялянамі, таму нам цяжка давалася земляробская справа. Але мы вучыліся і араць, і сеяць.

Праўда, такі калектыў у нас быў нядоўга. Неўзабаве частка былых яўрэяў-гандляроў выйшла з камуны і зноў перайшла на прыватны гандаль. Гэта адбылося не толькі з-за арганізацыйна-гаспадарчых цяжкасцей, але і таму, што не было жылля для тых камунараў, якія штодзень дабіраліся на працу з Брагіна ў Гарадзішча. Моцна азадачаны такім паваротам справы, пакінуў камуну і сам яе кіраўнік. Замест яго да 1924 года старшынёй працаваў Райхман Шэел. Пры ім камуна набыла племянных кароў. Асвоілі і зямлю, яна давала ўжо добрыя ўраджаі. У 1927 годзе нам далі трактар «Фардзон», і я быў на ім трактарыстам разам з Пінем Пінскім.

Заўвага. Ш. Гарадзецкі ў час вайны знаходзіўся ў эвакуацыі. Пасля вызвалення Брагіншчыны ад гітлераўцаў вярнуўся ў калгас, дзе працаваў да 1963 года, з'яўляючыся нязменным членам праўлення.

З таварыства — у калгас...

З успамінаў Фамы Міхайлавіча Расюка, актыўнага ўдзельніка калектывізацыі

У 1927 годзе я ўзначальваў камітэт беднаты ў вёсцы Калыбань. Аднойчы прыехаў загадчык зямельнага аддзела Камарынскага райвыканкама Говараў. Азнаёміўшыся з нашымі вясковымі справамі, параіў стварыць у нас таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі. Вясковы актыў пагадзіўся. Арганізавалі меліярацыйнае таварыства, старшынёй якога абралі мяне. Нам выдзелілі ўчастак балота, і мы прыступілі да яго

расчысткі ад хмызнякоў і купін. Затым пачалі асушэнне. Работы ў асноўным выконваліся ўручную, але даволі паспяхова.

У 1928 годзе да нас далучыліся яшчэ дзве групы сялян, і мы пераўтварыліся ў машынна-меліярацыйнае таварыства. Вядома, мелі і некаторую тэхніку. Калі ў канцы таго ж года наша вытворчае аб'яднанне яшчэ колькасна павялічылася, вырашылі стварыць даволі буйное па тым часе малочна-жывёлагадоўчае таварыства. Атрымалі пазыку ў крэдытным таварыстве, набылі племянную жывёлу, добрае насенне. У 1930 годзе на эканамічна моцнай базе нашага таварыства быў створаны калгас «Чырвоны араты».

Адзін доктар, адна бальніца

На пачатку XX ст. у шасці валасцях Камарыншчыны і Брагіншчыны працавалі ўсяго шэсць медыцынскіх работнікаў. Напрыклад, у былой Ялчанскай воласці медыцынскую дапамогу хворым аказвалі адзін фельчар — Станіслаў Ігнатавіч Манецкі і акушэрка Любоў Восіпаўна Шастакова. Пры гэтым іх дапамога была платнай, і далёка не ўсе, асабліва беднякі, маглі ёю карыстацца.

На нізкім узроўні вялася ў той час і прафілактычная работа. У прыватнасці, у 1910 г. прышчэпкі супраць воспы на Камарыншчыне і Брагіншчыне былі зроблены не больш чым палове нованароджаных. Высокай была дзіцячая смяротнасць. Змардаваныя цяжкім, паўгалодным існаваннем сяляне часта пакутавалі ад малярыі, тыфу, кароставы, дыфтэрыі, воспы. Асноўнай прычынай інфекцыйных захворванняў была нізкая санітарна-бытавая культура, антысанітарыя на саматужных гарбарнях Шайкевічаў у Брагіне і Расліных — у Камарыне. Шкуры жывёлін, забітых або загінуўшых ад сібірскай язвы, яшчура і іншых хвароб, не абеззаражваліся, а тэхналагічныя сцёкі з гарбарняў скідваліся ў Брагінку, канавы і азёры, траплялі ў Днепр. Тым самым інфіцыраваліся асноўныя крыніцы пітной вады, а ў выніку — інфекцыйныя захворванні.

Справы з аховай здароўя насельніцтва крыху палепшыліся ў паслякаст-

Першае праўленне сельгасарцелі «Надзея». Злева направа: І. Быкадзёр, Ш. Гарадзецкі, З. Міляўская, Б. Пінскі, Ш. Фрыдман

рычніцкі час. У Брагіне ўжо ў 1918 г. была адрамантавана бальніца з расшырэннем да 10 ложкаў. Аднак з персаналу ў ёй меліся толькі фельчар, акушэрка і санітарка-прыбіральшчыца.

На Камарыншчыне некаторае паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання было звязана з прыездам у канцы 1917 г. на пастаяннае жыхарства ў вёску Краснае доктара медыцынскіх навук Дзмітрыя Мікалаевіча Разнатоўскага. Вучоны-медык адразу ж разгарнуў лячэбна-прафілактычную работу ў Ялчанскай воласці. За ўласныя сродкі ён набыў тры сялянскія хаты і зрабіў з іх прыбудову да будынка, атрыманага ад свайго цесця Р. Ф. Селюкова. Так, у маі 1918 г. Дзмітрый Мікалаевіч адкрыў першую на Камарыншчыне бальніцу на 16 ложкаў.

Д. М. Разнатоўскі з'яўляўся ледзь не адзіным па тым часе доктарам медыцынскіх навук па Гомельшчыне і Мазыршчыне. Па кансультацыю да яго звярталіся спецыялісты-медыкі з Чарнігава, Кіева, Гомеля, а хворыя прыязджалі не толькі з бліжніх, але і далёкіх мясцін. Тысячы пацыентаў вылечыў доктар Разнатоўскі ад люта-ваўшых тады інфекцыйных захворванняў. А вось выратаваць самых блізкіх сваіх людзей не змог. Вясной 1919 г. ад тыфу памерлі жонка — былая актрыса Мікалаеўскага тэатра Кацярына Радзівонаўна Селюкова і адзіны іх пятнаццігадовы сын.

Цяжкія страты рэзка падарвалі здароўе Дзмітрыя Мікалаевіча. Але нават хворы ён не перапыняў сваёй высакароднай справы. У 1930 г. доктар Д. М. Разнатоўскі памёр. Пахаваны ён на могілках вёскі Старая Ёлча.

А. П. Баннікаў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З ЗАГАДА ПА 16-Й АРМІІ З АБ'ЯЎЛЕННЕМ ПАДЗЯКІ ХАРЧКАМАМ, ВЫКАНКАМАМ І РЭЎКАМАМ ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЕРНІ ЗА ВЫКАНАННЕ ХАРЧРАЗВЁРСТКІ ДЛЯ ПАТРЭБ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ (1920)

За энергичную работу по выполнению разверстки продовольствия для нужд Красной Армии объявляется благодарность: Гомельскому губпродкому, упродкомам: Новозыбковскому, Почепскому, Гомельскому, Речицкому, Стародубскому, Суражскому, Мстиславскому, Рогачевскому, Быховскому, Чаусскому, Чериковскому, Климовичскому и Городецкому; соответствующим исполкомам, ревкомам, населению указанных уездов и волостей, а также всем сотрудникам упомянутых учреждений.

Друкуецца па кн.: Революционные комитеты БССР и их деятельность по укреплению Советской власти и организации социалистического строительства (июль — декабрь 1920 г.). Сборник документов и материалов. Мн., 1967. С. 342.

З ПАЛІТЫЧНАЙ СПРАВАЗДАЧЫ ГУБКАМА РКП(б) АБ АЖЫЦЦЯЎЛЕННІ НОВАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ І БАРАЦЬБЕ З БАНДЫТЫЗМАМ У ГУБЕРНІ ЗА ЧАС АД 1 САКАВІКА ДА 15 КАСТРЫЧНІКА 1921 г.

...Меры по оказанию помощи крестьянскому хозяйству, агиткомпания в деревне, а главное — замена разверстки продналогом вносят значительное успокоение в деревню, способствуют расширению посевной площади и приостанавливают бандитизм, причем отношение к нему крестьянства начинает коренным образом меняться в нашу пользу.

Начавший усиливаться к марту месяцу текущего года бандитизм особенно давал себя чувствовать в следующих районах: в Речицком уезде, где оперировала банда Галака численностью до 300 чел. и остатки банд Струка...

Восстановление народного хозяйства Гомельской губернии (1921—1925 гг.). Гомель, 1960. С. 89.

З АДОЗВЫ VI РЭЧЫЦКАГА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ ДА НАСЕЛЬНІЦТВА З ЗАКЛІКАМ АБ ДАПАМОЗЕ ГАЛАДАЮЧЫМ ПАВОЛЖА

20 снежня 1921 г.

Представители рабочих, трудового крестьянства и красноармейцев Речицкого уезда, собравшиеся на уездный съезд Советов, заслушали и обсудили сообщение о бедственном положении Поволжья, о нечеловеческих муках, переживаемых населением края, и обращаются с горячим призывом ко всему населению уезда...

Речицкий уезд должен прокормить 32 000 голодных до нового урожая. Учитывая население уезда, приходится на 10 сытых 1 голодный. Каждые 10 человек должны ежедневно оторвать несколько золотников для голодного брата...

Время не терпит. Помощь нужна скорая, дружная и энергичная...

Філіял дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці у г. Мазыры. Ф. 98. Воп. 1. Спр. 12. Л. 2.

З ПРАТАКОЛА 1-й БРАГІНСКАЙ ВАЛАСНОЙ БЕСПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ СЯЛЯНАК

29 кастрычніка 1922 г.

На конференцию явились 78 делегаток.

В президиум избраны от делегаток с решающим голосом: Коцубо Юлия, Василенко Александра и Рыженко Г.

Повестка дня:

1. Международное положение.
2. Вовлечение крестьянок в советское строительство и перевыборы.
3. О продналоге.
4. О землепользовании.

Слушали: По первому вопросу докладывает тов. Добринский...

По второму вопросу докладывает тов. Рыженко, ссылаясь на факты, имеющие место, в особенности в деревнях, где на женщину смотрят, как на раба, не допускают к общественной работе, ей отводят специальную работу в семье и возле скота. Такое положение, говорит тов. Рыженко, было до Октябрьской революции. Такое положение, вследствие невежества нашего, существует и до сих пор, но такое не должно быть..., из этого положения единственный выход заключается в том, чтобы всюду, во всех учреждениях государственных, общественных и др. должны быть избираемы женщины...

По докладу в прениях выступают: дер. Малейки — Коцубо..., дер. Шкураты — Лозовик..., дер. Дублин — Кабанчук, дер. Глуховичи — Василенко, дер. Котловица — Рак...

Постановили: доклад тов. Рыженко принять к сведению и приступить к выборам крестьянок в совторганы... **Избираются:** в Волисполком — Максимчик Антонина с Котловиц, в ВолЕПО Брагина — Юлия Коцубо с Малеек, в Нарсуд — Лозовик с Шкуратов, в комитет взаимопомощи — с Ясеней Кислая, на торжество в честь пятой годовщины Октябрьской революции в Речицу — Василенко из Глуховичей...

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 29. Воп. 1. Адз. зах. 104. Л. 151.

З ПАСТАНОВЫ САВІЦКАЙ ВАЛАСНОЙ БЕСПАРТЫЙНАЙ СЯЛЯНСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ АД 27 СТУДЗЕНЯ 1923 г.

Заслушав доклад о постановлениях, принятых 10-м съездом Советов[1], конференция отмечает, что сельское хозяйство является основой всего хозяйства Советской республики, что от его состояния зависит дальнейшее развитие нашей промышленности, что Советская власть это учитывает и принимает все меры к подъему обездоленного сельского хозяйства и разоренной промышленности. А потому, одобряя мероприятия и решения, принятые 10-м Всероссийским съездом Советов, конференция выражает свою готовность приложить все усилия к подъему и укреплению сельского хозяйства, осуществлению всех решений съезда.

Друкуецца па газ.: Маяк Палесся. 1982. 21 лістап.

[1] Маецца на ўвазе 10-ты Усерасійскі з'езд Саветаў (снежань 1922 г.).

З ПРАТАКОЛА ПЕРАВЫБАРАЎ КРЫЎЧАНСКАГА СЕЛЬСКАГА САВЕТА РАБОЧЫХ І СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ БРАГІНСКАЙ ВОЛАСЦІ РЭЧЫЦКАГА ПАВЕТА

17 лістапада 1923 г.

... под председательством уполномоченного по выборам членов сельской избирательной комиссии тов. Мельникова и Лукашенко произведены выборы сельского Совета согласно Конституции Р.С.Ф.С.Р. о выборах. Совет выбран от количества населения обоего пола 975 человек; в выборах приняли участие как имеющие право, согласно §§ 64 и 65 Конституции и инструкции о выборах, 154 человека. Из них были отстранены, как не имеющие права избирать и быть избранными, 29 чел., согласно прилагаемого списка. (Члены Совета):

1. Кравченко Тимофей Дормидонтович.
2. Вороненко Степан Иванович.
3. Кравченко Дормидонт Григорьевич.
4. Волосенко Мефодий Степанович.
5. Панченко Федор Степанович.
6. Чубса Аким Авдеевич.
7. Рудник Архип Карпович...

Председатель *(подпись)*
Секретарь *(подпись)*

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 29. Воп. 1. Спр. 36. Л. 30.

З МАТЭРЫЯЛА АБСЛЕДАВАННЯ КАМІСІЯЙ ГОМЕЛЬСКАГА ГУБЕРНСКАГА АДДЗЕЛА НАРОДНАЙ АСВЕТЫ КУЛЬТУРНАГА СТАНУ БРАГІНСКАЙ ВОЛАСЦІ Ў 1923 г.

Брагинская волость чуть ли не самая крупная волость Речицкого уезда: 72 населенных пункта и 37 с/с, количество жителей 38 448 человек. Перед проверяющими стояла задача не только охватить все просветительные учреждения, но и все населенные пункты с количеством населения жителей от 100 человек. Таких пунктов оказалось 42.

Одним из существенных вопросов является отношение крестьянства к народному образованию, к мероприятиям Советской власти в области просвещения. Обследование выявило ряд положительных фактов. Наличие договорных школ всецело содержится за счет крестьянства. Крестьянин из окладного листа знает, что школа должна содержаться государством, но он понимает затруднения и дает еще средства на школу и избу-читальню. Факт кормления учителей говорит о многом. Без упреков, жалоб крестьяне поочередно дают продукты питания, сами готовят, относят. Тут, очевидно, играет сознание, что учитель мало получает и ему надо помочь, хотя это явление не желательное. Но все-таки оно указывает на сочувствие крестьян делу просвещения.

Договорные избы-читальни (Шкураты, Маложин, Острогляды), кстати сказать, куда лучше работают государственных изб-читален, если сопоставить их с Брагинской центральной избой, которая при 2-х работниках на 2 головы стоит ниже любой договорной избы. Договорная изба стоит крестьянству 50 пудов — помещение, 10—15 пудов освещение и 120 пудов — наемработница (здесь расчет идет исключительно на ржаные единицы), да еще выписка газет, журналов и т. д.

Дальше: ремонт всех школьных помещений прошлой осенью 1922 года произведен самими крестьянами. Отмечая случаи постройки школ (Вязок) исключительно собственными силами. Все это свидетельствует о самом благожелательном отношении крестьян к народному образованию. Наконец, резолюция волостной Брагинской крестьянской конференции, принятая единогласно, говорит о желании поддержать дело просвещения путем доставки отопления, производства ремонта, вывозки леса и выполнения всех подсобных работ при постройках того или иного просветительного учреждения.

Крестьянство осознало пользу образования и из последних средств поддерживает культурные очаги деревни.

Если проанализировать бюджет деревенских просветительных учреждений, Речицкий уездный отдел народного образования дает зарплату работникам избы-читальни 6 рублей 50 копеек в месяц. ВолОНО (ВИК) содержит технического работника, оплачивает 2 рубля в месяц. Ремонт, отопление, закупка учебных пособий, наем помещения и т. д. оплачивает крестьянство. Такова сила фактов. Так обстоит дело. И едва ли кто вздумает утверждать, что крестьянство (по крайней мере Брагинской волости) не сочувствует народному просвещению.

Работники просвещения втягиваются в общественную жизнь. Этот процесс начался. Учитель организует и ведет работу в избе-читальне (Глуховичи, Острогляды, Маложин, Микуличи). Он бывает на сходе, читает крестьянам газету, разъясняет тот или иной вопрос. Особенно большая работа проводится среди женщин. Тут нужна упорная и длительная работа со стороны женщин, чтобы вытравить из крестьян то отношение к женщине, которое осталось из проклятого прошлого.

Третий момент, на котором бы хотелось остановиться в данном очерке, это состояние политико-воспитательной работы в деревнях. Тут налицо стремление крестьян к просвещению и желание учительства вести работу среди крестьян. Речицкий уездный отдел народного образования дает на Брагинскую волость для проведения политико-воспитательной работы 25 рублей 50 копеек в месяц. Да 115 книг за полугодие. Это в месяц составляет сумму в 13 рублей. Это выходит по 0,1 копейки на человека. 72 населенных пункта волости имеют пять изб-читален, из которых одна в Брагине обслуживает подростков и комсомол, а остальные в деревне, причем одна только государственная, а то договорные.

Книжный фонд волости 603 книги, так как тут 500 брошюр изданий 1918 года. Книжки потрепаны, без переплетов. Деревни сами открывают избы-читальни (Шкураты — зав. избы-читальни Кривенчук, Острогляды — зав. избы-читальни Михаленко), выписывают газеты, но газеты не доходят. Просят книг — им даются 50 штук брошюр. Ходовых книг по законодательству, по сельскому хозяйству совсем нет. Несмотря даже на это, избы растут. Крестьяне высказывают желание открыть и содержать таковые, только просят материала (Вязок — зав. избы-читальни Смусенок, Соболи — зав. избы-читальни Зеленковский Кузьма).

Застой в работе политпросвета родит секты, обновленные иконы и т. д. Ибо крестьянству некуда деваться: живет оно трезво, в праздники молодежь устраивает «вечерки», а старшие идут послушать какого-нибудь евангельского начетчика.

В свое время Наркомпрос указал, что политпросвету надо выделить 15 % из своей сметы народному образованию, и это надо выполнить, тем более что перед политпросветом стоит теперь основная и большая задача — это ликвидация неграмотности...

Известия Гомельского губкома РКП(б), 1923. № 63, 64.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БРАГІНСКАГА ВАЛАСНОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

12 верасня 1925 г.

Слушали: доклад Городищенской сельхозартели «Надежда» — докладчик т. Городецкий.

Артель «Надежда» существует с 1920 г. Всего в артели имеется 109 десятин пахотной земли, 15 лошадей, 32 коровы, 9 телят, 10 плугов, 1 жнеярка, 4 пары борон, 1 сеялка. В артели применяется 9-польная система севооборота. Зимний посев произведен, приступлено к зяблевой вспашке. Артель состоит из 15 семей, в коих рабочих 32. Сад в 2 раза вспахан, опрыскан и унавожен. Наемный труд применяется в исключительных случаях... С сельсоветом связь имеется, агроном посещает артель 1 (раз) в 2 недели. Взаимоотношения с населением удовлетворительные...

С с/х кооперацией и Волземкомом связь поддерживается. Распределение продуктов ведется в зависимости от рабочей силы и числа едоков...

Постановили: признать состояние Городищенской артели «Надежда» удовлетворительным...

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 29. Воп. 1. Адз. зах. 176. Л. 221–222.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ КАМАРЫНСКАГА ВАЛАСНОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА

18 снежня 1926 г.

Слушали: информацию зав. ВЗО — Герасименко и культуртехника Ковалева об организации Кулажинского мелиоративного товарищества на землях земфонда бывшего нетрудового пользования в урочище «Грубча» площадью 180 десятин, находящихся ныне в аренде общества дер. Кулажина, и протокол общего собрания гр-н дер. Кулажина от 10 декабря с. г. № 30, а также заявление учредителей Кулажинского мелиоративного товарищества Зайца Иосифа и др. В числе 5 человек об утверждении товарищества в количестве 79 членов. Инд. 321 – 1218.

Постановили: Признать возможным организацию Кулажинского мелиоративного товарищества на землях, числящихся в земфонде бывшего нетрудового пользования в урочище «Грубча» площадью 180 десятин. и просить Речицкое УВУ об утверждении этого товарищества.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 316. Воп. 1. Спр. 20. Л. 106 – 107.

З ДАКЛАДА БРАГІНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА РЭЧЫЦКАЙ АКРУГІ ДА 13-га ВАЛАСНОГА З'ЕЗДА — 1-га З'ЕЗДА САВЕТАЎ БРАГІНСКАГА РАЁНА АБ РАБОЦЕ ЗА ПЕРЫЯД З 25 ЛЮТАГА 1926 г. ДА 10 САКАВІКА 1927 г.

Политическое состояние

Политическое состояние района в общем можно считать устойчивым, за исключением имевших место отдельных выступов уголовного бандитизма в местах, близлежащих к Черниг. губернии (Бабки, Селец, Петьковщина, Верховая Слобода), каковые, благодаря своевременно принятым мерам со стороны райисполкома, были в большинстве ликвидированы и преступный элемент попал в руки правосудия...

Райисполком обслуживает 39 сельсоветов, 59 селькомов взаимопомощи, 6 потребительских обществ, 3 сельскохозяйственных т-ва, 3 сельхозартели, 1 совхоз, 1 раймилицию, 1 врачебный участок, 1 почт.-телегр. отделение, 1 страхучасток, 1 агропункт и 1 об-во кустарей...

Весенняя посевная кампания 1926 года

Яровыми культурами обсеменено 8830 дес., из них: яровой пшеницей — 473,1/3 дес., ячменем — 981 дес., овсом — 1120 дес., просом — 464 дес., гречихой — 896,3/7 дес.. горохом — 37,1/4 дес., картофелем — 3484 дес., льном — 624,1/4 дес., коноплей — 116,1/2 дес., викой — 469 дес., середелой — 17,3/4 дес., клевером — 125,1/4 дес., люпином — 17,1/2 дес., тимофеевкой — 4 дес. ...

Праздник Дня урожая

В совхозе Остроглядах была организована сельскохозяйственная выставка, на которую были доставлены осенью экспонаты полеводства, садоводства, огородничества и животноводства. Наиболее выдающиеся экспонаты премировались, всего премировано 25 хозяйств. На выставке присутствовало около 300 человек.

Агропункт

Агропункт создан в 1924 году в бывш. имении Шкураты площадью 5,01 дес., сада 2,33 дес., выгона 0,75 дес., болотного сенокоса 3,75 дес. Живого инвентаря — 2 лошади и 1 корова, имеется зерноочистительный пункт, 4 триера, сортировка, змейка, льнотрещетка и веялка, случной пункт — сезонный, с одним жеребцом.

Пашня разбита на 6 полей и введен многопольный севооборот с клеверосеянием, сад культивирован.

Народное образование

	В 1925/26 г.	В 1926/27 г.
Школ	37	42
Комплектов	51	60
Учителей	51	60
Школьных зданий:		
собственных	19	22
наемных	18	20
Учебников на школу	142	в среднем до 175
Учащихся	2464	2900

Политпросветработа

По району изб-читален — 7, библиотек — 1, ликпунктов — 15 с охватом 645 неграмотных, из коих 31 человек батраков, 1 группа индивидуального обучения с охватом

23 человека (Нежихов), групп малограмотных — 5 с охватом 80 человек, организационно оформлено красных уголков — 28...

Деятельиость врачебиого участка

С 1-го февраля 1926 года по 1-е февраля 1927 года.
Больница на 12 кроватей.
Всего прошло больных через больницу 357 чел.
Произведено операций — 80.
Всего проведено койко-дней — 4260.
Всего проведено родов в больнице — 16.
Всего проведено абортов в больнице — 36.
Всего прошло через амбулаторию — 14 982.
Осмотрено школ — 21.
Прочитано лекций — 89.
Произведено выездов — 438, осмотрено больных — 5009.
Всего прошло больных через зубоврачебный кабинет — 1192.
Принято больных Микуличским фельдпунктом — 4870.

Штат больницы и амбулатории состоит из 14 человек, из них: врачей — 2, зубной врач — 1, фельдшеров — 2, акушерка — 1, сестер милосердия — 1 и тех. персоиала — 7...

Деревии: Просмычи, Пучин, Нежихово, Жердное и Храковичи частично обслуживаются Савичским врачебным участком...

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 316. Воп. 1. Спр. 27. Л. 29, 32, 35, 38—40.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ КАМАРЫНСКАГА РАЙВЫКАНКАМА АД 12 СТУДЗЕНЯ 1927 г.

Слушали: Ходатайство зав. Иолчанской больиицы Кашпова ... об увеличенин содержания доктору Рознатовскому до 100 рублей, ввиду того, что Рознатовский по своей специальности хирург и в прошлом году получал 90 рублей в месяц, и ннформацию т. Ефименко о том, что на заседании Президиума окрисполкома заведующий Уздравотделом Деиискин информировал, что Рознатовскому предложеио выдавать прибавку 30 рублей в месяц и Кашпову 10 рублей, о чем уже посланы сообщения на места.

Постановили: ... просить Окрисполком об увеличении содержания Рознатовскому на 30 рублей, Кашпову на 20 рублей.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 316. Воп. 1. Спр. 20. Л. 118.

Дакументы выявіў і падрыхтаваў да друку *І. Ф. Ганжураў*

30-я гады: час заваёў і страт

Калектывізацыя

Паводле статыстычных даных, у 1926 годзе на Брагіншчыне налічвалася 12,7 тысячы сялянскіх гаспадарак, на кожную з якіх прыпадала да дзвюх дзесяцін ворнай зямлі, 1,5 галавы рабочых коней. У сярэднім на 100 гаспадарак (двароў) было 5 конных плугоў заводскай вытворчасці, 3 малатарні. Але дзяржава ў асобе мясцовых Саветаў абмяжоўвала развітыя гаспадаркі ў памерах і тэрмінах арэнды зямлі, праве па найме рабочай сілы, выдачы крэдытаў. Гэта рабілася з той мэтай, каб перашкодзіць далейшаму эканамічнаму ўмацаванню заможных кулацкіх гаспадарак.

На заможнікаў узмацняўся падатковы ціск, згортвалася забеспячэнне іх сродкамі вытворчасці, канфіскоўваліся зямельныя лішкі, спынялася землеўпарадкаванне гаспадарак хутарскога тыпу. Пры гэтым самі хутары сталі разглядацца як кулацкія гаспадаркі, а іх гаспадары, асабліва калі яны сістэматычна выкарыстоўвалі наёмную рабочую

сілу, адносіліся да катэгорыі кулакоў. У выніку інтарэсы сялян-заможнікаў і часткі эканамічна ўзмацнелых серадняко̆ў увайшлі ў супярэчнасць з інтарэсамі дзяржаўнай адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Супрацьстаянне сялян і ўлад яшчэ больш абвастрылася, калі ад нэпаўскага харчпадатку зноў перайшлі да харчразвёрсткі — да гвалтоўнага адабрання ў сялян-заможнікаў і нават у серадняко̆ў не толькі лішкаў збожжа, але і насення, часткі маёмасці. Пры такіх рэквізіцыях справа даходзіла нават да сур'ёзных інцыдэнтаў, тэрарыстычных актаў. Так, пры адабранні лішкаў збожжа ў заможнага селяніна з вёскі Малейкі быў забіты актыўны член камісіі па збожжанарыхтоўках, мясцовы камсамолец І. В. Татарынаў, у суседняй вёсцы Макрэц цяжка паранены член такой жа камісіі.

Далейшае развіццё сельскай гаспадаркі ў краіне праходзіла пад знакам рашэнняў XV з'езда ВКП(б), які прыняў курс на калектывізацыю аднаасобных сялянскіх гаспадарак.

Як паказаў папярэдні вопыт сельгаскамун, арцелей, таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі, шырокі пераход дробных сялянскіх аб'яднанняў да калектыўных форм гаспадарання быў магчымы толькі пры ўмове насычэння сельгасвытворчасці найноўшай машыннай тэхнікай. У 1927 годзе пачалася айчынная вытворчасць трактароў. З кожным годам павялічваўся выпуск трактарных прычапных машын і коннага інвентару. Прымяненне новай тэхнікі пачалося перш за ўсё ў саўгасах. На Брагіншчыне першыя трактары з'явіліся ў 1927—1928 гадах у саўгасе «Астрагляды», сельгасарцелях «Надзея», «Новы свет» і інш. Прыбыццё сталёвых машын у вёскі было для іх жыхароў сапраўды выдатнай падзеяй. Так, хлебам-соллю сустракалі ў вёсках Мікулічы, Шкураты трактарыстаў Піню Пінскага, Шэпшаля Гарадзецкага, Шубянка, якія гналі трактары з чыгуначнай станцыі ў вёскі Гарадзішча і Касачоў.

Ліпеньскі (1928 г.) Пленум ЦК ВКП(б) прыняў пастанову аб стварэнні ў краіне буйных збожжавых саўгасаў. У адпаведнасці з ёй на калыбанскіх і вельямоўскіх балотах пачалося будаўніцтва гаспадаркі, якая атрымала ў далейшым назву саўгаса імя Молатава. На балотных масівах праводзіліся вялікія па тым часе меліярацыйныя работы, якімі кіраваў прыезджы інжынер-меліяратар Андрэй Буры. У саўгасе была адзіная ў Камарынскім раёне грузавая аўтамашына ГАЗ-АА. У 1929 годзе ў гэтай гаспадарцы правялі першую веснавую сяўбу.

Дзякуючы намаганням мясцовых Саветаў і партыйных арганізацый па развіцці грамадскай актыўнасці і ініцыятывы вясковага насельніцтва ў 1928 годзе на Брагіншчыне ўзнік метад збожжанарыхтовак па прынцыпе самаабкладання. Кулакам устанаўліваліся для выканання «цвёрдыя заданні». Тады ж у кожнай вёсцы былі створаны і актыўна працавалі камісіі садзейнічання збожжанарыхтоўкам, у якіх пераважаў бядняцкі састаў

У працэсе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі Саветы разглядалі беднату як сваю апору ў вёсцы і таму праводзілі вялікую работу па яе згуртаванні і палітычным выхаванні. Пастаяннымі арганізацыйнымі цэнтрамі беднаты былі бядняцкія групы пры сельскіх Саветах і камітэты сялянскай грамадскай узаемадапамогі. Вялікую работу ў такіх групах і камітэтах праводзілі іх старшыні і актывісты М. Зайцаў (в. Крукі), Д. В. Прышчэпаў (в. Макрэц), Ф. М. Расюк (в. Калыбань), М. І. Скідан (в. Ёлча), У. Сукач (в. Ніжнія Жары), А. Л. Яжгуновіч (в. Глухавічы) і іншыя.

У снежні 1929 года ў Брагінскім і Камарынскім раёнах праходзілі канферэнцыі груп беднаты, на якіх абмяркоўваліся надзённыя задачы сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Удзельнікі гэтых мерапрыемстваў адобрылі пераход да суцэльнай калектывізацыі, заклікалі сялян-беднякоў і

Арганізатар калгаса «Надзея» і першы яго старшыня А. І. Шаўчэнка

серадняком да хутчэйшага ўступлення ў калгасы.

Далейшае ўзмацненне грамадскага сектара сельскагаспадарчай вытворчасці патрабавала новых падыходаў да павышэння эфектыўнасці выкарыстання зямлі, тэхнікі ва ўмовах узрастаючай матэрыяльна-тэхнічнай базы кааперавання на вёсцы. Наступным захадам у гэтым напрамку з'явілася стварэнне трактарных калон спачатку на Украіне, затым паўсюдна — машынна-трактарных станцый (МТС). Будаўніцтва іх пачалося пасля пастановы Савета працы і абароны ад 5 чэрвеня 1929 года «Аб арганізацыі машынна-трактарных станцый». У 1930 годзе былі створаны МТС на Брагіншчыне і Камарыншчыне. Першымі дырэктарамі Брагінскай і Камарынскай (Ялчанскай) машынна-трактарных станцый з'яўляліся Ф. Ціхаміраў і М. Клімянок. Забягаючы наперад, скажам, што ўжо праз тры гады Брагінская МТС, напрыклад, забяспечвала вытворчым абслугоўваннем 92 калгасы, а Камарынская — 40. За гэты ж час сумарная магутнасць трактарнага парка ў абодвух раёнах узрасла больш чым удвая.

Першымі актыўнымі арганізатарамі калгасаў у нашых мясцінах былі ўраджэнец Ніжніх Жароў М. А. Клімянок, а таксама А. І. Шаўчэнка, І. М. Садчанка, А. А. Краўчанка, І. П. Бельчанка, Ф. М. Расюк, Е. І. Асадчы і іншыя.

Актыў калгаса «Надзея». Першы рад (злева направа): Т. Грамыка, Н. Камок, Х. Каплан, А. П. Непава (брыгадзір жаночай трактарнай брыгады), Я. Гатальскі (каваль). Другі рад (злева направа): Л. С. Дзялец, А. Н. Злотнік (каваль), М. С. Дзялец, М. І. Дваракоўская, Х. Ц. Рак, А. І. Радчанка, М. Т. Зубар з сынам Уладзімірам. Трэці рад (злева направа): М. Грамыка, І. В. Быкадзёр (аграном), Раслін, А. Ганчароў (садоўнік), Х. Хавін, Г. Віленскі

Калгас «Надзея». У час абедзеннага перапынку

Ва ўзначальваемых імі і некаторых суседніх гаспадарках шырока выкарыстоўваліся такія новыя формы павышэння працоўнай актыўнасці калгаснікаў, як сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, калектыўныя выезды ў поле, зажынкі і дажынкі. Аб тым, як працоўнае саперніцтва дапамагала хлебаробам, сведчыць вытрымка са звестак Белкалгасцэнтра ад 23 верасня 1930 года:

«Имеется ряд колхозов, которые в результате соревнования и ударничества добились значительных результатов. Например, колхозы Брагинского района — «Интернационал», «Ильич», «Надежда» — окончили весенний сев и уборку зерновых значительно ранее установленных планом сроков»[1].

Аб першым калектыўным выездзе на палявыя работы ў калгасе «Чырвоны Кастрычнік» (в. Мікулічы) знаходзіцца сведчанне ў дакуменце таго часу:

«8 красавіка калгас выехаў у поле. Выезд меў вельмі добры выгляд. У сонечную раніцу выехалі да месца збору 64 пары коней з плугамі, сеялкамі, культыватарамі, баронамі і г. д. Шмат народу сабралася праводзіць калгаснікаў у поле: прыйшлі жанчыны, вучні, дзеці... Пад музыку і песні выйшлі хлебаробы... У полі зноў усе сабраліся. Пасля кароткага мітынгу, пры гучных воклічах «Ура!», «Няхай жыве Камуністычная партыя, Савецкая ўлада, калектывізацыя!» аратыя пачалі працу. За чатыры гадзіны было ўзарана 30 гектараў.

Гэта быў прыгожы і радасны дзень у Мікулічах па сацыялістычнай пабудове сельскай гаспадаркі...»[1]

На рубяжы 1929—1930-х гадоў адбыліся карэнныя перамены на вёсцы. Пачалося фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі. Тэарэтычным абгрунтаваннем яго з'явіўся артыкул Сталіна «Год вялікага пералому», змешчаны ў газеце «Правда» за 7 лістапада 1929 года. На хутчэйшае завяршэнне вытворчага кааперавання сялянскіх гаспадарак нацэльвала і пастанова ЦК ВКП(б) ад 5 студзеня 1930 года «Аб тэмпе калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву». Часта тэмп гэты забяспечваўся прымусовымі мерамі. Пры гэтым сялян арганізоўвалі ў калгасы з поўным абагуленнем хатняй жывёлы і дробнага інвентару. Напрыклад, на сесіі Калыбанскага сельсавета па прапанове ўпаўнаважанага з райцэнтра прынялі рашэнне аб тым, што ўсе сяляне павінны ўступіць у калгас. Сур'-

[1] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 338. Воп. 1. Спр. 54. Л. 33.

[1] Шлях калектывізацыі, 1930. № 6. С. 17 – 20.

ёзныя перагібы і памылкі ў справе калектывізацыі ў калгасах «Чырвоны араты», «Ленінскі шлях», «Парыжская камуна» і шэрагу іншых месц у сакавіку – красавіку 1930 года выклікалі масавы выхад сялян з калгасаў. Суцэльнае ж абагуленне маёмасці ўступаўшых у калгас вяскоўцаў з'явілася прычынай масавага збыту імі або забою жыўнасці яе гаспадарамі. Спробы ўлад сілавымі метадамі спыніць гэту тэндэнцыю зноў выклікалі процідзеянне сялян, часта крымінальнага характару. У прыватнасці, на Камарыншчыне была спалена канюшня ў калгасе «Чырвоны араты» (в. Калыбань), знішчаны млын у вёсцы Кавака Брагінскага сельсавета і інш.

Патрабаваліся тэрміновыя і рашучыя меры па выпраўленні становішча. Па рашэнні ЦК партыі 2 сакавіка 1930 года ў газеце «Правда» быў надрукаваны артыкул Сталіна «Головокружение от успехов». У ім аналізаваліся дапушчаныя памылкі ў калектывізацыі і прадугледжваліся меры па іх ухіленні.

У лютым 1930 года на Брагіншчыне і Камарыншчыне, як і ў шэрагу іншых месц, пачалася кампанія ў адпаведнасці з патрабаваннямі пастановы ЦК ВКП(б) і дэкрэта СНК СССР «Аб мерапрыемствах па ўмацаванні сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі ў раёнах суцэльнай калектывізацыі і па барацьбе з кулацтвам». Быў афіцыйна абвешчаны пераход да палітыкі ліквідацыі кулацтва як класа. Мясцовым органам улады прадастаўлялася права на канфіскацыю маёмасці падпаўшых пад раскулачванне заможніцкіх гаспадарак і высяленне кулакоў у аддаленыя мясцовасці краіны. Прадугледжвалася паступленне сродкаў вытворчасці і маёмасці раскулачаных у неадчальныя фонды калгасаў у якасці першага ўзносу беднякоў і батракоў. Як і пры арганізацыі калгасаў, пры раскулачванні мела месца шкодная для справы спаборнасць. Нядзіўна, што ў вёсках Крукі, Спярыжжа, Сувіды і іншых раскулачванню падвяргаліся нават серадняцкія гаспадаркі.

Раскулачванне і высяленне яшчэ больш абвастрыла палітычную сітуацыю на месцах. Пацярпелыя ў ходзе калектывізацыі вяскоўцы станавіліся ў варожую апазіцыю да мясцовай улады, кіраўнікоў гаспадарак і сельскіх Саветаў, актывістаў. Напрыклад, у Чыкалавічах, Ніжніх Жарах, Малейках і іншых месцах працаўнікі калектывізацыі ўчынялі тэрарыстычныя і іншыя злачынныя акты. Яны забілі старшыняў Шкурагоўскага, Астраглядаўскага сельсаветаў Адама Раманаўца і Сямёна Малочку, старшыню камітэта беднаты Міхаіла Новікава (в. Радзін), спалілі памяшканне сельсавета ў вёсцы Малейкі, хату-чытальню ў вёсцы Макрэц і г. д. Аб адной з такіх акцый расказваецца ў публікацыі газеты «Звязда» за 1930 год.

Суд над кулаком-падпальшчыкам

Гомель. (Наш. кар.). Адбыўся суд над кулаком вёскі Пучын Брагінскага раёна Дуняковым Аляксеем, які падпаліў маёмасць старшыні сельсавета Цалуйкі. Тав. Цалуйка вёў актыўную барацьбу з кулакамі-самагоншчыкамі, патраўшчыкамі і парубшчыкамі. Сярод гэтых шкоднікаў была і сям'я Дуняковых, на якую не раз накладваліся штрафы. Каб запалохаць старшыню сельсавета, Дунякоў спаліў яго будынкі. Гомельскім акруговым судом Дунякоў Аляксей прыгавораны да расстрэлу.

З другой паловы 1930 года быў узяты курс на ўцягненне ў калектыўныя гаспадаркі сераднякоў-аднаасобнікаў. І ў сувязі з іх рашучым нежаданнем уступаць у калгасы пачалася другая хваля раскулачвання ці, дакладней, рассяляньвання – наступлення на аднаасобніка. Да канца 30-х гадоў аднаасобныя гаспадаркі, як таваравытворцы, па сутнасці, перасталі існаваць. Побач з ліквідацыяй кулацтва як класа гэта азначала, што вёска пазбавілася мноства працавітых, гаспадарлівых людзей. У Брагінскім і Камарынскім раёнах раскулачванню былі падвергнуты 1235 сем'яў.

Многія з недахопаў у правядзенні калектывізацыі адзначаліся на пасяджэнні Прэзідыума ЦВК БССР у ліста-

падзе 1931 года, на якім былі заслуханы справаздачы шэрагу кіраўнікоў райвыканкамаў, у тым ліку Брагінскага, аб стане калгаснага будаўніцтва[1]. Падкрэслівалася неабходнасць шырэйшага распаўсюджвання станоўчага вопыту арганізатарскай і масава-растлумачальнай работы з мэтай паскарэння тэмпаў аб'яднання сялян у калгасы. Дарэчы, на той час у Брагінскім раёне было калектывізавана 53,6 і ў Камарынскім — 52,5 працэнта сялянскіх гаспадарак[2].

З мэтай вырашэння кадравага пытання ў раёнах суцэльнай калектывізацыі, па рашэнні лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б) 1929 года — на работу ў вёску былі накіраваны 25 тысяч перадавых рабочых і служачых, у тым ліку на Беларусь — 100 лепшых працаўнікоў завода «Чырвонае Сормава» з Ніжняга Ноўгарада, з прадпрыемстваў Масквы і Ленінграда. Ужо ў студзені 1930 года на Брагіншчыну і Камарыншчыну прыехалі 15 рабочых-дваццаціпяцітысячнікаў. Яны былі абраны старшынямі калгасаў і сельсаветаў, сакратарамі партыйных ячэек. Вядома, не ўсе здолелі асабліва праявіць сябе ў новай і незнаёмай для іх справе. Нягледзячы на моцную класавую загартоўку і прафесіяналізм, яны не ведалі спецыфікі і асаблівасцей сельскага побыту, не мелі навыкаў гаспадарчай работы. І ўсё ж добрую памяць пакінулі аб сабе рабочыя Ленінградскіх чыгуначных майстэрняў Міхаіл Бялоў, Пуцілаўскага і Механічнага суднарамонтнага заводаў Ігнат Сакалоў і Пётр Сахараў, Ленінградскіх суднаверфяў — Пётр Штыркін, якія працавалі старшынямі калгасаў «Кастрычнік» (в. Сабалі), «Чырвоны барацьбіт» (в. Асарэвічы), імя Будзённага (в. Багушы), імя Варашылава (в. Астрагляды).

Адной з форм умацавання класавых сувязей паміж рабочымі гарадоў і працоўным сялянствам у той час з'явілася ўзнікненне такога віду ўзаемаадносін, як аказанне шэфскай дапамогі з боку прадпрыемстваў і арганізацый калгасам і саўгасам у рамонце сельгастэхнікі і прычапнога інвентару, уборцы ўраджаю, правядзенні масава-палітычнай работы і г. д. Вясной 1934 года і ў далейшым для аказання такой дапамогі з Гомеля ў раённыя МТС і калгасы прыязджалі тэхнічныя спецыялісты і палітработнікі. У Брагінскай і Камарынскай МТС, тутэйшых гаспадарках добрасумленна працавалі (са сваім інструментам) майстры Фадзееў і Курбацкі, Гарчаноўскі, Сінкевіч і іншыя. Калгасы і саўгасы абодвух раёнаў арганізавана правялі ўсе сельскагаспадарчыя работы, сабралі ўраджай амаль удвая вышэйшы, чым у папярэднім годзе. Так, у калгасе імя Тэльмана намалацілі па 15,5, у калгасе «Кастрычнік» (в. Чырвоная Гара) — па 14,3 цэнтнера азімага жыта з кожнага гектара[1]. Узрасла і валавая вытворчасць збожжа.

Вынікі арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, станоўчы вопыт іх работы абагульніў і зафіксаваў новы Прыкладны статут сельгасарцелі, прыняты 2-м Усесаюзным з'ездам калгаснікаў-ударнікаў у лютым 1935 года. Пасля з'езда Статут зацікаўлена абмяркоўваўся на сходах калгаснікаў. У радзе месц перад удзельнікамі такіх мерапрыемстваў выступалі дэлегаты з'езда — старшыні калгасаў «Чырвоны араты» Камарынскага раёна П. В. Блудчы і калгаса імя Варашылава Брагінскага раёна Г. С. Дзернавы.

Умацаванню калгасаў у немалой меры садзейнічала таксама работа, праведзеная сельскімі Саветамі і гаспадарчымі органамі ў сувязі з уручэннем гаспадаркам Дзяржаўных актаў на бестэрміновае (вечнае) карыстанне зямлёй. Напрыклад, па-святочнаму прайшло такое мерапрыемства ў калгасе «Ленінскі шлях» Камарынскага раёна. На ўрачыстым вечары ў новым клубе выступілі

[1] Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 2418. Л. 64.
[2] Тамсама. Ф. 338. Воп. 1. Спр. 54. Л. 33.

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 192. Л. 75.

таршыня райвыканкама Гуцаў, лепшая аярка гаспадаркі і раёна В. М. Лі-ашапка, каваль-стаханавец Чалы і ін-ыя.

У перыяд другой пяцігодкі (1933–937) умацавалася матэрыяльна-тэхніч-ая база сельскагаспадарчай вытворчас-і. Паступленне ў МТС усё большай олькасці новай тэхнікі ставіла на пара-ак дня пытанні падрыхтоўкі ме-анізатарскіх кадраў. Пры Брагінскай і Камарынскай (Ялчанскай) машынна-рактарных станцыях працавалі курсы рактарыстаў. На іх вучыліся хлопцы і зяўчаты з ліку былых батракоў, а так-ама беднякоў і сераднякоў. У Ёлчы ыкладанне на такіх курсах вялі ды-эктар МТС Удавенка, яго намеснік . Слабко, галоўны механік П. Мешка-іцар. У ліку 80 курсантаў былі 4 дзяў-ыны: круглыя сіроты Яўгенія Кіручок, Таццяна і Антаніна Музычэнкі, Варвара Федасеенка. У далейшым Таццяна стала афёрам у родным калгасе «Дняпроўскі раты». Пасля заканчэння курсаў у бодвух раёнах добрасумленна праца-алі першыя трактарысты Фёдар Дзя-ец, Касьян Касцючэнка, Яўхім Гардзе-нка, Ульян Літаш, Анікей Макута, Міхаіл Маргун, Міхаіл Процка, Алак-ей Самойленка, Васіль Смусянок, Дзямід Сярдзюк і іншыя.

У тыя ж гады многае было зроблена а павышэнні культуры земляробства. Гаспадарках абодвух раёнаў укара-яліся ворыва зяблівa, сяўба радковымі еялкамі, баранаванне азімых, трава-ольныя севазвароты. Гэта садзейнічала авышэнню ўраджайнасці сельгаскуль-ур, павелічэнню валавых збораў збож-а, бульбы, ільнопрадукцыі і г. д. 1936 годзе за дасягненне высокіх вы-ворчых паказчыкаў група перадавікоў рагінскага і Камарынскага раёнаў бы-а ўдастоена дзяржаўных узнагарод. прыватнасці, ордэнам Леніна адзна-аны звеншявы калгаса імя Тэльмана . І. Радчанка, ордэнам «Знак Пашa-ы» – звеншявы калгаса «Чырвоны пра-аўнік» В. Ф. Кулай, медалём «За пра-оўную доблесць» — старшыня калгаса «Чырвоная зорка» (в. Крыўча) Уладзімір Валасенка, калгасніца калгаса «Ленінскі шлях» (в. Чыкалавічы) В. М. Ліхашапка.

На Брагіншчыне і Камарыншчыне былі добра вядомы пролвішчы стаханаўцаў калгасных палёў механіка Фёдара Гензельмана з калгаса «Чырвоная Украіна» (в. Гдзень), Ігната Голуба з калгаса імя Варашылава Астраглядаўскага сельсавета, які, працуючы на жняярцы, зжынаў за дзень па 7–8 гектараў збажыны[1], калгаснікаў Параскі Зачаткі і Фёдара Зелянкоўскага з калгаса «Кастрычнік» Буркоўскага сельсавета, звеннявога Андрэя Коцура з калгаса «Новы Беларус» Малейкаўскага сельсавета, пастуха калгаса «Камунар» Мікуліцкага сельсавета Данілы Шкурко, які са сваёй сям'ёй выпрацаваў за год 1085 працадзён, звеннявой Ёўгі Шрамянок з калгаса «Вольны шлях» Савіцкага сельсавета і іншых.

Да 1937 года калектывізацыя ў абодвух раёнах была завершана, у калгасы ўдалося арганізаваць да 80 працэнтаў сялянскіх гаспадарак.

І. Ф. Ганжураў

Той незабыўны час

З успамінаў А. П. Эльмана, былога сакратара Камарынскага райкама КП(б)Б

У жніўні 1933 года па рашэнні ЦК КП(б) Беларусі я быў накіраваны на работу сакратаром Камарынскага раённага камітэта партыі. Чыгункай праз Гомель, Чарнігаў з цяжкасцю дабраўся да станцыі Ёлча. Затым фурманкай да Камарына.

Адзіная на той час вуліца раённага цэнтра цягнулася ўздоўж Дняпра, які каля Камарына меў шырыню з паўкіламетра. На гэтай вуліцы (цяпер вул. імя Леніна) размяшчаліся будынкі райкама партыі, пошты, магазінаў. Каля самага

[1] Трыбуна калгасніка, 1936. № 81.

Партыйна-камсамольскі актыў Брагінскага раёна. 1930-я гг.

берага працаваў механічны прэс сеназавода. Тут уцюкоўвалі сена, нарыхтаванае рабочымі Камарынскага лугсаўгаса, дырэктарам якога быў камуніст Ігнат Кілачыцкі. Вясной 1934 года мы накіравалі яго на ўмацаванне выканкама Крукаўскага сельсавета. Пасля Кілачыцкага дырэктарам лугсаўгаса працаваў т. Ціханенка, які загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны.

На ўскраі цудоўнага камарынскага бору размяшчаліся адзіная на Камарыншчыне школа-сямігодка, будынкі райвыканкама, міліцыі і райспыжаўсаюза.

Успамінаю прозвішчы тагачасных камарынскіх работнікаў. Загадчыкам аргаддзела РК КП(б)Б працаваў эрудыраваны, дзейсны Рыгор Бедынерман (у жніўні 1941-га загінуў пад Гомелем). Аддзел агітацыі і прапаганды ўзначальваў Міхаіл Баброўскі. Адначасова з рэдактарам камарынскай райгазеты «Калгасны сцяг» т. Сакалоўскім ён пацярпеў ад культу асобы.

З іншых талковых тагачасных работнікаў назваў бы яшчэ літсупрацоўніка райгазеты Фёдара Кляцкова, які затым стаў вядомым мінскім журналістам, маладога настаўніка Крукаўскай школы, а ў далейшым вядомага беларускага пісьменніка Уладзіміра Карпава, старшыню РКК т. Палянскага, начальніка райаддзела міліцыі т. Губара, старшыню райвыканкама Івана Тарасавіча Гуцава, яго намесніка, члена партыі з 1919 года Захара Іванавіча Глушакова і іншых.

У час майго сакратарства цэнтрам усёй культурна-масавай работы ў Камарыне быў клуб. У ім мы глядзелі нямыя кінафільмы ў музычным суправаджэнні камарынскага скрыпача Шаевіча.

Апрача прамкамбіната ў Камарыне тады былі швейная, шавецкая і цагельная прамысловыя арцелі. У дакалгасны перыяд у раёне існаваў адзін саўгас з цэнтральнай сядзібай у былым фальварку паміж Крукамі і Калыбанню. Узначальваў гэтую гаспадарку настаўнік па прафесіі т. Ігнатоўскі. Высокі, стройны, бяскрыўдна насмешлівы, з добрымі задаткамі гаспадарніка — такім быў гэты прыемны сваёй адкрытасцю чалавек. У час вайны камандаваў дывізіяй. Загінуў у 1944-м пад Варшавай.

Запомнілася і такая немалаважная на тым часе дэталь. У саўгасе была адзіная на ўвесь раён грузавая аўтамашына ГАЗ-АА (палутарка). Ды яшчэ

Партыйна-камсамольскі актыў Камарынскага раёна. 1929 г.

райкам і райвыканкам у якасці прэміі за паспяховае выкананне планаў нарыхтоўкі збожжа і бульбы атрымалі «газік» першага выпуску. Калі гналі яго ў Камарын, то вельмі хваляваліся, ці пераадолее ён пяскі каля вёсак Радзін і Баршчоўка, якія ўваходзілі тады ў Камарынскі раён. Так мясцовыя сяляне ўбачылі ўпершыню «жывыя» аўтамабілі.

Большасць калгасаў Камарыншчыны была створана ў 1930 годзе. Тэхнікі, акрамя конных сеялак, жняярак, касілак, а таксама веялак ды малатарань з конным прывадам (і дзе-нідзе з паравым), у гаспадарках Камарынскага раёна не было. Уся цяглавая сіла — валы мясцовых пародаў і коні.

Многае рабілі для развіцця калгаснага ладу вясковыя актывісты-гаспадаркі. Успамінаю старшынь калгасаў і сельсаветаў Івана Пугача (В. Жары), Емяльяна Асадчага (Камарын), Малафея Паўлава (Ёлча), Кацярыну Гудзянок (Капоранка), Міхаіла Скідана (Піркі) і іншых. Дарэчы, Міхаіл перад вайной працаваў першым сакратаром Нараўлянскага райкама партыі. Загінуў у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У перыяд маёй работы на Камарыншчыне ў нас не было абласнога падзелу. Мы непасрэдна былі звязаны з Мінскам. Гэта давала шырокую самастойнасць і накладвала вялікую адказнасць за яе. Работнікі райкама партыі і райвыканкама часта бывалі ў раз'ездах, у калгасах і першых створаных партарганізацыях.

Шмат гадоў прайшло, а я добра памятаю той незабыўны час. Люблю Камарын і Камарыншчыну з іх мілай сэрцу прыродай, слаўнымі і працавітымі людзьмі.

Група членаў сельгасарцелі «Надзея». Злева направа: Я. Казіміроўскі, Ільіцкі, І. В. Быкадзёр, Хамінскі

Сельгасарцель «Надзея». Раздача малака па працадніях

Першы аграном

З успамінаў Васіля Іванавіча Казачэнкі, былога старшыні калгаса імя Тэльмана

Пасля рэвалюцыі ў 1917 годзе ў маёнтку Гарадзішча застаўся толькі адзін аграном І. В. Быкадзёр. Людзі паважалі гэтага чалавека за сумленнасць, справядлівасць і чэснасць. Таму пры арганізацыі сельгаскамуны «Надзея» Ігнат Васільевіч быў запрошаны на работу аграномам і да 1929 года нязменна з'яўляўся членам праўлення гаспадаркі. Калі камуну пераўтварылі ў сельгасарцель, І. В. Быкадзёр яшчэ дзесяць гадоў працаваў брыгадзірам, зноў аграномам.

Вялікая заслуга гэтага адукаванага, працавітага чалавека ў тым, што калгас, якому ў 1934 годзе было прысвоена імя Тэльмана, у 1940 годзе атрымаў вышэйшую ўзнагароду Радзімы — ордэн Леніна.

Стары аграном многае зрабіў па вывядзенні сорту бульбы «тэльманаўка» і асабліва па вырошчванні азімай пшаніцы, якая давала небывалы па тым часе ўраджай — 25—30 цэнтнераў зерня з гектара.

На пачатку Вялікай Айчыннай вайны І. В. Быкадзёр паехаў у Чарнігаў, дзе жылі яго дочкі. У акупіраваным ворагам горадзе ён памёр ад голаду, але рашуча адхіліў прапанову працаваць на гітлераўцаў і тым самым захаваць сабе жыццё.

У ліку дваццаціпяцітысячнікаў

З успамінаў С. В. Дулькіна, старшыні сельгасарцелі «Надзея» ў 1930—1932 гг., дваццаціпяцітысячніка

Па закліку партыі я, рабочы гомельскай фабрыкі «Палесдрук», як і многія іншыя прадстаўнікі рабочага класа краіны, у канцы 1929 года быў накіраваны на правядзенне калектывізацыі ў вёсцы. Тады ў Брагінскі і Камарынскі раёны нас прыехала некалькі чалавек: я — напачатку ў сельгасарцель «Усход-Зара» ў Глухавічы, Голад — у Буркі, Ліберман — у Сялец, Окунь — у Мікулічы, Пятрынаў — у Калыбань, Сахараў — у Астрагляды, Славінаў — у Ёлчу, Слізко — у Петрыцкае, Шэндзярэй — у Хракавічы і г. д. Праўда, у наступным годзе я быў накіраваны ў сельгасарцель «Надзея», у вёску Гарадзішча. Замяніў там на пасадзе старшыні Злату Хаімаўну Міляўскую.

Вялікую дапамогу аказвала нашай калектыўнай гаспадарцы фабрыка «Палесдрук», ад калектыву якой я быў вылучаны дваццаціпяцітысячнікам. Брыгаду па рамонце, падрыхтоўцы сельгасінвентара да пасяўной у нас узначальваў палесдрукаўскі механік Пальценка. Гэта было пачаткам шырока разгорнутага затым руху па аказанні горадам шэфскай дапамогі вёсцы.

На сродкі калгасаў «Новы свет» (Брагін), «Усход-Зара» (Глухавічы) і «Надзея» быў пабудаваны ў Касачове малочны завод, бо жывёлагадоўля развівалася, а малако рэалізаваць не было дзе. На заводзе выраблялі масла, смятану, тварог і галандскі сыр. Ад рэалізацыі гэтай прадукцыі гаспадаркі атрымлівалі значныя прыбыткі.

Немалыя грашовыя паступленні ў арцельную касу мелі ад рэалізацыі ранняй бульбы, гародніны, ільну, табакі, а таксама ад садоўніцтва. Наш сад быў адным з лепшых у раёне.

Незабыўнае

З успамінаў Марыі Васільеўны Петруненка, жыхаркі в. Бярозкі

На ўсё жыццё запомніўся мне той дзень, калі да нас даляцела вестка аб рэкордзе данецкага шахцёра Аляксея Стаханава. У той час я працавала свінаркай у калгасе «III-ці Інтэрнацыянал» Камарынскага раёна. Гэта было ў вёсцы Бярозкі, якая цяпер уваходзіць у саўгас «Краснае». Як і ўсе ў саўгасе, старалася добра працаваць. Але вестка пра Стаха-

нава прымусіла і нас на ферме па-іншаму паглядзець на свае справы. Пачалі працаваць з яшчэ большым стараннем.

За мной было замацавана 13 свіноматак. Нялёгка было даглядаць такое пагалоўе — не было ж ніякай механізацыі. Усё даводзілася рабіць уручную. Нягледзячы на гэта, ужо ў 1936 годзе ад кожнай замацаванай за мной свіноматкі атрымала па 19 парасят.

Праца на ферме прынесла мне вялікую радасць, якую не забыць ніколі. Як перадавая работніца была вылучана, а затым і абрана дэпутатам у вышэйшы орган дзяржаўнай улады рэспублікі — Вярхоўны Савет Беларускай ССР.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны працавала ў родным калгасе на розных работах, уносіла пасільны ўклад у аднаўленне разбуранай вайной гаспадаркі. Толькі тады, калі са здароўем стала няважна, вымушана была пайсці на адпачынак.

ЗА ГАЗЕТНЫМ РАДКОМ

На старонках газеты «Звязда»

21 снежня 1929 г.

У в. Шкуратах арганізаваны калгас, у які ўступіла ўсё сялянства, за выключэннем кулакоў. Ініцыятарамі арганізацыі гэтага калгаса былі бядняк Раманавец Адам і камсамолец Лазавік. Кулацтва было моцна незадаволена калектывізацыяй вёскі і павяло барацьбу супраць вясковых актывістаў.

У апошніх чыслах лістапада быў паранены камсамолец Лазавік. РВК гэтаму тэрарыстычнаму акту кулакоў не надаў палітычнага характару і кваліфікаваў замах на забойства т. Лазавіка толькі як крымінальнае злачынства. Кулакі яшчэ больш разварушыліся.

4 снежня стрэлам праз акно яны забілі другога вясковага актывіста тав. Раманаўца Адама. Гэтыя напады класавага ворага на вёсцы выклікалі вялікае абурэнне беднаты і серадняцтва.

Агульны сход в. Шкураты прыняў рэзалюцыю, у якой патрабуе вышэйшай меры пакарання злачынцам і высялення кулакоў з в. Шкураты за межы БССР.

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

ЗВЕСТКІ БРАГІНСКАГА РАЙКАЛГАССАЮЗА АБ ВЫНІКАХ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРНАЙ КАМПАНІІ Ў КАЛГАСАХ

12 сакавіка 1931 г.

Перавыбарная кампанія па калгасах Брагінскага раёна скончана. Выбары вытвараны ў 44 калгасах, па калгасах «Цалуйкі» і «Камунар» звестак аб перавыбарах не маецца. Праўленнем РКС касіраваны выбары ў калгасах «Чырвоная зорка», (імя) Будзённага, «Юны ленінец» у сувязі з неабраннем у склад праўленняў гэтых калгасаў жанчын.

За час перадвыбарнай і перавыбарнай кампаніі праводзілася самаачыстка калгасаў ад варожых і класава чуждых элементаў, у выніку чаго, па няпоўных звестках, выключана з калгасаў... гаспадарак[1].

За гэты ж час праводзілася праца па шырокаму прыліву ў існуючыя калгасы, які прыліў вызначыўся ў колькасці 200 гаспадарак, а таксама стварэнню новых калгасаў, якіх за гэты час арганізавана 13 новых калгасаў.

Звесткі аб удзеле ў перавыбарах калгаснікаў і аднаасобнікаў маюцца толькі па 25 калгасах, з якіх відаць, што пры перавыбарах праўленняў гэтых калгасаў удзельнічала ўсяго калгаснікаў 1561, з іх мужчын 1015, жанчын 546; усяго аднаасобнікаў 751, з іх рабочых 6, батракоў 7, беднякоў 254, сераднякоў 462, служачых 22.

У спрэчках выказаліся 216.

Выдвінута кандыдатур, акрамя вылучаных на бядняцкіх і дэлегацкіх сходах, у склад праўлення 181, рэўкамісіі 85.

Па 42 калгасах абрана старшынь калгасаў 42, з іх:

сяброў КП(б)Б 14, кандыдатаў КП(б)Б 18, беспартыйных 10, батракоў 2, беднякоў 22, маламоцных серадняко ў 2, серадняко ў 7, дваццаціпяцітысячнікаў 6, рабочых 2, служачых 1; беларусаў 34, яўрэяў 5, рассейцаў 2, латышоў 12; мужчын 41, жанчын 1.

Абіраліся першы раз 22, другі раз 20. Сяброў сельсаветаў 9.

Па 42 калгасах абрана 178 сяброў праўленняў, э іх:

сяброў КП(б)Б 5, кандыдатаў КП(б)Б 17, сяброў ЛКСМБ 12, беспартыйных 144:

[1] У дакументе лічба адсутнічае.

батракоў 8, беднякоў 91, маламоцных серадняко̆ў 26, серадняко̆ў 48, заможных 1, дваццаціпяцітысячнікаў 1, служачых 3;
беларусаў 165, палякаў 5, яўрэяў 5, украінцаў 3;
мужчын 130, жанчын 48.
Абіраюцца першы раз 116, другі раз 62. Сяброў сельсаветаў 21.
Па 42 калгасах абрана 42 старшыні рэўкамісіі, з іх:
сяброў КП(б)Б 2, кандыдатаў КП(б)Б 2, сяброў ЛКСМБ 7, беспартыйных 73;
беднякоў 31, маламоцных серадняко̆ў 10, серадняко̆ў 30, служачых 12;
беларусаў 75, палякаў 1, яўрэяў 8;
мужчын 71, жанчын 13.
Абіраюцца першы раз 61, другі раз 23. Сяброў сельсаветаў 8.

Старшыня праўлення РКС *Драйчук*

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 338. Воп. 1. Спр. 162. Л. 125—126.

КАЛГАСЫ ПЕРЫЯДУ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ (1929—1933)

Назвы гаспадарак	Месца знаходжання цэнтральнай сядзібы	Час стварэння
1. Брагінскі раён		
«Беларусь»	в. Рыжкаў Мікуліцкага сельсавета[1]	да 1933 г.
«Бераснёўка»	в. Бераснёўка Малажынскага сельсавета	— " —
Імя Будзённага	в. Багушы Астраглядаўскага сельсавета	— " —
Імя Варашылава	в. Астрагляды Астраглядаўскага сельсавета	— " —
«Верны шлях»	в. Конанаўшчына Мікуліцкага сельсавета	— " —
«Вольны шлях»	в. Грушнае Хракавіцкага сельсавета	— " —
«Выграбная Слабада»	в. Выграбная Слабада Слабадскога сельсавета	у 1929 г.
Імя Галадзеда	в. Новыя Юркавічы Крыўчанскага сельсавета	да 1933 г.
«Гарадок»	в. Гарадок Крыўчанскага сельсавета	— " —
«Дабрагошча»	в. Дабрагошча Малажынскага сельсавета	— " —
Імя Дзімітрава	в. Круг-Рудка Глухавіцкага сельсавета	— " —
«Дзямееўка»	в. Дзямееўка Крыўчанскага сельсавета	— " —
Імя Дзяржынскага	в. Марытон Буркоўскага сельсавета	— " —
«Дняпровец № 1»	в. Жылічы Малажынскага сельсавета	— " —
«Дняпровец № 2»	в. Новыя Хракавічы Хракавіцкага сельсавета	— " —
«Добраахвотнік»	в. Дублін Спярыжскага сельсавета	— " —
«Другая пяцігодка»	в. Міхалоў Спярыжскага сельсавета	— " —
«Другая пяцігодка»	п. Рытаў Малажынскага сельсавета	у 1933 г.
«Жэрднае»	в. Жэрднае Слабадскога сельсавета	у 1929 г.
«Запаветы Леніна»	в. Кавака Шкуратоўскага сельсавета	да 1933 г.
«Зялёны лес»	в. Каманоў Лубяніцкага сельсавета	да 1930 г.
«Ільіч»	в. Ільічы Глухавіцкага сельсавета	у 1929 г.
«Інтэрнацыянал»	в. Двор-Савічы Савіцкага сельсавета	да 1933 г.
Імя Кагановіча	в. Шчарбіны Буркоўскага сельсавета	— " —
Імя Калініна	в. Глухавічы Глухавіцкага сельсавета	— " —
«Камунар»	в. Пажаркі Мікуліцкага сельсавета	— " —
«Кастрычнік»	в. Сабалі Брагінскага пасял. Савета	— " —
Імя Кірава	в. Нова-Аляксееўка Крыўчанскага сельсавета	— " —
«Краіна Саветаў № 1»	в. Новы Макрэц Малейкаўскага сельсавета	— " —
«Краіна Саветаў № 2»	в. Ясменцы Глухавіцкага сельсавета	у 1930 г.
«Крыўча»	в. Крыўча Крыўчанскага сельсавета	у 1929 г.
Імя Кутузава	в. Кавалі Буркоўскага сельсавета	да 1933 г.
Імя Ланцуцкага	в. Такліноў Шкуратоўскага сельсавета	— " —
Імя Леніна	в. Дуброўнае Астраглядаўскага сельсавета	да 1933 г.
«Ленінец»	в. Ясяні Спярыжскага сельсавета	на пачатку 1930 г.

[1] Назвы сельсаветаў даюцца па тагачасным раённым адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле. Некаторыя сельсаветы адышлі да Хойніцкага раёна пры скасаванні Камарынскага раёна ў 1962 г.

Назвы гаспадарак	Месца знаходжання цэнтральнай сядзібы	Час стварэння
Імя К. Маркса	в. Нулзічы Глухавіцкага сельсавета	да 1933 г.
«Міхнаўка»	в. Міхнаўка Шкуратоўскага сельсавета	у 1929 г.
Імя Молатава	в. Нежыхаў Слабадскога сельсавета	да 1933 г.
«Новая Грэбля»	в. Новая Грэбля Хракавіцкага сельсавета	у 1929 г.
«Новы беларус»	в. Сялец Малейкаўскага сельсавета	да 1933 г.
«Новы свет»	в. Касачоў Брагінскага пасял. Савета	да 1930 г.
«Новы шлях»	в. Катловіца Малейкаўскага сельсавета	— " —
«Парыжская камуна»	в. Шкураты Шкуратоўскага сельсавета	да 1933 г.
«Пераможнік»	в. Малейкі Малейкаўскага сельсавета	— " —
«Першамай»	в. Вялікі Лес Мікуліцкага сельсавета	— " —
«Першамайск»	в. Малажын Малажынскага сельсавета	у 1929 г.
«Пецькаўшчына»	в. Пецькаўшчына Спярыжскага сельсавета	— " —
«Прабуджэнне»	в. Вязок Астраглядаўскага сельсавета	да 1933 г.
«Пралетарскі шлях»	в. Рафалаў Глухавіцкага сельсавета	— " —
«Пралетарыст»	в. Стары Макрэц Малейкаўскага сельсавета	— " —
«Рагазін»	в. Рагазін Лубяніцкага сельсавета	у 1929 г.
«Савічы»	в. Савічы, цэнтр сельсавета	да 1933 г.
«Садовы»	п. Садовы Чамярыскага сельсавета	— " —
«Спярыжжа»	в. Спярыжжа, цэнтр сельсавета	у 1929 г.
Імя Сталіна	в. Старыя Хракавічы Хракавіцкага сельсавета	да 1930 г.
«Сцяг Леніна»	в. Зарэчча Крыўчанскага сельсавета	да 1933 г.
«Трэці рашаючы»	г. п. Брагін, цэнтр пассавета і раёна	да 1930 г.
Імя Тэльмана	в. Тэльман (да 1934 г. Двор-Гарадзішча) Малейкаўскага сельсавета	да 1930 г.
«Ударнік»	в. Чамярысы, цэнтр сельсавета	на пачатку 1930 г.
«Узыходзячая зара»	в. Глухавічы, цэнтр сельсавета	да 1933 г.
«Улада Саветаў»	в. Старыя Юркавічы Крыўчанскага сельсавета	— " —
«Цалуйкі»	в. Цалуйкі Хракавіцкага сельсавета	у 1929 г.
Імя Чапаева	в. Просмычы Савіцкага сельсавета	— " —
Імя Чарвякова	в. Петрыцкае Лубяніцкага сельсавета	да 1933 г.
«Чырвоная Гара»	в. Чырвоная Гара Глухавіцкага сельсавета	у 1929 г.
«Чырвоная Беларусь»	в. Чамярысы, цэнтр сельсавета	на пачатку 1930 г.
«Чырвоная гаспадарка»	п. Лешінец Малажынскага сельсавета	у 1930 г.
«Чырвоная дуброва»	в. Вуглы Шкуратоўскага сельсавета	да 1933 г.
«Чырвоная зорка»	в. Хатуча Астраглядаўскага сельсавета	у 1929 г.
«Чырвоная ніва»	в. Рудня Жураўлёва Лубяніцкага сельсавета	да 1933 г.
«Чырвоная ніва»	в. Буркі, цэнтр сельсавета	на пачатку 1933 г.
«Чырвоная Паляна»	в. Чырвоная Паляна Малажынскага сельсавета	у 1929 г.
«Чырвонае Гарадзішча»	в. Гарадзішча Малейкаўскага сельсавета	да 1929 г.
«Чырвонае Поле»	в. Чырвонае Поле Мікуліцкага сельсавета	да 1933 г.
«Чырвоны Кастрычнік» № 1	в. Мікулічы, цэнтр сельсавета	да 1933 г.
«Чырвоны Кастрычнік» № 2	в. Казялужцы Глухавіцкага сельсавета	— " —
«Чырвоны лістапад»	в. Байдакі Мікуліцкага сельсавета	— " —
«Чырвоны партызан»	в. Пераносы Крыўчанскага сельсавета	— " —
«Чырвоны партызан»	в. Бераснёўка Малажынскага сельсавета	— " —
«Чырвоны працаўнік»	в. Бакуны Буркоўскага сельсавета	да 1930 г.
«Чырвоны рассвет»	в. Сцежарнае Крыўчанскага сельсавета	да 1933 г.
«Чырвоны рог»	в. Чырвоная Дуброва Крыўчанскага сельсавета	у 1933 г.
«Чырвоны сцяг»	в. Пучын Савіцкага сельсавета	у 1929 г.
Імя Шаўчэнкі	в. Валахоўшчына Спярыжскага сельсавета	да 1933 г.
«Шлях да сацыялізму»	в. Ленінскі Чамярыскага сельсавета	— " —
«Юны ленінец»	в. Вярховая Слабада Слабадскога сельсавета	да 1933 г.
2. Камарынскі раён		
«Бальшавік» («Чыстае»)	в. Людзвіноў Капоранскага сельсавета	да 1930 г.
Імя Будзённага	в. Стары Радзін Радзінскага сельсавета	— " —

Назвы гаспадарак	Месца знаходжання цэнтральнай сядзібы	Час стварэння
«Герой працы»	в. Піркі, цэнтр сельсавета	да 1933 г.
Імя Горкага	в. Чэрнеў Піркаўскага сельсавета	да 1930 г.
«12-ы Кастрычнік»	в. Жалібор Крукаўскага сельсавета	да 1929 г.
«Дзень калектывізацыі»	в. Пасудава Чыкалавіцкага сельсавета	да 1933 г.
Імя Дзяржынскага	в. Іванкі Камарынскага пасял. Савета	да 1930 г.
«За Радзіму»	в. Галкі Асарэвіцкага сельсавета	— " —
Імя Ільіча	в. Крукі, цэнтр сельсавета	— " —
«Інтэрнацыянал»	в. Краснае Ялчанскага сельсавета	— " —
Імя Калініна	в. Уласы Баршчоўскага сельсавета	да 1933 г.
«Камінтэрн»	в. Стары Сцепаноў Сцепаноўскага сельсавета	— " —
Імя Куйбышава	в. Вельямоў (Велімаў) Калыбанскага сельсавета	— " —
Імя Леніна	в. Перасяцінец Сцепаноўскага сельсавета	— " —
Імя Маркса	в. Карлаўка Камарынскага пасял. Савета	да 1930 г.
Імя Молатава	в. Кулаковік Сцепаноўскага сельсавета	да 1933 г.
«Новадняпровец»	в. Ніжнія Жары, цэнтр сельсавета	у 1929 г.
«Новае жыццё»	в. Баршчоўка, цэнтр сельсавета	— " —
«Новая праца»	в. Новы Радзін Радзінскага сельсавета	— " —
«Парыжская камуна»	в. Кулажын Крукаўскага сельсавета	да 1930 г.
«Першае Мая»	в. Сінцы Радзінскага сельсавета	— " —
«Пралетарый»	в. Новы Сцепаноў Сцепаноўскага сельсавета	да 1933 г.
«Рухавік рэвалюцыі»	в. Верхнія Жары, цэнтр сельсавета	у 1929 г.
«Савецкая Беларусь»	в. Капоранка, цэнтр сельсавета	у 1930 г.
Імя Свярдлова	в. Новая Ёлча Ялчанскага сельсавета	у 1929 г.
«Серп і молат»	в. Камарын, цэнтр сельсавета	— " —
Імя Сталіна	в. Малочкі Баршчоўскага сельсавета	— " —
«13-ы Кастрычнік»	в. Міхалёўка Крукаўскага сельсавета	да 1930 г.
«Ударнік»	в. Масаны Баршчоўскага сельсавета	— " —
Імя Фрунзе	в. Вялле Асарэвіцкага сельсавета	да 1930 г.
Імя Чарвякова	в. Кірава (Лукаеды), цэнтр сельсавета	у 1929 г.
«Чырвонае гарадзішча»	в. Галубоўка Ялчанскага сельсавета	да 1930 г.
«Чырвоная Беларусь»	в. Сувіды Піркаўскага сельсавета	— " —
«Чырвоная зорка»	в. Аляксандраўка Ялчанскага сельсавета	— " —
«Чырвоная Украіна»	в. Гдзень, цэнтр сельсавета	— " —
«Чырвоны араты»	в. Калыбань, цэнтр сельсавета	у 1930 г.
«Чырвоны барацьбіт»	в. Асарэвічы, цэнтр сельсавета	да 1933 г.
«Чырвоны будаўнік»	в. Піркі, цэнтр сельсавета	— " —
«Чырвоны квіт»	в. Кацічаў Капоранскага сельсавета	— " —
«Чырвоны партызан»	в. Пасека Камарынскага пасял. Савета	— " —

ЗА ГАЗЕТНЫМ РАДКОМ

Па старонках раённай газеты «Трыбуна калгасніка»

17 лістапада 1936 г.

З чым мы прыйшлі да Надзвычайнага з'езда Саветаў

...Выраслі і ўмацаваліся рад калгасаў. Праізайшоў карэнны зрух у машынізацыі сельскай гаспадаркі. Павялічылася сетка школ. Узрасла культура вёскі. Вось некалькі фактаў. У 1934 годзе ў раёне ўсяго было 14 трактароў, а зараз 47. Гэта значыць, павелічэнне амаль у тры разы. У 1934 годзе ў раёне не было ніводнага камбайна — зараз іх ёсць 2, маем 2 ільноцерабілкі, 9 складаных малацілак, 7 ільносеялак і рад іншых сельскагаспадарчых машын.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў нашым раёне было ўсяго 28 школ, у якіх навучалася 1000 дзяцей, а зараз у нашым раёне ёсць 60 школ, з іх 17 няпоўнасярэдніх і адна сярэдняя школа. Усяго навучаецца ў школах 9000 дзяцей.

Зараз наш раён выдаткоўвае з агульнага раённага бюджэта 2 823 136 рублёў на культурнае будаўніцтва, на нарасвету 1 709 800 рублёў, што складае амаль 50 процантаў раённага бюджэта...

Рэзка павялічылася жывёлагадоўля калгасаў. У параўнанні з 1934 годам колькасць буйной рагатай жывёлы павялічылася на 42,1 процанты — па конях на 6,1 процантаў, па свіннях на 50,1 процанты і па авечках на 22 процанты.

Разам з умацаваннем калгасаў расце і калгасная заможнасць. Нашы калгасы ўпэўнена ідуць па шляху яшчэ больш радаснага заможнага жыцця.

Выраслі дзесяткі перадавых людзей стаханаўцаў, як Кулай Васілій Фёдаравіч, Зубар Хадоска, Доўбун, Юнах (брыгадзір трактарнай брыгады МТС), Маргун і рад іншых, якія, зламаўшы старыя вытворчыя нормы, паказалі ўзоры большэвіцкай барацьбы за ажыццяўленне лозунга таварыша Сталіна «Зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі» і якія па-большэвіцку змагаюцца за атрыманне сталінскага ўраджаю, каб у бліжэйшыя тры-чатыры гады атрымаць 7 — 8 мільярдаў пудоў зярна.

Поспехі відавочныя, але гэта не азначае, што ў нас усё добра. У нашай рабоце яшчэ многа недахопаў. Перш за ўсё яшчэ не ўсе калгасы па-большэвіцку змагаюцца за высокі сталінскі ўраджай. Вялікія недахопы ёсць у галіне культурнага будаўніцтва. Рад калгасаў і сельсоветаў злачынна зрываюць своечасовае выкананне плана здачы тэхнічных культур дзяржаве.

Наш раён мае ўсе магчымасці быць у радах перадавых раёнаў ардэнаноснай рэспублікі. Адставанне раёна тлумачыцца тым, што асобныя кіраўнікі сельсоветаў, калгасаў і аддзелаў РВК яшчэ не з'яўляюцца сапраўднымі арганізатарамі мас, яшчэ недастаткова кіруюць і дапамагаюць у арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў. Нарэшце РВК і РайЗА вельмі многа патрэбна зрабіць у адносінах уздыму арганізацыйна-масавай работы на вёсцы, бо і на гэтым участку ў нас далёка не ўсё добра.

За апошнія гады ў сельсоветах вырас выдатны совецкі і калгасны актыў. Калгасніца Каціон Тэкля — старшыня перадавога калгаса, равесніца Акцябра, Ціханчук Лена — старшыня перадавога сельсовета і рад іншых. У большасці — гэта лепшыя стаханаўцы калгасаў, культурныя работнікі, але гэтаму актыву мы мала дапамагаем у штодзённай рабоце.

Недахопаў многа. Задача з'езда Советаў поўнасцю ўскрыць іх. Шляхам разгортвання большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, яшчэ больш мабілізаваць усіх дэпутатаў, членаў секцый і ўвесь совецкі і калгасны актыў на павышэнне якасці работы Советаў, каб вывесці раён у перадавыя раёны ордэнаноснай рэспублікі.

П. А. Баброў,
старшыня Брагінскага райвыканкама

17 лістапада 1936 г.

Рапарт ардэнаносца В. Ф. Кулая раённаму Надзвычайнаму а'езду Саветаў

У маёй брыгадзе налічваецца 30 жанчын і 15 мужчын. Наша брыгада заўсёды працуе спрачона і дружна, і дзякуючы чэсным і добрасумленным адносінам да працы мы датэрмінова і добраякасна выканалі план сельскагаспадарчых работ.

Сярэдні ўраджай па маёй брыгадзе раўняецца 10 цэнтнерам жыта, 10,5 цэнтнерам пшаніцы з гектара, і на вопытных участках мы дабіліся 25 — 30 цэнтнераў ячменю з гектара.

Павышэнне ўраджайнасці нашых палёў павышае вагу працадня калгаснікаў. Нашы калгаснікі атрымоўваюць у гэтым годзе 1,5 кг зерневых, 7 кг бульбы і 1 рубель грашыма на працадзень.

Лепшыя стаханаўкі маёй брыгады Савянок Антаніна і Леўчанка Ліда паказалі лепшыя ўзоры работы па апрацоўцы ільну, сістэматычна перавыконваючы нормы выпрацоўкі, яны давалі высокую якасць валакна. Леўчанка Лідзе ўсяго 14 год, але па сваёй працы яна не адстае ад дарослых. Звеннявы маёй брыгады Каваленка Фёдар сваім асабістым прыкладам мабілізуе астатніх калгаснікаў на перавыкананне норм выпрацоўкі. Працуючы на здабычы торфу, Каваленка выконвае норму выпрацоўкі на 250 %.

Завяраю VI Надзвычайны з'езд Советаў, што мая брыгада з яе лепшымі стаханаўцамі не здасць першынства і будзе ўпарта змагацца за сталінскія 7—8 мільярдаў пудоў хлеба.

Удзельнікі Усебеларускай нарады выдатнікаў сельскай гаспадаркі 1936 г. ад Брагінскага раёна[1]

Баранаў Дзяніс Іванавіч, загадчык малочнатаварнай фермы калгаса імя Чапаева Хракавіцкага сельсавета.

Дзялец Мікалай Сідаравіч, старшыня калгаса імя Тэльмана.

Доўбун Пімен Карнеевіч, пастух-даглядчык аўцафермы калгаса «Чырвоны рассвет» Крыўчанскага сельсавета.

Краўчанка Аляксандр Гардзеевіч, старшыня калгаса «Новы шлях» Малейкаўскага сельсавета.

Крысенка Іван Фёдаравіч, брыгадзір калгаса «Чырвонае поле» Мікуліцкага сельсавета.

Кулай Васіль Фёдаравіч, звеннявы калгаса «Чырвоны працаўнік» Буркоўскага сельсавета.

Макаранка Рыгор Кірылавіч, брыгадзір калгаса «Чырвоны Кастрычнік» Мікуліцкага сельсавета.

Мельнічэнка Якаў Васільевіч, загадчык свінагадоўчай фермы калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (в. Казялужцы).

Стрыбук Іван Фёдаравіч, старшыня калгаса «Кастрычнік» Буркоўскага сельсавета.

Сялецкі Іван Нікіфаравіч, брыгадзір калгаса «Савічы» Савіцкага сельсавета.

[1] Трыбуна калгасніка, 1936. 25 студз.

Татаруніс Станіслаў Казіміравіч, старшыня калгаса «Чырвоная піва» Буркоўскага сельсавета.

Хіжанок Фёдар Іванавіч, загадчык малочнатаварнай фермы калгаса «Новае жыццё» Крыўчанскага сельсавета.

Адступала непісьменнасць...

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі адбылося пераўтварэнне школы на сацыялістычных пачатках. У 1918 годзе спынілі сваё існаванне царкоўнапрыходскія школы. Тады ж у Брагіне на базе чатырохкласнага вучылішча была адчынена гімназія, якая пазней, у адпаведнасці з урадавай дырэктывай аб рэарганізацыі школы, пераўтворана ў адзіную працоўную школу другой ступені з дзевяцігадовым тэрмінам навучання.

На Брагіншчыне, былой глухой ускраіне Расіі, узровень пісьменнасці быў даволі нізкі. Па перапісе 1922 года 90 працэнтаў сялян тут не ўмелі ні чытаць, ні пісаць[1]. Таму ліквідацыя непісьменнасці з першых крокаў Савецкай улады стала яе ўдарным участкам работы. 26 снежня 1919 года быў прыняты дэкрэт Саўнаркама «Аб ліквідацыі непісьменнасці сярод насельніцтва РСФСР» (Брагіншчына на той час у складзе Гомельшчыны ўваходзіла ў Расійскую Фэдэрацыю), у адпаведнасці з якім ставілася задача навучыць грамаце ўсё дарослае насельніцтва ва ўзросце ад 8 да 50 гадоў.

Гэтая доўгатэрміновая праграма мела далёка не добраахвотны характар. Усе, хто належаў прызыву і ўхіляўся ад навучання, падвяргаліся грашоваму штрафу (ад 100 да 500 тысяч рублёў). Былі і меры заахвочвання: тыя, хто спасцігаў азы граматы ў пунктах па ліквідацыі непісьменнасці, вызваляліся ад працоўнага падатку з разліку тры гадзіны заняткаў за гадзіну працоўнага падатку, але не больш як 8 гадзін у месяц.

Ва ўсіх вёсках арганізоўваліся пункты па ліквідацыі непісьменнасці. Да працы ў іх прыцягваліся ўсе інтэлектуальныя сілы мястэчак і вёсак. Было нават створана таварыства «Далоў непісьменнасць!» (ТДН). У Брагіне і Камарыне яго раённыя добраахвотныя арганізацыі ўзначальвалі інспектары народнай асветы адпаведна А. Л. Яжгуновіч і Д. Д. Гееў.

У 1920 годзе на тэрыторыі сучаснага Брагінскага раёна было 10 школ, у якіх навучаліся 275 дзяцей. Нягледзячы на цяжкае становішча, выкліканае нямецкай і затым польскай акупацыяй, наступствамі грамадзянскай вайны, мясцовыя Саветы знаходзілі сілы і сродкі для аднаўлення раней дзеючых, адкрыцця новых школ, паляпшэння іх работы. Ужо ў канцы 1921 года функцыяніравалі 23 школы першай ступені з агульнай колькасцю 1380 навучэнцаў, адна школа другой ступені ў Брагіне — 33 вучні. У гэтых вучэльнях працавалі 79 школьных работнікаў[1]. Беднай была матэрыяльная, вучэбная база школ. Як успамінаў стары настаўнік І. Д. Малец (працаваў педагогам з 1907 да 1957 г.), да пачатку 1921/22 навучальнага года ў школы Брагіншчыны было прыслана ўсяго 30 буквароў Сатарава і 4 экземпляры хрэстаматыі Л. М. Талстога.

У адпаведнасці з рэзалюцыяй 9-й Гомельскай канферэнцыі РК КП(б)Б ад 18 кастрычніка 1922 года, у школах другой ступені ўводзілася выкладанне новай дысцыпліны — грамадазнаўства. Першым выкладчыкам гэтага прадмета ў Брагінскай школе быў Міхаіл Лапіеўскі.

У 1922 годзе на Брагіншчыне пераставалі дзейнічаць яўрэйскія рэлігійныя школы — хедэры, якіх на тэрыторыі Брагіншчыны тады было пяць.

1922/23 навучальны год з'явіўся пераломным у справе народнай асветы, улічваючы праведзеную вялікую работу па пераглядзе саставу школьных работ-

[1] Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 7. Спр. 18. Л. 20.

[1] Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 10. Спр. 112. Л. 43.

Першы піянерскі атрад. У цэнтры піянерважатая С. М. Шайкевіч. Вёска Савічы

нікаў, рамонце школ, забеспячэнні іх вучэбнымі дапаможнікамі і інш. Школьная сетка тагачасных Брагінскага і Камарынскага раёнаў складалася з трох местачковых школ, у якіх было 15 настаўнікаў і 135 вучняў, а таксама 27 сельскіх школ, дзе было 129 выкладчыкаў і 2005 навучэнцаў. Вялікай павагай карысталіся педагогі Іван Абрамовіч, Лук'яи Бушчык, Аляксандр Дашук, Груня Казак, Лука Кастрыцкі, Аляксандра Кулініч, Лізавета Лысенка, Любоў Караткевіч, Іван Малец, Фёдар Палуян, Анастасія Прус, Міхаіл Рачэўскі, Міхаіл Старжынскі, Аланас Скараход, Алена Турцэвіч, Алена Улановіч, Марыя Уласенка, Казімір Цішкевіч і іншыя. З іх вышэйшую адукацыю мелі толькі 5 чалавек. У прыватнасці, Алена Турцэвіч атрымала яе ў Парыжы, Максім Джажора, Фёдар Рымша і Міхаіл Старжынскі скончылі Віленскі настаўніцкі, Іван Прасепік — Кіеўскі камерцыйны інстытуты. Большасць настаўнікаў мела сяроднюю адукацыю, атрыманую на базе жаночых гімназій і епархіяльных вучылішчаў.

1922 год азнаменаваўся ў школьным жыцці такой важнай падзеяй, як стварэнне першых піянерскіх атрадаў у Брагіне і Камарыне. У іх складзе тады налічвалася 75 хлопчыкаў і дзяўчынак. Першымі старшымі піянерважатымі былі Кніжнікаў і Гальперын.

За 1923/24 навучальны год школьная сетка Брагіншчыны павялічылася на 25 працэнтаў. Ужо налічвалася 5 местачковых і 47 сельскіх школ, у якіх

было адпаведна 21 выкладчык, 289 вучняў і 162 выкладчыкі, 3760 вучняў. З 1924 года сельскія школы былі пераведзены на поўны бюджэт. У 1924/25 навучальным годзе пачалі функцыяніраваць дзве яўрэйскія нацыянальныя школы ў Брагіне і Камарыне, чатыры польскія (вёскі Жалібор, Марытон, Пецькаўшчына, Такліноў) і чатыры школы з украінскай мовай навучання (вёскі Верхнія Жары, Гдзень, Лукаеды (Кірава), Ніжнія Жары). У тым жа, 1924/25 навучальным годзе большасць сельскіх школ атрымала зямельныя ўчасткі памерам 2,5 дзесяціны. Яны выкарыстоўваліся школьнымі работнікамі.

У сувязі з вострым недахопам педагагічных кадраў з 1924 года найбольш здольным выпускнікам Брагінскай працоўнай школы другой ступені прадастаўлялася права выкладання ў сельскіх школах раёна. 27 выпускнікоў пайшлі працаваць настаўнікамі. У іх ліку былі Георгій Балахон, Ефрасіння Баранава, Яфім Кандраценка, Софія Мяшкоўская, Ефрасіння Пуранок, Аніcся Скараход і іншыя. Брагінская школа дала путёўку ў вялікае жыццё шэрагу сваіх выхаванцаў. У прыватнасці, Аляксандр Паўлючэнка з вёскі Глухавічы працяглы час працаваў міністрам сельскай гаспадаркі Таджыкскай ССР, Апанас Пятрэнка з вёскі Красная Гара стаў доктарам мінералагічных навук, акадэмікам, і іншыя.

З 1924/25 навучальнага года ў школах Брагіншчыны і Камарыншчыны ажыццяўляліся мерапрыемствы па паляпшэнні вучэбнай работы: уводзіліся новыя праграмы, перабудоўвалася методыка выкладання, прадпрымаліся спробы цяснёй увязаць навучанне і выхаванне з жыццём. Школы першай ступені пераходзілі з трохгадовага на чатырохгадовы тэрмін навучання.

У 1925 годзе 98 працэнтаў настаўніцкіх кадраў Брагіншчыны павышалі педагагічную кваліфікацыю праз кароткатэрміновыя губернскія курсы. Настойліва ўдасканальвалі сваё майстэрства, паспяхова прымянялі ў практычнай рабоце пачэрпнутыя на курсах веды настаўнікі Ганна Кірылаўна Пятровіч, Вера Будрык, Аляксандра Якаўлеўна Джажора, Аляксей Дубровскі, Назар Мяфодзьевіч Ефіменка, Ніна Апанасаўна Нікіценка, Марк Восіпавіч Новік, Фёдар Пракаповіч, Іван Разанскі, Міхаіл Міхайлавіч Суханаў, Алена Міхайлаўна Фешчанка, Міхаіл Фешчанка і іншыя.

У сярэдзіне 20-х гадоў у вёсцы з'явіўся новы тып школ — школы сялянскай моладзі (ШСМ) з трохгадовым тэрмінам навучання на базе пачатковай школы. Яны былі створаны ў Брагіне, Камарыне, у вёсках Астрагляды, Верхнія Жары, Краснае, Крыўча, Мікулічы, Новая Ёлча, Савічы, Чамарысы. Агульная адукацыя ў ШСМ спалучалася з вывучэннем асноў аграномii і заатэхніі, з замацаваннем атрыманых ведаў у практычнай рабоце на прышкольных участках.

Аднак наяўная сетка школ не забяспечвала магчымасць сесці за парты ўсім дзецям школьнага ўзросту, хоць за 1925—1926 гады былі пабудаваны новыя школы ў Камарыне, Гдзені, Круках, Ніжніх Жарах, Ясянях, Бераснёўцы, Чамарысах, Спарыжжы. Вялікая заслуга ў гэтым была мясцовых архітэктараў Георгія Плескачэўскага (Камарын) і Кірылы Каўрова (Брагін). У асноўным па іх праектах і пад іх непасрэдным кантролем узводзіліся школьныя будынкі.

У Брагінскім раёне, паводле перапісу 1926 года, налічвалася 9 тысяч дзяцей 7—9-гадовага ўзросту, а вучыліся толькі 4300. Школы другой ступені (Брагін, Камарын, Савічы) сталі шырока даступнымі для ўсіх дзяцей, але колькасць іх была недастатковай — усяго адна на 40 школ першай ступені.

Згаданы тут перапіс сведчыў і аб нядрэнных выніках наступу на непісьменнасць. За перыяд ад яго пачатку ўзровень пісьменнасці сельскага насельніцтва ў раёне дасягнуў 45,2 працэнта. Аднак значнай заставалася колькасць

жанчын, якія па-ранейшаму не ўмелі чытаць і пісаць.

Ажыццяўляючы мерапрыемствы культурнай рэвалюцыі, Савецкі ўрад прыняў у 1925 годзе рашэнне аб увядзенні ў бліжэйшыя гады ў краіне ўсеагульнага абавязковага навучання. Крайнім тэрмінам ажыццяўлення ўсенавучу намячаўся 1933/34 навучальны год. Аднак, зыходзячы з указанняў XVI з'езда ВКП(б), УЦВК СССР у жніўні 1930 года прыняў закон аб увядзенні з 1930/31 навучальнага года абавязковай пачатковай адукацыі. Праведзеная вялікая падрыхтоўчая работа дазволіла паспяхова выканаць гэтую адказную задачу. Калі па праведзеным на Брагіншчыне школьным перапісе 1927—1928 гадоў фактычны ахоп навучаннем дзяцей школьнага ўзросту складаў 66,9 працэнта[1], то к канцу 1930 года ў пачатковых школах ужо навучалася 98 працэнтаў дзяцей.

Прыкметную ролю ў выкананні закона аб усенавучы, умацаванні школы на Брагіншчыне адыгралі настаўнікі школ: Малажынскай — Ульян Аляксандравіч Гацка, Калыбанскай — Міхаіл Пятровіч Баранаў, якія ў далейшым сталі генераламі Чырвонай Арміі, Астраглядаўскай — Кулакоўская-Газарэвіч, якая стала доктарам матэматычных навук, Буркоўскай — Аляксандр Ігнатавіч Шкурко, які стаў доктарам юрыдычных навук, і іншыя.

У 1931—1932 гадах ЦК ВКП(б) і Савецкі ўрад прынялі пастанову, накіраваную на паляпшэнне работы школ. Яны перайшлі на навучанне па новых прадметных праграмах, быў уведзены цвёрды распарадак вучэбных заняткаў. Павышалася роля настаўніка як арганізатара навучальнага працэсу. Для павышэння якасці ведаў у вучэбныя планы ўключаліся пераводныя і выпускныя экзамены.

Для азнаямлення са станам спраў у 1932 годзе Брагінскі і Камарынскі раёны наведаў Старшыня ЦВК БССР А. Р. Чарвякоў. Кіраўнік урада рэспублікі меў сустрэчы з актывам, у тым ліку педагогамі, у Брагіне, Камарыне, Пажарках, Мікулічах, Верхніх Жарах, Круках і інш. Высокі госць з Мінска з разуменнем паставіўся да просьбаў аб садзейнічанні Брагінскаму раёну ва ўмацаванні матэрыяльнай базы народнай асветы і культуры, якія ўтрымліваліся ў выступленні тагачаснага сакратара райкама партыі І. П. Каржа на раённым сходзе актыву.

У Брагіне А. Р. Чарвякоў наведаў кватэру мясцовага настаўніка Максіма Джажоры, пра якога чуў як пра аўтара праекта школьнага падручніка па фізіцы.

Вынікі развіцця народнай асветы на тэрыторыі Брагіншчыны да канца другой пяцігодкі (1933—1937) характарызуе табліца, якая ілюструе расшырэнне школьнай сеткі і павелічэнне колькасці навучэнцаў у 1927—1938 гадах.

Паказчыкі	Навучальныя гады		
	1927/28	1932/33	1937/38
Агульная колькасць школ	63	76	98
у тым ліку:			
пачатковых	60	65	62
няпоўных сярэдніх	2	9	30
сярэдніх	1	2	5
Агульная колькасць вучняў	5200	9800	13 700
Агульная колькасць настаўнікаў	330	590	786

Такім чынам, за дзесяцігоддзе колькасць школ на Брагіншчыне павялічылася амаль утрая. Асабліва прыкметна ўзрасла колькасць няпоўных сярэдніх (сямігадовых) і сярэдніх школ. Колькасць навучэнцаў і настаўнікаў павялічвалася больш чым у два разы. На Брагіншчыне ўжо ў другой пяцігодцы фактычна ажыццяўлялася ўсеагульнае сямігадовае навучанне.

За дасягнутыя поспехі ў навучальна-выхаваўчай рабоце ЦВК СССР у 1939 годзе адзначыў групу перадавых настаўнікаў краіны. З ліку педагогаў Брагіншчыны і Камарыншчыны былі ўзнагароджаны: ордэнам Працоўнага Чыр-

[1] Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Статыстычная справаздача, 1929 г. Спр. 17. Л. 89.

Перадваенны выпуск Брагінскай сярэдняй школы. 18 чэрвеня 1941 г.

вонага Сцяга — настаўніца, пазней дырэктар Крыўчанскай сярэдняй школы Анастасія Клімкіна, медалём «За працоўную адзнаку» — настаўніца Верхнежараўскай сямігадовай школы Вольга Чарэнька і іншыя.

У перадваенныя гады шырокім фронтам вялася работа па расшырэнні школьнай сеткі, умацаванні яе вучэбна-матэрыяльнай базы, павышэнні ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню і педагагічнага майстэрства выкладчыкаў. Дастаткова сказаць, што ў 1940 годзе на Брагіншчыне ў яе цяперашніх межах дзейнічалі 103 агульнаадукацыйныя школы (без уліку школ рабочай і сельскай моладзі), у тым ліку 8 сярэдніх, 33 сямігадовыя і 62 пачатковыя. У іх працавалі 556 педагогаў, якія вялі навучанне і выхаванне 7800 вучняў. З дашкольных устаноў налічвалася 16 дзіцячых ясляў-садоў.

За поспехі ў павышэнні якасці ведаў навучэнцаў, паляпшэнні выхаваўчай работы Камарынскаму раёну ў 1940 годзе ўручаны пераходны Чырвоны сцяг Наркамата асветы БССР, група настаўнікаў, кіраўнікоў школ прэміравана каштоўнымі падарункамі. У ліку іх дырэктары школ Андрэй Вінер (Кірава), Назар Ефіменка (Верхнія Жары), Віктар Цэх (Чыкалавічы), Міхаіл Шульга (Крукі), настаўнікі Міхаіл Савіцкі (Крукі), Пётр Смалянаў (Камарын) і іншыя.

Высокім педагагічным майстэрствам і глыбокімі ведамі вызначаліся настаўнікі Камарынскай сямігадовай школы Яўген Бобаў, Пётр Смалянаў, Фёдар Кузняцоў, Васіль Прымакоў, Крукаўскай сямігадовай — Уладзімір Карпаў (будучы пісьменнік), Мікалай Савіцкі, Калыбанскай — Іван Кацуба, Чыкалавіцкай — Віктар Цэх, Асарэвіцкай — Мі-

хаіл Жарскоў, Брагінскай сярэдняй — Дзмітрый Емяльяиаў, Сцяпан Нікіціи, Чамярыскай — Сяргей Стрыбульскі і іншыя.

З першых дзён вайны ў рады дзеючай Чырвонай Арміі пайшлі больш як дзве трэці настаўнікаў прызыўных узростаў. Частка педагогаў разам са сваімі сем'ямі эвакуіравалася ў глыбокі тыл, самаддана працавала там у школах, на фабрыках і заводах. Іх старанная праца ў імя перамогі над ворагам у шэрагу выпадкаў высока ацэнена Радзімай. У прыватнасці, настаўнік Камарынскай сярэдняй школы Пётр Смалянаў за самаадданую працу на Чалябінскім танкавым заводзе ўзнагароджаны ордэнам Леніна. Былыя настаўніцы Марыя Мінкіна і Софія Пекуроўская, рабочыя Магнітагорскага авіяцыйнага і Новасібірскага патроннага заводаў, адзначаны ордэнам Айчыннай вайны і іншыя.

Многія настаўнікі, якія знаходзіліся на акупіраванай ворагам тэрыторыі, удзельнічалі ў падпольнай патрыятычнай дзейнасці. У прыватнасці, у ліку членаў Савіцкай і Брагінскай падпольных арганізацый былі Лідзія Абушэнка, Савелій Рэпчанка, Матрона Седранок і іншыя. У радах партызан змагаўся з ворагам настаўнік Бядуля, партызанскай сувязной з'яўлялася былая піянерважатая Чамярыскай школы Вольга Іванаўна Корхава, якая падчас вайны выратавала параненага партызанскага камісара Я. Р. Садавога.

Некалькі даваенных настаўнікаў загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі. У іх ліку члены Савіцкай падпольнай патрыятычнай арганізацыі даваенны дырэктар Верхнежараўскай школы Н. М. Ефіменка, настаўніца Сцепаноўскай школы Г. П. Сайкова, сем'і настаўнікаў Мікуліцкай школы І. В. Здараўца, Астраглядаўскай школы А. А. Кунцэвіча, дырэктар Крукаўскай школы М. І. Шульга і іншыя. Усяго гітлераўцы загубілі на Брагіншчыне і Камарыншчыне 87 настаўнікаў і настаўніцкіх сем'яў.

І. Ф. Ганжураў

З маладым запалам

У 30-х гадах Брагінская раённая камсамольская арганізацыя налічвала 350—400 чалавек.

Галоўным асяродкам саюзнай і масава-палітычнай работы моладзі былі вясковыя хаты-чытальні і бібліятэкі, клубы пралетарскай культуры. На работу ў іх камсамольскія ячэйкі накіроўвалі найбольш пісьменных і ініцыятыўных сваіх членаў. У ліку такіх былі загадчыкі хат-чытальняў у в. Новы Макрэц Марыя Сакоўская, у в. Буркі Фёдар Шкурко і іншыя. Арганізатарам мастацкай самадзейнасці пры Камарынскім Доме пралетарскай культуры з'яўляўся камсамолец Ліна Панчэшнікаў. Ён жа і яго сябры Р. Газанцвей, А. Каплан, Я. Качэўскі, А. Кніжнік, А. Пінчук, Ю. Шайкевіч крыху пазней з'яўляліся ініцыятарамі стварэння ў Камарыне абаронных гурткоў і правядзення розных мерапрыемстваў па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі.

Калі калгасы і саўгасы пачалі атрымліваць на ўзбраенне трактары і іншыя складаныя сельгасмашыны, паўстала пытанне аб падрыхтоўцы механізатарскіх кадраў. У 1934-м і затым у 1936 гадах рашэннямі Брагінскага і Камарынскага райкамаў камсамола на курсы трактарыстаў была накіравана вялікая група моладзі, у тым ліку 30 дзяўчат. З часткі гэтай групы затым была сфарміравана першая ў Брагінскім раёне жаночая трактарная брыгада. Узначаліла яе камсамолка з калгаса імя Тэльмана, член бюро райкама ЛКСМБ (1936) Н. П. Нэпава.

Актыўна праявілі сябе многія камсамольцы і ва ўмацаванні мясцовых органаў улады. Найбольш пісьменныя і актыўныя маладыя людзі накіроўваліся райкамамі камсамола на пасады старшыняў і сакратароў сельскіх Саветаў дэпутатаў працоўных. Яшчэ ў 1921 годзе камсамолец Міхаіл Даніленка ўзначаліў выканкам Капоранскага сельсавета і добрасумленна працаваў на гэтай пасадзе 15 гадоў. У 1921 годзе рэка-

мендаваны старшынёй Верхнежараўскага сельсавета Міхаіл Юшчанка, сакратаром Камарынскага сельсавета — Ісак Алеўскі і іншыя. Старшынёй Крыўчаіскага сельсавета ў 1934 годзе была абрана камсамолка Алена Ціханчук.

Многія камсамольцы тагачасных Брагінскага і Камарынскага раёнаў з высокай самаадданасцю працавалі на ўзвядзенні Камсамольска-на-Амуры, Днепрагэса, Кузбаса, Магніткі, заводаў сельскагаспадарчых машын і г. д. У прыватнасці, у 1929 годзе па пуцёўцы, атрыманай у Камарынскім райкаме камсамола, паехаў на будаўніцтва Днепрагэса член ВЛКСМ э 1925 года Мікалай Грыцанок. Пасля таго прымаў удзел ва ўзвядзенні іншых ударных аб'ектаў у розных кутках краіны. Ваяваў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Да высокіх ратных узнагарод у мірны час у яго дабавіліся ордэн Леніна і ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга, якіх Мікалай Пятровіч удастоены за самаадданую працу на будаўніцтве Краснаярскай ГЭС імя У. І. Леніна.

У 1935 годзе па камсамольскай пуцёўцы паехаў з Брагіншчыны на будаўніцтва беларускай сталіцы камсамолец Пётр Агафоненка. Ён прымаў удзел у будаўніцтве акруговага Дома афіцэраў у Мінску. На будоўлях Данбаса, узвядзенні Гомсельмаша працавалі пасланцы Брагінскай раённай камсамольскай арганізацыі Пётр Гарошка, Яўсей Балобан, Ёсіп Шэхтман і іншыя. Сотні маладых энтузіястаў настойліва памнажалі грамадскае багацце на палетках і фермах калгасаў і саўгасаў. Славіліся вытворчымі здабыткамі паляводчыя камсамольска-маладзёжныя звенні А. Радчанкі з в. Петрыцкае, В. Кулая з в. Бакуны і іншыя.

На Камарыншчыне было добра вядомае прозвішча загадчыцы перадавой жывёлагадоўчай фермы, сакратара камсамольскай арганізацыі калгаса «Серп і молат» Марыі Бажанок.

Адным з прыярытэтных напрамкаў дзейнасці камсамола, яго пярвічных арганізацый у 30-я гады з'яўлялася ваенна-патрыятычнае выхаванне моладзі. Пры гэтым асаблівая ўвага ўдзялялася яе дапрызыўнай падрыхтоўцы. Служба ў радах Чырвонай Арміі для моладзі была самым ганаровым і пачэсным грамадзянскім абавязкам. У гэтым можна пераканацца з газетнай заметкі, аўтарам якой з'яўляўся член пярвічнай камсамольскай арганізацыі Камарынскага райвыканкама Кірыла Мазураў, у далейшым вядомы партыйны і дзяржаўны дзеяч.

«На мяне, прынятага сёлета ў Чырвоную Армію, лажыцца абавязак абараняць сваю радзіму,— пісаў Кірыла Трафімавіч.— Штодзённай сістэматычнай вучобай па аўладанню вайсковай тэхнікай, усебаковай фізічнай падрыхтоўкай я даб'юся таго, што буду лепшым байцом. І калі фашысцкія псы захочуць напасці на нашу вялікую радзіму, я выканаю свой ганаровы абавязак грамадзяніна СССР, са зброяй у руках стану ў першыя рады і, калі гэта спатрэбіцца, аддам сваё лепшае — жыццё ў імя вялікай радзімы...»[1]

Далейшы лёс юнака пацвердзіў глыбокую вернасць дадзенай ім клятве камсамольца-чырвонаармейца.

У перадваенныя гады па заданні ЦК ЛКСМБ Брагінскі і Камарынскі райкамы камсамола ажыццяўлялі адбор юнакоў у ваенныя лётныя вучылішчы. У ліку атрымаўшых камсамольскія пуцёўкі былі Іван Вашчанка, Яфім Лысенка, Талкачоў і іншыя.

Райкамамі камсамола сумесна з райваенкаматамі і раённымі камітэтамі Асаавіяхіма праводзіліся спаборніцтвы па праграме Усесаюзных дзён савецкага стралка, па здачы норм на значкі «Варашылаўскі стралок», «Гатоў да працы і санітарнай абароны», ваенізаваныя паходы і гульні. Наладжвалася шэфства камсамольскіх арганізацый над воінскімі часцямі. У 1935—1936 гадах у гаспадарках, у тым ліку ў калгасах «Новы свет», «Парыжская камуна», «Серп і молат» і інш., ствараліся эскадроны варашылаўскіх коннікаў. Зведзеныя затым у полк варашылаўскіх коннікаў, яны прымалі ўдзел у спаборніцтвах, якія заканчваліся парадам. Адзін

[1] Калгасны сцяг, 1936. 20 верас.

з іх у 1935 годзе прымаў камандзір 37-й стралковай дывізіі, будучы вядомываеначальнік І. С. Конеў. Брагінскі раён шэфстваваў тады над 111-м стралковым палком гэтай дывізіі, што дыслацыравалася ў Рэчыцы.

Некаторыя выхаванцы камсамольскіх арганізацый Брагінскага і Камарынскага раёнаў вызначыліся ў 1937—1939 гадах у баях супраць іспанскіх і італа-германскіх фашыстаў, змагаючыся ў радах інтэрбрыгадаўцаў. У прыватнасці, у 1937 годзе ў рэвалюцыйнай Іспаніі ваяваў камандзір танкавай роты Васіль Скідан, адзначаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонаіі Зоркі за подзвігі ў далёкай краіне.

Сотні камсамольцаў нашых мясцін адважна змагаліся з ворагамі падчас ваенных канфліктаў 30-х гадоў. Так, у баях з японскімі агрэсарамі на возеры Хасан вызначыліся Фёдар Данчанка з в. Буркі, Міхаіл Касцючэнка з в. Сабалі, Сяргей Леўчанка з Камарыншчыны і іншыя. Адважна ваяваў на савецка-фінляндскім фронце сакратар Брагінскага РК ЛКСМБ у 1934—1936 гадах Ціхан Капур, загінулі ў тых баявых дзеяннях маладыя воіны Іван Кавальчук з в. Міхалёўка, Іван Кандраценка з в. Кавака, Агей Краўчанка, Аляксей Рабянок і Макар Рак з в. Катловіца, Пётр Паўленка з в. Гдзень і іншыя.

Загадчык гаспадаркі «Чэлюскіна»

Магілевіч Барыс Рыгоравіч, удзельнік савецкай палярнай экспедыцыі 1933—1934 гг. на параходзе «Чэлюскін». Нарадзіўся ў 1906 г. у м. Брагін. Трагічна загінуў 13.2.1934 г. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У жніўні 1933 года пабудаваны ў Даніі вялікі параход «Чэлюскін» выйшаў з Мурманска ў далёкую і небяспечную дарогу. Мэтай гэтай першай савецкай палярнай экспедыцыі было — прайсці за адну навігацыю ва Уладзівасток па трасе Паўночнага марскога шляху. У кастрычніку таго ж года «Чэлюскін» падышоў да Берынгава праліва, дзе быў скаваны льдамі і вынесены імі ў Чукоцкае мора. 13 лютага 1934 года, раздаўлены велізарнай сілай лядовага напору, ён затануў. Члены экіпажа высадзіліся на лёд і затым былі выратаваны лётчыкамі.

Адным з удзельнікаў вялікага і смелага штурму Паўночнага марскога шляху быў ураджэнец Брагіна Барыс Рыгоравіч Магілевіч, які разам з усімі членамі экіпажа стойка пераносіў усе нягоды непрадбачанага 104-дзённага дрэйфу па Берынгавым праліве. Загадчык вялікай і складанай гаспадаркі «Чэлюскіна», Барыс Рыгоравіч забяспечваў людзей усім неабходным для нармальнай жыццядзейнасці і правядзення навуковых назіранняў.

Вясной 1934 года сталіца нашай Радзімы — Масква ўрачыста сустракала чэлюскінцаў. Але сярод герояў легендарнага паходу па Паўночным марскім шляху, дрэйфу на льдзіне не было аднаго чалавека — Б. Р. Магілевіча. Месца гібелі гэтага судна-волата стала і яго вечнай магілай. Наш зямляк загінуў у дзень катастрофы 13 лютага 1934 года.

З кнігі Б. Громава «104 на дрейфующей»

...Паники не было, работали дружно, организованно, отдавали последние силы общему делу. В сумерках, которые быстро сгущались, «Челюскин» глубже и глубже оседал в воду, сильно задирая кверху корму.

— Все на лед! — скомандовал В. И. Воронин (капітан судна. — *І. Г.*).

Те, кто был около форштевня, сошли спокойно, но тем, кто находился на корме, пришлось прыгать. Последними покинули корабль О. Ю. Шмидт (начальнік экспедыцыі. — *І. Г.*) и капитан.

Казалось, что все уже внизу. И вдруг на корме, среди груды сваленных ящиков, показался завхоз.

— Прыгай, Борис, прыгай! — кричали ему.

Да! Ему необходимо было, не медля, прыгать. Но Борис наверное растерялся. И в этот момент произошло страшное. С шумом и гулом в передние трюмы парохода ворвался поток воды. С треском ломался металл. «Челюскин» сделал резкий крен на форштевень, высоко задрав корму, оголив на момент руль и лопасти гребного винта.

Бочки, находившиеся на корме, по инерции посунулись вниз, и мы со страхом увидели, как

они налетели на одинокую фигуру нашего товарища. На секунду в тумане мелькнула вытянутая вверх его рука и исчезла... Бориса Могилевича мы больше не видели.

ЗА ГАЗЕТНЫМ РАДКОМ

Брагінская раённая газета выдаецца з 19 лютага 1932 г. на беларускай мове. У 1932—1961 гг. называлася «Трыбуна калгасніка», орган Брагінскага РК КП Беларусі і райсавета. З 1 ліпеня 1961 г. па 21 красавіка 1962 г.— «Прамень камунізма», орган парткама Брагінскага калгасна-саўгаснага ўпраўлення і райсавета, з красавіка 1962 г.— «Трыбуна калгасніка», з лютага 1965 г.— «Маяк Палесся». У гады Вялікай Айчыннай вайны (з 14 жніўня 1941 г. па 2 снежня 1943 г.) не выдавалася. З 1990 г. выдаецца на беларускай і рускай мовах.

Камарынская раённая газета выдавалася з 11 красавіка 1931 г. на беларускай мове. У 1931—1938 гг. называлася «Калгасны сцяг», орган Камарынскага РК КП Беларусі і райсавета. З 23 чэрвеня 1938 г. па 15 жніўня 1941 г.— «Шлях да камунізму», з 14 кастрычніка 1943 г. па сакавік 1966 г.— «За Радзіму». У гады Вялікай Айчыннай вайны (з 15 жніўня 1941 г. па 14 кастрычніка 1943 г.) не выдавалася. Спыніла існаванне ў сакавіку 1966 г. у сувязі са скасаваннем Камарынскага раёна.

Па старонках брагінскай раённай газеты «Трыбуна калгасніка»

Чытаем мастацкую літаратуру

1 студзеня 1935 г.

28 снежня адбылося пасяджэнне штаба пры райкоме па правядзенню паходу за асваенне мастацкай літаратуры. Штаб вызначыў арганізаваць гурткі па чытанню мастацкай літаратуры ў 35 буйнейшых калгасах нашага раёна...

Вызначана, як мінімум, прачытаць і распрацаваць у гуртках наступныя творы: «Маці» Максіма Горкага, «Чапаеў» Фурманава, «Паднятая цаліна» М. Шолахава, «Дрыгва» Якуба Коласа, «Над ракой Арэсай» Янкі Купалы, «Сполах на загонах» П. Галавача...

Уключаюся

11 красавіка 1935 г.

Я ўключаюся ў конкурс на выхаванне сваіх дзяцей у камуністычным духу. Бяру на сябе абавязацельствы прадставіць сваім 2 дзецям асобны пакой, асобныя ложкі, зубны парашок і мыла, асобныя ўціральнікі, раз у пяцідзённу перамяняць бялізну і інш. Усё гэта я ўжо выконваю.

Выклікаю паследаваць майму прыкладу ўсіх матак нашага калгаса. Будзем лепш, па камуністычнаму выхоўваць сваіх дзяцей.

Краўчанка Ульяна,
калгасніца калгаса імя Кірава

Сустрэча ардэнаносца

7 студзеня 1936 г.

З вялікім захапленнем калгаснікі, усе працоўныя нашага раёна сумесна з прадстаўнікамі раённых арганізацый сустрэлі ўзнагароджанага ЦВК Саюза ССР ордэнам «Знак Пачота» Кулая Васіля Фёдаравіча, які вярнуўся з нарады перадавікоў ураджайнасці па зярну, трактарыстаў і машыністаў малатарань з кіраўнікамі партыі і ўрада...

...Па прыезду ўзнагароджанага, у калектыве быў скліканы сход, на якім калгаснікі віншавалі свайго ардэнаносца доўгімі, бурнымі апладысментамі...

Зубар Хадоска пабіла ўсесаюзны рэкорд

9 студзеня 1936 г.

Знатныя людзі калгаснай вытворчасці — старшыні перадавых калгасаў, брыгадзіры і стахановцы, рабочыя і работніцы Малейкаўскага крухмальнага завода 19 студзеня сустракалі лепшую стахановку, пабіўшую ўсесаюзны рэкорд па выпрацоўцы крухмалу на цэнтрыфугах, удзельніцу трэцяга пленума Піўпаткрахпрам і ўзнагароджаную каштоўным падарункам.

У гонар ініцыятара стаханаўскага руху на заводзе Зубар Хадоскі быў арганізаваны вечар з удзелам знатных людзей завода, суседніх калгасаў і прадстаўнікоў раёна...

Уносім 150 рублёў на дапамогу іспанскім жанчынам

20 лістапада 1937 г.

Мы, настаўніцы Брагінскай поўнай сярэдняй школы, горача падтрымліваем заклік работніц Трохгорнай мануфактуры імя Дзяржынскага аб дапамозе дзецям і мацерам працоўных Іспаніі.

Мы сваім калектывам уносім на дапамогу іспанскім жанчынам 150 рублёў і заклікаем паследаваць нашаму прыкладу ўсіх жанчын Брагінскага раёна.

Трактарысты — стаханаўцы

29 мая 1940 г.

Па-стаханаўску працуюць трактарысты 8-й брыгады Брагінскай МТС т. Юнах Бенядзікт і Федарэнка Рыгор на асушцы балот і падняцці цаліны.

Кругласутачна працуючы на падняцці цаліны ў калгасе «Чырвоная ніва» Лубяніцкага сельсавета, трактарамі ХТЗ «НАТІ» яны зменную норму выпрацоўкі выконваюць на 200 працэнтаў.

Удзельнікі Усесаюзнай выстаўкі

29 студзеня 1940 г.

У 1939 годзе дэманстравалі свае дасягненні на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве калгасы імя Тэльмана, «2-я пяцігодка» Брагінскага пасялковага Савета, «Чырвоны партызан» Малажынскага сельсавета, атрымаўшыя добрыя ўраджаі збожжавых, бульбы, табаку.

Па старонках камарынскай раённай газеты «Калгасны сцяг»

Мацуем абароназдольнасць краіны

28 верасня 1935 г.

— Мы павінны ганарыцца тым, што дзяржава купляе ў нас хлеб. Продажам лішкаў хлеба мы ўмацоўваем абароназдольнасць нашай краіны, — заявілі на агульным сходзе калгаснікі калгаса «Парыжская камуна» таварышы Кульпа і Сізаненка Піліп.

Агульны сход калгаснікаў пастанавіў: прадаць дзяржаве з калгаснага фонду 6 тон хлеба і з кожнага працадня калгасніка па 250 грамаў.

В. Дукорскі

370 лямпачак Ільіча

7 лістапада 1935 г.

Сёння ў калгасе «Чырвоны араты» Калыбанскага сельсавета яркім святлом загарацца ў 170 калгасных хатах лямпачкі Ільіча. Электрасвятло з'явіцца ў кароўніку і канюшні. 200 калгасных хат атрымаюць электрычнае святло ў калгасе «Чырвоная Украіна» Гдзенскага сельсавета.

Радзільны дом

7 лістапада 1937 г.

Закончана будаўніцтва новага радзільнага дома ў м. Камарын. Ён разлічан на дзесяць ложкаў. Гэтым зноў такі сказваюцца велізарныя клопаты партыі і ўрада аб мацеры і дзіцяці.

Тав. Тэльман — ганаровы калгаснік

26 сакавіка 1938 г.

У дзень святкавання 67-й гадавіны Парыжскай камуны ў калгасах «Ленінскі шлях» і «Дзень калектывізацыі» Чыкалавіцкага сельсавета арганізаваны пярвічныя МОПРаўскія арганізацыі. Калгаснікі сельгасарцелі «Дзень калектывізацыі» залічылі сваім ганаровым калгаснікам правадыра германскага пралетарыята Эрнста Тэльмана.

Расюк

Прэміі за высокі ўраджай гарчыцы

21 красавіка 1938 г.

Наркамзем БССР сяголета прэміраваў рад калгасаў нашага раёна і асобных звеннявых за высокі ўраджай гарчыцы ў 1937 годзе.

Калгас «Дзень калектывізацыі» прэміраваны ў 1000 руб., «Ніжні дняпровец» і «Чырвоная Украіна» — 900 руб., «Дняпроўскі араты» — 700 рублёў і «Ленінскі шлях» — 600 рублёў.

За высокі ўраджай гарчыцы ў 1937 г. прэміраваны ў 400 рублёў звеннявы калгаса імя Сталіна Баршчоўскага сельсавета Марчанка Іван Андрэевіч.

Брагінскі раён у 30-я гады

Брагінскі раён размяшчаецца паміж 51 градусам 38 мінутамі і 52 градусамі 00 мінутамі паўночнай шырыні і 30 градусамі 00 мінутамі і 35 градусамі 35 мінутамі ўсходняй даўжыні ад Грынвіча. Раённы цэнтр — м. Брагін. Бліжэйшая чыгуначная станцыя — Хойнікі. Раён падзяляецца на 14 сельсаветаў і мяжуе з раёнамі: на поўначы — з Лоеўскім, на захадзе — з Хойніцкім, на поўдні — з Камарынскім і на ўсходзе — з Лоеўскім і УССР.

Агульная тэрыторыя раёна складае 105 426 гектараў, у тым ліку зямель сельскагаспадарчага прызначэння — 92,1 %, лясоў — 7,7 %. Зямель сельскагаспадарчага прызначэння ўжыткоўнай — 81 %, неўжыткоўнай — 9 %. Усяго насельніцтва ў раёне 44 627 чалавек. Нацыянальны склад насельніцтва ў працэнтах: беларусаў — 29,6, яўрэяў — 4,5, украінцаў — 1,9.

Па тытульным спісе ў раёне існавала 113 прадпрыемстваў, з агульнай колькасцю рабочых — 329, у тым ліку: торфарцеляў — 2, кузняў — 26, кузнечных арцеляў — 1, цагельных заводаў — 7, сталярных майстэрняў — 1, шавецкіх арцеляў — 1, кравецкіх — 1, паравых млыноў — 5, ветраных — 55, маслабойняў — 2, крупарушак — 5, конных млыноў — 4, сыра-маслазаводаў — 3, крухмальных заводаў — 1.

У 1932 годзе па раёне існавала 8 дзяржаўных, 62 кааперацыйных і 1 грамадскае, а ўсяго 71 прамысловае прадпрыемства (значная частка ветракоў не ўлічана)... Пэрсоны ўсіх гэтых прадпрыемстваў на 1.12.32 года складаў 331 чал., з іх рабочых (без вучняў і МАП) — 280 асоб, служачых — 27, апрача таго працуючых па хатах —

3 чал. Сярэдняя колькасць рабочых за 1-е паўгоддзе 1932 года склала 340 асоб. Сума асноўных фондаў была роўна 677 502 р. Калі валавая прадукцыя ў антова-адпускных цэнах адпаведнага года за 1931 год была 664 832 р., то за 1-е паўгоддзе 1932 года яна ўжо складала 330 653 р. Шэсць прадпрыемстваў мелі рухавікі.

Асноўнымі прадпрыемствамі раёна ў 1932 годзе былі: крухмальны завод з лікам рабочых у сярэднім за паўгоддзе 1932 года — 28 і валавой прадукцыяй за гэты час у цэнах 1926—1927 гадоў — 190,8 тыс. р.; абутковая арцель з лікам рабочых 68 і валавой прадукцыяй у 94,0 тыс. р.

Спажыўкааперацыя мае 11 сельпо з гандлёвай сеткай у 56 адзінак, пайнікаў — 11 466 чал.

Сельская гаспадарка спецыялізуецца ў жывёлагадоўча-канапляным напрамку. Саўгасаў — 1 («Астрагляды»), з малочна-жывёлагадоўчым напрамкам, з тэрыторыяй 649 га і 79 раб.

У раёне налічваецца 7971 гаспадарка, з якіх на 1.12.1933 года калектывізавана 3722, што складае 46,7 %. Усяго калгасаў у раёне 31, якія па плошчы сенажаці займаюць 53,7 %. У калгасах ёсць наступныя фермы: СКТ — 20, з агульнай колькасцю пагалоўя на 1.1.33 года — 1474, малочна-таварных — 21, з пагалоўем на 1.1.33 года — 1618; па вырошчванні маладняка (цялят) — 30, з пагалоўем на 1.1.33 года — 1054.

У калгасах налічваецца наступная колькасць складаных сельгасмашын: сенакасілак — 30, конных грабляў — 54, жняярак-самакідак — 84, снапавязалак — 2, бульбакапалак — 8, сеялак радковых — 71, трактароў — 9, складаных малатарняў — 24.

Пасяўная плошча раёна ў 1932 годзе складала 33 195 га, у тым ліку пад зерневымі культурамі — 67,5 %, пад бульбай 17,9 %, пад тэхнічнымі культурамі — 5,5 %, палявымі травамі — 5,6 % і інш. — 3,5 %.

Нарыхтоўкі 1932 года на 1.1.1933 года далі наступныя лічбы ў тонах: ільновалакна — 120, ільнасемя — 152, канапель — 153, саломы — 390...

Сетка навучальных устаноў раёна на 1.1.33 года: тэхнікумаў — 1, у ім студэнтаў — 146, 4-годак — 48, у іх настаўнікаў — 97, вучняў — 4013, ШКМ — 11, у іх настаўнікаў — 83, вучняў — 3384.

Працэнт пісьменнасці раёна — 92.

Партарганізацыя складаецца з 13 ячэек, з агульнай колькасцю камуністаў — 206, з іх членаў КП(б)Б — 124, кандыдатаў — 82. Камсамольская арганізацыя раёна складаецца з 46 ячэек, з агульнай колькасцю камсамольцаў — 642.

У раёне выдаецца газета «Трыбуна калгасніка».

Камарынскі раён у 30-я гады

Размяшчаецца Камарынскі раён паміж 51 градусам 16 мінутамі і 51 градусам 39 мінутамі паўночнай шырыні і 29 градусамі 54 мінутамі і 30 градусамі 39 мінутамі ўсходняй даўжыні ад Грынвіча. Раённы цэнтр — м. Камарын. Бліжэйшая чыгуначная станцыя — Камарын на чыгуніцы Чарнігаў — Оўруч. Раён падзяляецца на 15 сельсаветаў, у тым ліку 4 нацыянальных (украінскіх)...

Агульная тэрыторыя раёна 98,635 га, у тым ліку зямель сельскагаспадарчага прызначэння 83,8 %, лесу — 16,1 %...

Усяго насельніцтва ў раёне 26 059 чал. Нацыянальны склад насельніцтва раёна ў працэнтах: беларусаў — 54,51, яўрэяў — 3,69, палякаў — 0,35, украінцаў — 23,76, латышоў — 0,51, іншых — 17,8 %.

Па тытульным спісе 1931 года ў раёне налічваецца 14 прадпрыемстваў, з агульнай колькасцю рабочых — 136. Сярод прадпрыемстваў былі: цагельных заводаў — 5, цагельных арцеляў — 1, дрэваапрацоўчая-сукнавальная арцель — 1, шавецкая арцель — 1, кравецкая арцель — 1, паравых млыноў — 3, крухмальны завод — 1, сенапрасавальны завод — 1.

У 1932 годзе ў раёне ўжо існавала 7 дзяржаўных і 39 кааперацыйных, а ўсяго 46 прамысловых прадпрыемстваў, з агульнай колькасцю рабочых — 136... Пэрсоны ўсіх гэтых прадпрыемстваў на 1.12.32 года налічваў 363 чал., у тым ліку рабочых (без вучняў і МАП) — 331 і служачых — 25, апрача таго працуючых дома — 1. Сярэдняя колькасць рабочых за І-е паўгоддзе 1932 года — 320. Сума асноўных фондаў — 113 321 р. Калі валавая прадукцыя ў адпускных цэнах адпаведнага году за 1931 год была 415 271 р., то толькі за 1-е паўгоддзе 1932 года яна ўжо складала 257 459 р. Адно прадпрыемства мела рухавік.

Асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі раёна ў 1932 годзе з'яўляліся: арцель «Савецкі будаўнік» у м. Камарын, з лікам рабочых у сярэднім за паўгоддзе 1932 — 1933 гг. 47 чал. і валавой прадукцыяй за гэты ж час у цэнах 1926—1927 гг. — 300 тыс. р.; сенапрасавальны завод у м. Камарын, з лікам рабочых — 98 і валавой прадукцыяй 9986 тыс. р.

Спажыўкааперацыя раёна мае 10 сельпо з гандлёвай сеткай у 41 адзінку. Пайнікаў — 8264.

Карысныя выкапні ў раёне не выяўлены.

Агульная плошча балот — 549 га.

Сельская гаспадарка раёна спецыялізуецца ў жывёлагадоўча-канапляводчым напрамку. У раёне ёсць 3 саўгасы: «Молатаў» з малочным напрамкам, плошча сенажаці якога 5230 га, агульны лік рабочых — 123, буйной рагатай жывёлы — 514; «Камарын», з лугавой спецыялізацыяй, агульны лік рабочых — 91 і трактарны парк у 3 трактары.

У раёне 4497 гаспадарак, з іх на 1.1.33 года калектывізавана 2287, што складае 50,9 %.

Усяго калгасаў у раёне — 36. У калгасах ёсць наступныя фермы: свінаводных — 12, з агульнай колькасцю пагалоўя на 1.11.32 года — 700, МТФ — 13, з агульнай колькасцю пагалоўя на 20.12.1932 года — 2797; па вырошчванню маладняку (цялят) — 11, з пагалоўем на 1.9.1932 го-

да — 1325, і каняводная — 1, з агульнай колькасцю коней — 51.

У калгасах раёна... складаных машын: сенакасілак — 29, конных грабляў — 32, жняярак-самакідак — 47, снопавязалак — 2, бульбакапалак — 2, сеялак радковых — 35, складаных малатарняў — 4.

Пасяўная плошча раёна складала ў 1932 годзе — 16 718 га, у тым ліку пад зерневымі — 63,0 %, пад бульбай — 21,0 %, тэхнічнымі культурамі — 9,6 % і пад травамі — 2,5 %.

Загатоўкі 1932 года па раёне на 1.11.1933 года далі наступныя лічбы ў тонах: ільновалакна — 29, пянькі — 20, ільнасемя — 51, канапель — 30, саломы — 454.

Сетка навучальных устаноў раёна на 1.1.1933 года была наступная: 23 чатырохгодкі, у іх настаўнікаў — 50, вучняў — 1649. ШКМ — 10, у іх настаўнікаў — 56, вучняў — 2191.

Працэнт пісьменнасці ў раёне — 94.

Партыйная арганізацыя раёна складаецца з 19 ячэек, з агульнай колькасцю камуністаў 169, з іх членаў КП(б)Б — 108 і кандыдатаў — 61. Камсамольская арганізацыя раёна складаецца з 27 ячэек, з агульнай колькасцю ў іх камсамольцаў — 368.

У раёне выходзіць газета «Калгасны сцяг».

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Усе раёны БССР. Мн., 1933. С. 260—263.

Матэрыялы на с. 146—152 падрыхтаваў

І. Ф. Ганжураў

На зыходзе 30-х...

У 1938 г. адбыліся выбары ў Вярхоўны Савет СССР і Вярхоўны Савет БССР. Па Рэчыцкай выбарчай акрузе дэпутатам Савета Саюза вышэйшага органа ўлады краіны быў абраны военачальнік Р. І. Кулік, у Савет Нацыянальнасцей — працаўнік Ровен-Слабодскага сельсавета Рэчыцкага раёна А. І. Мацюшэнка.

Рэспубліканскія выбары праводзіліся на аснове Новай Канстытуцыі Беларускай ССР, прынятай Надзвычайным XII Усебеларускім з'ездам Саветаў у лютым 1938 г. Прадстаўнікамі ў Вярхоўны Савет БССР былі абраны намеснік старшыні Брагінскага райвыканкама, актыўны ўдзельнік грамадзянскай вайны С. А. Таміловіч-Данчанка і свінарка калгаса «III-ці Інтэрнацыянал» Камарынскага раёна М. В. Петруненка. А на выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных у снежні 1939 г. дэпутацкі мандат у Палескі абласны Савет атрымала звеннявая — стаханаўка з калгаса «XVIII партз'езд» Крыўчанскага сельсавета Ф. Ц. Чубса.

Хоць на агульным фоне ўпэўненага ўмацавання народнагаспадарчай сферы краіны дасягненні Брагіншчыны і Камарыншчыны ў 30-я гады былі даволі сціплымі, аднак яны мелі немалаважнае значэнне для мясцовай эканомікі, жыцця брагінцоў і камарынцаў. Бо закладвалі надзейную аснову для далейшага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Як сведчаць тагачасныя публікацыі ў газетах абодвух раёнаў, за гады перадваенных пяцігодак, акрамя згаданых раней аб'ектаў, пабудаваны Ялчанскі крухмальны завод № 8, саўгас імя Молатава (у далейшым «Пасудава») на асушаных тарфяніках, 6 млыноў. У 1939 г. уведзены ў эксплуатацыю торфазавод «Брагінскі», на якім працавалі 80 рабочых, а за сезон выраблялася 4000 тон сухога кавалкавага торфу.

У 1939 г. на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы дэманстравалі свае вытворчыя дасягненні калгасы імя Тэльмана Малейкаўскага, «Другая пяцігодка» — Брагінскага, «Чырвоны партызан» Малажынскага Саветаў. Напрыклад, у «Другой пяцігодцы» збіралі па 16,3 цэнтнера зерневых, 160 цэнтнераў бульбы, 39 цэнтнераў табакі і інш.

Па выніках другой пяцігодкі вялікая група перадавікоў розных галін народнай гаспадаркі ў 1939 г. была адзначана высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. У ліку ўзнагароджаных ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга былі настаўніца Крыўчанскай сярэдняй школы Клімкіна Анастасія Аляксееўна і брыгадзір калгаса «Чырвоны працаўнік» (в. Бакуны) Кулай Андрэй Якаўлевіч. А ў апошнім перадваенным годзе вышэйшай узнагароды краіны — ордэна Леніна — удастоіўся калектыў адной з лепшых у Брагінскім раёне гаспадарак — калгаса імя Тэльмана.

Такімі былі 30-я гады ў гісторыі Брагінскага і Камарынскага раёнаў.

І. Ф. Ганжураў

Вернутыя імёны

Цяжкі Малох палітычных рэпрэсій, разгорнутых таталітарным сталінскім рэжымам на пачатку 30-х гг., перамалоў сваімі крывавымі жорнамі мільёны чалавечых лёсаў і жыццяў. Пад знішчальныя ўдары судовых органаў, а часцей за ўсё несудовых карных утварэнняў траплялі і рабочы, і калгаснік, і творчы работнік, і хатняя гаспадыня. Аб'яўленыя «ворагамі народа», «шпіёнамі», «агентамі імперыялізму», страчвалі свабоду, а часта і жыццё нявінна ачэрненыя і абылганыя людзі. Трагізм сітуацыі быў у тым, што пераважная большасць грамадзян, аслепленая фанатычнай верай у справядлівасць і законнасць грубага беззаконня ці, відаць, запалоханая рэальнай магчымасцю самім аказацца на месцы арыштаваных сваіх таварышаў, суседзяў, знаёмых, не магла зразумець, не адважвалася задацца пытаннем, з якой прычыны вакол іх раптам стала столькі многа ворагаў розных масцей.

У час рэпрэсіўных кампаній, якія супалі з перыядам прымусовай калектывізацыі або мелі месца пазней, у 1937 г., па пастановах паўнамоцнага прадстаўніцтва АДПУ па БССР, судоў, рашэнняў сельскіх і пасялковых Саветаў многія сяляне былі ілжыва прылічаны да «агентаў замежных разведак», «контрэвалюцыйнага кулацкага актыву», аб'яўлены сацыяльна небяспечнымі шкоднікамі і расстраляны або гвалтоўна высланы далёка за межы сваёй малой радзімы, загнаны за калючы лагерны дрот. Цяжкі лёс такіх вымушаных пакутнікаў раздзялілі больш чым паўтары тысячы сем'яў з Брагіншчыны і Камарыншчыны.

З таго часу прайшло больш за паўстагоддзя. Многія з рэпрэсіраваных ужо рэабілітаваны, але застаюцца яшчэ і тыя, чые лёсы дагэтуль невядомыя. Аднак працягваецца работа ў архівах, і ёсць надзея, што ўсім сумленным людзям будуць вернуты іх чэсныя імёны.

Ніжэй прыводзіцца спіс нявінна рэпрэсіраваных ураджэнцаў Брагіншчыны, чые прозвішчы сталі вядомыя ў працэсе работы над кнігай «Памяць».

Бязвінныя ахвяры палітычных рэпрэсій[1]

АСАРЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АСАРЭВІЧЫ

БЕЛЬЧАНКА Майсей Сямёнавіч, н. у 1878, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

КАНЦАВЫ Гаўрыла Іванавіч, н. у 1876, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

КАНЦАВЫ Мікіта Філімонавіч, н. у 1867, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

АСТРАГЛЯДАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АСТРАГЛЯДЫ

ЛЯЛЯЎСКІ Восіп Дзяменцьевіч, н. у 1869, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 18.10.1937 у г. Гомель.

МЯТЛІЦКІ Сяргей Васільевіч, н. у 1896, селянін. Памёр ва Усьвымлагу (Комі АССР) 14.2.1943.

РЫБІК Аляксей Пятровіч, н. у 1916. Асуджаны ў 1936, адбываў пакаранне на будоўлях у г. Камсамольск-на-Амуры. Загінуў.

ВЁСКА ВЯЗОК

ФУРС Антон Яўціхіевіч, н. у 1889, працаваў памочнікам рахункавода к-са «Прабуджэнне» Астраглядаўскага с/с. Арыштаваны 18.8.1938, памёр у месцы зняволення (Магадан) 26.6.1942.

«Помню яго жывым...»

...Той звычайны — гэта пазней яна назаве яго чорным — жнівеньскі дзень 1938-га помніць да драбніц. Уся сям'я была ў зборы — і яны з Антонам, і дзеці. Як раптам заўважылі, што да іх хаты набліжаецца міліцыянер у суправаджэнні старшыні калгаса і старшыні сельвыканкама. Можа, што трэба высветліць, падумалася, бо муж на той час супрацоўнічаў з Брагінскай раённай газетай, пісаў даволі вострыя заметкі аб калгасным жыцці.

Праўда, адразу насцярожыў вобыск. Былі перарыты, раскіданы ўсе школьныя паперы —

[1] Рэабілітаваны напрыканцы 50-х і ў 60—90-я гг.

і Настассі Мікалаеўны (яна настаўнічала), і Антона Яўціхіевіча, што бераліва захоўваліся пасля таго, як пайшоў на выслугу гадоў. Асабліва пільна праглядалася кожная рахункаводчая паперка... Вядома ж, нічога падазронага не знайшлі. Вось чаму нечакана, як стрэл, прагучала кароткае: «Збірайцеся!»

Муж, здаецца, адчуваў нешта нядобрае — перацалаваў усю сям'ю, да зямлі пакланіўся на развітанне. А Настасся Мікалаеўна заставалася спакойнай, ведала ж: яе Антону баяцца нечага. Ён чалавек паважаны ў раёне: хаця і беспартыйны, але прынцыповы, патрабавальны, дзейна змагаецца за калгасныя парадкі, шаноўны ў вёсцы — 25 гадоў тут настаўнічаў, выбіраўся і членам праўлення калгаса, і першую баразну вясной пракладваў, як самы аўтарытэтны і лёгкі на руку...

А пакуль пацягнуліся бясконцыя, поўныя няўпэўненасці дні. Каторы раз выклікаў Настассю Мікалаеўну да сябе начальнік Брагінскага райаддзела НКУС, і заўсёды яна чула яго незадаволенае: «Вы не савецкая настаўніца. Чаму пакрываеце ворага народа? Чаму не даеце патрэбных паказанняў?» А якую праўду, акрамя той, што ведалі ўсе аднавяскоўцы, яна магла паведаміць?

Час ішоў. Мінулі месяцы, а суда ўсё не было. Як гаварылі Настассі Мікалаеўне, «збіраюцца матэрыялы»...

У тую студзеньскую ноч 1939 года яна была ў Васілевічах — вярталася з санаторыя, у які праводзіла хворага сына,— чакала цягніка дамоў. Як раптам заўважыла натоўп людзей, што ўтрымліваліся асобна ад усіх, пад узмоцненым канвоем, і сярод іх да болю знаёмую фігуру Антона...

Ёй яшчэ раз давядзецца бачыць, як плачуць мужчыны. І будзе гэта ў чэрвеньскай турме, начальнік якой дазволіць Настассі Мікалаеўне спатканне з мужам. Ужо дома яна раскажа маці: «Антону далі пяць гадоў ссылкі, быццам бы на Далёкі Усход. Але, каб ты бачыла, як ён плакаў. А я нібы скамянела — ні слова з мяне, ні слязінкі». Волю свайму гору яна дасць потым, праз паўтадзіны, калі мужа забяруць. На гэты раз назаўсёды...

А потым была вайна, пасля якой Настасся Мікалаеўна атрымала медаль «За доблесную працу ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны». І яе бясконцыя хадайніцтвы аб мужу, вынікам якіх стане паведамленне аб яго смерці (незразумелай, неўспрымаемай сэрцам смерці здаровага мужчыны ў росквіце сіл). Тады яна не супакоіцца ўдвая. Будзе да канца змагацца за аднаўленне яго добрага імя. Пакуль не атрымае даведку за подпісам старшыні Ваеннага трыбунала Беларускай ваеннай акругі, у якой гаварылася: «Справа па абвінавачванні Фурса Антона Яўціхіевіча, да арышту — 18 жніўня 1938 года — працаваў памочнікам рахункавода ў калгасе, перагледжана Ваенным трыбуналам Беларускай ваеннай акругі 8 красавіка 1958 года. Пастанова ад 5 жніўня 1939 года ў адносінах Фурса А. Я. адменена, і справа з-за адсутнасці саставу злачынства спынена...»

Н. Пісарэнка

ВЁСКА МАРЫТОН

ВАЙЦАХОЎСКІ Адвм Восіпавіч, н. у 1887, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 22.11.1938 у г. Мазыр.

ПРЫМАЧЭНКА Восіп Пятровіч, н. у 1899, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 14.3.1938 у г. Гомель.

ЦІШКЕВІЧ Віктар Казіміравіч, н. у 1892, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 14.3.1938 у г. Гомель.

БРАГІНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГАРПАСЁЛАК БРАГІН

ДАВЫДОК Мяфодзій Іванавіч, расстраляны 21.7.1938 у г. Віцебск.

КРУС Канстанцін Васільевіч, н. у 1892. Расстраляны 11.10.1938.

ЛЕЙКІН Яўсей Баніфанавіч, н. у г. Ветка, жыў і працаваў у г. Брагін. Рэпрэсіраваны. Памёр у гомельскай турме 17.1.1938.

ВЁСКА КАВАКА

ЯРМОЛЕНКА Якаў Міхайлавіч, н. у 1901, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 10.9.1937 у г. Гомель.

ВЁСКА САБАЛІ

СТРЫБУК Піліп Сцяпанавіч, н. у 1861, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 10.9.1937 у г. Гомель.

ВЕРХНЕЖАРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЕРХНІЯ ЖАРЫ

БЛУДЧЫ Ксенафонт Федасеевіч, н. у 1866, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

БЛУДЧЫ Уладзімір Іванавіч, н. у 1850, займаўся сельскай гаспадаркай. Арыштаваны 4.1.1933, расстраляны 24.3.1933.

ДЗЯЦЕЛ Андрэй Мікітавіч, н. у 1897, працаваў рабочым у леспрамгасе. Арыштаваны ў студзені 1933, тады і загінуў.

КАЗЛОЎСКІ Іван Паўлавіч, н. у 1903, працаваў рабочым ва Уладзівастоку. Рэпрэсіраваны ў 30-я гг.

КОВАЛЬ Васіль Самсонавіч, н. у 1899, калгаснік. Асуджаны да расстрэлу 30.12.1937.

КОВАЛЬ Іван Цімафеевіч, н. у 1896, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 26.2.1938 у г. Мінск.

ЧАРЭНЬКА Максім Фёдаравіч, н. у 1886, калгаснік. Арыштаваны 4.1.1933. Асуджаны да расстрэлу 24.3.1933.

ЧАРЭНЬКА Савелій Фёдаравіч, н. у 1881, калгаснік. Арыштаваны 10.2.1933. Асуджаны да расстрэлу 24.3.1933.

ЧАРЭНЬКА Сцяпан Іванавіч, н. у 1900, калгаснік. Асуджаны да расстрэлу 24.3.1933.

ШУЛЬГА Іван Уласавіч, н. у 1900, селянін. Арыштаваны 4.1.1933. Прыгавораны да расстрэлу 24.3.1933.

ЮШЧАНКА Несцер Фёдаравіч, н. у 1857, селянін. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ЯЗЯНОК Іван Яўгенавіч, н. у 1877, селянін. Арыштаваны 17.9.1937. Расстраляны 16.10.1937.

ВЁСКА НІЖНІЯ ЖАРЫ

КЛІМЯНОК Анціп Андрэевіч, н. у 1860, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

СУКАЧ Васіль Гардзеевіч, н. у 1897, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ВУГЛОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВУГЛЫ

ЛЯВОНЕНКА Цімафей Іовіч, н. у 1895, займаўся сельскай гаспадаркай. Загінуў у месцы пазбаўлення волі 7.10.1937.

ВЁСКА ТАКЛІНОЎ

БУЙНЕВІЧ Мечыслаў Міхайлавіч, н. у 1906, займаўся сельскай гаспадаркай. Памёр у месцы пазбаўлення волі 20.11. 1938.

ДУБІНСКІ Антон Адамавіч, н. у 1891, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 8.10.1938 у г. Мазыр.

ДУБІНСКІ Франц Кврлавіч, н. у 1893, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 8.10.1938 у г. Мазыр.

КУЛІЦКІ Аляксандр Адольфавіч, н. у 1899, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 21.7.1938 у г. Гомель.

ШАЦІЛА Іпаліт Іванавіч, н. у 1887, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 8.10.1938 у г. Мазыр.

БЫЛЫ ГДЗЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГДЗЕНЬ

АТРОШЧАНКА Васіль Аляксандравіч, н. у 1884, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 27.5.1938.

КОЗЕЛ Васіль Селівестравіч, н. у 1888, селянін. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

КОЗЕЛ Даніла Селівестравіч, н. у 1882, працаваў на будаўніцтве моста цераз р. Днепр. У 1930 раскулачаны. Прыгавораны да расстрэлу 24.3.1933.

МАЛЬЧАНКА Іван Уладзіміравіч, н. у 1900, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 26.2.1938 у г. Мінск.

ШУЛЬГА Аўрам Кірылавіч, н. у 1866, селянін. Арыштаваны 19.9.1937, тады і расстраляны.

ЯЎСТРАЦЕНКА Макар Рыгоравіч, н. у 1892, селянін. Расстраляны 23.10.1937 у г. Гомель.

БЫЛЫ КАЛЫБАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАЛЫБАНЬ

АСІПЕНКА Сяргей Нікіфаравіч, н. у 1888, калгаснік. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ВАШЧАНКА Хадоска Мінаўна, н. у 1902, калгасніца. Расстраляна 13.3.1938 у г. Гомель.

ГАРМЕЛЬ Сямён Міхайлавіч, н. у 1887, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ГЕРАСІМЕНКА Сямён Севасцьянавіч, н. у 1888, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

КЛІМЯНОК Пётр Прохаравіч, н. у 1860, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

КРЫВАШЭЕНКА Рыгор Пракопавіч, н. у 1855, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ЛЯВОНЕНКА Фрося Яфрэмаўна, н. у 1891, займалася сельскай гаспадаркай. Расстраляна 13.3.1937 у г. Гомель.

ПЕТРУСЕНКА Фёдар Андрэевіч, н. у 1893, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ПІСЬМЕННЫ Восіп Лук'янавіч, н. у 1875, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

РАСЮК Несцер Карнеевіч, н. у 1863, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

СКІДАН Міна Аўдзеевіч, н. у 1888, займаўся сельскай гаспадаркай. Памёр 5.9.1937 у месцы зняволення.

ТРАШКУН Марфа Андрэеўна, н. у 1893, сялянка. Расстраляна 13.3.1938 у г. Гомель.

ЧЫРЫК Віктар Андрэевіч, н. у 1869, селянін. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ЧЫРЫК Мікалай Андрэевіч, н. у 1891, селянін. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ВЁСКА ПАСУДАВА

АСАДЧЫ Сідар Фёдаравіч, н. у 1877, калгаснік. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

БАРАВЕЦ Логвін Пілінавіч, н. у с. Затонскае Новашапеліцкага р-на Кіеўскай вобл., жыў і працаваў у в. Пасудава. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ІВАНЕНКА Трафім Майсеевіч, н. у 1862, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 1.11.1937.

КАСЦЮЧЭНКА Уладзімір Іванавіч, н. у 1900, жыў і працаваў у Свярдлоўскай вобл., дзе і расстраляны 12.12.1941.

ВЁСКА ЧЫКАЛАВІЧЫ

ЛІХАШАПКА Восіп Васільевіч, н. у 1906. Расстраляны 28.2.1938 у г. Мінск.

ЛЯВОНЕНКА Іван Клімавіч, н. у 1908, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ЛЯВОНЕНКА Іван Сямёнавіч, н. у 1881 у в. Калыбань, жыў у в. Чыкалавічы. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ЛЯВОНЕНКА Якаў Іванавіч, н. у 1869, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

МАЦАПУРА Іван Восіпавіч, н. у 1871, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ЧУМЕНКА Адам Аляксеевіч, н. у 1906, селянін. Расстраляны 11.1.1938 у г. Гомель.

ШПЕТНЫ Віктар Іванавіч, н. у 1910, селянін. Расстраляны 26.2.1938 у г. Мінск.

КАМАРЫНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГАРПАСЁЛАК КАМАРЫН

АСІПЕНКА Сяргей Лазаравіч, н. у 1891 на Украіне, жыў і працаваў у г. п. Камарын. Расстраляны 23.10.1937 у г. Гомель.

БАРЗМАН Ашар Шаевіч, н. у 1876. Расстраляны 14.3.1938 у г. Гомель.

ДАКТАРОВІЧ Арон-Янкель Хаімавіч, жыў і працаваў у г. п. Камарын. Рэпрэсіраваны ў 1938.

КАГАНОВІЧ Марк Навумавіч, н. у 1900. Расстраляны 3.1.1938.

КІРЫЛЕНКА Ігнат Пятровіч, н. у 1854. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

КРАЎЧАНКА Есіп Антонавіч, н. у 1866. Расстраляны 13.3.1938 у г. Гомель.

КРАЎЧАНКА Іван Міхайлавіч, н. у 1857. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ПЕТРУСЕВІЧ Нікіфар Кірылавіч, н. у 1886. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ПЛІСЕЦКІ Арон Волькавіч, н. у 1866. Расстраляны 23.10.1937.

РАЙДОХА Іван Францавіч, н. у 1884 у в. Цінец Падгунескага павета, Полыпча, жыў у Камарыне. Расстраляны 14.3.1938 у г. Гомель.

РЫМША А. Ф., н. у 1895, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і ўстанаўлення Савецкай улады ў Ялчанскай і Савіцкай валасцях. З 1921 да 1929 г. працаваў загадчыкам Камарынскай працоўнай школы 1-й ступені. Рэпрэсіраваны ў 1937.

ВЁСКА КАРЛАЎКА

ВЕТЧАНКА Іван Сцяпанавіч, н. у 1896, займаўся сельскай гаспадаркай. Рэпрэсіраваны.

ВЕТЧАНКА Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1888, селянін. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

КРУПЕЙЧАНКА Іван Георгіевіч, н. у 1898 у в. Ляды, жыў у в. Карлаўка, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 16.10.1937 у г. Гомель.

КРЫВАШЭЁНКА Анастасія Паўлаўна, н. у 1901, займалася сельскай гаспадаркай. Расстраляна 1.11.1937 у г. Гомель.

МАЙСЕЕНКА Рыгор Пятровіч, н. у 1911, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ПЕТРУСЕВІЧ Кацярына Лукаўна, н. у 1903. Расстраляна 1.11.1937 у г. Гомель.

ПЕТРУСЕВІЧ Марыя Лукаўна, н. у 1889, займалася сельскай гаспадаркай. Расстраляна 1.11.1937 у г. Гомель.

ПЕТРУСЕВІЧ Цімафей Пятровіч, н. у 1869, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ЯТЧАНКА Фёдар Васільевіч, н. у 1872, селянін. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ЯТЧАНКА Ціхан Іванавіч, н. у 1896, селянін. Расстраляны 10.2.1938 у г. Мінск.

ВЁСКА КАЦІЧАЎ

ФІЛАНЕНКА Андрэй Фёдаравіч, н. у 1879, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 23.10.1937.

ВЁСКА КІРАВА

КРАЎЧАНКА Еўдакія Андрэеўна, н. у 1890, займалася сельскай гаспадаркай. Расстраляна 13.3.1938 у г. Гомель.

ЛЕЎЧАНКА Восіп Нікадаімавіч, н. у 1877, селянін. Расстраляны 26.2.1938 у г. Мінск.

ЛЕЎЧАНКА Іван Яўгенавіч, н. у 1901, працаваў касірам ашчадкасы ў Камарыне. Арыштаваны ў верасні 1937. Памёр у лагеры 17.8.1941 у г. Ухта.

ЛЯВОНЕНКА Іван Платонавіч, асуджаны да расстрэлу 24.3.1933.

ЛЯВОНЕНКА Іван Яўгенавіч, н. у 1888, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ЛЯВОНЕНКА Павел Харытонавіч, н. у 1886, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 1.11.1938 у г. Гомель.

КРУКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЖАЛІБОР

БАРЭЦКІ Браніслаў Казіміравіч, н. у 1889, калгаснік. Рэпрэсіраваны. Памёр у месцы пазбаўлення волі 14.3.1938.

БАРЭЦКІ Людвіг Кааміравіч, н. у 1881 у в. Храпкаў Хойніцкага р-на. Расстраляны 31.5.1938 у г. Мінск.

ГРЫНЕВІЧ Іван Францавіч, н. у 1902, селянін. Расстраляны 14.3.1938 у г. Гомель.

ГРЫНЕВІЧ Казімір Валяр'янавіч, н. у 1915, займаўся сельскай гаспадаркай. Памёр 14.3.1938 у месцы пазбаўлення волі.

КУЛІЦКІ Валяр'ян Андрэевіч, н. у 1906, займаўся сельскай гаспадаркай. Памёр 27.11.1937 у месцы пазбаўлення волі.

КУЛІЦКІ Іван Андрэевіч, н. у 1889 у в. Берасцечка Хойніцкага р-на, селяніп. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ВЁСКА КРУКІ

ДУСЯНОК Якаў Кузьміч, н. у 1852, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

КУЛІЦКІ Восіп Андрэевіч, н. у 1894 у в. Берасцечка Хойніцкага р-на, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 27.11.1937 у г. Мазыр.

НАВУМЕНКА Пётр Маркавіч, н. у 1896, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ВЁСКА КУЛАЖЫН

ДЗЁМІН Яфім Мікітавіч, н. у 1880 у в. Чыстыя Лужы Чачэрскага р-на, жыў у в. Кулажын. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ВЁСКА МІХАЛЁЎКА

СКАЧОК Міхаіл Дзмітрысвіч, н. у 1907, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 13.3.1938 у г. Гомель.

МАЛЕЙКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАРЭЧЧА

ІЁТЧАНКА Мітрафан Нікіфаравіч, н. у 1884, займаўся сельскай гаспадаркаі. Расстраляны 10.9.1937 у г. Гомель.

ІЁТЧАНКА Сямён Максімавіч, н. у 1876, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 10.9.1937 у г. Гомель.

ПРОТЧАНКА Аляксандр Цімафеевіч, н. у 1881, займаўся сельскай гаспадаркай. Памёр 10.9.1937 у месцы зняволення.

ВЁСКА ПЕТРЫЦКАЕ

СЕДРА Рыгор Аляксеевіч, н. у 1904, займаўся сельскай гаспадаркай. Рэпрэсіраваны ў 1937.

ВЁСКА СТАРЫ МАКРЭЦ

ПЕТРАКОЎ Фядос Фядосавіч, н. у 1888, удзельнік 1-й імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў. Працаваў старшынёй Крыўчанскага с/с. Рэпрэсіраваны ў 1937.

ВЁСКА СЦЕЖАРНАЕ

ГАЎРЫЛЕНКА Акім Піліпавіч, н. у 1888, калгаснік. Арыштаваны 21.1.1933 па абвінавачванні ў антысавецкай агітацыі. Расстраляны 17.3.1933.

КАТЛЯРЭНКА Ульян Мінавіч, займаўся сельскай гаспадаркай. Арыштаваны 20.1.1933 па абвінавачванні ў антысавецкай агітацыі. Расстраляны 17.3.1933.

ПЛЕСКАЦЭВІЧ Міхаіл Восіпавіч, н. у в. Залужжа Крывошынскага р-на Мінскай вобл., жыў у в. Снежарнае. Расстраляны 27.11.1938 у г. Мазыр.

МІКУЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАЙДАКІ (цяпер не існуе)

ЦІШКЕВІЧ Браніслаў Адамавіч, н. у 1880. Расстраляны 27.7.1937 у г. Віцебск.

ВЁСКА ВЯЛІКІ ЛЕС

БЫВАЛЬД Іван Адамавіч, н. у 1898, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 21.7.1938 у г. Гомель.

ВЁСКА МІКУЛІЧЫ

СМАЛЬЦАР Павел Данілавіч, н. у 1857, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 26.2.1938 у г. Мінск.

ВЁСКА ЧЫРВОНАЕ ПОЛЕ

МІГАЙ Пётр Паўлавіч, н. у 1897, працаваў загадчыкам фельчарска-акушэрскага пункта. Рэпрэсіраваны ў 1938.

НОВАЯЛЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АЛЯКСАНДРАЎКА

КОМ Сяргей Харытонавіч, н. у 1868 у в. Данічы на Украіне, жыў у в. Аляксандраўка. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

КРЭНІНГ Рэйнгольд Данілавіч, н. у 1903, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 22.11.1938.

ВЁСКА БЯРОЗКІ

КАЦУБА Трафім Паўлавіч, н. у 1872, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ВЁСКА КАПОРАНКА

ВАШЧАНКА Аляксей Іванавіч, н. у 1888, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ДЗЯЦЕЛ Лявон Іванавіч, н. у 1868, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 16.10.1937 у г. Гомель.

ВЁСКА ЛЮДЗВІНОЎ

КРАЎЧАНКА Мікалай Аляксеевіч, н. у 1903, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 26.2.1938.

ЧАШАНОК Міхаіл Сямёнавіч, калгаснік. Расстраляны 10.2.1938 у г. Мінск.

ВЁСКА НОВАЯ ЁЛЧА

ГРЫШАН Іван Антонавіч, н. у 1887, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

КАСЦЮЧЭНКА Марк Апанасавіч, н. у 1882, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

КЛЯПЕЦ Іван Савельевіч, н. у 1892, займаўся сельскай гаспадаркай. Загінуў 16.10.1937 у месцы пазбаўлення волі.

БЫЛЫ ПІРКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ПІРКІ

ГУДЗЯНОК Сцяпан Фёдаравіч, н. у 1902, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ПУГАЧ Сяргей Ерамеевіч, н. у 1905, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

САДОЎСКІ Пётр Адамавіч, н. у 1882 у в. Крывец Бельскага павета, Полыпча, жыў у в. Піркі. Расстраляны 5.6.1938 у г. Гомель.

ВЁСКА СУВІДЫ

ВІСЛОВУХ Мікалай Вікенцьевіч, н. у 1893 у г. Чарнобыль, жыў у в. Сувіды. Расстраляны 5.9.1937.

ВЁСКА ЧЭРНЕЎ

МЕЛЬНІК Нікіфар Гаўрылавіч, н. у 1871. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ШУЬЯНОК Майсей Максімавіч, н. у 1892, селянін. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

БЫЛЫ САВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КУЛАКОВІК

ШАРАНОК Дзмітрый Кірылавіч, н. у 1901 у в. Жэрднае, жыў у в. Кулаковік. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ВЁСКА ПЕРАСЯЦІНЕЦ

ГРАМЫКА Патап Васільевіч, н. у 1887, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ПАДСАСОННЫ Апанас-Аляксандр Нікіфаравіч, н. у 1894 у в. Запрудоўка Добрушскага р-на Гомельскай вобл., жыў у в. Перасяцінец. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ЦІТОЎ Васіль Іларыёнавіч, н. у 1885 у в. Галавінец Магілёўскай вобл., жыў у в. Перасяцінец. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

ВЁСКА НОВЫ СЦЕПАНОЎ

ДЗЯДКОЎ Трафім Нікіфаравіч, н. у 1911. Расстраляны 26.2.1938 у г. Мінск.

ТАЎПЫГА Савелій Адамавіч, н. у 1903, селянін. Рэпрэсіраваны.

УЛАСАЎ Іван Рыгоравіч, н. у 1889, селянін. Расстраляны 31.1.1938 у г. Мінск.

ВЁСКА СТАРЫ СЦЕПАНОЎ

АКЕНЧЫЦ Міхаіл Цімафеевіч, н. у 1900, калгаснік. Расстраляны 1.11.1937 у г. Гомель.

СПЯРЫЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДУБЛІН

ГАЦКА Васіль Анісімавіч, н. у 1888. Арыштаваны 24.6.1941. Пазней памёр ад голаду ў Новасібірскай турме.

ЛУТЧАНКА Мікалай Дзямідавіч. Рэпрэсіраваны ў 1933.

ВЁСКА МІХАЛОЎ

САВЯНОК Аляксандр Акімавіч, н. у 1889, займаўся сельскай гаспадаркай. Памёр 21.2.1938 у месцы зняволення.

ВЁСКА СТАРЫЯ ЮРКАВІЧЫ

ВАРОНЕНКА Павел Гардзеевіч, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 5.9.1937 у г. Гомель.

ХРАКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА НОВЫЯ ХРАКАВІЧЫ

ГРЫШАНОВІЧ Васіль Іванавіч, н. у 1889 у в. Ігнатаўка Асіповіцкага р-на Магілёўскай вобл., жыў у в. Новыя Хракавічы. Памёр 6.6.1940 у месцы зняволення.

ТКАЧЭНКА Фёдар Цімафеевіч, памёр 22.8.1944 у лагеры ў г. Варкута.

ВЁСКА ПРОСМЫЧЫ

БАРАН Апанас Яфрэмавіч, н. у 1908, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 7.10.1937 у г. Гомель.

ПІНЧУК Павел Рыгоравіч, н. у 1870, займаўся сельскай гаспадаркай. Расстраляны 7.10.1937 у г. Гомель.

За рэспубліканскую Іспанію

З успамінаў Васіля Лявонцьевіча Скідана, ураджэнца в. Ёлча

У 1936 годзе ў Іспаніі ўспыхнуў фашысцкі мяцеж супраць заваёў Іспанскай рэвалюцыі 1931—1936 гадоў, якая ў далейшым набыла характар нацыянальна-вызваленчай вайны супраць іспанскага і італа-германскага фашызму. У складзе групы танкістаў-добраахвотнікаў я накіраваўся ў гэтую краіну.

Праз пятнаццаць дзён пасля прыбыцця ў Іспанію наша танкавая рота прыняла бой з мяцежнікамі і ваеннымі фарміраваннямі Гітлера і Мусаліні. Асабліва запомніўся бой 4 студзеня 1937 года. На ўчастку фронту, які абараняла 2-я інтэрнацыянальная брыгада рэспубліканскай арміі, вораг перайшоў у наступленне. Стварылася цяжкая абстаноўка. Вось тады на ліквідацыю прарыву і былі кінуты нашы танкісты. Пры падтрымцы пяхоты яны рашучым контрударам адкінулі ворага на зыходныя рубяжы.

Танкавы батальён, у складзе якога я затым ваяваў у Іспаніі, тыднямі не выходзіў з баёў, заўсёды накіроўваўся камандаваннем на самыя адказныя ўчасткі фронту. 10 студзеня 1937 года батальён тэрмінова быў перакінуты на ўчастак, які займалі 12-я і 14-я інтэрнацыянальныя брыгады. Так разгарнулася наступленне рэспубліканскіх войск. Асабліва моцнае супраціўленне фашысты аказвалі на ўчастку 14-й інтэрбрыгады. Яе наступленне падтрымаў другі танкавы ўзвод, у складзе якога з гэтага часу я быў са сваім экіпажам у якасці камандзіра. А неўзабаве мяне прызначылі камандзірам танкавай роты.

Адзінаццаць месяцаў праваяваў я ў Іспаніі. Гэта былі амаль штодзённыя атакі і контратакі, смелыя начныя рэйды. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў Іспаніі, высокае пачуццё інтэрнацыяналізму многія нашы танкісты былі адзначаны высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Я атрымаў ордэны Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі.

Спіс воінаў-землякоў, якія загінулі падчас савецка-японскага ўзброенага канфлікту на возеры Хасан (1938), у раёне ракі Халхін-Гол (1939), пры вызваленні Заходняй Беларусі (1939) і ў савецка-фінляндскую вайну (1939—1940)

АСТРАГЛЯДАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БУРКІ

ДАНЧАНКА Фёдар Пракопавіч, н. у 1919, прызваны Брагінскім РВК у 1938, загінуў у жніўні 1939 на возеры Хасан.

БРАГІНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА КАВАКА

КАНДРАЦЕНКА Іван Андрэевіч, н. у 1910, прызваны Брагінскім РВК у 1937, загінуў у лістападзе 1939 на савецка-фінляндскім фронце.

ЯРМОЛЕНКА Макар Ільіч, н. у 1920, прапаў без вестак у сакавіку 1941.

ВЁСКА САБАЛІ

КАСЦЮЧЭНКА Міхаіл Пятровіч, н. у 1916, прызваны Брагінскім РВК у 1938, загінуў 28.8.1939 у баі з японскімі самураямі ў Манголіі.

БЫЛЫ ГДЗЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГДЗЕНЬ

ПАЎЛЕНКА Пётр Міхайлавіч, н. у 1919, прызваны Камарынскім РВК у 1938, загінуў у лістападзе 1939 на савецка-фінляндскім фронце.

ШПЕТНЫ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1919, прызваны Камарынскім РВК у 1939, рад., загінуў у 1939 на савецка-фінляндскім фронце.

М. І. Ярмоленка

С. В. Раманенка

КАМАРЫНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ВЁСКА КІРАВА

РАМАНЕНКА Сцяпан Васільевіч, н. у 1908, лейт., загінуў 28.9.1939 падчас вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

КРУКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КРУКІ

БЫХАЎСКІ Шолам Міхайлавіч, н. у 1905, загінуў у 1939.

КАВАЛЬЧУК Іван Антонавіч, н. у 1917, лейт., камандзір узвода лыжнага б-на, загінуў на пачатку 1940 на Карэльскім перашыйку.

МАЛЕЙКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАТЛОВІЦА

КРАЎЧАНКА Агей Ігнатавіч, н. у 1918, загінуў у 1939 на Карэльскім перашыйку.

РАБЯНОК Аляксей Іванавіч, н. у 1918, яфр., загінуў 16.3.1940 на вышыні Безыменная на савецка-фінляндскім фронце.

РАК Макар Якаўлевіч, н. у 1918, ст. сяржа., памёр ад ран 13.2.1940 на Карэльскім перашыйку.

ВЁСКА ПЕТРЫЦКАЕ

ЮРЧАНКА Сцяпан Сямёнавіч, н. у 1906, рад., загінуў на пачатку 1940 на Карэльскім перашыйку.

ВЁСКА СТАРЫ МАКРЭЦ

ШАЎЧЭНКА Аляксандр Кузьміч, н. у 1912, ст. сяржа., загінуў 13.2.1940 на савецка-фінляндскім фронце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

МІКУЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА МІКУЛІЧЫ

НАЗАРАНКА Піліп Міхайлавіч, н. у 1912, лейт., загінуў у 1940 на савецка-фінляндскім фронце.

ШУМСКІ Ціхан Архіпавіч, н. у 1918, прызваны Брагінскім РВК у 1937, загінуў у 1939.

НОВАЯЛЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАЛУБОЎКА

ВЕТЧАНКА Іван Аляксандравіч, н. у 1906, прапаў без вестак у 1940.

А. К. Шаўчэнка

П. М. Назаранка

ВЁСКА КРАСНАЕ

АЛЕЎСКІ Ісак Аронавіч, н. у 1908, камісар сбр., загінуў 25.11.1939 каля г. Выбарг.

ВЁСКА НОВАЯ ЁЛЧА

ШЭЙН Іван Пятровіч, н. у 1898, рад., загінуў у 1939 на Карэльскім перашыйку.

БЫЛЫ САВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КУЛАКОВІК

КАРТАШ Мікалай Антонавіч, н. у 1914, загінуў у 1939 на савецка-фінляндскім фронце.

СПЯРЫЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ДУБЛІН

ФІЛІПЕНКА Ігнат Якаўлевіч, н. у 1915, загінуў 8.3.1940 на Карэльскім перашыйку.

ХРАКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГРУШНАЕ

ПІКУС Андрэй Міхайлавіч, н. у 1899, загінуў у 1939 на савецка-фінляндскім фронце.

ВЁСКА ХРАКАВІЧЫ

ТКАЧЭНКА Мітрафан Аўрамавіч, н. у 1919, рад., стралок 6-й асобнай чыгуначнай роты, памёр ад хваробы 3.6.1940, пахаваны ў г. Хабараўск.

Па матэрыялах Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, райваенкамата і сведчанняў насельніцтва

спіс падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

1941

1945

У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

Так пачыналася вайна

22 чэрвеня 1941 года фашысцкая Германія напала на Савецкі Саюз. Вестка аб гэтым была перададзена ў Брагін і Камарын па тэлефоне з абласнога камітэта партыі. У той жа дзень жыхары Брагінскага і Камарынскага раёнаў слухалі па радыё выступленне намесніка старшыні СНК, наркама замежных спраў краіны В. М. Молатава, які абвясціў аб пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Была абвешчана мабілізацыя ў Чырвоную Армію ваеннаабавязаных 1905—1918 гг. нараджэння.

З першых гадзін вайны дзейнасць раённых партыйных і савецкіх органаў была падпарадкавана мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў на абарону краіны ад фашысцкага нашэсця. Пасля нарад партыйна-савецкага і гаспадарчага актыву і кароткіх інструктажаў у Брагіне і Камарыне адказныя ўпаўнаважаныя з абодвух райцэнтраў раз'ехаліся па сельсаветах. Былі створаны і адразу ж пачалі дзейнічаць раённыя мабілізацыйныя пункты пры райваенкаматах. У Брагіне такі пункт узначаліў член бюро райкама партыі, даваенны старшыня Брагінскай прамысловай (кравецкай) арцелі «Чырвоны Кастрычнік» Пётр Рыгоравіч Зіновіч. У Брагіне і Камарыне фарміраваліся маршавыя батальёны і каманды прызыўнікоў, затым яны адпраўляліся на зборныя пункты Курскай, Смаленскай і Арлоўскай абласцей. У сціслыя тэрміны ў дзеючую армію было накіравана больш за 9 тысяч грамадзян прызыўнога ўзросту.

Кіраўніцтва, актыў, насельніцтва Брагіншчыны і Камарыншчыны жылі ў тыя дні трывогамі і напружанымі клопатамі ваеннага часу. На сельскіх сходах, мітынгах усе прагна слухалі прамоўцаў аб ваенным становішчы краіны, рэкамендацыі аб неадкладных мерах па арганізацыі адпору ворагу. Наладжваліся калектыўныя чыткі газет з дырэктыўнымі матэрыяламі партыі і ўрада, скупымі паведамленнямі аб ваенных дзеяннях на франтах. Пры гэтым бадай кожны балюча перажываў часовыя, як іх называлі, няўдачы нашых войск на пачатку вайны. І ў той жа час многія задумваліся над прычынамі гэтых няўдач, бо цяжкія ваенныя рэальнасці ўваходзілі ў супярэчнасць з перадваеннымі ўяўленнямі людзей аб нашай «самай-самай» арміі, здольнай без асаблівых цяжкасцей і страт, як сцвярджала савецкая прапаганда, разбіць любога агрэсара на яго ўласнай тэрыторыі, аб самым мудрым

і прадбачлівым правадыру, таксама здольным разгадаць і папярэдзіць любую варожую авантуру.

Глухія весткі аб акружэнні і знішчэнні цэлых нашых палкоў, дывізій, бясконцыя патокі бежанцаў з заходніх абласцей краіны, адступаючыя пасля цяжкіх баёў вельмі парадзелыя ад страт чырвонаармейскія часці, да крайнасці знясіленыя ад ран чырвонаармейцы-акружэнцы, што прабіраліся групамі ці па адным на ўсход, калі немцы ўжо перарэзалі шляхі адступлення, міжволі вымушалі людзей задаваць сабе пытанне: чаму такое здарылася?

Аднак суровая ваенная паўсядзённасць для простых людзей не пакідала часу на глыбокі роздум. Чырвоная Армія з цяжкімі абарончымі баямі адступала ад заходніх рубяжоў, вымотваючы праціўніка, а мірнае насельніцтва ратавала народнае дабро, каб яно не дасталося акупантам, усімі сіламі дапамагала фронту, рыхтавалася жыць і змагацца з ворагам на акупіраванай ім тэрыторыі.

Пры распрацоўцы плана «Барбароса» камандаванне вермахта ставіла мэту дасягнуць вусця Прыпяці на працягу адзінаццаці дзён[1]. Пры гэтым мелася на ўвазе не выдзяляць значных сіл для наступальных аперацый у басейне Прыпяці. З аднаго боку, улічваўся вопыт перыяду нямецкай інтэрвенцыі 1918 года, калі кайзераўскія войскі моцна завязлі ў палескіх балотах. З другога — па плану «Барбароса» прадугледжвалася падцягнуць падмацаванні, хуткімі і глыбокімі ўдарамі групы армій «Цэнтр» на поўнач і групы армій «Поўдзень» — на поўдзень ад прыпяцкіх балот раскалоць фронт савецкіх армій з наступным іх знішчэннем.

Але гэтая мэта не была дасягнута. Ва ўстаноўлены планам тэрмін (напрыканцы чэрвеня — пачатку ліпеня) нямецкія 4-я армія групы армій «Цэнтр» і 2-я танкавая група генерала Гудэрыяна падышлі толькі да паўночна-заходніх і затым паўднёва-заходніх межаў Гомельшчыны. І нават яшчэ 6 ліпеня 2-я нямецкая танкавая армія вяла баі каля Рагачова. Менавіта ў той дзень начальнік генштаба сухапутных войск фашысцкай арміі генерал-палкоўнік Гальдэр запісаў: «Противник оказывает сильное сопротивление, одновременно продолжая контратаки от Гомеля...»[1] Яшчэ праз тыдзень ён пазначыў у сваіх запісах, што на паўднёвым флангу групы армій «Цэнтр» пачала актыўныя баявыя дзеянні гомельская групоўка войск, умаўчаўшы, аднак, аб тым, што 13—14 ліпеня войскі 21-й арміі Заходняга фронту (камандуючы генерал-лейтэнант В. Ф. Герасіменка) контратакавалі гітлераўцаў і на непрацяглы час вызвалілі Жлобін і Рагачоў.

У выніку паспяховага наступлення войск 21-й арміі паміж групамі нямецкіх армій «Цэнтр» і «Поўдзень», якія наступалі на поўначы і поўдні ад Прыпяці, утварыўся разрыў у 250 кіламетраў. Гэтым тлумачыцца тое, што на Брагіншчыне і прылеглых да яе паўднёва-ўсходніх тэрыторыях Палескай вобласці нямецкія войскі з'явіліся 24—25 жніўня, і толькі пасля таго, як гітлераўцы перакінулі са Смаленскага на Рэчыцка-Жлобінскі (у далейшым — Гомельскі) напрамак дадатковыя воінскія часці.

Напярэдадні ж у сітуацыі, якая склалася ў выніку гераічных дзеянняў нашай 21-й арміі ў раёне Гомельскага выступу, партыйныя арганізацыі Палескай і Гомельскай абласцей разгарнулі вялікую работу па фарміраванні народнага апалчэння і знішчальных батальёнаў. Такі батальён на пачатку ліпеня быў створаны ў Брагіне (138 чалавек, камандзір Мікалай Прыходзька, камісар сакратар РК КП(б)Б Кузьма Дзюндзікаў), а ў Камарыне сфарміравалі не-

[1] Совершенно секретно! Только для командования! М., 1967. С. 176.

[1] Гальдер Ф. Военный дневник. М., 1971. Т. 3. С. 95.

калькі атрадаў (груп) народнага апалчэння пад адзіным камандаваннем раённага ўпаўнаважанага наркамата нарыхтовак Бельчанкі. Байцы гэтых фарміраванняў неслі ахову маёмасці на асноўных аб'ектах, дзяжурылі на скрыжаваннях важнейшых дарог, каля мастоў, дапамагалі ў эвакуацыі насельніцтва і народнага дабра, уборцы ўраджаю і г. д.

У цяжкіх умовах прыфрантавой абстаноўкі працягвалася мабілізацыя на фронт, арганізавана вялася эвакуацыя ў глыбокі савецкі тыл матэрыяльных каштоўнасцей, спецыялістаў пэўных катэгорый. Для практычнага вырашэння гэтай задачы ў Брагінскім і Камарынскім раёнах былі створаны надзвычайныя камісіі. У выніку аператыўных мер тут поўнасцю вывезлі абсталяванне Малейкаўскага і Ялчанскага крухмальных заводаў, мясцовых прамарцеляў, сотні трактароў, шмат сыравіны, гатовай прамысловай і харчовай прадукцыі. З абодвух раёнаў паспелі перагнаць на ўсход асноўную масу буйной рагатай жывёлы, коней, авечак і інш.

У ліку калгасных і саўгасных актывістаў, хто ў тыя трывожныя дні займаўся эвакуацыяй вялікіх статкаў грамадскай жывёлы на ўсход, былі У. Я. Ефіменка з в. Хракавічы, Ф. Т. Сіманава з в. Малейкі, В. А. Шаўчэнка з в. Асарэвічы, П. П. Шубянок з в. Касачоў, М. В. Ярмоленка з в. Малейкі і многія іншыя вяскоўцы, якія, не зважаючы на паўсядзённыя цяжкасці і небяспеку, самаадданa выконвалі даручаную ім справу. Пры эвакуацыі статкаў з раёнаў усю работу па перапраўцы жывёлы на левы бераг Дняпра ў раёне в. Жылічы ўзначальвалі раённы ўпаўнаважаны наркамата нарыхтовак Д. В. Прышчэпаў, яго намеснік Захар Васека, загадчык райземаддзела Д. К. Маргыненка, райветфельчар Пётр Юдзянок. Для далейшаі эвакуацыі ў савецкі тыл каля Жылічаў было сагнана ў лес вельмі многа жывёлы. Д. В. Прышчэпаў разам са старшынёй Малажынскага сельсавета прыгналі сюды з Радуля і Любеча два паромы і напачатку пераправілі на левабярэжжа ўсю буйную рагатую жывёлу і коней. А са свіннямі выйшла сур'ёзная замінка. З-за таго, што паромы не былі належным чынам абсталяваныя, перамяшчэнне жывёлы з аднаго боку на другі моцна іх нахіляла, і свінні звальваліся ў раку. Для абсталявання паромаў не было ні матэрыялаў, ні часу. Таму сабралі па навакольных вёсках драўляныя бочкі, рэзалі свіней і, засаліўшы свежыну, адпраўлялі яе для пагрузкі ў вагоны на чыгуначную станцыю Шостка Чарнігаўскай вобласці.

З прыстані Бабка, што па суседстве з Жылічамі, рачным транспартам адправілі ў савецкі тыл дзве тысячы тон збожжа. Адну трохсоттонную баржу поўнасцю загрузілі крухмалам, а рэшту яго, 200 тон, спачатку прадавалі насельніцтву, а потым і бясплатна раздавалі ўсім жадаючым, каб толькі каштоўная прадукцыя не дасталася ворагу. Артылерыйская ж кананада 23 жніўня ўжо грымела дзесьці за Хойнікамі.

У канцы першай — пачатку другой дэкад ліпеня нямецкія войскі былі спынены на рубяжы Дняпра. Гомель застаўся астатнім буйным прамысловым цэнтрам Беларусі, не занятым ворагам. У гэтых умовах выключнае значэнне мела дакладная праграма адпору ворагу. Асноўнай часткай яе з'явілася дырэктыва ЦК ВКП(б) і Саўнаркама СССР партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей ад 29 чэрвеня 1941 г., у якой, у прыватнасці, падкрэслівалася: «В занятых врагом районах создавать партизанские отряды и диверсионные группы для борьбы с частями вражеской армии, для разжигания партизанской войны всюду и везде, для взрыва мостов, дорог, порчи телефонной и телеграфной связи, поджога складов и т. д. В захваченных районах создавать невыносимые условия для врага и всех его пособников, преследовать и уничтожать их на каждом шагу, срывать все их мероприятия»[1].

[1] КПСС о Вооруженных Силах Советского Союза: Документы 1917—1981. М., 1981. С. 298.

30 чэрвеня ЦК КП(б)Б прыняў дырэктыву № 1 аб падрыхтоўцы да пераходу на падпольную работу партыйных арганізацый раёнаў, якія знаходзіліся пад пагрозай фашысцкай акупацыі, і затым, 1 ліпеня — дырэктыву № 2 па разгортванні партызанскай вайны ў тыле ворага. У другой дырэктыве падкрэслівалася: «В районах и селах создаются подпольные партийные и комсомольские ячейки, главная задача которых — мобилизация народа на беспощадную расправу с врагом. Для этой цели все коммунисты и комсомольцы, способные носить оружие, остаются на территории, занятой врагом»[1].

У адпаведнасці з гэтымі дырэктывамі і пастановай ЦК ВКП(б) ад 18 ліпеня 1941 г. «Аб арганізацыі барацьбы ў тыле германскіх войск» у другой палове ліпеня — пачатку жніўня на Брагіншчыне і Камарыншчыне заканчвалася падрыхтоўчая работа па разгортванні партызанскага руху і патрыятычнага падполля на выпадак акупацыі. Палескі абласны камітэт партыі паставіў перад камандзірам і камісарам Брагінскага ашшчальнага батальёна (атрада) Мікалаем Прыходзькам і Кузьмой Дзюндзікавым задачу дыслацыравацца ўсім саставам атрада ў лесе, дзе загадзя былі падрыхтаваны базы, і разгарнуць партызанскую барацьбу ў тыле ворага. Але з-за дапушчанага прамаруджвання шлях у лес аказаўся адрэзаным перадавымі рухомымі групамі немцаў. К. П. Дзюндзікаў павёў атрад да Дняпра з намерам праз ручаёўскія лясы выйсці да баз. Аднак на Дняпры Брагінскі знішчальны атрад быў расфарміраваны, а яго байцы накіраваны ў чырвонаармейскія падраздзяленні ў якасці папаўнення. У выніку для арганізацыі партызанскай барацьбы ў тыле ворага засталося ўсяго некалькі чалавек з ліку камуністаў. У гэтую групу ўвайшлі раённыя актывісты — член бюро райкама партыі П. Р. Зіновіч, райпракурор Магураў, дырэктар нарыхтоўчай канторы Біркоў, старшыня калгаса «Добраахвотнік» (в. Вуглы) Піліп Дзялец, старшыні Лубяніцкага, Крыўчанскага і Спярыжскага сельсаветаў Васіль Лявоненка, Іван Сапоненка, Апанас Чарняк і іншыя.

І. Ф. Ганжураў

[1] Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Документы и материалы. Мн., 1967. Т. 1. С. 53.

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З ПРАТАКОЛА № 69 ПАСЯДЖЭННЯ БЮРО ЦК КП(б)Б

22 чэрвеня 1941 г.

Присутствовали: члены бюро ЦК КП(б)Б тт. Пономаренко, Калинин, Былинский, Ванеев, Цанава, Матвеев, Наталевич, Эйдинов, Крупеня.

Кандидат в члены бюро ЦК КП(б)Б т. Бударин.
Секретари ЦК КП(б)Б тт. Авхимовнч, Прохоров, Гапенко, Тур.
Уполномоченный КПК т. Захаров.
Вопросы, рассмотренные 22 июня 1941 г.
1. Слушали о нападении Германии на СССР.
Постановили: 1. Поручить членам бюро и секретарям ЦК КП(б)Б немедленно связаться и поддержнвать беспрерывную связь с областями и районами, в первую очередь областями и районами полосы начавшихся военных действий.
Передать указания ЦК КП(б)Б:
а) о немедленной перестройке работы парторганизаций на военные рельсы;
б) установление связи с воинскими частями;
в) введение угрожаемого положения в городах и районах Белоруссии, организации боевой службы ПВО;

г) об усилении охраны промышленных предприятий, узлов транспорта, складов, средств связи, постов силами групп по борьбе с авиадесантами, вооруженными коммунистами, рабочими и колхозниками;

д) о помощи военкоматам в проведении всей работы...

2. Слушали: О задачах и мероприятиях в связи с выступлением по радио заместителя председателя СНК СССР т. Молотова В. М.

Постановили: Обязать все партийные, советские, профсоюзные и комсомольские органы широко популяризировать речь т. Молотова в народе, мобилизуя весь белорусский народ на борьбу и разгром немецкого фашизма.

Созвать в Минске и в других областных городах партийные активы для мобилизации партийных организаций на разрешение задач, вытекающих из военной обстановки. На Минском партийном активе (созвать на 3 часа дня) выступление поручить тов. Пономаренко.

На всех предприятиях, в колхозах, совхозах, учреждениях провести митинги.

Обязать все обкомы, горкомы и райкомы, советские, комсомольские и профсоюзные организации принять меры к организованному переводу работы промышленности и транспорта на нужды Красной Армии.

Поручить редакциям газет «Советская Белоруссия» и «Звязда» опубликовать речь товарища Молотова, передовую и другие материалы по указанию отдела пропаганды ЦК КП(б)Б с призывом к Отечественной войне против немецких фашистов.

5. Слушали: О мерах в связи с введением в Белорусской ССР военного положения.

Постановили:

а) Предложить всем партийным, профсоюзным и комсомольским организациям, директорам заводов, руководителям учреждений – немедленно перевести работу учреждений и предприятий на условия военного времени, в связи с введением военного положения.

б) Обеспечить быстрое и организованное проведение мобилизации. Предупредить всех руководителей наркоматов, предприятий и учреждений об их ответственности за сдачу транспортного и автопарка, тягла в совершенно исправном состоянии.

в) В целях организованного проведения мобилизации и обеспечения бесперебойной работы всех партийных и советских органов в связи с военной обстановкой, поручить тов. Прохорову согласовать с Военным советом оставление на посту первых и вторых секретарей обкомов, горкомов и райкомов КП(б)Б, председателей облисполкомов, гор. и райисполкомов.

6. Слушали: О работе железнодорожного транспорта.

Постановили: Обязать секретаря ЦК КП(б)Б т. Тур вместе с работниками его отдела установить контроль за немедленным переводом работы всех железных дорог на военные условия...

7. Слушали: Об эвакуации детей из городов, подвергающихся бомбардировке противником в полосе военных действий и г. Минска.

Постановили: Обязать СНК БССР (т. Былинского), Наркомпрос (т. Уралову), ЦК ЛКСМБ (т. Зимянина) и председателя Минского горисполкома (т. Бударина) в двухдневный срок вывезти детей из детских домов, садов, лагерей, из городов, подвергающихся бомбардировке в полосе военных действий и г. Минска.

8. Слушали: Об эвакуации ценностей и денежных знаков из Государственного банка БССР.

Постановили: 1. Обязать зам. Управляющего Госбанка БССР т. Кузнецова в суточный срок эвакуировать в Москву ценности, денежные знаки и архив банка.

2. Обязать тт. Миронова и Карасева немедленно обеспечить эвакуацию банка вагонами.

9. Слушали: Об организации вооруженных рабочих отрядов для усиления охраны предприятий и порядка в городе.

Постановили: 1. В целях усиления охраны предприятий и порядка в городе обязать Минский обком и горком КП(б)Б создать по районам отряды вооруженных рабочих и трудящихся.

2. Просить Военный совет Западного фронта выделить для этой цели 5000 винтовок и соответственное количество патронов.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 3. Спр. 1214. Л. 2–5.

Выявіў і падрыхтаваў да друку *У. І. Лемяшонак*

З ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА ПАЛЕСКАГА АБКАМА КП(б)Б П. А. ЛЯВІЦКАГА Ў ЦК КП(б)Б АБ АБСТАНОЎЦЫ Ў ВОБЛАСЦІ

13 ліпеня 1941 г.

В Комаринском районе создано 14 отрядов народного ополчения, в которые входят 207 чел., руководит отрядами зав. райзо, бывший партизан тов. Бельченко.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33[а]. Спр. 64. Л. 18–25.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

ПАСТАНОВА ПАЛЕСКАГА АБКАМА КП(б)Б АБ ВЫКАНАННІ ДЫРЭКТЫВЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА АБАРОНЫ СССР АД 22 ЛІПЕНЯ 1941 г.[1]

23 ліпеня 1941 г.

1. Директиву Государственного комитета обороны СССР от 22 июля принять к немедленному выполиенню.

2. Обязать секретарей райкомов КП(б)Б н председателей исполкомов райсоветов и земельные органы Туровского, Житковичского, Петриковского, Копаткевичского, Глусского, Паричского, Октябрьского, Домановичского, Лельчицкого, Ельского, Василевичского, Калинковичского районов уничтожить все посевы сахарной свеклы, кок-сагыза, льна-долгунца, конопли и других технических культур, произведенные колхозами, совхозами и другими государственными организациями, путем скашивания, скармливания, вытаптывания скотом и другими способами.

3. Из общественных или государственных посевов зерновых культур и картофеля передать остающимся колхозникам по 1,5–2 га на хозяйство. Всю остальную часть посевов зерновых культур и картофеля уничтожать путем скашивания в зеленом виде на фураж для нужд Красной Армии, скармливания и вытаптывания скотом, сжигания и т. п.

4. Обком КП(б)Б обязывает Наровлянский, Хойникский, Брагинский, Комаринский и Мозырский райкомы КП(б)Б и райисполкомы распространить действие настоящего решения в случае, если будет создаваться угроза занятия территории районов противником.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4126. Воп. 1. Спр. 2. Л. 18. Арыгінал.

Падрыхтаваў *У. І. Лемяшонак*

[1] З пратакола.

ПАСТАНОВА ПАЛЕСКАГА АБКАМА КП(б)Б АБ АРГАНІЗАЦЫІ БАРАЦЬБЫ Ў ТЫЛЕ ГЕРМАНСКІХ ВОЙСК

23 ліпеня 1941 г.

1. В соответствии с постановлением ЦК ВКП(б) об организации борьбы в тылу германских войск утвердить областную тройку по руководству подпольно-коммунистическими ячейками и партизанским движением.

5. Поручить председателю облисполкома тов. Зайцеву выделить необходимое количество денег, одежды, продовольствия и радиоприемников для партизанских отрядов и подпольных организаций.

6. Предложить начальнику УНКВД тов. Строкину и первым секретарям РК КП(б)Б подготовить переход истребительных батальонов в партизанские отряды, причем руководствоваться принципом строгого индивидуальиого отбора каждого бойца, посылаемого в партизанские отряды.

Всенародное партизанское движение... Т. 1. С. 73–74.

ДАВЕДКА АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ПАДРЫЎНІКОЎ З ПАРТЫЙНА-КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ З 20 ДА 31 ЛІПЕНЯ 1941 г.

Не раней 31 ліпеня 1941 г.

За указанный период через сборы по ознакомлению с изготовлением зарядов из взрывных веществ и с производством взрывов пропущено 9 отрядов общим количеством 258 чел.:

... 7. отряд Брагинского района — 42 чел.,
9. отряд Комаринского района — 20 чел.

П. Шмаков

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 65. Л. 89.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

З успамінаў Д. В. ПРЫШЧЭПАВА, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, жыхара г. п. Брагін

22 чэрвеня 1941 года збіраўся сход Брагінскай раённай партыйнай арганізацыі з парадкам дня:

1. Аб падрыхтоўцы да ўборкі ўраджаю і правядзенні збожжанарыхтовак.

2. Аб гатоўнасці тэхнічнай базы да прыёму збожжа і завяршэнні сенанарыхтовак.

Па першым пытанні дакладчыкам быў сакратар райкама партыі К. П. Дзюндзікаў, а па другім падрыхтаваўся выступаць раённы ўпаўнаважаны наркамата нарыхтовак.

Было дзесьці каля дзесяці гадзін раніцы. У раённым Доме культуры, дзе намячаўся сход, па радыё трансліравалася музыка. Пачатак мерапрыемства затрымаўся таму, што Дзюндзікава тэрмінова выклікалі ў райкам партыі па званку з Мазыра. Вярнуўся сакратар вельмі ўзрушаны і, пагутарыўшы самнасам са старшынёй райвыканкама, ашаламіў усіх весткай аб вераломным нападзе Германіі на Савецкі Саюз.

Напачатку зала трывожна прыціхла, але потым загула, як патрывожаны пчаліны вулей: што, як, чаму?

— Спакойна, таварышы! Аб падрабязнасцях — пазней. У дванаццаць гадзін будзе спецыяльнае паведамленне па радыё.

...Затаіўшы дыханне, камуністы, актыў раёна, жыхары райцэнтра слухалі В. М. Молатава, які зачытаў зварот Палітбюро ЦК ВКП(б) да партыі і народа. Пасля гэтага К. П. Дзюндзікаў зноў пайшоў да сябе ў кабінет, каб сазваніцца з абласным камітэтам партыі. А раённы ваенны камісар паспяшаўся ў райваенкамат. Неўзабаве яны вярнуліся. З пяцімінутнымі прамовамі аб задачах ваеннага часу выступілі К. П. Дзюндзікаў і старшыня райвыканкама І. Расоўскі. Потым усе, акрамя чатырнаццаці актывістаў раённага звяна, накіраваліся ў свае працоўныя калектывы. У ліку тых чатырнаццаці я таксама атрымаў мабілізацыйны пакет і тут жа на кані паехаў у Астраглядаўскі сельсавет, дзе мяне ўжо чакалі члены выканкама і пасыльныя ў кожны населены пункт. Назаўтра раніцай па абвестках, уручаных пасыльнымі, да сельсавета прыбылі 500 чалавек ваеннаабавязаных. Я выступіў перад імі з кароткай прамовай, і ўсе мы накіраваліся ў Брагін.

Д. В. Прышчэпаў

За чатыры дні (23—26 чэрвеня) мабілізацыя ў асноўным была закончана. Мужчыны прызыўнога ўзросту ў складзе маршавых рот і батальёнаў накіроўваліся на зборныя пункты Арлоўскай, Курскай і Смаленскай абласцей. Непрызванымі (па броні) некаторы час заставаліся толькі работнікі савецка-партыйнага актыву, якія паступова, па некалькі чалавек, выклікаліся ў райваенкамат і накіроўваліся на прызначэнні. Такая адзінкавая мабілізацыя працягвалася да 15—20 жніўня, да таго часу, пакуль у раёне не былі завершаны эвакуацыйныя работы.

Неўзабаве жыхароў Брагіна раніцай разбудзіў мнагалюдны шум. То бежанцы — мужчыны, жанчыны, дзеці на падводах і пехатой — прыбылі з заходніх абласцей Беларусі і Украіны, ратуючыся ад гітлераўцаў. Гэтае сумнае відовішча адразу дало нам зразумець, што нясе з сабой развязаная гітлераўцамі вайна.

Райкам партыі, выканкам райсавета адразу ж прынялі тэрміновыя меры па аказанні дапамогі бежанцам. Многіх з іх размясцілі ў клубе, некаторых, асабліва жанчын з маленькімі дзецьмі, прынялі ў свае хаты брагінчане. На поўную сілу пачалі працаваць швейныя і шавецкія майстэрні, каб апрануць і абуць людзей. Працавалі некалькі прыстасаваных сталовак і кухняў, харчовых пунктаў.

З Мазыра Палескі абкам партыі даў указанне неадкладна арганізаваць пераправу бежанцаў далей за Днепр. Арганізацыя гэтай работы даручалася мне. Не губляючы часу, я разам з групай таварышаў з раённага актыву ўзяўся за справу. За некалькі дзён былі перавезены на левабярэжжа тысячы бежанцаў.

Мне, як раённаму ўпаўнаважанаму Наркамата па нарыхтоўках, была даручана і эвакуацыя на ўсход грамадскай жывёлы. Тысячы галоў яе было пераправлена на левы бераг Дняпра.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

З пісьма К. П. ЯРМОЛЕНКІ, ветэрана вайны і працы, гв. падпалкоўніка ў адстаўцы

13 июля 1941 года Брагинским райвоенкоматом была сформирована команда призывников. Мне сказали, что, как старший команды, я назначаюсь командиром батальона. Кроме сопровождающих документов на руки мне было выдано удостоверение, в котором, в частности, говорилось:

«Предъявитель сего пом. Прокурора, призывник Брагинского райвоенкомата Ермоленко Константин Павлович действительно является старшим команды призывников в количестве 474 чел., отправляемых из Брагинского райвоенкомата в г. Карачев Орловской обл.»

Нам была выдана машина ЗИС-5 и 25 пароконных подвод. Двигались на Лоев, у нас была карта, списки команды. Переправились в Лоеве, потом двигались по Украине. И, кажется, на станции Городня Черниговской области нам удалось устроиться на товарный состав, который следовал порожняком в нужную нам сторону. По пути нас обстреливали и бомбили немцы. Мы разбегались, потом собирались и так добрались до Карачева. В течение дня собрались все из команды на перекличку. Никто не отстал.

Потом нас кормили горячим обедом, военный комендант поблагодарил за честное выполнение нами своего гражданского долга, выдал мне новое удостоверение о том, что наша команда следует в г. Орел, в 45-й запасной стрелковый полк. Посадили нас на товарняк, и мы прибыли к месту назначения...

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Гналі жывёлу на ўсход...

З успамінаў Ф. Т. Сіманавай, жыхаркі в. Малейкі

Два перадваенныя гады я працавала трактарысткай. Калі пачалася вайна, мяне ўключылі ў групу, якой было да-

ручана эвакуіраваць калгасную жывёлу на ўсход. Напачатку было нас дванаццаць чалавек. Гналі гурт кароў, 150 галоў, ды атару авечак. Не ўсе з нас вытрымалі. Гэта ж бадай чатыры месяцы давялося пераганяць жывёлу ў Растоўскую вобласць. З дванаццаці чалавек засталося нас толькі чацвёра, у тым ліку я, Галіна Яўсееўна Дзялец, Мікалай Васільевіч Ярмоленка. Напрацаваліся, нагараваліся... Але жывёлу захавалі. Прыгнаўшы яе па прызначэнні, перадалі па акту. І ўпершыню за доўгую дарогу памыліся ў лазні, уволю выспаліся, адпачылі...

З успамінаў А. Г. СКОКАВА, былога супрацоўніка Палескага абласнога ўпраўлення НКУС

Жнівеньскія дні 1941 г. былі заняты арганізацыяй сувязі паміж падполлем Мазыра і раёнаў вобласці. 20 жніўня па заданні сакратара АК КП(б)Б Турыка і старшыні аблвыканкама Зайцава я з супрацоўнікам Чыгіром выехаў у Хойніцкі і Брагінскі раёны, каб падрыхтаваць базы ўзбраения і харчоў, наладзіць з мясцовым кіраўніцтвам сувязі.

20—21 жніўня 1941 г. у Брагіне мы займаліся стварэннем партызанскага атрада. У яго былі ўключаны работнікі партыйнага апарату, міліцыі і іншыя актывісты. Турык і Зайцаў паехалі ў Чарнігаў, дзе ў гэты час зиаходзіўся штаб 21-арміі, членам ваеннага савета якой быў П. А. Лявіцкі[1].

Калі яны вярнуліся ў Брагін. нам было прапанавана адшукаць начальніка Палескага ўпраўлення НКУС І. Н. Івашчанку і паступіць у яго распараджэнне...

Памяць. Мазыр. Мазырскі раён. Мн., 1997. С. 197.

[1] Тагачасны першы сакратар Палескага абкама КП(б)Б.

Акупацыйны рэжым

Акупацыйны рэжым, што быў устаноўлены гітлераўцамі на часова захопленай імі тэрыторыі нашай Радзімы, прадугледжваўся фашысцкімі стратэгамі загадзя, яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Галоўныя яго накірункі былі выкладзены Гітлерам у сакрэтным мемарандуме «Некаторыя думкі пра абыходжанне з насельніцтвам на Усходзе» ад 25 мая 1940 г. У ім указвалася, што захопленыя ўсходнія тэрыторыі належыць разглядаць як аб'ект каланізацыі і германізацыі. Акупацыйная палітыка, гаварылася ў гэтым мемарандуме, павінна быць накіравана на тое, каб ператварыць актыўную масу «іншароднага насельніцтва» ў напаўпісьменных рабоў.

Асноўныя палажэнні акупацыйнага рэжыму былі даволі падрабязна выкладзены і ў шэрагу іншых сумна вядомых дакументаў, у тым ліку ў плане «Барбароса» (канчатковы варыянт выкладзены ў дырэктыве вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброенымі сіламі Германіі ад 18.12.1940 г.), які вызначаў стратэгію і тактыку нападу на СССР, генеральным плане «Ост» — праграме каланізацыі тэрыторыі, германізацыі, высялення і знішчэння народаў Усходняй Еўропы, у тым ліку Беларусі, «інструкцыі пра асобыя вобласці» да дырэктывы № 21—план «Барбароса» (13.3.1941 г.), дырэктыве па кіраўніцтве эканомікай у акупіраваных усходніх абласцях і інш. Гэтыя дакументы намецілі практычныя мерапрыемствы па ўстанаўленні акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі, якая падлягала захопу. У далейшым яны дапаўняліся загадамі, інструкцыямі галоўнакамандавання ўзброеных сіл і іншых ведамстваў гітлераўскай Германіі, у якіх масавы тэрор, рабаванні, гвалтаванне і забойствы ўзводзіліся ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

13 мая 1941 г. начальнік штаба вярхоўнага галоўнакамандавання ўзброе-

ных сіл Германіі В. Кейтэль падпісаў «Распараджэнне Гітлера аб ваеннай падсуднасці ў раёне «Барбароса» і асобых паўнамоцтвах войск». Яно з'явілася тым самым афіцыйным дакументам, які здымаў з салдат і афіцэраў вермахта юрыдычную і маральную адказнасць за забойства грамадзянскага насельніцтва на тэрыторыі СССР[1].

Асноўны сэнс гэтых жорсткіх, нечалавечых загадаў і інструкцый зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны. Гэтыя дакументы поўнасцю развязвалі рукі гітлераўскім катам і забойцам, вызваляючы іх ад усялякай адказнасці за здзейсненыя злачынствы.

Яшчэ задоўга да агрэсіі верхаводы трэцяга рэйха адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам і план падзелу захопленай тэрыторыі. Восенню 1941 г. падзел часова акупіраванай Беларусі быў у асноўным завершаны. Яе этнаграфічную цэласную тэрыторыю захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым супольнасць тэрыторыі, мовы, культуры беларускага народа, што складвалася на працягу многіх вякоў яго гісторыі. Тэрыторыю рэспублікі па лініі Полацк — Барысаў на ўсходзе, Старыя Дарогі — возера Чырвонае на поўдні, па рацэ Зяльвянка і ўсходнім узлессі Белавежскай пушчы на захадзе вылучылі ў генеральную акругу, якая атрымала назву «Беларутэнія». Плошча акругі складала толькі чвэрць тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3 138 256 чалавек (па стане на 4 снежня 1941 г.). Беластоцкая вобласць, паўночныя раёны Брэсцкай і частка Баранавіцкай абласцей адышлі да акругі «Беласток», якая далучалася да Усходняй Прусіі. Частку Ашмянскага, Свірскага, Відзаўскага, Астравецкага, Смаргонскага і Пастаўскага раёнаў далучылі да генеральнай акругі «Літва». Віцебскую, Магілёўскую і ўсходнія раёны Мінскай абласцей, а таксама большую частку Гомельскай вобласці адносілі ў зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

Паўднёвыя раёны Гомельскай, Палескай і Пінскай абласцей, большая частка Брэсцкай вобласці былі ўключаны ў рэйхскамісарыят «Украіна», які быў створаны 20 жніўня 1941 г. на чале з Эрыхам Кохам. Ён падпарадкаваўся спецыяльна створанаму ў Берліне рэйхсміністэрству па справах акупіраваных усходніх абласцей, якое ўзначальваў Розенберг. Рэйхскамісарыят «Украіна» быў падзелены на 6 генеральных акруг. У генеральную акругу «Валынь — Падолія» з цэнтрам у Роўна ўвайшлі Ровенская, Валынская і Камянец-Падольская вобласці, а таксама паўднёвыя раёны Брэсцкай і Пінскай абласцей Беларусі. У генеральную акругу «Жытомір» былі ўключаны Жытомірская вобласць, паўночныя раёны Вінніцкай, а таксама паўднёвыя раёны Палескай вобласці, у тым ліку Брагінскі і Камарынскі раёны.

Перадача паўднёвых раёнаў Беларусі ў склад рэйхскамісарыята «Украіна» была праведзена нямецка-фашысцкімі захопнікамі без уліку нацыянальнай прыналежнасці большасці насельніцтва гэтых раёнаў, насуперак яго жаданню.

Узброенай апорай фашысцкага рэжыму з'яўляліся войскі вермахта. Гарнізоны і ўмацаваныя пункты ахоўных дывізій, палкоў, батальёнаў гітлераўцы размясцілі на ўсёй акупіраванай тэрыторыі Беларусі.

Загадам Гітлера ад 25 чэрвеня 1941 г. уся паўната ўлады на акупіраванай тэрыторыі перадавалася камандуючаму вермахтам. Для падтрымання так званага «новага парадку» была створана нямецкая цывільная адміністрацыя. Тут уся ўлада сканцэнтроўвалася ў руках рэйхскамісара, генеральных камісараў, гебітскамісараў, гарадскіх камісараў і розных «шэфаў» ды камендантаў, на

[1] Преступные цели гитлеровской Германии в войне против Советского Союза: Документы и материалы. М., 1987. С. 67–70.

пасады якіх прызначаліся толькі немцы. Мясцовая дапаможная адміністрацыя павінна была садзейнічаць акупантам у зняволенні савецкіх людзей, у рабаванні і вывазе з раёна матэрыяльных і людскіх рэсурсаў.

Устаноўлены на Украіне каланіяльны рэжым, у тым ліку на тэрыторыі Брагінскага і Камарынскага раёнаў, падтрымліваўся густой сеткай усялякіх карных паліцэйскіх органаў, такіх, як паліцыя бяспекі і СД, СС, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя парадку, жандармерыя і інш.

Усе савецкія законы на часова акупіраванай тэрыторыі фашысты абвясцілі несапраўднымі, пазбавіўшы насельніцтва якіх бы там ні было правоў. Замест іх акупацыйныя ўлады кожны дзень выдавалі загады пра «новы парадак», якія заканчваліся адной і той жа фразай: «Вінаватыя будуць пакараны смерцю». Цывільнаму насельніцтву забаранялася мяняць месцажыхарства без спецыяльнага дазволу; выходзіць на вуліцу, калі сцямнее; прымаць на жыхарства асоб не з мясцовага насельніцтва; падыходзіць да чыгуначнага палатна на адлегласць бліжэй за 100 метраў. За захоўванне зброі, дапамогу партызанам і падпольшчыкам пагражала смяротная кара.

Сурова рэгламентавалася ўсё жыццё людзей. Абсалютнае палітычнае бяспраўе павінна было, па задуме гітлераўцаў, ператварыць мясцовых жыхароў у бязмоўных, пакорных рабоў нямецкіх каланістаў, вытруціць з іх волю да барацьбы за свабоду і незалежнасць.

«Калі мы хочам стварыць нашу вялікую нямецкую імперыю, мы павінны перш за ўсё выцесніць і знішчыць славянскія народы — расіян, палякаў, чэхаў, славакаў, балгар, украінцаў, беларусаў. Няма ніякіх прычын не зрабіць гэтага» — так заяўляў ашалелы Гітлер[1], і гэтая маніякальная заява легла ў аснову палітыкі фашысцкага рэйха на акупіраваных яго войскамі тэрыторыях, у тым ліку Брагінскага і Камарынскага раёнаў.

У правядзенні сваёй палітыкі на акупіраванай тэрыторыі гітлераўцы шырока выкарыстоўвалі здраднікаў. Украінскія нацыяналісты складалі галоўную апору акупантаў у стварэнні мясцовых органаў, займалі кіруючыя адміністрацыйныя і гаспадарчыя пасады, грэючы рукі на рабаванні насельніцтва гарадоў і вёсак. Тыя з іх, што заселі ў дапаможнай паліцыі парадку, выконвалі самыя ганебныя даручэнні акупантаў у барацьбе супраць свайго народа, партызан і падпольшчыкаў. Шырока выкарыстоўвалі іх акупанты і ў карных аперацыях супраць партызан і насельніцтва.

Аб тым, якой бязмежнай была ўлада над жыхарамі, што панавала ў акупіраваных вёсках, сведчыць, напрыклад, распараджэнне ярунскага гебітскамісара Жытомірскай генеральнай акругі ад 29 красавіка 1942 г.: «За непаслушэнства старасту, галаве абшчыннай гаспадаркі і брыгадзірам, за нявыхад на работу і нядбайныя адносіны да работы кожны паліцай мае права на першы выпадак на месцы адсцябаць вінаватага бізуном. Калі ж хто-небудзь не падпарадкаваўся другі раз, то трэба паведаміць мне, і я дазволю павесіць вінаватага»[1].

Як і ўсякія каланізатары, нямецка-фашысцкія захопнікі намагаліся раз'яднаць савецкіх людзей, распаліць між імі нацыянальную варожасць. Украінцаў падбухторвалі супраць палякаў, палякаў супраць украінцаў і беларусаў, тых і другіх — супраць расіян, усіх разам — супраць яўрэяў. Асаблівую ўвагу фашысцкая прапаганда звяртала на тое, каб пасварыць украінцаў і беларусаў з расійскім народам.

Украінскія буржуазныя нацыяналісты вельмі стараліся дапамагаць акупантам у правядзенні антысавецкай прапаганды — гэта адпавядала іх ідэалагіч-

[1] Німецько-фашистський акупаційний режим на Україні. Київ, 1963. С. XI.

[1] Жытомірскі абласны дзяржаўны архіў. Ф. 143. Спр. 1. Л. 92.

ным поглядам. Нацыяналістычныя газеткі выходзілі ва ўсіх абласных цэнтрах і гарадах Украіны. Своеасаблівым афіцыёзам была «Нямецка-ўкраінская газета», якая распаўсюджвалася і ў Брагінскім раёне. На старонках прадажнага лістка прапагандаваўся звярыны нацыяналізм, узводзіўся брудны паклёп на ўсё савецкае, усхваляўся лад жыцця ў «новай Германіі», прадказвалася хуткая перамога фашыстаў, шырока папулярызаваліся ўсялякія «тэарэтыкі» з ліку здраднікаў украінскага народы, якія выступалі за падпарадкаванне Украіны іншаземным рабаўнікам. Уся гэта друкаваная дэмагогія мела на мэце адно: падарваць маральную стойкасць савецкіх людзей, прывіць ім пачуцці рабскага нізкапаклонства перад заваёўнікамі, гатоўнасці ісці ў навуку да немцаў. Але савецкія людзі не хацелі «ісці ў навуку» да фашысцкіх нелюдзяў, забіваць і рабаваць, і прафашысцкая прапаганда здраднікаў поспеху сярод насельніцтва Брагіншчыны, як і іншых акупіраваных раёнаў, не мела.

Гітлераўскія верхаводы яшчэ задоўга да нападу на нашу краіну падрыхтавалі праграму рабавання і раскрадання багацяў нашага народа, якая складала неаддзельную частку агульнага плана агрэсіі супраць Савецкага Саюза. У гэтай праграме захопнікі вельмі актыўна ўлічвалі матэрыяльныя і людскія рэсурсы Беларусі, імкнучыся паставіць іх на службу сваёй агрэсіўнай вайне.

Акупанты абкладвалі насельніцтва непасільнымі падаткамі — натуральнымі і грашовымі. Адзіных нормаў не існавала. Памер падаткаў залежаў ад волі мясцовых улад. Так, напрыклад, у генеральнай акрузе «Жытомір» селянін за карову павінен быў здаць 800 літраў малака і заплаціць 600 карбованцаў. Усе жыхары ад 14 гадоў павінны былі плаціць так званы «падушны падатак»: 100—200 карбованцаў з чалавека. Існавалі «дзяржаўныя» падаткі — грашовы з «абшчынных гаспадарак», падатак з сельскай гаспадаркі, са спадчыны; апрача таго, акупанты абавязвалі плаціць безліч падаткаў мясцовых: за будынкі, за транспартныя сродкі і жывёлу, за зямельныя ўчасткі, якія не падлягалі сельскагаспадарчаму падаткаабкладанню, і нават за сабак. Так, 27 студзеня 1942 г. спецыяльным распараджэннем рэйхскамісара Украіны быў устаноўлены падатак на сабак — па 50 карбованцаў у год за кожнага. Падаткаў было так многа, а метадычнае рабаванне вёсак акупантамі станавілася такім непасільным, што большасць сялян проста не магла іх выконваць. Гітлераўцы жорстка каралі за гэта. За невыкананне паставак малака, як правіла, забіралі кароў.

Кат украінскага народа Эрых Кох, выступаючы ў верасні 1942 г. у Роўна, так інструктаваў сваіх падначаленых: «Я вядомы як жорсткі сабака. За гэта мяне і прызначылі рэйхскамісарам Украіны. Наша задача — высмактаць з Украіны ўсё, што можна толькі ўзяць, не зважаючы ні на пачуцці, ні на ўласнасць украінцаў. Я чакаю ад вас крайняй жорсткасці ў адносінах да мясцовага насельніцтва». Вось яна — псіхалогія вампіра.

Метад адкрытага бязлітаснага рабавання і раскрадання народнага набытку ў акупіраванай Беларусі, як і ў іншых раёнах былога Савецкага Саюза, з'яўляўся адным з галоўных у фашысцкім арсенале сродкаў, з дапамогай якіх акупанты «атрымлівалі» яе багацці і «ставілі» яе эканоміку на службу агрэсіі.

У доўгім спісе злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі асабліваe месца займае прымусовы вываз мірных жыхароў на фашысцкую катаргу ў Германію. Ужо ў 1941 г. гітлераўцы распачалі на Украіне, у тым ліку і ў суседніх Брагінскім і Камарынскім раёнах, кампанію «добраахвотнай» вярбоўкі рабочай сілы на працу ў Германію. Каб заманіць ахвяры ў сваю пастку, фашысцкая прапаганда не скупілася на абяцанні, паказваючы ў ружовым святле нямецкі «рай». Людзям абяцалі, што ў рэйху яны будуць мець добры заробак, жыллё, магчымасць «пабачыць Захад»

і г. д. Але поспеху гэтыя абяцанкі не мелі. Калі «добраахвотная» кампанія сарвалася, акупанты пачалі літаральна паляваць на людзей. Фашысты ішлі на ўсё, каб выканаць план «мабілізацыі» рабочай сілы. Паліцыя праводзіла масавыя аблавы, арыштоўвала працаздольных і гвалтоўна адпраўляла іх у Германію. Гебітскамісар Ружына Жытомірскай вобласці выдаў такі загад: «Я не спынюся перад тым, каб спаліць будынкі (дамы) тых, хто не паедзе ў Нямеччыну, хто пратэстуе і не хоча працаваць у Нямеччыне»[1].

На асобным уліку ў фашысцкіх захопнікаў былі жыхары партызанскіх зон. Яны аб'яўляліся «бандытамі» ці «саўдзельнікамі» бандытаў, ставіліся па-за законам і падлягалі знішчэнню ці гвалтоўнаму вывазу ў рабства.

Усяго з Беларусі гітлераўцам удалося вывезці ў Германію звыш 380 тысяч грамадзян, у тым ліку з Брагінскага і Камарынскага раёнаў звыш 2000 чалавек.

У. І. Лемяшонак

Крывавы «новы парадак»

Акупіраваўшы Брагіншчыну і Камарыншчыну, гітлераўцы адразу ж ліквідавалі сістэму савецкіх уладных органаў і ўсталявалі суровы акупацыйны рэжым. Разам з іншымі паўднёвымі раёнамі Палескай вобласці Брагінскі і Камарынскі раёны ўваходзілі ў генеральную акругу «Жытомір» рэйхскамісарыята «Украіна». У складзе гэтай акругі Брагін быў цэнтрам гебіта. У раённых цэнтрах Камарын, Лоеў, Хойнікі і іншых уладу ўзначальвалі зондэрфюрэры або нямецкія шэфы раёнаў, пры якіх у якасці дапаможнага органа ствараліся раённыя ўправы на чале з бургамістрамі, ваенная камендатура і фашысцкія карныя органы. У сельскай мясцовасці замест ліквідаваных Саветаў былі створаны валасныя ўправы, якія ўзначальвалі бургамістры ці старшыны. У вёсках (абшчынах) акупацыйную ўладу ажыццяўлялі старасты.

У сістэме ваенна-паліцэйскай акупацыйнай адміністрацыі гітлераўцаў асаблівая роля належала паліцыі бяспекі і службе бяспекі (СД), якія тварылі ў Брагінскім і Камарынскім раёнах жудасныя злачынствы.

На тэрыторыі Брагіншчыны, Камарыншчыны і іншых суседніх раёнаў навядзеннем «новага парадку», рэалізацыяй злачынных планаў гаспадарча-эканамічнага асваення акупіраваных тэрыторый займаліся каманды тайнай палявой паліцыі (ГФП), СС, паліцыі бяспекі і СД, жандармерыі, паліцыі парадку і інш.

Пры фарміраванні мясцовых органаў акупацыйнай улады, у т. л. паліцыі аховы парадку, у так званае «мясцовае самакіраванне» акупанты падбіралі «кадры» як з ліку добраахвотнікаў — антысавецкіх і крымінальных элементаў, так і шляхам вярбоўкі з дапамогай гнюснага шантажу, запалохвання некаторых маладушных грамадзян.

Створаныя такім чынам органы акупацыйнага рэжыму пачалі ажыццяўляць палітыку адкрытага рабаўніцтва і ўціску насельніцтва. Былыя саўгасы былі перайменаваны ў земскія двары (зборныя пункты), дзе вёўся адкорм адабранай у грамадзян жывёлы і птушкі. Калгасы атрымалі назву земскіх або абшчынных гаспадарак. Да працы ў іх у прымусовым парадку прыцягваліся ўсе працаздольныя грамадзяне, нават састарэлыя і хворыя людзі. За ўхіленне ад прымусовых работ на абшчынных палетках і фермах вяскоўцаў збівалі палкамі, а самых непакорлівых нават забівалі да смерці або расстрэльвалі. За такую правінаснць гітлераўцы забілі састарэлага жыхара в. Савічы Т. Л. Анапрэенку, расстралялі жыхара в. Дублін А. А. Кабанчука і іншых. Шырока ўжываліся розныя штрафы — як грашовыя, так і канфіскацыйныя, калі за невыкананне паставак у сялян адбіралі сельгаспра-

[1] Жытомірскі абласны дзяржаўны архіў. Ф. 1510. Воп. 1. Спр. 4.

дукты, жывёлу. Загады сельскагаспадарчага каменданта аб спагнанні падаткаў і штрафаў выконваліся ўзброенымі атрадамі акупантаў і паліцэйскіх. Падчас правядзення такіх акцый сялян жорстка збівалі або нават забівалі за спробу абараніць сваю маёмасць. Так, немцамі быў застрэлены жыхар в. Новы Пуць Сямён Раманавец, калі ён выказаў нездавальненне рабаўніцкімі паводзінамі гітлераўцаў і паліцаяў на яго пчальніку. Падобных прыкладаў было нямала.

Але гітлераўцы не толькі рабавалі мірнае насельніцтва. Яны па-драпежніцку высякалі лясы і вывозілі ў «фатэрлянд» дзелавую драўніну найбольш каштоўных парод, адпраўлялі ў Нямеччыну помнікі духоўнай культуры і мастацтва, якія не ўдалося эвакуіраваць у савецкі тыл. Акупанты апаганьвалі або нават знішчалі культавыя будынкі, не спыняліся нават перад знішчэннем патрыятычна настроеных святароў і г.д.

У верасні 1941 года ў Брагіне пачаліся масавыя рэпрэсіі супраць мірнага насельніцтва. Першы ўдар быў нанесены па яўрэйскіх сем'ях і партыйна-савецкім актыве.

У двары тагачаснай беларускай школы было створана яўрэйскае гета, у якім утрымліваліся каля 600 чалавек, у т. л. 156 дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў. У тую жудасную восень 1941-га і пазней на грузавіках і падводах немцы звозілі яўрэяў, натоўпамі гналі людзей у Брагін з навакольных вёсак, з Камарыншчыны і Лоеўшчыны, дастаўлялі арыштаваных з Хойнікаў і іншых месцаў, нават з Азарычаў, Капаткевічаў, Калінкавічаў, Мазыра. Хапалі цэлымі сем'ямі. Затым гэтых замардаваных, ні ў чым не вінаватых людзей розных узростаў бязлітасна знішчалі. У прыватнасці, па загаду шэфа жандармерыі Вільгельма Фрыдрыха 27 лістапада 1941 года было ліквідавана брагінскае яўрэйскае гета. Больш за 600 яго вязняў (напачатку мужчын, а затым жанчын і дзяцей) расстралялі або закапалі жывымі ў дзвюх вялікіх ямах у раёне цяперашняй вуліцы Набярэжнай. У Камарыне, ва ўрочышчы Печы, каля Саласцянавага возера, і на двары калгаса «Серп і молат» было расстраляна 140 яўрэяў розных узростаў, пераважна жанчын і дзяцей.

Аб тым, якім зверствам падвяргалі акупанты яўрэйскае насельніцтва, расказалі адразу пасля вызвалення раёна яго жыхары — у пісьме, што было змешчана ў франтавой газеце «За Родину».

Отомстн, воин!

Товарищи бойцы! Недавно вы побывали в нашем местечке. Враг — ненавистный немец — бежал под ударамн Красной Армии. Но кровавый след тянется за ним. Знаете ли вы, какие страшные злодеяния творили фашистские мерзавцы в нашем местечке на протяжении двух с лишним лет оккупации?

8 августа 1941 года к нам в местечко прибыл так называемый «черный отряд», состоявший из эсэсовцев и финнов. Они согнали в здание и во двор школы 517 еврейских семей, оцепили школу пулеметами, а затем начали дикую, ни с чем не сравнимую расправу. Вначале расстреливали мужчин. Их выводили группами и по одному к речке и убивали выстрелами в затылок.

За мужчинами наступила очередь женщин и детей. Их расстреливали группами, в большую яму сталкивали одновременно десятки невинных жертв, а затем расстреливали из автоматов, забрасывали гранатами. Когда засыпали эти ямы, слышны были крики еще живых людей. Грудных детей убивали на руках матерей, подбрасывали их вверх и расстреливали на лету, омертвляли головой о землю.

Трагически погибла семья Гуревичей. Гуревич-мать была беременной. Ее гнали на расстрел с шестилетним сыном на руках и двумя дочерьми. Вначале убили мальчика. Девочек долго мучили на глазах матери: выстрелили в живот, прострелили одну, другую ногу и наконец добили. Потом застрелили и мать...

Товарищ боец! Таких преступлений еще не знал мир. Запомни их и отомсти за каждую каплю невинно пролитой крови.

Жители местечка:

Манжос П. М., Полуян К. И., Скороход Ф. Д., Полуян И. И., Воробей З. Л., Репченко С. И., Скороход Н. П., Зыбенок Ф. С., Григорьев В. П.

Газета 246-й стралковай дывізіі 61-й арміі «За Родину», 1943. № 124. Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі. Ф. 246. Воп. 2. Спр. 162. Л. 124.

На першым этапе рэпрэсій акупанты хапалі партыйна-савецкіх актывістаў, гаспадарчых кіраўнікоў, пасля знішчэн-

ня якіх браліся за іх родных і блізкіх. Усяго толькі ў Брагінскім і Камарынскім раёнах гітлераўцамі было загублена 285 сем'яў. Шырокую карную акцыю гітлераўскія душагубы спланавалі на 14 студзеня 1942 года, асабліва ў Камарынскім раёне. Праз старастаў вясковаму насельніцтву было загадана паўсюдна па-святочаму адзначыць стары Новы год, з кожнай вёскі выдзеліць па адным кані, запрэжаным у сані, нібыта для святочнага катання паноў-афіцэраў. Гэтая д'ябальская акцыя была задумана, каб прытупіць у людзей пільнасць і раптоўным налётам на конях захапіць тых, каго ім трэба было знішчыць. Сапраўды крывавыя трагедыі адбыліся ў той марозны вечар у вёсках Верхнія Жары, Гдзень, Кірава і іншых.

Пачынаючы з восені 1941 года спецыяльныя групы гітлераўцаў і паліцэйскіх наязджалі ў вёскі, арыштоўвалі чырвонаармейцаў-акружэнцаў і там жа іх расстрэльвалі або везлі на допыты і забойства ў Брагін. Працягвалася дзікае паляванне на яўрэяў, якія спрабавалі схавацца ад згубы ў вёсках. Жудасны рахунак ахвяр павялічваўся з кожным днём.

Вясной 1942 года па рашэнні вышэйшых нямецкіх улад Брагінскі, Камарынскі, Лоеўскі і Хойніцкі раёны былі зведзены ў вобласць з цэнтрам у Брагіне. Гебітскамісарам Брагінскай вобласці стаў адпеты нацыст Нольдэ. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам на тэрыторыі «гебітскамісарыята» і асабліва на Брагіншчыне і Камарыншчыне ажыццяўляўся жорсткі тэрор супраць мірнага насельніцтва.

Не менш цяжкай і страшнай былі для брагінцоў восень — пачатак зімы 1942 года. Адразу ж пасля няўдалых карных акцый супраць партызанскіх атрадаў імя Катоўскага, імя Чапаева, іншых партызанскіх фарміраванняў з Чарнігаўскага злучэння, якія дзейнічалі ў міжрэччы Дняпра і Прыпяці на тэрыторыі Камарыншчыны, па загаду Вільгельма Фрыдрыха зноў пачалося масавае знішчэнне мірнага насельніцтва. З Брагінскага, Камарынскага, Лоеўскага раёнаў было сабрана больш за 500 партыйна-савецкіх актывістаў, членаў іх сем'яў, родзічаў. На працягу трох сутак іх расстрэльвалі ў Брагіне, за жывёлабазай. У ліку забітых быў і даваенны член бюро Камарынскага райкама партыі М. І. Шульга.

Тады ж быў нанесены цяжкі ўдар па Брагінскім і Савіцкім патрыятычным падполлі.

Рэпрэсіўная дзейнасць акупантаў была б менш выніковай, калі б яны не мелі хоць і не шматлікіх, але верных памагатых — паліцэйскіх і іншых здраднікаў. Многія з іх са скуры вылузваліся, імкнучыся выслужыцца перад акупантамі. Яны высочвалі, вынюхвалі рэдка дзе ацалелых да таго часу чырвонаармейцаў-акружэнцаў, усіх, хто хоць нейкім чынам быў звязаны з партызанамі ці проста спачуваў ім. Па даносах здраднікаў, а часта і пры іх непасрэдным удзеле гітлераўцамі праводзіліся крывавыя акцыі: расстрэлы, спаленні людзей жывымі, забойствы дзяцей, як гэта было ў вёсках Бярозкі, Вельямоў, Кірава, Лубенікі, Мікулічы, Савічы і іншых. Так, у лубяніцкім лесе сямёра дзяцей зрабілі зямлянку, у якой хаваліся ад немцаў. Паліцэйскія высачылі іх і закідалі гранатамі.

Паступова мясцовыя паліцэйскія ўчасткі ператварыліся ў зброд рабаўнікоў і п'яніц. Таму ў верасні 1943 года яны былі распушчаны прыбыўшымі ў Брагін і Камарын кіраўнікамі жандармерыі. Пры дапамозе раённых паліцэйскіх фарміраванняў жандары стварылі апорныя нямецка-паліцэйскія гарнізоны ў буйнейшых населеных пунктах (Астрагляды, Верхнія Жары, Камарын, Крукі, Лоеў, Малажын, Мікулічы, Піркі, Ручаёўка, Савічы, Чыкалавічы і інш.). У Брагіне ж быў створаны рухомы паліцэйскі атрад на чале з мацёрым бандытам У. Гененкам.

Рэфармаваныя жандарска-паліцэйскія органы паставілі сваёй мэтай задушыць партызанскі рух шляхам масіраваных карных акцый. Часта

нямецка-фашысцкія акупанты зрывалі злосць за смелыя партызанскія дзеянні на мірным насельніцтве. Мясцовасці, што прылягалі да партызанскіх дыслакацый, яны ператваралі ў зоны выпаленай зямлі. Праводзячы аблавы, блакады месцаў базіравання партызанскіх атрадаў, асабліва вясной, летам і восенню 1943 года, гітлераўцы знішчалі цэлыя вёскі разам з мірным насельніцтвам. Так, толькі за некалькі майскіх дзён 1943 года адзін атрад эсэсаўцаў на чале з катам Шыманам спаліў у Баршчоўскім і Радзінскім сельсаветах[1] Камарынскага, а таксама ў суседнім Хойніцкім раёнах некалькі вёсак. Тады было знішчана 399 жыхароў населеных пунктаў Баршчоўка, Лясок, Масаны, Радзін, Уласы і інш.[1].

Але нават самыя жорсткія рэпрэсіі ворага не маглі зламаць волю савецкіх людзей, іх веру ў перамогу над гітлераўскім фашызмам. Гэтая вера надавала ім сілы, умацоўвала імкненне ўнесці свой пасільны ўклад у разгром акупантаў.

І. Ф. Ганжураў

[1] Да 1966 г. Баршчоўскі і Радзінскі сельсаветы ўваходзілі ў склад Камарынскага раёна.

[1] Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944. Мн., 1965. С. 86—87.

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

7.7.1941 г.

Пераклад з нямецкай мовы

I. Аб прызначэнні бургамістраў у валасцях

1. На пасады бургамістраў у першую чаргу павінны быць прызначаны палітычна надзейныя і кваліфікаваныя асобы, па магчымасці з ліку беларусаў.
2. Бургамістр з'яўляецца прадстаўніком воласці.
3. Ён з'яўляецца службовым начальнікам над усімі асобамі, якія працавалі ў воласці. Ён прымае іх і звальняе з працы.
4. Бургамістр нясе адказнасць за фінансавыя справы воласці.
5 Усе жыхары, якія пражываюць у воласці паводле становішча на 21.6.1941 г., павінны быць нанава ўлічаны і перапісаны бургамістрам.
6. Бургамістры неадкладна павінны паклапаціцца аб тым, каб усе жыхары былі запяспечаны адпаведнымі дакументамі, якія засведчваюць іх асобу: прозвішча і імя, час і месца нараджэння, месца жыхарства, склад сям'і, прафесія, прабыванне і род заняткаў, сацыяльнае паходжанне, веравызнанне, нацыянальнасць, падданства.
7. Бургамістры прыцягваюць да адказнасці вінаватых за ўчыненыя акты сабатажу ў даверанай ім воласці. Яны павінны ўсімі сродкамі прадухіляць акты сабатажу. У іх абавязкі ўваходзіць ахова прадпрыемстваў, размешчаных на тэрыторыі воласці, асабліва жыццёва важных.
8. Бургамістраў і іх намеснікаў у населеных пунктах, якія налічваюць да 20 000 жыхароў, прызначае мясцовы камендант, а ў населеных пунктах, у якіх звыш 20 000 жыхароў, прызначае камендант палявой камендатуры.

II. Аб забароне пакідання кватэр у начны час

1. У перыяд з 21.00 да 5.00 раніцы насельніцтву забараняецца пакідаць кватэры.
2. Выключэнні дапускаюцца па пісьмовым дазволе мясцовага каменданта для асоб, якія працуюць у начны час на жыццёва важных прадпрыемствах, дактарамі, акушэркамі, на машынах хуткай дапамогі.
3. Парушальнікі будуць найстражэйшым чынам не называцца мясцовымі камендантамі. Як дапаможнымі мерамі пакарання могуць быць часовы арышт з абмежаваным харчаваннем, насільна затрыманы і прыцягненне да працы.

III. Адметныя знакі для яўрэяў і яўрэек

1. Усе яўрэі і яўрэйкі, якія знаходзяцца на занятай рускай тэрыторыі і дасягнуўшыя 10-гадовага ўзросту, неадкладна абавязаны насіць на правым рукаве верхняга адзення і сукенкі белую паласу шырынёй да 10 см з намаляванай на ёй сіняісцкай зоркай або жоўтую павязку шырынёй да 10 см.

2. Такімі павязкамі забяспечваюць сябе самі яўрэі і яўрэйкі.

3. Яўрэям катэгарычна забараняецца вітаць.

Парушальнікі будуць найстражэйшым чынам карацца мясцовым камендантам па месцы жыхарства.

VIII. Стварэнне дапаможнай паліцыі

1. Для правядзення паліцэйскіх мер бяспекі бургамістрам даручана прыцягнуць у дапаможную паліцыю надзейных «фольксдойча», беларусаў, і калі такіх няма, тады палякаў і выкарыстоўваць гэту паліцыю са згоды з начальнікамі каманд паліцыі бяспекі.

2. Служачыя дапаможнай паліцыі, якія працуюць у цесным кантакце з мясцовымі айнзатцкамандамі паліцыі бяспекі і СД, могуць падтрымліваць сувязь толькі з мясцовымі начальнікамі паліцыі бяспечнасці і СД або прызначанымі імі органамі.

3. Служачыя дапаможнай паліцыі носяць белую нарукаўную павязку з надпісам «Дапаможная паліцыя».

4. Мясцовая камендатура да 20-га чысла кожнага месяца, а ўпершыню да 20.7.1941 года, паведамляюць пра колькасць і ўзбраенні дапаможнай паліцыі.

Камандуючы тылам групы армій «Цэнтр» фон *Шэнкендорф*, генерал пяхоты

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 952. Л. 1, 2, 4–5.

Выявіў і падрыхтаваў да друку *У. І. Лемяшонак*

НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ БРАГІНСКАГА І КАМАРЫНСКАГА РАЁНАЎ, ПОЎНАСЦЮ АБО ЧАСТКОВА ЗНІШЧАНЫЯ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ Ў 1941—1943 гг.

Названия населенных пунктов	Количество накануне войны		Количество уничтоженных		Даты уничтожения
	Дворов	Населения	Дворов	Населения	
Населенные пункты, не восстановленные после войны					
1. Байдакн	31	124	31	—	IX.1942
2. Кулаковнк	23	97	23	11	V.1943
Населенные пункты, восстановленные после войны					
1. Береэкн	180	221	140	21	IX.1943
2. Великий Лес	15	75	15	11	V.1943
3. Вельямов (Велимов)	46	180	46	20	VI.1943
4. Верхов. Слобода	65	265	60	29	V.1943
5. Выгреб. Слобода	73	274	73	30	V.1943
6. п. Громкий	27	121	27	2	X.1943
7. Демеевка	24	79	24	—	IX.1943
8. Дуброва	41	142	41	1	IX.1943
9. Желибор	42	248	42	9	V.1943
10. Жердное	108	378	86	38	V.1943
11. Жиличн	103	327	103	1	IX.1943
12. Залесье	130	580	110	2	IX.1943
13. Иолча Новая	150	611	50	18	IX.1943
14. Капореиские Ляды	23	104	20	—	IX.1943
15. Кирово	194	563	1	26	V.1943
16. п. Красная Поляна	18	105	18	—	IX.1943

Названия населенных пунктов	Количество накануне войны		Количество уничтоженных		Даты уничтожения
	Дворов	Населения	Дворов	Населения	
17. Кривча	116	402	115	11	IX.1943
18. Кулажин	132	573	132	33	V.1943
19. Лубеники	120	630	120	11	IV.1943
20. Майск	18	65	18	7	IV.1943
21. Маложин	142	493	119	3	IX.1943
22. Михалевка	94	450	94	6	V.1943
23. Нараги	32	102	32	1	V.1943
24. Нежихов	60	240	60	30	V.1943
25. Пересетинец	60	240	60	4	V.1943
26. Петрицкое	170	570	158	6	VII.1943
27. Петьковщина	27	143	21	—	V.1943
28. Пирки	196	670	93	15	VII.1943
29. Рогозин	22	150	22	2	IV.1943
30. Рудня Журавлева	78	385	78	16	IV.1943
31. Рытов	46	164	46	—	IX.1943
32. Старые Ляды	29	136	26	—	IX.1943
33. Старый Степанов	57	235	57	16	V.1943
34. Хатуча	92	369	84	13	VI.1943
35. Чемерисы	359	1436	307	6	IX.1943
36. Чиколовичи	215	780	190	—	VI.1943
37. Чирвоное Поле	14	98	14	3	V.1943
38. Бересневка	11	39	11	5	V.1943
39. Галки	106	318	99	18	IX.1943
40. Колыбань	290	760	265	7	IX.1943
41. Команов	95	390	95	16	IV.1943
42. Кононовщина	70	310	70	9	V.1943
43. Крюки	280	818	280	25	V.1943
44. Новый Степанов	53	230	53	41	V.1943

Друкуецца па кн.: Нацистская политика геноцида и «выжженной» земли в Белоруссии в 1941 – 1944 гг. Мн., 1984. С. 68 – 192.

Со знаменем на груди

...По дороге шел одинокий путник в старом крестьянском пиджаке, кирзовых сапогах и с котомкой за спиной. Его походка была усталой, ноги скользили по рассыпчатому снегу...

Это был один из тех, которым не повезло уже в самом начале войны. Семен Иванович Комеко последним возвращался из окружения в родной Брагин. Сколько перенесено тягот! Сколько горечи и боли накопилось у него в душе! Двенадцать лет отдано службе в Красной Армии. Пройден путь от рядового бойца до начальника штаба полка. И вот сейчас с таким позором приходится возвращаться в родные места. Как придется смотреть в глаза родственникам, соседям, знакомым? Такое чувство, словно один он виноват в том, что фашисты оккупировали столько территории, что нет больше полка и боевых друзей, что самому вот так, в гражданской одежде, приходится тайно пробираться к своей семье.

Разве кому расскажешь сейчас, как упорно дрались с врагом под Лидой, как сражались до последней возможности бойцы его части, преграждая путь врагу? Полк был смят превосходящими силами, но фашисты были остановлены и понесли ощутимые потери. Тот, кто остался живой, оказался в плену. Спасая полковое знамя и печать части, Комеко удалось укрыться в лесу.

Разве расскажешь сейчас, какие чувства побуждали Семена, пренебрегая опасностью, нести при себе знамя и печать воинской части № 1476 по оккупированной немцами территории?..

В Ильичах у Семена жила старшая сестра — Феодосия. К ней он и решил зайти, прежде чем отправиться в Брагин. Шел с мыслью: «Переночую, разузнаю все, может, и идти туда нечего».

У сестры Семен застал ее дочь Тамару.

...Семен внимательно слушал племянницу, лишь изредка задавал уточняющие вопросы. Он ликовал от радости. Не успел дойти до дома, а уже установил связь с теми, кто не покорился врагу, и в числе этих мужественных борцов его родственники. «Повидаю детей — и в лес к Филиппенкам. Вот только примут ли?» — думал он.

Тамара словно разгадала его мысли:

— Завтра собираюсь в Савичи за сводками. Расскажу о твоем возвращении. Уверена, тебя с радостью примут в отряд.

— Не знаю, Тамара, как тебя и благодарить.

— Свои люди, сочтемся,— засмеялась племянница.

И Семену вдруг захотелось сделать ей что-нибудь приятное, показать, что он смелый и честный солдат, которому можно доверять. Он плотнее задернул занавеску на окне и, прежде чем Тамара успела сообразить, что он собирается делать, снял гимнастерку вместе с нижней рубашкой. Оборвал шпагат, поддерживавший на груди знамя, и дрожащими от волнения руками развернул полотнище на спинке дивана. Тяжелая золотистая бахрома, свисая, поползла вниз и коснулась пола. Как от вспыхнувшего костра, озарилась багровым светом комната...

Семен нежно обнял Тамару и тихо проговорил:

— С нами оно не раз шло в бой, и мы насмерть стояли.— Помолчав немного, попросил: — Скажи командиру отряда, вынес знамя и сейчас готов передать партизанам до возвращения наших войск. А пока помоги мне спрятать его в надежное место[1].

У Тамары не нашлось слов, чтобы выразить свою радость и восхищение...

Друкуецца па кн.: Степаненко А. Непокоренные. Полесская быль. Мн., 1970. С. 92—95.

Той жудасны дзень

З успамінаў А. М. Старахатняга, былога жыхара а. Вельямоў

Было гэта ў жніўні 1943 года. Наша невялікая вёсачка жыла прадчуваннем бяды. Бо гітлераўцы і іх паліцэйскія хаўруснікі асабліва лютавалі, зрываючы злосць на мірным насельніцтве за паражэнні на франтах, за партызанскія налёты на паліцэйскія ўправы і гарнізоны. Відаць, не абышлося без даносу здрадніка: савецкіх актывістаў арыштоўвалі па спісах. Яшчэ 14 студзеня 1942 года ў нас былі схоплены камуністы Ц. Р. Зароўны і П. С. Сярдзюк. Пасля жорсткіх катаванняў іх расстралялі ў Брагіне.

Незадоўга да таго дня, пра які я хачу расказаць, у Вельямове схапілі Волкава Рыгора (Грыцка) — бацьку партызана Уладзіміра Волкава, а таксама прымака адной нашай вяскоўкі — нейкага Новіка. Пасля таго схапілі Грыцковага Валодзю, і ў нас пачаліся арышты. Потым мы даведаліся, што ў Брагіне быў расстраляны Грыцко, а ў Хобным — яго сын Уладзімір, старая Клімянок Хоўра, М. Г. Пшанько, А. І. Волкаў.

Перад тым акупанты спалілі вёску Крукі. Усе мы, падлеткі, не сталі начаваць дома. Звычайна ганялі коней на начлег. Раніцай глядзелі з балота на калодзежны журавель на ўскрайку вёскі: калі на ім вісела дзяружка, нельга было вяртацца з коньмі дамоў.

[1] Пасля вызвалення раёна восенню 1943 г. сцяг і пячатка воінскай часці № 1476 былі перададзены ваеннаму камандаванню.

Аднойчы мы пагналі коней за кар'еры тарфянога балота. З намі быў чырвонаармеец-акружэнец Андрэй Чарноў, які прыстаў у вёсцы ў прымы і быў сувязным партызанскага атрада імя Чапаева. У той дзень пры ім знаходзіўся трохгадовы хлопчык прымачыхі. Раніцай, яшчэ да ўсходу сонца, мы на балоце пачулі гудзенне, якое набліжалася. Зразумелі, што едуць немцы і паліцаі акружаць нашу вёску. Чарноў загадаў нам сесці пад стог і не бегаць, бо, сказаў ён, фрыцы перастраляюць усіх.

Неўзабаве ў прагалах туману мы ўбачылі, што па балоце ланцугом ідуць немцы. Чарноў схапіў хлопчыка пад паху і, прыгнуўшыся, пабег па аўсе на край балота, дзе быў густы алешнік. За аўсом немцы заўважылі яго і адкрылі агонь. Але Чарноў ацалеў і разам з малым прабраўся ў вёску Чыкалавічы, адкуль была яго жонка.

Немцы падышлі да нас, штурхаючы перад сабой Кацярыну — жонку Чарнова. Паліцэйскія вымусілі яе прывесці гітлераўцаў да мужа, на балота. Нас акружылі і разам з коньмі, на якіх сядзелі паліцэйскія і некаторыя з салдат, пагналі ў вёску, дзе мы ўбачылі многа машын. Нас паставілі ў шарэнгу каля плота. Неўзабаве пад'ехаў легкавік, з якога выйшаў немец з перакладчыкам. Вывалаклі моцна збітага, са звязанымі дротам рукамі прымака Новіка і падвялі да нашай шарэнгі.

— Кто здес ест партызант? — спытаў немец.

Новік падышоў да першага ў шарэнзе — Апанаса Волкава, доўга глядзеў на хлопца страшнымі вачыма.

— Партызант?

— Не...

Тое ж паўтарылася каля мяне. Потым дайшла чарга Максіма Пшанько, бацьку якога — Мітрафана Герасімавіча, ужо расстралялі ў Хобным. Новік кіўнуў галавой. Хлопца выхапілі з шарэнгі і павялі. Потым стала вядома, што яго разам з маці, дзвюма сёстрамі і іншымі вяскоўцамі спалілі.

Каля дзядзькі Андрэя Бандарэнкі немец зноў паўтарыў сваё пытанне.

— Не, пахітаў галавой Новік,— яго сын — афіцэр...

Перакладчык пацікавіўся, калі сына бралі ў армію.

— Сын вучыўся ў Ленінградзе на настаўніка,— растлумачыў дзядзька.— Пасля таго як пачалася вайна, не ведаю, дзе ён.

Бандарэнку не схапілі. І на нас, астатніх, Новік ні на каго болыш не паказаў.

Нас адпусцілі, загадаўшы ісці толькі па сваіх хатах і папярэдзіўшы, што ў чужых дварах расстраляюць. Бяжым з Апанасам і бачым, што з парога нашай хаты махае рукой мая маці і гукае:

— Апанас! Хадзі сюды, не бяжы ў свой двор!

Маці расказала, што ў нашу адсутнасць немцы выгналі вяскоўцаў з хат і паставілі каля Калузькавых бярозаў, пад прыцэлам кулямётаў. Стаялі так, пакуль не з'явіўся нейкі нямецкі чын і не пачаў штосьці чытаць з паперкі. Перакладчык загадаў усім ісці на свае селішчы. А немцы і паліцэйскія пайшлі па вуліцы, робячы меткі крыжыкамі на некаторых варотах. Потым з тых двароў забралі ўсіх жыхароў і сагналі ў двор Грыцка. Апанас выскачыў з нашага двара і забег у сваю хату. Дарэчы, ён тады ацалеў, цяпер жыве ў в. Любань Акцябрскага раёна.

Немцы пасадзілі вяскоўцаў з Грыцковага двара ў крыты грузавік і некуды павезлі. Мы думалі, што ў Піркі.

Запаліўшы хаты з крыжыкамі на варотах, фашысты і паліцаі селі ў машыны і паехалі з вёскі. А мы пачалі тушыць агонь, не дапускаючы яго да сваіх хат. Пасля таго мы, хлапчукі, пачалі аглядаць пажарышчы. На месцы хлява ў двары Волкава Паўла Раманавіча ўбачылі чорную кучу, якая густа дымілася. Наблізіўшыся да згарэўшага хлява, мы ўбачылі, што з тае кучы тырчаць чалавечыя ногі. Людзі ўсё зразумелі: у кучы спаленыя вяскоўцы. Загаласілі жанчыны. Толькі па кавалках адзення і гузіках

вяскоўцы пазнавалі родных і блізкіх. Ды на маленькіх дзецях, якія не абгарэлі, затуленыя мацярынскімі целамі.

Мужчыны зрабілі вялікую скрыню, у якой усіх загінуўшых і пахавалі. Пазней запрасілі папа, паставілі пры дарозе на ўскраіне вёскі крыж. Каля яго разаслалі палатно і справілі памінкі...

Напрыканцы 60-х гадоў каля месца пахавання спаленых вельямоўцаў быў узведзены цагляны абеліск з металічнай плітой, на якой пералічаны прозвішчы ахвяраў фашысцкага тэрору.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Адны чорныя галавешкі...

З успамінаў М. Ц. Назаравай, жыхаркі в.Вярховая Слабада

Дажджлівым лістападаўскім ранкам 1941 года гітлераўцы пад дуламі аўтаматаў вывелі з хат семярых камуністаў нашай вёскі Вярховая Слабада і павезлі ў Брагін. Сярод іх быў і мой дзядзька Рыгор Васільевіч Літаш. Але яму цудам удалося ўцячы па дарозе, уратавацца. З параненай нагой, на трэці дзень ён адшукаў у лесе партызан. Дзядзьку прызначылі памочнікам камандзіра гаспадарчага ўзвода.

Разам з дзядзькам у лесе была яго сям'я — жонка і шасцёра дзяцей. Старэйшыя дочкі — Ніна і Марыя — ноччу часта хадзілі ў вёску па прадукты. Мая маці, Кацярына Савельеўна, пякла хлеб і праз надзейных людзей перадавала партызанам. Часта яны начавалі ў нашым доме, атрымлівалі звесткі пра ворага.

Другі мой дзядзька — Лаўрэнцій — працаваў па заданні партызан у нямецкім гарнізоне, які размяшчаўся ў райцэнтры. Правакатар выдаў яго. Жорстка пакаралі за гэта ўсю сям'ю — жонку Надзею і васьмімесячную дачку. Іх забілі ў Брагіне.

Неўзабаве карнікі даведаліся, што наша сям'я падтрымлівае сувязь з партызанамі. За домам устанавілі назіранне. Аднойчы да нас ішоў з лесу па прадукты дзядзька Рыгор. Але ён своечасова заўважыў варожую засаду і ўцёк. Тады ў хату ўварваліся немцы. Яны моцна збілі маці, выкінулі яе на снег. Доўга дапытвалі адзінаццацігадовага брата Грышу, але ён нічога не сказаў. Стаяў на сваім: «Не ведаю ніякіх партызан».

Жорстка расправіліся з маімі аднавяскоўцамі фашысты ў красавіку 1942 года. Жыхароў зганялі ў хаты, хлявы і спальвалі жывымі. Калі прыйшла наша чарга, маці крыкнула: «Уцякайма, дзеці. Усіх не заб'юць!» Мы кінуліся ў прыдарожныя кусты. Ззаду загрымелі стрэлы, але, на шчасце, кулі нікога з нас не закранулі. Мы схаваліся і перасядзелі да ночы ў нейкай яміне. Адтуль бачылі, як гарэла вёска, чулі страшныя крыкі жанчын і дзяцей. Потым усё сціхла. Ад нашай вёскі засталіся адны чорныя галавешкі.

Няволя не зламала

З успамінаў І. І. Дзяльца, жыхара в.Вутлы

У 1940 годзе па накіраванні калгаса я паехаў на вучобу ў школу фабрычна-заводскага навучання ў горад Часаў Яр Данецкай вобласці. Там мяне і заспела нямецкая акупацыя. На Украіне пачаліся мае нявольніцкія пакуты (турма ў г. Лубны, лагер ваеннапалонных у г. Харог, турма і лагер у г. Ромны). А потым такіх, як я, нявольнікаў пагрузілі ў таварныя вагоны і павезлі ў Германію. Там я трапіў у лагер Караў, каля Берліна. Далёка ад радзімы мая непакорная натура не магла змірыцца з думкай аб канчатковай страце свабоды. Згаварыўся з ленінградцам Конанавым Іванам Іванавічам, і мы прадпрынялі адчайную спробу вырвацца з лагера. Але ўцёкі не ўдаліся, ва ўсякім выпадку для мяне. Назаўтра я быў затрыманы нейкім немцам. Конанаў жа, магчыма, уцёк. Толькі не ўяўляю сабе, як можна было ўцячы з далёкай, чужой краіны, не ве-

даючы яе мовы, без адзення і харчоў.

Я быў кінуты ў берлінскую турму на Аляксандрплац. Прайшоў праз многія катаванні, але нейкім цудам ацалеў. Потым быў размеркавальны лагер, а неўзабаве мяне прывезлі ў берлінскі лагер Байзельштрасэ. Працаваў на радыётэлефоннай фабрыцы. У адным бараку са мной у лагеры жыў Вежнавец Мікалай, калі не памыляюся, быў ён з Нараўлянскага раёна.

Праз сем месяцаў за сабатаж на рабоце я зноў трапіў у тую ж берлінскую турму, адкуль праз два месяцы быў пераведзены ў канцлагер Аўшвіц, што каля польскага горада Катавіцы. Там мне накалолі нумар 121775. Відаць, з аднаго месца зняволення ў другое на вязняў перадаваліся нейкія характарызуючыя іх звесткі, бо на кожным новым нявольніцкім этапе да мяне ставіліся асабліва падазрона і прыдзірліва. Напэўна, менавіта таму доўга не затрымалі і ў Аўшвіцы. Дзесьці праз паўгода перавезлі ў канцлагер Бухенвальд, а яшчэ праз месяц — у канцлагер Дора. Той самы, вязні якога працавалі на падземным заводзе па выпуску кіруемых снарадаў і ўжо самім фактам выключнай сакрэтнасці гэтага ваеннага аб'екта былі асуджаны на немінучую смерць.

Але лёс, пры ўсіх маіх нягодах і выпрабаваннях, усё ж быў літасцівы да мяне. Вясной 1945 года мяне перавезлі ў Бользен, дзесьці каля Фалінксбастэля. А праз два ці тры тыдні лагер занялі саюзнікі — амерыканцы. Так мы выйшлі на волю, і ў маі 1945-га я ўжо служыў у Савецкай Арміі.

У лагерах і турмах гітлераўцы рабілі ўсё магчымае, каб вытруціць у душах сваіх ахвяр усё чалавечае, зрабіць іх маўклівымі і паслухмянымі рабамі. Але гэта ім удавалася далёка не заўсёды. Як ні душылі непасільнай працай, як ні марылі голадам і холадам, няволя мяне не зламала.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Лісты з палону

Паводле сведчання А. К. Пракопенкі, жыхара в. Жылічы[1]

В марте м-це 1943 г. из дер. Жиличи в Германию немцами угнано на каторгу местных жителей молодежи в количестве 16 человек. Угнанная в Германию Корж Татьяна Федоровна пишет родителям в июле 1943 года: «Мне очень скучно, передавайте привет хоть пташками, а я Вам зозулькою. Зачем мамаша народила, зачем на свет нас создала, а лучше бы у мори утопила, што б я на свете не жила».

В марте м-це 1943 года Корж Т. Ф. в открытке пишет: «Я работаю у хозяина, дорогая мамаша, я дома работала с темненького до темна, а здесь работаю с шести часов и до шести. Дорогие родители, я дома в недельку работала да плясала, а тут нет того дня, что бы я песенок не пела»[2].

В ноябре м-це 1943 года при отступлении немецкие фашисты увели в Германию жителей дер. Жиличи в количестве 19 человек...

Здзекі з ваеннапалонных

Са сведчанняў Л. Е. Ярмоленкі, жыхара в. Малейкі

4 студзеня 1945 г.

...Я, гражданин дер. Малейки... Знаю, как немецкие изверги издевались над военнопленными и гражданами Малейковского сельсовета.

10 июля 1942 года в дер. Малейки на подводах из местечка Брагин приехала группа СД в количестве вооруженных 8 человек, схватили 4 человека военнопленных и увезли в м-ко Брагин, которых на вторые сутки расстреляли, а 28 декабря 1942 года вторично приехали

[1] Запісана 9 студзеня 1945 г.

[2] Горкая іронія, інашасказ, калі параўнаць з тым, што сказана ў першым лісце: «...што б я на свете не жила». *(Рэд.)*

из СД 15 вооруженных в дер. Малейки, забрали одного военнопленного и 3 граждан д. Малейки и увезли в м-ко Брагин, где над ними издевались и расстреляли.

С 10 июля по 28 декабря 1942 года с дер. Котловица было уничтожено и замучено в м-ке Брагин 8 человек местных граждан и 3 военнопленных человек.

Немецко-фашистские изверги вывели с дер. Котловица одного военнопленного по имени Женя и крепко избили и увезли в м-ко Брагин, где был расстрелян.

28 декабря 1942 года в дер. Городище приехала группа СД, забрала 2-х граждан, которых завезли в м-ко Брагин, где были замучены и уничтожены.

28 декабря 1942 года из дер. Заречье было взято группой СД 8 человек, из которых два военнопленных, которых увезли в Брагин и расстреляли.

28 декабря 1942 года из деревень Новый и Старый Мокрец было взято группой СД в м-ко Брагин 8 человек, которые были замучены, уничтожены немецко-фашистскими извергами.

Зверское издевательство над тремя женщинами по национальности еврейки немецко-фашистскими захватчиками, которые произвели над ними невыносимые пытки, как-то: избивали прикладами, палками, поджиганием на костре, двух женщин немецко-фашистские изверги замучили на месте, в дер. Старый Мокрец, а одну завезли в м-ко Брагин и уничтожнли.

28 декабря 1942 года из дер. Селец было взято группой СД в м-ко Брагин 5 человек и уничтожено.

28 декабря 1942 года из дер. Тельмана был взят гр-н Котченко в м-ко Брагин немецко-фашистской группой СД, где был замучен и уничтожен через 2 дня.

27 ноября 1941 года расстреляно военнопленных в дер. Селец в количестве 18 человек отрядом СД.

Дзяржайны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 7021. Воп. 91. Адз. зах. 10. Л. 99 зв. — 100.

Са сведчання М. А. КРЫВУЛЬКІ, жыхара в. Нежыхаў

5 студзеня 1945 г.

...10-го января 1943 года в нашу деревню Нежихов приехали на подводах около 600 немцев — солдат и офицеров. Они были вооружены автоматами, и на возах были пулеметы. Они со всех сторон окружили нашу деревню. Когда в деревне оказались немцы, гр-не, зная о том, что немцы убивают и сжигают мирных гр-н, подвергают их неслыханным пыткам и издевательствам, начали убегать из деревни. По рассказам граждан нашей деревни, Василенко Федор Яковлевич, Василенко Анна Федоровна, Шутов Алексей Фокович и Шутов Иван Фокович находились недалеко от гумна, увидев это и заподозрив о том, что они скрываются, немцы начали стрелять из автоматов и винтовок зажигательными пулями и подожгли гумно.

Когда начало гореть гумно, вышеперечисленные гр-не вышли из гумна, в это время немецкие солдаты Василенку Федору Яковлевичу выбили правый глаз. Лицо его было все в крови, а его дочке разбили голову. Остальные немецкие солдаты в это время согнали всех гр-н мужчин, женщин и детей на улицу и привели туда Василенку Федора с выбитым глазом, избитым, еле живым, и его дочку Анну Федоровну, отвели несколько шагов от стоявшей толпы народа и на глазах у всех выстрелом из автомата один немец в спину расстрелял Василенку Федора и его дочку Анну.

В тот же день в присутствии гр-н, стоявших на улице, был ранее избит немцами прикладами гр-н Гуляй Иван Владимирович, а потом в присутствии всех расстрелян выстрелом в затылок с автомата за то, что он по каким-то причинам не успел выйти на улицу, где немцы сгоняли народ.

Народ, стоя под охраной на улице и видя, что немцы их будут убивать, начал кричать, плакать, особенно нельзя было вытерпеть, когда на руках у матерей кричали маленькие ребятишки. Потом

всю толпу граждан около 150 человек согнали в большой дом, там было столько крика и прощаний детей с матерями, поскольку думали, что доживают последние минуты жизни, в этом доме был лично я. Просидели мы там с утра до вечера. Потом немцы выпустили и начали с оружием гнать нас к сараю с тем, чтобы в данном сарае всех спалить. Но народ от страха и ужаса упал на колени и не пошел в сарай. Тогда немецкий переговорщик сказал: «Идите домой и будете жить до второго нашего приезда».

Когда народ сидел в доме Пилипенко Иосифа под охраной, немцы в это время грабили имущество граждан: открывали сундуки и забирали всю одежду, обувь и продукты питания.

Вторично, 23 мая 1943 г., приехали немецкие войска около 200 человек и начали запаливанием соломы зажигать дома, а гр-н мужчин, женщин и детей выгоняли в конец деревни, где были наготовленные пулеметы для расстрела гр-н, и все гр-не, увидев, что нх будут расстреливать, начали убегать кто куда, а немцы тогда начали стрелять из пулеметов и автоматов. И тогда мужчин, женщин и детей убили 20 человек, а так же живьем сожгли Беленок Феодосию Фоковну, женщину 30 лет, и двое малых детей — Василенко Екатерину Федоровну, 6 лет, мальчика Пилипенко Илью Николаевича, 6 лет.

Вообще, немцы систематически истребляли мирных советских граждан: мужчин, женщин, стариков и детей. Всего за время оккупации немцами в нашей деревне убито и сожжено живьем 36 человек, в том числе женщин 8 человек и детей 6 человек. Кроме этого, собирали граждан и под силой оружия угоняли в Германию на каторжные работы, всего угнано 28 человек, в том числе женщин 11 человек и детей 11 человек...

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 7021. Воп. 91. Адз. зах. 10. Л. 1036.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Нязломны дух падполля

Нягледзячы на жорсткі акупацыйны рэжым, ужо з восені 1941 года ў Брагіне і некаторых буйнейшых населеных пунктах раёна (Савічы, Жэрднае, Нежыхаў, Асарэвічы і інш.) пачалі дзейнічаць падпольныя партыйна-камсамольскія, камсамольска-маладзёжныя антыфашысцка-патрыятычныя арганізацыі і групы, іх сувязныя. З часткі іх саставу (Брагін, Савічы) затым былі створаны першыя партызанскія групы, якія ў далейшым паклалі пачатак партызанскім атрадам імя Катоўскага і імя Варашылава.

Падпольшчыкі з'яўляліся сувязнымі партызанскіх фарміраванняў, вялі агітацыйна-палітычную работу, здабывалі і перадавалі партызанам каштоўныя звесткі пра ворага, папаўнялі рады лясных салдат, дастаўлялі ім зброю, боепрыпасы, медыкаменты. У сваёй дзейнасці члены падпольных арганізацый і груп абапіраліся на паўсядзённую падтрымку і дапамогу насельніцтва.

У пасляваенны час партыйнымі і савецкімі органамі была праведзена вялікая работа па вывучэнні гераічнай дзейнасці Брагінскага падполля і ўвекавечанні імён патрыётаў-падпольшчыкаў.

І. Ф. Ганжураў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БЮРО ГОМЕЛЬСКАГА АБКАМА КП БЕЛАРУСІ

24 красавіка 1970 г.

Аб Брагінскім патрыятычным падполлі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны (лістапад 1941 — верасень 1943 гг.)

Рассмотрев представленные материалы бюро Брагинского райкома КПБ о деятельности антифашистского патриотического подполья в Брагинском районе Гомельской области в период Великой Отечественной войны, бюро обкома КПБ отмечает, что в декабре 1941 года в г. п. Брагине под руководством бывшего председателя местной промартели «Красный Октябрь» Зиновича Петра Григорьевича, оставленного партийными органами на подпольную работу в тылу немецко-фашистских захватчиков, была создана подпольная антифашистская патриотическая группа.

В это же время в д. Савичи Брагинского района под руководством братьев Степана Илларионовича и Федора Илларионовича Филиппенко создалась другая подпольная патриотическая группа.

В апреле 1942 года Зинович П. Г. ушел с группой подпольщиков в лес для организации партизанскої борьбы, возложив руководство подпольной группой на Дубину Николая Лукьяновича — бывшего бухгалтера артели «Красный Октябрь».

В январе 1942 года перешли на нелегальное положение братья Филиппенко. Они, как и Зинович, из числа подпольщиков создали партизанскую группу. Впоследствии эти группы объединились в партизанский отряд имени Котовского.

Во время рейда партизанского соединения Ковпака, снабдив командованне соединения разведданными по обороие Брагина, подпольщики принимали участие в разгроме местного гарнизона. В сентябре 1943 года после разгрома немецкого гарнизона в Брагине подпольщики ушли в партизанский отряд имени Котовского.

Состав патриотического подполья г. п. Брагин, д. Савичи и прилегающих к ним населенным пунктам насчитывал 45 человек.

В борьбе с немецко-фашистскими захватчиками погибли подпольщики: Дубина Н. Л., Елишевич В., Абушенко К., Ефименко Н. М., Юденок К. М., Леоненко Н. А., Березняцкий Р. К., Бабич И. И., Фурс А. М., Ануприенко П. Т., Клишевич М.

Бюро обкома КПБ считает факт существования подпольной патриотической организации в Брагинском районе в период немецкой оккупации достоверным и п о с т а н о в л я е т:

1. Признать патриотическую деятельность подпольной антифашистской организации в Брагинском районе в период с ноября 1941 года по сентябрь 1943 года.

2. Утвердить состав подпольной патриотической организации, действовавшей на территории Брагинского района в период немецкой оккупации. (Список прилагается.)

Секретарь Гомельского обкома КП Белоруссии *(В. Гвоздев)*

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4853. Воп. 1. Спр. 1. Л. 1—3.

СПІС УДЗЕЛЬНІКАЎ БРАГІНСКАГА (БРАГІНСКАЙ І САВІЦКАЙ ГРУП) ПАТРЫЯТЫЧНАГА ПАДПОЛЛЯ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ (ЛІСТАПАД 1941 — ВЕРАСЕНЬ 1943 гг.)

Фамилия, имя и отчество	Год рождения	Национальность	Партийность	Выполняемая работа в подполье	Время нахождения в подполье	Работа до войны	Место жительства
Зинович Петр Григорьевич	1915	бел.	член КПСС с 1940 г.	Комиссар парт. отряда им. Котовского, секретарь Брагинского подпольного райкома КПБ(б)	с 26.VIII. 1941 по 23.XI.1943	Директор Брагинской инвалидной артели «Красный Октябрь»	Минская обл., г. Клецк, ул. Панкратовская, д. 9

Фамилия, имя и отчество	Год рождения	Национальность	Партийность	Выполняемая работа в подполье	Время нахождения в подполье	Работа до войны	Место жительства
Дубина Николай Лукьянович	1914	-»-	б-п	с XI.1941 по IV.1942 рядовой Брагинской подпольной организации, с IV.1942 по VIII.1942 руководитель Брагинской подпольной организации	с XI.1941 по VIII. 1942	бухгалтер Брагинской артели «Красный Октябрь»	расстрелян в августе 1942 года
Репченко Савелий Иванович	1910	-»-	член КПСС с 1951 г.	с IV.1942 по X.1942 рядовой участник Брагинской подпольной организации, с X.1942 по IX.1943 руководитель Брагинской подпольной организации	с IV.1942 по IX.1943	учитель 44-й Минской школы	г. Минск, 70 пр. Партизанский, д. 20, кв. 60
Марченко Прокофий Федорович	1910	-»-	б-п	с IV.1942 по X.1943 зам. руководителя Брагинской подпольной организации	с IV.1942 по IX.1943	слесарь промкомбината	г.п.Брагин, ул. Партизанская, 24
Михневич Александр Ефимович	1920	-»-	-»-	с XI.1941 по IV.1942 рядовой Савичской подпольной организации	с XI.1941 по IV.1942	военнослужащий Сов. Армии	Ростовская обл., Аксайский р-н, винсовхоз «Реконструктор»
Марченко Анна Ивановна	1916	-»-	-»-	рядовая Брагинской подпольной организации	с IV.1942 по IX.1943	учительница	г.п.Брагин, ул. Партизанская, 24
Стрибук Денис Федорович	1911	-»-	-»-	с IV. 1942 по IX.1943 член Брагинской подпольной организации	с IV.1942 по IX.1943	врач, военнослужащий Сов. Армии	г. Минск, Снежный пер., д. 7, кв. 1
Стрибук Татьяна Ивановна	1918	рус.	-»-	член Брагинской подпольной организации	с IV.1942 по IX.1943	военнослужащая Сов. Армии	-»-
Скороход Николай Васильевич	1918	-»-	член КПСС с 1961 г.	член Брагинской подпольной организации	с IV.1942 по IX.1943	бухгалтер райфинотдела	г.п. Брагин, ул. Первомайская, 35
Скороход Евгения Ивановна	1912	-»-	-»-	рядовая Брагинской подпольной организации	с VI. 1942 по VIII.1942	кассир маслозавода	расстреляна в августе 1942
Симукова (Лысенко) Ольга Григорьевна	1918	-»-	-»-	связная Брагинской подпольной организации	с IV.1942 по IX.1943	зав. детсадом № 2 г. п. Брагин	г. п.Брагин, ул. Советская, 80
Ковш Константин Антонович	1914	-»-	-»-	рядовой Брагинской подпольной организации	с III.1942 по IX.1942	военнослужащий Сов. Армии	Брагинский р-н, д. Глуховичи

Фамилия, имя и отчество	Год рождения	Национальность	Партийность	Выполняемая работа в подполье	Время нахождения в подполье	Работа до войны	Место жительства
Голуб Григорий Антонович	1922	-»-	член ВЛКСМ	рядовой Брагинской подпольной организации	с III.1942 по X.1942	колхозник	погиб в октябре 1942 г.
Скороход (Золотухина) Ольга Игнатьевна	1922	-»-	-»-	рядовая Брагинской подпольной организации	с XII.1941 по V.1943	кассир Брагинской артели «Красный Октябрь»	г. п. Брагин, ул. Советская, 85
Демус Евгений Андреевич	1924	-»-	член КПСС с 1960 г.	с XI.1941 по VIII.1942 рядовой Брагинской подпольной организации	с XI.1941 по VIII.1942	окончил Брагинскую СШ	г. Тюмень, ул. Рижская, 55, кв. 8
Скороход Ольга Романовна	1915	-»-	б-п	рядовая Брагинской подпольной организации	с III.1942 по IX.1943	учительница	г. Минск, бульвар Луначарского, д. 5, кв. 28
Винницкий Николай Федорович	1920	-»-	член КПСС с 1955 г.	рядовой Брагинской подпольной организации	с I.1942 по IX.1943	окончил Брагинскую СШ	Гомельская обл., г. Добруш
Свирденко Петр Гаврилович	1915	-»-	б-п	рядовой Брагинской подпольной организации	с VIII.1942 по IX.1943	наборщик типографии	г.п. Брагин, ул. Советская, 37
Демиденко Георгий Иванович	1925	-»-	-»-	рядовой Брагинской подпольной организации	с XI.1941 по V.1942	окончил 8 кл. Брагинской СШ	Брагинский р-н, д. Глуховичи
Петренко Гавриил Иванович	1913	-»-	-»-	рядовой Брагинской подпольной организации	с III.1942 по IX.1943	бухгалтер Брагинского отдела комунхоза	Брагинский р-н, д. Глуховичи
Федченко Иван Федорович	1924	-»-	-»-	рядовой Брагинской подпольной организации	с XI.1941 по IX.1943	учащийся	г.п.Брагин, ул. Калинина, 1
Камеко Семен Иванович	1907	-»-	-»-	рядовой Брагинской подпольной организации	с XI.1941 по IX.1943	офицер Сов. Армии	Брестская обл., г. п. Ганцевичи, ул. Первомайская, 10
Стоянов Федор Семенович	1923	-»-	-»-	рядовой Савичской подпольной организации	с III.1942 по IX.1943	бухгалтер колхоза	г. Рига, ул. Мнера, 82/11
Филиппенко Степан Илларионович	1908	-»-	член КПСС	с XI.1941 по XII.1941 руковод. Савичской подпольной организации	с XI.1941 по XII.1941	председатель Савичского сельпо	Брагинский р-н, д. Савичи
Филиппенко Федор Илларионович	1910	-»-	член КПСС с 1938 г.	с XI.1941 по XII.1941 руковод. Савичской подпольной организации	с XI.1941 по XII.1941	инструктор Комаринского РК КПБ	убит в марте 1943 г.

Фамилия, имя и отчество	Год рождения	Национальность	Партийность	Выполняемая работа в подполье	Время нахождения в подполье	Работа до войны	Место жительства
Загорянский Федор Антонович	1901	-»-	член КПСС с 1956 г.	с XI.1941 по XII.1941 рядовой Савичской подпольной организации, с XII.1941 по VI.1942 руководитель Савичской подпольной организации	с XI.1941 по VI.1942	бухгалтер Савичского сельпо	Брагинский р-н, д. Савичи
Загорянская Нина Николаевна	1926	-»-	член КПСС с 1964 г.	с XII.1941 по IV.1943 рядовая Савичской подпольной организации	с XII.1941 по IV.1943	окончила школу	г. Феодосия, ул. Куйбышева, 32
Загорянская Феодосия Мефодьевна	1909	-»-	б-п	с XII.1941 по IX.1942 рядовая Савичской подпольной организации	с XII.1941 по IX.1942	колхозница	Брагинский р-н, д. Савичи
Загорянская Феодосия Ивановна	1900	-»-	-»-	с XII.1941 по IV.1943 рядовая Савичской подпольной организации	с XII.1941 по IV.1943	учительница Ильичской СШ	г. Феодосия, ул. Куйбышева, 32
Загорянская Лидия Антоновна	1914	-»-	-»-	рядовая Савичской подпольной организации	с XI.1941 по VIII.1942	учительница Савичской СШ	расстреляна немцами в августе 1942 г.
Щука Татьяна Сергеевна	1910	-»-	-»-	рядовая Савичской подпольной организации	с XI.1941 по VIII.1942	колхозница	-»-
Березняцкий Роман Купреевич	1907	-»-	к. в чл. КПСС	рядовой Савичской подпольной организации	с XI.1941 по VIII.1942	шофер Брагинского РОМВД	-»-
Ефименко Назар Мефодьевич	1900	-»-	б-п	рядовой Савичской подпольной организации	с XII.1941 по VIII.1942	директор В.-Жаровской школы	-»-
Обушенко Клавдия Федоровна	1915	-»-	-»-	рядовая Савичской подпольной организации	с XI.1941 по VIII.1942	учительница Савичской СШ	-»-
Анапрненко Петр Тимофеевич	1912	-»-	-»-	рядовой Савичской подпольной организации	с XI.1941 по VIII.1942	военнослужащий Сов. Армии	-»-
Бабич Иван Иванович	1892	-»-	-»-	рядовой Савичской подпольной организации	с XI.1941 по VIII.1942	колхозник	-»-
Юденок Клавдия Мефодьевна	1921	-»-	-»-	рядовая Савичской подпольной организации	с XI.1941 по VIII.1942	студентка Могилевского пединститута	-»-
Гриценко Фома Яковлевич	1910	-»-	-»-	с XI.1941 по XI.1942 рядовой Савичской подпольной организации	с XI.1941 по XI.1942	колхозник	Брагинский р-н, д. Савичи

Фамилия, имя и отчество	Год рождения	Национальность	Партийность	Выполняемая работа в подполье	Время нахождения в подполье	Работа до войны	Место жительства
Шареюк Михаил Васильевич	1902	-»-	чл. КПСС	с XI.1941 по V.1942 рядовой Савичской подпольной организации	с XI.1941 по V.1942	председатель В.-Слободского с/с	погиб в бою с оккупантами
Пилипенко Петр Сидорович	1922	-»-	б-п	с XI.1941 по 1942 рядовой Савичской подпольной организации	с XI.1941 по XI.1942	колхозник	погиб в бою с оккупантами
Фурс Ананий Мефодьевич	1900	-»-	-»-	рядовой Савичской подпольной организации	с XI.1941 по VIII.1942	колхозник	расстрелян немцами в августе 1942 г.
Халиманчик Михаил Иванович	1907	-»-	-»-	рядовой Брагинской подпольной организации	с XI.1941 по IX.1943	сапожник артели «Красный Октябрь»	умер в 1953 г.

Секретарь Брагинского райкома КП Белоруссии *(И. Зиневич)*

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4853. Воп. 1. Спр. 1. Л. 12–17.

ДАВЕДКА
АБ ДЗЕЙНАСЦІ АНТЫФАШЫСЦКАГА ПАТРЫЯТЫЧНАГА ПАДПОЛЛЯ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ГАРАДСКІМ ПАСЁЛКУ БРАГІН І ВЁСЦЫ САВІЧЫ

Перед оккупацией Брагинского района немецко-фашистскими войсками партийно-советским активом под руководством райкома партии в районе д. Лубеники были заложены крупные базы с оружием и боеприпасами. Для организации партизанской деятельности в районе баз были оставлены 8 коммунистов, среди которых председатель артели «Красный Октябрь» Зинович Петр Григорьевич, председатели колхозов и сельских Советов.

Встретив осенью 1941 года трудности с организацией партизанской деятельности в районе, ряд оставленных товарищей приняли решение явиться в Брагин и ожидать весны 1942 года. В Брагине они были сразу арестованы и расстреляны.

Бывший директор заготконторы Бирков оказался предателем, выдал партизанские базы и впоследствии стал служить конюхом у немцев.

Только Зинович П. Г., председатель Лубеникского с/с Леоненко Василий Евтихневич и председатель колхоза Делец Филипп Емельянович были противниками явки в Брагин, остались в лесу и начали проводить диверсии на шоссе Хойники — Речица. После разгрома карателями баз они ушли из леса. Леоненко В. Е. и Делец Ф. Е. стали нелегально проживать у своих родственников в д. Углы, а Зинович, несмотря на то, что за его поимку была назначена большая премия, пробрался в Брагин и укрылся в сарае рабочего артели Халиманчика Михаила Ивановича, проживавшего рядом с полицией.

За короткое время Зинович объединил вокруг себя бывших работников артели в подпольную антифашистскую группу, которая до весны 1942 года под его руководством проводила в Брагине патриотическую работу.

С помощью этой подпольной группы Зинович П. Г. к весне 1942 года создал небольшую партизанскую группу и в апреле ушел с ней в Лубеникские леса и вскоре объединился с патриотическими группами, действовавшими в деревнях Савичи и Микуличи, а к лету 1942 года организовали партизанский отряд имени Котовского. Командиром отряда был Михневич Александр Ефимович, а Зинович П. Г. стал комиссаром этого отряда. Кроме этого в Брагине была оставлена группа подпольщиков для патриотической деятельности, руководителем которой Зинович П. Г. назначил бывшего бухгалтера артели Дубину Николая Лукьяновича, а помощником его — Марченко Прокофия Федоровича.

При Зиновиче, а также после его ухода в лес, подпольщики проводили следующую патриотическую работу:

Через Демуса Евгения Андреевича, работавшего на радиоузле, организовали регулярный прием сводок Совинформбюро, которые размножали и распространяли в Брагине

М. Л. Дубіна

П. Ф. Марчанка

Т. І. Стрыбук

В. Р. Скараход

В. Р. Сімукова (Лысенка)

Я. А. Дзмус

Г. І. Дземідзенка

Я. І. Скараход

и окружных селах, а для этого привлекли ряд новых патриотов. В деревне Глуховичи у них работала группа в составе Петренко Гавриила Ивановича (руководитель), Ковша Константина Антоновича, Голуба Григория Антоновича и Демиденко Георгия Ивановича. В д. Косачев работал Федченко Иван Федорович, в д. Ковака сводки доставляла Марченко Анна Ивановна.

В самом Брагине распространением сводок Совинформбюро занимались участники подпольной организации Дубина Н. Л., Халиманчик М. И., Скороход О. Р., Скороход Е. И., Скороход Н. В., Марченко П. Ф., Скороход Юлия, Клишевич Михаил, Елишевич Виктор и другие.

Кроме распространения сводок Совниформбюро Зинович П. Г. составлял листовки и воззвания, которые распространялись в Брагине.

После ухода Зиновича П. Г. в лес Демус Е. А. самовольно включил по местной сети ретрансляцию передачи из Москвы. За этот дерзкий поступок Демуса Е. А. оккупанты сильно избили и выгнали с работы, но благодаря тому, что его отец работал заместителем бургомистра района, подпольщик арестован не был. Позднее подпольщики решили сделать свой радиоприемник. Нужные детали из старых приемников Демус Е. А. доставал у своего друга Джежоры Геннадия, работавшего на том же радиоузле. Из этих деталей они вместе с Марченко П. Ф. на квартире Скороход Евгения собрали радиоприемник, который тайно установили на этой же квартире. Работа по приему и распространению сводок продолжалась.

Вскоре по заданию партизан они собрали другой приемник на квартире полицейского Костюка Иллариона Гордеевича и передали его в отряд Зиновича П. Г. В то же время группа патриотов с участием Демиденко Георгия Ивановича в д. Глуховичи сделала свой радиоприемник и установила его на квартире Демиденко Г. И.

Н. М. Ефіменка

Н. М. Загаранская

Т. С. Шчука

К. Ф. Абушэнка

К. М. Юдзянок

М. І. Халіманчык

По заданию партизан подпольщики добывали оружие и боеприпасы, переправляли их в отряд. Это делалось двумя способами. Подпольщики узнавали, у кого есть оружие, и затем выкупали его или похищали. Установили связь с полицейскими Костюком И. Г. и Комеко Семеном Ивановичем, которые передавали оружие из немецкого склада. Осуществлялось это таким образом: заступая в наряд на мельнице или на окраину Брагина, они брали с собой винтовки, боеприпасы, а также гранаты из числа тех, которые были собраны у населения и без особого присмотра хранились в полиции, а потом, возвращаясь с поста, заходили к Марченко П. Ф. и Репченко С. И. И оставляли у них в сарае все это оружие и боеприпасы. Так повторялось много раз. В результате — все собранное оружие исчезло из полиции. Арестованный бывший следователь полиции Потего С. С. по этому поводу показал, что, когда они с начальником полиции Марченко Н. обнаружили отсутствие собранного оружия, боясь подозрений и расправы немцев, не доложили об этом жандармерии и составили фиктивный акт, что собранное оружие якобы уничтожено.

По имеющимся в республиканском партийном архиве данным, подпольщиками Брагина было передано много оружия и боеприпасов.

Переправляли по своим каналам людей в партизаны. На активных немецких пособников писали анонимные письма в жандармерию, намекая, что они связаны с партизанами, и немцы арестовывали своих же пособников.

К началу 1942 года в д. Савичи под руководством коммунистов братьев Филипенко Степана Илларионовича и Федора Илларионовича была создана активная патриотическая группа из числа местных коммунистов, комсомольцев, учителей школ. В эту группу вошли: Филипенко Степан Илларионович, Филипенко Федор Илларионович, Мнхневич Александр Ефимович, Загорянский Федор Антонович, Березняцкий Роман Купреевич,

Фурс Ананий Мефодьевич, Обушенко Клавдия Федоровна, Ефименко Назар Мефодьевич, Зеленковская Елена Григорьевна, Анаприенко Петр Тимофеевич, Загорянская Лидия Антоновна, Бабич Иван Иванович, Юденок Клавдия Мефодьевна, Леоненко Николай Алексеевич, Гриценко Фома Яковлевич, Смеян Федор Семенович, Шаренок Михаил Васильевич, Пилипенко Петр Сидорович, Щука Татьяна Сергеевна.

Эти подпольщики проводили патриотическую работу среди населения, разъясняли ему правду о положении на фронтах, писали листовки и воззвания. Сделали и тайно установили приемник у учительницы Обушенко Клавдии, принимали и распространяли сводки Совинформбюро.

Собирали, прятали оружие и боеприпасы, которого в то время было много в окружающих лесах и у населения.

Укрывали молодежь от отправки в Германию и еврейских детей. Так, в доме Загорянского Ф. А. скрывали Колотей Олю и Кунцевич Лиду, которых потом отправили в отряд к Степану и Федору Филиппенко.

В начале 1942 года Степан и Федор Филиппенко были арестованы полицией, но вскоре им удалось освободиться, так как начальник полиции Головня был им знаком.

Вернувшись домой, они сразу же ушли на нелегальное положение в лес и стали организовывать партизанский отряд. Вскоре к ним перешли подпольщики Михневич А. Е., Гриценко Ф. Я., Стоян Ф. С., Шаренок М. В., Пилипенко П. И., Кунцевич Лидия, Колотей Ольга. Пришли несколько военнопленных, проживавших в ближайших селах, и, таким образом, в лесу, в районе д. Нежихов, стал базироваться небольшой партизанский отряд.

Оставшиеся в д. Савичи подпольщики под руководством партизан продолжали проводить патриотическую работу среди населения, собирали и передавали партизанам оружие и боеприпасы, снабжали их продуктами и информацией о действии местного полицейского гарнизона. Руководил оставшимися подпольщиками Загорянский Федор Антонович.

Большая часть продукции работавшего в Савичах молокопункта шла в лес, партизанам. Это делали подпольщики с помощью Леоненко Николая Алексеевича, работавшего заведующим пунктом, и Фурса Анания, работавшего бургомистром волости.

Весной 1942 года партизаны вместе с подпольщиками разгромили местный полицейский гарнизон, убили около 15 человек предателей. Был разбит маслозавод и уничтожено здание волости с документацией.

В августе 1942 года для установления связи с группой партизан братьев Филиппенко, Зинович П. Г. послал связную Скороход Евгению Ивановну.

Подпольщикам Брагина Зиновичем П. Г. была поставлена задача связать Скороход Е. И. с подпольщиками Савич, чтобы последняя была доставлена в отряд Филиппенко.

Воспользовавшись случаем прихода Скороход Е. И. и зная, что она после этого пойдет в отряд к Зиновичу П. Г., Дубина Н. Л. написал последнему письмо, в котором указал фамилии и имена многих подпольщиков Брагина. Письмо было зашито в пиджак Скороход Е. И., которая с помощью подпольщика Ковша Константина А. была доставлена на лошади в д. Савичи.

В это время в Савичах находился отряд полиции во главе с начальником Марченко Н. и следователем полиции Потего С. С.

Скороход Е. И., пробираясь в деревню, наткнулась на полицейский пост. Отстреливаясь из нагана и предпринимая попытку уйти в лес, она была задержана и не успела достать и уничтожить письмо. Оно попало в руки полицейских, и по нему были арестованы почти все подпольщики Брагина. У Скороход Е. И. была и другая записка, адресованная подпольщику Леоненко Н. А. Леоненко был арестован и без всяких пыток, по уговору следователя полиции Потего С. С., работавшего в их деревне до войны учителем и обещавшего спасти ему жизнь, выдал всех подпольщиков, которые действовали в деревне Савичи. Все подпольщики были немедленно арестованы и отправлены в тюрьму в Брагин, только Загорянскому Ф. А. в пути удалось бежать.

Больше недели во дворе тюрьмы всех арестованных подпольщиков Брагина и Савич, кроме Леоненко Н. А., зверски пытали, но все они вели себя мужественно и не признались, что вели какую-то борьбу против немцев. По показаниям следователя полиции Потего С. С., всего по делу подпольщиков Брагина и Савич было арестовано около 30 человек.

В начале сентября 1942 года около 20 человек наиболее активных подпольщиков немцы и полицаи расстреляли на окраине Брагина, а остальных угнали на работы в другие города, Германию, некоторых освободили.

Среди расстрелянных: Дубина Николай Лукьянович, Скороход Евгения Ивановна, Елишевич Виктор (отчество не установлено), Клишевич Михаил (отчество не установле-

но), Березняцкий Роман Купреевич, Фурс Ананий Мефодьевич, Анапреенко Петр Тимофеевич, Ефименко Назар Мефодьевич, Обушенко Клавдия Федоровна, Бабич Иван Иванович, Леоненко Николай Алексеевич, Юденок Клавдия Мефодьевна, Щука Татьяна Сергеевна.

Вскоре были расстреляны и семьи почти всех этих подпольщиков.

Учитель одной из минских школ Репченко Савелий Иванович накануне войны прибыл в Брагин за малолетними детьми, находившимися у тещи Скороход Екатерины, и вынужден был остаться в Брагине. Вскоре теща умерла, и Репченко остался один с детьми. Оккупационные власти с сочувствием относились к нему, определили на работу в местную типографию, где выпускались различные хозяйственные бланки. По своей инициативе он установил связь с партизанским отрядом Зиновича П. Г. и выполнял различные поручения.

После разгрома подпольной организации в Брагине, в октябре 1942 года, Зинович вызвал Репченко С. И. в лес и поставил перед ним задачу создать в Брагине новую подпольную организацию из числа патриотов и оставшихся подпольщиков.

Репченко С. И. вскоре удалось создать небольшую патриотическую группу. Наученные горьким уроком, члены патриотической группы действовали более конспиративно. Каждый участник группы имел присвоенный номер (010, 012 и т. д.), который и фигурировал в документах и донесениях, а также псевдонимы («Дурецкий», «Каспирович», «Васильев» и т. д.). В эту новую группу вошли: Репченко Савелий Иванович (руководитель), Марченко Прокофий Федорович (помощник), Стрибук Денис Федорович, Снмукова Ольга Григорьевна, Комеко Семен Иванович, Костюк Илларион Гордеевич, Свириденко Петр Гаврилович, Марченко Анна Ивановна, Стрибук Татьяна Ивановна, Скороход Ольга Романовна.

Через проживавших в то время в деревнях Журавлева Павла Аврамовича, Павлюченко Антона Ивановича, Денисенко (имя и отчество не установлено) из д. Соболи Репченко С. И. связался с партизанским отрядом имени Котовского.

Боевые дела этой организации:

В большом количестве получали от партизан листовки и распространяли их среди населения. Сами составляли воззвания к солдатам добровольческих подразделений и чехословацких частей с призывом переходить на сторону партизан. Несколько таких листовок имеется в партархиве ЦК КПБ.

Передавали партизанам различные сведения о немцах и действиях оккупационных властей Брагина, полиции и жандармерии.

Передавали шрифт, бумагу, краску, которые брали из местной типографии, где работал Репченко С. И. Когда оккупанты летом 1943 года собрались выпустить в Брагине областную газету, по заданию партизан подпольщики сожгли типографию вместе с оборудованием и принасенными материалами.

Передали в партизанский отряд имени Котовского большое количество оружия, боеприпасов, тола, которые доставали у чехословаков и полиции.

Достали у чехословаков, с которыми установили связь, и передали в партизанский отряд радиопередатчик. С чехословаками держали связь через поручика Дюржо Ондрика и четника Шушло Франтишека.

Вывели из строя 40 велосипедов одной из немецких частей, дислоцировавшихся в Брагине (исполнил Марченко П. Ф.).

Сожгли две автомашины во дворе райпромкомбината. Вывели из строя электростанцию в г. п. Брагин (исполнил Марченко П. Ф.).

Передавали партизанам в большом количестве медикаменты.

С оружием в руках вместе с партизанами соединения Ковпака и отряда имени Котовского участвовали в разгроме полицейского гарнизона в Брагине. Было убито не менее 200 немцев и полицейских, разгромлены маслосырзавод, хлебозавод и другие немецкие учреждения.

Брагинские подпольщики перед наступлением партизан на Брагин предварительно провели работу. Они передали пароль, подожгли строения возле укрепленного пункта, обозначили мелом дома, где жили полицейские.

Вскоре после этого боя в сентябре 1943 года по указанию партизан подпольщики в полном составе оставили свои места и вместе с семьями ушли в партизанский отряд, где сражались до соединения с частями Советской Армии в ноябре 1943 года.

Справка о подпольщиках г. п. Брагин и д. Савичи составлена на основании материалов следствия по делу бывшего следователя брагинской полиции Потего С. С. и начальника этой полиции Шевкуненко Г. И., по делу которых состоялся открытый процесс в Брагине в 1964 году. Кроме этого были использованы показания оставшихся в живых руководителей подполья, рядовых подпольщиков, жителей Брагина и имеющихся в республиканском партархиве документов.

О брагинских подпольщиках, их боевых делах на основании указанных материалов, написана документальная повесть, которая опубликована...[1]

Секретарь Брагинского райкома КП Белоруссии *(И. Зинович)*

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4853. Воп. 1. Спр. 1. Л. 6—11.

Дакументы выявіў і падрыхтаваў да друку *У. І. Лемяшонак*

[1] Степаненко А. Непокоренные. Полесская быль. Мн., 1970.

БРАГІНСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКАМ КП(б) БЕЛАРУСІ

Створаны рашэннем Палескага падпольнага абкама КП(б) Беларусі на пачатку лістапада 1943 г. Сакратаром райкама быў зацверджаны камісар партызанскага атрада імя Катоўскага Зіновіч Пётр Рыгоравіч. Райкам базіраваўся ў гэтым жа атрадзе (камандзір А. Я. Міхневіч).

Склад падпольнага райкама КП(б)Б

Сакратар Зіновіч Пётр Рыгоравіч (11.10.1943—24.11.1943).
Члены райкама: Мельнікаў Ісідар Нікіфаравіч (11.10.1943—24.11.1943), Міхневіч Аляксандр Яфімавіч (11.10.1943—24.11.1943).

Падпольныя партыйныя органы Кампартыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1944). Мн., 1975. С. 225—226.

КАМАРЫНСКІ ПАДПОЛЬНЫ РАЙКАМ КП(б) БЕЛАРУСІ

6 верасня 1943 г. Палескі падпольны абкам КП(б) Беларусі даручыў камісару партызанскага атрада імя Варашылава І. А. Шэйну і камандзіру гэтага атрада С. І. Філіпенку арганізаваць у Камарынскім раёне сетку падпольных партыйных арганізацый. Разгарнуўшы работу, яны стварылі райкам партыі, які базіраваўся ў гэтым жа партызанскім атрадзе.

Склад падпольнага райкама КП(б)Б

Сакратар Шэйн Іван Ануфрыевіч (6.9.1943—22.9.1943).
Члены райкама: Міхедзенка Сяргей Мікітавіч (6.9.1943—22.9.1943), Філіпенка Сцяпан Іларыёнавіч (6.9.1943—22.9.1943).

Падпольныя партыйныя органы Кампартыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1944). Мн., 1975. С. 232.

Змагаўся ў падполлі камсамол

На франты Вялікай Айчыннай вайны па мабілізацыі ў 1941-м пайшлі тысячы жыхароў Брагінскага і Камарынскага раёнаў, у тым ліку добраахвотнікі з брагінскага знішчальнага батальёна Мікалай Агароднік, Іван Зелянкоўскі, Анатоль Скараход, Мікалай Скараходаў, Фёдар Чавус і іншыя. Многія юнакі і дзяўчаты ўліліся ў партызанскія атрады і падпольныя групы, якія ўжо ў першыя месяцы вайны пачалі дзейнічаць на акупіраванай ворагам тэрыторыі, у тым ліку і ў нашых мясцінах.

Загартоўка, атрыманая маладымі актывістамі ў бурлівыя гады камсамольскага юнацтва, вельмі дапамагала ім у суровыя часіны ваеннага ліхалецця. У ліку такіх былі трактарыстка-камсамолка з калгаса «Новы свет» (в. Касачоў) Эна (Ганна) Піліпаўна Шубянок, вылучаная ў 1939 годзе на работу сакратаром Тураўскага райкама ЛКСМБ. Пасля захопу Тураўшчыны гітлераўцамі яна ўзначаліла мясцовы падпольны райкам камсамола. У першы ж дзень акупацыі правяла смелую дыверсію, у выніку якой было знішчана 2 тысячы тон гаручага. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 8 ліпеня 1941 года ў ліку першых партызан і падпольшчыкаў

яна была ўзнагароджана медалём «За адвагу»[1]. У далейшым удзельнічала ў патрыятычным падполлі ў Рэчыцы, дзе была выдадзена правакатарам і расстраляна немцамі.

У першай палове 1942 года камандаванне партызанскага атрада імя Катоўскага прызначыла Віктара Рабянка кіраўніком падпольнай камсамольскай групы, якая складалася з падгруп на чале з Ф. Я. Грыцэнкам і М. Н. Шаранок (вёскі Жэрдзяе і Нежыхаў) і дзейнічала ў асноўным на тэрыторыі Выграбна-Слабадскога сельсавета. У групу ўваходзілі актыўныя камсамольцы Іван Грыцэнка, Тамара Загаранская, Еўдакія Кавулька, Мікалай Котчанка, Фёдар Стаян, Ганна Шаранок і іншыя. Неўзабаве група павялічылася да 30 чалавек.

З мэтай узмацнення палітычнага кіраўніцтва камсамольска-маладзёжнымі групамі і каардынацыі іх дзеянняў у красавіку 1943 года быў створаны Брагінскі падпольны раённы камітэт камсамола. Прыкладна праз месяц у размяшчэнні партызанскага атрада імя Катоўскага адбылася раённая камсамольская канферэнцыя. У яе рабоце прынялі ўдзел 78 камсамольцаў-партызан і 9 падполыпчыкаў з Брагіна. Канферэнцыя абрала новы склад падпольнага райкама ЛКСМБ і яго бюро з пяці чалавек: Віктар Рабянок (сакратар), Пётр Гаркавенка, Ніна Загаранская, Мікалай Котчанка, Пётр Філіпенка.

Пад кіраўніцтвам райкама камсамола падпольныя камсамольскія групы праводзілі значную работу: выяўлялі ў акупацыйных гарнізонах і перадавалі партызанам звесткі аб колькасным саставе і ўзбраенні ворага. Апрача таго, маладыя патрыёты адшуквалі зброю і боепрыпасы, медыкаменты і перадавалі іх у партызанскі атрад.

Нелегальны райкам ЛКСМБ, камсамольцы і моладзь з падпольных груп вялі растлумачальную работу сярод насельніцтва, распаўсюджвалі лістоўкі і адозвы, зводкі Савінфармбюро і г. д. Наколькі вынікавай была іх дзейнасць, сведчаць наступныя прыклады.

Пры дапамозе камсамольцаў-падполыпчыкаў у савіцкім нямецка-паліцэйскім гарнізоне была праведзена агітацыйная работа сярод дыслацыраванага там 108-га ўкраінскага батальёна, сфарміраванага гітлераўцамі з ваеннапалонных чырвонаармейцаў. Салдаты батальёна перабілі афіцэраў, у большасці немцаў, і перайшлі ў партызанскі атрад. У чэрвені 1943 года камсамольцы-сувязныя паведамілі, што на партызанскі атрад імя Катоўскага наладжваецца аблава немцаў з савіцкага гарнізона. Камандаванне атрада дало даручэнне сакратару падпольнага райкама ЛКСМБ Віктару Рабянку сфарміраваць мабільныя партызанскія падраздзяленні, у асноўным з ліку камсамольцаў, і даць бой фашыстам на подступах да вёскі Вярховая Слабада. Так і было зроблена. У гэтым баі немцы страцілі 22 салдаты. Сямёра акупантаў былі ўзяты ў палон.

У баявых аперацыях і ў падпольнай рабоце сярод насельніцтва партызанскай зоны з найлепшага боку зарэкамендавалі сябе камсамольцы Аляксей Астапенка, Мікалай Бабіч, Барыс Волкаў, Пётр Гаркавенка, Мікалай Котчанка, Міхаіл Попік, Еўдакія Піліпенка, Пётр Піліпенка, Наталля Піліпенка і іншыя.

Работа падполыпчыкаў пастаянна была звязана з вялікай небяспекай і нярэдка са смяртэльнай рызыкай. Так, у 1942—1943 гадах гітлераўцамі былі арыштаваны многія члены Брагінскай і Савіцкай падпольных груп, а таксама сувязны Аляксей Смірноў, разведчык Іван Грыцэнка. Падчас адной з наладжаных гітлераўцамі ў 1943 годзе блакад партызанскага атрада імя Катоўскага бясстрашна дзейнічалі і загінулі смерцю герояў камсамолец Пётр Гаркавенка і камандзір узвода Барыс Волкаў, які ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга пасмяротна.

І. Ф. Ганжураў

[1] Партызанская барацьба беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1959. С. 170—171.

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

ЛІСТОЎКА, НАПІСАНАЯ ПАРТЫЗАНАМІ АТРАДА ІМЯ Р. І. КАТОЎСКАГА І РАСПАЎСЮДЖАНАЯ ПАДПОЛЬШЧЫКАМІ СЯРОД УЛАСАЎЦАЎ І ПАЛІЦЭЙСКІХ БРАГІНСКАГА ГАРНІЗОНА[1]

Смерть немецким оккупантам!

ДОБРОВОЛЬЦЫ!

Коварный враг — немецкие захватчики сделали вас соучастниками своего кровавого дела. Мы знаем: большинство из вас, за исключением малой кучки отъявленных негодяев, не были изменниками, любили свой народ, свою Родину, но обманом да запугиванием втянуты немцами в убийства своего русского народа, своих родных и близких.

Гитлеровские мерзавцы запугивают вас тем, что, мол, одинаково не будет вам пощады от партизан. Не верьте этой лжи. Они врут, как врали всегда и везде. Всех, добровольно переходящих к нам, казаков, полицейских, так называемых «добровольцев», мы принимаем в свои ряды, и они вместе с нами борются против врагов русского народа — немецких захватчиков. Но горе тем, кого мы поймаем, как врага, с оружием.

В партизанских отрядах есть бывшие полицейские, «добровольцы». К партизанам перешел 108-й батальон «добровольцев», полицейские дер. Крюки и другие.

Позорный конец постигнет рано или поздно каждого изменника, который будет продолжать служить врагу.

Куда вы денетесь тогда?

У многих из вас братья, сыновья, отцы борются за свой народ. Вы сегодня-завтра встретитесь с ними, как враги, изменники. И скажут они вам, как старый казак Тарас Бульба: «Предатель! Я тебя породил, я тебя и убью!»

Бейте своих немцев-командиров и переходите к нам!

Смерть немецким бешеным псам!

Эта листовка служит пропуском для перехода к партизанам.

Красные партизаны

июль 1943 года

[1] Гэты і наступныя дакументы (с. 196—197) публікуюцца па кн.: Степаненко А. Непокоренные. Полесская быль. Мн., 1970. С. 160, 210—211, 215—217, 221—222.

ЗВЕСТКІ АБ ДЗЕЙНАСЦІ ПАДПОЛЬНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ БРАГІНА

Штабу п/о им. Котовского

Сведения выполнения задания т. 012 Дуборецким

1. Спален спиртзавод Брагинский.
2. Спален продовольств. склад немецкого гарнизона в Брагине.
3. По заданию п/орг 012 вывел со строя паровую машину Райпромкомбината, т. 11 у пром. комбинате на складе уничтожено 68 веломашин немецких и 2 легковые машины.

Руководитель п/орг 012 *Дуборецкий*
Писар п/орг 014 *Скороход*

18 августа 1943 г.

Сведения поступления в/вооружения от 012 т. Дуборецкого

1. Винтовок русских — 30 шт.
2. Гранат ручных — 300 шт.
3. Радиостанций — 1 шт.
4. Радиоприемники — 2 шт.
5. Патронов винтовочн. — 6 ящиков.
6. Головых шашек — 300 шт.

Руководитель п/орг 012 *Дуборецкий*

ЗАГАД АБ ПЕРАДАЧЫ ПАРТЫЗАНСКАМУ АТРАДУ ІМЯ Р. І. КАТОЎСКАГА ЎРАЧА-ПАДПОЛЬШЧЫКА

Приказ № *Копия — штабу*

На основании распоряжения штаба п/о имени Котовского за № 1476 от 25 августа о передаче одного медработника штабу п/о, приказываю:

Передать в распоряжение штаба п/о имени Котовского товарища 013.

Место встречи сообщить через тов. 016.

Нач. подпольн. орг. *Касперович*

29.8.43 г.

ЛІСТОЎКА, НАПІСАНАЯ І РАСПАЎСЮДЖАНАЯ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА БРАГІНСКІМІ ПАДПОЛЬШЧЫКАМІ

Воззвание к рабочим и крестьянам Брагинской области

Несколько дней тому назад русская армия перешла в решительное наступление на всех фронтах и в жестоких боях нанесла противнику смертельный удар. Враг чувствует свою гибель, а поэтому он становится жесточе. Отступая, фашисты уничтожают все на своем пути, чего не успели уничтожить за полтора года. Горят города, местечки и села. Течет ручьями еще не остывшая кровь по русской земле русского народа. Они насильно увозят тысячи лучших людей в Германию, чтобы их там уничтожить.

Кто может не знать жестоких расправ фашистских псов над мирным населением в г. Брагине, Комарине, Лоеве и др. городах и селах?!

Кто не видел зарево пожаров пылающих деревень, а в них корчащиеся тела отцов, матерей, маленьких детишек?!

Кто не слышал грубое рыдание отцов, нежный плач матерей и жалкий визг детишек, склонявших свои головы у вырытой для них могилы?!

И вот настал решительный момент жестокой расправы над врагом. Мы должны всеми средствами борьбы уничтожать фашистов в тылу, иначе фашисты уничтожат нас. А для этого необходимо:

1. Идти в леса и расширять деятельность партизанских отрядов.
2. Саботировать сдачу зерна, скота, льноволокна и других видов поставок.
3. Разрушать мосты и дороги.
4. Всякими мерами срывать и дезорганизовывать все проводимые мероприятия германской властью.

Палачи, убийцы, грабители должны быть уничтожены русским народом, на русской земле!

Прочитай и передай товарищу!

ПІСЬМО КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ Р. І. КАТОЎСКАГА ПАТРЫЁТАМ БРАГІНА

Дорогие товарищи!

Советские патриоты т. 010, 012 и другие!

Зажатые в стальные тиски немецкой агентуры, вы не опустили свои гордые головы, продолжаете бороться с фашистскими двуногими зверями.

Мы, как представители командования отряда народных мстителей, от имени сотен наших товарищей благодарим вас за вашу работу в деле разведки, диверсии и помощи партизанскому отряду. Мы выражаем уверенность, что вы и в дальнейшем сделаете еще больше под непосредственным нашим руководством.

Мы считаем, что вы так же, как и мы, уверены в победе Красной Армии над немецкими оккупантами и среди вас нет таких, которые бы сомневались в этом. Помните слова Василия Гроссмана: «Чем труднее и опаснее борьба, тем приятнее и слаще победа».

Боритесь, товарищи, смело и мужественно. Желаем вам больших успехов в работе.

Жмем ваши дружеские руки.

Командир п/о им. Котовского *(Михневич)*

Комиссар *(Зинович)*

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Як рыхтаваўся штурм

С. І. Рэпчанка

З успамінаў С. І. Рэпчанкі, кіраўніка Брагінскай патрыятычнай падпольнай групы

Пасля сустрэчы з праслаўленым камандзірам партызанскага руху Сідарам Арцёмавічам Каўпаком я вяртаўся ў Брагін. Імжэў дождж. Настрой быў добры, бадзёры. У вушах гучалі словы Каўпака: «Таварыш Рэпчанка! Гэтымі днямі я быў у Маскве. Маё заданне — гэта заданне Цэнтра. Выканаеш яго, мы цябе не забудзем!» Ён уважліва паглядзеў мне ў вочы, усміхнуўся, моцна паціснуў руку. Заданне было адказнае: скласці і ў вызначаны тэрмін перадаць партызанам план гарадскога пасёлка, паказаць размяшчэнне агнявых кропак праціўніка, а ў момант наступлення партызанскага злучэння на гарадскі пасёлак перадаць пароль, каб забяспечыць бесперашкоднае прасоўванне партызан да горада.

Аднойчы вечарам падпольшчыкі Сямён Камека і Іларыён Касцюк, якія працавалі ў паліцыі, паведамілі нам трывожную вестку: у Брагін прыбылі рэгулярныя нямецкія часці па барацьбе з партызанамі. Адзін гарнізон размясціўся ў памяшканні былой школы. Нібы з мэтай атрымання пропуска для паездкі па прадукты ў вёску я наведаў бургамістра гарадскога пасёлка.

— Колькі афіцэраў, пан Казак, з'явілася ў нашым пасёлку! Адбою няма ў сталовай, карміць нечым! Што будзем рабіць?

Ён адклаў паперы, прапанаваў мне прысесці і сказаў:

— Так, да нас прыбыло шмат салдат і афіцэраў. Гебітскамісар учора папярэдзіў, што яшчэ з Жытоміра прыбудзе іх вельмі многа. Усіх накарміць трэба. Паспрабуй не накармі!

— А я, пан бургамістр, сабраўся па прадукты ехаць.

— Куды? — спытаў у мяне Казак.

— У Астрагляды, Багушы, Хатучу, гэтыя вёскі не выконваюць паставак.

Казак уважліва паглядзеў на мяне і нерашуча, праз зубы, працадзіў: «Там будуць праходзіць воінскія часці ў Хойнікі...»

Я зразумеў, што над партызанамі збіраюцца хмары. Трэба было спяшацца дзейнічаць.

Ноччу мы не звялі вачэй: заканчвалі работу над планам. Сямён Камека і Іларыён Касцюк данеслі нашы звесткі аб прыбыўшых воінскіх нямецкіх часцях, іх колькасным складзе і ўзбраенні. Я ўпакаваў медыкаменты, атрыманыя напярэдадні ад урача Д. Стрыбука. План гарадскога пасёлка зашыў у халяву бота.

Была ясная цёплая раніца вясны 1943 года. На ўсходзе яркім зарывам узнімалася сонца. Конік бег бадзёра. У Багушах, у дварэ школы, мяне сустрэў сувязны атрада імя Катоўскага настаўнік Супічэнка. Ён расказаў, што ноччу, калі яны з Балобанам ішлі на сувязь з партызанамі злучэння Каўпака, іх затрымалі. Балобана арыштавалі, а ў яго быў зроблены вобыск. Я зразумеў, што мая трывога недарэмная. Перадаць план партызанам было немагчыма. Я вырашыў хутчэй ехаць у Хатучу, дзе сувязны Антон Паўлючэнка мог перадаць план па прызначэнні. Але ўжо было позна: на маёй павозцы праводзілі вобыск паліцаі. Я паспяшаўся да іх, прад'явіў пасведчанне, надрукаванае на рускай і нямецкай мовах, з пячаткай гебітскамісара і стаў абвінавачваць мясцовага старасту, што ён не выконвае распараджэнне нямецкіх улад.

Староста стаяў перад гітлераўцамі і

Падпольшчыкі Брагінвічыны ўскладаюць кветкі да помніка сваім таварышам, расстраляным гітлераўцамі ў Брагіне ў 1942 г.

даказваў, што ён не партызан, што ён сумленна служыць фюрэру, а партызан ненавідзіць. Яму загадалі сабраць прадукты і накіраваць іх у Брагін.

Я сказаў, што па ўказанні ўлад мне трэба ехаць у Хатучу. Да мяне прымацавалі паліцая, якому было загадана ахоўваць мяне ад партызан.

У Хатучы план я перадаў Антону Паўлючэнку, які даставіў яго ў штаб Каўпака. Задача была выканана. У горад я вярнуўся ў той жа дзень.

У гарадскі пасёлак прыбыла воінская часць чэхаславакаў. Ведаючы аб іх лаяльнасці да партызан і наогул да савецкага народа, мы вырашылі звязацца з імі. Праз падпольшчыцу Вольгу Сімукову была наладжана сувязь з чэхаславацкім паручнікам Дзюржо Андрыекам, чэшікам Шушла Францішкам і іншымі. Пры іх дапамозе мы набылі шмат зброі, узрыўчаткі.

У наступленні на Брагін прымалі ўдзел злучэнні Каўпака, Фёдарава і спецатрада НКДБ «Вторые» пад камандаваннем Мікалая Зебніцкага, якому было даручана захапіць сакрэтныя аператыўныя дакументы карнай групы.

Баявыя дзеянні партызан пачаліся ў чатыры гадзіны раніцы. Карыстаючыся паролем аховы горада, перададзеным падпольшчыкамі партызанам, яны, зняўшы пасты аховы, падышлі ўшчыльную да горада. Завязаўся бой. Фашысты, што размяшчаліся ў будынку школы, былі захоплены партызанамі знянацку. Сігнал да бою яны прынялі за чарговую вучэбную трывогу. За адну гадзіну гэты гарнізон быў разгромлены, а ўсе штабныя дакументы аказаліся ў руках партызан.

Іншыя падраздзяленні партызан, уварваўшыся ў горад, вялі жорсткія вулічныя баі. Частка гарнізона, схаваўшыся за ўмацаваным валам, аказвала партызанам упартае супраціўленне. Ім удалося выклікаць з Жытоміра авіяцыю, і некалькі самалётаў бамбілі ўскраіны горада. Але бомбы трапілі ў самы «пятачок», дзе схаваліся гітлераўцы і паліцаі...

Аперацыя па разгроме гарнізона завяршылася паспяхова.

Знамя юности. 1973. 14 жн.

Пераклаў з рускай *І. Ф. Ганжураў*

Партызанскі фронт

Партызанскі рух на Брагіншчыне зарадзіўся ў снежні 1941 года. Першыя баявыя дзеянні правяла ўзброеная група, створаная братамі Сцяпанам Іларыёнавічам і Фёдарам Іларыёнавічам Філіпенкамі на базе Савіцкага патрыятычнага падполля. Лясныя салдаты дыслацыраваліся спачатку ў лясіста-балоцістай мясцовасці каля вёскі Нежыхаў. Затым, з прадвесня 1942 года,— ва ўрочышчы Паганное, што на мяжы Брагінскага і Хойніцкага раёнаў, па суседстве з нежыхаўскімі мясцінамі.

У маі — чэрвені 1942 года адбылося аб'яднанне групы Філіпенкаў з групай П. Р. Зіновіча, у якую ўваходзілі брагінскія падпольшчыкі. Так быў пакладзены пачатак партызанскаму атраду, якому надалі імя праслаўленага героя грамадзянскай вайны Р. І. Катоўскага.

Разгортванню барацьбы народных мсціўцаў істотна паспрыяла дырэктыва ЦК ВКП(б) і Саўнаркама СССР партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей ад 29 чэрвеня і пастанова ЦК ВКП(б) ад 18 ліпеня 1941 года, якія ўтрымлівалі канкрэтныя рэкамендацыі па арганізацыі адпору ворагу. Як успамінаў стваральнік першага на Брагіншчыне партызанскага атрада С. І. Філіпенка, гэтыя дакументы з'явіліся для камандавання атрада сапраўднай праграмай дзеянняў на бліжэйшы час і перспектыву.

П. Р. Зіновіч

Летам 1942 года і ў далейшым катоўцы праводзілі баявыя аперацыі на тэрыторыі Брагінскага, Камарынскага і Хойніцкага раёнаў. Напачатку гэта было сістэматычнае разбурэнне варожых тылавых камунікацый — ліній тэлефоннай сувязі, мастоў, грунтавых дарог, а затым і знішчэнне нямецка-паліцэйскіх умацаваных участкаў і апорных пунктаў у вёсках Шкураты і Хракавічы. Былі нанесены ўдары па варожых гарнізонах у Савічах, Круках, Пірках, Мікулічах, Баршчоўцы, Радзіне. 27 ліпеня 1943 года на дарозе Жэрднае — Выграбная Слабада партызаны разграмілі варожы транспарт, затым спалілі склады з ваенным рыштункам і боепрыпасамі ў Брагіне, Савічах, Астраглядах і Аравічах.

Па заданні Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) падрыўнікі атрада ўзарвалі чыгунку на ўчастку Чарнігаў — Оўруч. Пад адхон былі пушчаны паравоз і некалькі вагонаў са зброяй і жывой сілай ворага, на некалькі гадзін паралізаваны рух цягнікоў.

Пры актыўным удзеле катоўцаў была праведзена баявая аперацыя ў вёсцы Аравічы Хойніцкага раёна, куды напярэдадні прыбылі на адпачынак 50 нямецкіх лётчыкаў. Нягледзячы на ўзмоцненую ахову, гітлераўцы былі перабіты. Разам з імі знайшлі свой бясслаўны канец і каля 30 паліцэйскіх. Вялікую дапамогу партызанам у гэтай акцыі аказаў іх сувязны Дзмітрый Цэхан, які жыў у Аравічах у «прымаках».

У 1942 годзе партызанскі атрад імя Катоўскага дыслацыраваўся ва ўрочышчы Доўгі Лес. Перад тым у Савічах, у памяшканні былой школы, размясціўся нямецка-паліцэйскі гарнізон па барацьбе з партызанамі, у тым ліку 108-мы батальён, сфарміраваны немцамі пераважна з ваеннапалонных чырвонаармейцаў. Па даручэнні камандавання партызанскага атрада падпольшчыца Клаўдзія Юдзянок, а пасля яе гібелі ў засценках гестапа іншыя патрыёты праз радавога

І. Плотніцкага правялі ў батальёне растлумачальную работу, і ў сакавіку 1943 года батальён у поўным складзе, знішчыўшы немцаў-камандзіраў, перайшоў да партызан.

У жніўні — верасні 1943 года на Брагіншчыне дзейнічалі таксама партызанскія фарміраванні: лоеўскі «За Радзіму», хойніцкія імя Чапаева і імя Суворава, а ў міжрэччы Дняпра і Прыпяці — створаны там атрад імя Чапаева і атрад імя Кацюбінскага з Чарнігаўскага злучэння.

Партызаны жлобінскага атрада «Смерць фашызму» напрыканцы 1942 — пачатку 1943 гадоў, разам з іншымі атрадамі, бралі ўдзел у баях з ворагам у раёне населеных пунктаў Лубенікі, Майск, Петрыцкае[1].

У сакавіку 1943 года з партызанскага атрада імя Катоўскага была вылучана ініцыятыўная група на чале з яго камандзірам С. І. Філіпенкам. Сумесна з групай прадстаўніка Палескага падпольнага абкама КП(б) Беларусі І. А. Шэйна на Камарыншчыне быў створаны і дзейнічаў партызанскі атрад імя Варашылава.

Моцныя ўдары па акупантах на Брагіншчыне і Камарыншчыне ранняй вясной 1943 года і пазней наносілі партызанскія злучэнні на чале з С. А. Каўпаком, Я. І. Мельнікам, А. Ф. Фёдаравым і іншыя. Буйную аперацыю правялі каўпакаўцы і беларускія партызаны па зрыве навігацыі праціўніка на Прыпяці. Затым па ініцыятыве камандавання атрада імя Катоўскага (камандзір А. Я. Міхневіч) у ноч на 11 красавіка быў ажыццёўлены смелы налёт на добра ўмацаваны варожы гарнізон у Брагіне. Пры актыўным садзейнічанні брагінскіх падпольшчыкаў у баявой аперацыі сумесна з падраздзяленнямі са злучэнняў С. А. Каўпака, А. Ф. Фёдарава, Я. І. Мельніка прынялі ўдзел і катоўцы. Гітлераўцы страцілі забітымі і параненымі некалькі дзесяткаў салдат і афіцэраў. Было знішчана 25 дзотаў і дотаў з кулямётамі, 2 склады са зброяй, склады з абмундзіраваннем, амуніцыяй і іншай ваеннай маёмасцю, збожжам і гаручым, млын, скурзавод, установы акупантаў. Партызаны захапілі ў якасці трафеяў 10 станковых і 5 ручных кулямётаў, 4 батальённыя мінамёты, шмат вінтовак і аўтаматаў, боепрыпасаў і прадуктаў[1].

У першай палавіне красавіка 1943 года, пасля працяглага рэйду па лесастэпавых і стэпавых раёнах Украіны, у міжрэчча Дняпра і Прыпяці прыбыло злучэнне партызанскіх кавалерыйскіх атрадаў пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза генерал-маёра М. І. Навумава. Добрае ўяўленне аб тагачаснай дыслакацыі і баявых дзеяннях каўпакаўскага і навумаўскага партызанскіх злучэнняў дае картаграфічны эскіз, прыкладзены да дзённіка аб баявой дзейнасці кавалерыйскага злучэння М. І. Навумава.

З тлумачэнняў да эскіза вядома, што штабы М. І. Навумава і С. А. Каўпака размяшчаліся адпаведна ў вёсках Малочкі і Аравічы. Каўпакаўскі аэрадром знаходзіўся каля вёскі Кажушкі. Баявыя падраздзяленні злучэння Каўпака размяшчаліся ў Кажушках, а навумаўскія кавалерыйскія атрады — у вёсках Радзін і Кулікоўка. Апорныя пункты гітлераўцаў у нашых мясцінах знаходзіліся ў Хойніках, Брагіне, Камарыне, Пірках, Круках, Савічах і інш.

Першую на Камарыншчыне баявую аперацыю навумаўцы правялі 8 красавіка 1943 года. У ходзе яе разведчыкі першага аддзялення галоўразведкі пад камандаваннем Грынзлова знішчылі групы паліцаяў камарынскай раённай паліцыі.

14 красавіка кавалерыйскія атрады пры ўдзеле беларускіх партызан разграмілі варожы апорны гарнізон у вёсцы Піркі. Гэта быў апорны пункт, надзейна

[1] Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць. Мн., 1985. С. 323.

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 227. Л. 2. Нацыянальны архіў Украіны. Ф. 54. Воп. 1. Спр. 1. Л. 87–95.

ўмацаваны драўляна-земляным валам, перад якім па ўсім перыметры быў запоўнены вадой роў, абнесены калючым дротам. Паверыўшы ў непрыступнасць гарнізона, гітлераўцы і паліцэйскія паводзілі сябе тут бестурботна. Скарыстаўшы гэта, партызаны імклівым кідком уварваліся ў Піркі і знішчылі апорную базу акупантаў, якая дазваляла ім кантраляваць падыходы да чыгуначнай магістралі Чарнігаў — Оўруч[1].

Прыкладна тады ж група кавалерыйскай галоўразведкі навумаўцаў пад камандаваннем яе камандзіра Астахава знішчыла на Камарыншчыне падраздзяленне ўкраінскіх казачкоў, якія служылі ў немцаў. Затым партызанскі батальён каўпакаўцаў на чале з Героем Савецкага Саюза генералам С. В. Рудневым разграміў нямецкі гарнізон у вёсцы Крукі, а група галоўразведкі і баявая група навумаўцаў на чале з Шайдуравым знішчыла канвой камарынскіх і чарнобыльскіх паліцаяў.

12 мая 1943 года партызанскія падраздзяленні злучэнняў С. А. Каўпака і М. І. Навумава з-пад Аравічаў і Малочкаў выйшлі ў раён нямецкіх апорных пунктаў Калінкавічы — чыгуначны паўстанак Дыміха, адкуль пасля моцнага бою адышлі да Прыпяці і ў раён лясного масіва на захад ад вёскі Навасёлкі Хойніцкага раёна.

Пакуль каўпакаўцы пры дапамозе мясцовага насельніцтва наводзілі наплыўны мост цераз Прыпяць, іншыя іх батальёны на чале з камісарам С. В. Рудневым 16 мая вялі бой з двума палкамі гітлераўцаў, падтрыманых 15 танкамі, у вёсцы Тульгавічы, а падраздзяленне пад камандаваннем камбата Кульбакі знішчала ў суседняй вёсцы Цішкаў гарнізон украінскіх казачкоў-карнікаў, які пагражаў навядзенню пераправы.

На наступны дзень баявыя падраздзяленні С. А. Каўпака адыходзілі за Прыпяць, а коннікі злучэння М. І. Навумава прыкрывалі пераправу каўпакаўцаў з боку Хойнікаў і Брагіна. Навумаўцам давялося вытрымаць моцны бой з двума батальёнамі карнікаў, падмацаваны 4 танкамі і 8 бронемашынамі.

17 мая 1943 года апошнія групы прыкрыцця навумаўцаў пераправіліся на правы бераг Прыпяці і знішчылі за сабой наплыўны мост.

У тлумачэннях да картаграфічнага эскіза ўтрымліваюцца звесткі аб тым, што ў вёсцы Жалібор Крукаўскага сельсавета знаходзілася штаб-кватэра беларускіх партызан, мясцовай падпольнай арганізацыі, якой кіравала камсамолка Надзея Старахатняя. На эскізе штрыхапаказальнікамі пазначаны напрамкі да варожых апорных пунктаў у Чарнігаве, Чарнобылі, Шапелічах, Янаве, у якіх партызаны жаліборскага падполля дабывалі разведданыя для злучэння М. І. Навумава. Пазначана таксама траса маршруту (Жалібор — Малочкі), па якім юны сувязны Ваня Цалуйка дастаўляў Н. Старахатняй разведвальныя звесткі для галоўразведкі злучэння М. І. Навумава.

Для расшырэння і ўмацавання сувязі з раёнамі і завяршэння работы па стварэнні партыйных падпольных органаў на акупіраванай ворагам тэрыторыі ў маі 1943 года Палескі падпольны абкам партыі і штаб злучэння партызанскіх атрадаў Палескай вобласці накіравалі на месцы вопытных арганізатараў падполля і партызанскага руху. У Хойніцкую партызанскую зону, якая ахоплівала Хойніцкі, Брагінскі, Камарынскі і Васілевіцкі раёны, у якасці ўпаўнаважанага прыбыў Іван Ануфрыевіч Шэйн, у далейшым сакратар Камарынскага падпольнага райкама партыі. Пасля гібелі Ф. І. Філіпенкі ён стаў камісарам партызанскага атрада імя Варашылава.

З вясны 1943 года дзеянні партызанскіх фарміраванняў станавіліся больш узгодненымі і выніковымі. Сілу партызан вымушаны былі прызнаць самі гітлераўцы. Так, 4 мая 1943 года генеральны камісар Жытомірскай акругі паведамляў у Берлін:

[1] Ветров В. Д. Братья по оружию. Мн., 1968. С. 237.

«За отчетный период обстановка по-прежнему характеризуется активностью партизан. Примерно 15 000 кв. км в северной части моего генерального округа, в частности, большая часть бывших районов боевых действий Лельчиц и Ельска, а так же р-на Брагина, большая часть Речицкого, Петриковского, Олевского и Овручского районов практически больше не находятся под немецким управлением, в них господствуют партизаны, и в настоящее время они полностью управляются Советами. Такие районные центры, как Брагин, Речица, Мозырь, Петриков, отныне следует рассматривать как опорные пункты или как позиции круговой обороны. Власть гебитскомиссаров едва ли распространяется на несколько километров за пределы район. центра, так что в создавшейся обстановке не может быть и речи о каком-то упорядоченном управлении и экономическом использовании этой территории»[1].

Але і ў саміх гарнізонах акупанты адчувалі сябе не зусім упэўнена. У Брагіне, напрыклад, яны перасталі давяраць камандаванню кавалерыйскага палка са славацкай дывізіі, якая прыбыла сюды яшчэ ў 1942 годзе для аховы нямецкіх акупацыйных службаў і ўстаноў, а таксама для садзейнічання гітлераўцам у барацьбе з партызанамі. Недавер гэты меў сур'ёзныя падставы. Акупанты здагадваліся аб сувязях славацкіх афіцэраў з мясцовымі падполыпчыкамі і таму вымушаны былі перадыслацыраваць славацкі полк у Хойнікі і Жытомір.

На пачатку чэрвеня 1943 года на тэрыторыю Беларусі з Чарнігаўшчыны прыбылі створаныя там малдаўскія партызанскія атрады пад камандаваннем Я. П. Шкрабача і В. І. Піскарова. Некаторы час яны дзейнічалі ў міжрэччы Дняпра і Прыпяці, у тым ліку ў Камарынскім раёне. Тут малдаване наладзілі сувязі з атрадамі лоеўскім «За Радзіму», хойніцкім імя Суворава і іншымі, сумесна правялі некалькі баявых аперацый. У прыватнасці, лясныя салдаты лоеўскага атрада «За Радзіму», украінскага імя Бажэнкі і малдаўскія партызаны ў сярэдзіне ліпеня разгромілі гаспадарчую базу акупантаў у вёсцы Астрагляды. Яны знішчылі нямецкую ахову, захапілі больш за 400 галоў буйной рагатай жывёлы, 40 коней, шмат свіней і авечак, узарвалі маслазавод. Малдаўскія атрады імя Варашылава, імя Будзённага ў гэтай аперацыі знішчылі 4 аўтамашыны з варожым падмацаваннем[1].

Да восені гітлераўцы здолелі аднавіць вайскова-паліцэйскі гарнізон у Пірках. Але ненадоўга. У верасні партызаны атрада імя Кацюбінскага з Чарнігаўскага злучэння правялі ўдалую аперацыю па знішчэнні гэтага апорнага пункта акупантаў. Вораг панёс вялікі ўрон. Але былі страты і ў партызан. 6—12 верасня загінулі Р. А. Арол, Ц. А. Белан, У. А. Вайценка, І. П. Галушка, Г. Т. Каламіец, П. П. Кірыдон, І. П. Машна, Р. І. Панцялееў, М. І. Прыз, Ф. Г. Ферын і іншыя. Усяго ж тут у розных баявых аперацыях загінулі 37 украінскіх партызан.

Поспехі Чырвонай Арміі летам 1943 года ў ходзе Курскай бітвы і іншых наступальных аперацый, асабліва пасля ліквідацыі арлоўскага і белгарадска-харкаўскага плацдармаў гітлераўцаў, стварылі рэальныя ўмовы для вызвалення Левабярэжнай Украіны і паўднёва-ўсходняй часткі Беларусі. Гэты фактар, а таксама актывізацыя партызанскага руху ў ходзе рэйкавай вайны ў жніўні — верасні 1943 года і іншых баявых аперацый народных мсціўцаў наогул амаль поўнасцю паралізавалі дзейнасць акупацыйных улад у рэгіёнах партызанскіх зон. Справядлівая кара спасцігала здраднікаў. Так, 3 кастрычніка 1943 года партызаны брыгады імя Аляксандра Неўскага з партызанскага злучэння Паўднёва-Прыпяцкай зоны разгромілі вялікі абоз, з якім у Петрыкаў перадыслацыраваліся паліцэйскія гарнізоны з Брагіна і Хойнікаў. Падчас бою было забіта 40 паліцэйскіх, захоплены сакрэтныя дакументы, 30 коней з фурманкамі, шмат зброі і боепрыпасаў[2].

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 970. Л. 51. *(Пераклад з нямецкай.)*

[1] Шкрябач Я. П. Дорога в Молдавию. Кишинев. 1966. С. 119.

[2] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць. Мн., 1985. С. 264.

Поспех баявых дзеянняў народных мсціўцаў у немалой ступені залежаў ад іх сувязей з насельніцтвам акупіраваных гітлераўцамі мясцовасцей. Праз сувязных і падпольшчыкаў у лес паступалі не толькі каштоўныя разведданыя і зброя, але і медыкаменты, перавязачныя сродкі, адзенне і прадукты. Актыўнымі сувязнымі партызанскага атрада імя Катоўскага з'яўляліся Агаф'я Цітаўна Цалуйка, Наталля Мікітаўна Шрамянок. Пяклі хлеб і перадавалі яго партызанам Таццяна Сазонава, Хіма Ахрэмаўна Шаўчэнка і іншыя жанчыны.

Побач з дарослымі ў партызанскіх атрадах было нямала падлеткаў, якія таксама ўносілі свой пасільны ўклад у агульную справу барацьбы з ворагам. Так, ва ўкраінскім партызанскім атрадзе імя Чапаева, што дзейнічаў на Камарыншчыне, былі два браты-падлеткі Міша і Піліп Грані з вёскі Капоранка. Дзевяцігадовы Міша быў сувязным, а старэйшы, Піліп, змагаўся ў радах партызан. Па даносе правакатара Мішу Граня ворагі схапілі ў 1943 годзе і расстралялі. Партызанам-разведчыкам у атрадзе імя Катоўскага быў пятнаццацігадовы Лёва Ефіменка, сын загінуўшых савецкіх падпольшчыкаў Ефіменкаў. Пры выкананні разведвальнага задання ў 1943 годзе Лёва трапіў у рукі ворага, але цудам яму ўдалося выратавацца. У далейшым Л. Н. Ефіменка ў радах Савецкай Арміі ўдзельнічаў у баях за вызваленне Польшчы. Загінуў у лютым 1945 года, пахаваны ў г. Познань. Юным народным мсціўцам называлі катоўцы свайго выхаванца чатырнаццацігадовага Івана Шпакава.

Храбра змагаліся ў партызанскім атрадзе імя Катоўскага радавыя І. Л. Пугач, М. А. Котчанка, Р. М. Сазонаў, М. Р. Ціханенка, у атрадзе імя Варашылава — радавыя В. І. Кананучанка, А. К. Пінчук, у атрадзе імя Суворава — радавыя Д. Н. Васілеўскі, У. М. Лявоненка і іншыя.

Вайна ў тыле ворага, як і на фронце, не абыходзілася без страт і ахвяр. У баях з гітлераўцамі, пры выкананні

Партызанскі сувязны Л. С. Сабаленка

заданняў загінулі байцы і камандзіры падраздзяленняў атрада імя Катоўскага Б. А. Волкаў, І. Д. Грышчанка, М. С. Падсасонны, Р. М. Сазонаў, М. В. Шрамянок, Ф. І. Філіпенка, атрада імя Суворава — І. В. Здаравец, 37 партызан з Чарнігаўскага партызанскага злучэння і інш.

Удзячныя брагінцы і камарынцы свята шануюць памяць загінуўшых народных мсціўцаў. У гонар іх у Брагіне, Камарыне, Пірках, Савічах і іншых населеных пунктах узведзены помнікі і абеліскі, устаноўлены мемарыяльныя знакі. У шэрагу школ афармлены вітрыны і стэнды з матэрыяламі аб партызанскім руху ў нашых мясцінах. Прозвішча камандзіра партызанскага атрада імя Катоўскага П. Р. Зіновіча нададзена адной з вуліц Брагіна. На месцах базіравання партызанскіх атрадаў імя Варашылава і імя Катоўскага (у вёсках Радзін і Нежыхаў), месцы знаходжання падпольных Брагінскага і Камарынскага райкамаў КП(б) Беларусі ўстаноўлены памятны знак (абеліск) і мемарыяльная дошка.

І. Ф. Ганжураў

ПРЫСЯГА БЕЛАРУСКАГА ПАРТЫЗАНА[1]

Я, грамадзянін Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, верны сын гераічнага беларускага

[1] Адзіны тэкст Прысягі беларускага партызана распрацаваны на пачатку жніўня 1941 г. ЦК КП(б)Б і партызанскай школай, надрукаваны ў газеце «Звязда» і ў лістоўках, якія з самалётаў былі скінуты на акупіраваную тэрыторыю Беларусі.

народа, прысягаю, што не пашкадую ні сіл, ні самога жыцця для справы вызвалення майго народа ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і катаў і не складу зброі да таго часу, пакуль родная беларуская зямля не будзе ачышчана ад нямецка-фашысцкай пагані.

Я клянуся строга і няўхільна выконваць загады сваіх камандзіраў і начальнікаў, строга захоўваць воінскую дысцыпліну і берагчы ваенную тайну.

Я клянуся за спаленыя гарады і вёскі, за кроў і смерць нашых жонак і дзяцей, бацькоў і мацярэй, за гвалты і здзекі над маім народам жорстка помсціць ворагу і безупынна, не спыняючыся ні перад чым, заўсёды і ўсюды смела, рашуча, дзёрзка і бязлітасна знішчаць нямецкіх акупантаў.

Я клянуся ўсімі шляхамі і сродкамі актыўна дапамагаць Чырвонай Арміі, паўсямесна знішчаць фашысцкіх катаў і тым самым садзейнічаць хутчэйшаму і канчатковаму разгрому крывавага фашызму.

Я клянуся, што хутчэй загіну ў жорсткім баі з ворагам, чым аддам сябе, сваю сям'ю і беларускі народ у рабства крываваму фашызму.

Словы маёй свяшчэннай клятвы, сказаныя перад сваімі таварышамі партызанамі, я замацоўваю ўласнаручным подпісам, — і ад гэтай клятвы не адступлю ніколі.

Калі ж па сваёй слабасці, трусасці або па злой волі я парушу сваю прысягу і здраджу інтарэсам народа, няхай памру я ганебнай смерцю ад рук сваіх таварышаў.

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА ГОМЕЛЬСКАГА ГАРКАМА КП(б)Б С. Ф. АНТОНАВА Ў ЦК КП(б)Б АБ ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ ВОБЛАСЦІ ЗА ПЕРЫЯД З 1 ЛІПЕНЯ 1941 г. ДА СНЕЖНЯ 1942 г.

В августе месяце карательные отряды вынудили нас перебазироваться, и, форсировав р. Днепр, мы обосновались в Хойникском районе. Здесь мы связались с отрядом Лосова (окруженец, капитан). Отряд действовал в Хойникском и Брагинском районах, с количественным составом 60 чел. Тов. Кожар на время подчинил этот отряд тов. Федосеенко, командиру отряда «Большевик», на положении взвода. В отряде была наведена соответствующая дисциплина, был назначен новый руководящий состав, т. е. назначены братья Филиппенко: старший Филиппенко, бывший инструктор оргинструкторского отдела Полесского обкома партии, назначен командиром отряда, а младший Филиппенко — комиссаром. Отряд под новым руководством был отправлен опять в свою зону действий. Вскоре после этого разгромили небольшой немецкий отряд в одной из деревень, убив 15 немцев.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33ª. Спр. 68. Л. 63—66.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ НАМЕСНІКА КАМІСАРА ПА КАМСАМОЛЕ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ КАТОЎСКАГА В. А. РАБЯНКА АБ РАБОЦЕ КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ЗА ЛІПЕНЬ 1943 г.

Всего в отряде насчитывается 34 ком-ца, что составляет 17 проц. из общего числа партизан в отряде.

Проведенная немцами блокировка нашего района, в т. ч. района действия нашего партизанского отряда, принесла большой ущерб... Пережив этот критический момент, комсомольская организация опять взялась за свою работу по приему лучших, проверенных товарищей в комсомол, а так же ведется подготовительная работа среди комсомольцев для вступления в нашу большевистскую партию.

В целях изучения всех видов оружия, боевой техники, взаимодействия в бою комсомольцы занимаются боевой учебой. Под руководством командиров и политработников налаживаются занятия по изучению винтовки (иностранных марок тоже), пулемета, автомата, гранат.

Проводится политико-воспитательная работа среди комсомольцев, молодежи и населения путем (распространения) листовок, воззваний, литературы, оперсводок Советского информбюро. Забрасывается информационный материал в савичский, ильичский и пирковский гарнизоны противника с целью разложения их...

С приближением уборочной противник в июле начал забрасывать в нашем районе свои гарнизоны по населенным пунктам Савичи, Пирки, Ильичи, Острогляды с целью уборки урожая и отправки хлеба из нашего района. На этот счет комсомольской организацией было проведено 5 июля 1943 года собрание комсомольцев по вопросу проведения

широкой политмассовой работы среди населения окружающих деревень с целью не дать ни одного килограмма из нашего района. Свинца вместо хлеба врагу — так воспитывали комсомольцев отряда и население окружающих деревень нашего района. Для проведения практических мероприятий комсомольцами под руководством парторганизации и командования написаны воззвания и отосланы в населенные пункты Савичи, Пирки, Хатуча, Богуши и др. Молодежное звено под руководством старшего группы Горобченко Василия Ник. уничтожило уборочный сельскохозяйственный инвентарь в дер. Верхняя Слобода, который немцы хотели использовать для проведения уборочной. Организована развед-группа, командиром которой является Астапенко Алексей Л. Эта группа добросовестно выполняет порученные ей задания командования. Доносит штабу данные о количественном и национальном составе противника, его вооружении, укреплении и месторасположении...

При боевой операции 22 июля 1943 года было убито 2 гитлеровца, 1 немецкий переводчик, 4 полицейских и 3 взято в плен. Боевую способность в бою проявил комсомолец Астапенко Алексей Л. (ком. группы), который автоматной очередью убил двух гитлеровцев. Организована одна подпольная группа из 3 чел. 23 июля 1943 г. проведено комсомольское собрание по вопросу работы комсомольской организации за последний период времени. Решением собрания принят ряд конкретных мероприятий по вопросу роста комсомольской организации, усилению политмассовой, разъяснительной работы среди населения, организации диверсионных групп, подпольных групп и групп «охотников»[1], возобновления работы стенной газеты, повышения качества боевой учебы комсомольцев, вступления в нашу большевистскую партию.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4134. Воп. 1. Спр. 11: Л. 3.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

[1] Невялікая група партызан-добраахвотнікаў па знішчэнні нямецка-фашысцкіх акупантаў з засад.

Не давалі ворагу спакою

З успамінаў С. І. Філіпенкі, былога камандзіра партызанскіх атрадаў імя Р. І. Катоўскага і К. Я. Варашылава

Філіпенка Сцяпан Іларыёнавіч нарадзіўся ў 1908 г. у в. Савічы Савіцкай воласці Рэчыцкага павета. Адукацыя 6 класаў. З пачатку 1941 г. і да першых дзён Вялікай Айчыннай вайны працаваў старшынёй Савіцкага спажывецкага таварыства.

С. І. Філіпенка

Ф. І. Філіпенка

З 24 жніўня 1941 г. у саставе мінамётнай роты 483-га стралковага палка 21-й арміі Паўднёва-Заходняга фронту. На пачатку лістапада 1941 г. полк трапіў у акружэнне на Палтаўшчыне. Пасля выхаду з акружэння С. І. Філіпенка вярнуўся ў родную вёску, куды яшчэ раней прыйшоў з акружэння яго брат Фёдар Іларыёнавіч. Пры дапамозе падпольшчыка, бургамістра Савіцкай воласці А. М. Фурса і спецыяльна накіраванага на работу ў паліцыю двоюраднага брата П. Ц. Анапрэнкі Сцяпан Іларыёнавіч і Фёдар Іларыёнавіч правялі вялікую работу па стварэнні падпольных патрыятычных груп у вёсках Савічы, Грушнае, Савічы-Двор, Пучын, Жэрднае і інш. У склад іх уваходзілі не толькі мясцовыя патрыятычна настроеныя грамадзяне, але і акружэнцы, што ўцяклі з палону, чырвонаармейцы — ураджэнцы іншых мясцін.

Калі акупацыйныя ўлады пачалі праяўляць цікавасць да братоў Філіпенкаў, яны пайшлі ў лес, каб весці арганізаваную ўзброеную барацьбу з гітлераўцамі і іх паліцэйскімі прыхваснямі.

Пасля вайны С. І. Філіпенка жыў і працаваў на радзіме. Пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС пераселены на пастаяннае жыхарства ў Рэчыцкі раён Гомельскай вобласці.

21 снежня 1941 года я разам з братам Фёдарам і яшчэ адзінаццаццю мясцовымі грамадзянамі, у т. л. Фамой Якаўлевічам Грыцэнкам з в. Жэрднае, Фёдарам Сямёнавічам Стаяном, Рама-

нам Купрыянавічам Беразняцкім, Міхаілам Фёдаравічам Філіпенкам з в. Савічы і іншымі, а таксама сямю акружэнцамі, якія часова пражывалі ў в. Грушнае (з іх памятаю толькі Мікалая Аляксандравіча Данскога), прыйшлі ў лес за вёску Нежыхаў і абсталявалі там свой лагер. Нас моцна засмучала, што не ва ўсіх партызан была зброя, ды яшчэ непакоіла, што не было прадуктаў. Але пры садзейнічанні бургамістра А. М. Фурса і савіцкіх падпольшчыкаў раздабылі вінтоўкі, патроны, гранаты. Бургамістр таксама прапанаваў удалы план забеспячэння партызан прадуктамі. З воласці вясковым старастам немцамі даваўся загад аб зборы прадуктаў для гітлераўцаў. Калі прадукты везлі ў напрамку Савічаў і Брагіна, папярэджаныя аб гэтым партызаны выходзілі на дарогу і забіралі ўсё з падвод ці саней. Гэткім жа чынам лясныя салдаты ноччу «рэквізоўвалі» і муку на млынах. А бургамістр А. М. Фурс, які перад гэтым даваў нам звесткі аб часе і маршрутах праходжання фурманак з прадуктамі, аб наяўнасці мукі на млынах, назаўтра паведамляў у брагінскую паліцыю і жандармерыю аб тым, што партызаны аграбілі абоз ці млын. Прыкладна гэткім жа чынам мы забяспечваліся мясам і малочнымі прадуктамі. У гэтай справе добра дапамагаў праз А. М. Фурса дырэктар маслазавода ў Савічах, даваенны настаўнік Грушнянскай школы Мікалай Аляксеевіч Лявоненка.

Каб не падвяргаць небяспецы жыццё ездавых, у якіх мы забіралі прадукты, выдавалі ім квітанцыі, завераныя пячаткай вайсковай часці № 1476, якую нам перадаў С. І. Камека.

У красавіку 1942 года ў нашу групу прыйшоў П. Р. Зіновіч. З ім былі І. М. Садчанка, Міхаіл Дзялец і яшчэ двое — прозвішчаў не помню. Праз пару дзён Садчанка і Дзялец накіраваліся ў Гомельскае партызанскае злучэнне І. П. Кожара, а Зіновіч быў прызначаны ў нас загадчыкам гаспадаркі.

Да красавіка 1942 года наш партызанскі атрад дзейнічаў самастойна. Мы падтрымлівалі сувязь з Гомельскім партызанскім злучэннем, з чарнігаўскім партызанскім атрадам імя Кацюбінскага са злучэння М. М. Таранушчанкі, які дзейнічаў на тэрыторыі тагачаснага Камарынскага раёна.

У маі 1942 года наша партызанская група ўжо налічвала 40 узброеных байцоў. У гэты час да нас прыйшоў А. Я. Міхневіч, які перад тым працаваў землямерам у Савіцкай воласці. Аляксандр Яфімавіч на ваеннай службе быў начальнікам штаба палка. Такі спецыяліст аказаўся нам вельмі дарэчы. Па прапанове Міхневіча пераўтварылі сваю партызанскую групу ў атрад, прысвоіўшы яму імя героя грамадзянскай вайны Катоўскага. Вырашылі і арганізацыйнае пытанне: мяне абралі камандзірам атрада, брата Фёдара — камісарам, а Міхневіча — начальнікам штаба.

Да лета 1942 года партызанскі атрад імя Катоўскага ўжо моцна непакоіў акупантаў. Таму начальнік брагінскай жандармерыі Вільгельм Фрыдрых неадноячы спрабаваў выявіць і знішчыць партызан. У чэрвені 1942 года ён нават закамуфляваў «пад партызан» групу карнікаў і спрабаваў выявіць размяшчэнне народных мсціўцаў. Але — безвынікова. Партызаны загадзя даведаліся аб варожых планах праз падпольшчыка Пятра Анапрэенку, які працаваў паліцэйскім у Савічах.

Баявыя аперацыі да красавіка 1943 года мы праводзілі ў Брагінскім, Камарынскім і Хойніцкім раёнах. Але падчас іх не ўсё і не заўсёды было гладка. Напрыклад, 18 красавіка 1943 года павінен быў адбыцца прыём капітуляцыі і пераход у наш атрад паліцэйскіх піркаўскага гарнізона. Аб гэтым напярэдадні была дасягнута дамоўленасць паміж камісарам атрада Ф. І. Філіпенкам і піркаўскім бургамістрам Анапрэенкам. Аднак гэта аказалася здрадніцкай пасткай. Ф. І. Філіпенка і партызанская сувязная (сястра жонкі бургамістра Анапрэенкі) былі арыштаваны

камендантам піркаўскай паліцыі Фясько і расстраляны.

Не дачакаўшыся вяртання камісара і сувязной, партызаны вырашылі ісці ў Піркі, але на подступах да вёскі былі сустрэты моцным агнём. Прыйшлося адступіць. Пры гэтым атрымаў раненне ў нагу ўпаўнаважаны Палескага партызанскага злучэння Л. П. Баранаў, які знаходзіўся ў атрадзе імя Катоўскага.

Каб даведацца аб лёсе камісара Філіпенкі і сувязной, мы накіравалі ў Піркі сувязную Феню Якаўлеўну Грыцэнка і партызана Рамана Купрыянавіча Беразняцкага. Неўзабаве разведчыкі вярнуліся і паведамілі, што сувязная і камісар забіты паліцэйскімі.

За перыяд, на працягу якога я ўзначальваў партызанскі атрад імя Катоўскага, яго сіламі былі праведзены наступныя найбольш значныя баявыя аперацыі:

1. У жніўні 1942 года знішчаны паліцэйскі апорны пункт пры Савіцкай воласці. Пры гэтым былі забіты 14 паліцэйскіх і два нямецкія шпіёны. У якасці баявых трафеяў катоўцы здабылі 14 вінтовак, кулямёт, 2 аўтаматы, 3 гранаты. Быў схоплены і расстраляны пасля допыту ў лагеры начальнік савіцкай паліцыі.

2. Падрыўнік партызанскага атрада М. А. Данскі разам з партызанам Сямёнам Зылем зманціравалі міну-сюрпрыз у выглядзе пасылкі і праз старасту з в. Жэрднае Анісімава даставілі яе ў Брагін. Ад выбуху замініраванай пасылкі загінулі начальнік паліцыі Марчанка, некалькі паліцэйскіх і немцаў.

3. У другой палавіне 1942 года разгромлены нямецка-паліцэйскі куст у в. Аравічы Хойніцкага раёна. Пры гэтым партызаны знішчылі прыстань на р. Прыпяць, 2 аўтамашыны, некалькі паліцэйскіх і немцаў, захапілі шмат зброі і боепрыпасаў.

4. Знішчаны паліцэйскі куст у в. Карчовае Хойніцкага раёна, а яго начальнік расстраляны.

5. У сакавіку 1943 года праз жыхара вёскі Савічы сувязнога Гаўрылу Харытонавіча Несцярэнку быў разагітаваны размешчаны ў Савічах 108-мы ўласаўскі батальён з 250 чалавек, па прымусе створаны гітлераўцамі з ваеннапалонных чырвонаармейцаў. Расстраляўшы пяцярых немцаў, што камандавалі батальёнам, яго байцы са зброяй прыйшлі ў лес. У партызанскім лагеры новае баявое папаўненне сустрэлі з радасцю. Нават быў праведзены мітынг. Затым 250 байцоў былога савіцкага батальёна былі накіраваны ў распараджэнне Палескага партызанскага злучэння ў в. Піліпаўку Капаткевіцкага раёна.

6. Сумесна з народнымі мсціўцамі са злучэнняў С. А. Каўпака, А. М. Сабурава, М. І. Навумава 11 красавіка 1943 года прымалі ўдзел у разгроме Брагінскага нямецкага вайскова-паліцэйскага гарнізона. У выніку значная частка зброі і боепрыпасаў дасталася нашаму атраду.

Пасля гібелі Ф. І. Філіпенкі камісарам нашага атрада быў прызначаны П. Р. Зіновіч. Аднак нам не давялося доўга працаваць разам. У красавіку 1943 года па накіраванні Палескага падпольнага абкама КП(б) Беларусі ў атрад прыбыў у якасці ўпаўнаважанага сакратар Камарынскага райкама партыі І. А. Шэйн з групай з дзесяці чалавек. У перасланай праз яго запісцы камандзірам Палескага партызанскага злучэння Ф. М. Языковічам мне прадпісвалася перадаць кіраўніцтва атрадам імя Катоўскага начальніку штаба А. Я. Міхневічу, а самому разам з некалькімі катоўцамі і групай І. А. Шэйна ісці ў раён Камарына і стварыць там новае партызанскае фарміраванне. Так узнік партызанскі атрад імя Варашылава. Яго камандзірам быў я, а камісарам — І. А. Шэйн. У стварэнні атрада вялікую дапамогу нам аказалі кіраўнікі арганізаваных намі падпольных груп і сувязныя Канстанцін Анісімавіч Акуленка (в. Асарэвічы), Пётр Піліпенка (в. Ёлча), Васіль Чмураў (в. Капоранка). Ужо ў чэрвені 1943 года ў нашым атрадзе налічвалася 35 байцоў. У гэты

час начальнікам штаба атрада быў прызначаны кадравы ваенны, ураджэнец в. Новая Ёлча Аляксандр Архіпавіч Петрусевіч.

Наш новы партызанскі атрад дзейнічаў у раёне Камарына, на мяжы Брагінскага і Хойніцкага раёнаў. Нашай задачай было — не дапусціць стварэння немцамі ў вёсках або знішчэнне існаваўшых паліцэйскіх груп, пашкоджанне ліній сувязі, падрыў мастоў, прадухіленне вывазу акупантамі нарабаваных у мірнага насельніцтва жывёлы, збожжа, вядзенне палітычнай прапаганды і агітацыі сярод жыхароў і інш. І мы многае рабілі ў гэтым плане. У прыватнасці, у ліпені 1943 года быў знішчаны паліцэйскі гарнізон у Камарыне. З таго часу акупацыйная ўлада ў гэтым гарпасёлку ўжо не аднаўлялася.

Да моманту злучэння з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі 22 верасня 1943 года ў нашым партызанскім атрадзе налічвалася больш як 80 байцоў.

Усякае было ў партызанскім жыцці: даводзілася адчуць і радасць перамог, і горыч цяжкіх страт. Пры выкананні баявых заданняў, прарыве варожых блакад загінулі адважныя лясныя салдаты і партызанскія сувязныя Д. С. Анапрэенка, С. І. Кірычэнка, М. Д. Краўцоў, Пётр Піліпенка, Аляксей Смірноў і іншыя.

І. Ф. Ганжураў

З пісьма МІКАЛАЯ БАБІЧА, ДЗМІТРЫЯ ПІЛІПЕНКІ і УЛАДЗІМІРА ШАРАНКА, жыхароў Слабадскога сельсавета

На нашых вачах ствараўся партызанскі аград, арганізатарамі якога з'яўляліся браты Філіпенкі, а першымі партызанамі былі жыхары населеных пунктаў Слабадскога сельсавета — Жэрдінага, Нежыхава, Выграбнай Слабады, Вярховай Слабады і інш. У ліку іх трэба назваць Грыцанка Мішу, Грыцанка Фаму, Котчанку Мікалая Ад., Крывульку Івана Мак., Піліпенку Пятра, Рабянка Віктара Аляксандр., Сазонава Грышу, Сазонаву Таццяну, Шаранка Міхаіла і інш. З іх ліку цяпер жывыя толькі М. А. Котчанка (жыве ў Гомелі), Сазонава Таццяна (жыве ў Савічах) ды яшчэ, магчыма, хто-кольвечы.

Пра Т. М. Сазонаву хочацца сказаць асобна. Вось гэта была сапраўды адважная партызанка. Калі ворагі арыштавалі яе мужа — Грышу Сазонава, дык яна адразу разам з камандзірам атрада А. Міхневічам і групай партызан смела паішла на яго вызваленне. Праўда, вызваліць Грышу не ўдалося, але маладая жанчына паказала ў той аперацыі прыклады сапраўднай храбрасці. Акрамя таго, Таццяна пякла хлеб для партызан. Жанчына неаднойчы, як кажуць, глядзела смерці ў вочы, але не збаялася і знаходзілася ў партызанскім атрадзе да самага вызвалення раёна ад гітлераўцаў.

1981 г.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Партызанскія «сюрпрызы»

З успамінаў Ф. А. Загаранскага, былога камандзіра роты партызанскага атрада імя Р. І. Катоўскага

Успамінаю некалькі эпізодаў з баявога жыцця нашага атрада.

Камендантам паліцыі ў Брагіне быў нейкі Марчанка, вядомы сваімі здзекамі з мясцовага насельніцтва. Падчас разгрому нямецкага гарнізона ў Лоеве каўпакаўцы ашукалі брагінскую паліцыю. Выкарыстаўшы нямецкую лінію сувязі,

Ф. А. Загаранскі

яны паведамілі ў Брагін (ад імя лоеўскіх паліцаяў, вядома), што вядуць бой з партызанамі, дабіваюць іх, прапануюць выехаць на дапамогу. Партызаны загадзя замініравалі ўчастак дарогі, наладзіўшы каля гэтага месца засаду. Так машыны з брагінскімі паліцаямі былі ўзарваны. У гэтай акцыі разам са сваімі прыхваснямі-паліцаямі загінуў і камендант Марчанка.

Калі замест загінуўшага каменданта на гэтую пасаду заступіў другі Марчанка, у нашым атрадзе вырашылі расправіцца і з ім. Улічваючы, што новы фашысцкі паслугач быў вельмі асцярожным у выездах за межы Брагіна, дамовіліся даканаць яго партызанскай хітрасцю. І даканалі, пераслаўшы яму, быццам у знак удзячнасці ад гітлераўцаў, пасылку з мінай нацяжнога дзеяння. Выбухам былі знішчаны Марчанка-другі і некалькі ворагаў.

Наступную аперацыю назвалі «Партызанскі мядок». Сутнасць яе таксама зводзілася да міны-сюрпрызу. У бітон з мёдам паклалі міну з гадзіннікавым механізмам, завёўшы яго на пэўны час. Гэта было зроблена ў вёсцы Савічы-Двор, непасрэдна на пасецы, якая ў той дзень не ахоўвалася паліцэйскімі. На гэты раз не адсылалі свой «падарунак», а арганізавалі ўсё так, быццам партызаны ў паспешлівасці не змаглі захапіць бітон мёду з сабой.

Назаўтра немцы і паліцаі выявілі на пасецы «пакінутую пры адступленні» партызанскую падводу, на якой стаяў бітон. Баючыся атруты, яны спачатку далі пакаштаваць мёд мясцовым дзецям, а затым, супакоіўшыся, павезлі салодкі груз да будынка, дзе размяшчаўся савіцкі гарнізон. У вызначаны час магутны выбух страсянуў паветра над вёскай. Ад яго загінулі 15 фашыстаў і паліцаяў.

Добра помніцца аперацыя, у якую быў уключаны і я. Было дадзена заданне знішчыць у Астраглядах паліцэйскі пост, які ахоўваў нямецкую гаспадарку, створаную на рэштках базы ранейшага саўгаса. Заданне было паспяхова выканана. Тут мы нагрузілі сем падвод рознымі, вельмі неабходнымі прадуктамі і ўсё гэта прывезлі ў партызанскі атрад.

Наогул, за час дзеянняў нашага атрада давялося прыняць удзел у некалькіх параўнаўча буйных баявых аперацыях. Добра запала ў памяць адна з іх — разгром брагінскага варожага гарнізона 11 красавіка 1943 года. У ім прымалі ўдзел партызаны са злучэнняў Каўпака, Фёдарава і інш.

...Побач з дарослымі ў партызанскім атрадзе былі і падлеткі. Нярэдка разам са сваімі старэйшымі таварышамі яны прымалі ўдзел у баявых аперацыях, аказвалі вельмі неабходную дапамогу атраду ў якасці разведчыкаў. У іх ліку юныя разведчыкі Лёня Бабіч, Лёва Ефіменка, Ваня (Іван Раманавіч) Беразняцкі і іншыя. Бясстрашным лясным салдатам зарэкамендавала сябе шаснаццацігадовая дзяўчына Лідзія Кунцэвіч. Напачатку, улічваючы няхватку баявой зброі, яна мела на ўзбраенні звычайную паляўнічую стрэльбу. Але неўзабаве ў баі здабыла сабе сапраўдную вінтоўку. Разам з партызанамі яна і Оля Калацэй хадзілі на баявыя аперацыі, прымалі ўдзел у разгроме варожых гарнізонаў у Савічах, Аравічах і інш. Ліда загінула ў баі ў 1943 годзе.

...Восенню 1943 года, падчас баёў за Днепр, партызаны ўсяляк дапамагалі наступленню Чырвонай Арміі. Нямала нямецкай тэхнікі ўзляцела ў паветра на нашых мінах, шмат варожых салдат знайшлі бясслаўную смерць ад трапных партызанскіх куль.

Запісаў *Ю. Я. Залатарэнка*

Маяк Палесся, 1978. 9 мая.

Шпіталь у зямлянцы

З успамінаў Д. Ф. Стрыбука, былога падпольшчыка, галоўнага ўрача партызанскага атрада імя Р. І. Катоўскага

Месца для дыслакацыі партызанскага атрада было выбрана ў глухой лясіста-балоцістай мясцовасці на паўднёна-заходнім стыку Брагінскага і Хойніцка-

га раёнаў, ва ўрочышчы Паганное. Амаль з усіх бакоў яго акаляў гонкі і дрымучы лес. На ўсход, у бок Чарнігава, за ім было балота, часткова асушанае яшчэ ў дваенныя гады. Усе аб'екты лагера — шалашы і зямлянкі, кухня — размяшчаліся вакол цэнтральнай лагернай паляны, а млын і пякарня знаходзіліся крыху далей, у дрымучым ляснім гушчары. Па суседстве з імі быў сямейны лагер.

З боку цэнтральнай лагернай плошчы размяшчалася партызанская сталоўка, якая ўяўляла сабой доўгія, збітыя з дошак сталы і некалькі лавак. Ежу пераважна прымалі стоячы — на лаўках звычайна сядзелі параненыя ці партызаны, што толькі вярнуліся з баявога задання. Па суседстве са сталоўкай былі прыштабны шпіталь і амбулаторыя. Быў яшчэ адзін цікавы аб'ект, пра які нельга не згадаць,— партызанская гаўптвахта пад высокай бярозай у цэнтры пляца, ва ўсіх на віду. Але месца пад ёй звычайна пуставала, бо ў атрадзе падтрымлівалася строгая дысцыпліна і на «губу» рэдка хто трапляў.

Няхітрая партызанская гаспадарка ўключала ў сябе і аднесены крыху далей, у лясны гушчар, хірургічны шпіталь. Гэта была вялікая зямлянка (а ў летні час — павець) з некалькімі самаробнымі ложкамі. Тут жа, па суседстве знаходзіўся аперацыйны пакойчык. У ім я праводзіў аперацыі, і дапамагала мне мая жонка — былы ваенфельчар Чырвонай Арміі, ураджэнка г. Ульянаўска. Таццяна Іванаўна пасля выхаду з акружэння асталявалася ў Брагіне. Яна наладзіла сувязь з патрыятычным падполлем і затым перайшла ў партызанскі атрад. Загадвала партызанскай аптэкай Ганэліна Ганна А. У 1943 годзе ўзначальваў нашу медслужбу ваенфельчар-акружэнец Пётр Гаркавенка.

Аперацыі мы рабілі пры газоўках з самаробнымі люстэркавымі ўзмацняльнікамі святла. А ў летні час — пры дзённым асвятленні. У хірургічным шпіталі параненых і хворых даглядалі спецыяльна падрыхтаваныя намі для гэтага жанчыны і дзяўчаты. Складана было з медыкаментамі і перавязачнымі сродкамі. Пераважна іх здабывалі праз брагінскіх падпольшчыкаў. Выкарыстоўвалі і народныя лекавыя сродкі. У нашым сямейным лагеры была бабулька, якая ўлетку назапашвала лекавыя травы і затым з'яўлялася добрым кансультантам па вырабе, прыгатаванні з іх каштоўных лячэбных настояў, адвараў, прымочак. У якасці перавязачнага матэрыялу выкарыстоўвалі тонкае даматканае палатно, парэзанае на стужкі. Па маёй прапанове партызаны абшуквалі ўзятых у палон і забітых немцаў і забіралі перавязачныя пакеты. І ў іншых выпадках збіралі ўсё прыдатнае для медыцынскіх мэт. Частку бінтоў пасля старанной тэрмічнай апрацоўкі выкарыстоўвалі паўторна.

Д. Ф. Стрыбук

Г. А. Ганэліна

Медыцынская служба атрада, якая налічвала каля дзесятка чалавек, вярнула ў баявы строй многіх параненых партызан, вылечыла хворых жанчын і дзяцей з сямейнага лагера.

Самым цяжкім быў для нашых партызан перыяд з чэрвеня па лістапад 1943 года. Пад напорам варожых сіл, падтрыманых артылерыяй, катоўцы хавалі ў зямлю і надзейна маскіравалі атрадную маёмасць, эвакуіравалі параненых і хворых у аддалены сямейны лагер і ў суправаджэнні вопытнага правадніка адступалі ў напрамку цяжкапраходнай балоцістай мясціны, адводзя-

чы фрыцаў у бок ад сямейнага лагера. Так безвынікова заканчваліся спробы акупантаў блакіраваць і знішчыць наш атрад. Бо звычайна праз суткі-двое партызаны вярталіся на ранейшае месца дыслакацыі, аднаўлялі разбураную гаспадарку і зноў ішлі ў засады і на дыверсіі, баявыя аперацыі. Народныя мсціўцы актыўна дапамагалі з варожага тылу Чырвонай Арміі ў дні вызвалення ёю Брагіншчыны і Камарыншчыны. 24 ліставада злучыліся з чырвонаармейскімі часцямі, а насельнікі сямейнага партызанскага лагера пайшлі да сваіх жытлаў.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Баявы рахунак атрада

З успамінаў І. М. Садчанкі, былога начальніка разведкі партызанскага атрада імя А. В. Суворава

З самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны я быў на фронце. Пасля кантузіі трапіў у акружэнне пад Вязьмай. Тры тыдні праляжаў у адной бабулькі, якая ледзь выхадзіла мяне рознымі травамі і адварамі. Затым, пераапрануты ў сялянскае адзенне, з цяжкасцю дабраўся да родных мясцін.

У вёсцы паліцэйскія адразу ж устанавілі за мной назіранне. А калі па маёй ініцыятыве камсамольцы Сямён Доўбуш і Іван Здаравец напісалі і распаўсюдзілі лістоўкі, мяне арыштавалі. Ледзь удалося выбрацца з учэпістых кіпцюроў жандараў і паліцэйскіх. І то толькі пасля таго, як за мяне пахадаінічалі вяскоўцы.

Неяк позна вечарам Сямён і Іван тайком прыйшлі да мяне і завялі гаворку, што трэба ісці ў лес і са зброяй у руках змагацца з ворагам.

— Са зброяй,— уцікнуў я,— а дзе яна?

— У нас ужо ёсць пяць вінтовак і патроны...

Я згадзіўся. Днём схадзіў у Бакуны, да Адама Міхайлавіча Каробкіна, які ўзначальваў спецыяльную групу па

І. М. Садчанка

стварэнні партызанскага атрада. Праўда, пра галоўную мэту яго з'яўлення ў тутэйшых мясцінах я тады не ведаў, але блізка знаёмыя мне таварышы параілі пагутарыць з былым старшынёй райсавета Асаавіяхіма.

Згаварыліся мы (12 чалавек) пайсці ў лес. Сабраліся ва ўмоўленым месцы, у лясным урочышчы Зялёны востраў, што паміж Лубенікамі і Амелькаўшчынай. Траіх сваіх таварышаў так і не дачакаліся. Але шкадавалі не столькі аб саміх палахліўцах, колькі аб трох вінтоўках, што засталіся ў іх.

Па дарозе ў лес сустрэлі двух чырвонаармейцаў, якія ўцяклі з палону, і двух знаёмых з Брагіна. Яны без ваганняў прынялі нашу прапанову дзейнічаць разам. Але патрэбна была зброя. Неяк мы даведаліся, што ў размешчанай непадалёку вёсцы Пудакоў Хойніцкага раёна ў старастаўым доме ладзілі вечарынку гаспадар хаты, бургамістр, камендант і паліцай з Хойнікаў. Пасля папойкі яны вярталіся дамоў. Мы падпільнавалі іх і абяззброілі. Каменданта расстралялі, а паліцая і бургамістра адлупцавалі шомпаламі і адпусцілі.

Яшчэ праз некалькі дзён раздабылі адзінаццаць вінтовак і значную колькасць патронаў. Аднойчы па дарозе ў свой лагер мы сустрэлі семярых акружэнцаў, якія прабіраліся ажно з-пад Брэста, і ўзялі іх у свой атрад. Так нас стала больш за дваццаць.

Аперацыі па знішчэнні дробных груп немцаў і паліцаяў засведчылі існаванне

нашага атрада, а гэта садзейнічала пашырэнню яго радоў. Неўзабаве мы мелі ўжо 150 лясных байцоў. Камандзірам партызанскага атрада, якому падалі імя А. В. Суворава, быў камуніст К. Т. Сацура, камісарам М. Ф. Снягір. Я з'яўляўся начальнікам разведкі.

Неяк дачуліся ад мясцовых жыхароў, што ў Брагіне і Савічах былыя ваеннапалонныя па прымусе прынятыя на службу ў вайскова-паліцэйскае фарміраванне. Многія з іх чакалі зручнага выпадку, каб са зброяй у руках перайсці да партызан. Праз сувязных мы дамовіліся з некаторымі з іх аб пераходзе ў атрад. Так да нас прыйшло папаўненне. У ліку яго былі і салдаты-югаславы з нямецкіх часцей.

Памятаю, аднойчы разведка данесла, што па дарозе з Васілевічаў у бок Брагіна рухаецца калона немцаў. Вырашылі зрабіць засаду. У выніку бою было забіта шмат фашыстаў. У другі раз, даведаўшыся, што ў вёсцы Лубенікі немцы расстралялі адну сям'ю і маюць намер знішчыць яшчэ дзевяць, вырашылі падрыхтаваць пастку для карнікаў. На дарозе каля каманоўскага хвойніку адкрылі па гітлераўцах шквальны агонь. У гэтым баі разам са сваім атрадам загінуў і нямецкі палкоўнік.

Пачуўшы стральніну, нехта з суседняй вёскі па тэлефоне паведаміў у Брагін, бо неўзабаве адтуль у Лубенікі пазванілі паліцаі. Мы пайшлі на хітрасць: выдаўшы сябе за мясцовых паліцэйскіх, папрасілі дапамогі. І яна не замарудзіла з'явіцца на некалькіх грузавіках. Мы сустрэлі фашыстаў на падыходзе да месца першага бою. Зрабілі так, каб «падмога» не ўбачыла падбітых намі машын і трупаў салдат. І на гэты раз мала каму з фашыстаў удалося вырвацца жывымі. Усе машыны мы падпалілі, перш чым пакінуць месца бою.

Засталася ў памяці і сустрэча з партызанамі С. А. Каўпака. У нас яны стаялі тры дні. Агульнымі сіламі мы разгромілі нямецкі гарнізон у Хойніках.

Восенню 1943 года, калі наступала Чырвоная Армія, наш атрад нечаканым ударам разграміў нямецкі батальён, які рухаўся з Брагіна ў Хойнікі.

За час сваёй дзейнасці партызаны атрада імя Суворава разгромілі 39 паліцэйскіх участкаў і пастоў у Брагінскім, Хойніцкім і Васілевіцкім раёнах, падарвалі 29 аўтамашын, знішчылі 5 танкаў, пусцілі пад адхон 7 эшалонаў, разбралі падчас «рэйкавай вайны» 7 кіламетраў чыгункі, узарвалі 70 мастоў на чыгуначных і грунтавых дарогах. 23 лістапада 1943 года атрад у колькасці 470 партызан злучыўся з Чырвонай Арміяй.

Маяк Палесся. 1990. 10 крас.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

«Ніводнага таварыша не выдаў...»

З успамінаў І. Д. Вятрова, былога першага сакратара Палескага падпольнага абкама КП (б)Б, камандзіра злучэння партызанскіх атрадаў Палескай вобласці

...Камандаванне партызанскага атрада імя Р. І. Катоўскага (П. Р. Зіновіч, А. Я. Міхневіч) летам 1942 года даведалася, што брагінскі гебітскамісар Нольдэ загадаў стварыць у колішнім памешчыцкім маёнтку Савічы-Двор пасеку для асабістых патрэб. У атрадзе прынялі рашэнне заманіць Нольдэ на пасеку і знішчыць яго там, бо ён вельмі зверстваваў у Брагінскім раёне. Галоўная роля ў аперацыі адводзілася Сямёну Іларыёнавічу Кірычэнку, пчаляру мясцовага калгаса «Інтэрнацыянал».

Сувязь з Кірычэнкам трымалі толькі асабіста П. Р. Зіновіч і А. Я. Міхневіч. Больш аб ім у партызанскім атрадзе ніхто не ведаў.

Дапамагаць партызанам С. І. Кірычэнка пачаў па ўласнай ініцыятыве яшчэ ў канцы 1941 года — стаў іх сувязным. Але акрамя свайго асноўнага задання Сямён Іларыёнавіч дапамагаў партызанам матэрыяльна: перадаў у атрад нямала прадуктаў і, самае галоўнае, — табаку, якую ёй вырошчваў на сваім агародзе.

С. І. Кірычэнка

Па сваёй ініцыятыве С. І. Кірычэнка звязаўся (праз С. І. Філіпенку) з падпольнай групай І. А. Шэйна ў Камарыне і стаў нашым сувязным ад камарынскай групы.

«Бераглі мы Сямёна Іларыёнавіча як зрэнку вока,— расказваў мне камандзір партызанскага атрада А. Я. Міхневіч.— Але прыстукнуць фашысцкага звера Нольдэ было вельмі неабходна. Тым больш што сядзеў ён у Брагіне. Партызанская зона адной сваёй назвай наводзіла на яго страх. Тройчы С. І. Кірычэнка спрабаваў заманіць гебітскамісара ў Савічы, але гэта яму не ўдавалася. У трэці раз Нольдэ выехаў у «сваё памесце». Мы былі гатовы. Але ўсё сарвалася з-за прыкрага выпадку. Дзеці ў вёсцы Спярыжжа знайшлі снарад ці міну і ўзарвалі на дарозе Брагін — Савічы якраз перад самым выездам Нольдэ. Паездка не адбылася.

...1943 год быў у партызанскіх дзеяннях самым актыўным, і Нольдэ катэгарычна адмовіўся ехаць у Савічы. Сямён Іларыёнавіч на сустрэчы са мной унёс прапанову ўзарваць фашысцкіх салдат і паліцаяў у савіцкім гарнізоне. Гэта прапанова была прынята і ажыццёўлена 3—4 верасня 1943 года».

Камандаванне атрада загадала С. І. Кірычэнку неадкладна прыбыць у атрад і прывесці ў лес сям'ю. Але штосьці ў яго не атрымалася, і ён быў схоплены акупантамі. Сям'ю ўдалося ўратаваць.

Сямён Іларыёнавіч Кірычэнка быў падвергнуты цяжкім катаванням у брагінскім фашысцкім засценку. Падрабязна аб гэтым нам стала вядома ад даваеннага галоўнага бухгалтара саўгаса «Астрагляды» Маторнага, якому ўдалося выратавацца. Шэсць сутак фашысты мучылі партызанскага сувязнога. Патрабавалі назваць размяшчэнне партызанскага атрада, прозвішчы камандзіраў і падпольшчыкаў. Калі з чарговага допыту Сямёна Іларыёнавіча паўжывога ўцягнулі ў камеру, дзе сядзеў Маторны, Кірычэнка ледзь змог прамовіць: «Ніводнага таварыша не выдаў. Калі ты, Маторны, савецкі чалавек, скажы аб гэтым людзям...»

Сельская газета, 1975. 7 мая.

Пераклаў з рускай *І. Ф. Ганжураў*

Пакуль білася сэрца...

...У канцы 1942 года Барыс Аляксеевіч Волкаў уступіў у партызанскі атрад імя Катоўскага. Неўзабаве яго прызначылі камандзірам узвода першай роты. Шмат баявых аперацый было на рахунку Барыса і яго таварышаў Пятра Яўхімавіча Лагвіненкі, Фамы Грыцэнкі, Васіля Лагвіненкі, Міхаіла Рэбкі, Паўла Лявоненкі, Мікалая Дусянка, брата Андрэя Аляксеевіча Волкава і іншых партызан.

Памятны той эпізод, калі ўзвод пад камандаваннем Волкава адбіў у немцаў сотні галоў жывёлы, якая пасвілася на лузе каля Шапелічаў, і адправіў яе ў партызанскі лагер Баравіца, што каля вёскі Паганное Хойніцкага раёна. Ведаючы, што будзе пагоня, камандзір застаўся ў засадзе каля вёскі Красно былога Новашапеліцкага раёна. Неўзабаве завязаўся кароткі бой. Волкаў, паранены ў правую руку, працягваў змагацца з ворагам, натхняў партызан — і перамога аказалася на іх баку.

Паспяхова выканаў узвод баявыя заданні і ў засадзе каля вёскі Слабада, у падрыве глухавіцкага млына і ў іншых аперацыях.

Бясстрашны партызан збіраў сходы насельніцтва ў тыле ворага, заклікаў людзей змагацца з фашыстамі. У адной з баявых аперацый у верасні 1943 года ў няроўным баі каля вёскі Нежыхаў камандзір узвода Волкаў загінуў ад варожай кулі. З параненай рукой ён і ў той дзень вёў у бой партызан. У рашаючую мінуту адважны сын Радзімы ўзяў кулямёт ад цяжкапараненага партызана Івана Корзуна і кінуўся наперад. Страляў да таго часу, пакуль білася сэрца.

Пахавалі Барыса брат Андрэй з таварышамі пад дубамі ва ўрочышчы Баравіца. Над магілай камандзіра яны паклляліся адпомсціць ворагу і гэтую клятву стрымалі. Нямала гітлераўцаў знайшло сваю бясслаўную смерць ад трапных партызанскіх куль.

За баявыя заслугі перад Радзімай камандзір партызанскага ўзвода Б. А. Волкаў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

У 1965 годзе астанкі Б. А. Волкава перанесены з урочышча Баравіца і перазахаваны ў яго роднай вёсцы Крукі.

Д. П. Самойленка

Знявечаны, але не зламаны...

Дзям'яну Анапрэенку споўнілася дваццаць сем, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Як і большасць яго аднагодкаў, у жніўні 1941-га ён апрануў салдацкі шынель.

Аднойчы ў канцы 1941 года радавога Анапрэенку выклікалі да камандзіра часці. Незнаёмы афіцэр завёў з ім гутарку пра Палессе, Брагіншчыну. І ўсё рабіў акцэнт на тым, ці добра ведае салдат розныя мясцовасці раёна. Назваў лясіста-балоцістыя ўрочышчы каля вёскі Паганное, грушнянскае балота Грубчу, пучынскія і людзвіноўскія лясы. На ўсе пытанні Дзям'ян адказваў станоўча.

— Кандыдатура ваша падыходзіць,— сказаў незнаёмы афіцэр.— У складзе дэсантнай групы пасылаем вас у родныя мясціны.

...Самалёт ляцеў мінут сорак. Непадалёк унізе ўжо былі відаць сігнальныя кастры. Але, як потым аказалася, гэта былі выпадковыя вогнішчы непадалёку ад партызанскага аэрадрома паміж Чарнігавам і Лоевам. Далейшы шлях перагарадзіў моцны зенітны кардон. Пражэктары паласавалі неба. Тады на развароце, над узлескам, прагучала каманда: «Пайшлі!» Тры цёмныя фігуры аддзяліліся ад самалёта.

Прызямліліся зусім не туды, куды трэба. З сігнальнымі кастрамі выйшла яўная памылка. Зразумеўшы гэта, закапалі парашуты і рушылі з поля да лесу, што цямнеў на гарызонце. У цемры дакладна вызначыць месцазнаходжанне не ўдавалася.

Відаць, немцы здагадаліся, што самалёт скінуў дэсант, бо неўзабаве па шашы прамчаліся некалькі аўтамашын з салдатамі.

Ад балотнага хмызу за дарогай было ўжо амаль нішто да такога жаданага і выратавальнага лесу, калі нечакана начную цемру і цішыню скалануў моцны выбух з бліскавіцай...

Некалькі дзён, кожны з якіх быў для Дзям'яна чарней за цёмную ноч, ачуньваў паранены ў жанчыны-ўкраінкі, якая падабрала яго, ледзь жывога, на балоце.

Праз некаторы час пераапрануты ва ўсё цывільнае з хлопчыкам-павадыром Дзям'ян накіраваўся ў мястэчка, у лякарню. Пад самым мястэчкам яго арыштавалі і прывялі ў жандармерыю. Дзям'ян прыкінуўся глухім і нямым. Яго доўга дапытвалі, потым кінулі ў падвал. Адтуль была адна дарога — у гомельскі канцлагер. Тут праз аднаго чалавека ўдалося звязацца з гомельскім знаёмым Сяргеем Герасіменкам, і ён за масла і табаку выкупіў Дзям'яна. Жонка, Марыя Майсееўна, прывезла мужакалеку дадому.

Здавалася б, пасля такіх цяжкіх выпрабаванняў у чалавека і думкі не засталося аб тым, што яго накіроўвалі змагацца ў родныя мясціны. Ці ж многа сіл, магчымасцей пакінуў злы лёс зня-

вечанаму Дзям'яну, каб працягваць барацьбу з ворагам? Аказалася, хоць і не шмат, але дастаткова, каб не пакарыцца акупантам.

Крыху падлячыўшы вочы, амаль сляпы, Дзям'ян стаў сувязным партызанскай групы (затым — атрада) імя Катоўскага. Пад выглядам жабрака, ён наведваў вёску Кулаковік, заходзіў там да Данілы Бабіча (загінуў пазней). Насіў патроны, якія перадаваў ляскім салдатам жыхар вёскі Ільічы (у далейшым актыўны партызан) Аляксей Астапенка. Як успамінала дачка сувязнога, Раіса Дзям'янаўна, насіў бацька і нейкія пакеты. Казалі, што лістоўкі. Разам з павадыром наведваў умацаваны салдацка-паліцэйскі апорны пункт у Пірках, суседнюю вёску Сувіды. Здабываў там і пасля перадаваў праз сувязных у атрад звесткі аб колькасці і ўзбраенні ворага.

Дзям'яна выдаў здраднік-аднавяскавец. Арыштавалі сляпога патрыёта зімой 1943 года. Моцна катавалі ў брагінскай жандармерыі. Бо даведаліся не толькі пра ягоную сувязь з партызанамі, але і пра даваенную актывісцкую дзейнасць. Пра тое, што — камсамолец, што працаваў старшынёй калгаса ў Выграбнай Слабадзе, у Ільічах, брыгадзірам на торфазаводзе.

Не атрымаўшы ад вязня ніякіх звестак, немцы расстралялі яго ў Брагіне. Такі ж лёс чакаў і сям'ю Дзям'яна Савельевіча, але выручыла Тамара Астапенка з Ільічоў — папярэдзіла. Жонка і дачка сувязнога перабраліся да сваякоў у вёску Сцепаноў...

Шмат гадоў прайшло пасля вайны. Але ў Грушным, дзе жыў Дзям'ян, у суседніх вёсках і цяпер памятаюць адважнага патрыёта.

І. Ф. Ганжураў

Архіўная даведка

Анопреенко Демьян Савельевич (по другим данным Савкович, год рождения не указан) числится в списке группы лиц, направленных на временно оккупированную фашистскими захватчиками территорию Брагинского района Полесской области, затем с мая 1942 года по январь 1943 года являлся связным группы, позже отдельно действовавшего партизанского отряда им. Г. И. Котовского данной области. Будучи связным, Анопреенко Д. С. погиб в борьбе против фашистских захватчиков. Других данных не обнаружено.

Зав. сектором партархива
Института истории партии
при ЦК КП Белоруссии *(Л. Аржаева)*

16 февраля 1983 г.

Даведка

Дана товарищу Анопреенко Марии Моисеевне в том, что ее муж Анопреенко Демьян Савкович с мая 1942 года работал связным партизанского отряда им. Котовского, который действовал на территории Брагинского р-на Полесской области.

Тов. Анопреенко, придя с плена врага, хотя же без глаз, по всеми силами старался помочь партизанскому отряду, неоднократно посылался в Пирки, Брагин, Савичи и ряд других деревень с тем, чтобы узнать размещение полиции, вооружение и их количество, и своевременно докладывал партизанскому отряду. Так же т. Анопреенко проводил работу среди крестьян, чтобы шли в партизанский отряд и били врага. Посылался в д. Ильичи за патронами и в д. Кулаковик, что им было выполнено. Ходил он по деревням, как нищий, но все задания командования отряда выполнял своевременно и аккуратно, так как требовалось от члена ВЛКСМ, за что был арестован полицией в январе 1943 года и расстрелян в Брагине за связь с партизанами.

Командир С. *Филипенко*

Выявіў і падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Майскім днём сорак трэцяга...

Невялікі хутарок Заглыб'е, што ў былым Чарнобыльскім раёне, на Кіеўшчыне,— радзіма Паны Асядач. Размясціўся ён на адным з пясчаных пагор-

П. М. Асядач

каў у балоцістай пойме Дняпра. Пасля заканчэння Ладыжыцкай школы Паша засталася працаваць у ёй піянерважатай. Марыла стаць настаўніцай.

Ціхімі летнімі вечарамі моладзь хутара збіралася пад густымі шатамі вербаў. Часта прыходзілі туды і суседзі — хлопцы і дзяўчаты з беларускай вёскі Гдзень.

...Не збылася Пашына мара стаць настаўніцай — пачалася вайна. І Паша знайшла сваё месца ў страі змагароў — стала сувязной партызанскага атрада імя В. І. Чапаева, які дзейнічаў у міжрэччы Дняпра і Прыпяці. Яна стала часта адлучацца з дому — трэба было хадзіць у далёкія вёскі, каб сабраць там звесткі аб фашыстах і затым у патаемным месцы перадаць партызанам. Хвалявалася маці, непакоячыся за лёс дачкі. Казала:

— Не хадзі болей, донька. Бач, азвярэлі фашысцкія нелюдзі. Напалілі Ладыжычы. Цярэмцы, Залатнеў. Хапаюць каго напала...

— Ды нічога са мной не здарыцца. Схаджу да сваёй сяброўкі і праз два дні буду дома.

Маці нездарма трывожылася за дачку, бо здагадвалася, куды яна ходзіць.

А дачка зноў збіралася ў сваю небяспечную дарогу.

Майскім днём сорак трэцяга Паша спяшалася ў партызанскі атрад, які ў той час базіраваўся ў суседнім беларускім лесе. Дарога была знаёмая, не адзін раз хадзіла тут. Ёй трэба было толькі неўпрыкмет прайсці каля вёскі Кацічаў, дзе стаялі фашысты, а затым непадалёку пачыналася партызанская зона — вораг не вельмі любіў туды совацца.

Але на гэты раз ёй не ўдалося дайсці да партызан. Хтосьці са здрадзікаў паведаміў акупантам, што дзяўчына часта ходзіць паўз вёску ў лес. Таму гітлераўцы і паліцэйскія сачылі за дарогай і нарэшце затрымалі Пашу каля Кацічава, непадалёку ад партызанскай зоны. Доўга дапытвалі ворагі адважную дзяўчыну. Цікавіліся, дзе атрад, якія звесткі несла туды. Нават распілялі дзявочую касу — можа, у ёй схавана якая паперка. Але нічога не знайшлі, нічога не дазналіся. Усе звесткі былі ў памяці Пашы: і колькі салдат у бліжэйшым варожым гарнізоне, і якое ўзбраенне там, і дзе пастаўлены гарматы. Тады яе вывелі ў лес, прывязалі да сасны і штыкамі скалолі ўсё цела. Яна была яшчэ жывая, калі паліцаі закапалі яе ў акопе.

Цёмнай ноччу людзі беларускай вёскі Аляксандраўка адкапалі цела Пашы Асядач і пахавалі яго на сваіх могілках.

Пасля перамогі ў сасновым бары паблізу вёскі Кацічаў, на месцы гібелі патрыёткі, быў пастаўлены часовы абеліск з чырвонай зоркай. Гэта зрабілі мясцовыя жыхары. А ў 1965 годзе прах Пашы Асядач быў перанесены і пахаваны ў сяле Ладыжычы. Удзячныя землякі ўстанавілі на яе магіле абеліск з граніту і мармуру. На ім высечана: «Асядач Параска Мікалаеўна (1922—1943), партызанка-сувязная. Замучана фашысцкімі катамі пры выкананні баявога задання».

Свята берагуць землякі, жыхары навакольных беларускіх вёсак памяць аб камсамолцы-партызанцы. Піянерская дружына Ладыжыцкай школы насіла імя Пашы Асядач. Насіла, бо пасля катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі апусцелі Ладыжычы, пераехалі ў іншыя месцы піянеры і школьнікі разам са сваімі бацькамі. Але засталася ў сэрцах нязгасная памяць пра смелую і адважную дзяўчыну.

Р. Андрэявец

Маяк Палесся, 1982. 10 жн.

З успамінаў А. П. БЯЛЯЕВАЙ, жыхаркі в. Кацічаў

...Гэта было пад вечар. Мы, тады яшчэ дзеці, пасвілі коней вунь там, у хвойніку. Раптам нехта з хлопчыкаў крычыць: «Глядзіце, немцы кагосьці вядуць!» Калі б мы ведалі, што будзе далей, напэўна б, куды вочы глядзяць паўцякалі... А як пачалося — з перапалоху не змаглі і паварушыцца, рукі і ногі знямелі... Фашысты прывялі з вёс-

кі дзяўчыну. Не наша дзяўчына, чужая. Валасы мокрыя, рассыпаныя ў яе на грудзях, і ўся скрываўленая. Без сукенкі, на ёй толькі сарочка была. Яна ледзьве ішла, хісталася і спатыкалася. Босая. Адну руку, здаецца, правую, яна вось так падтрымлівала і прытуляла да сябе. На тым месцы, дзе вы паклалі вянкі, быў тады акоп. Яны і прыпынілiся. Немец гергетаў да дзяўчыны па-свойму, а высокі рыжы паліцаі закрычаў: «У апошні раз — скажаш, дзе партызаны,— будзеш жыць! А не — дык закапаем жывой!» Дзяўчына ўзняла галаву і плюнула яму ў твар. Крывёю плюнула.

Друкуецца па газ.: «Прапор перемоги», Чарнобыльская райгазета, 1983, 12 мая.

Пераклаў з украінскай *І. Ф. Ганжураў*

«Прытулак украінскіх партызан...»

З успамінаў М. І. Навумава, Героя Савецкага Саюза, генерал-маёра, аднаго з арганізатараў партызанскага руху на Украіне, былога камандзіра партызанскага кавалерыйскага злучэння

...Оревичи, Молочки, Старый и Новый Радин и все села Комаринского района — отрадный приют украинских партизан. Раненых бойцов ожидала там материнская любовь и ласка.

Сельская молодежь Комаринского и Брагинского районов начала осаждать штабы отрядов, вбирающих в себя пополнение, как губка воду; сумские отряды будто сборные пункты новобранцев — идет формирование и вооружение. К нам прилетели самолеты из Москвы, и молодые партизаны запели новую, ими же сложенную песню:

В саду порублены деревья,
И лужа крови у плетня,
Дымит сожженная деревня,—
Садись, товарищ, на коня!
И зиай, мой друг, в сраженьях доля
И для тебя и для меня.
Гляди: идет в твой дом неволя,—
Садись, товарищ, на коня!
Уже объят весь край пожаром,
Поработителей гоня,
Ответь губительным ударом,—
Садись, товарищ, на коня!

Но району все еще грозила пирковская опорная база гитлеровцев. Пирки были обнесены крепостными стенами, ограждены баррикадами и затопленными водой рвами. Там — крупный гарнизон и немецкая районная комендатура. То же и в Крюках. Очистка Крюков и Пирок от гитлеровцев давала возможность раздвинуть пределы партизанского края в междуречье Припяти и Днепра вплоть до Брагина.

На партизанском совете было решено, что генерал Руднев с ковпаковцами будет громить вражеский гарнизон в Крюках, а мы — в Пирках.

Атака пирковских укреплений началась при поддержке местных партизан из отряда имени Чапаева одновременно с трех сторон. Захваченные врасплох гитлеровцы бросились наутек через подземные ходы, приготовленные ими на случай отступления. Комендант в нижнем белье пытался уйти на лошади, однако партизанская пуля догнала его.

Жена коменданта торопилась спрятать награбленные вещи, она спешно укладывала в узлы драгоценности, деньги и одежду, но партизан из местного отряда, не дав ей скрыться, отомстил за смерть своего комиссара и партизан, которых предала эта женщина.

Бой длился всего полчаса. Бросив оружие, гитлеровцы бежали из Пирок к полноводной реке Брагинке, но попытки переплыть ее стоили им еще многих жертв.

Богатые пасхальные подарки, приготовленные для отправления в Германию, партизаны погрузили на повозки: продовольственные запасы гарнизона оказались неисчерпаемы — полицейские и гитлеровские прислужники держали у себя по две-три лошади, по пять коров, добытых грабежом.

Спустя день к нам прибыли из Пирок два полицая и заявили, что они провели в Пирках собрание тридцати двух полицейских, спрятавшихся от нас, и что все готовы сдаться, просят забрать оружие.

— Мы никуда не уйдем от вас,— твердили полицейские.— Все равно немцы нас расстреляют, так лучше уж вы... Делайте с нами, что хотите!

Они были переданы местному партизанскому отряду. Несколькими днями позже задымился Брагин: через белорусские леса шли партизаны-федоровцы, их наступление поддержали сумчане.

Из истории партизанского движения в Белоруссии (1941—1944 гг.). Сборник воспоминаний. Мн., 1961. С. 317—319.

З успамінаў А. Е. СІВУХІ, былога начальніка штаба партызанскага атрада імя В. І. Чапаева

У 1942 годзе, калі гітлераўскія войскі рваліся да Сталінграда, пад Старым Асколам нашы часці трапілі ў акружэнне, і я ў ліку многіх чырвонаармейцаў аказаўся ў палоне. З ліпеня да верасня 1942 года знаходзіўся ў лагеры ваеннапалонных Глыбокая даліна Кіеўскай вобласці. Затым з групай вязняў уцёк з гэтага лагера. Групай прабірацца па занятай ворагам тэрыторыі было небяспечна, мы разбіліся па два чалавекі і рухаліся толькі ноччу.

І вось першая беларуская вёска Гдзень. На падыходзе да яе я захварэў і далей ужо ісці не мог. Памятаю, каля першых хат вуліцы (з боку Чыкалавіч) сядзелі жанчыны і мужчыны. Адна са спагадлівых сялянак запрасіла мяне на вячэру, не зважаючы на тое, што гэтым магла наклікаць на сябе бяду: за аказанне ж дапамогі ваеннапалонным ці партызанам акупанты бязлітасна расправуляліся з насельніцтвам. Так я аказаўся на лячэнні ў сям'і жыхароў вёскі Гдзень братоў Віктара Сцяпанавіча і Яўгена Сцяпанавіча Максіменкаў.

Памятаю, зімой, дзесьці ў студзені 1943 года, на Гдзень быў зроблены налёт камарынскай паліцыі. Браты Яўген і Віктар Максіменкі, рызыкуючы жыццём, схавалі мяне ў хляве, закідаўшы сенам. Паліцаі рабілі па дварах вобыск, але мяне не знайшлі.

Калі я ачуняў, у Гдзені ўжо арганізавалася партызанская група, і мы пайшлі ў жараўскі лес, за вёску Скароднае. А перад гэтым прынялі баявое хрышчэнне ў сутычцы з паліцыяй. Мы зрабілі засаду на нямецкіх паслугачоў прама на вуліцы Гдзені. Успамінаю таварышаў-партызанаў Роя Аляксея Васільевіча, братоў Максіменкаў Яўгена і Віктара, Шпетнага Сямёна, настаўніцу Пелагею, якая займалася разведкай, і іншых. У далейшым наша група ўвайшла ў партызанскі атрад імя Чапаева партызанскага злучэння М. М. Таранушчанкі. Мы наносілі адчувальныя ўдары па ворагу. Напрыклад, у школьным будынку вёскі Роцічы Кіеўскай вобласці намі быў знішчаны атрад фашысцкіх карнікаў — 70 чалавек, якія прыбылі з карнай акцыяй у партызанскую зону. У тым баі загінулі сямёра нашых партызан.

Пасля таго наш атрад перадыслацыраваўся на тэрыторыю Камарынщчыны, у жараўскія лясы. На прачоску іх гітлераўцы кінулі сваю 8-ю пяхотную дывізію. Улічваючы складанасць сітуацыі, камандаванне атрада прыняло рашэнне ісці на злучэнне з партызанскімі фарміраваннямі С. А. Каўпака. Разам з каўпакаўцамі мы прымалі ўдзел у баі 15 мая 1943 года пры пераправе на правы бераг Прыпяці.

Лепшыя нашы баявыя таварышы-партызаны былі адабраны для паходу ў Карпаты, а астатніх прыкамандзіравалі ў распараджэнне падпалкоўніка Г. Ф. Пакроўскага, пад камандаваннем якога партызанскае злучэнне з баямі заняло раённы цэнтр Нова-Шапелічы і пабудавала мост цераз Прыпяць для аблягчэння пераправы наступаўшых савецкіх войск. Затым на гэтым мосце адбылася ўрачыстая сустрэча партызан і рэгулярных чырвонаармейскіх часцей. Многія партызаны прынялі ўдзел у жаркім баі за вызваленне Чарнобыля. Там, каля сяла Чаравач, у складзе 507-га стралковага палка 148-й стралковай дывізіі загінуў адважны партызан-камсамолец Яўген Сцяпанавіч Максіменка.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Рабілі смелыя налёты

З успамінаў Ф. І. Кетава, былога камандзіра ўзвода партызанскага атрада імя В. І. Чапаева

У сярэдзіне лютага 1943 года наша невялікая група па загаду камандзіра партызанскага атрада накіравалася са спецыяльным баявым заданнем у Камарын. Каб пазбегнуць сутычак з ворагам паблізу піркаўскага нямецка-паліцэйскага гарнізона, рухаліся ляснымі сцежкамі, ноччу. Наш шлях праходзіў праз пучынскі лес на Сцепаноў, а адтуль на Крукі, Чыкалавічы, Гдзень. Пасля таго як мы два дні правялі ў гэтай вёсцы, па наваколлі пайшлі чуткі, быццам нас ажно трыста чалавек, ды да таго ж з гарматай. А пакуль мы дабраліся ў Камарын, хтосьці паведаміў у паліцыю аб выступленні цэлага партызанскага атрада. Такая дэзінфармацыя дапамагла нам паспяхова выканаць баявое заданне.

Прыкладна праз месяц разведка данесла, што з Брагіна ў Камарын у пэўны час будуць ехаць бургамістр Гармель і начальнік паліцыі Зароўны. Мы вырашылі зрабіць ім партызанскую сустрэчу. Але, на жаль, з-за выпадковай недарэчнасці яна не адбылася. Абодва фашысцкія паслугачы ў прыўзнятым настроі праехалі па лясным бальшаку. Зароўны быў у новым нямецкім мундзіры. Дзіва што!.. Ён у той дзень прымаў прысягу на вернасць акупантам.

Але мундзір той начальніку паліцыі давялося насіць нядоўга. Праз некалькі дзён Зароўны і Гармель усё ж трапілі ў нашы рукі і атрымалі па заслугах. Па прыгаворы партызанскага суда здраднікаў расстралялі.

Наша партызанская сям'я павялічвалася з кожным днём. Мы рабілі смелыя налёты на камунікацыі ворага, знішчалі дробныя групы акупантаў і паліцэйскіх. Памятаю, як нашай групе на чале з Паўлам Варапаем было загадана зняць у Камарыне варту, што ахоўвала склады са збожжам у будынках Дома культуры, школы і райвыканкама, а ўсё збожжа, гвалтоўна адабранае гітлераўцамі ў сялян, раздаць ім жа. І гэтае заданне было паспяхова выканана.

А яшчэ праз некалькі дзён, удала правёўшы баявую аперацыю, камандаванне атрада вырашыла правесці каля Камарынскай школы мітынг, прысвечаны Дню міжнароднай салідарнасці працоўных — 1 Мая. Наколькі рызыкоўным было гэтае мерапрыемства, сведчыць тое, што ў Камарын тады прыбыла група карнікаў. Аднак, даведаўшыся аб наступленні нашага атрада, фрыцы не прынялі бою і ўцяклі.

Апоўдні 1 Мая партызаны ўступілі ў Камарын. Нас было нямнога. Але людзі акружылі партызан, і мітынг узнік стыхійна. Жыхары Камарына ўважліва слухалі прамову камандзіра атрада, настаўніка Барыса Замыкі, які гаварыў аб баявых справах атрада, аб тым, што пад сакрушальнымі ўдарамі савецкіх войск вораг адступае на захад, што акупантам не даюць спакою партызаны.

— Сябры! Усе сілы на барацьбу з нямецка-фашысцкімі акупантамі! — заклікаў камандзір.— Ніякай літасці ворагу! Мы пераможам!

У той жа першамайскі дзень стыхійна ўзнік мітынг таксама ў вёсцы Верхнія Жары. Яго правялі пасля чарговага начнога налёту на фашысцкіх карнікаў байцы з нашага ж атрада.

Пасля непрацяглага адпачынку лясныя салдаты накіраваліся на выкананне чарговай баявой аперацыі.

ПАРТЫЗАНСКІЯ ФАРМІРАВАННІ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЛІ НА ТЭРЫТОРЫІ БРАГІНСКАГА І КАМАРЫНСКАГА РАЁНАЎ У ПЕРЫЯД 1941—1943 гг.

Асобны партызанскі атрад імя Р. І. Катоўскага

Створаны ў жніўні 1942 г. у Брагінскім раёне ў выніку аб'яднання партызанскіх груп С. І. Філіпенкі — Ф. І. Філіпенкі і П. Р. Зіновіча, створаных адпаведна ў снежні 1941 г. і красавіку 1942 г. на базе Савіцкай і Брагінскай падпольных груп.

Атрад дзейнічаў у Брагінскім, Камарынскім і Хойніцкім раёнах.

Камандзіры атрада: *Філіпенка Сцяпан Іларыёнавіч* (жнівень 1942 — сакавік 1943), *Міхне*

віч Аляксандр Яфімавіч (сакавік 1943 — лістапад 1943).

Камісары атрада: *Філіпенка Фёдар Іларыёнавіч* (жнівень 1942 — сакавік 1943), *Зіновіч Пётр Рыгоравіч* (сакавік 1943 — лістапад 1943).

Начальнікі штаба: *Міхневіч Аляксандр Яфімавіч* (жнівень 1942 — сакавік 1943), *Крывашэсаў Цімафей Андрэевіч* (сакавік 1943 — ліпень 1943), *Мельнікаў Ісідар Нікіфаравіч* (ліпень 1943 — лістапад 1943).

Асобны партызанскі атрад імя К. Я. Варашылава

Створаны ў маі 1943 г. на базе групы С. І. Філіпенкі, якая вылучылася з асобнага атрада імя Р. І. Катоўскага Палескай вобл., і прыбыўшай у тыл праціўніка па заданні ЦК КП(б) Беларусі і Беларускага штаба партызанскага руху групы І. А. Шэйна.

Атрад дзейнічаў у Камарынскім раёне. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 22 верасня 1943 г. у складзе 81 партызана.

Камандзір атрада *Філіпенка Сцяпан Іларыёнавіч* (май 1943 — верасень 1943).

Камісар атрада *Шэйн ІванАнуфрыевіч* (май 1943 — верасень 1943).

Начальнік штаба *Петрусевіч Аляксандр Архіпавіч* (май 1943 — верасень 1943).

Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1983. С. 655–657.

Ваявалі ў іншых партызанскіх фарміраваннях

Нямала нашых землякоў змагалася з ворагам у радах народных мсціўцаў, якія дзейнічалі ў іншых раёнах Беларусі. Так, камандзірам 136-га атрада 130-й партызанскай брыгады ў 1943 г. з'яўляўся А. І. Трухановіч, камісарам партызанскага атрада брыгады імя Калініна Вілейскай вобласці — М. А. Клімянок, камісарам партызанскай брыгады 4-я Беларуская (студзень — ліпень 1944 г.) — Ф. М. Расюк, камісарам партызанскага атрада імя Губіна, што дзейнічаў на тэрыторыі Акцябрскага, Капаткевіцкага, Парыцкага і Асіповіцкага раёнаў, — І. Н. Кулей, камандзірам роты партызанскага атрада імя М. Ф. Гастэлы на Брэстчыне — П. Я. Дубін. У складзе партызанскага атрада імя Варанянскага ваяваў старшына роты У. Ф. Еўчанка, які, дарэчы, прымаў удзел у партызанскім парадзе ў вызваленым ад ворага Мінску. Радавымі партызанскіх атрадаў імя Жукава брыгады № 19 імя Молатава (Баранавіцкая вобл.) ваявалі П. Т. Данчанка, 113-га партызанскага атрада Жыткавіцкай партызанскай брыгады — Д. І. Мартыненка, партызанскіх атрадаў імя Будзённага і імя Чапаева з Чарнігаўскага злучэння пад камандаваннем М. М. Таранушчанкі — М. П. Кушнірэнка, С. П. Кічкар, партызанскай брыгады імя ЦК КП(б)Б — камсамолец М. Н. Цясёлкін. За мужнасць і прафесійнае ўмельства паважалі ў партызанскім атрадзе № 2 брыгады «Жалязняк» фельчара П. Ф. Котава і інш.

Чытайце ўспаміны некаторых з іх аб удзеле ў партызанскай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Гарнізон быў знішчаны

Атрад імя А. Ф. Каваленкі арганізаваны ў снежні 1941 года на базе ініцыятыўнай групы А. Ф. Каваленкі — Л. М. Мельніка. У маі 1942 года ўвайшоў у склад брыгады Ф. І. Паўлоўскага. Да кастрычніка 1943 года называўся па прозвішчы свайго камандзіра, затым яму было прысвоена імя Афанасія Фаміча Каваленкі, які загінуў 21 чэрвеня 1942 года.

Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1983. С. 630.

Афанасій Фаміч Каваленка нарадзіўся і вырас у Камарыне. Перад вайной быў абраны старшынёй Камарынскага райвыканкама. Калі пачалася вайна, па рашэнні партыйных органаў ён быў пакінуты для арганізацыі партызанскага руху.

Не адразу ўдалося наладзіць сувязі з патрэбнымі людзьмі, а таксама знайсці месца для дыслакацыі партызанскага атрада. Практычна да яго стварэння А. Ф. Каваленка прыступіў у лістападзе 1941-га. Ужо ў наступным месяцы разам з Л. М. Мельнікам закончыў фарміраванне атрада, стаў яго камандзірам.

З першых жа дзён партызаны ўключыліся ў актыўную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ні днём,

ні ноччу не ведалі ворагі спакою, зямля гарэла ў іх пад нагамі. Былы сакратар партарганізацыі калгаса імя Кірава Акцябрскага раёна М. Каваленка ўспамінаў:

«Гэта было ў 1942 годзе. Мне тады было дванаццаць гадоў. Назаўсёды запомніў сход жыхароў вёскі Ломавічы, перад якімі выступаў з прамовай камандзір партызанскага атрада Афанасій Фаміч Каваленка. Я і цяпер памятаю яго цвёрдыя словы: «Ніколі фашысцкія захопнікі не будуць гаспадарамі на нашай свяшчэннай зямлі. Савецкі народ пераможа!»

Мясцовыя жыхары паведамілі камандзіру атрада, што фашысты вырашылі размясціць свой гарнізон у вёсцы Ломавічы, каб трымаць пад кантролем усю акругу. Камандаванне атрада прыняло рашэнне не дапусціць гэтага. Былі наладжаны сувязі з насельніцтвам, расстаўлены людзі. Аднак фашысты даведаліся аб намерах партызан. У азарыцкай і парыцкай камендатурах гітлераўцы сабралі паліцэйскіх, каб падпільнаваць і схапіць А. Ф. Каваленку. З гэтай каварнай задумы нічога не выйшла — народных мсціўцаў людзі заўсёды папярэджвалі аб засадах, з'яўленні падазроных тыпаў, якія выглядвалі, выпытвалі, вынюхвалі.

...Набліжалася гадавіна вераломнага нападу гітлераўскай Германіі на нашу краіну. Партызаны атрада Каваленкі вырашылі адзначыць яе разгромам варожага гарнізона ў вёсцы Ломавічы. Яшчэ два атрады прынялі ўдзел у гэтай аперацыі.

Вораг адчайна супраціўляўся. Але гэта не дапамагло — ломавіцкі гарнізон фашыстаў і іх памагатых-паліцэйскіх быў поўнасцю знішчаны народнымі мсціўцамі. Гэта была вялікая перамога партызан. Толькі радасць яе азмрочыла гібель Афанасія Фаміча Каваленкі. Ён загінуў смерцю героя падчас штурму нямецкіх умацаванняў на подступах да Ломавічаў, каля вёскі Хвойня.

Баявыя справы камандзіра партызанскага атрада А. Ф. Каваленкі высока ацаніла Радзіма. Ён быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Гэта была не адзіная ўзнагарода адважнага важака народных мсціўцаў: яшчэ раней Афанасій Фаміч быў удастоены ордэна Чырвонага Сцяга.

М. А. Салаўёў

Маяк Палесся, 1989. 1 ліп.

З групы вырас атрад

З успамінаў П. Я. Дубіны, былога начальніка штаба партызанскага атрада імя М. Ф. Гастэлы брыгады імя Панамарэнкі, жыхара в. Тэльман

Вялікая Айчынная вайна застала мяне ў ваенным вучылішчы ў Ленінградзе. Пасля выпуску мяне накіравалі ў Арзамас камандзірам узвода курсантаў у кулямётна-мінамётнае вучылішча. Пры падыходзе немцаў да Масквы быў накіраваны з курсантамі камандзірам роты пад Серпухаў, у 942-гі стралковы полк. 12 лістапада 1942 года адкліканы ЦК КП(б)Б у Маскву, дзе прайшоў спецпадрыхтоўку да дыверсійных дзеянняў у тыле ворага. 20 лістапада 1942 года ад станцыі Сходня (пад Масквой) мы, шаснаццаць чалавек, выйшлі да лініі фронту. Пераходзілі яе ў раёне шашы Невель — Віцебск у суправаджэнні франтавой разведкі. З намі таксама ішла група В. Р. Сіліча. Задача ў нас была агульная — правядзенне дыверсійнай работы ў Бярозаўскім і Кобрынскім раёнах. Камандзірам нашай групы «Дуб» быў прызначаны Н. Ф. Новік, камуніст, які да вайны працаваў старшынёй сельсавета ў Хойніцкім раёне. Камісарам быў Т. І. Саўчанка з Веткі. Мяне прызначылі намеснікам камандзіра групы і камандзірам разведкі. Вось дарагія майму сэрцу імёны маіх таварышаў: Ганна Ашыркава, Н. С. Бясіўка, Н. С. Вайцяшэня, Л. Н. Гантварг, Л. М. Каган, І. М. Кендысь, Якаў Ляўковіч, М. Сувалаў, І. К. Сурначоў, Н. А. Чэкан, Марыя Шаўчэнка.

Наш шлях ляжаў праз Віцебскую, Мінскую, Вілейскую, Маладзечанскую,

Баранавіцкую, Брэсцкую вобласці. Ішлі пехатой, ехалі на конях. У Гуцінскія лясы прыбылі 16 студзеня 1943 года, прабіваючыся месцамі з баямі, абыходзячы засады. У спаленай вёсцы Акулінава Баранавіцкай вобласці каля царквы ўбачылі трупы мірных жыхароў, расстраляных разам з малымі дзецьмі. З груды цел былі вызвалены цудам ацалелыя жыхар вёскі па прозвішчы Рубец і яго дачка.

У Булінскіх лясах, дзе базіраваўся партызанскі атрад «Савецкая Беларусь», крыху адпачылі і раніцой зноў рушылі ў дарогу. І вось перад намі спаленая вёска Чыжыкі, стаяць толькі каміны і печы. 10 гадзін раніцы, мароз. Раптам кулямётныя чэргі прашываюць пярэднюю падводу з правадніками. Засада. Бой працягваўся больш за гадзіну. У няроўнай схватцы мы страцілі 9 чалавек забітымі, а праціўнік 42 чалавекі. У гэтым баі загінулі Сіліч і 6 яго байцоў. Тыя ж, хто застаўся ў жывых, далучыліся да нашай групы. Пахавалі мы таварышаў на ўзлеску.

Зіма для нас была вельмі цяжкай — жылі ў чумах, без зямлянак. Неўзабаве наладзілі сувязь з камсамольцамі вёскі Пляхаўшчына. Пачалі праводзіць самастойную баявую работу, разведку, дыверсіі. Разам з Іванам Кендысем узарвалі перцы варожы эшалон каля станцыі Таўлі. Нашай дыверсійнай групе ўдалося ўзарваць 6 эшалонаў на чыгунцы Блудзень — Івацэвічы, Слонім — Ваўкавыск, Кобрын — Драгічын. Наладжвалі сувязі з польскім насельніцтвам у вёсках Гайнаўка, Шарашова і Бяла-Падляска. У выніку былі падрыхтаваны масавыя ўцёкі ваеннапалонных з лагера ў Бяла-Падлясцы, частка з якіх улілася ў наш атрад. Размяшчаліся мы на Цёмным Грудзе, у Гуцінскіх лясах. Тут на безыменнай вышыньцы быў наш шпіталь. На прылеглай тэрыторыі былі зроблены падземныя ўкрыцці, дзе хаваліся партызанскія сем'і, мірнае насельніцтва.

У чэрвені 1943-га наша група накіравалася на чыгунку паміж станцыямі Бяроза-Картузская і Бронная Гара. Было выведзена са строю 2500 метраў чыгуначнага пуці, разабрана 420 рэек. Неўзабаве на нашы Ружаны — Пружаны ўдалося замініраваць нямецкі кабель сувязі з фронтам. 8 аўтамашын з немцамі выехалі на яго рамонт. Мы іх сустрэлі агнём з кулямётаў і аўтаматаў. Але вораг хутка ачомаўся і арганізаваў упартае супраціўленне. Да немцаў прыбыло падмацаванне, і нам давялося адступіць...

Падчас разведкі ў ноч на 16 чэрвеня 1943 года ў вёсцы Сошыца ў няроўным баі загінуў Мікалай Фаміч Новік і камсамолец Іван Міхайлавіч Кендысь. Пахавалі мы сваіх таварышаў у садзе вёскі Сошыца.

19 чэрвеня 1943 года група ўвайшла ў склад брыгады імя Панамарэнкі, дзе колькасна выросла да 67 чалавек і была аформлена як партызанскі атрад імя Гастэлы. Да ліпеня 1944 года атрад пусціў пад адхон 42 эшалоны.

Памяць. Бярозаўскі раён. Мн., 1987. С. 177—178.

Пераклаў з рускай *І. Ф. Ганжураў*

Яе звалі Ніна

Вёска Вялікі Лес на Брагіншчыне. Тут нарадзілася і правяла дзяцінства Ніна. Перад вайной скончыла медвучылішча ў Гомелі. Потым пачалася вайна...

Медсанбат, з якім пайшла Ніна насустрач вайне, трапіў у акружэнне. Прыйшлося спачатку выходзіць на Украіну, а потым доўга дабірацца дадому.

— Тут, дачка, таксама нельга заставацца,— сказаў ёй бацька.— Жывём на вачах у старасты, а чалавек ён паганы. Лепш пайсці куды-небудзь.

І Ніна пайшла ў Гарошкаў, што недалёка ад Хойнікаў. Там была замужам яе сястра Юля. У Гарошкаў час ад часу заходзіў хто-небудзь з партызанскай групы Карася і Бельскага. Ніна ведала, што з партызанамі падтрымлівае сувязь Андрэй Данец, муж сястры Юлі, і ўсё ўпрошвала ўзяць яе ў партызаны. Але

гэта група неўзабаве пайшла ў іншыя лясы.

А пасля на сям'ю Кечкаў звалілася бяда. За сувязь з партызанамі арыштавалі бацьку Макара Архіпавіча і кінулі ў брагінскую турму. За адну ноч учарнела Ніна, калі даведалася, што ў Брагіне бацьку два дні люта катавалі, пакуль не забілі. Не ведала, як адпомсціць ворагам. Калі даведалася, што партызаны зноў вярнуліся ў Хойніцкі раён, узрадавалася. У партызанскі атрад разам з Андрэем Данцом прыйшла і Ніна.

І хоць усе сем месяцаў яна афіцыйна лічылася медыцынскай сястрой, у патрэбную хвіліну замяняла і разведчыцу, і сувязную, і байца. І ў той раз Ніна з групай партызан пайшла на заданне.

...Бой завязаўся нечакана. Спачатку здавалася, нікога не было ў вёсцы. І раптам на іх наткнуўся Ярмольчык, начальнік хойніцкай паліцыі, са сваёй зграяй. Страляніна ішла ў цемры, і колькі яна працягвалася, Ніна не памятала. Калі апрытомнела, ужо развіднела. Яна не паспела падпаўзці да капы сена, яе заўважылі.

Усё гэта адбылося ў ноч з 19 на 20 верасня 1943 года ў вёсцы Мокіш Хойніцкага раёна...

...І вось чацвёртае світанне сустракае ў бальніцы Ніна Кечка. Яна ўжо страціла лік дням. Усё як у тумане. Не здрадзіла б свядомасць. Толькі б не забыць: «Сяргеева... Таіса... Пятроўна...» Першае прозвішча, якое прыйшло ёй у галаву, калі пачаўся допыт. А потым — атрад Дзяржынскага... Тысяча ці дзесяць байцоў у ім? Ужо забыла, якую лічбу называла... Думка выдаць сябе за дэсантніцу прыйшла не адразу. Яна разумела, што, калі даведаюцца, хто яна і адкуль, — мала што жылы выпягнуць, але і іншыя пацярпець могуць.

— Не, толькі б не здрадзіла памяць...

— Ну, як здароўечка? — яшчэ з дзвярэй выскаліўся Ярмольчык, а падышоўшы бліжэй, ірвануў за коўдру. — Ану, падымайся, сцерва! Я цябе хутка вылечу!..

...Ярмольчык узяўся сам дапытваць партызанку. Ад яго Ніну, непрытомную, кінулі ў турэмны бункер. Потым у гэты ж бункер штурхнулі другога «партызана». Так ён назваў сябе і пачаў расказваць пра свае «подзвігі» і «таварышаў», распытваць у Ніны. Але дарэмна спадзяваўся на яе адкрытасць.

Як потым высветлілася, гэтым «партызанам» быў адзін з падручных Ярмольчыка — Сямён Бягун. (Пасля вайны ён быў асуджаны за здраду Радзіме і службу ў фашысцкіх карных органах.)

Правакацыя не дапамагла, і за справу зноў узяўся кат Ярмольчык.

— Ну, сёння ты ў мяне загаворыш...— махаў ён перад вачыма Ніны бізуном.

Яна маўчала. Маўчала і тады, калі гэты бізун са свістам сцябаў яе па ране.

— Як сабака, здохнеш!

— Я памру, вядома, але памру як чалавек,— з цяжкасцю загаварыла Ніна Кечка, абапіраючыся на рукі.— А вось ты сапраўды здохнеш, як сабака. Ды і сабаку шкада з такім нягоднікам параўноўваць. Няўжо ты думаеш, што стану літасці ў цябе прасіць?

Ніна гаварыла яшчэ штосьці, але яе не слухалі. З грукатам адчыніліся дзверы. Яе выштурхнулі на вуліцу. Выстралы не далі дагаварыць. Так на дваццатым годзе жыцця загінула адважная партызанка. Згодна рапарту вахмістра ахоўнай паліцыі жандарскай акругі ў Рэчыцы, гэта адбылося 24 верасня 1943 года.

Вось і ўсё. Больш нічога пакуль невядома пра гэты подзвіг... Жыла ў вёсцы, вучылася, працавала, марыла, няхай не аб подзвігах, проста аб прыгожым жыцці... І гэту мару пранесла праз усе выпрабаванні, памерла за яе. Ці подзвіг гэта? Так! І гераіня — Ніна Кечка.

А. І. Захарэнка

Памяць. Хойніцкі раён. Мн., 1993. С. 106—107.

Вызваленне

Штурмавалі «дняпроўскі вал»

І. І. Люднікаў

12 ліпеня 1943 года, пасля перамогі ў Сталінградскай бітве і краху нямецкай наступальнай аперацыі «Цытадэль» у раёне Курскай дугі, Чырвоная Армія перайшла ў рашучае контрнаступленне, якое затым перарасло ў агульнае стратэгічнае наступленне, што разгарнулася на ўсіх франтах ад Вялікіх Лук да Чорнага мора. Савецкае камандаванне ставіла сваёй мэтай разграміць асноўныя сілы ворага на паўднёвым крыле фронту, вызваліць Левабярэжную Украіну і захапіць стратэгічныя плацдармы на заходнім беразе Дняпра. Гітлераўскі ж генералітэт, у сваіх спробах спыніць рух Чырвонай Арміі на захад, асабліва вялікае значэнне надаваў добра ўмацаванаму, глыбока эшаланіраванаму воднаму рубяжу Дняпра — галоўнай часткі «непрыступнага Усходняга вала», як яго называла нямецкае камандаванне. Гітлерам быў аддадзены катэгарычны загад — утрымацца на рубяжы Дняпра, не дапусціць Чырвоную Армію на правабярэжжа, на Украіну і Беларусь, у абарончых баях абяскровіць яе і затым перайсці ў наступленне.

Аднак фашысцкія планы былі асуджаны на правал. Чырвоная Армія нястрымна рухалася да Дняпра. З мэтай большай канцэнтрацыі сіл на Чарнігаўска-Прыпяцкім напрамку дырэктывай Стаўкі галоўнага камандавання ад 6 верасня 1943 года ў склад войск Цэнтральнага фронту (камандуючы генерал арміі К. К. Ракасоўскі, член Ваеннага савета генерал-лейтэнант К. Ф. Цялегін, нач. штаба генерал-лейтэнант М. С. Малінін) у стык паміж 65-й і 13-й арміямі была ўведзена 61-я армія (камандуючы генерал П. А. Бялоў) і 7-мы гвардзейскі кавалерыйскі корпус генерал-маёра М. Д. Малеева. З ходу фарсіраваўшы Дясну, савецкія войскі 21 верасня вызвалілі Чарнігаў.

Дняпроўская бітва па сваім размаху і напружанні стала небывалай. Дастаткова сказаць, што толькі на вузкім участку ад няданчыцкага моста да Верхніх Жароў (15—30 км) дзейнічалі 3 стралковыя дывізіі, некалькі іншых агульнавайсковых часцей — усяго 11 палкоў.

Развіваючы наступленне, да зыходу 21 верасня перадавыя часці 13-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант М. П. Пухаў) выйшлі да Дняпра на поўнач ад вусця Прыпяці. На поўдзень ад чыгуначнай станцыі Ёлча да ракі выйшлі 15-ты стралковы корпус (8-я, 74-я і 148-я стралковыя дывізіі, 19-ты гвардзейскі артылерыйскі полк і інш.), якім камандаваў удзельнік Сталінградскай і Курскай бітваў генерал-лейтэнант І. І. Люднікаў, і 28-мы стралковы корпус (181-я, 211-я стралковыя дывізіі) генерал-маёра А. І. Рыжкова. Перадавыя атрады стралковых дывізій — 74-й (камандзір генерал-маёр А. А. Казаран), 8-й (камандзір палкоўнік П. М. Гудзь) на плытах, рыбацкіх чаўнах, на іншых падручных пераправачных сродках фарсіравалі Днепр на ўчастку Мнёў — Бярозкі — Навозы — Лукаеды (Кірава) — Верхнія Жары, захапілі плацдармы на правабярэжжы. Нягледзячы на адчайнае супраціўленне ворага, савецкія воіны імклівa атакавалі, з боем ава-

лодалі Камарыном, вёскаі Новая Ёлча і некаторымі іншымі населенымі пунктамі[1]. Такім чынам былі створаны неабходныя ўмовы для пераправы астатніх падраздзяленняў 15-га, а таксама 29-га стралковых карпусоў. Наступальныя дзеянні па вызваленні Камарына і яго ваколіц ажыццявілі 360-ты стралковы полк (камандзір палкоўнік М. І. Сташак) і 74-я стралковая дывізія, а таксама 129-я асобная танкавая брыгада (камандзір палкоўнік Н. В. Пятрушын).

Імкнучыся выправіць становішча, немцы ў другой палове 23 верасня кінулі супраць войск 15-га стралковага корпуса авіяцыю, якая групамі па 9—12 самалётаў да самай цемры бамбіла пераправы і часці на плацдармах. Супраць авіяцыі праціўніка рашуча дзейнічалі воіны 1287-га Чарнігаўскага зенітна-артылерыйскага палка, эскадрыллі 286-й знішчальнай авіядывізіі 16-й паветранай арміі. У паветры над міжрэччам Дняпра і Прыпяці кіпелі гарачыя баі. У іх прымаў актыўны ўдзел пры вызваленні нашых мясцін намеснік камандзіра знішчальнай авіяэскадрыллі старшы лейтэнант І. В. Маслаў. У далейшым (у 1944 г.) яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Адначасова са спробамі, з дапамогай масіраваных авіяўдараў, стрымаць наступальны парыў чырвонаармейскіх часцей гітлераўцамі прадпрымаліся моцныя, але безвыніковыя контратакі танкаў і пяхоты.

23 верасня 1943 года 135-ты асобны знішчальны супрацьтанкавы дывізіён фарсіраваў Днепр. Гераічна змагаліся на плацдарме нашы воіны. Так, наводчык «саракапяткі» Ігар Прохараў разам з разлікам дапамагаў пехацінцам вызваляць вёскі Бярозкі, Новую Ёлчу, Капоранку, чыгуначную станцыю Ёлча. А на пачатку кастрычніка ён вызначыўся ў баі за вёскі Калыбань і Вельямоў, дзе падбіў фашысцкага «тыгра» і тым самым садзейнічаў адбіццю варожай контратакі. За гэты бой адважны камсамолец узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Дарэчы, гэта быў не апошні подзвіг артылерыста — верны сын Айчыны стаў поўным кавалерам ордэна Славы, атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу» і іншыя адзнакі воінскай доблесці.

З першымі часцямі пяхоты на падручных сродках на правабярэжжа была перапраўлена частка палкавой артылерыі і мінамётаў. Дывізіённая артылерыя, а таксама артылерыя Рэзерву Галоўнага камандавання ў гэты час прыкрывалі пераправу і абаронцаў плацдармаў агнём з левабярэжжа. Да вечара 23 верасня наступаўшыя расшырылі плацдарм за Дняпром да 40 кіламетраў па фронту і да 20 кіламетраў углыбіню. У той жа дзень і 24—25 верасня на прыдняпроўскім участку Лукаеды — Верхнія Жары ў напрамку вёскі Гдзень актыўныя баявыя дзеянні вялі воіны 1085-га і 1087-га стралковых палкоў 322-й стралковай дывізіі 17-га гвардзейскага стралковага корпуса. 24 і 26 верасня былі вызвалены вёскі Верхнія Жары і Бярозкі, а на працягу трох сутак — амаль уся паўднёвая частка Камарыншчыны.

У баях пры фарсіраванні Дняпра ў раёне Камарына і на плацдармах вызначыліся воіны 78-га (камандзір падпалкоўнік І. М. Леўсенка), 109-га (камандзір маёр Д. П. Сухарнікаў), 360-га (камандзір М. І. Сташак) стралковых палкоў, 6-га артылерыйскага палка (камандзір маёр Ф. Г. Чычкан), 110-га асобнага сапёрнага батальёна (камандзір маёр В. С. Лявонцьеў) 74-й стралковай дывізіі; 151-га (камандзір падпалкоўнік П. А. Міронаў), 229-га (камандзір падпалкоўнік Д. К. Шышкоў), 310-га (камандзір П. І. Жданаў)

[1] У гонар гэтай падзеі ў верасні 1976 г. у Камарыне быў узведзены мемарыяльны помнік «Сцяг», на якім пазначана: «Доблестным воинам 15-го стрелкового корпуса 13-й армии Центрального фронта, форсировавшим реку Днепр и 23 сентября 1943 года освободившим от немецко-фашистских оккупантов г. п. Комарин, деревни Н. Иолча, Березки — первые населенные пункты Белоруссии».

стралковых, 62-га артылерыйскага (камандзір падпалкоўнік І. Ф. Мінееў) палкоў, 21-га асобнага сапёрнага батальёна (камандзір маёр Ф. Н. Іваненка) 8-й стралковай дывізіі; часці 148-й стралковай дывізіі генерал-маёра А. А. Мішчанкі; 129-я асобная танкавая брыгада і іншыя.

Храбра дзейнічалі разам са сваімі падначаленымі пры фарсіраванні Дняпра каля в. Бярозкі і затым у баі за в. Пасудава камандзір роты 78-га стралковага палка 74-й стралковай дывізіі мал. лейтэнант І. Х. Дубін, камандзір кулямётнага разліку мал. сяржант Е. Сіхімаў. Камандзірскае майстэрства праявілі ў баях на дняпроўскім плацдарме каля в. Верхнія Жары камандзір батарэі 229-га стралковага палка 8-й стралковай дывізіі капітан Д. А. Бакураў, камандзір стралковага батальёна П. К. Баюк, камандзір роты супрацьтанкавых ружжаў ст. лейтэнант А. М. Кузняцоў, камандзір аддзялення сяржант І. М. Грачоў. Подзвіг Аляксандра Матросава паўтарыў камандзір аддзялення аўтаматчыкаў сяржант С. І. Акіф'еў. Узоры воінскай доблесці прадэманстравалі ў баі каля в. Калыбань наводчык гарматы радавы М. Д. Ольчаў, стралок 78-га стралковага палка М. С. Байкоў і іншыя воіны.

16 кастрычніка 1943 года выйшаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза 203 воінам 13-й арміі за паспяховае фарсіраванне ёю Дняпра і замацаванне плацдармаў на правабярэжжы. У ліку адзначаных вышэйшым званнем воінскай доблесці былі і 94 салдаты, сяржанты і афіцэры 15-га стралковага корпуса, які вызваляў Камарыншчыну: камандуючы 13-й арміяй генерал-лейтэнант М. П. Пухаў, камандзір 15-га стралковага корпуса генерал-лейтэнант І. І. Люднікаў, камандзіры 74-й і 8-й стралковых дывізій генерал-маёр А. А. Казаран, палкоўнік П. М. Гудзь, камандзіры 78-га, 229-га і 360-га стралковых палкоў І. М. Леўсенка, Д. К. Шышкоў, М. І. Сташак, вышэйназваныя С. І. Акіф'еў, М. С. Байкоў, Д. А. Бакураў, П. К. Баюк, І. М. Грачоў, І. Х. Дубін, А. М. Кузняцоў, М. Д. Ольчаў, Е. Сіхімаў і іншыя воіны.

Скарыстаўшы тую акалічнасць, што войскі 61-й арміі і прыдадзены ёй у аператыўнае падпарадкаванне 7-мы гвардзейскі кавалерыйскі корпус толькі 26 верасня выйшлі да Дняпра і пачалі зацяжныя баі на пераправах, немцы перайшлі ў наступленне супраць правага фланга 15-га і левага фланга 28-га (181-я, 211-я, 415-я стралковыя дывізіі) стралковых карпусоў. У раёне чыгуначнай станцыі Пасудава разгарэліся цяжкія баі з атакаваўшымі часцямі 2-й, 4-й і 12-й танкавых дывізій праціўніка. З выключнай храбрасцю процістаялі варожаму танкаваму напору воіны 874-га процітанкавага артылерыйскага палка і 4-й знішчальнай процітанкавай артылерыйскай брыгады. Дзякуючы гераічным дзеянням савецкіх войск варожае наступленне захлынулася. Пачаліся цяжкія пазіцыйныя баі са спыненымі на лініі чыгункі гітлераўцамі. Яны працягваліся тут да пачатку трэцяй дэкады лістапада. Вораг адчайна супраціўляўся, спрабуючы пераламіць ход баявых дзеянняў на сваю карысць. Савецкім воінам на гэтым участку ў міжрэччы Дняпра і Прыпяці супрацьстаялі 17 пяхотных палкоў, 12 асобных батальёнаў, тры танкавыя і адно матарызаванае фарміраванні. Такое ўпартае супраціўленне немцаў тлумачыцца тым, што загадзя падрыхтаваная другая дняпроўская лінія абароны праціўніка была добра ўмацавана з улікам лясіста-балоцістай мясцовасці.

Замаруджванне тэмпаў наступлення 61-й арміі на Дняпры тлумачылася шэрагам аб'ектыўных прычын. Па-першае, у выніку імклівага наступлення нашых войск іх тылы адсталі, чыгуначныя магістралі былі разбураны адступаўшым ворагам. З-за недахопу гаруча-змазачных матэрыялаў адсталі танкавыя злучэнні, артылерыя, табельныя перапраўвачныя сродкі, марудна дастаўляліся боепрыпасы. Але ўсім гэтым і іншым

цяжкасцям воіны арміі супрацьпаставілі баявы парыў, храбрасць і адвагу, веды і вопыт, ратнае майстэрства камандзіра саставу. Масавыя прыклады мужнасці і гераізму ў баях пры фарсіраванні Дняпра і на дняпроўскіх плацдармах прадэманстравалі многія воіны 9-га гвардзейскага (камандзір генерал-маёр М. А. Папоў), 29-га (камандзір генерал-лейтэнант Я. С. Факанаў) і 89-га стралковых, 7-га гвардзейскага кавалерыйскага (камандзір генерал-маёр М. Д. Малееў) карпусоў.

На поўнач ад асарэвіцка-жыліцкага ўчастка (ад Мысоў і Любеча) да Дняпра выйшлі 76-я і 12-я гвардзейскія, 81-я стралковыя дывізіі, затым — 68-я асобная танкавая брыгада, але з ходу пераправіцца не змаглі. У часцях пачалася ўпартая падрыхтоўка да пераадолення ракі. Першым да 18 гадзін 26 верасня 1943 года на левы бераг выйшаў 237-мы гвардзейскі стралковы полк (камандзір І. П. Мохаў). У раёне в. Жылічы ў ноч на 28 верасня перадавую групу чырвонаармейцаў павёў на штурм Дняпра гв. сяржант М. Ф. Махаў. Абарону тут трымалі часці 251-й нямецкай пяхотнай дывізіі. Пасля захопу плацдарма на правабярэжжы воін-камсамолец разам са сваімі таварышамі на працягу чатырох гадзін перапраўляў праз раку байцоў са зброяй і боепрыпасамі. Нават будучы параненым, ён не пакінуў поле бою. Гвардзеец загінуў 18 кастрычніка падчас атакі і быў пахаваны каля рэчкі Пясчанка, паблізу в. Жылічы. (25 чэрвеня 1958 года астанкі героя перазахаваны ў Брагіне, у брацкай магіле воінаў, якія загінулі за вызваленне райцэнтра і раёна восенню 1943 года.)

У імклівым парыве на світанні 29 верасня 1943 года выйшаў да Дняпра 234-ты гвардзейскі стралковы полк 76-й гвардзейскай Чарнігаўскай стралковай дывізіі. У ліку першых пераправіліся на правы бераг дзевяць воінаў кулямётнага аддзялення 2-й стралковай роты на чале з камуністам Аканам Курманавым. На правабярэжжы жменька смельчакоў уступіла ў бой з дзвюма ротамі гітлераўцаў. У самы разгар гэтай схваткі А. Курманаў захапіў нямецкую супрацьтанкавую гармату і прамой наводкай адкрыў агонь па наступаўшых фашыстах. Варожыя контратакі былі адбіты, плацдарм для пераправы батальёна забяспечаны. Смерцю героя загінулі гв. сяржанты А. Курманаў, І. П. Баладурын, гв. радавы Г. Г. Маслякоў і іншыя.

А па суседстве разгортвала актыўныя дзеянні 12-я гвардзейская стралковая дывізія. Перадавы атрад яе 32-га гвардзейскага палка (камандзір Н. Т. Волкаў) на чале з гв. капітанам А. М. Дзянісавым 28 верасня, захоўваючы поўную маскіроўку і цішыню, на 17 лодках пераадолеў левы рукаў ракі і з боем высадзіўся на рачным востраве ў раёне вёсак Глушэц — Жылічы. Гвардзейцы цэлыя суткі адбівалі варожыя контратакі. У наступную ноч пад моцным агнём праціўніка батальён гв. маёра А. П. Кузаўнікава пераадолеў другую частку ракі і штурмам авалодаў траншэямі гітлераўцаў на правабярэжжы. Адбіўшы некалькі контратак, гвардзейцы замацаваліся на захопленым рубяжы і тым самым садзейнічалі паспяховаму фарсіраванню Дняпра асноўнымі сіламі дывізіі.

Ужо 30 верасня ў межах тагачаснага Брагінскага раёна былі створаны тры надзейныя плацдармы нашых войск, на якіх накопліваліся сілы, неабходныя для далейшага наступлення, вяліся абарончыя баі.

У баях на пераправе, пры захопе і расшырэнні плацдарма на заходнім беразе Дняпра здзейснілі подзвігі гв. радавы сувязіст 7-й батарэі 154-га гвардзейскага артылерыйскага палка 76-й гвардзейскай Чарнігаўскай стралковай дывізіі Л. А. Працэнка, камандзір аддзялення гв. старшына гэтай жа дывізіі І. В. Кірык і іншыя воіны. За гераізм і мужнасць 47 з іх удастоены звання Героя Савецкага Саюза, больш як тысяча воінаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі. Героем Савецкага Саюза стаў і камандзір 76-й дывізіі А. В. Кірсанаў.

У радах доблесных воінаў 76-й гв. Чарнігаўскай стралковай дывізіі надчас дняпроўскага штурму ваявалі нашы землякі М. І. Пінчук з Камарыншчыны, узнагароджаны за ўдзел у гэтых баях ордэнам Чырвонай Зоркі, С. А. Ганчар з Конанаўшчыны і іншыя.

Жорсткія баі разгарнуліся на плацдарме ў напрамку Малажын — Асарэвічы. У гэтым месцы на правым беразе ракі гітлераўцы пабудавалі разгалінаваную сістэму траншэй, бліндажоў, дотаў, дзотаў, пасадзілі на астравах кулямётчыкаў, а з глыбіні сваёй абароны вялі моцны артылерыйскі агонь. Але нішто не магло стрымаць фарсіраваўшых тут Днепр воінаў 215-га, 218-га гвардзейскіх стралковых палкоў 77-й гвардзейскай Чарнігаўскай стралковай дывізіі (камандзір генерал-маёр В. С. Аскаленаў). У ноч на 27 верасня яе перадавыя падраздзяленні пры падтрымцы свайго 156-га гвардзейскага артылерыйскага палка і іншых часцей пачалі фарсіраванне Дняпра. Выключны гераізм тут праявілі салдаты і камандзіры 218-га гв. стралковага палка (камандзір гв. падпалкоўнік А. Г. Байцоў). Удала падтрымлівалі дзеянні пехацінцаў артылерысты батарэі пад камандаваннем гв. ст. лейтэнанта І. І. Алімава. Першымі ў палку пераправіліся на правы бераг ракі і вызначыліся ў баях на плацдарме каля в. Галкі гвардзейцы 5-й стралковай роты, якой камандаваў гв. лейтэнант М. М. Магерамаў.

Пасля прарыву тут варожай абароны часцямі і злучэннямі 9-га гв. і 89-га стралковых карпусоў для развіцця поспеху былі ўведзены ў дзеянне перададзеныя ў аператыўнае падпарадкаванне 61-й арміі часці і злучэнні 7-га гв. кавалерыйскага і 9-га танкавага карпусоў. 16-я гв. Чарнігаўская кавалерыйская дывізія (камандзір генерал-маёр Р. А. Бялоў) атрымала задачу фарсіраваць Днепр і выйсці на рубеж Вялле — Асарэвічы — Новы Сцепаноў — Людзвіноў — станцыя Ёлча. Бесперапынна гонячы праціўніка, першым да ракі падышоў 58-мы гв. кавалерыйскі полк (камандзір падпалкоўнік Т. Т. Кусімаў). Было прынята рашэнне — не чакаючы табельных пераправачных сродкаў, фарсіраваць водную перашкоду з ходу, на падручных сродках. Актыўную дапамогу савецкім воінам у навядзенні перапраў на Дняпры аказалі партызаны, у т. л. байцы атрада імя Варашылава (камандзір С. І. Філіпенка, камісар І. А. Шэйн), які дзейнічаў на тэрыторыі Камарыншчыны[1].

З дапамогай мясцовага насельніцтва сапёры менш чым за суткі зрабілі 53 плыты, адрамантавалі каля 20 лодак. Месцам іх сканцэнтравання вызначылі стары рукаў ракі, які злучаўся з возерам Крывая Рэчка.

Затым пры фарсіраванні ракі асабліва вызначыўся 4-ты эскадрон 58-га гв. кавалерыйскага палка на чале з гв. ст. лейтэнантам А. М. Рудым. 100 байцоў эскадрона з чатырма станковымі кулямётамі, шасцю процітанкавымі ружжамі на плытах пераадолелі Днепр, выбілі немцаў з траншэі. Праціўнік адкрыў шквальны агонь з бліжэйшай вышыні і артылерыйска-мінамётны абстрэл з в. Старая Ёлча. Сотні варожых аўтаматчыкаў пайшлі ў контратаку. У гэтым баі з найлепшага боку зарэкамендаваў сябе наводчык кулямётнага разліку Іскандэр Даутаў. Дзякуючы яго мужным дзеянням контратакі немцаў былі адбіты. Але і сам воін-герой загінуў у гэтым баі. Утрымаўшы захоплены плацдарм, коннагвардзейцы А. М. Рудога забяспечылі іншым эскадронам палка магчымасць пераправіцца на правабярэжжа. І тут эстафету мужнасці і адвагі свайго аднапалчаніна Даутава падхапіў гв. радавы Клычніяз Азалаў, які на працягу дзвюх гадзін вінтовачным агнём і гранатамі стрымліваў ворага і, уварваўшыся ў яго акопы, знішчыў 13 гітлераўцаў. Храбры воін

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 214. Л. 3–4; В пламени сражений: Боевой путь 13-й армии. М., 1973. С. 141–145; Рокоссовский К. К. Солдатский долг. Мн., 1984. С. 214.

памёр ад ран 12 снежня 1943 года і быў пахаваны ў Шацілках (цяпер Светлагорск) Гомельскай вобласці.

З групай аўтаматчыкаў агітатар 58-га гв. кавалерыйскага палка 16-й гв. Чарнігаўскай кавалерыйскай дывізіі З. Г. Латыпаў вызваліў в. Ніўкі. За ўмелыя і смелыя дзеянні пры фарсіраванні Дняпра і ў баях на правабярэжжы адважны афіцэр быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Такой жа ўзнагароды за подзвіг каля в. Калыбань пасмяротна ўдастоены зенітчык гв. радавы гэтай жа дывізіі М. Н. Малашыч.

Да раніцы 28 верасня 1943 года ўсе тры палкі 16-й гв. Чарнігаўскай кавалерыйскай дывізіі фарсіравалі Днепр і пачалі наступленне з мэтай расшырэння плацдарма. Пры вызваленні в. Вялле 60-ты гв. кавалерыйскі полк рухаўся ў напрамку в. Галкі, а 62-гі гв. кавалерыйскі полк — на хутар Усохі. Тут, на тэрыторыі Асарэвіцкага сельсавета, ім супрацьстаялі 86-я пяхотная, частка 12-й танкавай дывізіі, іншыя нямецкія вайсковыя часці. У імя перамогі ў гэтых баях па-геройску загінулі сяржанты 60-га і 62-га гв. кавалерыйскіх палкоў Е. І. Данільянц і Т. Т. Міндзігулаў.

Раніцай наступнага дня з рубяжа Галкі — Усохі перайшлі ў наступленне нямецкія мотапяхота і танкі, але атрымалі дружны і моцны адпор з боку коннагвардзейцаў. Тут вызначыліся эскадрон Мюлькі Абрамава, узвод процітанкавых ружжаў пад камандаваннем гв. лейтэнанта Д. Ф. Грачушкіна. Пры гэтым сам камандзір загінуў у адзінаборстве з варожым «фердынандам».

Наколькі жорсткімі і крывапралітнымі былі ў тыя дні баі на гэтым участку дняпроўскага плацдарма, сведчаць даныя аб беззваротных стратах фарміраванняў і часцей 9-га гв. стралковага і 7-га гв. кавалерыйскага карпусоў. Толькі ў брацкай магіле на паўднёва-заходняй ускраіне в. Галкі пахаваны 444 воіны, у тым ліку Героі Савецкага Саюза К. Д. Грыцынін, Т. Т. Міндзігулаў. У 1984 годзе каля брацкай магілы пабудаваны мемарыяльны помнік.

Упартыя баі з немцамі на дняпроўскім плацдарме ў раёне пасёлка Ніўкі, вёсак Прудавіца, Новыя Ляды, Людзвіноў вялі 1128-мы, 1130-ты, 1132-гі стралковыя палкі 336-й стралковай дывізіі. Ад украінскага населенага пункта Мысы ў напрамку вёсак Хракавічы — Чамярысы дзейнічала 356-я стралковая дывізія 89-га стралковага корпуса. Іх суседзямі па правым флангу з'яўляліся 55-я і 81-я стралковыя дывізіі 29-га стралковага корпуса, якім належала весці наступленне ў напрамку Брагіна. З 8 лістапада 1943 года суседняя 336-я стралковая дывізія была выведзена ў аператыўнае падпарадкаванне камандуючага 1-м Украінскім фронтам.

Вялікую дапамогу падчас баёў за Днепр і на плацдармах войскам 13-й і 61-й армій аказвала авіяцыя. Лётчыкі, у тым ліку з 165-га знішчальнага авіяцыйнага палка 16-й паветранай арміі, перашкаджалі ворагу бамбіць пераправы і баявыя парадкі нашых войск на правабярэжжы, ахоўвалі ў паветры штурмавікоў 2-й гвардзейскай Чарнігаўскай штурмавой авіядывізіі, якія наносілі бомбавыя ўдары па артылерыйскіх і мінамётных пазіцыях немцаў, па іх бранятэхніцы. У тыя дні ў паветраным баі быў падбіты адзін з самалётаў Ла-5 165-га знішчальнага авіяпалка, што суправаджалі на штурмоўку дзве групы самалётаў 874-га штурмавога авіяпалка. Цяжкапаранены пілот з гэтага экіпажа прызямліўся каля в. Цалуйкі і пазней загінуў у перастрэлцы з немцамі. А пашкоджаны савецкі знішчальнік упаў на балоце каля в. Жэрднае. Толькі ў 1977 годзе рэшткі яго выпадкова былі адкапаны меліяратарамі падчас пракладкі асушальнага канала. Там жа былі знойдзены астанкі пілота Г. Д. Чарствова. Удалося высветліць і прозвішча таго другога лётчыка, што загінуў каля Цалуек, — В. І. Ведзянеева. Урны з прахам абодвух былі захаваны на новым мемарыяльным комплексе «Памяць» у в. Выграбная Слабада. На месцы ж падзення самалёта ўстаноўлена памятная стэла.

20 кастрычніка 1943 года Цэнтральны фронт быў ператвораны ў Беларускі.

У ноч з 21 на 22 кастрычніка 1943 года ў раёне Любеча на пантонах Днепр фарсіравала 68-я асобная танкавая брыгада (камандзір Р. А. Цімчанка). Пераправа вялася пад бесперапынным агнём варожай артылерыі і авіяцыі. Дарэчы, для танкістаў гэта было другое пераадоленне сівога Славуціча. Упершыню яны перабраліся на правабярэжжа па няданчыцкім чыгуначным мосце непадалёку ад Камарына. Пасля стабілізацыі лініі фронту на рубяжы Калыбань — Пасудава 68-я асобная танкавая брыгада атрымала загад вярнуцца на левабярэжжа і фарсіраваць Днепр на стыку Лоеўскага і Брагінскага раёнаў.

Уступіўшы на беларускую зямлю каля вёскі Дзяражычы, танкісты завязалі баі за расшырэнне плацдарма. Асабліва жорсткія былі яны каля населеных пунктаў Ручаёўка, Грохаў, Нова-Кузнечная, Жылічы і інш. На працягу некалькіх сутак брыгада рыхтавалася да наступлення ў паўночна-заходнім напрамку. Неўзабаве пасля гэтага баявая машына камандзіра брыгады Р. А. Цімчанкі была падбіта на вуліцы в. Жылічы. Экіпаж ацалеў. Пры гэтым атрымалі раненні механік-вадзіцель В. Г. Бузулін, стралок-радыст К. Т. Тумілін і вежавы зараджаючы, прозвішча якога невядома.

Тры танкі Т-34 з роты капітана В. Н. Хлістунова падчас прарыву да Жылічаў правaліліся ў дрыгвяністую балацянку і забалочаную пратоку. Два з іх тады выцягнулі, а трэці (вежавы нумар 5163) быў вызвалены з дрыгвяністага палону толькі ў жніўні 1982 года. Пазней ён устаноўлены ў якасці мемарыяльнага помніка на цэнтральнай плошчы райцэнтра. Пры гэтым прысутнічаў былы камандзір танкавай роты 114-га танкавага палка І. Я. Канцавы з в. Вець Быхаўскага раёна.

У сярэдзіне лістапада 68-я асобная танкавая брыгада з прыдняпроўскага плацдарма прадоўжыла свой шлях на захад. 114-ты танкавы полк развіваў наступленне ў напрамку в. Рудня Жураўлёва. Ён прарваў варожую абарону на правым беразе ракі Брагінка і сумесна з часцямі 9-га гв. стралковага корпуса ўдзельнічаў у вызваленні Брагіна.

Пры вызваленні Брагіншчыны вызначыліся танкавыя батальёны капітана Мацвеева і маёра Жураўлёва, узвод Героя Савецкага Саюза гв. лейтэнанта У. Р. Калесніка, мотастралкі капітана Тарэева, экіпажы танкаў лейтэнантаў Агапава, Горлава, Сташэўскага і іншых. Смерцю герояў загінулі ў баях за Брагіншчыну камандзіры мотастралковых батальёнаў капітаны Алімаў, Тумайкін, камандзір танкавай роты капітан Багданаў, камандзіры ўзводаў лейтэнанты Горлаў, Рыскін, Шчэпкін, старшыны Агаркаў, Коцін і іншыя.

У баявых дзеяннях на Дняпры ў межах Брагінскага раёна восенню 1943 года прымала ўдзел таксама 5-я гвардзейская мінамётная дывізія. Яна вяла масіраваны агонь па правабярэжных варожых умацаваннях, апорных пунктах праціўніка ў вёсках Дзяражычы, Старая Лутава, Жылічы і інш., падтрымліваючы тым самым наступленне 12-й і 76-й гвардзейскіх стралковых дывізій і 81-й стралковай дывізіі, 68-й асобнай танкавай брыгады. Асабліва моцнымі былі агнявыя ўдары 508-га і 518-га дывізіёнаў 16-й гвардзейскай мінамётнай брыгады па апорных пунктах гітлераўцаў у Дзяражычах і Старой Лутаве 16 кастрычніка 1943 года.

У паласе наступлення 61-й арміі на ўчастку Ніўкі — Глушэц — Дзяражычы вораг прадпрымаў шматлікія контратакі, але поспеху не меў. Атрымаўшы падмацаванне, часці 61-й арміі 23 кастрычніка авалодалі правабярэжнымі населенымі пунктамі Старая і Новая Лутава, штурмам узялі ўмацаваны апорны пункт Сяўкі, затым вызвалілі вёскі Бывалькі і Малажын. Пасля гэтага зацяжныя пазіцыйныя баі ў прыдняпроўскай паласе працягваліся яшчэ больш як два тыдні, пакуль урэшце не была прарвана варожая абарона і 81-я, 356-я стралко-

выя дывізіі, 68-я асобная танкавая брыгада і іншыя часці выйшлі на подступы да Брагіна.

10 лістапада 1943 года пасля кароткачасовай падрыхтоўкі войскі Беларускага фронту пачалі Гомельска-Рэчыцкую наступальную аперацыю. У ходзе яе прадугледжвалася нанесці два ўдары, абысці з флангаў гомельскую групоўку праціўніка і знішчыць яе. Галоўны ўдар планаваўся з лоеўскага плацдарма сіламі 48-й, 65-й і 63-й арміі, 9-га і 1-га гвардзейскага танкавых, 7-га і 2-га гвардзейскіх кавалерыйскіх карпусоў у агульным накірунку на Рэчыцу з наступным выхадам у тыл ворагу з поўдня. Пры гэтым асноўныя сілы 61-й арміі — 76-я і 77-я гвардзейскія стралковыя Чарнігаўскія, 15-я, 55-я, 81-я, 356-я, 415-я стралковыя дывізіі, 7-мы гвардзейскі кавалерыйскі корпус і іншыя часці і фарміраванні намячалася выкарыстаць для развіцця наступлення на Калінкавічы, Мазыр і г. д. І першым на шляху да выканання гэтай задачы быў Брагінскі раён.

У дзень рашаючага штурму Дняпра газета 55-й стралковай дывізіі «Победа» ў нумары за 16 кастрычніка 1943 года заклікала: «Вперед, за Днепр, сыны Отечества! Нас ждет Белоруссия!» А назаўтра 111-ты і 228-мы стралковыя палкі гэтай дывізіі разам з іншымі часцямі і злучэннямі перайшлі ў наступленне ў напрамку Крыўчы, Нова-Аляксееўкі. Але пераадолець супраціўленне ворага з ходу не ўдалося, і завязаліся зацяжныя баі. Пры гэтым суседзямі на левым флангу былі 12-я і 76-я гвардзейскія дывізіі.

У ноч на 9 лістапада 55-я стралковая дывізія пераадолела рэчку Пясчанку каля в. Жылічы. Наперадзе былі населеныя пункты Крыўча, Зарэчча, Малейкі і іншыя. 15 лістапада 55-я стралковая дывізія з баямі дасягнула рубяжа р. Брагінкі. Улічваючы цяжкапраходную балоцістую мясцовасць, добрую ўмацаванасць варожых пазіцый, камандзір 55-й стралковай дывізіі М. М. Заіюльеў прапанаваў браць раённы цэнтр не лабавой атакай, а абходным манеўрам з флангаў. Адначасова перад камандаваннем асобнага партызанскага атрада імя Катоўскага была пастаўлена задача перарэзаць дарогу Брагін — Хойнікі і затым ударыць па адступаючых варожых часцях з тылу.

Яшчэ ішлі кровапралітныя баі ў паўночна-заходніх раёнах, а на вызваленай ад акупантаў тэрыторыі Палескай і Гомельскай абласцей ужо адраджалася жыццё. У першую чаргу члены аператыўных груп адразу ж заняліся аднаўленнем органаў Савецкай улады, партыйных і камсамольскіх арганізацый. Старшынёй райвыканкама ў Брагіне стаў былы партызанскі камісар П. Р. Зіновіч. У сувязі з ваенным становішчам Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР адтэрмінаваў выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных, тэрмін паўнамоцтваў якіх скончыўся. У населеных пунктах, дзе засталіся выбраныя да вайны дэпутаты, праводзіліся сесіі сельсаветаў. Так было і ў Брагіне ў сакавіку 1944 г. Былі разгледжаны пытанні забеспячэння функцыяніравання сацыяльнай інфраструктуры, выканання іншых неадкладных задач у адпаведнасці з патрабаваннямі дырэктыўных органаў і інш.[1].

Напрыканцы 1943—пачатку 1944 гг. на пасяджэннях райвыканкамаў у Брагіне і Камарыне былі зацверджаны старшыні выканкамаў і сакратары сельскіх Саветаў дэпутатаў працоўных. На першых сесіях Саветаў асабліва востра стаялі пытанні аднаўленчага характару: нарыхтоўкі і вывазкі лесаматэрыялу, наладжвання работы цагельняў, падрыхтоўкі кадраў будаўнічых прафесій, гатоўнасці да веснавых палявых работ і інш.

Учарашнія партызаны ўзначальвалі выканкамы сельсаветаў: Лубяніцкага — П. Я. Дзялец, Мікуліцкага — В. Ц. Лагвіненка, саўгас «Астрагляды» — І. П. Пятроўскі, калгасы «Ленінец» Спярыжскага сельсавета — С. І. Кіслоў, імя Сталіна — А. С. Голуб і інш.

Затым, у адпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) і Саўнаркама СССР ад 21 жніўня 1943 г. «Аб неадкладных мерах па аднаўленні гаспадаркі ў раёнах, вызваленых ад нямецкай акупацыі», пачалася актыўная работа па аднаўленні прадпрыемстваў і арганізацый, калгасаў і саўгасаў. Аб'ектамі першачарговага аднаўлення ў райцэнтры і напачатку ў буйнейшых населеных пунктах сталі жыццёва важныя прадпрыемствы і ўстановы народнай гаспадаркі. На пачатку снежня 1943 г. першы сакратар Брагінскага райкама партыі К. Х. Дагура звярнуўся з заклікам да камсамольцаў і моладзі раёна лічыць сябе мабілізава-

[1] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 6. Воп. 1. Спр. 331. Л. 2—27.

нымі на аднаўленне хлебапякарні, бальніцы, прадпрыемстваў гандлёвай сеткі, камунальнай службы. Зварот выклікаў высокі працоўны і палітычны ўздым сярод брагінчан. Ужо праз два-тры тыдні дзейнічала частка хлебапякарні, пачала прымаць хворых бальніца, поўнасцю была адноўлена сістэма водазабеспячэння. У дзве змены кіпела работа на аднаўленні вальцовага млына, будынка пошты і радыёвузла, абутковай майстэрні ў Брагіне.

З выключным энтузіязмам працавалі і камарынцы на аднаўленні аб'ектаў народнай гаспадаркі і сацыяльна-бытавой сферы. Ударныя брыгады дзейнічалі на адбудове цагельні мясцовага райпрамкамбіната, на нарыхтоўцы лесу і піламатэрыялаў. У абодвух раёнах прымаліся дзейсныя меры па будаўніцтве і рамонце жылля, стварэнні спрыяльных умоў для функцыяніравання школ, фельчарска-акушэрскіх пунктаў, майстэрняў па пашыве і рамонце адзення і абутку. Пачалі наладжваць работу ацалелых у вайну клубных устаноў, адкрываць хаты-чытальні і бібліятэкі. Значная частка кніг паступала з рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, якія не падвяргаліся нямецка-фашысцкай акупацыі, было атрымана шмат вучэбных падручнікаў і наглядных дапаможнікаў для школ.

На пачатку 1944 г. былі арганізацыйна, а затым і матэрыяльна-тэхнічна адноўлены машынна-трактарныя станцыі. Брагінскую ўзначаліў здольны кіраўнік і арганізатар Р. С. Аўдзяйчук, Камарынскую — былы камандзір партызанскага атрада А. І. Трухановіч. Ужо ў першую пасляваенную веснавую кампанію механізатары гэтых прадпрыемстваў працавалі выключна старанна і плённа. Сяўба была праведзена паспяхова. У Брагінскай МТС вызначыліся, асабліва на палявых работах 1945 г., члены трактарных брыгад Р. П. Федарэнкі, У. І. Коўзіка. Са значным перавыкананнем даведзеных заданняў працавалі лепшыя трактарысткі Брагіншчыны Е. Л. Дземчанка, К. А. Ярмоленка, іх калегі-мужчыны С. Ф. Голікаў, Н. І. Сашко, І. С. Кузьмянок, у Камарынскай МТС — А. М. Манецкая, П. В. Дзяцел, у Крыўчанскай МТС (дырэктар Ц. А. Крываносаў) — трактарная брыгада Д. Ф. Протчанкі, трактарысты А. П. Косцін, І. М. Баранаў і іншыя.

Як і насельніцтва іншых раёнаў, найбольш пацярпелых ад нямецкай акупацыі і баявых дзеянняў падчас вызвалення, жыхары Брагіншчыны атрымалі вялікую дапамогу ад дзяржавы, міжнародных арганізацый (праз Чырвоны Крыж), ад працоўных усходніх абласцей краіны, да якіх не дакацілася вайна. Насельніцтва было вызвалена ад дзяржаўных паставак сельгаспрадукцыі, ваеннага і іншых падаткаў. Сем'ям загінуўшых воінаў і партызан, франтавікоў, а таксама тым, якія страцілі ў вайну амаль усю або ўсю сваю хатнюю маёмасць, аказвалася дапамога праз органы дзяржаўнага забеспячэння, з фонду Чырвонага Крыжа. Дзяржава аказвала насельніцтву і харчовую дапамогу: выдзяляліся мука, крупы, мяса, тлушчы, цукар, згушчонае малако.

З усходніх раёнаў СССР на Брагіншчыну было завезена 10 трактароў, 170 коней, 1200 галоў буйной рагатай жывёлы, 1500 авечак, 1000 галоў свіней. Была атрымана таксама пэўная колькасць коней, адбітых Чырвонай Арміяй у адступаўшых гітлераўцаў.

Нягледзячы на тое, што раёны самі моцна пацярпелі ад нямецка-фашысцкіх акупантаў, ад баявых дзеянняў восенню 1943 г., працоўныя Брагіншчыны і Камарыншчыны не пажадалі застацца ў баку ад ахапіўшага ўсю краіну патрыятычнага руху пад лозунгам: «Усё для фронту, усё — для перамогі!» Арганізавана вялася кампанія па аказанні дапамогі фронту, збору матэрыяльных сродкаў у Фонд абароны ў Брагіне, Камарыне, Савічах, Сабалях і іншых населеных пунктах. Гарачую падтрымку і адабрэнне атрымаў у нас пачын вядомага калгасніка з Саратаўскай вобласці Ферапонта Галаватага, які за ўласныя

зберажэнні набыў два баявыя самалёты для дзеючай арміі. На Брагіншчыне з заклікам разгарнуць збор сродкаў на будаўніцтва авіяэскадрыллі «Палескі партызан» выступіў звеннявы калгаса імя Тэльмана, кавалер ордэна Леніна Антон Іванавіч Радчанка. Ён асабіста зрабіў першы ўзнос у суме 500 рублёў.

Прыкладу А. І. Радчанкі паследавалі многія іншыя грамадзяне. У прыватнасці, калгасніца з вёскі Чырвоная Гара Буднік Ксенія Сямёнаўна выручаныя ад продажу каровы грошы ўнесла ў Фонд абароны з просьбай набыць на іх і ўручыць мужу на фронце «сямейны» мінамёт.

Актыўна вёўся збор грошай сярод жыхароў вёсак Тэльман, Малейкі, Сабалі, Буркі Брагінскага раёна, а таксама на Камарыншчыне. Свае асабістыя зберажэнні ўносілі жыхары Брагіна і навакольных вёсак. У 1944 г. за параўнаўча кароткі час працоўнымі Брагіншчыны было сабрана 277 350 рублёў. Іх пералічылі на набыццё артылерыйскай зброі, будаўніцтва авіяэскадрыллі і інш.

Пад лозунгам «Дапаможам доблеснаму фронту!» у Брагінскім і Камарынскім раёнах ішоў збор сельгаспрадуктаў. І тут многія паказвалі прыклад. Так, адной з першых здала ў фонд Чырвонай Арміі 12 пудоў збожжа са сваіх запасаў калгасніца калгаса «Чырвоная ніва» Кацярына Раманюк, сын і дачка якой змагаліся на фронце. Усяго хлебаробы Брагінскага раёна сабралі ў 1944 г. для арміі 33 400 пудоў збожжа, а таксама 72 тысячы пудоў бульбы.

Адчувальным укладам у перамогу была сапраўды гераічная праца жыхароў вызваленага ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Прыдняпроўя. Не было трактароў, не хапала коней, плугоў, і тады ўскопвалі глебу рыдлёўкамі, запрагалі ў плугі, падводы нешматлікіх у вёсках кароў, напружваліся самі і вазілі на палеткі гной, аралі і сеялі, выконвалі іншыя работы. Вось яны, тыя нязгасныя ў нашай памяці прыклады працоўнага гераізму. Па 1,4 гектара калгаснай зямлі ўскапалі ўручную за вясну 1944 г. калгасніцы Любоў Мароз і Любоў Краўчанка з вёскі Макрэц. 12 гектараў узараў на ўласнай карове малажынскі калгаснік Даніла Шаўчэнка. Трыста вазоў гною вывезла на ўласнай карове на грамадскія палеткі малейкаўская калгасніца Кацярына Ласіца і інш.

І. Ф. Ганжураў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

СА ЗВАРОТУ ПАЛЕСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКАМА КП(б)Б ДА ПРАЦОЎНЫХ ПАЛЕСКАЙ ВОБЛАСЦІ З ВЫПАДКУ 25-й ГАДАВІНЫ БССР

25-ю гадавіну існавання БССР мы адзначаем ва ўмовах, калі Чырвоная Армія, адагнаўшы ворага на сотні кіламетраў, ачышчае беларускую зямлю ад нямецкіх акупантаў. Амаль поўнасцю вызвалена Гомельская вобласць, значная частка Магілёўскай, Віцебскай і Палескай вобл. Зноў вярнулася жыццё ў Хойнікі і Брагін, Васілевічы і ў Камарын, у Ельск і Нароўлю. На вызваленай зямлі аднаўляецца народная гаспадарка і культура, залечваюцца раны, нанесеныя крывавым гаспадараннем гітлераўскіх захопнікаў...

Газета «Бальшавік Палесся» — орган Палескага падпольнага абкама КП(б)Б. 1944. 1 студз. № 1 (2093).

ТЭЛЕГРАМА І. В. СТАЛІНА

7 красавіка 1944 г.

Мозырь.
Секретарю Брагинского РК КП(б) Белоруссии
тов. Догуро
Председателю Брагинского райисполкома
тов. Зиновичу
Передайте трудящимся Брагинского района, собравшим 277 350 рублей на строительство авиаэскадрильи «Полесский партизан», мой братский привет и благодарность Советской Армии.

И. Сталин

Ад Савецкага інфармбюро. З аператыўнай зводкі.

З РАШЭННЯ ВЫКАНКАМА БРАГІНСКАГА РАЁННАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ АБ'ЯЎЛЕННІ СВЯТОЧНЫМ ДНЯ ВЫЗВАЛЕННЯ РАЁНА АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

21 лістапада 1944 г.

В связи с тем, что 23 ноября 1943 года является днем освобождения Брагинского района от немецко-фашистских захватчиков и принимая к сведению многочисленные просьбы от учреждений, предприятий, организаций, колхозов, исполком районного Совета депутатов трудящихся решил:

1. 23 ноября (1943 года) — день освобождения Брагинского района от немецко-фашистских захватчиков — объявить праздником в районе.
2. Рабочий день 23 ноября перенести на 26 ноября 1944 года (воскресенье)...

Філіял дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл. у г. Рэчыцы. Ф. 214. Воп. 1. Спр. 2. Л. 213.

Выявіў і падрыхтаваў да друку
І. Ф. Ганжураў

Пісьмы з фронту

У Дзяржаўным архіве Гомельскай вобласці, у тым ліку ў яго філіяле ў г. Рэчыцы, захоўваюцца пісьмы ўраджэнцаў Брагінскага раёна, якія яны дасылалі з фронту. Нельга без хвалявання чытаць радкі, напісаныя ў кароткія часіны франтавога зацішша. Гэтыя пісьмы — часцінка нашай памяці, жывой гісторыі барацьбы і перамог савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Вось пісьмо, адрасаванае калгаснікам вёскі Валахоўшчына:

«Здравствуйте, глубокоуважаемые товарищи и друзья!

Разрешите вас поздравить с Новым, 1944 годом, передать мой краснофлотский боевой привет.

Новый, 1944 год будет годом новых побед над фашистскими войсками и окончательного их изгнания с нашей земли.

Товарищ председатель колхоза! Я вас прошу сообщить мне о моих родителях, потому что я не имею от них вестей.

Дорогие товарищи, я читал в газете, как издевались немецкие палачи над жителями Полесской области и особенно что они творили в Брагине и Хойниках. За это им не избежать кары. Сообщите, какие у вас новости, что немцы натворили у нас в деревне. Если родители мои живые, передайте им мой привет.

Ответ дайте как можно быстрее.

До свидания, победа близка!

Левошко Савелий Акимович

3 декабря 1943 года».

А вось пісьмо, датаванае 12 кастрычніка 1944 года:

«Здравствуйте, мои родные!

Если бы вы только знали, как я скучаю без вас! Мне очень хочется вас видеть. Этот паразит Гитлер нарушил нашу мирную жизнь. Я от вас теперь далеко-далеко. Но близок час, когда мы увидимся. И тогда заживут все раны, и жизнь пойдет нормальным ходом.

Поздравляю вас с праздником Великой Октябрьской социалистической революции! Эта 27-я годовщина Октября будет для нас особенно радостной. Мы в скором времени разобьем врага.

И. Т. Никитенко».

І яшчэ адно пісьмо:

«30 июля 1944 года.

Здравствуйте, мои дорогие! Я жив, только ранен, лежу в госпитале. Пишу вам письмо, а сам не

знаю, живые ли вы. Как вы вынесли такое тяжелое время, больше двух лет были под этим проклятым немцем. Очень хочется узнать, как там мои сыновья. Наверное, уже большие. Говорите им, что папа живой, скоро врага разобьет и домой вернется.

Кривенчук Петр Иосифович».

А гэта ўрывак з пісьма воіна Пятра Іванавіча Шапавалава, адрасаванае маці і сястры 22 студзеня 1944 года:

«Сообщаю вам, что я отъезжаю на фронт. Прошу не плакать и не волноваться за меня. Жив буду — встретимся. Победим немца, и приду домой. Ждите с фронта письма».

Байцы пісалі не толькі сваім сем'ям. Іх цікавілі справы ў калгасе, сельсавеце. Знаходзячыся далёка ад родных мясцін, яны з болем у сэрцы даведваліся аб зверствах фашыстаў на часова акупіраванай імі тэрыторыі, аб велізарных стратах, нанесеных вайной, і г. д. І ў іх гаварыла гаспадарская жылка, трывога, ці змогуць там, дома, землякі ўсё аднавіць, паправіць, наладзіць.

Вось пісьмо Мікалая Аляксеевіча Назаранкі ад 12 лютага 1944 года, адрасаванае старшыні Мікуліцкага сельсавета:

«Сообщаю вам, что, несмотря на такую кровопролитную войну, я пока жив и здоров, отважно стою за нашу родную страну.

Очень хочется знать, как дела в родной стороне? Какая работа у вас проводится по подготовке к весеннему севу. Есть ли семена в колхозе? Есть ли в колхозах лошади? Уцелели ли наши колхозные постройки: склады, тока, сараи?

Желаю вам успехов в мирном строительстве. Прошу работников сельсовета писать побольше обо всем».

А ўраджэнец Мікулічаў Рыгор Міхайлавіч Здаравец пісаў:

«Привет с фронта!

От солдат своего подразделения шлю вам горячий привет, желаю успехов в тылу. Мы бьем проклятых фрицев здесь, на фронте, мы мстим за кровь наших братьев и сестер, которые погибли под фашистским игом.

Мы будем бить и уничтожать фашистов еще больше. Но и вы, товарищи, держитесь в тылу. Мы знаем, что у вас все разрушено, сожжено. Но главное, что вы теперь можете мирно жить, трудиться.

Желаем вам успехов в налаживании хозяйства. С приветом к вам бойцы и командиры.

До свидания. Ждем ответа».

У кастрычніку 1944-га ў Камарынскі райваенкамат прыйшло пісьмо з фронту ад ураджэнца в. Новая Ёлча старшага сяржанта Міроненкі Сяргея Сямёнавіча. Вось што ён пісаў:

«Дорогие земляки, призывники!

Вот уже четвертый год идет Великая Отечественная война против немецких захватчиков. Белорусский народ рука об руку со всеми народами СССР встал на защиту своей Родины. Многим сыновьям и дочерям белорусского народа присвоено звание Героя Советского Союза. Партизаны и партизанки родной Белоруссии многое сделали для изгнания немецких захватчиков из пределов своего края.

Вы, дорогие призывники, жили под немецким игом более двух лет. Вы видели сами и пережили на себе все тяготы издевательств и позора.

Товарищ Сталин и вся доблестная Красная Армия не забывают вас, делая все для скорейшего освобождения своих братьев, сестер, жен и матерей, попавших под иго немецких шакалов. Я участвовал в героической обороне города Ленинграда, в боях под Волховом, Псковом, Выборгом. В боях с немецкими захватчиками я был пять раз ранен. Мои раны излечены, я буду бить немцев до полного их уничтожения. Буду бить их за слезы наших детей, жен, матерей, все их (врагов) издевательства над нашим народом.

Теперь я курсант военного училища, приобретаю новую специальность для того, чтобы, придя на фронт, бить немцев еще с большей силой.

Призываю вас, дорогие земляки, придя на фронт, бейте немцев, не жалея ни крови, ни жизни. Мстите им за кровь, за слезы наших отцов и матерей, жен и детей.

Будьте стойкими и мужественными до конца!

Смерть немецким захватчикам!

Мироненко С. С.

г. Омск-3».

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

История «семейного» миномета

Из письма, посланного в декабре 1944 г. жительницей деревни Красная Гора Брагинского района К. С. Будник мужу на фронт — гвардии младшему сержанту Я. А. Буднику:

«Мы, колхозницы и колхозники, внимательно следим за боевыми успехами наших воинов на фронте, с радостью отмечаем каждую победу нашей славной Красной Армии. От всего сердца благодарим воинов, освободивших от проклятых фашистов нашу родную Белоруссию. Я счастлива, что и мой муж Будник Яков Андреевич, воин вверенного Вам подразделения, бьет врага.

Искренне желая помочь фронту, я внесла в Брагинское отделение Госбанка свои сбережения на приобретение своему мужу Якову Буднику миномета. Пусть он еще крепче, еще беспощаднее бьет из своего оружия извергов-фашистов. Пусть ему и его боевым друзьям этот мой скромный подарок постоянно напоминает о том, как колхозники заботятся о наших славных защитниках Родины. Еще сильнее бейте врага! Мы же будем ковать победу над фашистами в тылу своим скромным трудом».

Накануне Нового, 1945 года на лесной поляне около Вислы состоялся митинг бойцов и офицеров гвардейской части, посвященный вручению нового оружия командиру минометного расчета Якову Буднику. Открывая митинг, офицер Яковой сказал:

— По поручению командира вручаю вам, товарищ Будник, миномет, приобретенный на средства вашей семьи. Берегите миномет и беспощадно громите из него гитлеровцев.

— Служу Советскому Союзу! — гордо ответил Будник, принимая в свое распоряжение миномет № 3568.

Прогремело трехкратное «ура!». Оркестр исполнил Гимн Советского Союза. А Яков, взволнованный до слез, стоял у своего миномета, смотрел на прикрепленную к стволу металлическую пластинку, на которой были выгравированы слова: «От жены Ксении».

Фронтовая печать много писала в те дни о патриотическом поступке белорусской колхозницы и героических делах Якова Будника. Красноармейская газета «На штурм», номера которой и сейчас хранятся у Якова, в те дни выходила с такими заголовками: «Яркий пример единства фронта и тыла!», «Новогодний подарок мужу», «Патриотический поступок белорусской колхозницы», «Красноармейское спасибо Ксении Будник!», «Героический подвиг Якова Будника».

Спустя некоторое время командир части написал Ксении Будник теплое письмо с фронта.

«Уважаемая Ксения Семеновна! — говорилось в нем. — Вы можете гордиться своим мужем. Из «семейного» миномета он уже уничтожил несколько десятков гитлеровцев, вывел из строя четыре вражеских пулемета и две немецкие пушки».

Наши войска неудержимо продвигались вперед на запад, громили врага на его собственной территории. Позади остались Висла, Одер. Вместе со своей частью шел и Яков Будник во главе боевого расчета. Во многих боях от Припяти до Эльбы участвовал Будник. Много раз смотрел он смерти в глаза, три раза был ранен, но неизменно оставался в боевом строю.

Неподалеку от Берлина, в одном из жарких боев, Яков Будник был снова ранен, бойцы расчета вышли из строя, а миномет сильно поврежден. Якову одному пришлось отбивать контратаку гитлеровцев. В этом бою Будник уничтожил из автомата 20 фашистов и отстоял свой миномет. А когда миномет был отремонтирован и расчет пополнился новыми людьми, Яков снова пошел в бой. Во время переправы через канал в районе Штеттина расчет миномета попал под артогонь врага. Миномет затонул. Несмотря на смертельную опасность, Яков Будник вместе с бойцами расчета достал миномет со дна канала и снова открыл огонь по врагу.

У Будника было горячее стремление во что бы то ни стало дойти со своим «семейным» минометом до Берлина. И он добился своего: штурмовал столицу фашистской Германии и закончил боевой путь на Эльбе.

Родина высоко оценила заслуги гвардии старшего сержанта, командира минометного расчета Якова Будника. Он награжден орденами и медалями, ему объявлено 16 благодарностей. И когда Яков Будник отслужил свой срок в рядах Советской Армии и возвращался в родной колхоз, командир части вручил гвардейцу памятное письмо.

«Уважаемый Яков Андреевич, — говорится в письме, — командование гвардейского полка выносит Вам искреннюю благодарность за Вашу безупречную

службу в полку. В боях с немецкими захватчиками Вы показали себя верным патриотом Советской Родины и своим мужеством и отвагой прославили наш полк. Надеемся, что Вы будете хранить боевые традиции, как самое дорогое в вашей жизни, и множить славные патриотические дела своим добросовестным трудом в родном колхозе».

Летом 1946 года Яков Андреевич вернулся из армии к своей родной семье в село Красная Гора. Воина-освободителя радостно встретили жена Ксения Семеновна, дочери Рая и Таня, отец Андрей Прокопович и братья-фронтовики. Помня наказ командира части, Яков Будник добросовестно трудится в родном колхозе «Путь к коммунизму», одном из передовых хозяйств на Гомельщине...

П. Похилько

Во славу Родины, 1959. 5 крас. № 80.

П. С. Жукаў (злева)

ЗА ГАЗЕТНЫМ РАДКОМ

Па старонках камарынскай раённай газеты «За Радзіму»

Наказ франтавіка

14 чэрвеня 1944 г.

У рэдакцыю нашай газеты даслаў пісьмо былы калгаснік калгаса «Чырвоная Украіна» Гдзенскага сельсавета Атрошчанка Іван Андрэевіч. Ён перадае сваім землякам і калгаснікам калгаса «Чырвоная Украіна» баявое прывітанне і наказвае працаваць так, як доблесныя воіны Чырвонай Арміі канчаткова вызваляюць родную савецкую зямлю ад гітлераўскіх захопнікаў.

— Я тры гады знішчаю фашыстаў, — піша таварыш Атрошчанка, — і буду граміць ворага да поўнага знішчэння, а вы, таварышы калгаснікі, хутчэй заканчвайце веснавую сяўбу і дастойна рыхтуйцеся да касавіцы сена і каласавых культур.

Падарунак франтавікоў

22 красавіка 1945 г.

У сакавіку 1945 г. выхаванцы Камарынскага дзіцячага дома паслалі на фронт пісьмо, у якім расказалі аб сваім жыцці і вучобе, пажадалі воінам здароўя і хутчэйшай перамогі над ворагам. Пісьмо трапіла ў вайсковую часць № 45838 (133-ці браняпоезд процівавіяцыйнай абароны). Праз некаторы час з гэтай часці ў дзіцячы дом прыйшло цёплае ўдзячнае пісьмо і ў якасці падарунка 1000 рублёў на грашовым пераводзе. Воіны-франтавікі прасілі дырэктара дзетдома выкарыстаць гэтыя грошы на набыццё падручнікаў, адзення і абутку для дзяцей-сірот.

Нашы землякі — Героі Савецкага Саюза

Жукаў Пётр Сяргеевіч. Герой Савецкага Саюза (1945). Нарадзіўся ў 1921 г. у в. Мікулічы Рэчыцкага павета Мінскай губерні. З сялян. Скончыў ваенна-пяхотнае вучылішча (1941), афіцэрскую школу (1946). У Чырвонай Арміі з 1940 г. У Вялікую Айчынную вайну на Паўднёва-Заходнім, Паўночна-Каўказскім, Паўднёвым, Цэнтральным, 1-м Беларускім франтах — камандзір батальёна. Удзельнік вызвалення Новарасійска, Тамані, Керчы. Вызначыўся ў чэрвені 1944 г. падчас прарыву варожай абароны на рубяжы рэк Трэмля і Пціч, пры вызваленні вёсак на поўдзень ад Бабруйска. Да 1953 г. служыў у Савецкай Арміі, гвардыі маёр. З 1953 г. працаваў у Мазыры ў гарадскім камітэце ДТСААФ, намеснікам начальніка, старшыні савета добраахвотнага пажарнага таварыства.

Памёр у 1967 г. Пахаваны ў в. Мікулічы. На магіле пастаўлены абеліск.

За родны край

25 чэрвеня 1944 года маёр Жукаў павёў свой батальён на прарыў варожай абароны заходняй вёскі Пружынішчы Акцябрскага раёна. Пад моцным агнём праціўніка воіны ўзламалі лінію абароны гітлераўцаў і імклівa пайшлі наперад, адрэзалі ворагу шлях адступлення, каб нанесці яму як мага большыя страты. Абходным манеўрам жукаўцы дасягнулі пастаўленай мэты. У выніку рашучай атакі 60 салдат і афіцэраў праціўніка засталіся на полі бою.

Пасля разгрому ворага ў Пружынішчах батальён Жукава мог, не адрываючыся ад праціўніка, прасоўвацца наперад. На наступны дзень батальён мусіў прарваць трэцюю паласу абароны, створаную на беразе ракі Трэмля. Фашысты разлічвалі на забалочаную пойму ракі і агнявую моц загадзя створаных вузлоў супраціўлення. Быў прыстрэлены кожны метр зямлі, абсталяваны доты і дзоты, вельмі разгалінаваная сістэма траншэй і акопаў.

Жорсткім агнём сустрэлі фашысты воінаў батальёна, якія ўзняліся ў атаку. Каб не дапусціць марных страт асабовага саставу, камандзір батальёна прымяніў абходны манеўр — загадаў адной з рот заставацца на месцы і скоўваць праціўніка, а сам павёў астатніх байцоў у абход праз балота.

Заставалася ўсяго некалькі дзесяткаў метраў, калі вораг выявіў смельчакоў і адкрыў па іх моцны агонь. Прыйшлося залегчы і адбіваць контратаку праціўніка. «У гэты напружаны момант бою,— пісаў гвардыі палкоўнік Смірноў ва ўзнагародным лісце,— ва ўвесь рост узнімаецца гвардыі маёр Жукаў, і батальён нечалавечым намаганнем вырываецца з балота, апракідвае праціўніка».

Вораг не вытрымаў націску і адступіў да ўмацаванага сяла Любань. Гвардзейцы з ходу ўзялі і гэты апорны пункт. Цяпер на шляху батальёна была вёска Заабоззе. К канцу дня нашы воіны пад моцным агнём праціўніка дасягнулі яе паўднёва-ўсходняй часткі. Завязаўся бой. Фашысты, атрымаўшы падмацаванне,— 200 салдат і некалькі танкаў, перайшлі ў контратаку.

Трэці дзень для гвардзейцаў маёра Жукава быў такім жа нялёгкім, як і два папярэднія. Батальёну было загадана фарсіраваць раку Пціч. І тут вельмі перашкаджала моцная забалочанасць. Наступаць «у лоб» было нельга. І Жукаў — майстар абходнага манеўру — зноў вырашыў перахітрыць ворага. Удар з фланга быў настолькі імклівы, што праціўнік пачаў адступаць. Тады ўзняўся ў атаку ўвесь батальён. Жукаўцы з мінімальнымі стратамі пераадолелі раку, выбілі гітлераўцаў з займаемага імі рубяжа. Але для гвардыі маёра Жукава гэта быў апошні бой. Ён атрымаў цяжкае раненне і, падаючы на зямлю, паспеў крыкнуць падбегшым на дапамогу байцам:

— Не спыняцца! Толькі наперад!

Пётр Сяргеевіч Жукаў ляжаў у шпіталі, а па інстанцыях ішоў узнагародны ліст. У ім камандаванне пісала: «За ўзорнае кіраўніцтва боем батальёна ў складаных умовах лясіста-балоцістай мясцовасці, за неаднаразовае праяўленне гераізма ў баях за нашу Радзіму — гвардыі маёр Жукаў дастойны прысвоення звання Героя Савецкага Саюза». Пад узнагародным лістом стаялі подпісы камандуючага 28-й арміяй генерал-лейтэнанта Лучынскага і члена ваеннага савета арміі генерал-маёра Мельнікава.

Указам ад 24 сакавіка 1945 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР прысвоіў групе салдат, афіцэраў і генералаў высокае званне Героя Савецкага Саюза. Сярод іх было і прозвішча Пятра Сяргеевіча Жукава, слаўнага сына беларускага народа, які вызначыўся ў баях за вызваленне сваёй роднай зямлі.

М. А. Салаўёў

Маяк Палесся, 1974. 23 лют.

Мацапура Сяргей Сцяпанавіч. Герой Савецкага Саюза (1945). Нарадзіўся ў 1919 г. у в. Гдзень Рэчыцкага павета Мінскай губерні. З сялян. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Цэнтральным, Калінінскім, 1-м і 2-м Украінскіх, 1-м Беларускім франтах — старшына, механік-вадзіцель танка Т-34. Вызначыўся пры вызваленні Польшчы. 18 студзеня 1945 г. уварваўся ў г. Сахачаў, знішчыў варожую гармату, 10 мінамётаў і кулямётаў, 16 аўтамашын. 22 студзеня 1945 г. зноў вызначыўся ў г. Інаўроцлаў. Жыве ў Маскве.

Вызваляў Польскую зямлю

Выхадам на раку Одэр і захопам плацдармаў на яе левым беразе войскі 1-га Беларускага і 1-га Украінскага франтоў завяршылі Вісла-Одэрскую

С. С. Мацапура з вучнямі

аперацыю. За гераізм, высокае воінскае майстэрства, праяўленыя пры вызваленні Польшчы, 1667 савецкім воінам прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У ліку іх быў і ўраджэнец вёскі Глзень Брагінскага раёна Сяргей Сцяпанавіч Мацапура.

...З 14 па 20 студзеня 1945 года 500 кіламетраў прайшоў з боем танк механіка-вадзіцеля 49-й гвардзейскай танкавай брыгады гвардыі старшыны С. С. Мацапуры. Ён удзельнічаў у вызваленні гарадоў Блендуў, Сахачаў, Любень, Інавроцлаў. 22 студзеня экіпаж танка разам з экіпажам яшчэ трох баявых машын уварваўся ў цэнтр горада Інавроцлаў і адрэзаў ворагу шлях да адступлення.

У ходзе Вісла-Одэрскай аперацыі Сяргей Сцяпанавіч праславіў сябе ў двух яркіх баявых эпізодах. 18 студзеня 1945 года экіпаж танка, механікам-вадзіцелем якога быў С. С. Мацапура, уварваўся ў горад Сахачаў, знішчыў варожую гармату, дзесяць мінамётаў і кулямёт, 65 фашыстаў. 22 студзеня ў горадзе Інавроцлаў захапіў чыгуначную станцыю і азрадром праціўніка, знішчыў 3 самалёты, цягнік, 15 аўтамашын і 49 гітлераўцаў.

Імя слаўнага земляка высечана ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і запісана ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

У Маскве, на Паклоннай гары, збудаваны велічны мемарыяльны комплекс, прысвечаны перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У беламармуровай зале Славы, што ў цэнтры мемарыяла, на адной з пліт можна прачытаць і прозвішчы нашых трох герояў-землякоў: П. С. Жукава, С. С. Мацапуры і П. І. Шпетнага.

Сяргей Сцяпанавіч Мацапура жыве ў Маскве. Ветэран вайны прымае актыўны ўдзел у рабоце па ваенна-патрыятычным выхаванні школьнікаў і моладзі.

С. Мілахін

Шпетны Павел Іванавіч. Герой Савецкага Саюза (1944). Нарадзіўся ў 1913 г. у в. Гдзень Рэчыцкага павета Мінскай губерні. З сялян. У Чырвонай Арміі з 1936 г., на фронце з 1941 г., камандзір узвода бранябойшчыкаў. Вызначыўся ў Курскай бітве. 12—13 ліпеня 1943 г. у баі на Белгарадскім напрамку з процітанкавага ружжа падбіў 6 варожых танкаў. Загінуў 13 ліпеня 1943 г. Імем героя названа школа на радзіме.

Герой Курскай бітвы

У дні Курскай бітвы наш полк дзейнічаў у раёне вёскі Прохараўка, дзе адбыўся, бадай, самы вялікі за Айчынную вайну танкавы паядынак. Не стану апісваць гэтую грандыёзную бітву, раскажу толькі пра аднаго героя-гвардзейца, ураджэнца Брагіншчыны П. І. Шпетнага і пра яго бясстрашных сяброў. Іх было дзевяць чалавек, дзевяць звычайных савецкіх воінаў, якія абаранялі рубеж, прыкрываючы подступы да вышыні 226,6. Гэта было якраз у тыя дні, калі немцы рыхтаваліся да апошняга наступлення на Курска-Белгарадскім выступе.

Зямля дыхла гарачынёй. На палетках паспела збажына, варожыя танкі сталёвымі пачварамі паўзлі па ёй, бязлітасна дратуючы яе гусеніцамі і цяжка бухаючы выстраламі гармат.

Натыкнуўшыся на артылерыйскі заслон, танкі пачалі распаўзацца па ўсім полі. Сем з іх накіраваліся на рубеж, які абаранялі бранябойшчыкі Шпетнага. Усяго дзевяць чалавек разам са старшым лейтэнантам. Сем сталёвых грамадзін нахабна лезлі наперад, нягледзячы на моцны загараджальны агонь нашай артылерыі і ўдалыя выстралы бранябойшчыкаў. І тады пачуўся хрыплы голас гвардыі старшага лейтэнанта Паўла Шпетнага:

— Сябры! Выбар у нас толькі адзін: перамагчы ворага або памерці...

Дзевяць гвардзейцаў працягвалі няроўны бой з сямю нямецкімі танкамі. Нібы прыраслі да сваіх ПТРаў старшы лейтэнант Шпетны, сяржант Салімаў, чырвонаармеец Гулькоў. З-за суцэльнага гулу артылерыйскай канонады, частых выбухаў снарадаў амаль не чуваць было стральбы бранябоек. Густы дым слаўся па зямлі. Гвардзейцы падбілі тры варожыя танкі, а астатнія чатыры раптам спыніліся. Яны паварочвалі ствалы гармат і стралялі нібы наўздагад. Відавочна, дымавая смуга перашкаджала ім добра бачыць цэль. І ўсё ж варожыя снарады траплялі і ў акопы бранябойшчыкаў. Вось загінуў ад асколкаў чырвонаармеец Праскуракаў, упалі сяржанты Ахранкін і Сухарскі... А танкі ўсё бліжэй і бліжэй. Задыхаючыся, гвардыі сяржант Ойя анямеўшай рукой націскаў на спускавы кручок. Нават у той момант, калі танк ужо застыў нерухомы, бранябойшчык выпусціў па ім яшчэ некалькі куль. Танкаў цяпер засталося тры — па адным на кожнага пэтээршчыка, што засталіся жывымі. Але гвардзейцы не пахіснуліся і працягвалі бой.

Над самым акопам спыніўся варожы танк. Паранены камандзір споўз на дно акопа, дзе ўжо ляжалі ў крыві Салімаў і Нялюбін.

— Таварыш камандзір... жывы? — ледзь чутна спытаў гвардыі сяржант Нялюбін і з цяжкасцю пачаў узнімацца з зямлі. Ён нацэліў процітанкавае ружжо, стрэліў раз, потым другі, трэці...

Цяжка паранены, Шпетны адчуваў, што сілы пакідаюць яго, але, застагнаўшы, на руках падняўся з паўразбуранага акопа. Апошні ацалелы танк набліжаўся да бруствера.

— Хто з вас можа трымаць зброю? — спытаў Шпетны ў параненых таварышаў. Перамагаючы слабасць і боль, узняліся Ойя і Бутко. Спрабаваў зрабіць тое ж Салімаў.

— На вас уся надзея... — Шпетны не скончыў фразы і асунуўся на зямлю. Гэта былі яго апошнія словы. Старшы лейтэнант ужо не бачыў, як паўжывыя воіны апошнімі патронамі расстрэльвалі

апошні на іх пазіцыях фашысцкі танк, як гвардыі сяржант Салімаў — ужо не было сілы ўтрымаць у руках ПТР — прыклаўся да аўтамата і да апошняга дыхання не выпускаў яго з рук.

Так загінулі дзевяць герояў-гвардзейцаў, да канца выканаўшы воінскі абавязак. Васьмёра з іх былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, а гвардыі старшаму лейтэнанту Шпетнаму Паўлу Іванавічу прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

А. Кулакоў,
гвардыі падпалкоўнік у адстаўцы

З узнагароднага ліста Героя Савецкага Саюза Шпетнага Паўла Іванавіча

Коммунист Павел Шпетный прошел славный боевой путь. Это твердый, решительный командир, проявивший в боях с ненавистными немецко-фашистскими захватчиками стойкость и мужество, уверенность в победе, беззаветную преданность социалистической Родине. Свое чувство глубокой ненависти к немецким захватчикам передал бойцам своего взвода.

12 и 13 июля 1943 года в жестоких боях за высоту 226,6 он со своим взводом бронебойщиков стоял на защите боевых порядков пехоты от нападения танков. Когда началась атака противника, взвод бронебойщиков встретил ее дружным и метким огнем. Товарищ Шпетный сам взял ружье ПТР и открыл огонь по танкам. Шесть таиков подбил он в этом бою. Им были израсходованы все боеприпасы, а танки продолжали еще наступать, явно имея своей целью подавить эту несокрушимую огневую точку. Прижав к груди противотанковые гранаты, товарищ Шпетный ждал, пока подойдет ненавистный враг. Танк подошел, и взрыв гранат остановил его. Так погиб верный своей цели и чувствам мужественный и скромный командир.

Імя героя не забыта

Нашы землякі па праву ганарацца яго імем. Ён не быў ураджэнцам Брагінскага раёна, але яго перадваенны лёс быў цесна звязаны з нашымі мясцінамі. І праз паўстагоддзе, што мінула з часу Вялікай Айчыннай вайны, імя Героя Савецкага Саюза А. М. Дулебы не забыта на Брагіншчыне.

Дулеба Антон Мікалаевіч, н. у 1920 г. у в. Дубовы Лог Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. Герой Савецкага Саюза (27.2.1945). З сялян. Член КПСС з 1943 г. Скончыў Мінскі індустрыяльна-тарфяны тэхнікум (1937), курсы мал. лейтэнантаў (1941), Вышэйшую афіцэрскую бранятанкавую школу (1948), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1954). Да вайны працаваў тэхнікам-землеўпарадчыкам у былым Камарынскім раёне. У Чырвонай Арміі з 1939 г. На фронце са жніўня 1942 г. 29.1.1945 г. эскадрон кавалерыстаў на чале са ст. лейтэнантам А. М. Дулебам з ходу фарсіраваў Одэр, заняў с. Прытаг і два дні адбіваў варожыя контратакі. 30.1.1945 г. арганізаваў прарыў эскадрона з акружэння. Пасля вайны палкоўнік А. М. Дулеба да 1969 г. служыў у Савецкай Арміі. Жыў у г. Хмяльніцкі, Украіна.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Адстаялі ў баях Радзіму

На ўсіх франтах Вялікай Айчыннай вайны, на акупіраванай тэрыторыі ў партызанскіх атрадах змагаліся з ворагам нашы землякі. Некаторыя ўступілі ў бой з фашыстамі яшчэ на Заходняй граніцы ў першыя дні вайны. Удзельнічалі ўраджэнцы Брагінскага і Камарынскага раёнаў і ў бітве пад Масквой, у Сталінградскай і Курскай бітвах. Потым некаторым з іх пашчасціла вызваляць ад прышэльцаў родную Брагіншчыну. Пасля вызвалення раёна многія тысячы нашых землякоў уліліся ў рады Чырвонай Арміі. Яны вызвалялі Беларусь, акупіраваныя гітлераўцамі краіны Еўропы, удзельнічалі ў штурме Берліна.

Не ўсе воіны-землякі дажылі да перамогі, але ўсе яны засталіся навечна ў нашай памяці. Пра некаторых з іх расказваецца ніжэй.

«За мной, наперад!»

З успамінаў І. Хандогіна, былога камсорга батальёна 922-га стралковага палка

Хачу расказаць аб адным малавядомым подзвігу, сведкам якога я быў. Яго здзейсніў беларус, старшы лейтэнант Гаўрыла Трафімавіч Калінічэнка, ураджэнец вёскі Савічы Брагінскага раёна.

Летам 1943 года савецкія войскі рыхтаваліся да ліквідацыі арлоўскай групоўкі праціўніка. У гэтай аперацыі ў саставе 250-й стралковай дывізіі ўдзельнічаў і наш 922-гі стралковы полк.

У ноч на 12 ліпеня батальён, у якім я служыў, сканцэнтраваўся на заходняй ускраіне сяла Залягош па правым беразе ракі Неруч. Нампаліт Г. Калінічэнка абышоў падраздзяленні, пагутарыў з многімі афіцэрамі, камуністамі і камсамольцамі. Кожнаму даваў слушную параду, як дзейнічаць у баі. На досвітку, калі агонь нашай артылерыі быў перанесены ў глыбіню варожай абароны, батальён у адзіным парыве рушыў наперад. Мы дасягнулі берага ракі, уброд фарсіравалі яе і выйшлі на процілеглы бераг.

Апамятаўшыся пасля першага ўдару, гітлераўцы нарошчвалі агнявое супраціўленне. Каб пазбегнуць страт, мы заляглі. Не прайшло і мінуты, як фашысты пайшлі ў контратаку. Некаторыя нашы салдаты не вытрымалі атакі і сталі адыходзіць да ракі.

У гэты крытычны момант прагучаў голас старшага лейтэнанта Калінічэнкі: «Стой, ні кроку назад!» Гэта ўнесла супакаенне ў нашы рады, вярнула ўпэўненасць байцам.

Бой працягваўся некалькі гадзін. Гітлераўцы падцягнулі рэзервы. Іх кулямётны і аўтаматны агонь шчыльна прыціснуў нас да зямлі. Нашы ланцугі радзелі. Выйшлі са строю камандзір узвода лейтэнант Новікаў, камандзір роты старшы лейтэнант Ліннік, парторг батальёна старшы лейтэнант Курносаў. Здавалася, яшчэ дзве-тры мінуты — і мы не вытрымаем такога высокага напружання.

І ў гэты момант мы зноў пачулі Калінічэнку. Перапаўзаючы ад аднаго байца да другога, ён гаварыў: «Варожая траншэя блізка, патрэбен адзін толькі адзін кідок наперад. Дзейнічаць грэба рашуча і хутка. Я падымуся першым, а вы — за мной...»

Не адразу дайшлі да маёй свядомасці словы нампаліта. Хіба магчымы над градам свінцу кідок? Хіба афіцэр не разумее, што гэта верная смерць?

Палымяны голас Калінічэнкі абарваў мае думкі: «За Радзіму, за мной — наперад!» Быццам нябачная магутная спружына адарвала нас ад зямлі і кінула на ворага. Наперадзе бег, не азіраючыся, нампаліт. Ён быў упэўнены, што за ім падымецца ўвесь батальён. Так яно і было. Імгненні назад, зліты з зямлёй, я не бачыў ніякага выйсця — і раптам... Бягу і не чую зямлі пад нагамі. Ліхаманкава працуе думка: дабегчы, прымусіць ворага назаўсёды замоўкнуць...

У прарыў, прабіты батальёнам у абароне праціўніка, былі ўведзены іншыя падраздзяленні палка. Наступленне паспяхова развівалася.

У гэтым баі нампаліт быў смяротна паранены. За свой подзвіг Г. Т. Калінічэнка пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Яго ўчынак натхняў нас і ў наступных баях.

Гомельская праўда. 1990. 9 мая.

Праз усю вайну

Ён прайшоў чатыры доўгія гады вайны. Быў тройчы паранены. У цяжкім 1941-м ён — палітрук, у пераможным сорак пятым — камандзір гвардзейскага стралковага палка. Усяго крыху больш як тыдзень не дажыў да Перамогі.

Ураджэнец вёскі Жэрднае Брагінскага раёна Васіль Канстанцінавіч Канановіч не быў прафесіянальным ваенным. Разам з бацькамі ў 1934 годзе ён пераехаў на жыхарства ў сяло Нова-Уладзіміраўка Кампанееўскага раёна Кіраваградскай (тады Адэскай) вобласці. Пасля заканчэння сярэдняй школы настаўнічаў, вучыўся на завочным аддзяленні Кіраваградскага пединстытута.

У 1937 годзе Васіля Канстанцінавіча прызначылі дырэктарам Губаўскай няпоўнай сярэдняй школы, той самай, у якой у свой час вучыўся вядомы пралетарскі паэт Дзям'ян Бедны. Зарэкамен-

даваў сябе здольным кіраўніком педагагічнага калектыву, у перадваенныя гады быў узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку».

Пасля заканчэння ў 1940 годзе школы палітработнікаў Васіля Канстанцінавіча накіравалі ў Калінінскі вышэйшы ваенна-педагагічны інстытут.

З чэрвеня 1941 года старшы палітрук В. К. Кананоўіч у дзеючай арміі. 154-я стралковая дывізія, у якую ён атрымаў прызначэнне, з цяжкімі баямі адыходзіла на ўсход, пакідаючы родную Гомельшчыну. Гітлераўцам удалося акружыць там частку 63-га стралковага корпуса, якім камандаваў генерал Л. Г. Пятроўскі. Калі пайшлі на прарыў, генерал-лейтэнант Пятроўскі і камандзір 154-й стралковай дывізіі Я. С. Факанаў ішлі ў атакуючых ланцугах. У гэтым жорсткім баі пад Жлобінам у першых радах байцоў ішоў і старшы палітрук В. К. Кананоўіч.

А потым была гераічная абарона г. Тулы. 154-я стралковая дывізія не прапусціла ворага на ўчастку, які абараняла.

Цяжкія абарончыя баі пад Сталінградам. Тут дывізія была перайменавана ў 47-ю гвардзейскую. Падчас контрнаступлення яна ўваходзіла ў склад 5-й танкавай арміі. Гвардыі батальённы камісар В. К. Кананоўіч і тут на пярэдняй лініі агню. Яго палымянае слова, асабістая храбрасць натхнялі байцоў на подзвіг. За ўзорнае выкананне заданняў камандавання батальённы камісар В. К. Кананоўіч загадам па войсках Паўднёва-Заходняга фронту ад 15 студзеня 1943 года быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

У баях за Данбас маёр В. К. Кананоўіч ужо камандаваў палком, атрымаў ордэн Суворава III ступені.

Пры вызваленні левабярэжнай Украіны Васіля Канстанцінавіча цяжка параніла. І трэба ж такому было здарыцца, што літаральна перад гэтым у полк прыбыла маладая дзяўчына-санінструктар. Аказалася — родная сястра Кананоўіча Марыя. Першым, каму ёй давялося аказваць медыцынскую дапамогу, быў брат. На санітарным самалёце Маша суправаджала цяжкапараненага камандзіра палка ў шпіталь. За ўмелыя дзеянні па аказанні тэрміновай дапамогі параненым воінам санінструктар Марыя Кананоўіч атрымала падзяку ад камандзіра дывізіі.

Не далячыўшыся, В. К. Кананоўіч вярнуўся ў дывізію на пачатку 1944-га. Але, недалечанаму, яму катэгарычна загадалі вярнуцца назад. Васіль Канстанцінавіч заскочыў на спадарожнай машыне пабачыцца з Машай. Якраз разгарэўся бой, і дзяўчына паспяшалася туды, дзе яе чакалі параненыя. Часу на размову не было.

У сваю дывізію Кананоўіч больш не трапіў. Камандаваў 163-м гвардзейскім палком у 5-й гвардзейскай Макееўскай ордэна Леніна Чырванасцяжнай ордэна Суворава дывізіі. Змагаўся ў Беларусі, Прыбалтыцы, пад Кёнігсбергам, дайшоў амаль да Берліна...

У пісьме, накіраваным гвардзейцамі дывізіі бацьку загінуўшага камандзіра, расказвалася аб слаўным баявым шляху Васіля Канстанцінавіча. За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандавання, умелае кіраванне войскамі на полі бою, праяўленыя пры гэтым мужнасць і гераізм камандзір палка В. К. Кананоўіч быў адзначаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, Суворава III ступені, медалямі «За абарону Масквы», «За абарону Сталінграда» і інш.

Гвардыі падпалкоўнік В. К. Кананоўіч пахаваны за 20 кіламетраў ад Берліна, а на яго магіле ўстаноўлены мармуровы помнік.

У чэрвені 1945 года загадам па войсках 28-й арміі падпалкоўнік В. К. Кананоўіч быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

В. Кабзар

У няпоўныя семнаццаць...

З успамінаў Р. Ф. Васіленкі, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, уралжэнца в. Савічы

У канцы 1944 года войскі 1-га Беларускага фронту вызвалілі нас на тэрыторыі Польшчы. Годам-двума раней мы былі вывезены сюды гітлераўцамі на ваенныя прадпрыемствы. Усіх вызваленых юнакоў і мужчын мабілізавалі ў Савецкую Армію. Толькі мяне ды яшчэ некалькі падлеткаў накіроўвалі на радзіму. Пакрыўджаны, я падышоў да афіцэра з просьбай: «Хачу змагацца з ворагам».

Так у няпоўныя семнаццаць гадоў я стаў салдатам. Пасля таго як мяне з цяжкасцю абмундзіравалі — форма аказалася велікаватай, мяне адвялі ў батальён. Там я спасцігаў азы салдацкай навукі: вучыўся страляць з вінтоўкі, аўтамата, кідаць гранаты.

Неўзабаве нас адправілі на перадавую. Баявым хрышчэннем для мяне было фарсіраванне ракі Вісла. На супрацьлеглым яе беразе мяне параніла ў левую нагу. Пасля непрацяглага лячэння ў шпіталі я трапіў у адну з часцей 33-й танкавай брыгады, якая ўваходзіла ў састаў танкавага корпуса пад камандаваннем генерал-палкоўніка С. І. Багданава.

15 лютага 1945 года групу камсамольцаў, сярод якіх быў і я, выклікалі ў штаб брыгады. Там з намі правялі гутарку, з якой я добра запомніў фразу штабіста: «Камсамольцы павінны стаяць скалой — ні кроку назад!» Гэтак маладых салдат рыхтавалі да адказнага баявога задання — нам выпала змагацца са здрадзіўшымі Радзіме суайчыннікамі з так званай Рускай вызваленчай арміі генерала Уласава.

Наша камсамольская група заняла важны рубеж — будынак маслазавода — і тым самым актыўна садзейнічала наступленню нашай часці. Мы паспяхова адбілі некалькі атак уласаўцаў. У гэтым баі мяне зноў параніла ў нагу.

Пасля шпіталя я вярнуўся ў сваю часць. Далечваўся тут, у санбаце. 10 ці 12 сакавіка нас, групу з васемнаццаці камсамольцаў-багданаўцаў, выклікалі на агульнае пастраенне, дзе мне былі ўручаны тры Падзякі Галоўнага Вярхоўнага Камандуючага І. В. Сталіна (загад № 288, 290, 292 ад 4, 5 і 6 сакавіка 1945 года) за актыўны ўдзел у авалоданні 21 населеным пунктам, адбітым у ворага ў выніку цяжкіх баёў.

Апошняй вялікай бітвай для мяне з'явіўся ўдзел у штурме Берліна. Напярэдадні штурму нас пасадзілі на танкі і накіравалі да рачной пераправы. Пад прыкрыццём дымавой заслоны мы пераправіліся на супрацьлеглы бераг Одэра. У дзевяць гадзін 16 красавіка, пасля магутнай артылерыйска-мінамётнай падрыхтоўкі і бамбёжкі, савецкія войскі пайшлі ў наступленне на левым флангу варожай абароны Берліна. У ходзе баёў за Берлін я падбіў гранатай нямецкі танк «тыгр».

У далейшым удзельнічаў у вулічных баях у Берліне, у тым ліку і каля Брандэнбургскіх варот. Пры знішчэнні кулямётнай кропкі ворага быў цяжка паранены.

Пасля працяглага лячэння ў шпіталях я быў прызнаны прыгодным для нестраявой службы і (гэта было ўжо пасля Перамогі) накіраваны ў спецбатальён па ахове эшалонаў. Дадам, што за фарсіраванне Вісла быў адзначаны ордэнам Славы трэцяй ступені. Потым атрымаў некалькі медалёў.

Маяк Палесся, 1990. 12 мая.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Абаранялі Ленінград

З успамінаў П. Р. Лявонава, былога камандзіра зенітнай батарэі, жыхара г. п. Брагін

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, я вучыўся ў Омску, у ваенным мінамётным вучылішчы. Але закончыць яго не ўдалося. У сувязі са складанай ваеннай абстаноўкай адбыўся датэрміновы выпуск курсантаў, пераважная большасць якіх была накіравана ў дзе-

ючую армію. Але адразу на фронт я не трапіў, бо ўсіх нашых былых курсантаў з сярэдняй адукацыяй залічылі ў вучылішча зенітнай артылерыі, якое было арганізавана на базе былога мінамётнага.

У канцы лістапада 1941 года нам прысвоілі афіцэрскае званне і праз некалькі дзён накіравалі ў воінскія часці. Так я прыбыў на Ленінградскі фронт. Там, у штабе, атрымаў накіраванне камандзірам агнявога ўзвода зенітнай батарэі, якая размяшчалася ў Ленінградзе, непадалёку ад завода імя С. М. Кірава. Асноўная наша задача заключалася ў тым, каб прыкрыць прадпрыемства ад налётаў авіяцыі праціўніка, не дапусціць прарыву ворага ў горад па вуліцы Стачак. Байцы ўзвода і батарэі добра разумелі важнасць гэтай задачы і рабілі ўсё магчымае для яе выканання.

Вясной 1942 года войскі супрацьпаветранай абароны Ленінграда сарвалі паветраную аперацыю «Айсштос», у ходзе якой немцы мелі намер знішчыць умёрзлыя ў лёд на Няве караблі Балтыйскага флоту. Асабліва жаданай цэллю для гітлераўскіх лётчыкаў быў крэйсер «Кіраў», які стаяў паблізу моста лейтэнанта Шміта. Пад прыкрыццём знішчальнікаў трыццаць пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў ворага спрабавалі скінуць бомбы на крэйсер і іншыя караблі. У схватку з ворагам уступілі і зенітчыкі, якія дапамагалі нашай авіяцыі атрымаць перамогу ў паветры. Бой быў цяжкім. Але дзякуючы ўзгодненым дзеянням у ім авіятараў і зенітчыкаў немцы страцілі 26 самалётаў. У гэтым быў пэўны ўклад і нашай зенітнай батарэі.

Неяк у маі 1942 года аднаму фашысцкаму сцярвятніку ўдалося прарвацца ў горад і скінуць бомбы ў раёне Кіраўскага завода. Але назад самалёт не вярнуўся. Трашным зенітна-кулямётным агнём нашай батарэі ён быў збіты.

Майстэрства нашых зенітчыкаў узрастала з кожным днём. Перавага ў паветры да канца 1942 года поўнасцю належала нам. У выніку спыніліся масавыя налёты фашысцкай авіяцыі. Горад ажыў. Адкрыўся трамвайны і аўтобусны рух. Пачалі дзейнічаць водаправод, многія прамысловыя прадпрыемствы. Ленінград сваёй нястомнай працай і гераічнай барацьбой каваў перамогу над ворагам.

Дарэчы, нашы зенітчыкі білі нямецка-фашысцкіх захопнікаў не толькі ў паветры, але і на зямлі. Толькі байцы батарэі, якой я затым камандаваў, прамой наводкай знішчылі некалькі танкаў і бронемашын, нямала жывой сілы ворага.

Радзіма высока ацаніла гераізм і мужнасць нашых салдат і афіцэраў. Так і я быў узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Ленінграда» і інш.

1977 г.

Жанчыны на вайне

На вайне мужнасць, адвага, баявое майстэрства — галоўныя салдацкія якасці. І розніцы тут бадай што не было, хто салдат: мужчына ці жанчына. Толькі «слабаму полу» вайна, бясспрэчна, давалася цяжэй. Так мяркуе жыхарка пасёлка Калінінскі Хракавіцкага сельсавета Клаўдзія Рыгораўна Журовіч (Калмыкова), для якой суровыя ваенныя будні пачаліся ў Брэсце 22 чэрвеня 1941 года.

Той дзень запомніўся ёй масіраванымі нямецкімі бамбёжкамі і артылерыйскімі абстрэламі, шматразовымі варожымі атакамі. Ёй, кволай дзяўчыне, тады давялося дапамагаць санітарам выносіць з поля бою і эвакуіраваць з прыгранічнай паласы параненых чырвонаармейцаў, здабываць для іх прадукты ў бліжэйшых вёсках. Затым (немцы ўжо захапілі Брэстчыну) некаторы час над выглядам родзічкі жыла ў адной вясковай сям'і. І нарэшце, прыкінуўшыся глуханямой бежанкай, прабіралася на ўсход па акупіраванай ворагам тэрыторыі. У раёне Гурава далучылася да мясцовых народных мсціўцаў.

Летам 1943 года трапіла ў атрад малдаўскіх партызан Д. Е. Бабіча. Па іх даручэнні выконвала разведвальныя заданні ў Жыткавіцкім раёне, разам з баявымі таварышамі ўдзельнічала ў некалькіх аперацыях супраць гітлераўцаў каля вёсак Баравое і Малашавічы Лельчыцкага раёна, у Жытомірскай, Хмяльніцкай і Чарнавіцкай абласцях. Вось радкі з баявой характарыстыкі байца 6-га батальёна 2-й стралковай брыгады 1-га Малдаўскага партызанскага злучэння (камандзір Я. П. Шкрабач, камісар В. Т. Драздоў) К. Р. Журовіч (Калмыковай):

«За время нахождения в отряде проявила себя стойким и мужественным бойцом — разведчиком...

Наравне со всеми бойцами участвовала в шести боях с гитлеровцами... Входила в состав диверсионной группы, которая на железнодорожных линиях Закопане — Русятин и Проскуров — Каменец-Подольский пустила под откос два воинских эшелона с живой силой, боеприпасами и продуктами противника...»

Можна дадаць, што за баявыя подзвігі Клаўдзія Рыгораўна адзначана ордэнам Чырвонай Зоркі і трыма медалямі. Пасля вайны яна па накіраванні з Масквы знаходзілася на клубнай і камсамольскай рабоце ў Кішынёве, а пасля вяртання на радзіму працавала бібліятэкарам, удзельнічала ў ваенна-патрыятычным выхаванні школьнікаў і моладзі.

Не менш цікавы баявы шлях і ў жыхаркі гарпасёлка Брагін Юліі Уладзіміраўны Скараход, якая з вясны 1942 года знаходзілася ў дзеючай арміі. Добраахвотніцай ваявала ў складзе 784-га зенітна-артылерыйскага палка. Асабліва запомніўся васемнаццацігадовай дзяўчыне чэрвень 1943-га, калі адбівалі налёты варожай авіяцыі пры спробе немцаў прарвацца на бамбёжку цэляў у раёне Горкага. Тады было збіта некалькі варожых самалётаў. Але панеслі страты і зенітчыкі. Юлія вельмі перажывала смерць баявых сяброўак.

У 1944-м радавы баец зенітна-артылерыйскага разліку Ю. У. Скараход стала камуністам. Са сваім палком прайшла цяжкі ваенны шлях да самай перамогі. У мірныя дні гадавала дзяцей, працавала да самага выхаду на заслужаны адпачынак.

Радавым членам Савіцкай падпольнай патрыятычнай арганізацыі, сувязной партызанскага атрада імя Катоўскага пачынала ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі 16-гадовая камсамолка з вёскі Савічы Ніна Загаранская. А з канца 1943 года яна на фронце — бухгалтар палявога аддзялення Дзяржбанка СССР у 61-й арміі. Узнагароджана медалямі «За адвагу», «Партызану Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.», «За перамогу над Германіяй» і інш. Пасля вайны, да выхаду на пенсію, працавала галоўным бухгалтарам курортгандлю ў г. Феадосія. Актыўна ўдзельнічала ў грамадскай рабоце.

Камандзірам падраздзялення сувязі проціпаветранай абароны была К. Я. Шумейка, начальнікам назіральнага паста, камандзірам узвода проціпаветранай абароны — Г. І. Верабей, медыцынскімі сёстрамі шпіталя № 29 легкараненых — П. С. Шульга, шэрагу эвакашпіталяў Варонежскага, 1-га Украінскага франтоў — С. А. Рак (Старавойт). Два гады працавала афіцыянткай у сталовай палявога батальёна аэрадромнага абслугоўвання А. М. Іваненка (Кузьменка). Сувязной партызанскага атрада (камандзір Ф. В. Галавач) са злучэння С. А. Каўпака з'яўлялася Ф. С. Клімянок, работніцай кухні партызанскага атрада 130-й партызанскай брыгады Палескага злучэння народных мсціўцаў — В. Д. Трухановіч. Са зброяй у руках змагалася з ворагам і была паранена настаўніца Бярозкаўскай школы В. Г. Марчанка. Наравне з салдатамі дзялілі цяжкасці і трывогі ваеннай паўсядзённасці на фронце і ў партызанскіх атрадах многія іншыя жанчыны-зямлячкі. У іх ліку — В. І. Драчова, Ф. А. Загорац,

Удзельніцы Вялікай Айчыннай вайны. Першы рад (злева направа): А. С. Колган, Ф. С. Клімянок, В. І. Драчова. Другі рад (злева направа): Г. М. Луцкая, Е. Я. Шумейка, В. І. Ляўсенка, Л. П. Скараходава

А. С. Колган, Г. М. Луцкая, В. І. Ляўсенка, М. І. Пузырына, А. Д. Пятрэнка, Е. І. Раманюк, Л. П. Скараходава, Э. П. Уласенка (Дубкоўская), М. М. Фешчанка, Г. С. Шаўчэнка і іншыя.

Напрыканцы 1943 — пачатку 1944 гадоў у шэрагу прыфрантавых населеных пунктаў Камарынскага і Брагінскага раёнаў размяшчаліся воінскія медустановы, асобныя медсанбаты: 431-ы 336-й сд — у в. Ніўкі, 440-ы 356-й сд — у в. Краснае, 19-ы 74-й сд — у в. Іванкі, 199-ы ў в. Лукаеды (Кірава) і Гдзень; эвакуацыйныя шпіталі: № 2553 — у в. Пасека, № 3240 — у в. Бярозкі, № 2607 — у в. Гарадзішча, інфекцыйны шпіталь № 4257 — у в. Кавака, шпіталь легкараненых — у в. Астрагляды і інш. Выратаваннем параненых або хворых салдат і афіцэраў у іх займаліся не толькі штатны персанал, але і многія мясцовыя дзяўчаты, пажылыя жанчыны. Яны дапамагалі даглядаць цяжкапараненых, прыносілі ім з дому прадукты, пралі і рамантавалі шпітальную бялізну і г. д. Некаторыя ж вясковыя дзяўчаты праявілі выключную прыхільнасць да працы па догляду за параненымі. У далейшым яны, у тым ліку Марыя Васільеўна Крус з в. Кавака, па ўласным жаданні ўліліся ў склад абслугоўваючага медперсаналу ў якасці санітарак, няняў, прачак і разам са шпіталямі прайшлі іх доўгі і нялёгкі шлях.

Г. С. Шаўчэнка

На жаль, не ўсім сціплым працаўніцам ратнага паходу міласэрнасці пашчасціла дажыць да светлага і радаснага дня перамогі. На палях Вялікай Айчыннай вайны загінула прачка 12-й запасной дывізіі М. А. Дзедзенка з в. Ясені, санінструктар 197-га інжынерна-сапёрнага батальёна Ю. І. Зяляўская з в. Астрагляды, старшая хірургічная сястра 95-га медсанбата 6-й гвардзейскай стралковай дывізіі В. Л. Мартыненка з в. Дубліч, санінструктар П. І. Плюшчай з в. Чырвоная Паляна Малажынскага сельсавета, санітарка інфекцыйнага шпіталя № 4257 А. Ф. Ярмоленка з в. Кавака.

І. Ф. Ганжурай

Прамой наводкай

У ходзе Беларускай наступальнай аперацыі ў вызваленні Талачыншчыны ўдзельнічалі 1-я і 5-я гвардзейскія стралковыя дывізіі 11-й гвардзейскай арміі. Воіны-гвардзейцы прадэманстравалі на талачынскай зямлі сапраўдныя ўзоры масавай мужнасці і гераізму. Аб гэтым сведчаць матэрыялы Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расіі. Вось адзін з эпізодаў...

28 чэрвеня 1944 года напружаныя баі ішлі каля станцыі Слаўнае. Храбра змагаліся тут з ворагам гвардзейцы-артылерысты...

У баях за Слаўнае па-геройску змагаўся гвардыі радавы 187-га гвардзейскага артылерыйскага палка беларус з калгаса «Новае жыццё» Брагінскага раёна Барыс Гарноўскі. Калі 28 чэрвеня 2-гі дывізіён сустрэўся з аўтакалонай фашыстаў і тыя, разгарнуўшыся ланцугом, пайшлі ў атаку, артылерысты занялі абарону. Гарноўскі падпусціў акупантаў на 200—250 метраў, адкрыў агонь з гарматы прамой наводкай. А калі гітлераўцы падышлі да гарматы ўшчыльную, разам з іншымі байцамі пайшоў у атаку, асабіста знішчыў з аўтамата 10 гітлераўцаў. За праяўлены ў гэтым баі гераізм ён узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Б. Шылуха

Памяць. Талачынскі раён. Мн., 1988. С. 271—272.

Вярнуліся пераможцамі

Цяжкімі шляхамі Вялікай Айчыннай вайны ў складзе Чырвонай Арміі, партызанскіх атрадаў і падполля прайшлі тысячы нашых землякоў. Яны ўнеслі важкі ўклад у разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў і дасягненне Вялікай Перамогі. Аб іх подзвігу пераканаўча сведчаць шматлікія баявыя ўзнагароды — ордэны і медалі.

Пройдуць гады, дзесяцігоддзі, і нашы нашчадкі будуць ведаць і помніць тых, хто ўдзельнічаў у самай кровапралітнай, жорсткай і цяжкай вайне, хто аддаў самае дарагое — сваё жыццё на алтар Перамогі, а хто вярнуўся дадому пераможцам, залечваў свае франтавыя раны, аддаваў сілы і здольнасці справе адбудовы разбуранай фашысцкімі захопнікамі гаспадаркі, працаваў на палях і фермах, фабрыках і заводах, гадаваў дзяцей... І мы лічым сваім пачэсным абавязкам, каб сваімі кнігамі Памяці ўвекавечыць імёны ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай. Ад гэтых імёнаў многія нашчадкі будуць адлічваць сваю радаслоўную і павядуць яе далей.

Поўнай упэўненасці, што мы назвалі імёны ўсіх нашых землякоў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, няма. Прайшло шмат часу. З кожным годам ветэранаў застаецца ўсё менш... Адны з іх памерлі ад франтавых ран у першыя пасляваенныя гады, другіх не стала ўжо ў апошні час. На жаль, захаваліся не ўсе дакументы аб баявой дзейнасці франтавікоў, партызан, падпольшчыкаў. Далёка не ўсе звесткі ўдалося знайсці і ў райваенкаматах. Але кожны з тых, хто названы і не названы тут, унёс свой уклад у агульную справу разгрому ворага, абараніў Айчыну ад фашысцкай навалы. Усім ім вялікая і шчырая ўдзячнасць нашчадкаў за тое, што зроблена імі ў імя Перамогі. З пачуццём найглыбейшай пашаны мы гаворым: «Нізкі паклон табе, слаўнае пакаленне пераможцаў у Вялікай Айчыннай!..»

У. І. Лемяшонак

АСАРЭВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Асарэвічы

Акуленка Міхаіл Анісімавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Бельчанка** Цярэнцій Кірылавіч, ордэн Славы III ступені;

Ефіменка Георгій Сідаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Канцавы** Іван Ігнатавіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Пацук** Васіль Сямёнавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Пескавы** Іван Патапавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Протас** Анатоль Фёдаравіч, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені; **Протас** Іван Цімафеевіч, ордэн Славы III ступені; **Сізаненка** Макар Ісакавіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Хмелянок** Рыгор Міхайлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Шаўчэнка** Васіль Нікандравіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Вялле

Катлабай Іван Іванавіч, ордэн Славы III ступені.

Вёска Галкі

Кандрашэўскі Васіль Нікіфаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Хмелянок** Іван Андрэевіч, медаль «За баявыя заслугі».

АСТРАГЛЯДАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Астрагляды

Кананок Максім Віктаравіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Кошмар** Сяргей Паўлавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Крысенка** Анатоль Канстанцінавіч, два ордэны Чырвонай Зоркі, ордэн Айчыннай вайны I ступені; **Міхаленка** Мікалай Антонавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Мятліцкі** Міхаіл Фёдаравіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі.

Вёска Багушы

Балобан Аляксандр Пракопавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Бакуны

Ільічэнка Васіль Адамавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Каробкін** Пётр Цярэнцьевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Повад** Мікалай Міхайлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Буркі

Марчанка Уладзімір Цімафеевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Фокін** Уладзімір Васільевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Шкурко** Ілья Дзмітрыевіч, медаль «За адвагу».

Вёска Дуброўнае

Данчанка Рыгор Дзяменцьевіч, тры ордэны Чырвонай Зоркі.

Вёска Кавалі

Прыходзька Павел Данілавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Марытон

Вайцяхоўскі Сцяпан Эдуардавіч, медаль «За адвагу».

БРАГІНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

Гарпасёлак Брагін

Бабовіч Міхаіл Іванавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Бакун** Якаў Іванавіч, ордэны Славы II і III ступені; **Беразняцкі** Іван Гаўрылавіч, медалі «За адагу», «За баявыя заслугі»; **Буднік** Міхаіл Андрэевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «За адвагу»; **Бяляк** Мікалай Рыгоравіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Васільеў** Леанід Антонавіч, медаль «За адвагу»; **Вініцкі** Піліп Піліпавіч, медаль «За адвагу»; **Волкаў** Іван Аляксеевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Гайдук** Уладзімір Гардзеевіч, ордэн Славы III ступені; **Гурэвіч** Яфім Давыдавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «За адвагу»; **Гусянок** Арсеній Адамавіч, ордэны Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; **Гапшікаў** Канстанцін Нікіфаравіч, ордэн Чырво-

най Зоркі; **Дзегцярэнка** Андрэй Максімавіч ордэн Айчыннай вайны I ступені; **Драчова** Варвара Іванаўна, ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «За баявыя заслугі»; **Драчоў** Раман Сідаравіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Дынін** Арон Рафаілавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Ефіменка** Павел Адамавіч, медаль «За адвагу»; **Есмановіч** Іван Міхайлавіч, медаль «За адвагу»; **Жукаў** Рыгор Мартынавіч, ордэн Славы III ступені; **Залугоўскі** Максім Варваравіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені; **Ігнаценка** Уладзімір Іванавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Казлоўскі** Віктар Уладзіміравіч, медаль «За адвагу»; **Казлоўскі** Міхаіл Леанідавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Калмыкова** Клаўдзія Рыгораўна, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Камароў** Іван Яфрэмавіч, ордэн славы III ступені; **Кардаш** Фёдар Ігнатавіч, ордэн Славы II ступені, два ордэны Славы III ступені, медаль «За адвагу»; **Качан** Аляксандр Тарасавіч, медаль «За адвагу»; **Кацуба** Аляксей Піліпавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Корань** Іван Мітрафанавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Котаў** Уладзімір Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Луцай** Аляксандр Маркавіч, медаль «За адвагу»; **Лысенка** Васіль Аляксандравіч, ордэны Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, два ордэны Чырвонай Зоркі; **Лысенка** Віталь Іванавіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені; **Лысенка** Ксенафонт Аляксандравіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Лысенка** Сцяпан Іванавіч, ордэны Айчыннай вай-

Група ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Г. п. Брагін

Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны: А. А. Шпандарук, В. А. Лысенка, Ф. Л. Чавус, А. А. Крус

ны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Любачка** Міхаіл Аляксандравіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Лявонаў** Пётр Рыгоравіч, два ордэны Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; **Макеенка** Канстанцін Іванавіч, два ордэны Чырвонай Зоркі; **Малочка** Пётр Сямёнавіч, два ордэны Чырвонай Зоркі; **Манжос** Рыгор Адамавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Непанаў** Мікалай Нікіфаравіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Нікалаенка** Васіль Аляксандравіч, два ордэны Айчыннай вайны I ступені, ордэн Чырвонай Зоркі; **Нікіценка** Галіна Трафімаўна, ордэн Айчыннай вайны I ступені; **Огчык** Уладзімір Лазаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Панёўчык** Аляксандр Акімавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Папавічук** Астап Іванавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Парэмскі** Іван Яфімавіч, медаль «За адвагу»; **Пархоменка** Сцяпан Майсеевіч, ордэн Славы III ступені; **Паўленка** Аляксей Рыгоравіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Процка** Міхаіл Данілавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Прышчэпаў** Дзмітрый Васільевіч, два ордэны Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Прышчэпаў** Рыгор Васільевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Разанаў** Уладзімір Фёдаравіч, два ордэны Чырвонай Зоркі; **Раманенка** АпанасАнуфрыевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Рачэўскі** Мікалай Васільевіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Руткоўскі** Іван Пятровіч, па два ордэны Айчыннай вайны і Чырвонай Зоркі; **Седра** Андрэй Васільевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «За адвагу»; **Сініла** Фядос Герасімавіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені; **Сіранькоў** Аляксандр Фёдаравіч, ордэны Суворава III ступені, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Скамарох** Іван Ільіч, ордэн Славы III ступені; **Скараход** Феафан Сцяпанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Скараход** Юлія Уладзіміраўна, медаль «За баявыя заслугі»; **Скараходава** Людміла Платонаўна, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Скараходаў** Мікалай Цімафеевіч,

Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны муж і жонка М. Ц. Скараходаў і Л. П. Скараходава

ордэн Аляксандра Неўскага, медаль «За адвагу»; **Скочка** Міхаіл Сідаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Сторажаў** Міхаіл Адамавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Стрыбук** Іван Захаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Сучкоў** Васіль Фёдаравіч, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Сцельмашэнка** Іван Іванавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Сыцянок** Кірыла Сцяпанавіч, медаль «За адвагу»; **Татура** Ілья Аксенцьевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Ткач** Восіп Сямёнавіч, ордэн Славы III ступені; **Фяськоў** Аляксей Акімавіч, медаль «За адвагу»; **Фяськоў** Міхаіл Восіпавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Чавус** Фёдар Лукіч, два ордэны Айчыннай вайны II ступені; **Чарапанін** Аляксандр Пятровіч, медаль «За адвагу»; **Шашкоў** Іван Паўлавіч, ордэны Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені; **Шкурко** Панфіл Андрэевіч, ордэны Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені; **Шпандарук** Аляксей Антонавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Шульга** Васіль Якаўлевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслу-

гі»; **Шумак** Уладзімір Аляксандравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Шур** Аляксандр Мікалаевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Шылец** Уладзімір Ільіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені.

Вёска Сабалі

Сабаленка Іван Лявонцьевіч, ордэны Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені; **Шкурко** Аляксандр Андрэевіч, ордэны Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Шылец** Барыс Васільевіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені.

ВЕРХНЕЖАРАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Верхнія Жары

Казлоўскі Павел Андрэевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені, два ордэны Чырвонай Зоркі; **Юшчанка** Фёдар Міхайлавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Ніжнія Жары

Блудчы Міхаіл Мікалаевіч, ордэн Славы III ступені; **Мішчанка** Мікалай Ільіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені; **Сукач** Міхаіл Паўлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Федарэнка** Андрэй Мікалаевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Шары** Мікалай Паўлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

ВУГЛОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Вуглы

Буйкевіч Міхаіл Адольфавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «За баявыя заслугі»; **Дзегцярэнка** Іван Ціханавіч, ордэн Славы III ступені; **Дзегцярэнка** Кірыла Сцяпанавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Лявоненка** Уладзімір Маркавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Хадасок** Канстанцін Аляксеевіч, ордэн Славы III ступені; **Шылец** Павел Іванавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

Вёска Каманоў

Купрэенка Рыгор Віктаравіч, ордэн Славы III ступені; **Цярэшчанка** Сямён Іванавіч, ордэн Славы I ступені.

Вёска Лубенікі

Гайдук Сямён Андрэевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Ласіца** Гаўрыла Віктаравіч, ордэн Славы III ступені; **Цярэшчанка** Раман Фёдаравіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі.

Вёска Міхнаўка

Камок Іван Ціханавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Кузьмянок** Пётр Дзям'янавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Новы Пуць

Заяц Сцяпан Абакумавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Сушчанка** Уладзімір Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Рудня Жураўлёва

Коваль Іван Прохаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Коваль** Рыгор Фёдаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Шкураты

Кошчанка Васіль Ігнатавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Пасёлак Майскі

Байдак Міхаіл Пятровіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Шаўчэнка** Васіль Кірылавіч, медаль «За баявыя заслугі».

БЫЛЫ ГДЗЕНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Гдзень

Атрошчанка Мікалай Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Атрошчанка** Пётр Яў-

генавіч, медаль «За адвагу»; **Балюка** Сцяпан Сямёнавіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; **Волкаў** Аляксандр Сідаравіч, медаль «За адвагу»; **Гарбецкі** Дзямід Аляксеевіч, медаль «За адвагу»; **Грабянюк** Рыгор Макаравіч, медаль «За адвагу»; **Ігнаценка** Аркадзь Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Кічкар** Сцяпан Паўлавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Клімянок** Міхаіл Сяргеевіч, медаль «За адвагу»; **Козел** Дзмітрый Паўлавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Козел** Пётр Паўлавіч, медаль «За адвагу»; **Козел** Платон Сямёнавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Козел** Рыгор Фёдаравіч, медаль «За адвагу»; **Максіменка** Андрэй Трафімавіч, медаль «За адвагу»; **Мальчанка** Яўген Сямёнавіч, ордэн Славы III ступені, два медалі «За адвагу»; **Мацапура** Іван Мікалаевіч, медаль «За адвагу»; **Мацапура** Іван Мікітавіч, медаль «За адвагу»; **Мацапура** Павел Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Мішчанка** Аляксей Пятровіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Самойленка** Іван Рыгоравіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Самойленка** Іван Уладзіміравіч, медаль «За адвагу»; **Сідоранка** Васіль Сцяпанавіч, медаль «За адвагу»; **Учкур** Марк Віктаравіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; **Шпетны** Васіль Ільіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Шпетны** Мікалай Антонавіч, медаль «За адвагу»; **Шпетны** Міхаіл Антонавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Шульга** Емяльян Мітрафанавіч, медаль «За адвагу»; **Шульга** Рыгор Васільевіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

БЫЛЫ ГЛУХАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Глухавічы

Асіпенка Андрэй Арцёмавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Маісеенка** Уладзімір Сямёнавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Мартыненка** Іван Дзмітрыевіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Мельнічэнка** Іван Васільевіч, медаль «За адвагу»; **Мельнічэнка** Пётр Пятровіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; **Певень** Міхаіл Іванавіч, ордэн Славы III ступені; **Шлег** Даніла Гаўрылавіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі.

Вёска Ільічы

Андрэенка Фёдар Іванавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Іваноў** Пётр Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

Вёска Нудзічы

Садчанка Фама Фёдаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Самойленка** Рыгор Мітрафанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу».

Вёска Рафалаў

Малочка Іван Сямёнавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Раманенка** Ігнат Адамавіч, медаль «За адвагу».

БЫЛЫ КАЛЫБАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Залессе

Вашчанка Іван Дзямідавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені.

Вёска Калыбань

Гаўрык Пётр Антонавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Гулянок** Яфім Міхайлавіч, ордэн Славы III ступені; **Ільенка** Кузьма Аляксеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Касцючэнка** Мацвей Адамавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Макута** Іван Раманавіч, ордэн Славы III ступені; **Раманенка** Андрэй Міхайлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Сяміход** Андрэй Аляксандравіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені.

Вёска Чыкалавічы

Бельчанка Пётр Кірылавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Ільенка** Іван Мікалаевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Штылеўскі** Іван Іванавіч, ордэн Славы III ступені.

медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

Вызначыліся таксама ўраджэнцы Калыбанскага сельсавета:

Асіпенка Іван Пятровіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Кузьмянок** Я. П., ордэн Чырвонай Зоркі; **Лявоненка** Ф. М., ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Навуменка** І. М., ордэн Чырвонай Зоркі; **Пізо** Р. А., ордэн Славы III ступені.

КАМАРЫНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

Вёска Іванкі

Ахрэменка Міхаіл Мікалаевіч, медаль «За адвагу»; **Бельчанка** Мікалай Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Блудчы** Павел Андрэевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Буднік** Андрэй Сямёнавіч, медаль «За адвагу»; **Курач** Іван Дзям'янавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Петруненка** Міхаіл Пракопавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Ціцянок** Ілья Каленікавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Шульга** Барыс Міронавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Гарпасёлак Камарын

Верба Яўген Кузьміч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Гардзеенка** Фёдар Дзянісавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Гаўрык** Павел Пятровіч, медаль «За адвагу»; **Гірын** Зяма Якаўлевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені, тры ордэны Чырвонай Зоркі; **Гулідаў** Георгій Канстанцінавіч; **Ефіменка** Сцяпан Сцяпанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Жыраў** Васіль Дзмітрыевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Іваненка** Васіль Кірылавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Каплан** Арон Файвелевіч, ордэн Славы III ступені; **Кірыленка** Пётр Яфімавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Клімянок** Васіль Уладзіміравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Клімянок** Лявон Нікіфаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Кошачкін** Фама Міхайлавіч, два ордэны Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Краўчанка** Васіль Ціханавіч, медаль «За адвагу»; **Літап** Пётр Якаўлевіч, медаль «За адвагу»; **Мацапура** Пётр Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Музыкін** Піліп Мікалаевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Неўмяржыцкі** Іван Апанасавіч, медаль «За адвагу»; **Падгорны** Іван Пятровіч, два медалі «За адвагу»; **Петрусевіч** Гаўрыла Ільіч, медаль «За адвагу»; **Петрусевіч** Іван Цімафеевіч, медаль «За адагу»; **Піліпенка** Міхаіл Іванавіч, ордэны Славы II і III ступеней; **Пінчук** Міхаіл Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Пляскач** Апанас Якаўлевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Прахарэнка** Канстанцін Мікалаевіч, ордэн Славы III ступені; **Рабкова** Валяціна Дзмітрыеўна, медаль «За баявыя заслугі»; **Фатаў** Рыгор Анісімавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Федарэнка** Рыгор Харытонавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Фешчанка** Іван Пятровіч, медаль «За адвагу»; **Фешчанка** Лявон Панцялеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Хмелянок** Сямён Андрэевіч, медаль «За адвагу»; **Царык** Мікалай Кузьміч, медаль «За баявыя заслугі»; **Цімашкоў** Павел Сямёнавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Шам** Максім Іванавіч, ордэн Чырвонага Сцяга; **Шахваранаў** Ісмаіл Мамедавіч, медаль «За адвагу»; **Шпетны** Іван Сямёнавіч, ордэны Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Ятчанка** Васіль Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Ятчанка** Марыя Ільінічна, медаль «За баявыя заслугі»; **Ятчанка** Мікалай Данілавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Карлаўка

Барзілоўскі Сямён Пракопавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Партыка** Міхаіл Васільевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Петрусевіч** Васіль Нікіфаравіч, медаль «За адвагу»; **Петрусевіч** Іван Антонавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Кацічаў

Курач Рыгор Пятровіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Мацапура** Мікалай Мікітавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Кірава

Вашчанка Аляксандр Рыгоравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Герашчанка** Іван Ціханавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Каўбеня** Рыгор Аляксеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Кацяруша** Іван Сямёнавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Леўчанка** Васіль Якаўлевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Леўчанка** Захар Кірылавіч, медаль «За адвагу»; **Леўчанка** Мікалай Лазаравіч, медаль «За адвагу»; **Леўчанка** Мікалай Якаўлевіч, медаль «За адвагу»; **Мельнік** Мікалай Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Мельнік** Сямён Данілавіч, медаль «За адвагу»; **Мяняйла** Іван Максімавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Пузырын** Васіль Сцяпанавіч, медаль «За адвагу»; **Пузырын** Іван Макаравіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Пузырын** Іван Сцяпанавіч, медаль «За адвагу»; **Пузырын** Міхаіл Андрэевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Сіманенка** Іван Аляксеевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Шульга** Мікалай Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Шульга** Фёдар Міронавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Пасека

Ходас Якаў Міхайлавіч, медаль «За баявыя заслугі».

БЫЛЫ КРУКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Жалібор

Цітоў Аляксандр Пятровіч, медаль «За баявыя заслугі».

Вёска Крукі

Амяльчук Іван Карнеевіч, ордэны Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі; **Міроненка** Дзмітрый А., ордэн Славы III ступені; **Навуменка** Міхаіл Пятровіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Самойленка** Антон Сысоевіч, медаль «За адвагу»; **Скіжанок** Апанас Кузьміч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Юдзянок** Іван Пятровіч, ордэны Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі.

Вёска Кулажын

Іваненка Іван Дзям'янавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Іваненка** Іван Ісакавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені.

Вёска Міхалёўка

Гардзеенка Мікалай Раманавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Лабянок** Дзмітрый Міхайлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

КРЫЎЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Аляксееўка

Агароднік Васіль Гардзеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Кіслоў** Рыгор Сідаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Краўчанка** Аркадзь Нікіфаравіч, тры ордэны Айчыннай вайны III ступені; **Краўчанка** Мікалай Кірылавіч, медаль «За адвагу»; **Краўчанка** Нікіфар Нікіфаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Кузьменка** Аляксандр Данілавіч, ордэн Славы III ступені; **Луфераў** Андрэй Сямёнавіч, ордэн Славы III ступені.

Вёска Гарадок

Зайцаў Міна Іванавіч, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені.

Вёска Дуброва

Сіманаў Павел Цімафеевіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені, два ордэны Чырвонай Зоркі.

Група ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны калгаса «XVIII партз'езд» Крыўчанскага сельсавета

Вёска Крыўча

Валасенка Іван Рыгоравіч, два ордэны Чырвонай Зоркі; **Валасенка** Раман Фёдаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Каляда** Архіп Фядосавіч, ордэн Славы III ступені; **Канчар** Міхаіл Пятровіч, медаль «За адвагу»; **Мартыненка** Іван Піліпавіч, ордэн Славы III ступені; **Маручок** Міхаіл Ільіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені; **Прымак** Іван Антонавіч, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені; **Рабчанка** Павел Якаўлевіч, ордэн Славы III ступені; **Сяргеенка** Міхаіл Цярэнцьевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Хамянок** Фёдар Антонавіч, медаль «За адвагу»; **Шубянок** Мікалай Алімпіевіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Славы III ступені.

Вёска Пераносы

Бычок Аляксей Дзям'янавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Дарахавец** Леанід Дзмітрыевіч, ордэн Славы III ступені; **Коршак** Тарас Рыгоравіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Сапоненка** Якаў Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

МАЛАЖЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Бераснёўка

Плюшчай Іван Ісакавіч, медаль «За адвагу»; **Плюшчай** Цімафей Дзянісавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Жылічы

Гуз Уладзімір Сямёнавіч, два ордэны Айчыннай вайны, ордэн Чырвонай Зоркі; **Давыдоўскі** Юрый Сідаравіч, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені; **Назаранка** Дзмітрый Міхайлавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Назаранка** Мікалай Міхайлавіч, медаль «За адвагу»; **Назаранка** Рыгор Сцяпанавіч, ордэн Славы III ступені; **Назаранка** Сцяпан Купрэевіч, медаль «За адвагу».

Вёска Малажын

Бяляк Іван Сямёнавіч, медаль «За адвагу»; **Давыдоўскі** Васіль Піліпавіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Давыдоўскі** Дзмітрый Ісакавіч, ордэн Славы III ступені; **Давыдоўскі** Іван Логвінавіч, ордэн Славы III ступені; **Каробушкін** Рыгор Мікалаевіч, ордэн

Чырвонай Зоркі; **Палявы** Пётр Свірыдавіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Сурабка** Максім Восіпавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Харко** Павел Аляксандравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Янчанка** Аляксей Яфімавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Пасёлак Громкі

Філон Аляксандр Васільевіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Пасёлак Дабрагошча

Пісьменны Павел Рыгоравіч, ордэн Славы III ступені; **Сурабка** Аляксей Восіпавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені, медаль «За баявыя заслугі».

Пасёлак Ленінск

Касьянаў Іван Пятровіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; **Малы** Дзмітрый Аляксандравіч, два ордэны Чырвонай Зоркі, ордэн Славы III ступені, медаль «За баявыя заслугі»; **Прыказчыкаў** Міхаіл Іванавіч, медаль «За адвагу».

Пасёлак Рытаў

Болбас Мікіта Пятровіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Бугаеў** Тарас Іванавіч, ордэны Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі.

МАЛЕЙКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Гарадзішча

Дзенісенка Іван Ігнатавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Жураў** Васіль Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Казачэнка** Павел Іванавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Карпенка** Іван Апанасавіч, медаль «За адвагу»; **Кацуба** Аляксандр Яфімавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Лаўрусенка** Павел Ферапонтавіч, медаль «За адвагу»; **Сіманаў** Якаў Ціма-феевіч, медаль «За адвагу»; **Шчапоўскі** Аляксандр Рыгоравіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Катловіца

Быкаў Павел Андрэевіч, медаль «За адвагу»; **Глазуноў** Пётр Мікітавіч, медаль «За адвагу»; **Жарыкаў** Мікалай Трафімавіч, медаль «За адвагу»; **Ігнаценка** Аляксандр Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Крываножка** Майсей Піліпавіч, медаль «За адвагу»; **Максімчык** Якаў Несцеравіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Рабянок** Мікіта Нікіфаравіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Рак** Іван Аляксеевіч, ордэны Айчыннай вайны I і II ступеней Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Рак** Рыгор Мікалаевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Случак** Фёдар Лазаравіч, медаль «За адвагу».

Вёска Малейкі

Аўраменка Пётр Сяргеевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Бокаш** Якаў Сяргеевіч, ордэн Славы III ступені; **Волкаў** Аляксей Сцяпанавіч, медаль «За адвагу»; **Зубар** Іван Фёдаравіч, медаль «За адвагу»; **Камок** Пётр Фёдаравіч, тры ордэны Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; **Кацуба** Рыгор Канстанцінавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Кацуба** Сямён Трафімавіч, медаль «За адвагу»; **Кацуба** Уладзімір Яфімавіч, медаль «За адвагу»; **Коцур** Іван Карпавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Краўчанка** Аляксандр Іларыёнавіч, медаль «За адвагу»; **Крываножка** Міхаіл Фёдаравіч, медаль «За адвагу»; **Лук'яненка** Данііла Антонавіч, медаль «За адвагу»; **Машкоўскі** Іван Ісаевіч, ордэн Славы II ступені, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

Вёска Новы Макрэц

Беланожка Пётр Елісеевіч, медаль «За адвагу»; **Галавачоў** Іван Барысавіч, медаль «За адвагу»; **Надзілецешы** Уладзімір Савельевіч, медаль «За адвагу»;

Прышчэпаў Ананас Елісеевіч, медаль «За адвагу».

Вёска Петрыцкае

Германенка Мікалай Пятровіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Калеснік** Сцяпан Сцяпанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Лыгач** Васіль Макаравіч, медаль «За адвагу»; **Лыгач** Пётр Максімавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Назаранка** Леанід Лявонцьевіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Новік** Дзмітрый Фёдаравіч, медаль «За адвагу»; **Новік** Фёдар Патапавіч, медаль «За адвагу»; **Патапенка** Антон Пятровіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Патапенка** Васіль Маркавіч, медаль «За адвагу»; **Радчанка** Іван Яўціхіевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Шкурко** Іван Максімавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Шумігай** Рыгор Уласавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Стары Макрэц

Данчанка Аляксандр Сяргеевіч, медаль «За адвагу»; **Ляшчун** Пётр Кірылавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Сцежарнае

Гаўрыленка Раман Міхайлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Сялец

Асядач Павел Якаўлевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Аўдзеенка** Аляксандр Ціханавіч, два медалі «За адвагу»; **Бут** Андрэй Андрэевіч, медаль «За адвагу»; **Бут** Мацвей Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Бут** Сямён Юр'евіч, медаль «За адвагу»; **Гаюн** Аляксандр Іванавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Жураў** Сцяпан Адамавіч, медаль «За адвагу»; **Жураў** Ціт Фёдаравіч, медаль «За адвагу»; **Коцур** Васіль Карпавіч, медаль «За адвагу»; **Коцур** Пётр Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Міронешка** Ігарыён Міхайлавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Мухін** Андрэй Ермалаевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Патапенка** Іван Фядосавіч, медаль «За адвагу»; **Прымак** Аляксандр, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Радчанка** Мікалай Фёдаравіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Юрчанка** Іван Сямёнавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Тэльман

Ганчароў Антон Аўрамавіч, медаль «За адвагу»; **Дубін** Павел Якаўлевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Татарынаў** Уладзімір Васільевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Фурс** Іван Макаравіч, медаль «За адвагу»; **Ходас** Ягор Іванавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Шкурко** Іван Сямёнавіч, медаль «За адвагу»; **Шруб** Гаўрыла Ніканоравіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Шубянок** Ціхан Сідаравіч, два ордэны Айчыннай вайны II ступені; **Шумігай** Іван Ісакавіч, медаль «За адвагу»; **Шумігай** Уладзімір Яфімавіч, медаль «За адвагу».

МІКУЛІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Конанаўшчына

Ганчар Васіль Яфімавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Ганчар** Віктар Канстанцінавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Кузьменка** Уладзімір Данілавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Сачок** Павел Усцінавіч, ордэн Славы III ступені; **Сачок** Пётр Фёдаравіч, ордэн Славы III ступені; **Сырапараў** Мікалай Рыгоравіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Мікулічы

Анціпенка Іван Пятровіч, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені; **Баярчук** Іван Сямёнавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Варанец** Адам Савельевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Галезнік** Антон Аляксандравіч, ордэн Славы III ступені; **Галезнік** Іван Андрэевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Галезнік** Ксенафонт Фёдаравіч, ордэн Славы III

ступені; **Галезнік** Мікалай Фёдаравіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Здаравец** Рыгор Міхайлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Любачка** Іван Пятровіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Любачка** Міхаіл Вячаслававіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Славы III ступені; **Назаранка** Мікалай Аляксеевіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Раманюк** Мікалай Аляксандравіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Рыжык** Леанід Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Смальцар** Мікалай Сяргеевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Смальцар** Нікіфар Восіпавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Шкурко** Міхаіл Данілавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Рыжкаў

Андрэенка Мікалай Васільевіч, ордэн Славы III ступені; **Андрэенка** Рыгор Аляксеевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Мялешка** Антон Фядосавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Прахарэнка** Адам Фёдаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Скарабагаты** Міхаіл Канстанцінавіч, ордэн Славы II і III ступеней.

Былы васёлак Чырвоная Горка

Шумскі Адам Дзмітрыевіч, ордэн Славы III ступені.

НОВАЯЛЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Аляксандраўка

Карпенка Іван Паўлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Бярозкі

Музычэнка Аляксандр Васільевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Петруненка** Цімафей Якаўлевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Пінчук** Аляксей Іванавіч, два ордэны Чырвонага Сцяга, ордэны Суворава, Айчыннай вайны I ступені, два ордэны Чырвонай Зоркі, польскі ордэн «Крыж храбрых»; **Тульжэнка** Сяргей Мікалаевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Шынкарэнка** Іван Карпавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Галубоўка

Вашчанка Васіль Паўлавіч, ордэны Славы III ступені, Чырвонай Зоркі; **Вашчанка** Іван Гаўрылавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Вашчанка** Іван Паўлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Скідан** Сяргей Вікенцьевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені, два ордэны Чырвонай Зоркі.

Вёска Капоранка

Дзяцел Сямён Аляксандравіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені.

Вёска Краснае

Андрэявец Аляксандр Аляксеевіч, ордэны Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, Чырвонай Зоркі; **Ключанкоў** Аляксей Нікіфаравіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Кудзін** Дзмітрый Лукіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Пеўнявец** Павел Аляксандравіч, ордэн Славы III ступені.

Вёска Людзвіноў

Даніленка Міхаіл Кузьміч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Еўчанка** Уладзімір Фядотавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Касцючэнка** Фёдар Маркавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Новая Ёлча

Бельчанка Павел Андрэевіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Вашчанка** Рыгор Гаўрылавіч, два ордэны Чырвонай Зоркі; **Гайдаш** Мікалай Захаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Грышаненка** Рыгор Харытонавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Мартыненка** Феласей Паўлавіч, медаль «За адвагу»; **Стружко**

Мікалай Якаўлевіч, ордэн Славы III ступені; **Шэйн** Лявон Паўлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Старая Ёлча

Брык Іван Апанасавіч, два ордэны Чырвонай Зоркі, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Дзегцярэнка** Андрэй Сямёнавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Мартыненка** Уладзімір І., ордэн Чырвонай Зоркі; **Петруненка** Іван Піліпавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені.

БЫЛЫ ПІРКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Ляды

Васечка Міхаіл Лукіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Гардзеенка** Лявон Мяфодзьевіч, медаль «За адвагу»; **Карташ** Пётр Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Краўчанка** Іван Васільевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; **Рагуцкі** Мікалай Абрамавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; **Рудзянок** Міхаіл Сцяпанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; **Халічэнка** Павел Дзямідавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Піркі

Баранчук Пракоп Емяльянавіч, медаль «За адвагу»; **Варабей** Мікіта Мікалаевіч, медаль «За адвагу»; **Кавальчук** Селівон Яўтухавіч, медаль «За адвагу»; **Маркевіч** Павел Апанасавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Певень** Пётр Дзям'янавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Пугач** Мікалай Мінавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Цярэшчанка** Іван Дзяменцьевіч, медаль «За баявыя заслугі».

Вёска Сувіды

Гайдаш Мікалай Захаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Цярэшчанка** Іван Давыдавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Шапецька** Іван Каленікавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Яўтушэнка** Мяфодзій Ісакавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Чэрнеў

Шубянок Рыгор Давыдавіч, медаль «За адвагу».

БЫЛЫ САВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёскі Двор-Савічы і Савічы

Анапрэенка Іван Цімафеевіч, медаль «За адвагу»; **Анапрэенка** Мітрафан Купрэевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Беразняцкі** Іван Раманавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Беразняцкі** Мікалай Акімавіч, ордэны Чырвонай Зоркі, Славы III ступені; **Беразняцкі** Мікалай Міхайлавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Беразняцкі** Міхаіл Лукіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Беразняцкі** Пётр Міхайлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Беразняцкі** Яўген Усцінавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Бярнацкі** Іван Нікіфаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Бярнацкі** Нікіфар Трафімавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Васіленка** Рыгор Фёдаравіч, ордэн Славы III ступені; **Ветчанка** Міхаіл Іванавіч, ордэны Славы II і III ступеней, медаль «За адвагу»; **Герда** Восіп Міхайлавіч, медаль «За адвагу»; **Герда** Нікіфар Міхайлавіч, медаль «За адвагу»; **Голік** Пётр Каленікавіч, медаль «За адвагу»; **Грэсь** Восіп Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Грэсь** Максім Мікітавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Грэсь** Мікалай Цярэнцьевіч, ордэн Славы III ступені; **Грэсь** Рыгор Данілавіч, медаль «За адвагу»; **Дзмітрычэнка** Іван Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Загаранскі** Фёдар Антонавіч, ордэн Чырвонага Сцяга; **Кірычэнка** Мікалай Іванавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Крывулька** Васіль Копанавіч, два ордэны Чырвонай Зоркі; **Крывулька** Іван Макаравіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За

адвагу»; **Маркелаў** Васіль Васільевіч, медаль «За адвагу»; **Пузырына** Мікалай Лявонавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Санько** Васіль Яфрэмавіч, медаль «За адвагу»; **Сялецкі** Аляксей Майсеевіч, медаль «За адвагу»; **Філіпенка** Сцяпан Іларыёнавіч, медаль «За адвагу»; **Фясько** Фядос Фёдаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; **Хмелянок** Рыгор Максімавіч, ордэн Славы III ступені; **Цалуйка** Мікіта Парфенавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За баявыя заслугі»; **Шапецька** Парфірый Васільевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Шапецька** Рыгор Лявонцьевіч, ордэн Славы III ступені; **Шруб** Іван Андрэевіч, ордэн Славы III ступені; **Шчука** Аляксандр Мікалаевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Шчука** Іван Карнеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Шчука** Яўсей Карнеевіч, медаль «За адвагу»; **Яўтушэнка** Андрэй Дзянісавіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Славы II ступені; **Яўтушэнка** Уладзімір Сцяпанавіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Перасяцінец

Акенчыц Павел Міхайлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі».

БЫЛЫ СЛАБАДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Жзрднае

Анісімаў Віктар Кірылавіч, два ордэны Айчыннай вайны II ступені, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Васіленка** Аўрам Самойлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Ваядзілаў** Майсей Аляксандравіч, два ордэны Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Ганюк** Павел Пятровіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Жураўскі** Кірыла Піліпавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Мацюшаў** Сцяпан Максімавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Нікіценка** Пётр Іванавіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Салаўёў** Міхаіл Еўдакімавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Пучын

Траццяк Кірыла Мікалаевіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

СПЯРЫЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Дублін

Кабанчук Міхаіл Адамавіч, ордэн Славы III ступені.

Вёска Спярыжжа

Ігнаценка Іван Антонавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Кузьменка** Вячаслаў Данілавіч, медаль «За адвагу»; **Мартыненка** Барыс Пятровіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Мартыненка** Павел Мартынавіч, два ордэны Чырвонай Зоркі; **Мартыненка** Рыгор Мікітавіч, ордэн Славы III ступені.

Вёска Старыя Юркавічы

Дзялец Міхаіл Віктаравіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені, два ордэны Чырвонай Зоркі.

Вёска Ясені

Іваненка Мікалай Іванавіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені; **Сакоўскі** Фёдар Паўлавіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені.

ХРАКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Грушнае

Анапрэенка Апанас Сямёнавіч, медаль «За адвагу»; **Анапрэенка** Аркадзь Аляксеевіч, медаль «За адвагу»; **Анапрэенка** Васіль Аркадзевіч, ордэн Славы III ступені; **Анапрэенка** Іван Аркадзевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Анапрэенка** Леанід Арка-

дзевіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Гаўрыленка** Філімон Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Гракун** Міхаіл Сцяпанавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Койдан** Іван Фядосавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Лявоненка** Захар Іларыёнавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Міхаленка** Мікалай Фадзеевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Чыецік** Дзмітрый Сяргеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Шрамянок** Мікалай Ціханавіч, ордэн Славы III ступені; **Шрамянок** Піліп Нікіфаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

Вёска Новая Грэбля

Богуш Андрэй Дзмітрыевіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Дзям'яненка** Міхаіл Эйдзеевіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; **Ефіменка** Міхаіл Сяргеевіч, медаль «За адвагу»; **Капур** Кірыла Яфімавіч, медаль «За адвагу»; **Певень** Алесь Данілавіч, медаль «За адвагу»; **Пінчук** Лявон Міхайлавіч, медаль «За баявыя заслугі».

Вёска Новыя Хракавічы

Булах Іван Іванавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Гронскі** Ціхан Якаўлевіч, медаль «За адвагу»; **Залужны** Трафім Васільевіч, ордэн Славы III ступені; **Лаёк** Якаў Якаўлевіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За баявыя заслугі»; **Масанавец** Аляксандр Давыдавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Новік** Міхаіл Андрэевіч, ордэн Славы III ступені; **Прыходзька** Сямён Тарасавіч, медаль «За адвагу»; **Уласенка** Іван Рыгоравіч, медаль «За баявыя заслугі».

Вёска Просмычы

Гуз Антон Яфімавіч, медаль «За адвагу»; **Ефіменка** Пётр Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Малочка** Кірыла Фёдаравіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Малочка** Міхаіл Арцёмавіч, медаль «За адвагу»; **Малочка** Фёдар Пятровіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Славы III ступені; **Малочка** Фёдар Самойлавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Пінчук** Іван Іларыёнавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Прышчэп** Іван Сцяпанавіч, медаль «За адвагу».

Вёска Старыя Хракавічы

Гуз Іван Трафімавіч, тры медалі «За адвагу»; **Кулеш** Іван Рыгоравіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Прыходзька** Іван Сцяпанавіч, медаль «За адвагу»; **Судаленка** Іван Сцяпанавіч, ордэн Айчыннай вайны II ступені; **Трубянок** Пётр Трафімавіч, ордэн Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Цалуйка** Іван Архіпавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Царанок** Мартын Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Шупан** Андрэй Маркавіч, медаль «За адвагу»; **Шупан** Іван Мінавіч, ордэн Славы III ступені.

Вёска Цалуйкі

Бельчанка Міхаіл Лявонцьевіч, медаль «За адвагу»; **Цалуйка** Іван Андрэевіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі; **Цалуйка** Пётр Кузьміч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Цалуйка** Пётр Сяргеевіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Шубянок** Кірыла Емяльянавіч, медаль «За адвагу».

Пасёлак Калініна

Пінчук Васіль Фёдаравіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Пінчук** Навум Гаўрылавіч, медаль «За баявыя заслугі».

Пасёлак Ленінскі

Гуз Елісей Міхайлавіч, ордэн Славы III ступені; **Садчанка** Мікалай Кірылавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Судак** Ілья Данілавіч, медаль «За адвагу»; **Царанок** Іван Фёдаравіч, ордэн Чырвонай Зоркі.

ЧАМЯРЫСКІ СЕЛЬСАВЕТ

Вёска Чамярысы

Галка Іван Аляксеевіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Галка** Пётр Андрэевіч, медаль «За адвагу»; **Краўчанка** Іван Іванавіч, ордэны Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Краўчанка** Іван Мартынавіч, медаль «За адвагу»; **Краўчанка** Іван Якаўлевіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Краўчанка** Фёдар Міхайлавіч, медаль «За адвагу»; **Кудранок** Дзмітрый Астапавіч, ордэн Айчыннай вайны I ступені; **Кудранок** Іван Іванавіч, медаль «За адвагу»; **Малец** Сцяпан Раманавіч, медаль «За баявыя заслугі»; **Пішчук** Мяфодзій Ільіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Пяхота** Рыгор Давыдавіч, медаль «За адвагу»; **Сініла** Рыгор Мікітавіч, ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу»; **Сапоненка** Мікалай Мікітавіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Сніцарэнка** Аркадзь Сяргеевіч, медаль «За адвагу»; **Сніцарэнка** Рыгор Андрэевіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Сніцарэнка** Савелій Сяргеевіч, медаль «За адвагу»; **Усцінаў** Міхаіл Усцінавіч, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»; **Чэх** Міхаіл Рыгоравіч, ордэн Чырвонай Зоркі, тры медалі «За адвагу»; **Шубянок** Якаў Несцеравіч, ордэн Чырвонай Зоркі; **Яшчанка** Уладзімір Аляксандравіч, два ордэны Чырвонай Зоркі, ордэн Славы III ступені.

Пасёлак Брацкі

Краўчанка Ілья Міхайлавіч, медаль «За адвагу».

Пасёлак Садовы

Краўчанка Аляксандр Акімавіч, два ордэны Чырвонай Зоркі, медаль «За адвагу»; **Пяхота** Кірыла Пятровіч, медаль «За баявыя заслугі».

Абаранялі Маскву

Гацка Аляксандр Рыгоравіч, **Гракун** Міхаіл Сцяпанавіч, **Давыдоўскі** Юрый Сідаравіч, **Данчанка** Аляксандр Сяргеевіч, **Канчар** Міхаіл Пятровіч, **Кацуба** Сямён Трафімавіч, **Лебедзь-Кананок** Пётр Іванавіч, **Лыгач** Васіль Макаравіч, **Малы** Дзмітрый Аляксандравіч, **Назаранка** Міхаіл Аляксеевіч, **Патапенка** Васіль Маркавіч.

Удзельнічалі ў абароне Ленінграда

Бадзісаў Уладзімір Міхайлавіч, **Болбас** Мікіта Пятровіч, **Вашчанка** Іван Гаўрылавіч, **Іваненка** Васіль Пятровіч, **Клімянок** Емяльян Піліпавіч, **Леўчанка** Мікалай Якаўлевіч, **Любачка** Міхаіл Васільевіч, **Лявонаў** Пётр Рыгоравіч, **Мальчанка** Яўген Сямёнавіч, **Маркелаў** Васіль Васільевіч, **Назаранка** Сцяпан Купрэевіч, **Процка** Міхаіл Данілавіч, **Пузырын** Іван Андрэевіч, **Шупан** Макар Пятровіч.

Удзельнічалі ў абароне Кіева

Раманенка Апанас Ануфрыевіч, **Хаменка** Міхаіл Фёдаравіч, **Хмелянок** Іван Андрэевіч.

Удзельнічалі ў абароне Сталінграда

Афон Аляксей Сцяпанавіч, **Бярнацкі** Іван Нікіфаравіч, **Бярнацкі** Нікіфар Трафімавіч, **Гаўрыленка** Пётр Гардзеевіч, **Гракун** Міхаіл Сцяпанавіч, **Міркін** Лейба Эльевіч, **Паўленка** Аляксей Рыгоравіч, **Раманенка** Апанас Ануфрыевіч, **Скіданаў** Пётр Сямёнавіч, **Харко** Сяргей Паўлавіч.

Абаранялі Каўказ

Каробкін Пётр Цярэнцьевіч, **Радчанка** Іван Яўціхіевіч, **Цітоў** Міхаіл Сцяпанавіч.

Абаранялі Савецкае Запаляр'е

Ганчарэнка Яфім Дзмітрыевіч, **Гапоненка** Рыгор Паўлавіч, **Краўчанка** Іван Кошанавіч, **Радчанка** Рыгор Емяльянавіч, **Рудзянок** Васіль Сцяпанавіч.

Вызвалялі Варшаву

Акенчыц Павел Міхайлавіч, **Бабовіч** Міхаіл Іванавіч, **Барысенка** Сяргей Іванавіч, **Буднік** Міхаіл Андрэевіч, **Быкаў** Павел Андрэевіч, **Бычынскі** Сямён Сяргеевіч, **Грэсь** Мікалай Цярэнцьевіч, **Грэсь** Рыгор Данілавіч, **Дворнік** Давыд Цітавіч, **Зянько** Аляксандр Маркавіч, **Кічанок** Самуіл М., **Коваль** Антон Пятровіч, **Корань** Іван Мітрафанавіч, **Кошаль** Андрэй Іванавіч, **Лявоненка** Нейстрат Аркадзевіч, **Нікалаенка** Васіль Аляксандравіч, **Паліенка** Міхаіл Іванавіч, **Паўленка** Аляксей Рыгоравіч, **Паўлючэнка** Уладзімір Піліпавіч, **Певень** Пётр Дзям'янавіч, **Пінчук** Іван Ігнатавіч, **Повад** Мікалай Міхайлавіч, **Пракопенка** Піліп Мікітавіч, **Прыходзька** Павел Данілавіч, **Радчанка** Мікалай Фёдаравіч, **Рак** Лаўрэн Яўменавіч, **Сірэнькоў** Аляксандр Фёдаравіч, **Татарынаў** Андрэй Васільевіч, **Татарынаў** Уладзімір Васільевіч, **Цалуйка** Іван Андрэевіч, **Цярэшчанка** Іван Дзяменцьевіч, **Чарапянка** Пётр Якаўлевіч, **Шашкоў** Іван Паўлавіч, **Шубянок** Кірыла Емяльянавіч, **Шчапоўскі** Аляксандр Рыгоравіч, **Шчука** Іван Карнеевіч.

Удзельнічалі ў вызваленні Будапешта

Буйневіч Міхаіл Адольфавіч, **Жураў** Пётр Фёдаравіч, **Кананок** Максім Віктаравіч, **Касьянаў** Іван Пятровіч, **Кацуба** Філарэт Іванавіч, **Пацега** Фёдар Сяргеевіч.

Удзельнічалі ў штурме Кёнігсберга

ДАВЫДОЎСКІ Васіль Нікіфаравіч, н. у 1928, падарваўся на боепрыпасах.

ДАВЫДОЎСКІ Іван Клімавіч, н. у 1874, загінуў падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

ДАВЫДОЎСКІ Павел Ісакавіч, н. у 1934, падарваўся на боепрыпасах.

ДАВЫДОЎСКІ Фёдар Аляксеевіч, н. у 1906, загінуў падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

ДРОЗД Акуліна Акімаўна, н. у 1891, загінула падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

ДРОЗД Анастасія Маркаўна, н. у 1923, калгасніца, загінула падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

КАЛЯСАН Рыгор Андрэевіч, падарваўся на боепрыпасах.

КАРПЕНКА Дзямід Фёдаравіч, н. у 1930, загінуў падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

КОРАНЬ Васіль Піліпавіч, 12 гадоў, падарваўся на боепрыпасах.

МАЛАЯ Акуліна, н. у 1905, калгасніца, загінула падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

НОВІК Павел Аляксандравіч, н. у 1934, падарваўся на боепрыпасах.

ПАЛЯВАЯ Марфа Іванаўна, н. у 1880, загінула падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

ПЛЮШЧАЙ Васіль Міхайлавіч, 8 гадоў, падарваўся на боепрыпасах.

ПЛЮШЧАЙ Іван Давыдавіч, 8 гадоў, падарваўся на боепрыпасах.

ПЛЮШЧАЙ Рыгор Акімавіч, 13 гадоў, падарваўся на боепрыпасах.

ФІЛОН Уладзімір Арцёмавіч, н. у 1927, падарваўся на боепрыпасах.

ФІЛОН Уладзімір Мікалаевіч, 8 гадоў, падарваўся на боепрыпасах.

ХАРКО Рыгор Сямёнавіч (Антонавіч), н. у 1928, падарваўся на боепрыпасах.

ЧАРНЯНОК Васіль Мікітавіч, н. у 1928, падарваўся на боепрыпасах.

ЧАРНЯНОК Вольга Сцяпанаўна, н. у 1934, загінула падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

ЧАРНЯНОК Уладзімір Ігнатавіч, н. у 1909, загінуў падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

ЧЫЖЫК Анатоль Купрыянавіч, 8 гадоў, падарваўся на боепрыпасах.

ШЧУЧЭНКА Іван Арцёмавіч, падарваўся на боепрыпасах.

ПАСЁЛАК ГРОМКІ

НОВІК Ульяна Арцёмаўна, н. у 1940, загінула падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

ФІЛОН Ніна Давыдаўна, н. у 1935, загінула падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

ФІЛОН Рэма Давыдаўна, н. у 1937, загінула падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

ПАСЁЛАК ЛЕНІНСК

МЕНДЗЕЛЕВА Еўдакія Фёдараўна, н. у 1922, калгасніца, загінула падчас баявых дзеянняў восенню 1943.

МАЛЕЙКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАРЭЧЧА

ПРОТЧАНКА Серафім Аўрамавіч, 14 гадоў, падарваўся на боепрыпасах.

ВЁСКІ НОВЫ І СТАРЫ МАКРЭЦ

КОРХАЎ Аляксей Іванавіч, н. у 1931, падарваўся на боепрыпасах.

ВЁСКА СЦЕЖАРНАЕ

БУЗЬКО Мяфодзій Ісакавіч, 16 гадоў,
БУЗЬКО Пётр Іванавіч, 12 гадоў,
ГАЎРЫЛЕНКА Пётр Пятровіч, 12 гадоў,
ГАЎРЫЛЕНКА Пётр Сямёнавіч, 12 гадоў,
ГЕРМАНЕНКА Дзмітрый, 10 гадоў,
САВЯНОК Георгій Канстанцінавіч, 10 гадоў,
САВЯНОК Дзмітрый Канстанцінавіч, 6 гадоў,
САВЯНОК Іван (Пётр) Канстанцінавіч, 4 гады,
САВЯНОК Рыгор Ахцімонавіч, 10 гадоў, — падарваліся на боепрыпасах.

БЫЛЫ ПІРКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛЯДЫ

КРУПЕЙЧАНКА Рыгор Мікалаевіч, падарваўся на боепрыпасах.
МАРЧАНКА Самуіл Андрэевіч, падарваўся на боепрыпасах.

ВЁСКА СУВІДЫ

ПІЛІПЕНКА Мікалай Міхайлавіч, падарваўся на боепрыпасах.
ПІЛІПЕНКА Рыгор Міхайлавіч, падарваўся на боепрыпасах.

ВЁСКА ЧЭРНЕЎ

ПЕВЕНЬ Васіль Піліпавіч, падарваўся на боепрыпасах.
РУДЗЯНОК Фёдар Канстанцінавіч, падарваўся на боепрыпасах.
ШУБЯНОК Максім Рыгоравіч, падарваўся на боепрыпасах.

БЫЛЫ САВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КУЛАКОВІК

БАБРОЎНІК Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1926, у ліпені 1941 пагнаў калгасную жывёлу на ўсход, далейшы яго лёс невядомы.

ВЁСКА СТАРЫ СЦЕПАНОЎ

КОНЧЫЦ Васіль, н. у 1938, падарваўся на боепрыпасах.

БЫЛЫ СЛАБАДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯРХОВАЯ СЛАБАДА

ВАСІЛЕНКА Арцём Фядотавіч, падарваўся на боепрыпасах.

ВЁСКА ЖЭРДНАЕ

ГУЛЯЙ Аляксандр Піліпавіч, н. у 1926, падарваўся на боепрыпасах.
ГУЛЯЙ Марыя Піліпаўна, н. у 1935, падарвалася на боепрыпасах.
ГУЛЯЙ Юлія Піліпаўна, н. у 1928, падарвалася на боепрыпасах.
ПІЛІПОВІЧ Пелагея Юр'еўна, н. у 1884, калгасніца, падарвалася на боепрыпасах.

ВЁСКА ПУЧЫН

БАЛОБАН Аўдзюха, загінула падчас бамбёжкі.
ГАЎРЫЛЕНКА Міхаіл Івававіч, н. у 1933, загінуў падчас бамбёжкі восенню 1943.
КАШНАРЭНКА Максім Захаравіч, н. у 1903, шавец, загінуў падчас бамбёжкі ў 1943.

СПЯРЫЖСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЯСЯНІ

ДЗЕДЗЕНКА Іван Фядосавіч, н. у 1929, падарваўся на боепрыпасах.
КІСЛОЎ Іван Максімавіч, н. у 1930, падарваўся на боепрыпасах.
ЦЯЦЕРА Пётр Васільевіч, падарваўся на боепрыпасах.

ЧАМЯРЫСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЧАМЯРЫСЫ

ГАЛКА Міхаіл Піменавіч,
ГАЛКА Павел Антонавіч,
ГРЭНЬ Іван Нікіфаравіч, н. у 1930,
КРАЎЧАНКА Рыгор Васільевіч, н. у 1932,
КУДРАНОК Майсей Івававіч,
ПЯХОТА Андрэй Тарасавіч,
ПЯХОТА Вольга Андрэеўна,
ПЯХОТА Рыгор Дзмітрыевіч,
ПЯХОТА Фёдар Іванавіч, н. у 1926, — падарваліся на боепрыпасах.

ПАСЁЛАК САДОВЫ

СІНІЛА Іван Якаўлевіч, н. у 1927, падарваўся на боепрыпасах.

У ПРЫВЕДЗЕНЫХ ВЫШЭЙ СПІСАХ НАЗВЫ ВАЙСКОВЫХ ЧАСЦЕЙ І ВОІНСКІХ ЗВАННЯЎ ДАЮЦЦА Ў НАСТУПНЫХ СКАРАЧЭННЯХ:

абр — артылерыйская брыгада
ад — артылерыйская дывізія
адн — артылерыйскі дывізіён
азенадн — асобны зенітна-артылерыйскі дывізіён
азенап — асобны зенітна-артылерыйскі полк
азптадн (онптадн) — асобны знішчальны процітанкавы артылерыйскі дывізіён (отдельный истребительный противотанковый артиллерийский дивизион)
АМСБ (ОМСБ) — асобны медыка-санітарны батальён (отдельный медико-санитарный батальон)
ап — артылерыйскі полк
асбн — асобны стралковы батальён
асбр — асобная стралковая брыгада
асп (осп) — асобны стралковы полк (отдельный стрелковый полк)
атбр (отбр) — асобная танкавая брыгада (отдельная танковая бригада)
атп — асобны танкавы полк
ашбн — асобны штрафны батальён
ашбр — асобная штрафная брыгада
ашр — асобная штрафная рота
бад — бамбардзіровачная авіяцыйная дывізія
б-н — батальён
бр — брыгада
ВБА (ВСО) — ваеины будаўнічы атрад (военный строительный отряд)
в / ч — вайсковая часць
ВШ — ваенны шпіталь
габр — гаўбічная артылерыйская брыгада
гап — гаўбічны артылерыйскі полк
гв. — гвардзейскі
зап — запасны артылерыйскі полк
зенап — зенітна-артылерыйскі полк
зптабр — знішчальная процітанкавая артылерыйская брыгада
зптап (иптап) — знішчальны процітанкавы артылерыйскі полк (истребительный противотанковый артиллерийский полк)
ісбн (исбн) — інжынерна-сапёрны батальён
ісбр (исбр) — інжынерна-сапёрная брыгада
іШ (ИГ) — інфекцыйны шпіталь (инфекционный госпиталь)
кбр — кавалерыйская брыгада
кд — кавалерыйская дывізія
кк — кавалерыйскі корпус
кп — кавалерыйскі полк
лейт. — лейтэнант
мал. (мл.) — малодшы
мехбр — механізаваная брыгада
мехд — механізаваная дывізія
мехк — механізаваны корпус
мсбн — мотастралковы батальён
мінбн — мінамётны батальён
мінд — мінамётная дывізія
мінп (минп) — мінамётны полк
мінр (минр) — мінамётная рота
мсбн — мотастралковы батальён
мсбр — мотастралковая брыгада
мсд — мотастралковая дывізія
мсп — мотастралковы полк
МЭП — медыка-эвакуацыйны пункт
пап — пушачна-артылерыйскі полк
пдбр — паветрана-дэсантная брыгада
пдд (вдд) — паветрана-дэсантная дывізія (воздушно-десантная дивизия)
пдк — паветрана-дэсантны корпус
пдп — паветрана-дэсантны полк
ПНАС (ВНОС) — падраздзяленне паветранага назірання, абвяшчэння і сувязі (подразделение воздушного наблюдения, оповещения и связи)
п / п — палявая пошта
ППА (ПВО) — процівапаветраная абарона (противовоздушная оборона)
ППС — палявая паштовая станцыя
ППШ (ППГ) — палявы перасоўны шпіталь (полевой подвижной госпиталь)
п / с — паштовая станцыя
п / ск — паштовая скрыня
ПТР — процітанкавае ружжо
ПХШ — палявы хірургічны шпіталь
ПЭП — палявы эвакуацыйны пункт
рад. (ряд.) — радавы
РГК — рэзерв Галоўнага Камандавання
сбн — стралковы батальён
сбр — стралковая брыгада
сд — стралковая дывізія
ск — стралковы корпус
сп — стралковы полк
ср — стралковая рота
ст. — старшы
СЭШ (СЭГ) — санітарна-эвакуацыйны шпіталь (санитарно-эвакуационный госпиталь)
сярж. (серж.) — сяржант
тбн — танкавы батальён
тбр — танкавая брыгада
тп — танкавы полк
ТПС — тэлеграфна-паштовая станцыя
тр — танкавая рота
УВПБ (УВПС) — управленне ваенна-палявога будаўніцтва (управление военно-полевого строительства)
ХППШ — хірургічны палявы перасоўны шпіталь
ЧБФ (КБФ) — Чырванасцяжны Балтыйскі флот (Краснознаменный Балтийский флот)
ШЛП (ГЛР) — шпіталь легкараненых (госпиталь легкораненых)
шр — штрафная рота
ЭШ (ЭГ) — эвакуацыйны шпіталь (эвакуационный госпиталь)
яфр. (ефр.) — яфрэйтар

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

З РУІН І ПАПЯЛІШЧАЎ

Час аднаўлення

Як ужо было сказана вышэй, аднаўленне разбуранай вайною гаспадаркі пачалося ў Брагінскім раёне адразу пасля яго вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аднак поўнасцю пераключыцца на мірнае будаўніцтва працоўныя раёна змаглі толькі тады, калі прыйшла доўгачаканая Перамога. А падымаць з папялішчаў і руін, аднаўляць і будаваць нанава трэба было вельмі многае. Так, у заняпадзе заставалася яшчэ сельская гаспадарка раёна.

У першыя пасляваенныя гады ўраджайнасць асноўных сельскагаспадарчых культур у раёне была нізкай: збожжавых — 6 ц, бульбы — 70 ц з гектара. Валавы збор збожжавых не перавышаў 10 тысяч тон. Калгасы і саўгасы атрымлівалі да 1200 тон мяса і 2500 тон малака за год. Вытворчасць малака ў разліку на 100 гектараў сельгасугоддзяў складала 100 ц, мяса — 15 ц.

У далейшым дзяржава аказвала вялікую дапамогу калгасам і саўгасам. Лютаўскі (1947) Пленум ЦК ВКП(б) прызнаў неабходным значна павялічыць выпуск трактароў і іншых сельгасмашын. Гэтае рашэнне паспяхова ажыццяўлялася. Толькі за 1947—1948 гг. Брагінскі і Камарынскі раёны атрымалі 29 гусенічных трактароў і 27 камбайнаў, дзесяткі грузавых аўтамабіляў, трактарных сеялак і г. д. Да канца чацвёртай пяцігодкі (1946—1950) магутнасць трактарнага парка ў МТС і саўгасах абодвух раёнаў перавысіла даваенны ўзровень на 26 працэнтаў.

Як вялікай важнасці падзея адзначалася тады кожнае ўступленне ў строй дзеючых таго ці іншага аб'екта. Аб дасягненнях народнагаспадарчай вытворчасці і яе перадавікоў з радасцю і гонарам паведамлялі раённыя газеты «Трыбуна калгасніка» і «За Радзіму» (рэдактары П. І. Купрэенка, У. І. Ельніцкі).

Знамянальнай падзеяй 1947 г. у жыцці хлебаробаў калгаса «Чырвоная ніва» і ўсяго раёна з'явілася прысваенне звеннявой Т. І. Шкурко звання Героя Сацыялістычнай Працы. Рэспубліканская газета «Сталинская молодежь» у нумары ад 31 снежня 1947 г. змясціла фотаздымак звеннявой з наступным подпісам: «На всю республику прогремела слава о знатной звеньевой из полесского колхоза «Чырвоная ніва» Тамаре Шкурко. Это она, руководя комсомольско-молодежным звеном, в этом году добилась замечательных урожаев — 30 центнеров ржи, 16 центнеров пшеницы, 37 центнеров махорки и 280 центнеров картофеля с гектара...»

У далейшым самаадданая праца камсамолкі была адзначана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

У 1947 г. Брагінскі раён дасягнуў даваеннай ураджайнасці з перавышэннем плана асваення даваенных пло-

шчаў, занятых асноўнымі сельгаскультурамі. У цэлым жа яны былі асвоены толькі ў 1949 г. Дарэчы, раён першым у тым жа годзе выйшаў на даваенны ўзровень па пасяўных плошчах і быў узнагароджаны за гэта пераходным Чырвоным сцягам Савета Міністраў Беларускай ССР і ЦК КП(б)Б.

Адчувальнай падтрымкай калгасам з'явілася спісанне з іх у 1948 г. запазычанасці за матэрыяльную дапамогу, аказаную дзяржавай у 1944—1945 гг.

У ліпені 1949 г. ЦК КП(б)Б прыняў разгорнутую пастанову «Аб масава-палітычнай і культурна-асветнай рабоце ў Брагінскім раёне Палескай вобласці». У ёй, у прыватнасці, адзначалася: «Партыйная арганізацыя раёна з першых жа дзён пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны ўзняла калгаснікаў на барацьбу за хутчэйшае аднаўленне калгасаў. Ужо ў 1947 годзе... быў перавыкананы план ураджайнасці па ўсіх культурах. Яшчэ больш паспяхова быў завершаны 1948 сельскагаспадарчы год. Уборка ўраджаю прайшла больш арганізавана. Раён датэрмінова выканаў план паставак сельгаспрадуктаў дзяржаве. Былі дасягнуты значныя поспехі ў аднаўленні і развіцці грамадскай жывёлагадоўлі».

Канец першага пасляваеннага пяцігоддзя для працоўных Брагіншчыны і Камарыншчыны з'явіўся падсумоўваючым рубяжом напружанай працы па аднаўленні народнагаспадарчай і сацыяльна-культурнай сфер іх жыццядзейнасці. Нарошчвалі тэмпы вытворчасці прадпрыемствы мясцовай прамысловасці і гандлю, функцыяніравалі ўстановы культуры, аховы здароўя і інш. За 1945—1949 гг. у абодвух раёнах з дапамогай дзяржавы і за ўласныя сродкі было пабудавана або адноўлена каля 5 тысяч дамоў грамадзян.

У тыя гады шырокую вядомасць у раёнах набылі імёны перадавых працаўнікоў — звеннявых калгаса «Ленінскі шлях» Ефрасінні Касцючэнка, кавалля Брагінскай МТС Паўла Садчанкі, токара Камарынскай МТС Якава Барзмана, камбайнераў Мікалая Зеленюка і Софіі Федарэнка, трактарыстаў Міхаіла Процкі, Дзяміда Сердзюка, свінаркі калгаса «Пераможнік» Марыі Карпук, жывёлавода калгаса «Рухавік рэвалюцыі» Паўла Куліка і іншых. Дарэчы, на XV з'ездзе камсамола рэспублікі першая на Брагіншчыне Герой Сацыялістычнай Працы Т. І. Шкурко была абрана ў склад Цэнтральнага Камітэта ЛКСМБ, а на выбарах у Вярхоўны Савет рэспублікі 3-га склікання атрымала мандат дэпутата вышэйшага органа ўлады Беларускай ССР. Тады ж камсамолка С. Р. Федарэнка стала дэпутатам Палескага абласнога Савета дэпутатаў працоўных.

І. Ф. Ганжураў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

З РАШЭННЯ ВЫКАНКАМА БРАГІНСКАГА РАЙСАВЕТА АБ АХОВЕ І АДНАЎЛЕННІ ГІСТАРЫЧНЫХ ПОМНІКАЎ І ЎВЕКАВЕЧАННІ ЗНАМЯНАЛЬНЫХ МЕСЦАЎ, ЗВЯЗАНЫХ З ВЫЗВАЛЕННЕМ БРАГІНСКАГА РАЁНА АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ

27 лютага 1946 г.

...Разработать эскизы оформления могил погибших героев гражданской и Великой Отечественной войны.

Учесть все места знаменательных событий, связанных с исторической борьбой советского народа на Полесье в дни Отечественной войны: места крупных боев, участие в них воинских и партизанских соединений; нахождение штабов, фронтов, армий, партизанских бригад; места массовых расстрелов и захоронений советских людей; сохранившиеся землянки и другие сооружения, в которых находились армейские, партизанские штабы, предупредить их разрушение и огородить их...

Філіял дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці у г. Рэчыцы. Ф. 214. Воп. 1. Спр. 16. Л. 125—126.

ЗА ГАЗЕТНЫМ РАДКОМ

Па старонках брагінскай раённай газеты «Трыбуна калгасніка»

Уручэнне ўзнагароды

17 верасня 1946 г.

Увечары 14 верасня ва ўрачыстай абстаноўцы калгасу імя Тэльмана ў прысутнасці членаў сельгасарцелі ўручаны пераходны Чырвоны сцяг Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б. Сцяг уручыў прадстаўнік Міністэрства земляробства т. Галенчык.

Пераходны Чырвоны сцяг уручан за поўнае аднаўленне даваеннай пасяўной плошчы, за ўзорнае правядзенне веснавой сяўбы, з перавыкананнем плошчы, за добры догляд і ўтрыманне пасеваў.

Электрычнасць у Брагіне

7 лістапада 1949 г.

Работнікі Брагінскага райпрамкамбіната аднавілі электрастанцыю. У гонар 32-й гадавіны Кастрычніка адбыўся пуск новай электрастанцыі. Электрычнае святло дадзена ў цэнтр гарадскога пасёлка. Ім будуць асветлены ўстановы і дамы жыхароў Брагіна.

Адкрыццё помніка

5 ліпеня 1951 г.

У цэнтры гарадскога пасёлка Брагін адбылося ўрачыстае адкрыццё помніка воінам Чырвонай Арміі, загінуўшым пры вызваленні Брагінскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 22—23 лістапада 1943 года. Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел каля тысячы працоўных пасёлка.

Калгасы — мільянеры

10 студзеня 1953 г.

Добра папрацавалі ў 1952 годзе хлебаробы сельгасарцелі «Шлях да камунізма». Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых у гэтым калгасе склала 17 цэнтнераў з гектара, а на асобных участках дасягнула 20—27 цэнтнераў. Грашовы даход калгаса ў мінулым годзе склаў 1100 тысяч рублёў.

Мільянерам стала і сельгасарцель імя Тэльмана Малейкаўскага сельсавета.

Т. Сідарэнка

З табару — у калгас

15 лютага 1957 г.

Сем'і цыганоў Мікалая Баранога і Міхаіла Федаровіча скончылі з вандроўным жыццём і ўступілі ў калгас «Чырвоны Кастрычнік». Тут яны атрымалі кватэры і працу па душы. М. Федаровіч працуе на свінагадоўчай ферме. За два месяцы ён выпрацаваў 64 працадні.

М. Біран

Рэкорд звяна Л. Бельскай

16 верасня 1958 г.

Звяно Любы Бельскай з саўгаса «Савічы» ўстанавіла сёлета раённы рэкорд па атрыманню зялёнай масы кукурузы — сабрала яе па 1760 цэнтнераў з гектара на 11-гектарнай плошчы. Узровень ураджайнасці вызначыла аўтарытэтная камісія.

Па 1103 цэнтнеры зялёнай масы кукурузы атрымала звяно Ганны Крот з калгаса «Ленінец» Спярыжскага сельсавета.

Адзначаны па заслугах

15 чэрвеня 1960 г.

Загадчык Астраглядаўскага сельскага клуба Каваленка Іван Андрэевіч за актыўны ўдзел і поспехі ў развіцці мастацкай самадзейнасці ўзнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Па старонках камарынскай раённай газеты «За Радзіму»

Павіншавалі звеннявую

8 студзеня 1949 г.

У 1948 годзе звяно Ліхашапка Кацярыны Адамаўны з калгаса «Ленінскі шлях» атрымала з кожнага гектара па 2502 пуды бульбы і па 17,6 цэнтнера зерня азімага жыта. У сувязі з 30-годдзем Беларускай ССР і дасягнутымі поспехамі ў працы звеннявая ўзнагароджана ордэнам Леніна.

3 студзеня 1949 года ў Чыкалавіцкай хаце-чытальні адбыўся мітынг з выпадку ўзнагароджання Ліхашапка К. А. ордэнам Леніна. Павіншаваць прыбылі сакратар РК КП(б)Б Кавалёнак Ф. П., сакратар РК ЛКСМБ Мельнік І. Я., калгаснікі.

Лепшае звяно калгаса

30 кастрычніка 1949 г.

Высокага ўраджаю канапель-семя дабілася селета звяно Антаніны Мішчанка з калгаса «Чырвоная Украіна». Кожны з двух гектараў даў па 8,04 цэнтнера семя. Такога ўраджаю ў калгасе яшчэ ніколі не было.

Зжынаюць па 0,43 гектара

16 ліпеня 1950 г.

Дружна і арганізавана вядуць хлебазборку калгаснікі шостай паляводчай брыгады калгаса імя Леніна, брыгадзірам якой з'яўляецца Майсей Мікалаевіч Маскаленка.

Многія калгасніцы дзякуючы ўшчыльненню працоўнага дня і сацыялістычнаму спаборніцтву дабіваюцца выдатных поспехаў. На ўвесь калгас пайшла слава аб жнеях брыгады Еве Лабянок і Марыі Бабранок. Кожная з іх, спаборнічаючы паміж сабой, зжынае па 0,43 гектара жыта пры норме 0,18 гектара. Такой выпрацоўкі не толькі ў брыгадзе, але і ў калгасе ніхто яшчэ не даваў.

Прыкладу лепшых жней следуюць многія іншыя калгасніцы. Так, падростак 13-гадовая Галя Бабранок зжынае па 0,18 гектара, Марыя Яфімаўна Лабянок — 0,36 га, Ольга Фёлараўна Сяміход — 0,37 га.

Д. Лабянок,
старшыня Крукаўскага сельсавета

Перадавікі збору кок-сагызу

26 жніўня 1951 г.

У калгасе «Ленінскі шлях» у поўным разгары збор насення кок-сагызу. Прыклад у гэтай рабоце паказваюць звеняявыя. Так, напрыклад, звеняявая Марыя Штылеўская сабрала і здала на склад 6 кілаграмаў сухога насення. 5 кілаграмаў 750 грамаў сухога насення здала на склад звеняявая Марыя Удод. Звяно Марыі Каляда сабрала і здало 25 кг сухога насення.

В. Васільеў

Гастролі Бярдзічаўскага тэатра

5 жніўня 1952 г.

У Камарыне праходзяць гастролі Бярдзічаўскага драматычнага тэатра Украінскай ССР...

За час знаходжання ў Камарыне прыезджыя артысты аказалі дапамогу ў наладжванні работы гуртка мастацкай самадзейнасці раённага Дома культуры.

Ёсць 700 гектараў

16 кастрычніка 1955 г.

Камбайнер МТС Мікалай Федасенка паспяхова выканаў узятае напярэдадні жніва сацыялістычнае абавязацельства: у абслугоўваемых ім калгасах ён убраў 700 гектараў збожжавых і крупяных культур.

С. Петрусевіч

На Сусветны фестываль

27 ліпеня 1957 г.

У Маскву, на Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў, выехала група юнакоў і дзяўчат раёна. Сярод паехаўшых і лепшая даярка сельгасарцелі «Чырвоная Украіна» Анастасія Мацапура, калгасніца сельгасарцелі імя Горкага Марыя Плявака, сакратар пярвічнай камсамольскай арганізацыі машынна-трактарнай станцыі Павел Гардзеенка і інш.

Каваль — ветэран

11 красавіка 1958 г.

17 гадоў запар Андрэй Сямёнавіч Глушкоўскі стаяў ля кавальскага горна на Пуцілаўскім заводзе ў Ленінградзе. У 1929 годзе ён пераехаў у Ніжнія Жары і пасля арганізацыі тут калгаса «Ніжні дняпровец» 30 гадоў працуе ў ім кавалём.

Ф. Пузырына

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

Дзесяцігоддзі — прыступкі росту

Пасляваеннае гаспадарчае будаўніцтва, развіццё сацыяльнай сферы Брагінскага раёна на працягу дзесяцігоддзяў былі абумоўлены характарам тых грамадска-палітычных і эканамічных працэсаў, што адбываліся ў маштабе ўсёй краіны — Савецкага Саюза.

Аб тым, як развівалася сельская гаспадарка раёна, яго прамысловасць, народная адукацыя, медыцына, культура, падрабязна расказваецца ў матэрыялах, што змяшчаюцца ніжэй.

Сельская гаспадарка

У 50-я гг. былі ажыццёўлены важныя меры па канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці — адбылося ўзбуйненне калгасаў. Некаторыя эканамічна слабыя калгасы былі пераўтворапы ў саўгасы. Калі ў 1949 г. у Брагінскім і Камарынскім раёнах налічвалася 132 гаспадаркі, то ў 1953 г. іх стала 47.

Нягледзячы на самаадданую працу вяскоўцаў і дасягнутыя істотныя вынікі ў пасляваенныя гады, сельская гаспадарка на Брагіншчыне і Камарыншчыне

Чырвоны абоз са збожжам з калгаса імя Тэльмана

ў далейшым развівалася марудней, чым прамысловасць. Хоць да 1950 г. у абодвух раёнах удалося аднавіць пасяўныя плошчы ў даваенных памерах, ураджайнасць асноўных сельгаскультур заставалася нізкай. Не ўсе гаспадаркі спраўляліся з планамі збожжанарыхтовак. Больш таго, ім часам даводзілася нават браць у дзяржавы насенную пазыку. Незайздросным заставалася становішча ў жывёлагадоўлі. Нават да 1953 г. не быў дасягнуты даваенны ўзровень па пагалоўі ўсіх відаў жывёлы. А колькасць кароў у гэты час нават змяншалася. Па прычыне парушэння прынцыпу матэрыяльнай зацікаўленасці пачалі зніжацца вытворчая актыўнасць і працоўная дысцыпліна калгаснікаў і рабочых саўгасаў.

Пытанні стану і далейшага развіцця сельскай гаспадаркі абмеркаваў вераснёўскі (1953) Пленум ЦК ВКП(б). Важным аграрна-палітычным яго рашэннем з'явілася адмена падаткаў, спісанне даўгоў з калгасаў, накіраванне ў галіну вялікіх фінансавых і матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў.

Другім важным фактарам з'явілася тое, што як раённае сельскагаспадарчае звяно, так і калгасы, саўгасы папоўніліся кадрамі. Колькасць дыпламаваных аграномаў павялічылася ўдвая, заатэхнікаў — на 20 працэнтаў, інжынераў і тэхнікаў — у два разы.

Прыкметна палепшыўся якасны склад кіраўнікоў у гаспадарках. Шырокую вядомасць, заслужаную павагу і аўтарытэт старанай працай заваявалі ў тыя гады старшыні калгасаў І. Л. Сабаленка («Шлях да камунізму»), В. І. Казачэнка (імя Тэльмана), М. М. Пянькоў (імя Фрунзе), М. П. Чаравач («Парыжская камуна»), М. Л. Бяршацкі («Чырвоная Украіна») і іншыя калгасныя важакі. Якасныя змены адбыліся і ў складзе кадраў сярэдняга звяна, масавых прафесій. Ужо на пачатку 50-х гг. у агульнай колькасці працаздольных калгаснікаў механізатары складалі 10 працэнтаў.

Захады па выпраўленні становішча ў сельскай гаспадарцы далі станоўчыя вынікі. Гэта добра прасочвалася і ў паказчыках работы працаўнікоў вёсак Брагінскага і Камарынскага раёнаў. Узрос узровень механізацыі сельскагаспадарчай працы. Ворыва глебы было механізавана на 90, сяўба збожжавых — на 95 працэнтаў. Нямала чаго рабілася па механізацыі працаёмкіх працэсаў у жывёлагадоўлі. Да 1958 г. электраэнергію атрымалі 35 працэнтаў калгасаў і 38 працэнтаў вясковых двароў. Усё гэта станоўча адбілася на выніках вытворча-фінансавай дзейнасці гаспадарак.

За дасягнутыя поспехі ў рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве жывёлаводаў малочнатаварных ферм у зімова-стойлавы перыяд 1956—1957 гг. пераможцам быў прызнаны Камарынскі раён, а Брагінскі — па вытворчасці мя-

Першы сакратар Брагінскага РК КПБ К. Х. Дагура (справа) і старшыня калгаса імя Тэльмана В. І. Казачэнка. 1950-я гг.

са ў першым квартале 1958 г. Абодва раёны былі адзначаны пераходнымі Чырвонымі сцягамі ЦК КПБ і Савета Міністраў Беларускай ССР. У тым жа, 1958 г., упершыню на Брагіншчыне пераадолелі рубеж у 3,5 тысячы кг па надоі малака ад каровы даяркі саўгаса «Астрагляды» Н. Ф. Чарняўская — 3863 кг і А. В. Карась — 3616 кг. Больш чым па 3000 кг малака ад кожнай каровы сваіх груп атрымалі даяркі саўгасаў «Астрагляды» Т. Е. Данчанка, «Савічы» — Е. А. Гулай, калгаса імя Фрунзе — М. С. Галка.

За высокія паказчыкі ў жывёлагадоўлі, а таксама за атрыманне багатых ураджаяў сельгаскультур у 1956 і 1957 гг. дыпломам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі быў адзначаны калгас «Шлях да камунізму», а яго старшыня І. Л. Сабаленка Ганаровай граматай Галоўнага камітэта УСГВ.

Аб умацаванні калгасаў і саўгасаў у гэты перыяд сведчаць наступныя прыклады. Так, калі ў 1954 г. агульны грашовы даход 29 гаспадарак адпаго Брагінскага раёна складаў 12 млн. руб. і было толькі 2 калгасы-мільянеры, то ў 1958 г. гэтыя паказчыкі адпаведна складалі 35,2 млн. і 17 гаспадарак-мільянераў. У ліку іх калгасы «Шлях да камунізму», імя Тэльмана, «Рассвет» і іншыя.

Узмацнілася і матэрыяльнае стымуляванне сельскіх працаўнікоў. Грашовая аплата працадня ў 1958 г. павялічылася ў 2,5 раза, выдача збожжа на працадні ўзрасла ледзь не ў 3 разы. У калгасах-мільянерах, напрыклад, выдавалі на працадзень ад 1 да 8 рублёў.

З даўніх часоў на Брагіншчыне лічылі выгаднай справай вырошчванне льну і канапель. Гэтыя культуры традыцыйна займалі належнае месца ў структуры пасяўных плошчаў і ў пасляваенныя гады. Асобныя гаспадаркі, як, напрыклад, калгасы «Шлях да камунізму», «Чырвоная ніва», імя Калініна і іншыя, мелі багаты вопыт вырошчвання высокіх ураджаяў «паўночнага шоўку». Таму ў вялікай групе перадавікоў рэспублікі, адзначаных па выніках 1954 г. за дасягнутыя поспехі ў развіцці льнаводства і канапляводства, было і трое прадстаўнікоў Брагінскага раёна. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР была адзначана праца старшынь калгасаў «Шлях да камунізму» і «Чырвоная ніва» І. Л. Сабаленкі і М. К. Юрчанкі, у якіх адпаведна было сабрана па 4,2 ц ільновалакна, 4,5—5 ц ільнасемя з кожнага гектара. Граматай

Вярхоўнага Савета БССР былі адзначаны брыгадзіры названых гаспадарак В. А. Паўлючэнка і П. Д. Шкурко, а таксама звеннявая-ільнаводка С. Ф. Шкурко з калгаса «Чырвоная ніва».

На працягу 1954—1957 гг. у абодвух раёнах павялічыліся ўраджайнасць і валавыя зборы сельгаскультур. Дзякуючы ўмацаванню кармавой базы для грамадскага статка, павышэнню закупачных цэн на мяса, малако, яйкі і іншыя прадукты жывёлагадоўлі павысілася вынікоўасць работы галіны ў цэлым. Дастаткова сказаць, што к 1958 г. нарыхтоўкі малака ў раёнах павялічыліся ў 2,1 і мяса — у 2,5 раза ў параўнанні з 1953 г.

Павысіліся даходы калгаснікаў ад асабістых падсобных гаспадарак. Усё гэта прадвызначала далейшае павышэнне жыццёвага ўзроўню хлебаробаў. Шырокі размах набыло індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. Сельскія працаўнікі пачалі набываць не толькі тавары паўсядзённага попыту, але і (патагачаснаму) такія прадметы раскошы, як матацыклы, тэлевізары, пральныя машыны і г. д.

Своеасаблівым аглядам дасягненняў і школай перадавога вопыту з'яўлялася Усесаюзная сельскагаспадарчая выстаўка. У 1954 г. яе ўдзельнікамі-экспанентамі з'яўляліся калгасы імя Тэльмана, «Шлях да камунізму», «Чырвоны араты» і саўгас «Астрагляды». Дарэчы, калгас імя Тэльмана даволі часта дэманстраваў свае вытворчыя дасягненні ў Маскве, рэспубліцы і вобласці. Забягаючы наперад, скажам, што ў 1957 г. на яго рахунку было 12 дыпломаў і ганаровых пасведчанняў усесаюзнай, рэспубліканскай і абласной выставак.

У 1956—1957 гг. за поспехі ў павышэнні ўраджайнасці і прадуктыўнасці жывёлы 127 перадавікоў Брагінскага і Камарынскага раёнаў былі ўзнагароджаны залатымі, сярэбранымі і бронзавымі медалямі галоўнай выстаўкі СССР.

У ліку новых і, як аказалася, даволі перспектыўных кармавых сельгаскультур напрыканцы 50-х гг. у гаспадарках з'явілася кукуруза. Хоць укараненне яе напачатку ішло і не без цяжкасцей. Высокімі ўраджаямі славіліся калгасы імя Тэльмана, «Чырвоны Кастрычнік», саўгас «Савічы» і іншыя. Сапраўднымі майстрамі вырошчвання гэтай культуры былі звеннявыя Марыя Коцур, Софія Коваль, Ніна Карпенка з калгасаў імя Тэльмана, «Ленінец», імя Чкалава, якія збіралі ў 1956—1958 гг. па 900—

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР В. І. Казлоў (у цэнтры) сярод калгаснікаў калгаса імя Тэльмана

1100 ц зялёнай масы і па 35—50 ц пачаткаў кукурузы з гектара. Высокай ацэнкай працоўнай самаадданасці кукурузаводаў з'явілася ўзнагароджанне звяна М. П. Коцур пераходным Чырвоным сцягам ЦК ЛКСМБ і Міністэрства сельскай гаспадаркі рэспублікі, а звеннявой — Ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ. У 1959 г. 28 перадавых кукурузаводаў раёна былі адзначаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Напружаная праца калгаснікаў і рабочых абодвух раёнаў у перыяд сямігодкі (1959—1965) была скіравана на далейшы ўздым усіх галін сельгасвытворчасці. Вырашэнне гэтай задачы не ў апошнюю чаргу ажыццяўлялася праз рэалізацыю кадравай палітыкі. У выніку вылучэння найбольш вопытных і здатных спецыялістаў на пасады кіраўнікоў колькасць старшынь калгасаў з вышэйшай сельскагаспадарчай адукацыяй узрасла з 45 да 79 працэнтаў. Прымаліся меры па ўмацаванні сярэдняга звяна кіраўнікоў — брыгадзіраў калгасаў, кіраўнікоў аддзяленняў саўгасаў, загадчыкаў ферм.

З кожным годам узрастала прымяненне электраэнергіі ў сельскагаспадарчай вытворчасці. У 1959 г. усе саўгасы, а ў канцы сямігодкі — усе калгасы Брагіншчыны і Камарыншчыны былі поўнасцю электрыфікаваны. За 1958—1965 гг. колькасць атрыманай гаспадаркамі электраэнергіі павялічылася ў 4,2 раза.

Працягвалася ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы калгасаў і саўгасаў. Чарговым важным аграрнапалітычным мерапрыемствам, ажыццёўленым у краіне ў 1958 г., з'явілася рэарганізацыя МТС у рамонтна-тэхнічныя станцыі, калі ўся тэхніка перайшла ў рукі гаспадарак. Аднак непрадуманасць і паспешлівасць у правядзенні гэтай буйной сацыяльна-эканамічнай акцыі па цэлым шэрагу накірункаў не прынесла жаданага выніку. Па-першае, выдаткаванне вялікіх сродкаў на набыццё тэхнікі паставіла пераважную большасць гаспадарак абодвух раёнаў у складанае фінансавае становішча. Па-другое, не маючы неабходнай рамонтнай базы, калгасы не маглі забяспечыць належнай якасці аднаўлення тэхнікі і складаных прычапных машын. І ўсё ж кіраўнікі і спецыялісты, кадры сярэдняга звяна і масавых прафесій супрацьпаставілі гэтым і іншым цяжкасцям імкненне і ўменне працаваць у адпаведнасці з патрабаваннямі часу, творчы пошук, актыўнае асваенне дасягненняў сельскагаспадарчай навукі і перадавой практыкі. Заканамерным вынікам усяго гэтага з'явілася павышэнне эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. Толькі за перыяд з 1959 да 1961 г. валавы збор збожжавых узрос больш чым на 50 працэнтаў у параўнанні з усёй папярэдняй пяцігодкай. На 29 працэнтаў павялічылася вытворчасць мяса, на 27 — малака і на 60 працэнтаў — яек.

У 1962 г. на базе Брагінскага, Камарынскага і Хойніцкага раёнаў было створана Хойніцкае тэрытарыяльна-вытворчае калгасна-саўгаснае ўпраўленне, але праіснавала яно толькі да кастрычніцкага (1964) Пленума ЦК КПСС, на якім такі падыход да перабудовы кіравання сельскай гаспадаркай быў прызнаны памылковым і былі прыняты дзейсныя меры па выпраўленні становішча.

Істотныя змены да лепшага адбыліся ў сельскагаспадарчай вытворчасці Брагіншчыны, як і ў цэлым усёй краіны, пасля сакавіцкага (1965) Пленума ЦК КПСС, які прыняў важныя рашэнні па далейшым арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў і саўгасаў, узмацненні матэрыяльных і маральных стымулаў для работнікаў сельскай гаспадаркі. У 1966 г. была ўведзена гарантаваная аплата працы ў калгасах.

Аб тым, што ў раёнах меліся патэнцыяльныя магчымасці для значна вышэйшых паказчыкаў у галіне земляробства, сведчылі вытворчыя набыткі шэрагу перадавых гаспадарак. Так, больш чым па 20 ц збожжавых з гектара збіралі хлебаробы калгасаў «Шлях да камунізму» і «Чырвоная ніва», па 120—140 ц буль-

бы мелі таксама з кожнай адзінкі зямельнай плошчы саўгас «Брагінскі» Слабадскога сельсавета і калгас «Запаветы Леніна». Па выніках работы ў 1965 г. калгас «Чырвоная ніва» дэманстраваў свае дасягненні ў галіне паляводства на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. У гаспадарцы было сабрана з кожнага гектара па 21,8 ц збожжавых, 450 ц кармавых караняплодаў, 6 ц ільновалакна і 5,6 ц ільнасемя.

Высокай ацэнкай хлебаробскіх заслуг з'явілася прысваенне ў 1966 г. звання Героя Сацыялістычнай Працы брыгадзірам калгасаў «Шлях да камунізму» і «Запаветы Леніна» Б. В. Шыльцу і І. Ц. Мартыненку, звеннявому механізаванага кукурузаводчага звяна саўгаса «Астрагляды» І. Д. Сіражу, узнагароджанне ордэнам Леніна механізатара і старшыні калгаса «Чырвоная ніва» І. Ф. Зелянкоўскага і І. А. Яловіка, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга — механізатара і брыгадзіра калгаса імя Тэльмана А. Ц. Аўдзеенкі і В. Н. Дашука, старшыні калгаса «Чырвоная Украіна» М. Л. Бяршацкага, камбайнера саўгаса «Савічы» І. С. Гракуна, старшыні калгаса імя Кірава Л. А. Другакова, калгасніка і брыгадзіра калгаса «Запаветы Леніна» П. І. Кабанчука і Д. П. Лутчанкі, звеннявога саўгаса «Пасудава» Б. І. Манойлы і іншых. Ордэнамі і медалямі былі адзначаны таксама многія перадавыя жывёлаводы.

Сярэдзіна 60-х гг. з'явілася тым адметным перыядам, які знаменаваў сабой у гісторыі Брагіншчыны два важныя ўзаемазвязаныя моманты: з аднаго боку, поўнае пераадоленне цяжкіх наступстваў вайны ў эканоміцы і культуры, ва ўсім жыцці брагінцоў і, з другога,— гэта быў час выхаду раёна на новыя рубяжы сацыяльна-эканамічнага развіцця, абнаўлення і дэмакратызацыі грамадскага жыцця.

Якасна новым этапам у развіцці сельскай гаспадаркі краіны і раёна ў тым ліку з'явіліся гады восьмай пяцігодкі (1966—1970), калі пачалося планамернае ажыццяўленне праграмы інтэнсіфікацыі сельгасвытворчасці на аснове комплекснай механізацыі, хімізацыі і меліярацыі зямель, спецыялізацыі калгасаў і саўгасаў. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых культур у 1966 г. склала 14,6 ц, у 1967 г.— 15,3 ц з гектара.

Адначасова з інтэнсіфікацыяй вытворчасці паскаралася і вырашэнне сацыяльных праблем: хутчэй пачалі расці даходы калгаснікаў і рабочых саўгасаў, усе гаспадаркі перайшлі на штомесячную гарантаваную аплату працы і г. д.

Побач з развіццём вытворчасці збожжа назіраўся і пэўны ўздым жывёлагадоўлі: павялічылася пагалоўе ўсіх відаў жывёлы, павышалася прадуктыўнасць статка. Узрасталі аб'ёмы нарыхтовак жывёлагадоўчай прадукцыі. Калгасы і саўгасы раёна ў 1967 г. датэрмінова выканалі планы продажу дзяржаве малака, мяса, яек, воўны і інш.

Далейшае развіццё спецыялізаванай жывёлагадоўлі ў раёне ажыццяўлялася на аснове ўмацавання кармавой базы за кошт расшырэння плошчаў пад кармавымі культурамі на дадаткова асушаных тарфяніках, паляпшэння пародных якасцей прадуктыўнай жывёлы, удасканалення тэхналогіі яе адкорму. У гаспадарках узялі курс на будаўніцтва механізаваных комплексаў па вытворчасці малака і мяса, вырошчванні цялушак. Самы буйны з іх — на 5 тысяч бычкоў — намечана было ўзвесці ў калгасе «Пераможнік» і крыху меншыя — у калгасах «Ленінскі шлях», «Чырвоная ніва», «Шлях да камунізму», імя Гагарына, саўгасе «Астрагляды» і іншых гаспадарках. Але практычнае ажыццяўленне гэтых далёка не танных праектаў пачалося не адразу, у асноўным з-за адсутнасці фінансавання і недастатковасці вытворчых магутнасцей падрадных будаўнічых арганізацый.

1971 г. з'явіўся адметным для хлебаробаў раёна тым, што яны ўпершыню пераўзышлі 20-цэнтнерны рубеж па намалоце збожжа з гектара, сабралі па 124 ц бульбы. Найбольшы ўклад у дасягненне гэтых паказчыкаў унеслі працаўнікі паляводства калгасаў «Чырвоная ніва» і «Шлях да камунізму», якія

Камбайнеры М. Ц. Зелянюк (другі злева) і яго сыны Мікалай, Аляксандр і Пётр у 1977—1978 гг. працавалі на жніве сямейным звяном

Першы сакратар Брагінскага РК КПБ Ц. І. Глушакоў віншуе экіпаж С. У. Гермеля з рэкордным сутачным намалотам — 143 т збожжа. Калгас імя Тэльмана. 1978 г.

намалацілі больш чым па 30 ц збожжа і сабралі больш чым па 150 ц бульбы з кожнага гектара. Высокіх паказчыкаў дабіліся таксама калгасы імя Тэльмана, «Запаветы Леніна», саўгас «Астраглядны» і іншыя гаспадаркі. З добрымі вынікамі закончылі 1971 г. і жывёлаводы раёна, упершыню атрымаўшы па 270,4 ц малака і 69,3 ц мяса на разліковую плошчу сельгасугоддзяў.

У дзевятай пяцігодцы (1971—1975) высока ўзышла зорка працоўнай славы аднаго з лепшых механізатараў Брагіншчыны — С. У. Гермеля. За поспехі, дасягнутыя на ўборцы ўраджаю ў 1972 г., ён удастоіўся вышэйшай узнагароды Радзімы — ордэна Леніна. У 1973 г. брыгадзіру трактарнай брыгады калгаса «Чырвоная ніва» І. Ф. Зелянкоўскаму прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы, а ў наступным годзе пераходнымі Чырвонымі сцягамі ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ былі адзначаны Брагінскі раён і калгас «Шлях да камунізму» — за павелічэнне вытворчасці збожжа і іншых прадуктаў земляробства.

У 70-я гг. у раёне паслядоўна ажыццяўлялася праграма развіцця аграрнага сектара. У цэлым за 10-ю пяцігодку (у параўнанні з папярэдняй) калгасы і саўгасы павялічылі сярэднегадавую валавую вытворчасць збожжа на 15,7, бульбы — на 6, гародніны — на 81,9, малака — на 28,6, мяса — на 8,1 працэнта. Гэта з'явілася вынікам больш высокага, чым раней, узроўню інтэнсіфікацыі вытворчасці, пастаяннага ўдасканалення арганізацыі вытворчасці і

Перадавікі жывёлагадоўлі Брагінскага раёна. 1977 г.

працы, павышэння ўраджайнасці сельгаскультур і прадуктыўнасці жывёлы.

Павялічвалася фонда- і энергаўзброенасць галіны. За 1976—1980 гг. гаспадаркам пастаўлена 350 трактароў, 146 аўтамабіляў, 92 збожжаўборачныя камбайны і многа іншых сельгасмашын.

Па выніках рэспубліканскага сацыялістычнага спаборніцтва за 1978 г. Брагінскі раён быў прызнаны пераможцам сярод раёнаў другой групы па павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве льнопрадукцыі і ўзнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрафа і ЦК ЛКСМБ, а калгас «Чырвоная ніва» ўдастоены пераходнага Чырвонага сцяга ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ як пераможца Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, паспяховае выкананне планаў і абавязацельстваў 1978 г. Тады ж калгас «Чырвоная ніва» быў названы ў ліку лепшых гаспадарак рэспублікі, якія атрымалі па 8 ц ільновалакна з гектара, выканалі планы продажу дзяржаве валакна і льнасемя.

На адзінаццатую пяцігодку (1981—1985) і на перыяд да 1990 г. перад працаўнікамі вёскі былі пастаўлены задачы па хутчэйшым уздыме эканомікі сельскай гаспадаркі, павелічэнні вытворчасці прадукцыі аграрнай галіны і пераўтварэнні вёскі. Укладваліся вялікія сродкі на развіццё галіны. Аб гэтым яскрава сведчыла папярэдняя практыка і яе выніковасць. У прыватнасці, за 15 гадоў (1968—1983) на развіццё матэрыяльнай базы калгасаў і саўгасаў раёна выкарыстана 121 млн. рублёў капітальных укладанняў. Энерганасычанасць за гэты перыяд узрасла амаль у 4 разы. Гэта дазволіла павялічыць сярэднегадавы аб'ём валавой прадукцыі ў 1,6 раза і давесці яго ў 1982 г. да

Уборка бульбы ў калгасе «Рассвет». 1980-я гг.

Ветэраны працы калгаса «XVIII партз'езд» Крыўчанскага сельсавета

42 млн. рублёў. У параўнанні з папярэдняй пяцігодкай, у 1981—1985 гг. вытворчасць валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі павялічылася на 54 працэнты.

Пры рэалізацыі дзяржавай аграрнай палітыкі вялікае значэнне надавалася павышэнню ўстойлівасці сельскагаспадарчай вытворчасці як важнейшай умове планамернага развіцця ўсёй народнай гаспадаркі. У дасягненні гэтай ключавой мэты рашаючая роля адводзілася такому магутнаму сродку інтэнсіфікацыі земляробства, як меліярацыя. У спалучэнні з механізацыяй, хімізацыяй сельскай гаспадаркі меліярацыя забяспечвала павышэнне ўрадлівасці зямлі, рацыянальнае выкарыстанне сельгасугоддзяў, матэрыяльна-тэхнічных і працоўных рэсурсаў. Гэта асабліва датычыла Брагіншчыны, дзе на пачатак 1975 г. з агульнага меліярацыйнага фонду ў 79 тыс. гектараў асушэнне было праведзена на 49 тыс. і арашэнне — больш чым на 3 тыс. гектараў. З меліяраваных земляў у раёне атрымлівалі 40 працэнтаў усёй прадукцыі раслінаводства.

Прыкметнымі падзеямі завяршальнага года адзінаццатай пяцігодкі з'явілася ўзнагароджанне пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ Брагінскага раёна — за павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак прадукцыі льнудаўгунцу і калгаса «Запаветы Леніна» — за паспяховае правядзенне зімоўкі жывёлы, павелічэнне вытворчасці і закупак прадуктаў жывёлагадоўлі ў зімова-стойлавы перыяд 1984—1985 гг.

1986 г. пачаўся ў традыцыйнай атмасферы клопатаў стартавага года чарговай пяцігодкі. У адпаведнасці з прыярытэтнымі мэтамі «Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гг. і на перыяд да 2000 года» ў працоўных калектывах праводзілася работа па вышукванні рэзерваў інтэнсіфікацыі народнай гаспадаркі. Але сумна памятны дзень 26 красавіка 1986 г. у адно імгненне перакрэсліў тыя планы і многія людскія надзеі.

Нягледзячы на складаныя абставіны пасля красавіка 1986 г., амаль усе галіны і гаспадаркі раёна выконвалі боль-

шасць планавых паказчыкаў у прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, гандлі і інш.

У 1989 г. быў пакладзены пачатак карэннаму павароту ў аграрнай палітыцы праз глыбокія змены ў аграпрамысловым комплексе, сур'ёзныя палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў інтарэсах людзей. Асноўныя задачы аграрнай палітыкі зводзіліся да карэннай змены вытворчых адносін у вёсцы. Асаблівая ўвага ўдзялялася ўкараненню перадавой тэхналогіі, брыгаднага падраду, гаспадарчага разліку, удасканаленню форм і метадаў кіравання, арганізацыі і аплаты працы, пераходу на самаакупнасць і самафінансаванне.

Напрыканцы 80-х гг. усе гаспадаркі раёна былі пераведзены на работу ва ўмовах унутрыгаспадарчага разліку і самафінансавання з аплатай працы ў залежнасці ад валавога даходу. Асноўнай формай арганізацыі працы пры гэтым з'явіўся брыгадны або арэндны падрад. Ужо ў 1989 г. арэндным калектывам былі перададзены ў карыстанне ўсё ворыва і сельгасугоддзі, а ў жывёлагадоўлі — увесь грамадскі статак.

Пераход калгасаў і саўгасаў на гаспадарчы разлік і самафінансаванне даў станоўчыя вынікі. Ужо ў 1990 г. прырост аб'ёму вытворчасці валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі да яго сяроднегадавога ўзроўню ў 11-й пяцігодцы склаў 45,2 працэнта, прадукцыйнасць працы павялічылася на 61,5, вытворчасць збожжа — на 54,1, бульбы — на 56, мяса — на 75 і малака — на 48 працэнтаў. Было атрымана звыш 20 млн. рублёў прыбытку або ў 3 разы больш, чым за папярэдняе пяцігоддзе. Прыкметна зменшылася крэдыторская запазычанасць гаспадарак перад дзяржавай і інш.

Надзвычайнасць сітуацыі пачатку 90-х гг. заключалася не толькі ва ўсеагульным дэфіцыце прадуктаў і тавараў, у страце кіравання, павагі да органаў улады, але і ў тым, што ў народа аслабла вера ў аўтарытэты, пастановы і законы. Людзі згубілі ранейшыя арыенціры, а новых не было відаць. Брагіншчына, як частка існаваўшай сістэмы, магчыма, у меншай меры, чым іншыя раёны і рэгіёны, але таксама адлюстравала ўсе працэсы, што адбываліся: абвастрэнне эканамічных і сацыяльных праблем грамадства, інфляцыя, зніжэнне вытворчай і выканаўчай дысцыпліны, незбалансаванасць эканомікі, дэстабілізацыя становішча на спажывецкім рынку. І, нарэшце, наступствы, выкліканыя катастрофай на ЧАЭС.

Нягледзячы на агульныя для рэспублікі і тым больш спецыфічныя мясцовыя цяжкасці, працоўныя Брагіншчыны ўсё ж нарошчвалі тэмпы развіцця народнай гаспадаркі. У 1988 г. раён быў прызнаны пераможцам абласнога сацыялістычнага спаборніцтва за паспяховае выкананне заданняў Харчовай праграмы, а калгас «Чырвоная ніва» ўзнагароджаны пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ за дасягненні ва Усесаюзным сацспаборніцтве па выкананні дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны. За поспехі ў рэспубліканскім спаборніцтве ў 1988 г. пераходным Чырвоным сцягам адзначаны калгас «Першамайск».

У сярэдзіне 90-х гг. у свядомасць і паўсядзённасць працоўных раёна ўсё адчувальней сталі пранікаць паняцці «рынкавыя адносіны» і «шокавая тэрапія». Сэнс іх кожным чалавекам, асабліва самых малаабароненых катэгорый насельніцтва, спасцігаўся на горкай жыццёвай практыцы. Страціўшы ад інфляцыі свае грашовыя зберажэнні ў ашчадкасах, маючы мізэрныя заробкі ці пенсіі або не маючы ні таго, ні другога, наогул, жыхары Брагіншчыны, напэўна, упершыню ў поўнай меры ўсвядомілі сваю бездапаможнасць і неабароненасць перад неспадзяванасцямі лёсу.

Яшчэ больш ускладнілі становішча ў сярэдзіне 90-х гг. рост цэн на закупляемыя ў Расіі энерганосьбіты і ў сувязі з гэтым павышэнне тарыфаў на пра-

дукты і тавары першай неабходнасці, камунальна-бытавыя паслугі і інш. Жыццёвы ўзровень насельніцтва пачаў зніжацца.

З павышэннем цэн на энерганосьбіты, тэхніку і запчасткі ўзрасла стратнасць у рабоце народнагаспадарчых галін, якія ў сувязі з гэтым сталі перад сур'ёзнымі праблемамі свайго функцыянiравання. У калгасах і саўгасах значна зменшылася пагалоўе буйной рагатай жывёлы, кароў, свіней, павышаўся сабекошт сельскагаспадарчай прадукцыі. І ўсё ж прадукцыя амаль напалову не акупляла затраты па прычыне неэквівалентнасці ў абмене прадукцыі прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Рэалізацыя збожжа, бульбы, мяса, малака і інш. не давала дастаткова сродкаў, каб абнавіць аўтатрактарны парк ці складаныя ўборачныя машыны і механізмы жывёлагадоўчых ферм з-за іх высокага кошту. У выніку калгасы і саўгасы раёна не маглі падтрымліваць належны ўзровень матэрыяльна-тэхнічнай базы, а значыць, і забяспечваць ранейшыя аб'ёмы вытворчасці. У наступныя гады запатрабаваліся вялікія намаганні, каб хоць у нейкай меры палепшыць становішча спраў.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

След на зямлі

Пра чалавека, які самааддана служыў людзям і потым надоўга застаўся ў іх удзячнай памяці, звычайна кажуць: «Ён пакінуў добры след на зямлі». І часта пераносны сэнс гэтых слоў амаль што супадае з іх прамым, рэальным сэнсам. Так бывае, калі галоўным зместам чалавечага жыцця быў штодзённы клопат аб той зямлі, якая ўсіх нас і корміць і поіць. Дзякуючы ім, нястомным працаўнікам, руплівым гаспадарам, у пасляваенны перыяд і на Брагіншчыне з году ў год павышаліся ўраджаі на полі, усё больш прадукцыі давалі фермы. І асаблівая, арганізатарская, роля ў развіцці сельскай гаспадаркі раёна належала кіраўнікам калгасаў і саўгасаў, некаторыя з якіх ужо завяршылі свой жыццёвы шлях. Умелым гаспадараннем, уважлівымі, гуманнымі адносінамі да простага працаўніка яны заслужылі глыбокую павагу ў калектывах сваіх гаспадарак і далёка за іх межамі.

Кіраўнікі, якія ў пасляваенны час пакінулі на Брагінскай зямлі свой добры след:

Кулай Іван Васільевіч нарадзіўся ў 1933 г. у в. Бакуны. З юнацкіх гадоў працаваў у мясцовым калгасе. Пасля службы ў Савецкай Арміі з 1957 г. узначальваў у ім паляводчую брыгаду. У 1971 г. абраны старшынёй калгаса «Чырвоная ніва». Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Гаспадарка, якую ўзначальвае І. В. Кулай, стала адной з лепшых на Брагіншчыне.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 11-га склікання. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыны III ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Сабаленка Іван Лявонцьевіч нарадзіўся ў 1918 г. у в. Сабалі. Вегэран вайны і працы. У 1939—1941 гг. у Чырвонай Арміі. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце. У 1942—1943 гг. у партызанах. Дэмабілізаваны пасля цяжкага ранення. У 1944—1945 гг. намеснік, а з 1946 і да 1979 г.— старшыня калгаса «Шлях да камунізму» Брагінскага р-на. Абіраўся дэпутатам

І. В. Кулай

І. Л. Сабаленка

М. П. Чаравач

Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 2-га і 3-га скліканняў.

Пад кіраўніцтвам Івана Лявонцьевіча калгас стаў адным з перадавых у раёне і вобласці, прызнанай на Брагіншчыне школай перадавога вопыту. У 1973 г. гаспадарка была адзначана пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР і ВЦСПС.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Памёр у 1998 г.

Чаравач Мікалай Паўлавіч нарадзіўся ў 1926 г. у в. Кавака. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію. Працаваў брыгадзірам паляводчай брыгады калгаса «Запаветы Леніна» (в. Кавака), у сельгасаддзеле Брагінскага райвыканкама. З 1959 па 1986 г. узначальваў узбуйнены калгас «Парыжская камуна».

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (двойчы), ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Памёр у 1994 г.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Подзвіг на збожжавым полі

Анатоль — сын патомнага хлебароба Мікалая Іванавіча Бельчанкі нарадзіўся і вырас у вёсцы Галубоўка. Вучыўся ў Ялчанскай сярэдняй школе. Быў прыкладным вучнем, актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці школы. Таварышы любілі і паважалі яго. Пасля заканчэння дзевяці класаў юнак служыў у Савецкай Арміі. Затым вырашыў вучыцца і паступіў у Чарнігаўскі кааператыўны тэхнікум. Летам кожны раз прыязджаў на канікулы да бацькоў. Але без справы не сядзеў.

Так было і на гэты раз. Анатоль вырашыў працаваць у родным саўгасе «Краснае» на ўборцы ўраджаю, на адвозцы збожжа ад камбайнаў. Кіраўнікі саўгаса даверылі яму аўтамашыну.

Бяда здарылася нечакана. У той жніўеньскі дзень 1982 года з раніцы прайшоў кароткі дождж. Апоўдні выглянула сонца, павеяў ветрык. Хутка абсохла збажына, і камбайны рушылі ў поле. На адным з участкаў уборачнай плошчы нізка віселі правады высакавольтавай электрычнай лініі. Камбайнер не заўважыў гэтага і, толькі калі зачапіў за правады выхлапной трубой, пачуў моцны трэск і скрыгат. Тут жа імгненна ўспыхнула полымя, стала гарэць салома ў капніцелі камбайна. Агонь пагражаў перакінуцца на поле.

Анатоль у гэты момант чакаў запаўнення чарговага бункера зернем, каб потым стаць пад яго выгрузку. Убачыўшы полымя, зразумеў, што здарылася бяда. Юнак націснуў на стартэр і пад'ехаў да камбайна, над якім ужо шугала полымя. Раздумваць не было калі. Трэба было перарваць кантакт электралініі з выхлапной трубой камбайна. Ён паспрабаваў зрабіць гэта — пасыпаліся іскры. І — усё...

Так загінуў наш аднавясковец Анатоль Мікалаевіч Бельчанка. Ён марыў стаць афіцэрам, але не прайшоў у вучылішча па конкурсе. Жыццё прадаставіла яму магчымасць для подзвігу ў самай мірнай сітуацыі. І ён без ваганняў і страху здзейсніў гэты подзвіг.

...Штогод у жніўны перыяд сярод камсамольска-маладзёжных збожжаўборачных экіпажаў Брагіншчыны наладжвалася спаборніцтва за прыз імя Анатоля Бельчанкі. За такі ж імянны ганаро-

вы трафей змагаліся лепшыя футбольныя каманды раёна. У Ялчанскай сярэдняй школе адзін з піянерскіх атрадаў насіў імя А. М. Бельчанкі.

М. М. Бельчанка

Калгасы, дзяржгасы, падсобныя гаспадаркі Брагінскага раёна на 1.1.2002 г.

Назва	Цэнтральная сядзіба
Калгасы	
«XVIII партз'езд»	в. Крыўча
імя Гагарына	в. Дублін
імя Тэльмана	в. Тэльман
імя Фрунзе	в. Асарэвічы
імя Чапаева	в. Хракавічы
імя Чкалава	в. Рудня Жураўлёва
імя Энгельса	в. Вуглы
«Парыжская камуна»	в. Шкураты
«Пераможнік»	в. Малейкі
«Першамайск»	в. Малажын
«Рассвет»	в. Чамярысы
«Чырвоная ніва»	в. Буркі
«Чырвоны Кастрычнік»	в. Мікулічы
«Шлях да камунізму»	в. Касачоў
Саўгасы	
«Камарынскі»	г. п. Камарын
«Краснае»	в. Краснае
Падсобныя гаспадаркі	
Вытворчае аб'яднанне «Сельгасхімія»	г. п. Камарын

Землеўладальнікі і землекарыстальнікі Брагінскага раёна на 1.1.2002 г. (у гектарах)

Землеўладальнікі і землекарыстальнікі	Агульная плошча	У тым ліку сельгасугоддзяў	З іх ворыва
Калгасы			
«XVIII партз'езд»	3032	2855	1662
імя Гагарына	3971	3253	1479
імя Тэльмана	3112	3471	1626
імя Фрунзе	4266	1828	855
імя Чапаева	5710	5144	1725
імя Чкалава	2707	2488	1140
імя Энгельса	1680	1576	698
«Парыжская камуна»	1772	1666	905
«Пераможнік»	5980	5304	2424
«Першамайск»	5209	3687	1660
«Рассвет»	2847	2395	1156
«Чырвоная ніва»	3331	2928	1785
«Чырвоны Кастрычнік»	4022	3391	1940
«Шлях да камунізму»	3470	2444	1387
Усяго па калгасах	51 109	42 430	20 442
Саўгасы			
«Камарынскі»	3473	2234	844
«Краснае»	6138	2123	1475
Усяго па саўгасах	9881	4357	2319
Усяго па падсобных гаспадарках	4692	2078	1204
Усяго па прадпрыемствах Мінсельгасхарча	65 682	48 865	23 965
Землі іншых ведамстваў (усяго)	914	707	654
Землі грамадзян (усяго)	5174	–	7
Усяго зямель сельгаспрадпрыемстваў, іншых ведамстваў і грамадзян	71 770	49 572	24 626
Землі запасу	9691	2151	1533
Землі агульнага карыстання	1569	–	–
Землі дзярж. заказніка	64 456	–	–
Землі прадпрыемстваў прамысловасці	1313	19	12
Землі прадпрыемстваў сувязі	1812	21	–
Землі дзяржаўных лесагаспадарчых прадпрыемстваў	44 581	892	859
Усяго па раёне	195 192	52 655	27 030

Прамысловасць

У першыя пасляваенныя гады ў Брагінскім і Камарынскім раёнах вялося аднаўленне прадпрыемстваў, разбураных у перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі і ў ходзе баявых дзеянняў за вызваленне Прыдняпроўя ад гітлераўцаў. На праектныя ж аб'ёмы вытворчасці ўзнятыя з руін абодва малаказаводы, крухмальны завод, а таксама прамарцелі «Прагрэс», «Чырвоны Кастрычнік», «Рэкорд» і іншыя выйшлі толькі ў 1950–1954 гг. Тады і пазней прадпрыемствы адносіліся пераважна да сістэмы мясцовай прамысловасці.

У далейшым на масласырзаводзе былі праведзены дзве карэнныя вытворча-тэхналагічныя рэканструкцыі. Прадпрыемства вырабляла прадукцыю шырокага асартыменту, частка якой (сыры, масла) ішла на экспарт. Пасля чарно-

Уручэнне пераходнага Чырвонага сцяга пераможцы абласнога спаборніцтва сувязістаў – Брагінскаму раённаму вузлу сувязі. 1985 г.



Новы будынак райвузла сувязі ў Брагіне

бульскіх падзей яно было перапрафіляванa на выраб плаўленых сыроў з прывазной сыравіны, а малако з раёна забіралі на перапрацоўку на Хойніцкі масласырзавод.

Пасля 1986 г. спынілі існаванне Камарынскія хлебазавод, маслазавод. Хлебабулачнымі вырабамі Камарынскую зону раёна забяспечваюць з Брагіна.

Нязначна паменела вытворчых спраў у раённага аб'яднання «Аграпрамтэхніка».

Прадпрыемства забяспечвае высокатэхналагічнае абслугоўванне сельскагаспадарчага раёна. Яно аказвае дапамогу калгасам і саўгасам у рамонце і прафілактычным кантролі за машынна-трактарным паркам, механізацыі працаёмкіх працэсаў у жывёлагадоўлі і інш. У калектыве створаны добрыя ўмовы працы і адпачынку. Большасць членаў яго жыве ў добраўпарадкаваных кватэрах ведамаснага фонду, які складае каля 5 тысяч квадратных метраў.

З іншых прадпрыемстваў трэба назваць аўтапарк № 19, раённы камбінат бытавога абслугоўвання насельніцтва. Калектыў транспартнікаў уносіць прыкметны ўклад у развіццё народнагаспадарчага комплексу раёна, забяспечваючы значныя аб'ёмы грузавых і 90 працэнтаў пасажырскіх перавозак, а працаўнікі сельскага сервісу аказваюць жыхарам Брагіншчыны каля 20 відаў бытавых паслуг.

У сярэдзіне 80-х гг. на Брагіншчыне функцыяніравалі раённы вузел і 36 сельскіх аддзяленняў сувязі. У іх сістэме дынамічна развівалася электрасувязь, асабліва пасля ўводу ў эксплуатацыю сучаснай АТС у новым трохпавярховым будынку раённага паштамта. Прыкметна павялічылася ёмістасць Брагінскай і 17 сельскіх аўтаматычных тэлефонных станцый. У кожным калгасе і саўгасе дзейнічае ўнутрыгаспадарчая сувязь. У два разы ўзрасла колькасць абанентаў. З 1990 г. ім забяспечаны аўтаматычны выхад на міжгароднюю і міжнародную сетку тэлефоннай сувязі. Вядзецца радыётрансляцыя па трох праграмах больш чым на 10 тысяч рарыёкропак. З уводам у строй у 1987 г. Брагінскай радыётэлевізійнай станцыі жыхары Брагіншчыны і навакольных раёнаў атрымалі магчымасць прымаць перадачы беларускага нацыянальнага і маскоўскіх тэлеканалаў.

Значнае развіццё атрымлівае паштовая сувязь.

Надзейнымі партнёрамі хлебаробаў па аграпрамысловым комплексе з'яўляюцца меліяратары Камарынскай ПМК-1 і міжгаспадарчага ўпраўлення асушальна-арашальных сістэм (МУААС), намаганнямі якіх у раёне асушана каля 50 тысяч гектараў забалочаных і пераўвільготненых зямель, пабудаваны арашальныя сістэмы амаль на 3,5 тысячы гектараў. Да 1986 г. на гэтых плошчах працаўнікі сельскай гаспадаркі раёна атрымлівалі 40 працэнтаў усёй прадукцыі раслінаводства. МУААС выконвае капітальны і бягучы рамонт унутрыгаспадарчай меліярацыйнай сеткі, рыхтуе плошчы пад перазалужэнне, правотуе дзіць палiў — арашэнне сельгаскультур,

ажыццяўляе іншыя віды работ па доглядзе меліярацыйнай сеткі. Тут ёсць высокапрафесіянальныя кадры, магутная сучасная тэхніка і рамонтная база.

Апрача адзначаных вышэй вытворчых калектываў у раёне функцыяніруюць іншыя службы, арганізацыі і таварыствы, якія абслугоўваюць сельскую гаспадарку і насельніцтва. У іх ліку вытворчае аб'яднанне жыллёва-камунальнай гаспадаркі, райаграпрамэнерга, раён электрычных сетак, райпалівазбыт, райспажыўтаварыства і інш.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Капітальнае будаўніцтва

Першымі будаўнічымі брыгадамі і звеннямі, створанымі пасля вызвалення Брагіншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, было многае зроблена па выкананні распрацаванай тады праграмы аднаўлення сацыяльна-вытворчай інфраструктуры, жыллёва-бытавога ўладкавання насельніцтва, пацярпелага ад вайны. У выніку ўжо да першамайскага свята 1945 г. больш за 600 сем'яў змаглі перасяліцца з зямлянак у новыя хаты і кватэры. Да 1949 г. у Брагіне аднавілі, а ў калгасах імя Калініна, імя Тэльмана, «Сцяг Леніна», Брагінскай МТС і саўгасе «Астрагляды» пабудавалі электрастанцыі. За 1944—1949 гг. за сродкі грамадзян і пры дапамозе дзяржавы было пабудавана або капітальна адрамантавана каля 5 тысяч жылых дамоў у Брагіне, Камарыне і вёсках абодвух раёнаў. Узрасталі аб'ёмы і тэмпы аднаўленча-будаўнічых работ у калгасах і саўгасах.

Напрыканцы 50-х — пачатку 60-х гг. былі створаны міжкалгасныя будаўнічыя арганізацыі, у далейшым — міжкалгасныя перасоўныя механізаваныя калоны: у Брагіне МПМК-42 і ў Камарыне — МПМК-51. Нягледзячы на недастатковую тэхнічную аснашчанасць, яны выконвалі асноўныя аб'ёмы будаўніча-мантажных работ на ўзвядзенні жывёлагадоўчых памяшканняў, машына-трактарных двароў, механічных майстэрняў і інш. у калгасах і саўгасах. Былі пабудаваны таксама новыя хлебапякарні ў Брагіне і Камарыне, вытворчая база ПМК-21, працягвалася жыллёвае будаўніцтва ў райцэнтрах і г. д.

У 70-я гг. у раёне ўжо працавала ПМК-94 трэста «Мазырсельбуд». У асноўным сіламі гэтай арганізацыі і абодвух МПМК за пяцігоддзе (1976—1980) было ўзведзена 120 аб'ектаў вытворчага і сацыяльна-культурнага прызначэння. А за два наступныя гады ў раёне пабудавалі каля 3 тысяч кватэр, у строй дзеючых увялі 11 школ, 12 клубных будынкаў, 7 дзіцячых дашкольных устаноў. Працягвалася забудова заходняга жылога мікрараёна ў Брагіне, ПМК-76 трэста «Гомельсаўгасбуд» пачало забудову цэнтральнай сядзібы і вытворчай зоны новага саўгаса «Брагінскі». З буйнейшых, пабудаваных у 80—90-я гг. аб'ектаў трэба назваць пяціпавярховы інтэрнат, сучасны універмаг, Дом правасуддзя, раённы паштамт, паліклініку, новую вытворчую базу ДРБУ-148, некалькі шматкватэрных жылых дамоў, аб'ектаў сельскагаспадарчага прызначэння ў гаспадарках раёна і г. д.

У 1981 г. высокую ацэнку атрымала самаадданая праца шэрагу мясцовых майстроў будаўнічай справы: брыгадзір комплекснай брыгады МПМК-42 П. І. Мельнічэнка адзначаны ордэнам Леніна, муляры МПМК-51 і МПМК-42 Н. С. Бельчанка і В. В. Ефіменка ўдастоены ордэна Працоўнага Чырвонага

Будынак універмага ў Брагіне

Сцяга. Дзяржаўныя ўзнагароды атрымалі і іншыя будаўнікі.

У 1985 г. Брагінскі раён прызнаны пераможцам абласнога спаборніцтва за выкананне планаў і абавязацельстваў па прамысловасці і капітальным будаўніцтве. У ліку лепшых будаўнічых калектываў Брагіншчыны з поўнай на тое падставай была названа ПМК-94 (начальнік В. С. Зінчанка). Тады ж брыгадзір комплекснай брыгады гэтай арганізацыі У. М. Халіманчык быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

У 90-я гг. у раёне пры актыўнай дапамозе будаўнікоў з іншых абласцей рэспублікі многае зроблена па ўзвядзенні жылля для перасяленцаў у чыстых ад радыяцыі населеных пунктах Брагіншчыны, добраўпарадкаванні ў райцэнтры, Камарыне, шэрагу вёсак, па вытворчым будаўніцтве ў калгасах, саўгасах і г. д.

За апошнія 15 гадоў выканалі вялікія аб'ёмы работ па будаўніцтве новых, сярэднім і бягучым рамонце існуючых дарог і мастоў, добраўпарадкаванні ў вёсках працаўнікі Брагінскага дарожнага рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 148, на абслугоўванні якога ў раёне каля 350 кіламетраў аўтамабільных дарог.

У 2000 годзе ў раёне па ўсіх крыніцах фінансавання асвоена 555,4 мільёна рублёў капітальных укладанняў. Уведзена ў эксплуатацыю 4071 кв. м жылля, у тым ліку на сяле — 189,1 мільёна рублёў і ўведзена ў эксплуатацыю 2971 кв. м жылля.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Лясная гаспадарка

Лясная гаспадарка — адна з важнейшых галін гаспадарчай дзейнасці ў Брагінскім раёне, бо лес займае 30 працэнтаў яго тэрыторыі. Зразумела, што вялікае значэнне, асабліва ў паслячарнобыльскі перыяд, мае прыродаахоўная функцыя лесу, але ажыццяўляецца яна ў вялікай ступені праз лесагаспадарчую, у значнай меры прамысловую дзейнасць людзей (нарыхтоўка лесаматэрыялаў, паліва пры высечках догляду, санітарных высечках і інш.)

Узнаўленнем, доглядам і аховай лесу ў Брагінскім раёне займаюцца працаўнікі Камарынскага лясгаса. Пасля чарнобыльскай катастрофы 2 тысячы гектараў лесу былі перададзены Прыпяцкаму экалагічнаму заказніку. Але работнікі лясной гаспадаркі працягваюць пашыраць межы лясных угоддзяў. Штогод яны павялічваюцца на 300—350 гектараў за кошт веснавых пасадак. Для гэтага ў лясгасе закладзены гадавальнік сеянцаў сасны, дубу, бярозы і іншых парод дрэў.

Наколькі паспяховымі з'яўляюцца лесаўзнаўленчыя намаганні працаўнікоў лясгаса, сведчаць лічбы за 1950—1975 гг. За гэты перыяд пасаджана 13,5 тысячы гектараў лесу. Усяго ж у раёне больш за 45 працэнтаў лясоў створана рукамі чалавека.

Апрача расшырэння плошчаў і аховы лясоў выконваецца значны аб'ём работ па задавальненні патрэб гаспадарак і насельніцтва ў будаўнічых матэрыялах, паліве. У прыватнасці, калектыў цэха дрэваапрацоўкі штогод рэалізуе 500 кубаметраў піламатэрыялаў, 5 тысяч парканных шчытоў, некалькі зрубаў будучых дамоў, 15—16 тысяч кубаметраў дроў і г. д. У перадчарнобыльскі перыяд на тэрыторыі лясгаса нарыхтоўваліся сотні тон грыбоў, ягад, бярозавіку для патрэб харчовай прамысловасці і насельніцтва. У лясгасе свая пчалапасека, амаль 100 пчаласямей.

Раней штогод, ды і цяпер часам механізатары лясгаса аказвалі і аказваюць дапамогу мясцовым хлебаробам у выкананні розных сельскагаспадарчых работ.

Сярод унутрыгаспадарчых падраздзяленняў лясгаса з году ў год лепшых вытворчых паказчыкаў дабіваюцца калектывы Брагінскага, Камарынскага і

Жараўскага лясніцтваў, якія на працягу доўгага часу ўзначальвалі А. Я. Кулыба, М. Е. Афанасенка, А. А. Бельчанка.

За прыведзенымі вышэй лічбамі — самаадданая праца работнікаў лесагаспадарчай вытворчасці і, у першую чаргу, яе ветэранаў. Такіх, як удастоеныя Ганаровай граматы Міністэрства лясной гаспадаркі СССР інжынер па лесакарыстанні Г. М. Смірнова і ляснік В. А. Радчанка або ветэраны калектыву — былы дырэктар лясгаса М. А. Шарашэўскі, леснікі А. І. Бабранок, К. Я. Вароненка, В. Ф. Германенка, М. М. Катлабай, І. Ф. Назаранка, В. Н. Петрусевіч, рабочая лесагадавальніка Г. В. Бельчанка, бензапільшчыкі М. Е. Роднеў, Э. Ф. Якушкін і іншыя. Дзякуючы шматгадовай стараннай працы сапраўдных энтузіястаў лесагаспадарчай справы і надалей шумець лясам зялёным на Брагіншчыне.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Адукацыя

Пасляваеннае аднаўленне сістэмы народнай асветы на Брагіншчыне і Камарыншчыне вялося ў вельмі складаных умовах. За перыяд акупацыі гітлераўцы амаль поўнасцю знішчылі яе матэрыяльна-тэхнічную базу: разбурылі або спалілі школьныя будынкі, вучэбныя прылады і наглядныя дапаможнікі. Значныя страты былі нанесены і педагагічным кадрам абодвух раёнаў.

Пасля вызвалення іх ад ворага тут адразу ж на парадак дня былі пастаўлены пытанні неадкладнага аднаўлення школьнай сістэмы. Ужо ў канцы кастрычніка 1943 г. у Камарынскім раёне заняткі аднавіліся ў 15 школах. У Брагінскім раёне яны пачаліся ў шэрагу школ у снежні таго ж года.

Шмат сіл і старання прыклалі да аднаўлення школьнай сеткі, падбору настаўніцкіх кадраў загадчык Брагінскага раённага аддзела народнай асветы А. І. Друзік, дырэктары мясцовых школ: сярэдняй — С. М. Нікіцін, сямігадовай — Ф. С. Аўрамёнка, педагогі І. А. Волкаў, Генадзь Сманцар і іншыя.

Многіх дзяцей вайна зрабіла сіротамі, бяздомнымі. Нягледзячы на выключна цяжкі час, дзяржава рабіла ўсе магчымыя захады па аблягчэнні лёсу дзетвары, якая страціла бацькоў. Ужо ў снежні 1943 г. на базе ацалелых будынкаў крухмальнага завода і дзвюх вясковых хат быў адчынены дзіцячы дом, першым дырэктарам якога стаў нядаўні партызан Міхаіл Супічэнка. Такая ж дзіцячая ўстанова з'явілася тады і ў Камарыне. У абодвух дзіцячых дамах утрымлівалася 430 хлопчыкаў і дзяўчынак.

Становішча паступова мянялася да лепшага: з эвакуацыі вярталіся настаўнікі, з усходніх абласцей краіны сталі паступаць школьныя прылады, наглядныя дапаможнікі і інш. У 1944/45 навучальным годзе школьная сетка Брагінскага і Камарынскага раёнаў ужо мела 2 сярэднія (Брагін, Камарын), 17 сямігадовых, 79 пачатковых школ.

За самаадданую працу на ніве народнай асветы, асабліва пры аднаўленні работы школ, у лютым 1946 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў ордэнамі і медалямі вялікую групу педагогаў, у тым ліку з Брагіншчыны — Фёдара Аўраменку, Аляксандра Друзіка, Сцяпана Нікіціна, Міхаіла Супічэнку і іншых — усяго 14 чалавек. Дырэктару Брагінскай сярэдняй школы С. А. Нікіціну было прысвоена званне заслужанага настаўніка школы БССР.

Калгасы і саўгасы дапамагалі ў рамонце і будаўніцтве школьных будынкаў, папаўненні вучэбным абсталяваннем і наглядным дапаможнікамі. За кошт калгасаў тады было ўведзена ў дзеянне 17 школ на 2550 вучнёўскіх месц.

Паспяховае аднаўленне і развіццё школьнай сеткі ў пасляваенны час дазволіла зрабіць новыя важныя крокі ў развіцці адукацыі. Пачынаючы з 1949/50 навучальнага года паўсюдна

ажыццяўлялася абавязковае сямігадовае навучанне. Колькасць вучняў у школах Брагіншчыны павялічылася з 17 тысяч у 1950/51 да 21 тысячы ў 1951/52 навучальных гадах.

У многім дзякуючы старанню выкладчыкаў прыродазнаўчых дысцыплін у школах назіралася актывізацыя юннатаўскай работы, умацаванне сувязей школы з мясцовымі калгасамі і саўгасамі. Юныя натуралісты займаліся даследніцкай і практычнай работай па вырошчванні сельгаскультур не толькі на прышкольных доследных участках, але і на палетках гаспадарак. Дзейнасць юннатаў шэрагу школ атрымала высокую ацэнку. Так, з 1955 г. з'яўляўся ўдзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі гурток юных натуралістаў Астраглядаўскай сярэдняй школы. А яго арганізатар і кіраўнік настаўніца Ганна Кірылаўна Пятровіч за ўмелую пастаноўку юннатаўскай работы адзначана юбілейным Мічурынскім медалём.

Адным з лепшых быў на Брагіншчыне і гурток юных натуралістаў Брагінскай беларускай сярэдняй школы. Сваёй даследніцкай работай і дапамогай мясцовым калгасам у 1956 г. 16 юннатаў школы таксама заваявалі права ўдзелу ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Шырокае развіццё атрымала вячэрняя школа рабочай і сельскай моладзі з разгалінаванай сеткай вячэрніх класаў і кансультацыйных пунктаў. Напрыклад, у 60-я гг. у Брагінскім раёне працавалі дзве сярэднія школы рабочай і сельскай моладзі — у Брагіне і Савічах, а таксама 25 вячэрніх класаў, у якіх займаліся больш за 500 юнакоў і дзяўчат. Пры Астраглядаўскай, Лубяніцкай і Малажынскай сярэдніх школах працавалі кансультацыйныя пункты Гомельскай абласной завочнай сярэдняй школы.

У школах рабочай і сельскай моладзі юнакі і дзяўчаты атрымлівалі сярэднюю адукацыю без адрыву ад вытворчасці. У Брагіне шмат увагі ўдзялялі арганізацыі работы вячэрняй школы яе дырэктары Алена Максімаўна Шур, Восіп Сямёнавіч Ткач і іншыя. За перыяд з 1953 да 1976 г. атэстаты аб сярэдняй адукацыі ў вячэрніх школах на Брагіншчыне (з улікам былога Камарынскага раёна) атрымалі 1026 чалавек.

У пасляваенны час праведзена вялікая работа па падрыхтоўцы педагагічных кадраў. Значна павысіўся агульнаадукацыйны ўзровень настаўнікаў. Калі ў 1955 г. школьных выкладчыкаў з вышэйшай адукацыяй было 16 працэнтаў, то ў 1967 г. — ужо 32 працэнты. Павысілася педагагічнае майстэрства кадраў. Значна ўзрасла колькасць педагогаў, якія працавалі без другагоднікаў. Добрасумленная праца многіх настаўнікаў высока ацэнена дзяржавай: на той час 72 педагогі былі адзначаны ордэнамі і медалямі СССР, больш чым дзесяці чалавекам прысвоена званне заслужанага настаўніка школы БССР. У іх ліку А. Я. Джажора, А. К. Кулініч, Н. І. Ліпская, Г. К. Пятровіч, М. М. Седранок, А. Ф. Сіранькоў, Б. Б. Шумейка і іншыя.

Шырокай вядомасцю на Брагіншчыне карысталіся такія майстры педагагічнай справы, як заслужаны дзеяч культуры БССР, настаўнік Ю. Я. Залатарэнка (Брагін), М. Е. Галка (Чамярысы), С. П. Кошмар (Астрагляды), А. Н. Ключанкоў (Н. Ёлча), Н. І. Ласкавая (Камарын), М. У. Зелянкоўскі (Малажын) і іншыя.

У 60-я гг. у Брагінскім раёне праведзена вялікая работа па перабудове дзейнасці школы на аснове закона «Аб узмацненні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР». Сямігадовыя школы пераўтвораны ў васьмігадовыя. У ходзе ажыццяўлення гэтага закона ўмацавалася сувязь школы з вытворчасцю, палепшылася працоўнае выхаванне навучэнцаў. Адной з форм арганізацыі вучэбна-вытворчай работы сельскіх школ сталі вучнёўскія вытворчыя брыгады, дзе школьнікі знаёміліся з агратэхнікай вырошчвання сельгаскультур, авалодвалі спецыяльнасцямі механізатараў, жы-

вёлаводаў, пальводаў. У 1962 г. такія брыгады і звенні былі створаны пры 14 сярэдніх і 30 васьмігадовых школах. У іх уваходзіла тады 1807 навучэнцаў, 670 школьнікаў прапавалі ў жывёлагадоўчых звеннях на фермах калгасаў і саўгасаў.

Сапраўднай школай жыцця, працы, вучобы і адпачынку стала вучнёўская вытворчая брыгада Астраглядаўскай СШ. Яна налічвала 14 звеняў жывёлаводаў, будаўнікоў, раслінаводаў, механізатараў. У 1962 г. членамі звеняў атрымана з кожнага гектара па 300 цэнтнераў цукровых буракоў, 600—700 цэнтнераў зялёнай масы кукурузы. Праводзіліся доследы па вырошчванні ўшчыльненых і змешаных пасеваў, ад кормі маладняку жывёлы зялёнымі кармамі, выкарыстанні вадкага біяміцыну і г. д.

Вучнёўская вытворчая брыгада Астраглядаўскай сярэдняй школы выйшла пераможцай у рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве і ўдастоілася пераходнага Чырвонага сцяга Міністэрства асветы БССР і ЦК ЛКСМБ. Добра была арганізавана работа ў вучнёўскіх вытворчых брыгадах брагінскай № 1, Вуглоўскай, Савіцкай, Камарынскай сярэдніх школ.

У далейшым паляпшэнні вучэбна-выхаваўчай работы важную ролю адыгрывала школьнае кіно. Добра працавалі кінаўстаноўкі ў Верхнежараўскай, Брагінскай, Глухавіцкай, Кіраўскай, Камарынскай, Сабалёўскай школах. Тут выкладанне матэрыялу часта падмацоўвалася паказам навукова-папулярных і вучэбных фільмаў. У выніку дасягаліся больш трывалыя веды навучэнцаў. На той час у раённай фільматэцы налічвалася 75 назваў кінафільмаў.

Перабудова школы, пачатая ў 60-я гг., ажыццяўленне ўсеагульнай васьмігадовай адукацыі патрабавалі не толькі карэнных арганізацыйна-структурных змен, але і, перш за ўсё, вялікіх матэрыяльна-тэхнічных сродкаў. Менавіта таму ў 1965 г. на патрэбы народнай адукацыі Брагінскага раёна было асігнавана 1 мільён 948,2 тысячы рублёў, або 61 працэнт ад усяго раённага бюджэту. У 1963—1968 гг. пабудаваны Катловіцкая, Вяллеўская пачатковыя, Конанаўская, Лубяніцкая, Піркаўская, Багушоўская, Сцепаноўская васьмігадовыя, Брагінская, Савіцкая, Крыўчанская сярэднія школы. Не спынялася гэтая работа і ў далейшым. За 1968—1970 гг. у раёне ўведзены ў эксплуатацыю памяшканні 10 школ, зроблены прыбудовы да 14 школ, пабудавана кватэра для настаўніка ў Дублінскай школе, дом настаўніка ў Пірках, спартыўная зала ў Вуглоўскай сярэдняй школе і г. д. У лютым 1971 г. пачаліся заняткі ў новай Выграбна-Слабадской васьмігадовай школе.

У многіх школах адкрыты пабудаваныя або прыстасаваныя сталовыя. Гарачыя абеды атрымлівалі каля 2,5 тысячы навучэнцаў, у тым ліку бясплатным харчаваннем забяспечваліся каля 1000 вучняў.

Чарговым этапам перабудовы агульнаадукацыйнай школы, пачынаючы з 1972 г., з'явілася ажыццяўленне комплексных мерапрыемстваў па пераходу да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. У гэты перыяд на Брагіншчыне працавалі 21 сярэдняя, 24 васьмігадовыя і 36 пачатковых школ. Навучанне і выхаванне ў іх 11 тысяч дзяцей ажыццяўлялі 549 настаўнікаў, 342 з якіх мелі закончаную вышэйшую адукацыю. Педагогі дабіваліся станоўчых вынікаў у павышэнні ўзроўню ведаў навучэнцаў. Калі ў 1970/71 навучальным годзе паспяховасць вучняў складала 98,7 працэнта, то ў 1975/76 навучальным годзе — 99,3 працэнта, 423 настаўнікі дабіліся стопрацэнтнай паспяховасці навучэнцаў. У 1975 г. 11 вучняў скончылі школу з залатым медалём. Значных поспехаў дабіліся гады педкалектывы Астраглядаўскай, Буркоўскай, Сабалёўскай сярэдніх, Брагінскай, Каманоўскай, Ясянёўскай васьмігадовых школ.

На традыцыйнай жнівеньскай нарадзе настаўнікаў у 1978 г. паведамлялася, што ў Брагінскім раёне завершаны

пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Пры гэтым адзначалася работа педагогаў-наватараў і мясцовых майстроў педагагічнай справы. Такіх, як настаўніцы Л. П. Дзяйкун (Астрагляды), Н. Т. Бельчанка, І. Ф. Галавачова (Брагін), Р. М. Серыкава (Камарын), З. Г. Сізова (Ёлча), А. К. Паўлючэнка (Сабалі) і іншых.

Павышэнню якасці работы педагогаў у значнай меры садзейнічала кабінетная сістэма навучання. У школах раёна было створана 196 прадметных кабінетаў. Усе сярэднія (а з 1981 г. і васьмігадовыя) школы пераведзены на кабінетную сістэму навучання.

Адбывалася далейшае ўдасканаленне працоўнага навучання і прафесійнай арыентацыі вучняў. У школах Брагіншчыны гэта ажыццяўлялася ў Астраглядаўскім (пасля 1986 г. у Малейкаўскім) і Камарынскім вучэбна-вытворчых камбінатах. Школьнікі 9—10 класаў займаліся ў іх па 7 прафесіях, вызначаных з улікам патрэбнасці раёна ў кадрах: трактарыст-машыніст 3-га класа, шафёр, аператар машыннага даення кароў, прадавец, кулінар і інш. Толькі за першыя тры гады гэтымі камбінатамі падрыхтавана 422 трактарысты, 19 вадзіцеляў аўтамабіляў, 168 швачак, 96 кулінараў і г. д.

У другой палове 70-х гг. усё большую грамадска карысную накіраванасць набывала праца вучняў на занятках у школьных майстэрнях. У многіх школах у працэсе працоўнага навучання школьнікі авалодвалі ведамі ў галіне тэхнікі, тэхналогіі і эканомікі вытворчасці, спалучаючы лабараторныя і практычныя заняткі з вытворчай працай у базавых гаспадарках.

У 1981 г. у раёне дзейнічалі 18 лагераў працы і адпачынку школьнікаў з ахопам 1200 старшакласнікаў, якія выконвалі за так званую працоўную чвэрць розных работ на 47 тысяч рублёў у тагачасным грашовым вылічэнні.

Важнейшую ролю ў падрыхтоўцы вучняў да працоўнай дзейнасці па-ранейшаму адыгрывалі вучнёўскія вытворчыя брыгады, якіх у 1982 г. у раёне налічвалася 18. Яны аб'ядноўвалі 1140 навучэнцаў. Пры кожнай васьмігадовай школе функцыяніравалі вытворчыя звенні. У тым жа годзе члены школьных вытворчых брыгад і звенняў даглядалі 98 гектараў бульбы, 65 гектараў кармавых буракоў, 22 гектары капусты, а таксама 3 гектары саду.

На пачатку 80-х гг., у адпаведнасці з Асноўнымі напрамкамі развіцця агульнаадукацыйнай і прафесіянальнай школы, атрымала далейшае пашырэнне тэхнізацыя навучальнага працэсу. У навучанні і выхаванні ўсё шырэй выкарыстоўваліся тэхнічныя сродкі. На канец 1980 г. у школах было больш як 80 кінаапаратаў, 54 тэлевізары, 15 лінгафонных кабінетаў, 74 магнітафоны, шмат іншай гукавой і праекцыйнай апаратуры, якая дазваляла настаўнікам праводзіць урокі на высокім метадычным узроўні.

Адметна новым у тэхнізацыі навучання з'явіліся першыя спробы па вывучэнні асноў камп'ютэрызацыі. На базе Брагінскай і Камарынскай сярэдніх школ пачалі функцыяніраваць першыя ў раёне класы персанальных электронных вылічальных машын тыпу «Агат». У іх праходзілі практычнае навучанне вучні дзесятых класаў усіх школ Брагіншчыны. Адкрылася магчымасць пераводу на машынны варыянт навучання і ўсіх дзевяцікласнікаў.

У 80-я гг. пабудаваны новыя тыпавыя сярэднія школы ў Камарыне, Малажыне, Мікулічах, Бурках, Хракавічах, дзіцячыя сады функцыяніравалі ў кожным калгасе і саўгасе. Аднак катастрофа на Чарнобыльскай АЭС 26 красавіка 1986 г. нанесла адчувальны і непапраўны ўрон справе народнай адукацыі на Брагіншчыне. У сувязі з радыяцыйным забруджаннем мясцовасці разам з бацькамі былі адселены 2,5 тысячы дзяцей, закрыты больш як 20 школ усіх тыпаў.

Славу і гонар, залаты фонд любой народнагаспадарчай галіны складаюць яе кадры. Брагіншчына 80-х гг. у гэтых

адносінах выгадна вызначалася ў палескай частцы Гомельскай вобласці. На пачатак 1985 г. у раёне было 560 настаўнікаў, 463 з якіх мелі вышэйшую адукацыю. 240 педагогаў мелі дзяржаўныя ўзнагароды за подзвігі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, 140 адзначаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза за поспехі ў навучанні і выхаванні школьнікаў. Амаль дваццаці педагогам прысвоена ганаровае званне заслужаны настаўнік БССР, 73 чалавекі адзначаны знакам «Выдатнік народнай асветы БССР». Нарэшце, 158 настаўнікаў узнагароджаны Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, Міністэрства асветы рэспублікі.

І. Ф. Ганжураў

Ельчын Аркадзь (Арон) Якаўлевіч нарадзіўся ў 1914 г. у м. Камарын Рэчыцкага павета. У 1928 г. па камсамольскай пуцёўцы быў накіраваны на вучобу ў Гомельскі індустрыяльна-педагагічны тэхнікум, пасля заканчэння якога настаўнічаў у Камарыне і завочна вучыўся ў Мінскім пединстытуце імя М. Горкага. Працаваў інспектарам, загадчыкам Камарынскага рана, дырэктарам Мазырскага педвучылішча. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенны час да выхаду на пенсію ў 1975 г. працягваў педагагічную працу на розных пасадах у Камарынскім і Брагінскім раёнах. Адзін з арганізатараў Брагінскага краязнаўчага музея, склаў рукапісны летапіс Брагіншчыны, асобныя матэрыялы якога выкарыстаны пры падрыхтоўцы кнігі «Памяць. Брагінскі раён».

Выдатнік народнай асветы БССР. Узнагароджаны Граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Міністэрства асветы рэспублікі.

Памёр у 1985 г.

Ахова здароўя

Паспяховым у развіцці раённай сеткі аховы здароўя былі 60–80-я гг. Менавіта тады былі пабудаваны карпусы першай раённай паліклінікі, райбальніцы, санэпідстанцыі, райаптэкі, участковай бальніцы ў в. Крыўча. Медыцынская дапамога насельніцтву ў сярэдзіне 80-х гг. аказвалася ў трох стацыянарах (410 ложкаў), чатырох урачэбных амбулаторыях і 30 фельчарска-акушэрскіх пунктах (ФАП), дзе працавалі 54 урачы, 251 медработнік сярэдняга звяна. Функцыяніравалі аптэкі ў Брагіне, Камарыне і інш.

У тыя ж гады пачалі працаваць фізіятэрапеўтычныя кабінеты, пакоі псіхалагічнай разгрузкі, сауны ў Дамах жывёлаводаў у калгасах «Пераможнік» і імя Тэльмана.

У ліку лепшых медработнікаў на той час з'яўляліся ўрачы М. Р. Умінская (Новаялчанская ўрачэбная амбулаторыя), Н. І. Вінаградава, Н. Д. Хамянок (Брагінская райбальніца), М. М. Фешчанка (Камарынская бальніца). За высокі прафесіяналізм і старанную працу Вінаградавай і Умінскай было прысвоена званне «Заслужаны ўрач БССР», а Хамянок — узнагароджана знакам «Выдатнік аховы здароўя».

Сур'ёзныя змены ў ахове здароўя ў раёне адбыліся ў выніку наступстваў катастрофы на ЧАЭС. З адмоўнага боку — гэта звужэнне галіновай базы з прычыны закрыцця шэрагу ФАПаў пасля адсялення насельніцтва з моцна забруджаных радыенуклідамі вёсак, выезду за межы раёна значнай часткі медперсаналу і г. д. Але былі прыняты дзейсныя меры па ўзмацненні аховы здароўя людзей, якія засталіся жыць і працаваць на ранейшых месцах. Ужо ў 1987 г. у Брагіне ўведзена ў строй новая паліклініка на 200 наведванняў у дзень, будынкі ФАПаў у вёсках Малажын, Чамярысы, Хракавічы, набыта абсталяванне і апаратура для фізіятэрапеўтычных кабінетаў у ФАПы вёсак Буркі, Лубенікі, Малажын, Чамярысы і інш. Медустановы, іх персанал правялі вялікую работу па суцэльнай і спецыяльнай дыспансерызацыі насельніцтва.

Работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы раённай сістэмы аховы здароўя працягвалася і ў наступныя гады. Цяпер медыцынскую дапамогу насельніцтву аказваюць цэнтральная раённая і дзве раённыя бальніцы, 4 сельскія ўрачэбныя амбулаторыі, 16 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, раённы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі. У апошнія гады прыкметна палепшаны агульны стан медустаноў. Адрамантаваны Камарынская бальніца, Крыўчанская і Новаялчанская сельскія ўрачэбныя амбулаторыі, 10 ФАПаў, пабудаваны харчблок у цэнтральнай раённай бальніцы, новы хірургічны корпус у Брагіне і г. д.

Медустановамі раёна зроблены крок наперад у асваенні новых метадаў лячэння і дыягностыкі. Ужо ў мінулыя гады працавалі кабінеты функцыянальнай дыягностыкі, перасоўная клінічна-дыягнастычная лабараторыя, ажыццяўлялася дыстанцыйная перадача ЭКГ-даследаванняў па сістэме «Хваля» і інш. Цяпер у раённым тэрытарыяльным медыцынскім аб'яднанні ёсць найноўшыя прыборы і апараты дыягностыкі і кантролю для медабследавання хворых, эфектыўныя сродкі лячэння.

Але ахова здароўя — гэта, перш за ўсё, спецыялісты і абслугоўваючы персанал. Добрасумленнай працай пакінулі добрую памяць аб сабе мясцовыя медыкі старэйшага пакалення І. А. Бігар, А. М. Ганчарэнка, М. Г. Гардзеенка, А. С. Ермалінскі, Д. Д. Саксонава, А. М. Шур, заваявалі аўтарытэт і павагу іх маладзейшыя паслядоўнікі І. П. Бакуновіч, М. М. Дзятко, Ж. У. Тураўская і іншыя медработнікі.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Сакрэт іх даўгалецця

Брагіншчына здаўна вызначалася доўгажыхарамі. Не сталі яны рэдкасцю і ў нашы часы. Пераважна гэта жанчыны. У прыватнасці, на пачатак 2001 года іх было восем. Бадай, ці не старэйшай не толькі ў тутэйшых мясцінах, але і на Беларусі з'яўлялася бабуля з вёскі Ніжнія Жары Марыя Васільеўна Шарая. Яна нарадзілася ў 1878-м, а памерла ў 2001 годзе. Чатыры доўгажыхаркі — Вольга Емяльянаўна Грыгор'ева, Галіна Аляксееўна Дзмітрэнка, Пелагея Уладзіміраўна Клімянок і Ганна Рыгораўна Леўчанка — на 12 гадоў маладзейшыя. У 1893, 1894, 1895 гадах адпаведна нарадзіліся Люцыя Нарцызаўна Навіцкая, Праскоўя Ігнатаўна Протчанка і Варвара Васільеўна Хмелянок.

Амаль усе з названых жанчын ніколі сур'ёзна не хварэлі, да глыбокага веку захавалі нядрэнную памяць і часам ахвотна ўспаміналі найбольш яркія падзеі з мясцовага і асабістага жыцця.

«Бога шанавалі, ніякай працы не цураліся і здаровае жыццё вялі» — прыкладна так тлумачаць «сакрэт» свайго даўгалецця бабулі. І яшчэ пагаджаюцца з думкай, што нямалаважнай умовай іх працяглага жыцця з'яўлялася цудоўнае прыроднае асяроддзе прыдняпроўскіх мясцін.

С. Д. Карпенка

Культура

Багацце культурнай спадчыны на Брагіншчыне выразна праявілася ў развіцці самадзейнай народнай творчасці,

Народны пісьменнік І. П. Шамякін у г. п. Камарын

Члены літаратурнага аб'яднання «Ніва» пры райгазеце «Маяк Палесся». 1984 г.

асабліва ў 60—70-я гг. Менавіта гады адбылося творчае станаўленне і росквіт многіх самадзейных калектываў, а драматычнаму гуртку Брагінскага раённага Дома культуры было нададзена ганаровае найменне народнага тэатра. Ягоныя ж рэжысёр Я. М. Шайкевіч і старэйшы самадзейны акцёр Я. К. Сачок удастоены Грамат Вярхоўнага Савета рэспублікі. Самадзейныя калектывы Астраглядаўскага, Сабалёўскага, Сялецкага, Тэльманаўскага, Ясянёўскага і шэрагу іншых сельскіх клубаў і Дамоў культуры здабылі шырокую вядомасць як сапраўдныя энтузіясты і папулярызатары народных песень і танцаў. На развіцці мастацкай самадзейнасці Брагінскі раён (тагачасная загадчыца аддзела культуры Таццяна Карпава) неаднойчы адзначаўся ў ліку лепшых на Гомелыпчыне. Такую высокую ацэнку аматары самадзейнай сцэны ў далейшым пацвердзілі масавасцю ўдзельнікаў і прыкметна ўзросшым майстэрствам выканання. У праведзеных раённых аглядах агітацыйна-мастацкіх брыгад (красавік 1974 г.), калектываў мастацкай самадзейнасці (снежань 1974 г.) і музычных канцэртных гуртоў (студзень 1975 г.) прынялі ўдзел больш за 40 калектываў з агульнай колькасцю каля 500 удзельнікаў. На змястоўнасці праграм і майстэрстве выканання лепшых ацэнак удастоіліся агітбрыгады Асарэвіцкага, Камарынскага, Сабалёўскага, Мікуліцкага СДК, драматычныя калектывы Гдзенскага, Глухавіцкага, Кіраўскага, Красненскага сельскіх устаноў культуры.

У 1975 г. Брагінскаму раёну прысуджаны пераходны Чырвоны сцяг Савета Міністраў БССР і Белсаўпрафа за дасягнутыя поспехі ў рэспубліканскім спаборніцтве за далейшае развіццё культуры, кінаабслугоўвання насельніцтва і кніжнага гандлю.

З 1983 г. у раёне пачало практыкавацца правядзенне справаздачных кан-

Ансамбль народных інструментаў Сялецкага сельскага Дома культуры

Група танцавальнага калектыву Брагінскага раённага Дома культуры. 1985 г.

цэртаў. Надчас іх удала выступалі самадзейныя артысты з фальклорна-этнаграфічных гуртоў «Асарэвіцкія вячоркі» і «Савіцкія вячоркі», фальклорна-этнаграфічнага танцавальнага калектыву і ансамбля народных інструментаў Сялецкага сельскага клуба, танцавальных гуртоў раённага Дома культуры, Сабалёўскага і Красненскага СДК.

Аглядавыя журы на той час і пазней падкрэслівалі, што ў творчым саперніцтве на сцэне пераможцамі часцей выходзяць калектывы, якім былі ўласцівыя рысы мясцовай самабытнасці. Менавіта гэта надавала папулярнасці фальклорна-этнаграфічнаму калектыву Зарачанскага сельскага клуба. У яго выкананні заўсёды зачароўвалі беларускія абрадавыя, народныя лірычныя і жартоўныя песні «Як на нашай ніўцы», «Ой, каліна не вярба», «На гары дробны дождж ык», прыпеўкі на мясцовыя тэмы ў выкананні Валянціны Цімошчанка, Марыі Протчанка, Агаф'і Філіпенка, Ніны Краўчанка, Мікалая і Праскоўі Коласаў і іншых.

Высокай ацэнкі заслугоўвае дзейнасць хору Малажынскага сельскага Дома культуры, створанага 20 гадоў таму назад на базе жаночага харавой групы. Вялікая заслуга ў творчым станаўленні гэтага калектыву яго ранейшых мастацкіх кіраўнікоў Н. Х. Давыдоўскай, В. М. Бабрынёвай, Т. В. Чарняпок, а таксама В. Ц. Новіка, які кіруе ім на працягу апошніх дзесяці гадоў. Хор вядзе актыўную канцэртную дзейнасць, удзельнічае ў правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў у вёсках свайго сельсавета, суседняга Лоеўскага раёна і ў райцэнтры.

Два дзесяцігоддзі споўнілася таксама фальклорна-этнаграфічнаму калектыву Карлаўскага і амаль столькі ж — фальклорнай групе Бярозкаўскага сельскіх клубаў, на чале якіх сапраўдныя энтузіясты мастацкай самадзейнасці А. В. Шары і Е. І. Чумак. Калектывы мастацкай самадзейнасці Камарынскага, Малажынскага, Карлаўскага сельскіх Дамоў культуры неаднаразова былі лаўрэатамі і дыпламантамі раённых і абласных аглядаў і конкурсаў.

Нягледзячы на складанасці паслячарнобыльскай сітуацыі, у раёне здолелі захаваць пераважную большасць калектываў мастацкай самадзейнасці. Пры іх актыўным удзеле стала традыцыйным правядзенне адроджаных народных святаў і абрадаў: калядак, купалля, масленіцы, зажынак, дажынак. Наладжваюцца таксама фестывалі, конкурсы патрыятычнай песні, дзіцячай аўтарскай творчасці «Іскрынкі Палесся» і інш. Звычайна ў Брагіне, Камарыне, буйнейшых населеных пунктах да такіх масавых мерапрыемстваў прымяркоўваюцца выстаўкі твораў дэкаратыўна-прыкладнога майстэрства. На іх сваё ўмельства паказваюць дзесяткі самадзейных мастакоў, разьбяроў, ткачых, вышывальшчыц і інш.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Брагіншчына спартыўная

Пачаткам актывізацыі фізкультурна-спартыўнага руху на Брагіншчыне можна лічыць 1950 г., калі ў сувязі са стварэннем на Беларусі добраахвотнага спартыўнага таварыства «Калгаснік»

Футбольная каманда Брагінскай МПМК-42. 1985 г.

(у далейшым — «Ураджай») ён выйшаў за межы школьных спартыўных пляцовак і пачаў пашырацца ў сельскіх працоўных калектывах, якія ў пераважнай большасці сталі юрыдычнымі членамі таварыства. Праверкай стану фізкультурнай работы ў яго нізавых фарміраваннях з'явіліся праведзеныя ўжо ў наступным годзе масавыя раённыя спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы, валейболе, футболе, гарадках і іншых відах спорту.

Напрыканцы 60-х — пачатку 70-х гг. у раёне дзейнічалі 32 сельскія калектывы фізкультуры, у тым ліку 29 у калгасах і саўгасах. У іх налічвалася больш за 5 тысяч чалавек. У гэты перыяд брагінскія спартсмены паспяхова выступалі на абласных і міжраённых спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы, лыжах, футболе і інш. Поспеху садзейнічалі рэгулярныя трэніроўкі пад кіраўніцтвам вопытных інструктараў, пераважна выкладчыкаў фізкультуры мясцовых школ.

Т. Гарбацюк

Н. Прышчэпава

У 1963 г. «залатой» рэкардсменкай рэспубліканскіх спаборніцтваў па лёгкаатлетычным кросе стала дзесяцікласніца Крыўчанскай сярэдняй школы Надзея Прышчэпава. Восенню таго ж года ў складзе зборнай Беларусі яна паспяхова выступіла на Усесаюзных спаборніцтвах у Маскве, прысвечаных XIII з'езду прафсаюзаў СССР. Другая вучаніца гэтай жа школы, у далейшым — выхаванка Гомельскай школы-інтэрната спартыўнага профілю Таццяна Гарбацюк неаднойчы ўдала выступала на раённых спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы, а ў 1975 г. заваявала першынство ў эстафетным бегу 4×400 м у спаборніцтвах па кубак СССР — на прыз газеты «Известия».

У 1978 г. праводзіўся розыгрыш першынства раёна па футболе, прысве-

чаны VII Спартакіядзе народаў СССР. У ім прынялі ўдзел каманды 14 працоўных калектываў. У фінальнай гульні перамаглі футбалісты Камарынскай ПМК-1.

Далейшаму паляпшэнню фізкультурна-спартыўнай работы спрыялі прынятыя на месцах меры ў адпаведнасці з патрабаваннямі партыйна-ўрадавай пастановы аб уздыме масавасці фізічнай культуры і спорту, прынятай у 1981 г. Асабліва гэта заўважалася ў пярвічных арганізацыях таварыства райвузла сувязі, ПМК-1, саўгасаў «Астрагляды», «Брагінскі», калгасаў «Шлях да камунізму», «Чырвоная ніва», «Сцяг Леніна», Буркоўскай, Савіцкай, Піркаўскай сярэдніх школ. У прыватнасці, спартсмены з гэтых калектываў у наступным годзе добра зарэкамендавалі сябе ў абласным лёгкаатлетычным кросе на прыз газеты «Правда». Вызначыліся лёгкаатлеты з Брагіна Уладзімір Раманюк, Васіль Чысцік, Васіль Шкурко, вучаніцы Вуглоўскай і Буркоўскай школ Анжэла Найдзенка і Вера Чыгарэўская.

У 1983 і 1985 гг. пераможцамі фінальных матчаў розыгрышу кубкаў памяці загінуўшага пры ратаванні збожжавага поля ад пажару камсамольца Анатоля Бельчанкі і земляка Героя Савецкага Саюза П. С. Жукава з'явіліся футбалісты з калгаса «Сцяг Леніна» і МПМК-42. З тае пары футбол стаў самым папулярным відам спорту сярод моладзі Брагіншчыны.

У нашай краіне і за яе межамі добра вядома імя героя-пажарніка, ураджэнца вёскі Спярыжжа Васіля Ігнаценкі, майстра спорту СССР. Пра яго, высакакласнага спецыяліста, адважнага чалавека, надзейнага таварыша і выдатнага спартсмена, пісала газета «Правда» ў нумары за 9 чэрвеня 1986 г. Цяпер у раёне традыцыйна праводзяцца абласныя спаборніцтвы па прыкладным пажарным спорце — на кубак імя В. І. Ігнаценкі.

Да часу перасялення ў не закранутыя радыяцыяй мясціны рэспублікі ў вёсцы Калыбань жыў вядомы не толькі ў нашых краях майстар шахматнай кампазіцыі Аляксей Мацвеевіч Петрусенка. На яго рахунку нямала перамог у спаборніцтвах: другое месца ў першынстве Гомельшчыны па складанні шахматных задач і эцюдаў, чацвёртае месца на буйнейшым конкурсе рыжскага часопіса «Шахматы», у якім прымалі ўдзел мацнейшыя шахматныя кампазітары.

Наступствы чарнобыльскай катастрофы адмоўна паўплывалі на развіццё фізкультуры і спорту ў раёне. Але ў апошнія гады тут намеціўся новы ўздым. Створана і ўдасканальваецца спартыўная база: ёсць 2 стадыёны, 13 спартыўных залаў, трэнажорная зала і пакой у дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе і Брагінскай СШ, 32 спартыўныя пляцоўкі, на якіх праводзяцца стаўшыя традыцыйнымі гульні і спаборніцтвы па розных відах спорту.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

ЗА ГАЗЕТНЫМ РАДКОМ

Па старонках брагіскай раённай газеты «Маяк Палесся» за 1963—1991 гг.

Уручэнне ўзнагарод герою

9 мая 1963 г.

Мужна змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі радавы Данчанка Рыгор Дзяменцьевіч. За мужнасць і адвагу ён быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Вясной 1945 года Рыгор Дзяменцьевіч некалькі разоў быў паранены. Пасля непрацяглага лячэння зноў і зноў станавіўся ў строй. І не ведаў, што камандаванне яшчэ тры разы прадстаўляла яго да баявых узнагарод.

30 кастрычніка г. г. ураджэнцу Астраглядаўскага сельсавета Р. Д. Данчанку ва ўрачыстай абстаноўцы былі ўручаны тры ордэны Чырвонай Зоркі.

З фермы — у акадэмію

7 сакавіка 1964 г.

Пасля заканчэння сярэдняй школы Ганна Кавалёва больш 5 гадоў працавала даяркай на касачоўскай ферме калгаса «Шлях да камунізма», лічылася адной з перадавых жывёлаводак гаспадаркі. Але была ў дзяўчыны мара вучыцца далей.

І праўленне калгаса накіравала адну з лепшых працаўніц на вучобу ў Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію.

Я. Агапітаў

Сустрэча праз 22 гады

6 сакавіка 1965 г.

Восенню 1943 года нямецка-фашысцкія акупанты вывезлі ў Германію жыхарку вёскі Хракавічы Судаленка Ксенню Савельеўну разам з яе дзесяцігадовай дачкой. Да канца вайны Ксенія батрачыла ў адпаго заможнага аўстрыйскага селяніна.

Пры вяртанні на радзіму маці згубіла дачку. Адшукаць яе сляды ўдалося толькі праз 22 гады. Аказалася, што Наташу Судаленка ўдачарыла і выгадавала адна добрая аўстрыйская жанчына.

Радаснай была сустрэча маці і дачкі, разлучаных вайной.

Першы выпуск

11 чэрвеня 1968 г.

У брагінскай дзіцячай музычнай сямігадовай школе адбыўся першы выпуск навучэнцаў. На працягу пяці гадоў тут паспяхова займаліся па класу баяна 16 хлопчыкаў і дзяўчынак. А праз два гады адбудзецца першы выпуск навучэнцаў па класу фартэпіяна.

Шчаслівыя старты зямлячкі

11 верасня 1975 г.

Яшчэ некалькі метраў — і канец фінішнай прамой.

— Пераможцай на дыстанцыі 400 метраў сярод дзяўчат стала гамяльчанка Таня Гарбацюк! — аб'явіў па рэпрадуктарах суддзя-інфарматар.

Гэта было ў час спаборніцтваў лёгкаатлетаў на кубак СССР — кубак газеты «Известия», якія праходзілі на гомельскім стадыёне «Лакаматыў». У той жа дзень дзяўчына ўдзельнічала ў эстафетным бегу 4×400 метраў і дапамагла камандзе Гомеля заняць чацвёртае месца.

Абараняючы спартыўны гонар свайго завода, горада, вобласці, Таня заўсёды помніць родны Брагінскі раён, Крыўчанскую школу, якія далі ёй пуцёўку ў вялікі спорт.

У. Пігуноў

Сустрэча з героем

1 красавіка 1986 г.

У гасцях у брагінчан пабываў Герой Савецкага Саюза, легендарны лётчык Дзевятаеў М. П., які ў гады Вялікай Айчыннай вайны вырваўся з варожага палону, захапіўшы на аэрадроме нямецкі самалёт.

Новая паліклініка

25 верасня 1986 г.

У гарпасёлку Брагін здадзена ў эксплуатацыю новая трохпавярховая паліклініка. Светлыя і прасторныя кабінеты, утульныя калідоры. Паліклініка мае сучаснае абсталяванне для аказання медыцынскай дапамогі жыхарам раёна.

Знойдзена костка маманта

23 чэрвеня 1987 г.

Вучань дзесятага класа Брагінскай СШ Артур Качаноўскі знайшоў у пяску, прывезеным з кар'ера, што ля вёскі Чырвоная Гара, дзесяцікілаграмовую костку маманта. Знаходка перададзена ў школьны музей.

Ю. Заматарэнка

Вечар памяці

27 сакавіка 1979 г.

На вечары памяці беларускага пісьменніка У. Б. Карпава ў Камарынскай пасялковай бібліятэцы яго імя пабывала група літаратараў рэспублікі на чале з кіраўніком беларускай пісьменніцкай арганізацыі І. П. Шамякіным, а таксама жонка Уладзіміра Барысавіча — Марыя Міхайлаўна.

Ахвяруючы сабой

16 жніўня 1979 г.

Гэта здарылася 7 жніўня 1979 года ў вёсцы Грушнае. Камсамолец Леанід Анапрэенка выратаваў пакупацца. Падышоў да рэчкі і раптам пачуў крык аб дапамозе. Не раздумваючы, юнак кінуўся на выратаванне дзіцяці. Моцным патокам вады яго зацягнула пад шлюз. Хлопец паспеў вышпурхнуць малога з усмоктваючай плыні, але выбрацца самому не хапіла сіл.

Так загінуў дваццацігадовы юнак. Ён нарадзіўся і вырас у Грушным. Працаваў механізатарам у саўгасе «Савічы», карыстаўся павагай і аўтарытэтам сярод таварышаў па рабоце і вяскоўцаў. Сціплым, добразычлівым яго ведалі ўсе. Дарагой цаной выканаў Леанід свой абавязак чалавека, грамадзяніна, камсамольца.

П. Цярэнцьеў

Танк на п'едэстале

5 ліпеня 1983 г.

3 ліпеня ў Брагіне ва ўрачыстай абстаноўцы і ў прысутнасці групы ветэранаў 61-й арміі, якія прымалі ўдзел у вызваленні Брагіншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, адкрыты мемарыяльны помнік «Танк». На вечную стаянку на пастаменце стаў Т-34 — баявая машына з роты Н. В. Хлістунова 2-га батальёна 68-й асобнай танкавай брагады, што ўдзельнічала ў вызваленні Брагіншчыны восенню 1943 года.

Галле — Брагін

18 снежня 1990 г.

Па ініцыятыве міністра замежных спраў аб'яднанай Германіі Г.-Д. Геншара жыхары яго роднага горада Галле сабралі і даставілі ў Брагін 8 тысяч навагодніх падарункаў для дзяцей раёна, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС.

На вянчанне — у Брагін

16 жніўня 1991 г.

У суправаджэнні інакіні мінскай царквы Маці Валеры і групы паломнікаў-веруючых у Брагінскую Свята-Нікольскую царкву з далёкай Грэцыі для выканання абрада вянчання прыязджала пара маладажонаў.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Ушанаваныя Радзімай

Героі Сацыялістычнай Працы

Галка Уладзімір Мікітавіч нарадзіўся ў 1923 г. у в. Чамярысы Рэчыцкага павета Гомельскай губерні. Герой Сацыялістычнай Працы (1971). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1951 г. дызеліст, буравы майстар Беларускай канторы разведачнага бурэння ў Мазыры. З 1965 г. буравы майстар Рэчыцкай нафтаздабываючай экспедыцыі глыбокага бурэння трэста «Белнафтагазаразведка» Гомельскай вобласці.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Славы III ступені, медалямі.

Зелянкоўскі Іван Фёдаравіч нарадзіўся ў 1933 г. у в. Марытон. Герой Сацыялістычнай Працы (1978). З 1947 г. калгаснік калгаса «Чырвоная ніва» Брагінскага раёна. У 1951 г. скончыў Рудакоўскую школу механізацыі сельскай гаспадаркі. Працаваў трактарыстам Брагінскай МТС. Пасля службы ў арміі зноў вярнуўся ў МТС. З 1958 г. працаваў у родным калгасе «Чырвоная ніва»: напачатку трактарыстам, затым — брыгадзірам трактарнай брыгады. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1974—1979 гг. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам раённага і сельскага Саветаў.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна (1966, 1973), медалямі.

Клімянок Максім Аляксандравіч нарадзіўся ў 1902 г. у в. Ніжнія Жары. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). У 1928—1941 гг. на гаспадарчай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Вілейскай вобласці. Са жніўня 1943 г. камісар атрада, з 1944 г. камісар партызанскай брыгады імя М. І. Калініна Вілейскай вобласці, адначасова член бюро Міёрскага падпольнага РК КП(б)Б. У 1944—1953 гг. на гаспадарчай і савецкай рабоце, у 1953—1970 гг.— старшыня калгаса імя Чапаева Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, іншымі ордэнамі і медалямі.

Памёр у 1992 г.

Мартыненка Іван Ціханавіч нарадзіўся ў 1927 г. у в. Валахоўшчына. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Працоўную дзейнасць пачаў у 1943 г. калгаснікам. З 1955 па 1967 г. працаваў брыгадзірам, а потым намеснікам старшыні калгаса «Запаветы Леніна» Брагінскага раёна. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1963—1967 і 1985—1990 гг. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам раённага і сельскага Саветаў.

І. Ф. Зелянкоўскі

І. Ц. Мартыненка

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна (1966, 1976), медалямі. Жыве ў Гомелі.

Мігай Рыгор Мікалаевіч нарадзіўся ў 1927 г. у в. Глухавічы. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). У 1945—1967 гг. працаваў у Верхне-Дняпроўскім рачным параходстве. З 1967 г. механік Пінскага суднабудаўніча-суднарамонтнага завода.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

Сарокіна Ганна Сямёнаўна нарадзілася ў 1913 г. у в. Перасяцінец. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). У 1931—1958 гг.— даярка калгаса імя Чапаева, у 1959—1970 гг.— саўгаса «Бярозкі» Гомельскага раёна.

Узнагароджана ордэнам Леніна, медалём.

Памерла ў 1970 г.

Сіраж Іван Дзмітрыевіч нарадзіўся ў 1933 г. у в. Астрагляды. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Працоўную дзейнасць пачаў у 1947 г. у саўгасе «Астрагляды». Пасля службы ў Савецкай Арміі ў 1955—1956 гг. працаваў на Рэчыцкім мэблевым камбінаце. У 1957 г. узначаліў механізаванае звяно па вырошчванні прапашных культур у саўгасе «Астрагляды». Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1970—1974 гг. Неаднаразова выбіраўся дэпутатам раённага і сельскага Саветаў.

Заслужаны механізатар рэспублікі.

Г. С. Сарокіна

Б. В. Шылец

Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966), медалямі.

Шкурко Тамара Іванаўна нарадзілася ў 1928 г. у в. Буркі. Герой Сацыялістычнай Працы (1948). Кандыдат сельскагаспадарчых навук (1971). Скончыла Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1957). У 1944—1948 гг. звеннявая па вырошчванні збожжавых у калгасе «Чырвоная ніва» Брагінскага раёна. З 1957 г. у Беларускім навукова-даследчым інстытуце бульбаводства і плодаагародніцтва: аграном, малодшы навуковы супрацоўнік. У 80-я гг. працавала навуковым супрацоўнікам музея Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1951—1955 гг.

Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі.

Шылец Барыс Васільевіч нарадзіўся ў 1922 г. у в. Ясменцы. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1948 г. у калгасе «Шлях да камунізму» Брагінскага раёна: палявод, брыгадзір паляводчай брыгады, намеснік старшыні калгаса.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1966), «Знак Пашаны» (1958), Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

Памёр у 1988 г.

* * *

Гермель Станіслаў Уладзіміравіч. Кавалер ордэна Працоўнай Славы трох ступеней. Нарадзіўся ў 1939 г. у в. Гарадзішча. Механізатар шырокага профілю калгаса імя Тэльмана. У 70—80-я гг. з'яўляўся ініцыятарам шэрагу каштоўных працоўных пачынаў, спаборніцтва за вышэйшы сутачны намалот збожжа. Па выніках жніва-73 удастоены першай прэміі Савета Міністраў БССР і Белсаўпрафа за высокія паказчыкі ў рэспубліканскім спаборніцтве на збожжаўборцы.

С. У. Гермель абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР восьмага склікання, дэлегатам 1-га з'езда Саветаў

С. У. Гермель

СССР (1989). Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1972), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), Працоўнай Славы трох ступеней (1975, 1979, 1986).

Ганаровыя грамадзяне

Вайцянкоў Мікалай Рыгоравіч нарадзіўся ў 1947 г. у г. Шверын былой Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі. Ганаровы грамадзянін г. п. Брагін (1997). Пасля заканчэння Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі працаваў майстрам Касьянаўскага аўтарамзавода ў г. Чарамхова Іркуцкай вобласці. У 1970–1976 гг.– на гаспадарчай, камсамольскай, з 1977 г.– на партыйнай рабоце. З 1989 да 1995 г.– старшыня Гомельскага аблвыканкама, абласнога Савета дэпутатаў. У 1995–1997 гг.– Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Чэшскай Рэспубліцы і ў Славацкай Рэспубліцы па сумяшчальніцтве. Затым зноў працаваў старшынёй Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта. У лістападзе 2001 г. прызначаны паслом па асобых даручэннях Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

М. Р. Вайцянкоў

У. І. Зелянкоўскі

Зелянкоўскі Уладзімір Іванавіч нарадзіўся ў 1928 г. у в. Кавака. Ганаровы грамадзянін г. п. Брагін (1997). Працоўную дзейнасць пачаў у 1945 г. у мясцовым калгасе. Пасля службы ў арміі з 1952 г. на працягу 46 гадоў працаваў эканамістам у раённым аддзеле статыстыкі. З 1998 г. і да выхаду на пенсію ўзначальваў інспекцыю планавання даходаў і эканамічнага аналізу фінансавага аддзела райвыканкама. Узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку».

Кірсанаў Аляксандр Васільевіч. Герой Савецкага Саюза (15.1.1944). Генерал-маёр (1943). Ганаровы грамадзянін г. п. Брагін (1968). Нарадзіўся ў 1898 г. у г. Казань. Скончыў Кіеўскую аб'яднаную ваенную школу (1926), Ваенную акадэмію Генштаба (1949). У Чырвонай Арміі з 1920 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. Падчас Вялікай Айчыннай вайны з верасня 1941 г. на Паўднёвым, Сталінградскім, Цэнтральным і Беларускім франтах. 76-я гвардзейская Чарнігаўская стралковая дывізія пад яго камандаваннем вызначылася пры фарсіраванні Дняпра восенню 1943 г.

Пасля вайны служыў у Савецкай Арміі, працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна.

Новікаў Мікалай Міхайлавіч. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Ганаровы грамадзянін г. п. Камарын (1968). Нарадзіўся ў 1918 г. у г. Міхайлаўскае Макшанскага раёна Пензенскай вобласці. На фронце з 1941 г. Вызначыўся ў баях пры вызваленні Камарынскага раёна. У ноч з 22 на 23 верасня 1943 г. намеснік камандзіра 360-га стралковага палка 74-й стралковай дывізіі М. М. Новікаў з перадавой групай у

М. М. Новікаў

50 чалавек фарсіраваў Дняпр, авалодаў гарадскім пасёлкам Камарын і ўтрымліваў яго да падыходу асноўных сіл палка. У баях за пёскі Івашкі, Кацічаў, Пасудава замяніў параненага камандзіра палка і забяспечыў далейшае пашырэнне плацдарма, паспяховае прасоўванне палка на захад. Пасля вайны да пачатку 70-х гг. служыў у Савецкай Арміі. Палкоўнік у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Суворава, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга і двума — Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

Сіранькоў Аляксандр Фёдаравіч нарадзіўся ў 1922 г. у в. Радуга Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. Ганаровы грамадзянін г. п. Брагін (1986). У 1941 г. скончыў Гомельскі педагагічны інстытут імя В. П. Чкалава. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1963 да 1983 г. працаваў дырэктарам брагінскіх сярэдніх школ № 1, 2. Узнагароджаны ордэнамі Суворава III ступені, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі.

Памёр у 1997 г.

Сташак Мікалай Іванавіч. Герой Савецкага Саюза (16.10.1943). Генерал-лейтэнант (1968). Кандыдат ваенных навук (1961). Ганаровы грамадзянін г. п. Камарын (1984). Нарадзіўся ў 1914 г. на хут. Марынаўскі Бяляеўскага раёна Адэскай вобласці. Скончыў Ваенную акадэмію Генштаба (1952). У Чырвонай Арміі з 1935 г. На фронце з 1941 г. Вызначыўся ў баях за вызваленне Камарынскага раёна. У верасні 1943 г. 310-ты стралконы полк 8-й стралковай дывізіі пад камандаваннем падпалкоўніка М. І. Сташака на падручных сродках

М. І. Сташак

Першы сакратар РК КПБ Г. М. Панькоў уручае А. Ф. Сіранькова са званнем «Ганаровы грамадзянін Брагіна»

М. А. Сторажаў

першым фарсіраваў Днепр, захапіў і расшырыў плацдарм, на які затым пераправіліся іншыя часці дывізіі, вызваліў райцэнтр Камарын.

Да 1973 г. М. І. Сташак служыў у Савецкай Арміі.

Сторажаў Міхаіл Адамавіч нарадзіўся ў 1926 г. у в. Канаток Ельскага раёна Гомельскай вобласці. Ганаровы грамадзянін г. п. Брагін (1988). Скончыў школу палітработнікаў у Ленінградзе (1953), Мінскую ВПШ пры ЦК КПСС (1962). У 1943 г. знаходзіўся ў партызанскім атрадзе імя Чапаева Чарнігаўскага партызанскага злучэння пад камандаваннем М. Таранушчанкі. З кастрычніка 1943 г. у Савецкай Арміі. Радавы 310-га стралковага палка 74-й стралковай дывізіі. Пасля вайны да 1950 г. служыў у арміі. У 1951—1953 гг. працаваў у Палескім абласным упраўленні міліцыі (г. Мазыр), у 1954—1986 гг. на адказных пасадах у партыйных і савецкіх органах Хойніцкага і Брагінскага раёнаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

Памёр у 1998 г.

Заслужаныя работнікі Беларусі

Адукацыя

Буйцевіч Людвіг Іванавіч, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Савіцкай сярэдняй школы.

Джажора Аляксандра Якаўлеўна, настаўніца брагінскай сярэдняй школы № 1.

Залатарэнка Юрый Яўгенавіч, дырэктар брагінскай сярэдняй школы № 2.

Заяц Таццяна Ігнатаўна, настаўніца Астраглядаўскай сярэдняй школы.

Збітиева Ніна Міхайлаўна, настаўніца Хойніцкай сярэдняй школы.

Зубар Васіль Якаўлевіч, настаўнік Малажыпскай сярэдняй школы.

Кастрыцкі Уладзімір Лукіч, настаўнік Брагінскай сярэдняй школы.

Кісялёва Фаіна Сямёнаўна, настаўніца Буркоўскай васьмігадовай школы.

Куліпіч Аляксандра Кірылаўна, настаўніца брагінскай сярэдняй школы № 2.

Ліпская Надзея Іванаўна, настаўніца брагінскай сярэдняй школы № 1.

Майсевіч Кацярына Фёдараўна, настаўніца Просмыцкай пачатковай школы.

Нікіцін Сцяпан Аляксеевіч, дырэктар Брагінскай сярэдняй школы.

Піляк Уладзімір Фёдаравіч, завуч Бабчынскай сярэдняй школы Хойніцкага р-на.

Пятровіч Ганна Кірылаўна, настаўніца Астраглядаўскай сярэдняй школы.

Седранок Матрона Майсееўна, загадчыца Каманоўскай пачатковай школы.

Серыкава Разалія Мікалаеўна, настаўніца Камарынскай сярэдняй школы.

Сіранькоў Аляксандр Фёдаравіч, дырэктар брагінскай сярэдняй школы № 1.

Супічэнка Марыя Міхайлаўна, настаўніца Глухавіцкай васьмігадовай школы.

Шафранаў Леў Нікіфаравіч, дырэктар Сабалёўскай сярэдняй школы.

Шумейка Барыс Барысавіч, дырэктар Камарынскай сярэдняй школы.

Яроцкая Юзэфа Савельеўна, настаўніца Камарынскай сярэдняй школы.

Ахова здароўя

Віпаградава Ніна Іванаўна, урач Брагінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Умінская Маргарыта Рыгораўна, урач Ялчанскай участковай урачэбнай амбулаторыі.

Мастацтва, культура

Вашчанка Гаўрыла Харытонавіч, загадчык кафедры манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута.

Дзялец Міхаіл Іванавіч, дзяржаўны дзеяч.

Палескі (Станкевіч) Вячаслаў Пятровіч, беларускі драматург і журналіст.

Піліпенка Міхаіл Фёдаравіч, беларускі этнолаг і гісторык.

Яскевіч Уладзімір Мікалаевіч, саліст ансамбля песні і танца Чырвонасцяжнай Беларускай ваеннай акругі.

Навукв

Паўлючэнка Міхаіл Міхайлавіч, загадчык лабараторыі цвёрдафазных рэакцый Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі АН БССР.

Сельская гаспадарка

Байдак Рыгор Іванавіч, галоўны інжынер калгаса «Чырвоная ніва».

Самойленка Уладзімір Цімафеевіч, галоўны аграном саўгаса «Стралічава» Хойніцкага р-на.

Адзначаныя ўрадавымі ўзнагародамі

Ордэнам Леніна

Аўдзеенка Аляксандр Ціханавіч, камбайнер калгаса імя Тэльмана.

Балашэнка Леанід Міхайлавіч, трактарыст калгаса «Дняпровец».

Буйневіч Анатоль Антонавіч, сакратар парткама калгаса «Чырвоная ніва».

Ганчарэнка Алена Міхайлаўна, акушэрка Брагінскай раённай бальніцы.

Гаўрыленка Яўгенія Віктараўна, свінарка калгаса імя Тэльмана.

Гацка Ульян Аляксандравіч, генерал-маёр артылерыі, былы начальнік ваеннага вучылішча ў г. Кіеў.

Грыцанок Мікалай Пятровіч, удзельнік будаўніцтва Днепрагэса і Краснаярскай ГЭС імя Леніна.

Дагура Ксенафонт Харытонавіч, першы сакратар Брагінскага райкама КП(б)Б.

Дзядзюшкін Аляксандр Сафронавіч, галоўны аграном калгаса «Шлях да камунізму».

Касцючэнка Уладзімір Іванавіч, галоўны аграном калгаса імя Чкалава.

Кулай Іван Васільевіч, старшыня калгаса «Чырвоная ніва».

Кулініч Аляксандра Кірылаўна, настаўніца Брагінскай сярэдняй школы.

Лазовік Міхаіл Лаўрэнавіч, механізатар калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Ліхашапка Кацярына Адамаўна, звеннявая калгаса «Ленінскі шлях».

Мартыненка Рыгор Лявонавіч, трактарыст калгаса імя Гагарына.

Мельнічэнка Пётр Іовіч, брыгадзір комплекснай брыгады Брагінскай МТМК-42.

Новік Кацярына Аўтаномаўна, цялятніца саўгаса «Астрагляды».

Пісьменная Праскоўя Васільеўна, свінарка саўгаса «Пасудава».

Радчанка Антон Іванавіч, звеннявы калгаса імя Тэльмана.

Рухлевіч Сямён Адамавіч, звеннявы саўгаса «Астрагляды».

Сабаленка Іван Лявонцьевіч, старшыня калгаса «Шлях да камунізму».

Стрыбульская Алена Піліпаўна, дырэктар Чамярыскай школы ў даваенныя гады.

Стрыбульскі Сяргей Міхайлавіч, на-

А. І. Радчанка

стаўнік Чамярыскай школы ў даваенныя гады.

Сяргеенка Уладзімір Мікалаевіч, трактарыст калгаса імя Чкалава.

Таміловіч-Данчанка Сяргей Аляксандравіч, удзельнік грамадзянскай вайны.

Ціханчук Сямён Аўрамавіч, генерал-лейтэнант.

Цярэшчанка Васіль Андрэевіч, брыгадзір калгаса «Парыжская камуна».

Ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі

Аўдзеенка Аляксандр Ціханавіч, механізатар калгаса імя Тэльмана.

Зіневіч Ігар Васільевіч, першы сакратар Брагінскага райкама КПБ.

Краўчанка Несцер Сцяпанавіч, брыгадзір калгаса «Пераможнік».

Кулай Анатоль Сідаравіч, трактарыст калгаса «Чырвоная ніва».

Кулай Іван Васільевіч, старшыня калгаса «Чырвоная ніва».

Кулеш Пётр Нікіфаравіч, механізатар калгаса «Рассвет».

Лазовік Міхаіл Лаўрэнавіч, трактарыст калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Прышчэп Марыя Фёдараўна, калгасніца калгаса «Сцяг Леніна».

Раманюк Фёдар Цітавіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана.

Русак Павел Іванавіч, трактарыст калгаса імя Чкалава.

Сабаленка Іван Лявонцьевіч, старшыня калгаса «Шлях да камунізму».

Сіранькоў Аляксандр Фёдаравіч, дырэктар брагінскай сярэдняй школы № 1.

Стрыбук Іван Адамавіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Чырык Настасся Цітаўна, даярка калгаса «Рассвет».

Шчука Іван Якаўлевіч, трактарыст саўгаса «Савічы».

Шылец Алена Канстанцінаўна, калгасніца калгаса імя Калініна.

Шылец Іван Рыгоравіч, камбайнер калгаса імя Калініна.

Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

Асіпенка Васіль Пятровіч, жывёлавод калгаса «Шлях да камунізму».

Атрошчанка Сцяпан Сяргеевіч, загадчык малочнатаварнай фермы калгаса «Чырвоная Украіна».

Аўдзеенка Аляксандр Ціханавіч, камбайнер калгаса імя Тэльмана.

Байдак Рыгор Іванавіч, галоўны інжынер калгаса «Чырвоная ніва».

Бандарэнка Марыя Дзмітрыеўна, даярка калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Барысенка Фёдар Акімавіч, брыгадзір саўгаса «Савічы».

Белаконь Раіса Канстанцінаўна, даярка саўгаса «Астрагляды».

Бельчанка Васіль Пракопавіч, звеннявы саўгаса «Краснае».

Бельчанка Надзея Сямёнаўна, муляр Камарынскай МПМК-51.

Беразняцкі Фёдар Аўрамавіч, трактарыст саўгаса «Савічы».

Блатун Леанід Фёдаравіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Блатун Уладзімір Сцяпанавіч, брыгадзір калгаса «Шлях да камунізму».

Буйневіч Анатоль Антонавіч, эканаміст калгаса «Чырвоная ніва».

Бяршацкі Мікалай Лукіч, старшыня калгаса «Чырвоная Украіна».

Вайцяхоўскі Сцяпан Эдуардавіч, брыгадзір калгаса «Чырвоная ніва».

Валасенка Надзея Андрэеўна, свінарка калгаса «XVIII партз'езд».

Вініцкі Фёдар Андрэевіч, загадчык Брагінскай раённай ветэрынарнай аптэкі.

Гайдук Мікалай Андрэевіч, трактарыст калгаса імя Чкалава.

Гатальскі Іван Рыгоравіч, былы майстар райаб'яднання «Сельгастэхніка».

Гацка Васіль Іванавіч, брыгадзір калгаса «Запаветы Леніна».

Германенка Уладзімір Кузьміч, трактарыст калгаса «Запаветы Леніна».

Гракун Іван Сцяпанавіч, камбайнер саўгаса «Савічы».

Гракун Пётр Рыгоравіч, трактарыст саўгаса «Савічы».

Груда Кацярына Раманаўна, даярка саўгаса «Пасудава».

Губар Аляксандра Васільеўна, даярка калгаса імя Тэльмана.

Гутнік Вольга Адамаўна, брыгадзір калгаса «Пераможнік».

Дашук Васіль Назаравіч, брыгадзір калгаса імя Тэльмана.

Дзядзюшкін Аляксандр Сафронавіч, галоўны аграном калгаса «Шлях да камунізму».

Дзялец Ганна Макараўна, калгасніца калгаса імя Энгельса.

Дзям'янчык Андрэй Іванавіч, брыгадзір калгаса імя Тэльмана.

Другакоў Леанід Аляксеевіч, старшыня калгаса імя Кірава.

Ефіменка Васіліна Васільеўна, муляр Брагінскай МПМК-42.

Жураўская Галіна Пятроўна, даярка калгаса «Чырвоная ніва».

Жыжэнка Рыгор Рыгоравіч, экскаватаршчык Камарынскай ПМК-1 трэста «Калінкавічыводбуд».

Заяц Якаў Данілавіч, механізатар калгаса «Чырвоная ніва».

Зелянкоўская Любоў Васільеўна, калгасніца калгаса «Шлях да камунізму».

Зелянюк Мікалай Цімафеевіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Злыдзенка Аляксандр Паўлавіч, аграном калгаса «Парыжская камуна».

Кабанчук Піліп Іванавіч, калгаснік калгаса «Запаветы Леніна».

Каваленка Яўгенія Паўлаўна, свінарка калгаса «Чырвоная ніва».

Кавалёнак Феадосій Пятровіч, першы сакратар Камарынскага райкама КП(б)Б.

Казачэнка Васіль Іванавіч, старшыня калгаса імя Тэльмана.

Кандраценка Пётр Міхайлавіч, трактарыст калгаса «Запаветы Леніна».

Каранчук Адам Рыгоравіч, трактарыст калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Караткевіч Васіль Аляксеевіч, сакратар Камарынскага райкама КП(б)Б.

Кардаш Іван Пятровіч, жывёлавод калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Каржанеўская Марыя Ісакаўна, свінарка саўгаса «Савічы».

Кароткі Пётр Якаўлевіч, калгаснік калгаса імя К. Маркса.

Касцючэнка Уладзімір Іванавіч, галоўны аграном калгаса імя Чкалава.

Кацуба Мікалай Васільевіч, трактарыст калгаса «Пераможнік».

А. А. Клімкіна

Кацуба Уладзімір Паўлавіч, заатэхнік калгаса «Парыжская камуна».

Кечка Валянцін Васільевіч, дырэктар саўгаса «Брагінскі» (в. Слабада).

Кіслова Матрона Іванаўна, даярка калгаса «Запаветы Леніна».

Клімкіна Анастасія Аляксееўна, дырэктар Крыўчанскай сярэдняй школы.

Клімянок Пётр Яўгенавіч, трактарыст калгаса «Ніжні дняпровец».

Козел Мікіта Фёдаравіч, механізатар калгаса «Чырвоная Украіна».

Котчанка Вольга Аляксандраўна, даярка калгаса імя Калініна.

Котчанка Ганна Рыгораўна, свінарка саўгаса «Пасудава».

Котчанка Яўгенія Паўлаўна, даярка калгаса імя Тэльмана.

Кохан Рыгор Дзям'янавіч, дырэктар саўгаса «Брагінскі» (в. Піркі).

Крывенка Вера Аляксееўна, птушніца калгаса «Запаветы Леніна».

Крывянчук Міхаіл Рыгоравіч, каваль калгаса «Парыжская камуна».

Кулай Анатоль Сідаравіч, камбайнер Брагінскай МТС.

Кулай Андрэй Якаўлевіч, брыгадзір калгаса «Чырвоны працаўнік».

Кулай Іван Васільевіч, старшыня калгаса «Чырвоная ніва».

Кулай Міхаіл Іванавіч, звеняявы калгаса «Чырвоная ніва».

Кулеш Пётр Нікіфаравіч, трактарыст калгаса «Рассвет».

Лазовік Міхаіл Лаўрэнавіч, механізатар калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Ласіца Васіль Фёдаравіч, жывёлавод саўгаса «Пасудава».

Ломаў Уладзімір Фёдаравіч, старшыня калгаса «Рассвет».

Лутчанка Дзмітрый Паўлавіч, брыгадзір калгаса «Запаветы Леніна».

Маісеенка Лідзія Васільеўна, даярка калгаса імя Калініна.

Манойла Барыс Ігнатавіч, звеннявы саўгаса «Пасудава».

Манойла Ганна Сцяпанаўна, рабочая саўгаса «Пасудава».

Мартыненка Васіль Данілавіч, жывёлавод калгаса «Запаветы Леніна».

Мартыненка Марыя Цімафееўна, птушніца калгаса «Запаветы Леніна».

Мартыненка Мікалай Канстанцінавіч, трактарыст калгаса «Запаветы Леніна».

Мартыненка Рыгор Лявонцьевіч, трактарыст калгаса імя Гагарына.

Маручок Варвара Дармідонтаўна, калгасніца калгаса «XVIII партз'езд».

Музычэнка Іван Максімавіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Набок Мікалай Паўлавіч, брыгадзір саўгаса «Краснае».

Нікалаенка Міхаіл Паўлавіч, трактарыст саўгаса «Краснае».

Новік Аляксандр Андрэевіч, рабочы саўгаса «Астрагляды».

Новік Міхаіл Анікеевіч, брыгадзір калгаса імя Тэльмана.

Паўлючэнка Рыгор Максімавіч, звеннявы калгаса імя Калініна.

Пекуроўская Софія, былая настаўніца Крукаўскай школы, рабочая Новасібірскага патроннага завода.

Петрусенка Іван Сямёнавіч, трактарыст калгаса «Ленінскі шлях».

Петрусенка Павел Іванавіч, старшыня калгаса «Ленінскі шлях».

Піліпенка Мікалай Максімавіч, трактарыст саўгаса «Брагінскі».

Пінчук Мікалай Пятровіч, жывёлавод саўгаса «Савічы».

Пінчук Міхаіл Іванавіч, старшыня Камарынскага райвыканкама.

Повад Павел Пятровіч, свінар калгаса «Чырвоная ніва».

Протчанка Гапна Пятроўна, даярка калгаса «Сцяг Леніна».

Процка Міхаіл Іванавіч, брыгадзір калгаса імя Калініна.

Прышчэп Марыя Фёдараўна, калгасніца калгаса «Сцяг Леніна».

Прышчэпаў Піліп Каленікавіч, загадчык малочнатаварнай фермы калгаса «Шлях да камунізму».

Пугач Еўдакія Мінаўна, даярка калгаса «Ленінскі шлях».

Пянькоў Мікалай Міхайлавіч, старшыня калгаса імя Фрунзе.

Пятрэнка Любоў Сямёнаўна, калгасніца калгаса «Шлях да камунізму».

Раманавец Міхаіл Іванавіч, звеннявы калгаса «Парыжская камуна».

Раманенка Іван Барысавіч, трактарыст саўгаса «Астрагляды».

Раманенка Міхаіл Кірылавіч, жывёлавод калгаса «Чырвоная ніва».

Раманюк Міхаіл Васільевіч, калгаснік калгаса «Чырвоная ніва».

Раманюк Фёдар Цітавіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана.

Рожанка Мікалай Антонавіч, трактарыст саўгаса «Астрагляды».

Русак Павел Іванавіч, трактарыст калгаса імя Чкалава.

Сабаленка Іван Лявонцьевіч, старшыня калгаса «Шлях да камунізму».

Садчанка Мікалай Пракопавіч, старшыня калгаса «Запаветы Леніна».

Свірыдзенка Міхаіл Кузьміч, шафёр калгаса імя Чкалава.

Сідоранкаў Уладзімір Дзмітрыевіч, кіраўнік райаб'яднання «Сельгастэхніка».

Скачок Мікалай Фёдаравіч, трактарыст калгаса «Ленінскі шлях».

Смусянок Алена Іванаўна, даярка саўгаса «Астрагляды».

Сукач Рыгор Сямёнавіч, старшыня калгаса «Рухавік рэвалюцыі».

Сушко Іван Сяргеевіч, дырэктар саўгаса «Савічы».

Уласенка Сямён Ігнатавіч, чабан калгаса «Сцяг Леніна».

Федарэнка Андрэй Харытонавіч, старшыня калгаса імя Кірава.

Фурс Мікіта Васільевіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Харытоненка Міхаіл Рыгоравіч, трактарыст калгаса імя Гагарына.

Хіжанок Фёдар Макаравіч, брыгадзір калгаса імя Гагарына.

Ціханенка Алена Пятроўна, даярка саўгаса «Астрагляды».

Ціханчук Яфім Майсеевіч, брыгадзір калгаса імя Тэльмана.

Цыбульскі Пётр Фёдаравіч, жывёлавод саўгаса «Астрагляды».

Цяцера Ганна Мікалаеўна, заатэхнік калгаса «Запаветы Леніна».

Чаравач Мікалай Паўлавіч, старшыня калгаса «Парыжская камуна».

Чарняк Іван Усцінавіч, брыгадзір калгаса імя Калініна.

Чашэнка Іван Мяфодзьевіч, брыгадзір саўгаса «Брагінскі».

Чугункоў Рыгор Апанасавіч, трактарыст саўгаса «Савічы».

Чуйка Алена Фадзееўна, даярка калгаса «Пераможнік».

Чырцік Васіль Паўлавіч, трактарыст калгаса «Чырвоная ніва».

Чырцік Леанід Цярэнцьевіч, брыгадзір калгаса імя Тэльмана.

Шаец Віктар Гаўрылавіч, механізатар саўгаса «Астрагляды».

Шкурко Аляксандр Андрэевіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Шкурко Антаніна Мікалаеўна, даярка калгаса імя Чкалава.

Шкурко Васіль Іванавіч, брыгадзір калгаса «Чырвоная ніва».

Шкурко Марыя Канстанцінаўна, даярка калгаса «Чырвоная ніва».

Шкурко Міхаіл Васільевіч, трактарыст калгаса «Чырвоная ніва».

Шубянок Адам Міхайлавіч, трактарыст калгаса імя Чкалава.

Шубянок Юлія Яфімаўна, даярка саўгаса «Брагінскі» (в. Піркі).

Шылец Алена Канстанцінаўна, даярка калгаса імя Калініна.

Шылец Аляксандра Рыгораўна, даярка калгаса «Шлях да камунізму».

Шылец Іван Рыгоравіч, камбайнер калгаса імя Калініна.

Шылец Павел Іванавіч, старшыня Вуглоўскага сельсавета.

А. А. Шкурко

Шылец Фёдар Ігнатавіч, камбайнер калгаса імя Калініна.

Шылянкова Матрона Мартынаўна, даярка саўгаса «Піркі».

Шэін Марыя Іванаўна, свінарка саўгаса «Краснае».

Юрчанка Марыя Ігнатаўна, даярка калгаса імя Калініна.

Юрчанка Матрона Яфімаўна, даярка калгаса імя Тэльмана.

Ордэнам Дружбы народаў

Дзегцярэнка Фёдар Яўменавіч, трактарыст калгаса імя Энгельса.

Касцючэнка Пётр Іванавіч, трактарыст калгаса імя Леніна.

Раманюк Пётр Рыгоравіч, брыгадзір калгаса «Шлях да камунізму».

Ордэнам «Знак Пашаны»

Бабранок Сяргей Георгіевіч, старшыня калгаса імя Фрунзе.

Байдак Ганна Арцёмаўна, свінарка саўгаса «Астрагляды».

Барабанаў Яўген Цітавіч, старшыня калгаса імя Гагарына.

Баранчук Рыгор Васільевіч, старшыня калгаса імя Кірава.

Басціцкая Ганна Ісакаўна, даярка саўгаса «Пасудава».

Болбас Рыгор Яфімавіч, трактарыст калгаса «Парыжская камуна».

Бондараў Вячаслаў Аляксандравіч, старшыня Брагінскага райвыканкама.

Бруцкі Садок Аляксандравіч, старшыня калгаса «Чырвоная Украіна».

Бузько Іван Раманавіч, шафёр калгаса «Сцяг Леніна».

Булацкі Аляксей Ніканоравіч, жывёлавод калгаса «Шлях да камунізму».

Бяляўская Любоў Пракопаўна, даярка калгаса «Пераможнік».

Бяляўскі Васіль Гаўрылавіч, дырэктар саўгаса «Астрагляды».

Варкус Міхаіл Арцёмавіч, жывёлавод саўгаса «Брагінскі».

Вароненка Марыя Віктараўна, цялятніца калгаса імя Гагарына.

Васечка Міхаіл Лукіч, жывёлавод саўгаса «Піркі».

Васіленка Ілья Самсонавіч, дырэктар Ялчанскай МТС.

Века Пётр Цімафеевіч, заатэхнік калгаса «Рухавік рэвалюцыі».

Волкава Арына Рыгораўна, даярка калгаса «Ленінскі шлях».

Волкава Юлія Ісакаўна, даярка саўгаса «Пасудава».

Галавачоў Леанід Іовіч, старшы інжынер райаб'яднання «Сельгастэхніка».

Ганчар Марыя Піліпаўна, даярка калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Гардзеенка Пётр Якаўлевіч, трактарыст калгаса імя Леніна.

Гаўрыленка Рыгор Іванавіч, трактарыст саўгаса «Піркі».

Гаўрыленка Ульяна Ісаеўна, даярка калгаса імя Тэльмана.

Гацка Міхаіл Рыгоравіч, брыгадзір калгаса «Парыжская камуна».

Гракун Пётр Рыгоравіч, трактарыст саўгаса «Савічы».

Гракун Уладзімір Аляксандравіч, трактарыст Крыўчанскай МТС.

Грамыка Аляксей Рыгоравіч, першы сакратар Брагінскага райкама КП(б)Б.

Давыдоўскі Дзмітрый Ісакавіч, брыгадзір калгаса «Першамайск».

Давыдоўскі Пётр Зосімавіч, свінар калгаса «Першамайск».

Данчанка Аляксандра Антонаўна, рабочая саўгаса «Астрагляды».

Данчанка Пётр Дзяменцьевіч, начальнік цэха агародніцтва саўгаса «Астрагляды».

Данчанка Уладзімір Мікалаевіч, трактарыст саўгаса «Астрагляды».

Дарашкоў Іван Іванавіч, старшыня калгаса «Пераможнік».

Дарашкоў Міхаіл Лявонцьевіч, трактарыст саўгаса «Пасудава».

Дзегцярэнка Рыгор Паўлавіч, брыгадзір калгаса імя Энгельса.

Дзернавы Віктар Гаўрылавіч, трактарыст саўгаса «Савічы».

Дзмітрэнка Іван Ціханавіч, трактарыст калгаса «Ленінскі шлях».

Дзмітрэнка Сцяпан Аляксеевіч, шафёр калгаса «Ленінскі шлях».

Дзялец Ганна Аўсееўна, цялятніца калгаса «Пераможнік».

Еўчанка Уладзімір Фядосавіч, брыгадзір саўгаса «Краснае».

Ефіменка Іван Герасімавіч, брыгадзір калгаса «Парыжская камуна».

Ефіменка Сцяпан Еўдакімавіч, брыгадзір калгаса «Чырвоны барацьбіт».

Жураў Надзея Якаўлеўна, калгасніца калгаса імя Тэльмана.

Жураўская Сцепаніда Дарафееўна, даярка саўгаса «Савічы».

Жытнік Аляксандра Васільеўна, калгасніца калгаса імя Калініна.

Залужны Аляксандр Мінавіч, брыгадзір калгаса «Рассвет».

Зачатка Васіль Сямёнавіч, брыгадзір трактарнай брыгады калгаса «Шлях да камунізму».

Заяц Дзмітрый Мікалаевіч, жывёлавод калгаса імя Фрунзе.

Заяц Іван Тарасавіч, трактарыст саўгаса «Пасудава».

Зіневіч Ігар Васільевіч, першы сакратар Брагінскага РК КПБ.

Іваненка Ганна Аляксандраўна, калгасніца калгаса «Шлях да камунізму».

Ігнатоўскі Георгій Іванавіч, дырэктар саўгаса імя Молатава.

Ільенка Вольга Міхайлаўна, даярка калгаса «Чырвоны араты»

Кабанчук Міхаіл Адамавіч, каваль калгаса імя Гагарына.

Каваленка Марыя Пятроўна, даярка саўгаса «Пасудава».

Казлоў Мікалай Яўгенавіч, старшыня калгаса «Пераможнік».

Кананок Ала Аляксееўна, галоўны заатэхнік калгаса «Пераможнік».

Каржанеўская Марыя Ісакаўна, свінарка саўгаса «Савічы».

Карнічэнка Марыя Адамаўна, даярка калгаса «Шлях да камунізму».

Кастрычэнка Аляксандр Іванавіч, старшыня Брагінскага райвыканкама.

Касцючэнка Касьян Пятровіч, механізатар саўгаса «Пасудава».

Катлярэнка Ксенія Андрэеўна, даярка калгаса імя Энгельса.

Качан Уладзімір Нікіфаравіч, трактарыст калгаса «Пераможнік».

Кіркевіч Леў Аляксандравіч, механізатар калгаса «Шлях да камунізму».

Клімянок Анатоль Андрэевіч, шафёр калгаса імя Леніна.

Кляцун Герасім Пятровіч, пастух калгаса імя Чапаева.

Коваль Аляксей Цімафеевіч, калгаснік калгаса імя Чкалава.

Котаў Уладзімір Уладзіміравіч, галоўны агранам упраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкама.

Котчанка Надзея Пятроўна, звеннявая калгаса «Шлях да камунізму».

Коцур Марыя Пятроўна, звеннявая калгаса імя Тэльмана.

Краўчанка Мікалай Фёдаравіч, галоўны дзяржаўны інспектар раёна па закупках і якасці сельгаспрадуктаў, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі райвыканкама.

Краўчанка Несцер Сцяпанавіч, брыгадзір калгаса «Пераможнік».

Кручкоў Леанід Макаравіч, сакратар Брагінскага РК КПБ.

Кузьмянок Адам Пятровіч, жывёлавод калгаса «Парыжская камуна».

Куэьмянок Аляксей Фёдаравіч, механізатар саўгаса «Камарынскі».

Кузьмянок Пётр Дзям'янавіч, брыгадзір калгаса «Парыжская камуна».

Кулеш Надзея Данілаўна, даярка калгаса «Рассвет».

Купрэенка Валянціна Дзмітрыеўна, даярка калгаса імя Чкалава.

Лахно Еўдакія Авяр'янаўна, другі сакратар Брагінскага РК КПБ.

Леўчанка Фёдар Міхайлавіч, механізатар Камарынскай ПМК-1 трэста «Калінкавічыводбуд».

Ліпніцкая Варвара Патапаўна, даярка саўгаса «Піркі».

Любачка Марыя Дзмітрыеўна, калгасніца калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Максіменка Ніна Герасімаўна, даярка саўгаса «Брагінскі».

Малінец Сцяпан Іванавіч, старшыня калгаса «Новае жыццё».

Манжос Софія Канстанцінаўна, повар кафэ раённага аб'яднання грамадскага харчавання.

Марозава Фаіна Фамінічна, даярка саўгаса «Савічы».

Мартыненка Васіліна Майсееўна, даярка калгаса «Запаветы Леніна».

Мартыненка Мікалай Канстанцінавіч, трактарыст калгаса «Запаветы Леніна».

Мартыненка Міхаіл Іванавіч, калгаснік калгаса «Запаветы Леніна».

Мартыненка Ніна Андрэеўна, настаўніца Брагінскай васьмігадовай школы.

Мацапура Ганна Паўлаўна, сакратар парткама саўгаса «Камарынскі».

Мацвеенка Марыя Макараўна, загадчыца аддзела камарынскага універмага.

Мельнік Мікалай Міхайлавіч, дырэктар Брагінскай МТС.

Мельнік Рыгор Іванавіч, жывёлавод саўгаса «Пасудава».

Мельнікаў Яўген Ларывонавіч, камбайнер калгаса «Зара».

Міхаленка Пётр Уладзіміравіч, трактарыст калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Мышкавец Фёдар Іввнавіч, майстар-наладчык калгаса «Чырвоная ніва».

Мялешка Іван Ігнатавіч, старшыня калгаса імя Чкалава.

Набок Мікалай Паўлавіч, брыгадзір саўгаса «Краснае».

Нікалаенка Міхаіл Паўлавіч, механізатар саўгаса «Краснае».

Нікалаенка Настасся Мартынаўна, цялятніца саўгаса «Пасудава».

Новік Іван Нікіфаравіч, трактарыст саўгаса «Астрагляды».

Новік Лідзія Трафімаўна, рабочая саўгаса «Астрагляды».

Новік Уладзімір Яўціхіевіч, трактарыст калгаса імя Гагарына.

Нямкевіч Валянціна Пятроўна, брыгадзір саўгаса «Савічы».

Палуян Лідзія Фамінічна, даярка калгаса імя Чапаева.

Пархамец Надзея Васільеўна, галоўны эканаміст калгаса імя Чкалава.

Патоцкі Андрэй Іванавіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Паўлаў Аўрам Ісакавіч, начальнік раённага ўпраўлення сельскай гаспадаркі.

Паўленка Аляксей Рыгоравіч, старшыня калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Петрусевіч Мікалай Міхайлавіч, калгаснік калгаса імя Кірава.

Петрусенка Павел Іванавіч, старшыня калгаса «Ленінскі шлях».

Піліпенка Вольга Паўлаўна, брыгадзір саўгаса «Брагінскі».

Пінчук Іван Андрэевіч, загадчык свінафермы калгаса імя Фрунзе.

Пінчук Марыя Арцёмаўна, даярка саўгаса «Савічы».

Пісьменны Павел Рыгоравіч, трактарыст калгаса «Першамайск».

Плюшчай Іван Апанасавіч, брыгадзір калгаса «Першамайск».

Повад Марыя Адамаўна, свінарка калгаса «Чырвоная ніва».

Протчанка Ганна Пятроўна, даярка калгаса «Сцяг Леніна».

Процка Міхаіл Сцяпанавіч, брыгадзір трактарнай брыгады Брагінскай МТС.

Прымак Мікалай Яўсеевіч, трактарыст калгаса «Пераможнік».

Прыходзька Марыя Мікалаеўна, даярка калгаса «Шлях да камунізму».

Пугач Мікалай Іванавіч, механізатар калгаса «Ленінскі шлях».

Пянькова Ганна Ільінічна, даярка калгаса «Чырвоны араты».

Рагожнік Мікалай Васільевіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана.

Рагожнік Уладзімір Васільевіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана.

Рак Іван Аляксеевіч, брыгадзір калгаса «Пераможнік».

Раманчук Ніна Ульянаўна, даярка калгаса імя Тэльмана.

Раманюк Васіль Савельевіч, калгаснік калгаса «Чырвоная ніва».

Раманюк Сцяпан Цітавіч, жывёлавод калгаса імя Тэльмана.

Рухлевіч Сямён Адамавіч, звеннявы саўгаса «Астрагляды».

Рыбачкін Фёдар Міхайлавіч, галоўны заатэхнік аддзела сельскай гаспадаркі райвыканкама.

Рыжык Андрэй Андрэевіч, брыгадзір калгаса «Першамайск».

Сідоранкаў Уладзімір Дзмітрыевіч, кіраўнік райаб'яднання «Сельгастэхніка».

Сізаненка Іван Мікалаевіч, трактарыст саўгаса «Краснае».

Скачок Ганна Карпаўна, даярка саўгаса «Пасудава».

Скачок Мікалай Фёдаравіч, брыгадзір калгаса «Ленінскі шлях».

Смальцар Алена Міхайлаўна, калгасніца калгаса «Чырвоная ніва».

Смальцар Уладзімір Кандратавіч, брыгадзір будаўнічай брыгады калгаса «Чырвоная ніва».

Сматрэнка Раман Варфаламеевіч, першы сакратар Камарынскага РК КП(б)Б.

Стрыбук Іван Адамавіч, звеннявы калгаса «Шлях да камунізму».

Стрэльчанка Фёдар Іванавіч, руславы раманцёр Днепра-Прыпяцкага ўпраўлення асушальна-арашальных сістэм.

Сцепаненка Аляксей Данілавіч, брыгадзір калгаса імя Калініна.

Сяргеенка Уладзімір Мікалаевіч, механізатар калгаса імя Чкалава.

Таўсталес Барыс Рыгоравіч, аграном саўгаса «Астрагляды».

Уласенка Іван Міхайлавіч, кіраўнік

Камарынскага райаддзялення «Сельгастэхніка».

Хадасок Алена Андрэеўна, калгасніца калгаса імя Энгельса.

Халько Леанід Цімафеевіч, шафёр калгаса імя Калініна.

Харко Вольга Пятроўна, даярка калгаса «Першамайск».

Церамецкая Лідзія Парфіраўна, даярка саўгаса «Брагінскі».

Цярэшчанка Васіль Андрэевіч, брыгадзір калгаса «Парыжская камуна».

Чаравач Мікалай Паўлавіч, старшыня калгаса «Парыжская камуна».

Чарэнька Антаніна Максімаўна, калгасніца калгаса «Ніжні дняпровец».

Чырык Анастасія Цітаўна, даярка калгаса «Рассвет».

Чырык Марыя Парфенаўна, даярка калгаса «Чырвоны араты».

Шкурко Алена Аўдзееўна, калгасніца калгаса імя Чкалава.

Шкурко Марыя Адамаўна, калгасніца калгаса «Чырвоная ніва».

Шкут Ганна Сяргееўна, калгасніца калгаса «Пераможнік».

Шульга Ганна Піліпаўна, свінарка калгаса «Чырвоны араты».

Шчука Іван Якаўлевіч, механізатар саўгаса «Савічы».

Шылец Алена Канстанцінаўна, калгасніца калгаса імя Калініна.

Шылец Барыс Васільевіч, брыгадзір калгаса «Шлях да камунізму».

Шылец Іван Рыгоравіч, камбайнер калгаса імя Калініна.

Шэін Міхаіл Васільевіч, трактарыст саўгаса «Краснае».

Шэін Уладзімір Фёдаравіч, загадчык арганізацыйнага аддзела Брагінскага РК КПБ.

Юркевіч Уладзімір Віктаравіч, загадчык вучэбнай часткі Калыбанскай сямігадовай школы.

Якаўцова Таццяна Іванаўна, свінарка калгаса «Сцяг Леніна».

Ордэнам Працоўнай Славы II ступені

Блудчы Міхаіл Данілавіч, шафёр саўгаса «Краснае».

Гладкі Пётр Іванавіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Раманюк Любоў Рыгораўна, даярка калгаса «Чырвоная ніва».

Стрыбук Васіль Мікалаевіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Ордэнам Працоўнай Славы III ступені

Анапрэенка Іван Фёдаравіч, трактарыст калгаса «Ленінскі шлях».

Асіпенка Іван Арцёмавіч, трактарыст калгаса імя Калініна.

Аўраменка Міхаіл Пятровіч, механізатар калгаса «XVIII партз'езд».

Бартніцкі Іван Паўлавіч, трактарыст калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Барысенка Фёдар Акімавіч, брыгадзір саўгаса «Савічы».

Бельчанка Васіль Пракопавіч, звеннявы саўгаса «Краснае».

Блудчы Міхаіл Данілавіч, шафёр саўгаса «Краснае».

Болбас Раіса Васільеўна, даярка калгаса «Парыжская камуна».

Бут Іван Андрэевіч, шафёр калгаса імя Тэльмана.

Гардзеенка Мікалай Васільевіч, трактарыст калгаса імя Леніна.

Гармель Кацярына Рыгораўна, калгасніца калгаса «Ленінскі шлях».

Гаўрыленка Валерый Аляксеевіч, трактарыст калгаса «Сцяг Леніна».

Герасіменка Тамара Міхайлаўна, даярка калгаса «Чырвоная ніва».

Гладкі Пётр Іванавіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Грыцэнка Аляксандр Пятровіч, трактарыст саўгаса «Брагінскі».

Грышаненка Мікалай Міхайлавіч, трактарыст саўгаса «Краснае».

Драбышэўскі Пётр Рыгоравіч, шафёр калгаса «Запаветы Леніна».

Драбышэўская Ніна Яўменаўна, даярка саўгаса «Савічы».

Дусянок Ніна Мікалаеўна, даярка саўгаса «Пасудава».

Жураў Іван Іванавіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана.

Заранік Андрэй Васільевіч, камбайнер калгаса «Шлях да камунізму».

Комар Наталля Апанасаўна, калгасніца калгаса імя Чкалава.

Косцін Пётр Андрэевіч, трактарыст калгаса «XVIII партз'езд».

Котчанка Мікалай Рыгоравіч, трактарыст саўгаса «Краснае».

Краўчанка Рыгор Макаравіч, механізатар калгаса «Пераможнік».

Крот Ніна Паўлаўна, даярка калгаса «Запаветы Леніна».

Крот Павел Герасімавіч, экскаватаршчык Камарынскай ПМК-1 трэста «Калінкавічыводбуд».

Кубар Лідзія Уладзіміраўна, даярка саўгаса «Астрагляды».

Кудранок Ніна Яфрэмаўна, калгасніца калгаса «Рассвет».

Курленка Святлана Піліпаўна, брыгадзір саўгаса «Астрагляды».

Куценка Васіль Вячаслававіч, шафёр калгаса «Шлях да камунізму».

Лазарэнка Пётр Сцяпанавіч, шафёр калгаса імя Гагарына.

Ліхашапка Лявон Лявонцьевіч, даяр калгаса «Ленінскі шлях».

Макаранка Лідзія Іванаўна, даярка калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Мялешка Уладзімір Уладзіміравіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана.

Пархамец Анатоль Антонавіч, трактарыст калгаса імя Фрунзе.

Пінчук Ганна Іванаўна, свінарка калгаса «XVIII партз'езд».

Пішчук Рыгор Паўлавіч, шафёр саўгаса «Пасудава».

Повад Уладзімір Пятровіч, загадчык жывёлагадоўчай фермы калгаса «Чырвоная ніва».

Рабянок Кацярына Мікалаеўна, даярка калгаса «Пераможнік».

Раманенка Пётр Карнеевіч, трактарыст саўгаса «Пасудава».

Раманюк Любоў Рыгораўна, даярка калгаса «Чырвоная ніва».

Раманюк Міхаіл Васільевіч, шафёр калгаса «Чырвоная ніва».

Раманюк Павел Паўлавіч, загадчык жывёлагадоўчай фермы калгаса «Чырвоная ніва».

Раманюк Уладзімір Сцяпанавіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана.

Сакоўская Яўгенія Апанасаўна, даярка саўгаса «Астрагляды».

Свірыдзенка Васіль Кузьміч, трактарыст калгаса імя Чкалава.

Сетка Ніна Міхайлаўна, даярка саўгаса «Краснае».

Скараход Уладзімір Пятровіч, пашталён райвузла сувязі.

Сніцарэнка Усціння Дзмітрыеўна, даярка калгаса «Рассвет».

Стрыбук Васіль Мікалаевіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Федасенка Мікалай Клімавіч, трактарыст саўгаса «Краснае».

Фурс Пётр Ільіч, камбайнер саўгаса «Савічы».

Хвост Мікалай Іванавіч, механізатар калгаса імя Чкалава.

Хіжанок Рыгор Міхайлавіч, брыгадзір калгаса «XVIII партз'езд».

Ціцянок Марыя Віктараўна, цялятніца калгаса «Ленінскі шлях».

Цішкевіч Адам Емяльянавіч, трактарыст саўгаса «Брагінскі».

Цішунец Кацярына Харытонаўна, даярка саўгаса «Савічы».

Цырульнік Аляксандр Сцяпанавіч, трактарыст калгаса «Шлях да камунізму».

Чапега Павел Васільевіч, трактарыст калгаса імя Чкалава.

Шаўчэнка Міхаіл Пятровіч, трактарыст калгаса «Першамайск».

Шкурко Уладзімір Іванавіч, трактарыст калгаса імя Тэльмана.

Шубянок Анатоль Мікалаевіч, трактарыст саўгаса «Брагінскі».

Шубянок Ганна Якаўлеўна, даярка саўгаса «Піркі».

Шчука Ганна Сямёнаўна, даярка саўгаса «Брагінскі».

Шыла Іван Мінавіч, трактарыст райаб'яднання «Сельгастэхніка».

Шынкарэнка Дзямід Міхайлавіч, трактарыст калгаса «Першамайск».

Заўвага. Спіс працаўнікоў розных галін народнай гаспадаркі Брагіншчыны, узнагароджаных у 1986 г. ордэнамі і медалямі СССР за актыўны ўдзел у ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС, гл. у матэрыялах на чарнобыльскую тэму.

Нарадзіліся на Брагіншчыне

Военачальнікі

Гацка Ульян Аляксандравіч нарадзіўся ў 1906 г. у в. Шкураты. Генерал-маёр артылерыі. Скончыў Брагінскае чатырохкласнае вучылішча, Бабчынскую школу 2-й ступені, Беларускі дзяржаўны універсітэт (1931). У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 г. Удзельнічаў у абароне Масквы, вызваленні Беларусі, Літвы, ва Усходне-Прускай аперацыі. Узнагароджаны сямю ордэнамі, у т. л. ордэнам Кутузава II ступені, многімі медалямі.

Пасля вайны У. А. Гацка служыў у Савецкай Арміі, на працягу многіх гадоў быў начальнікам Ваеннага зенітна-артылерыйскага вучылішча. У 1969 г. выйшаў у адстаўку.

Камандаваў Віцебскай зенітна-артылерыйскай

Калі фашысты рваліся да Масквы, У. А. Гацка са сваім зенітна-артылерыйскім дывізіёнам абараняў подступы да яе. Вартавыя маскоўскага неба рабілі ўсё, каб варожыя самалёты не прарваліся да горада.

Пасля разгрому немцаў пад Масквой для воінаў 33-й зенітна-артылерыйскай дывізіі, якой стаў камандаваць палкоўнік У. А. Гацка, пачаліся наступальныя франтавыя будні. Дывізія дзейнічала на напрамку галоўнага ўдару. У тым ліку гэта былі баі за Беларусь. Падчас наступальнай аперацыі «Багратыён» дывізія прымала ўдзел у разгроме гітлераўцаў у Віцебскай вобласці. За нанесеныя ворагу паражэнні і актыўны ўдзел у разгроме віцебскай групоўкі фашыстаў ёй было нададзена ганаровае найменне «Віцебская».

Летам 1944 года Савецкая Армія паспяхова наступала. Нашы лётчыкі імчэ не пераляцелі на новыя аэрадромы, а старыя ўсё больш і больш аддаляліся ад лініі фронту. Варожыя ж аэрадромы, наадварот, набліжаліся. Каб кампенсаваць мінусы такой сітуацыі, неабходна было актыўней выкарыстоўваць зенітную артылерыю, і зенітчыкі надзейна прыкрывалі пярэдні край, населеныя пункты і дарогі. Асабліва вызначыліся яны ў ліпені — жнівені ў баях за Вільнюс і Каўнас і затым пры выхадзе на дзяржаўную граніцу, пры ўступленні на тэрыторыю Усходняй Прусіі. У баях восенню 1944-га воіны 33-й Віцебскай зенітна-артылерыйскай дывізіі збілі 26 варожых самалётаў і сарвалі шмат спроб нямецкай авіяцыі бамбіць савецкія войскі.

М. А. Жураў

Зенітчыкам У. А. Гацкі не раз даводзілася апускаць ствалы сваіх установак і весці агонь па наземных цэлях. Яны знішчылі 35 кулямётных кропак, 3 мінамётныя батарэі і адну палявую гармату, падавілі агонь пяці батарэй шасціствольных мінамётаў.

Ульян Аляксандравіч Гацка закончыў вайну генерал-маёрам артылерыі.

П. Фралоў

Жураў Міхаіл Адамавіч нарадзіўся ў 1918 г. у в. Сялец. Генерал-лейтэнант артылерыі. Пасля заканчэння Брагінскай сярэдняй школы некаторы час працаваў у мясцовай раённай газеце. Потым скончыў Ленінградскае ваеннае артылерыйскае вучылішча, ваенную акадэмію, Акадэмію Генеральнага штаба. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Закончыў баявы шлях у 1945 г. у Чэхаславакіі. Адзначаны многімі ордэнамі і медалямі.

Пасля вайны М. А. Жураў служыў у Савецкай Арміі, быў камандуючым войск супрацьпаветранай абароны Маскоўскай ваеннай акругі.

Памёр у 1997 г.

Карпенка Іван Іванавіч нарадзіўся ў 1908 г. у в. Сцежарнае. Генерал-лейтэнант. У Чырвонай Арміі з 1927 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. Служыў у разведорганах. Адзначаны некалькімі баявымі ўзнагародамі.

Памёр у 1969 г.

С. А. Ціханчук

Ціханчук Сямён Аўрамавіч нарадзіўся ў 1898 г. у в. Крыўча. Генерал-лейтэнант. Удзельнік грамадзянскай вайны. Ваяваў у Іспаніі ў час нацыянальна-рэвалюцыйнай вайны іспанскага народа 1936–1939 гг. У 1939 г. браў удзел у баях з японскімі захопнікамі падчас узброенага канфлікту на Халхін-Голе. У Вялікую Айчынную вайну камандаваў танкавым корпусам. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, пяццю ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Суворава і Кутузава II ступені, многімі медалямі, а таксама ордэнамі і медалямі шэрагу замежных краін.

Памёр у 1965 г.

Вучоныя

Белы Уладзімір Мікалаевіч нарадзіўся 25.10.1947 г. у в. Рафалаў. Беларускі вучоны ў галіне оптыкі. Доктар фізіка-матэматычных навук (1992), прафесар (1994). Скончыў Гомельскі педінстытут (1968). З 1968 г. у Інстытуце фізікі НАН Беларусі. Аўтар навуковых прац па лінейнай і нелінейнай крышталяоптыцы, акустаоптыцы. Прапанаваў новы прынцып узмацнення ультрагукавых хваляў.

Мартыненка Міхаіл Дэмітрыевіч нарадзіўся 22.11.1937 г. у в. Крупская. Беларускі матэматык і механік. Доктар фізіка-матэматычных навук (1972), прафесар (1976). Скончыў Львоўскі універсітэт (1959). З 1971 г. дацэнт кафедры тэарэтычнай механікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Аўтар шэрагу прац па тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў, механіцы суцэльнага асяроддзя і тэорыі пругкасці.

Паўлючэнка Міхаіл Міхайлавіч нарадзіўся 17.3.1909 г. у в. Глухавічы. Беларускі фізікахімік. Акадэмік НАН Беларусі (1959). Доктар хімічных навук, прафесар (1954). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1972). Скончыў Маскоўскі універсітэт (1933).

З 1934 па 1968 г. М. М. Паўлючэнка працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце: асістэнтам, загадчыкам кафедры фізічнай і калоіднай хіміі (1938–1959), загадчыкам лабараторыі радыехіміі (1957–1968). Адначасова з 1937 г. у НАН Беларусі: у 1938–1957 гг. старшы навуковы супрацоўнік, з 1957 г.– загадчык лабараторыі мінеральных соляў і ўгнаенняў Інстытута хіміі НАН Беларусі. У 1959–1966 гг. дырэктар, з 1966 г.– загадчык лабараторыі цвердафазных рэакцый Інстытута агульнай хіміі НАН Беларусі.

Даследаванні вучонага прысвечаны тэорыі тапахімічных рэакцый, кінетыцы і механізму гетэрагенных хімічных рэакцый, радыехімічнаму аналізу. Распрацаваў тэорыю кінетыкі тапахімічных рэакцый, не каталізуемых цвёрдым прадуктам. Удзельнічаў у распрацоўцы тэхніка-эканамічнага абгрунтавання развіцця прамысловасці азотных і фосфарных угнаенняў у БССР. Прапанаваў шэраг новых флатарэагентаў для флатацыі абагачэння калійных руд.

Узнагароджаны двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі.

Памёр 24.3.1975 г.

Піліпенка Міхаіл Фёдаравіч нарадзіўся 19.5.1936 г. у в. Нежыхаў. Беларускі этнолаг і гісторык. Член-карэспандэнт НАН Беларусі (1994). Доктар гістарычных навук (1993), прафесар (1995). Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь (1999). Выхоўваўся ў Брагінскім дзіцячым доме. Скончыў Малейкаўскую сямігодку (1952), Мазырскае педвучылішча

(1956), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1961). Настаўнічаў. З 1967 г. працаваў на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З 1991 г. у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі: загадчык аддзела этнаграфіі, з 1994 г. — дырэктар.

Даследуе пытанні гісторыі беларускай этналогіі і фальклярыстыкі, сямейнага побыту беларусаў, народных звычаяў, абрадаў і рэлігійных вераванняў. Аўтар шматлікіх навуковых прац, у тым ліку манаграфій «Этнаграфія Беларусі» (1981), «Узнікненне Беларусі» (1991), а таксама адзін з аўтараў кніг «Гістарычнае краязнаўства Беларусі» (1980), «Народная педагогіка беларусаў» (1996), «Беларусы» (Масква, 1998), «Беларусы на мяжы тысячагоддзяў» (2000), «Беларусы» (Т. 4, 5. 2001) і інш.

Вучоны шырокага дыяпазону

Міхаіл Фёдаравіч Піліпенка — вучоны шырокага дыяпазону. Ён аўтар звыш ста навуковых прац, сярод якіх найбольш значнымі з'яўляюцца: «Сляды родавай арганізацыі ў вясельных звычаях славянскіх народаў» (1969), «Сям'я і шлюб у беларускіх сялян у другой палове XIX — пачатку XX ст.» (1970), «З гісторыі вывучэння беларускай этнаграфіі і фальклору» (1970), «Даследаванні па гісторыі беларускай этнаграфіі» (1974), «Этнаграфія ў краязнаўстве» (1980), «Этнаграфія Беларусі» (1980), «Сучасныя этнічныя і культурна-бытавыя працэсы ў Беларусі» (1982), «Тэма вайны і міру ў творчасці Міхаіла Савіцкага» (1983), «Роля эвалюцыі і дыфузіі ў гісторыі традыцый» (1990), «Беларуская традыцыйная культура як феномен еўрапейскай цывілізацыі» (1995) і інш.

М. Ф. Піліпенка ўдзельнічаў у падрыхтоўцы «Беларускай савецкай энцыклапедыі», кароткай энцыклапедыі «Беларускай ССР» у 5 тамах, «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі», энцыклапедычнага даведніка «Беларусь», энцыклапедыі «Этнаграфія Беларусі».

Вынікам шматгадовай працы вучонага па праблеме паходжання беларускага народа з'явілася новая канцэпцыя, выкладзеная ім у манаграфіі «Узнікненне Беларусі: Новая канцэпцыя» (1991). Аўтар адмовіўся ад уяўлення аб этнагенезе беларусаў як спрошчанай эвалюцыі, а таксама ад тлумачэння яго толькі вялікай міграцыяй. У сваім даследаванні ён улічвае ролю многіх фактараў — эканамічнага, палітычнага, гістарычнага, асаблівую ўвагу звяртае на ролю дыфузіі ў этнічных працэсах, перагрупоўку кампанентаў культуры і мовы. Пастаянна супастаўляючы даныя многіх крыніц, вучоны прыйшоў да высновы, што этнічная тэрыторыя сучаснай Беларусі сфарміравалася ў познім сярэднявеччы ў выніку кансалідацыі паўночнай часткі «палескага» і паўднёвай часткі падзвінскадняпроўскага субэтнасаў агульнаславянскай старажытнай рускай этнічнай супольнасці. Гэтыя часткі ўсходнеславянскага насельніцтва склалі аснову беларускага этнасу. Акрамя іх у склад беларускага этнасу ўліліся асобныя групы заходнеславянскага (польскага), балцкага і цюркскага (татарскага) насельніцтва.

М. Ф. Піліпенка ажыццяўляе кіраўніцтва працай інстытута па падрыхтоўцы і выданні шматтомнага гісторыка-этнаграфічнага даследавання пад агульнай назвай «Беларусы», пяць тамоў якога ўжо выйшла ў свет.

Вялікую ўвагу надае вучоны і падрыхтоўцы навуковых кадраў для рэспублікі. Ён уваходзіць у склад спецыялізаванага савета па абароне доктарскіх дысертацый, часта выступае афіцыйным апанентам, кіруе навуковай працай аспірантаў. Творчая дзейнасць М. Ф. Піліпенкі атрымала высокую ацэнку. Як вядомаму спецыялісту па беларускай этналогіі, аўтару шматлікіх грунтоўных прац, ініцыятыўнаму арганізатару навукова-даследчай працы, клапатліваму настаўніку яму ў 1995 г. было прысвоена званне прафесара, а ў 1994 г. ён быў абраны членам-карэспандэнтам Акадэміі навук па гуманітарным аддзяленні.

Т. А. Навагродскі

Протчанка Валерый Захаравіч нарадзіўся 12.4.1941 г. у г. п. Брагін. Кандыдат гістарычных навук (1979), дацэнт (1985). Скончыў брагінскую сярэднюю школу № 2 (1958), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1967). Настаўнічаў у Лепельскім раёне. Працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце,

В. З. Протчанка

Мінскай вышэйшай партыйнай школе, Дзяржкамчарнобылі і Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь. З 2002 г. у Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. Аўтар шэрагу прац па гісторыі Беларусі і праблемах Чарнобыльскай катастрофы.

Протчанка Васіль Ульянавіч нарадзіўся 7.4.1930 г. у в. Зарэчча. Беларускі вучоны ў галіне педагогікі і моўнаўства. Доктар педагагічных навук (1990), прафесар (1993). Выдатнік асветы БССР (1977). Скончыў Зарачанскую сямігодку (1946), Мазырскае педвучылішча (1949), Мазырскі педагагічны інстытут (1958). Працаваў загадчыкам Катловіцкай пачатковай школы, намеснікам дырэктара Брагінскага дзіцячага дома, завучам Зарачанскай сямігодкі, Савіцкай сярэдняй школы, дырэктарам брагінскай СШ № 1 (1949—1959), намеснікам дэкана падрыхтоўчага факультэта для замежных грамадзян Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1962—1964), дэканам філалагічнага факультэта Мазырскага педінстытута (1964—1968), загадчыкам кабінета беларускай мовы Мінскага абласнога інстытута удасканальвання настаўнікаў (1968—1971). З 1971 г. у Навукова-даследчым інстытуце педагогікі (з 1993 г. Нацыянальны інстытут адукацыі), з 1995 г.— адначасова галоўны рэдактар часопіса «Беларуская мова і літаратура».

Аўтар больш за сто навуковых прац па праблемах удасканальвання зместу школьнага курса роднай мовы, распрацоўкі і ўкаранення ў педагагічную практыку найбольш эфектыўных метадаў і прыёмаў навучання, у тым ліку кніг «Вывучэнне сінтаксісу ў школе: Словазлучэнне. Просты сказ» (1984), «Вывучэнне сінтаксісу ў школе: Складаны сказ» (1989), «Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове» (2001) і інш.

Узнагароджаны медалямі Францыска Скарыны (1999), «За працоўныя заслугі» (1986), «Ветэран працы» (1989).

Памёр 23.2.2002 г.

В. У. Протчанка

Лічу сябе настаўнікам...

З успамінаў В. У. Протчанкі

Мне часта ўспамінаюцца першыя гады настаўніцтва — праца на зруйнаваным вайной Палессі. Мяне, выпускніка Мазырскага педвучылішча, у жніўні 1949 года Брагінскі райана назначыў загадчыкам і настаўнікам Катловіцкай пачатковай школы. У школах у той час вучыліся дзеці вайны, пераважна сіроты. Прыніжала жудасная беднасць, галеча, маральная і бытавая неўладкаванасць. Толькі за адну зіму ад хваробы памерлі двое трэцякласнікаў, годам раней некалькі дзяцей падарваліся на міне. Людское гора адазвалася ў сэрцы, абвастрыла пачуцці, навучыла адчуваць боль ад чужых пакутаў, павысіла адказнасць за лёс, здароўе, спакой і жыццё дзяцей — самага дарагога, што даручылі настаўнікам удовы вайны.

Неўзабаве наладзілася праца. Удалося прывесці ў парадак школу: патынкаваць пакоі, зрабіць прыбудову, каб дзецям было дзе распрануцца, абсталяваць класы партамі, укамплектаваць бібліятэчку. Дапамаглі характар, сельскі Савет, калгас і вяскоўцы. Дзякуй ім, добрым і чулым людзям! Заўсёды ўспамінаю іх з любоўю і пашанай.

Аднак давесці сваіх пачаткоўцаў да выпуску не ўдалося. У жніўні 1950 года Палескі аблана назначыў мяне намеснікам дырэктара Брагінскага дзіцячага дома. Гэтая ўстанова таксама знаходзілася ў бядотным становішчы: каля двухсот дзяцей размяшчалася ў трох сялянскіх хатах і клубным памяшканні разбуранага крухмальнага завода. Адчуваліся перабоі ў забеспячэнні харчаваннем, не хапала адзення, бялізны. Панавала запушчанасць у арганізацыйна-педагагічнай рабоце. Праблему ўскладняла недакамплектаванасць установы кваліфікаванымі кадрамі. Дзіцячы дом знаходзіўся ў вёсцы. Аматараў працаваць у сяле, ды яшчэ ў дзіцячым доме, ужо і тады было мала. Дзякуючы намаганням выхавальнікаў і выхаванцаў, удзелу раённых арганізацый і аблана становішча ўдалося паправіць. Усталяваўся давер ва

ўзаемаадносінах выхаванцаў з выхавальнікамі і дырэкцыяй, дырэкцыі — з выхавальнікамі і выхаванцамі. Дзякуй богу, здаровы розум перамог. Наладзіліся сувязі з педагагічным калектывам мясцовай школы. Жыць стала весялей.

Нягледзячы на тое, што сядзіба бацькоў знаходзілася на адлегласці да чатырох кіламетраў, начаваў я ў дзіцячым доме. Свой пакойчык ніколі не замыкаў. Працаваў э шасці раніцы да позняй ночы. Толькі той, хто разумее, што такое трыццаць дзяцей у сялянскай хаце, дровы і печ у адным пакоі, можа ўявіць умовы працы.

Але прыйшоў час ісці на вайсковую службу. Дэмабілізаваўся ў лістападзе 1953 года. Дзіцячы дом расфарміраваўся. Працаваў настаўнікам, завучам Савіцкай, а потым дырэктарам брагінскай сярэдняй школы № 1, самай вялікай у раёне, першай, што перайшла на адзінацыгадовае прафесійна накіраванае навучанне. Аднак і ў гэты час падтрымліваў сувязь з выхаванцамі дзіцячага дома, удзельнічаў, па магчымасці, у вырашэнні іх жыццёвых праблем.

У 1959 годзе паступіў у аспірантуру Белдзяржуніверсітэта. Хацелася папоўніць веды і зноў вярнуцца ў школу. Але і на гэты раз лёс распарадзіўся інакш. Давялося працаваць намеснікам дэкана факультэта для замежных грамадзян Белдзяржуніверсітэта, дэканам філалагічнага факультэта Мазырскага педуніверсітэта, а затым загадчыкам кабінета беларускай мовы і літаратуры Мінскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў. Апошнія трыццаць год працую ў Нацыянальным інстытуце адукацыі, які раней называўся Навукова-даследчым інстытутам педагогікі.

Разам з калектывам супрацоўнікаў лабараторыі методыкі навучання беларускай мове распрацоўваем актуальныя праблемы, звязаныя з рэфармаваннем школьнай моўнай адукацыі: рыхтуем праграмы, пішам падручнікі, метадычныя дапаможнікі. Дапамагаем настаўнікам беларускай мовы вырашаць складаныя пытанні фарміравання асобы маладога чалавека сродкамі роднага слова. Пры гэтым кіруюся ісцінай, што ў свеце, бадай, няма іншай такой педагагічнай велічыні, якую можна было б параўнаць з той роляй, якую выконвае роднае слова ў фарміраванні светапогляду маладых людзей, у станаўленні іх цэласнага духоўнага вобліку — вобліку інтэлектуальнага, маральна-этычнага, нацыянальна-культурнага.

Педагог, акрамя слова, не мае іншых сродкаў трансфармаваць свет і іншых спосабаў уздзеяння на душы вучняў.

Лічу сябе настаўнікам не толькі па адукацыі, але і па складзе душы.

Служу гэтай высакароднай прафесіі пяцьдзесят адзін год, ганаруся ёю і ўспрымаю як самы надзейны сродак, што рыхтуе маладых людзей да жыцця ў грамадстве: фарміруе светапогляд, развівае інтэлект, вучыць мысліць, аналітычна падыходзіць да сябе, падзей і людзей, выхоўвае маральнасць, этыку і культуру — усё тое, што ўвасоблена ў слове Духоўнасць.

Звычайна духоўнасць атаясамліваюць з рэлігійнасцю. Я трымаюся іншай думкі. Для мяне — гэта інтэгральная якасць, уласцівая людзям: не столькі рэлігійнасць, адукаванасць, начытанасць, умение разбірацца ў літаратурных і мастацкіх напрамках, колькі стыль мыслення і паводзін чалавека, які адчувае сваю адказнасць за ўсё, што робіцца ў прыродзе і грамадстве.

Факты з гісторыі сведчаць, што гэтая якасць была ўласціва нашым продкам задоўга да прыняцця хрысціянства. Увасобілася яна ў традыцыях і рытуалах. Чым больш трывалыя этнічная памяць і традыцыі ў грамадстве, тым вышэйшыя культура і духоўнасць людзей, тым яны больш крытычна і ашчадна ставяцца да прыроды і ўсяго жывога, саміх сябе, сваіх думак і ўчынкаў.

Вялікая роля ў фарміраванні этнічнай памяці ў маладых людзей і захаванні народных традыцый у перадачы жыццёвага вопыту аднаго пакалення другому належыць роднаму слову. Менавіта з яго дапамогай забяспечваецца повязь пакаленняў. Пазбавіўшыся ж этнічнай памяці, чалавек становіцца чужым сярод сваіх. Без традыцый няма сапраўднай культуры, без культуры — духоўнасці, без духоўнасці — выхавання; без выхавання — асобы, а без асобы — культурнага грамадства. Такі закон эвалюцыі стылю мыслення і паводзін людзей. Пра гэта заўсёды неабходна памятаць тым, хто служыць педагагічнай прафесіі і займаецца выхаваннем.

Друкуецца са скарачэннямі: Настаўніцкая газета. 2000. 9 верас.

Раманенка Міхаіл Піліпавіч нарадзіўся ў 1937 г. у в. Пасудава. Канструктар сельскагаспадарчых машын. Кандыдат тэхнічных навук. Скончыў Гусеўскі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі ў Калінінградскай вобл., Украінскую сельскагаспадарчую акадэмію. З 1965 г. працаваў ва Украінскім навукова-даследчым інстытуце механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі.

М. П. Раманенка

На аснове распрацаваных тэхналагічных і канструктарскіх схем стварыў эксперыментальны ўзор тэрасера — машыны для апрацоўкі глебы на тэрасавых схілах — з актыўнымі рабочымі органамі. Пры яго ўдзеле распрацавана многа тыпаў сеялак, ім прапанаваны арыгінальныя прыстасаванні да ўжо існаваўшых машын. Мае больш за 20 аўтарскіх пасведчанняў. Узнагароджаны значком «Выдаходнік СССР».

Скараход Вольга Раманаўна нарадзілася 12.7.1915 г. у г. п. Брагін. Доктар хімічных навук (1971), прафесар (1972). Скончыла Беларускі дзяржаўны універсітэт (1939) і працавала там жа (з перапынкам 1941—1944 гг.) да 1984 г.

Асноўныя навуковыя працы прысвечаны даследаванню малекулярнай іонаабменнай і лігандная сорбцыі розных арганічных злучэнняў на іанітах. Выявіла заканамернасці сорбцыі, уплыў будовы малекул сарбату, саставу раствору і структуры іаніту на выбіральнасць паглынання. Прапанавала метады храматаграфічнага падзелу блізкіх уласцівасцямі злучэнняў і метады экстракцыйна-фотаметрычнага вызначэння малібдэну і тытану ў сплавах і мінералах з дапамогай амінаоксіфуранону. Аўтар шэрагу навуковых прац.

Памерла 24.6.1994 г.

Шыраканаў Дзмітрый Іванавіч нарадзіўся 20.5.1929 г. у в. Асарэвічы. Беларускі філосаф. Доктар філасофскіх навук (1972). Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1952). З 1955 г. малодшы, старшы навуковы супрацоўнік, загадчык сектара дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, загадчык аддзела філасофіі Інстытута філасофіі і права НАН Беларусі. Аўтар прац, у якіх даследуюцца законы і катэгорыі дыялектыкі, філасофскія пытанні прыродазнаўства.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Дзяржаўныя дзеячы

Дзялец Міхаіл Іванавіч нарадзіўся 1.7.1918 г. у в. Вуглы. Дзяржаўны дзеяч. Заслужаны работнік культуры БССР. Скончыў Вуглоўскую сямігадовую школу, Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1949), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1951). Працаваў у баранавіцкай абласной газеце «Красная звезда», рэдактарам баранавіцкай аб'яднанай газеты пад гэтай жа назвай, сакратаром Гарадзішчанскага райкама КПБ (1957—1965), старшынёй Брэсцкага Савета прафсаюзаў (1965—1969), рэдактарам газеты «Звязда» (1969—1972). У 1973—1989 гг. старшыня Дзяржаўнага камітэта па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю БССР.

Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР шасці скліканняў, быў кандыдатам і членам ЦК КПБ, каля дваццаці гадоў узначальваў Беларускае аддзяленне Усесаюзнага таварыства дружбы з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікай, быў членам іншых рэспубліканскіх грамадскіх арганізацый. У 1971 г. удзельнічаў у рабоце XXVI сесіі Генеральнай асамблеі ААН у якасці дэлегата.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў і дванаццаццю медалямі.

Памёр у 1999 г.

М. І. Дзялец

Станкевіч (Палескі) Вячаслаў Пятровіч нарадзіўся 3.11.1912 г. у в. Астрагляды. Дзяржаўны дзеяч. Беларускі драматург, журналіст. Заслужаны дзеяч культуры БССР (1967). У 1929 г. скончыў Бабчынскую сярэднюю школу Хойніцкага раёна. З 1930 г. працаваў у газетах «Палеская праўда», «Савецкая Беларусь», «Калгаснік Беларусі». У 1941—1944 гг. на радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» (Масква). З 1944 г. адказны сакратар, потым намеснік рэдактара газеты «Звязда». З 1961 г. намеснік старшыні, у 1965—1971 гг. старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па радыёвяшчанні і тэлебачанні.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» (двума), медалямі.

Друкаваўся з 1930 г. пад псеўданімам Палескі. У галіне драматургіі выступіў у пасляваенныя гады. Аўтар п'ес пра пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі, калектывізацыю і сучаснае жыццё калгаснай вёскі: «Песня нашых сэрцаў» (1949), «Калі зацвітаюць сады» (1950), «Гарачыя пірагі» (1958, паст. Бугурусланскім тэатрам). У 1976 г. выйшла кніга «П'есы».

Памёр 18.6.1971 г.

Творцы

Блатун Сымон Ціханавіч нарадзіўся 10.5.1937 г. у в. Кавака. Беларускі паэт. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1959). Працаваў у газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена». Друкаваўся з 1956 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Раўнавага» (1968), «Радаслоўнае дрэва» (1970), «Чысціня» (1979), паэмы «Барвянае ляда» (1970), кнігі сатыры і гумару «Калючая шаткаванка» (1971).

На беларускую мову пераклаў асобныя вершы рускіх, латвійскіх, армянскіх і ўзбекскіх паэтаў.

Трагічна загінуў 3.4.1970 г.

Сымон Блатун

Чысціня

З успамінаў народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна

На аддзяленні журналістыкі Сымон Блатун з першых дзён звярнуў на сябе ўвагу як самы здольны, баявы, апантаны саўдзельнік падзей сучаснасці. Рана пачаліся дарогі ў самыя далёкія куткі Беларусі, нялёгкая газетная праца, што карацей называецца заданнем рэдакцыі, камандзіроўкай.

Я з першых вёрстаў палюбіў дарогі,
Глухія зненавідзеў тупікі.
У мітусні перонаў і вакзалаў
Я адчуваў імклівы пульс жыцця...

Гэта не дэкларатыўныя радкі. Хутчэй думкі ўслых. Гэта рэальнасць, якая рабіла са студэнта-першакурсніка актыўнага летапісца часу, рашучага і прынцыповага паэта.

А Сымон Блатун як чалавек, як паэт быў асаблівай, цікавай з'явай. Здзіўлялі і выклікалі добрую зайздрасць шырокае і разнастайнае поле ягонай цікаўнасці, цяга да ведаў, упартае жаданне ў любой рэчы дайсці да сутнасці, да глыбіні, да вытоку. Займаўся спортам, вывучаў гісторыю мастацтва, а разам з тым не грэбаваў самай што ні ёсць чарнавой працай журналіста: апрацоўваў пісьмы, пісаў рэпартажы, нататкі, замалёўкі, рэцэнзіі, узнімаў нялёгкія скібы на здзірванелым палетку праблемнага нарыса.

Сымону да ўсяго была справа. Яго ўсё цікавіла...

Паэзію Сымон любіў, ведаў на памяць і класіку, і самыя апошнія навінкі. Яшчэ дасюль здзіўляюцца многія празаікі з прыемных для іх нечакапасцей, калі Сымон ці ў тралейбусе, ці проста на вуліцы хваліў той ці іншы раман, аповесць, цытуючы пры гэтым цэлыя абзацы, смакуючы асобныя асабліва ўдалыя выразы, словы, павароты сюжэта.

Стараўся паспець усё прачытаць, пра ўсё дазнацца — і паспяваў. Паспяваў шмат зрабіць, некаму памагчы парадай, спагадай, словам падтрымкі і вусна, і ў друку.

І калі казаць пра стыль Сымона Блатуна, пра

манеру пісьма, то ў першую чаргу трэба падкрэсліць натуральнасць, непасрэднасць, адсутнасць літаратурных хадуль, лёгкасць майстра і вясёлага субяседніка.

Шчырасць і нявымучанасць радка праявіліся і ў лірыцы, і ў гумары Сымона Блатуна, гумары дасціпным і інтэлектуальна-віртуозным.

Распасоўка экспромтамі, эпіграмамі была ў нас у тыя часы своеасаблівай гімнастыкай. Жартавалі з сябе, з сяброў. Нават са смерцю вясёла жартавалі, бо яна тады для нас хадзіла дужа далёка. Як звычайны верш успрымаліся тужліва прачулыя, абвострана выразныя радкі Сымона Блатуна:

І скажуць: «Быў яшчэ ён малады...»
Прадстаў я у кагосьці прад вачыма.
Зязюлямі падлічаць мне гады
Суцішана трывожныя жанчыны.
І скажуць так: «Ляжаў ён, як жывы...» —
Упершыню спагадліва і шчыра.
Цішэй вады, ніжэй травы...
Бывайце, гоні, рэчкі, паплавы, —
Я адлятаю ў свой далёкі вырай.

Чалавек, а мастак асабліва, адчувае свой скон. Гэта зразумеў я пасля...

Не думалі мы тады, маладыя і шчодрыя на час, што два апошнія радкі будзе адліваць у метале Ігар Краўчанка надпісам пад бронзавым барэльефам на Чыжоўскіх могілках.

«Гоні, рэчкі, паплавы» — гэта дакладна выпісаныя родныя мясціны. Калі быў я пасля на Брагіншчыне, пераканаўся ў гэтым. У галасах брагінцоў (яны самі націск робяць у слове гэтым на апошнім складзе) чуўся мне голас Сымона...

Сурова патрабавальны да свайго слова, Сымон сам зняў з выдавецкага плана свой першы зборнік, хаця ў рукапісе былі вершы друкаваныя, станоўча ацэненыя чытачом і крытыкай. Няшчадны да сябе, Сымон Блатун быў вельмі чулы і шчодры на падтрымку маладзейшых калег па пяру, калі кансультаваў у «Чырвонай змене», рыхтаваў літаратурныя старонкі маладой беларускай паэзіі.

У шэрай папцы па «маланцы», у якой звычайна Сымон насіў дадому па вуліцы Друкарскай рэдакцыйныя матэрыялы, зараз захоўваецца своеасаблівы архіў паэта: рукапісы, выразкі, адказы пачаткоўцам, бланкі газеты «Звязда».

Трэба бачыць, колькі варыянтаў, колькі рэдакцый мае амаль кожны радок. Пераклады «белых» вершаў Яна Судрабкална толькі ад рукі перапісаны тры разы — і кожны раз па-новаму.

Паэзія Сымона Блатуна яшчэ чакае свайго даследчыка, свайго крытыка, свайго зоркага часу. І яны будуць. Вынік узнёслага слова Сымона Блатуна па-ранейшаму празрысты і крынічна-жывучы. Без яго не зразумець усёй шырокай плыні сённяшняй нашай паэзіі. А вынік гэты дакладна і шматзначна называецца адным словам — чысціня.

Друкуецца са скарачэннямі па газ.: Літаратура і мастацтва, 1979. 17 ліп.

З вершаў Сымона Блатуна

* * *

Пакрыўдзілі мы продкаў
Знявагаю — «старызна»...
Да іх іямых папрокаў
Прыслухацца карысна.

Даніну новай модзе
Так часта аддавалі:
Што пражыло стагоддзі, —
За дзень мы зруйнавалі.

Спахопяцца нашчадкі,
Успомняць нас папрокам...
Дык будзем жа ашчаднымі
Да ўзнёслай думкі продкаў!

Мы з ёй — з адной пароды,
Яна неаддзяліма,
Як мова ад народа,
Ад сённяшняй Радзімы.

* * *

Апусцелі ад стрэлаў калчаны,
Ціха коні пайшлі на пагост...
І не плакалі хлопцы — крычалі,
Як пад кулі ішлі ва ўвесь рост.

Вусны смерцю халоднаю сцяты,
І вачэй палымнее агонь...
Правяралася так вернасць сцягу,
Як барвовілі раны яго.

Я шкадую тугімі начамі,
Што да часу таго не дарос,
Як не плакалі хлопцы — крычалі
І пад кулі ішлі ва ўвесь рост.

* * *

Маўчаць вянкі — завялая іх памяць,
І многа плітаў на маёй зямлі.
Зямля, зямля, нашто гранітам раняць
Твае жывыя карані?

Табе спрадвек паклон прыносяць нізкі,
Ты прыцягненне маеш, як магніт...
І прараслі штыкамі абеліскі,
І з неба зоркі ўпалі на граніт.

Вашчанка Гаўрыла Харытонавіч нарадзіўся ў 1928 г. у в. Чыкалавічы. Беларускі манументаліст і жывапісец. Народны мастак Беларусі (1988). Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1977). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984). Прафесар (1980). Скончыў Львоўскі інстытут прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва (1955). У мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1956 г. На

педагагічнай рабоце з 1955 да 90-х гг. Працуе ў галіне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, станковага жывапісу і акварэлі.

Станковыя творы Г. Х. Вашчанкі адметныя светлаіі лірычнасцю, высокім строем пачуццяў, філасофскай інтанацыяй, тонкім каларыстычным і кампазіцыйным майстэрствам. За работы «Маё Палессе» (1971), «Нафтавікі Палесся» (1973), «Мацярынскія крылы» (1975) узнагароджаны залатым медалём ВДНГ СССР, «Балада аб мужнасці» (1974) — сярэбраным медалём імя М. Б. Грэкава. Нацюрморт мастака «Цыкламен» (1966) удастоены бронзавага медаля ВДНГ СССР. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (1995).

Маштабнасцю задумы, цэласнасцю, гуманістычнай накіраванасцю, дакладнай сістэмай фарміравання прасторы вызначаюцца манументальныя размалёўкі «Зямля светлагорская» (1972, Палац культуры хімікаў у Светлагорску, тэмпера), «Асветнікі» (1976, Дом настаўніка ў Мінску, энкаўстыка). Выканаў у Мінску вітражы ў Доме кіно (1971—1974), вітражы і люстры ў кінатэатры «Масква» (1980, у сааўтарстве з М. Вашчанкам) і інш.

Міжнародны біяграфічны цэнтр у Кембрыджы (Англія) прысудзіў Г. Вашчанку ганаровыя званні «Чалавек года 1992—1996», «Чалавек XX стагоддзя» (1992).

Вяртанне да вытокаў

Гледзячы на карціны Гаўрылы Вашчанкі, хочацца вярнуцца да вытокаў архаічных паняццяў святла, дабрыні, чысціні, да каранёў нашай духоўнасці. Адна з важнейшых тэм, што яго хвалюе, гэта міфалогія язычніцтва, старажытнасць і гісторыя. Вобразы беларускай гісторыі заўжды цікавілі Г. Вашчанку (серыя «Асветнікі» ў Доме настаўніка — партрэты Сімяона Полацкага, Вітаўта, Льва Сапегі, Сымона Буднага, Скарыны і іншых). Гэта і партрэты, напрыклад, Барбары Радзівіл, Уладзіміра Караткевіча, Васіля Быкава. Але найбольш мастак ідзе праз іншае асэнсаванне тэмы — праз філасофскія катэгорыі, праз матэрыялізацыю ў міфалогіі духоўных ісцін («Вечнасць», «Зорка Пальін»). Такая ж і серыя, прысвечаная камяням, — старажытным сімвалам быцця і спадарожнікам беларускіх пейзажаў. Гэта развагі пра шлях чалавека, непазбежнасць лёсу, немагчымасць вяртання («Брама», «Забытая памяць»). І, натуральна, вобраз каменнага крыжа («Знакі», «Іардань на Палессі») — сімвала язычніцкага і хрысціянскага, вельмі важнага для мастака.

Ну, і, натуральна, — прыродныя замалёўкі. Прырода ў Г. Вашчанкі заўжды натхнёная. Яна спакойная і непарушная, як існасць сапраўднага беларуса, яна ўраўнаважана самімі колеравымі плямамі, стрыманымі душэўнымі перажываннямі, жывапісным почыркам мастака. Сам Г. Вашчанка лічыць, што мастацтва па сваёй прыродзе павінна быць нацыянальным. Мажліва, таму, гледзячы на буслоў, стагі, кветкі, чарот, лодкі, — перасэнсоўваеш іх абстрактна, як міфалагічныя паняцці («Таямнічасць», «Свіслач», «Дарога ўздоўж возера»)... Найбольш удалыя тут невялікія работы — нібы эцюдныя замалёўкі прыроды, вытанчаныя, зграбныя, падобныя на закончаныя аграненыя камяні («Дзень згасае», «Край азёр», «Мая зямля»).

Сам мастак разважае пра сканцэнтраванасць сваіх жывапісных абагульненняў, аддае данину сваёй адукацыі і працы ў манументальным мастацтве. Гэта дазволіла яму звыкла распрацоўваць тэматыку карцін, вылучаць на палатне галоўнае, пакідаючы толькі тыя дэталі, якія адпавядалі б выказанай ідэі. Цяпер мастак амаль не працуе як манументаліст, хаця і раней ён часта браў у рукі пэндзаль.

Г. Вашчанка ніколі не піша карціны проста з натуры. Але заўжды і паўсюль мастак алоўкам ці пэндзлем занатоўвае ўбачанае, а пасля гэтыя ўражанні кладуцца асновай на палатно. Стварачы новы твор, мастак ідзе ад тэмы, а не ад дакументальнай замалёўкі...

Родная вёска Гаўрылы Вашчанкі — Чыкалавічы засталася зараз у трыццацікіламетровай зоне Чарнобыля... Таму натуральна, што і чарнобыльская тэма гучыць у апошніх работах мастака. Праўда, ён прызнаецца, што доўга не мог да яе падступіцца, «бо цяжка перажыць асабістую трагедыю згубленай «малой радзімы».

«У маіх работах пра Чарнобыль няма дакументалістыкі, няма фатаграфічных дэталяў. Я інакш разумею гэту тэму. Я хачу знайсці філасофскую ідэю трагедыі», — разважае мастак. І сапраўды, яго работы на чарнобыльскую тэму нясуць не інфармацыю, а горкія і цяжкія эмоцыі, яны ўражваюць трывожным колерам («Рэквіем»), безвыходнай адзінокасцю чалавека («Зыход», «Адлучэнне», «Час прыцемкаў»).

«Цяпер асноўная мая творчасць у жывапісе. У маладосці жыццё здавалася бясконцым, можна было марнаваць час на шматлікія тэхнічныя перашкоды, якія суправаджалі стварэнне кожнага манументальнага твора. А цяпер стала шкада часу, хочацца паспець выказаць усё, што ёсць на душы».

Больш за трыццаць год Гаўрыла Вашчанка ўзначальваў кафедру манументальна-дэкаратыў-

нага майстэрства ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце (цяпер Акадэмія мастацтваў). Можна гаварыць пра тое, што пры ім сталася беларуская школа манументальнага мастацтва і выпеставалася многа выдатных мастакоў... Адышоўшы ад актыўнага кіраўніцтва кафедрай, Гаўрыла Харытонавіч і зараз мае сваіх студэнтаў-дыпломнікаў. На жаль, заўважае ён, сённяшні час бедны на новае будаўніцтва і галоўным заказчыкам маладых мастакоў становіцца царква, якая не дае сталай кананічнасцю разгортвацца таленту і майстэрству. Ды і сам Г. Вашчанка, калі атрымаў запрашэнне экзарха Філарэта на роспіс, прапанаваў сваё бачанне хрысціянскай тэматыкі, якое не цалкам прытрымліваецца праваслаўных канонаў і царквою было адхілена.

Любоў да прыроды, лічыць мастак, была выхавана ў яго дзяцінствам, праведзеным у прыгажэйшым кутку Беларусі — паміж Дняпром і Прыпяццю. А вось пачуццё нацыянальнага, любоў да гісторыі свайго народа прыйшлі ў той час, калі мастак жыў за межамі рэспублікі. Ён выпадкова трапіў на вучобу ў Кіеўскую вучэльню прыкладных мастацтваў, ужо здаўшы іспыты ў Гомельскі чыгуначны тэхнікум. Пасля быў мастацкі інстытут у Львове, горадзе, дзе панавала яшчэ ў мастацтве еўрапейская школа без сацрэалістычных перашкод і культывавалася шырокая плынь нацыянальнага руху. Там хлопец упершыню задумаўся, хто ён, адкуль, навошта вучыцца, для каго будзе працаваць. Пасля размеркавання Г. Вашчанка працаваў шэсць гадоў у Кішынёве, дзе яго прынялі ў Саюз мастакоў, узнагародзілі медалём і вылучылі на атрыманне звання заслужанага дзеяча мастацтваў. Але чым больш пазнаваў мастак малдаўскую культуру, тым больш цягнула на радзіму. І пры першай жа магчымасці ён прыняў удзел па запрашэнні П. Масленнікава, тагачаснага рэктара БДТМІ, у конкурсе на пасаду загадчыка кафедры манументальнага мастацтва і выйграў яго. Так на Беларусь вярнуўся яе сапраўдны патрыёт і сапраўдны мастак.

Створаныя ім манументальныя роспісы ў Салігорску, у мінскім Доме настаўніка, вітражы ў касцёле Сымона і Алены сталі хрэстаматыйнымі. Але не менш каштоўнымі для мастацтва Беларусі з'яўляюцца і жывапісныя творы Гаўрылы Вашчанкі, яго алейныя цыклы і чароўныя акварэлі.

Н. Шаранговіч

Друкуецца са скарачэннямі па газ.: Літаратура і мастацтва, 1998. 23 кастр.

Верамейчык Уладзімір Міхайлавіч нарадзіўся 1.11.1937 г. у в. Петрыцкае. Скончыў Рэчыцкае педвучылішча (1955), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1964). На педагагічнай рабоце (завуч, дырэктар Ведрыцкай васьмігадовай, у далейшым сярэдняй школы) з 1964 г. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём. Выдатнік народнай асветы БССР.

У. М. Верамейчык

Першы верш надрукаваў у 1955 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Прыпяць» (1973), «Яснасць» (1978), «Люблю» (1981), «Клянуся Прыпяццю» (1988), кнігі публіцыстыкі «Гарызонты сельскіх педагогаў: Запіскі дырэктара школы» (1984). З найбольш буйных вершаваных твораў трэба адзначыць паэмы «Родны дом» (1961), «Выклікаю вясну Перамогі» (1975), «Педвучылішча» (1975), «Наша Чырвонка» (1981) і «Ліхаўня» (1986), якая прысвечана Чарнобыльскай катастрофе.

Памёр 26.12.1999 г.

З вершаў Уладзіміра Верамейчыка

КАРАЛЕВА ПАЛЕССЯ

Я Прыпяці выток і вусце,
Яе пачатак і працяг.
Яна ніколі не адпусціць
Цябе з хмурынкай у вачах.

Як дываны, лугі раскіне,
Падорыць небу сваю сінь
І рыбы на кручок накіне
На юшку царскую усім.

Раўнуюць к Прыпяці нас жонкі,
Мы ж ёю трызнім па начах.
Нам сніцца плёскат хваль гамонкіх
І вогнішча гаркавы пах.

Стаіі вартуюць бераг левы,
На правым — вецер голле гне...
Плыве Палесся каралева
У сны маі, у дні маі.

* * *

У познім сене ціха дрэмле восень.
У суме пожні — пульхнасць баразны.
У жмені зерня — пругкае калоссе.
У раннім сене — позні пах вясны.

У познім сене ціха дрэмле восень,
У бліндажы — далёкі гул вайны.
Між цёмных хмараў — залатая просінь.
У раннім сене — позні пах вясны.

У познім сене дрэмле восень чуйна,
У прымаразку — сівізна градыі.
У Прыпяці маёй залатабруйнай —
Майго жыцця нязгасныя гады.

Мікола Ракітны

Грэсь Аляксандр Яфімавіч нарадзіўся 22.5.1951 г. у г. п. Брагін. Беларускі мастак. Скончыў Мінскі політэхнічны інстытут (1985). Працуе ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (саломка, пляценне з лазы). Асноўныя творы: дэкаратыўныя шкатулкі «Залатая восень», «Чарадзейка», «Сонейка»; падносы «Вясельны», «Падарачны»; цукерачніцы «Ластаўка», «Чарадзейка» і інш. Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, музеях Расіі, Францыі, Нарвегіі.

Давыдзенка Васіль Паўлавіч нарадзіўся 3.6.1933 г. у в. Нежыхаў. Беларускі пісьменнік. Скончыў Мінскае медыцынскае вучылішча (1953), Мінскі медыцынскі інстытут (1963). Працаваў урачом-анколагам у клініцы № 1 г. Мінска, у 1965—1987 гг. у Навукова-даследчым інстытуце анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Міністэрства аховы здароўя БССР.

Навуковую і практычную дзейнасць у галіне медыцыны спалучаў з літаратурнай творчасцю. Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Жывыя струны» (1978), «Свае і чужыя дарогі» (1983).

Памёр 27.9.1987 г.

Панамарэнка Яўген Георгіевіч нарадзіўся 13.3.1947 г. у г. п. Брагін. Беларускі мастак. Скончыў Віцебскі педінстытут (1970). Працуе ў акварэлі. Асноўныя творы: пейзажы «Старое Гродна», «Багаяўленская царква ў Полацку», «Вясна над Дзвіною», «Каля старой ратушы», «Восень над Дрысаю»; нацюрморты «Падасінавікі», «Букет», «Жоўты нацюрн» і інш. Творы знаходзяцца ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, Полацкім гісторыка-культурным запаведніку.

Ракітны Мікола (сапр. Новікаў Мікалай Ісакавіч) нарадзіўся 15.4.1920 г. у в. Петрыцкае. Беларускі пісьменнік. Скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча (1940). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Працаваў у газеце «Звязда» (1946—1949), часопісе «Беларусь» (1949—1980). Друкаваўся з 1944 г. Выступаў у жанрах апавядання, нарыса, фельетона. Жыццё калгаснай вёскі, адданасць роднай зямлі, светлае і глыбокае пачуццё кахання, харство працы — асноўныя тэмы твораў першага зборніка прозы «Ранняй вясной» (1952).

Аўтар зборнікаў апавяданняў «Вячэрнія зоры» (1956), «Селькоры» (1958), «Пад адным дахам» (1961), «Была вясна» (1964), «Сярод людзей сваіх» (1967), «Вясковыя навелы» (1969), «Засмужаная далеч» (1979), «У буйным квеце лотаці» (1989). Асобнымі выданнямі выйшлі таксама кнігі «Выбранае» (1972), «Выбраныя творы», т. 1—2 (1980).

Раманюк Міхаіл Фёдаравіч нарадзіўся 3.11.1944 г. у в. Кавалі. Беларускі мастацтвазнавец, этнограф, мастак.

М. Ф. Рамаюк

Кандыдат мастацтвазнаўства (1975), прафесар (1995). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1971). З 1974 г. выкладчык гэтага інстытута, адначасова ў 1982—1984 гг. галоўны рэдактар часопіса «Мастацтва Беларусі», загадчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў Беларускай акадэміі мастацтваў.

Даследаваў пытанні народнага мастацтва і матэрыяльнай культуры. Сабраў калекцыю беларускага народнага адзення, якая экспанавалася ў Мінску (1981), Парыжы і Ліёне (1981—1982). Стварыў сцэнічныя касцюмы для Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору імя Г. Цітовіча і некаторых самадзейных калектываў.

Аўтар шматлікіх навуковых прац, у тым ліку кніг «Беларускае народнае адзенне» (1981), «Народны касцюм Чачэрска і ваколіц» (1993), «Беларускія народныя крыжы» (2000) (пад такой жа назвай перавыдадзена ў Вільнюсе на польскай мове (2002), серый буклетаў і паштовак «Беларускі нацыянальны касцюм». Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Беларускім музеі гісторыі і культуры, Беларускім музеі народнай архітэктуры і побыту і іншых музеях.

Памёр 4.9.1997 г.

Згадваючы наша падарожжа пв Палессі

Я пазнаёміўся з Міхасём Раманюком, калі ён вучыўся ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Мы былі землякамі і добра, шчыра сябравалі. Нашы майстэрні знаходзіліся побач. І мы часта сустракаліся. Але як асоба, даследчык і мастак ён раскрыўся для мяне асабліва ярка ў незабыўным падарожжы па Палессі летам 1976 г. Чатыры ці пяць дзён ён здымаў народныя касцюмы ў маім родным Камарыне на Брагіншчыне і навакольных вёсках (Чыкалавічах, Верхніх і Ніжніх Жарах, Бярозках, Асарэвічах). Я атрымаў магчымасць назіраць за ім, зазірнуць у ягоную творчую лабараторыю. На Палессі часцей кідаюцца ў вочы два асноўныя тыпы жыхароў. Першы — мажны, мо некалькі грубаваты (але гэта толькі на першы погляд), круглатвары, як бы блізкі да ўкраінскага (Украіна ж тут побач, за Дняпром), другі — больш рэзкі — тонкі, артыстычны, так бы мовіць, арыстакратычны, «балцкі». Да гэтага другога тыпу палешукоў і належаў Раманюк. Невысокага росту, але ладна складзены, ён чараваў сваёй ветлівасцю, светлым выразам твару і прыгожым мяккім голасам. Ва ўсім яму была ўласціва глыбокая народнасць, беларускасць, мо самая вызначальная ягоная рыса.

У жыцці быў сціплым, амаль сарамлівым, але калі дзеля вырашэння якой важнай справы неабходна была рашучасць, мужнасць, яны выяўляліся ў ім моцна і выразна. Асабліва пры адстойванні сваёй пазіцыі ў пытаннях роднай мовы, нацыянальнай культуры, беларусізацыі вучэбнага працэсу.

У нашым агульным падарожжы па Палессі дзівіўся таксама ягонай кантактнасці з простымі людзьмі. Вось ён толькі з'явіўся на ўскраіне вёскі, а гасцінныя палескія цёткі ўжо адчыняюць свае куфры, нясуць яму насустрач посцілкі, ручнікі, андаракі, кабацікі, фартухі. Стагоддзямі яны чакалі СВАЙГО ЧАЛАВЕКА, які б ацаніў іх натхненне, бездакорны этнічны густ, фантазію, што ашаломлівае багаццем формаў, рытмаў, арнаментных колераў. І вось такі чалавек з'явіўся і ідзе да сваіх землякоў. Было такое ўражанне, што цётак, якія адчыняць перад ім куфры, ён ведаў з маленства, а яны самі насілі яго яшчэ дзіцяткам на руках. «Цётачка, пашукайце, калі ласка, другі фартух, гэты нам не падыходзіць», — кажа Міхась сваёй натуршчыцы, і тая не ідзе, а бяжыць у сваю хату пераапранацца.

Шкадую, што не запісваў ягоныя размовы з палешукамі — гэта нярэдка была сапраўдная песня: на працы Міхась гарэў. Людзей вабіла яго арганічная шчырасць. Паляшучкі шчодра дарылі яму ручнікі, андаракі, арнаментаваныя паясы, гладышыкі. І невыпадкова ягоная калекцыя твораў народнага мастацтва, можа, самая вялікая ў рэспубліцы — за сваё кароткае жыццё ён зрабіў тое, што не здолеў зрабіць ніводны навукова-даследчы інстытут, музей, лабараторыя. Наша агульнае падарожжа па Палессі працягвалася болей як 10 дзён. З Камарына праз Мазыр даехалі да Петрыкава. Міхась скрозь фатаграфаваў не толькі касцюмы, але і посцілкі, ручнікі, хаты, цэрквы, ліштвы, выразныя краявіды, усё яго кранала і захапляла, ва ўсім беларускім ён адчуваў родную прыгажосць і каштоўнасць.

З Петрыкава па Прыпяці мы на нейкім параходзіку даехалі да вёскі Хлупін, а потым трапілі ў вёску Перароўскі Млынок, што на Тураўшчыне, якая нас літаральна ашаломіла сваім ткацтвам (кросны ў кожнай хаце!), і Міхась прапанаваў застацца тут на дні 2—3. Спалі ў хлеве, на духмяным сене, працавалі з ранку да вечара. Каля 6-ці гадзін раніцы выходжу ў сялянскі двор і трапляю ў сапраўдны музей пад адкрытым небам: на платах скрозь посцілкі ды ручнікі, адзін прыгажэй за другі. А пасярэдзіне двара ўжо шчыруе сціплавясёлы Міхась са сваім фотаапаратам на трынозе. Натуральнасць — характэрная рыса, уласцівая яго творчаму метаду. Усе ягоныя шматлікія доследы, замалёўкі, паштоўкі, маркі не «высасаны з пальца», але ўзяты з самых глыбінь народнага жыцця. У гэтым іх сіла. Тут, у Млынку, быў зроблены вельмі дарагі і памятны для мяне фотаздымак. Мы сядзім на невялічкім мосціку праз рэчку, што цячэ ўздоўж вуліцы. Побач рэчавыя мяшкі, альбомы, сумкі. На здымку Раманюк — прыгожы, узнёсла-натхнёны, імпульсіўны, у белай артыстычнай кепачцы і светлым шэрым касцюме.

Раманюк нарадзіўся ў 1944 годзе на Брагіншчыне, у вёсцы, сама назва якой быццам далучала яго да народнага мастацтва,— Кавалі. Але адразу пасля вайны ягоная сям'я пераехала на Койданаўшчыну. Памятаю, у Камарыне я пацікавіўся, чаму так здарылася. І Раманюк нагадаў пра голад на Палессі ў першыя пасляваенныя гады. Бацька загінуў на фронце, на руках маці засталіся чацвёра дзяцей. Выжыць было няпроста. І тады маці вырашыла пераехаць да сваёй сястры ў вёску Старкі непадалёку ад Койданава. Тут Міхась вучыўся ў школе, а затым пайшоў вучыцца на краўца ў Мінскі тэхналагічны тэхнікум. Пасля яго заканчэння (1963) паступіў у Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Потым была аспірантура, праца ў інстытуце, дзе ён апошнія гады загадваў кафедрай гісторыі і тэорыі мастацтваў. Раманюк фактычна з'яўляецца заснавальнікам беларускай мастацтвазнаўчай школы на сучасным этапе. Раней гісторыя мастацтва вывучалася паводле праграм Расійскай акадэміі мастацтва, дзе быў невялікі курс «Мастацтва народаў СССР». Беларускае мастацтва займала ў ім сціплае, амаль непрыкметнае месца. «Мы,— гаварыў Раманюк,— рызыкнулі вынесці ў асобныя дысцыпліны гісторыю беларускага мастацтва, матэрыяльную і духоўную культуру Беларусі, дэкаратыўнае мастацтва, гісторыю Беларусі і чыталі іх паводле сваіх, асабіста распрацаваных планаў».

Беларусізацыя вучэбнага працэсу была асноўным накірункам педагагічнай дзейнасці Раманюка. Паводле ягонай ініцыятывы ствараецца не толькі дзённае, але і завочнае аддзяленне. Напачатку студэнты першага курса былі падзелены на два патокі: беларускамоўны і рускамоўны, але ў 1992 годзе ўвесь курс быў беларускамоўным... Павага і ўвага да студэнта, ягоных планаў, клопатаў і патрабаванняў былі ўласцівы Раманюку ў вышэйшай ступені.

Як лектар Раманюк у БДТМІ не меў сабе роўных. Бо хто мог параўнацца ў багацці, навізне матэрыялаў — прытым высокамастацкіх, апрабаваных часам, бездакорных паводле зместу, семантыкі, стылістыкі — з педагогам, картатэка якога паводле самых сціплых ацэнак налічвае не менш як 100 000 адзінак? Ніхто.

Раманюк добра разумеў, што мастацтвазнаўства — гэта трывалы сінтэз слова і ілюстрацыі. Таму апошнія — а гэта агромісты натурны матэрыял, творы народнага мастацтва, занатаваныя ў фота і слайдах,— у ягоных лекцыях як бы дамінуюць.

Просты і добразычлівы, прывабны прафесар рашуча ўваходзіць у аўдыторыю, дзе яго ўжо чакаюць студэнты. Гасне святло, і на экране ўсім бязмежным багаццем арнаментыкі, пластыкі формаў, колераў, стыляў заззялі, чаруючы студэнтаў, незлічоныя творы мастацтва: народнае адзенне, посцілкі, ручнікі, куфры, кераміка, народныя маляванкі, творы з дрэва, лазы, саломкі. Шэдэўры, у якіх раскрывалася харство беларускага народа, яркая і драматычная гісторыя ягонай культуры. Пераканаўча і назаўсёды не прымаліся міфы чужынцаў пра сціпласць беларускага мастацтва. Г. Сакалоў-Кубай піша, што Раманюк «быў выдатным лектарам, валодаючы непаўторным тэмбрам голасу — аксамітным барытонам, выдатнай дыкцыяй і пачуццём аўдыторыі. Як лектар-прапагандыст аб'ехаў усю Беларусь і далучыў да нашай культуры сотні мастакоў, музейных і клубных работнікаў».

Нашае грамадства толькі на пачатку асэнсавання жыцця і творчасці Міхася Раманюка, выдатнага беларускага вучонага XX стагоддзя, арыгінальнага мастака, нястомнага калекцыянера і музейнага работніка, уважлівага, аддадзенага сваёй справе педагога, віднага грамадскага дзеяча.

В. Ф. Шматаў

Сабаленка Раман Карпавіч нарадзіўся 15.10.1907 г. у сям'і селяніна-бедняка ў в. Сабалі. Беларускі пісьменнік. Скончыў Гомельскі педагагічны

Р. К. Сабаленка

тэхнікум (1929). З 1930 да 1941 г. працаваў літаратурным супрацоўнікам, стыль-рэдактарам, загадчыкам аддзела абласной газеты «Палеская праўда» (потым «Гомельская праўда»). Адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні Гомельскага педагагічнага інстытута (1933—1935). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

У пасляваенны час працаваў у рэдакцыях баранавіцкай абласной газеты «Чырвоная звязда», рэспубліканскай «Калгасная праўда», часопіса «Маладосць», штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Друкаваўся з 1928 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі і медалямі.

У 1935 г. у часопісе «Полымя» была надрукавана першая паэма Р. К. Сабаленкі «Брагінь». Выдаў зборнікі вершаў «З родных крыніц» (1950) і «Мая эстафета» (1954). Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Жменя зярнят» (1957), «Сустрэчы» (1958) і інш. Аповесці «Юнацтва ў дарозе», «Выпрабаванне сталасці» і «Былое застаецца ў сэрцы» склалі трылогію «Іду ў жыццё». Асобнымі выданнямі выйшлі таксама «Выбраныя творы», т. 1—2 (1967—1968), «Выбранае» (1977), «Творы» (1983).

Памёр 13.5.1975 г.

Імем пісьменніка названы вуліца ў Брагіне і сярэдняя школа ў в. Сабалі.

З аўтабіяграфіі Рамана Сабаленкі

Нарадзіўся я 15 кастрычніка 1907 года ў вёсцы Сабалі Брагінскага раёна на Гомельшчыне. Вёска была як вёска: глухая, забабонная. Людзей, якія ўмелі грамаце, можна было палічыць на пальцах. Бацька мой, Карп Яўстратавіч, неяк умудрыўся навучыцца чытаць, трошкі пісаць і слыў на вёсцы за грамацея. Ва ўсякім выпадку, яго кожны раз запрашалі чытаць псалтыр па нябожчыках. Яшчэ маленькім хлопчыкам і я хадзіў з ім на тыя сумныя літанні. Голас у бацькі быў не вельмі звонкі, але мне падабалася яго аднастайнае глухое гудзенне. Маці мая, Мар'я, хоць і паходзіла з багацейшай сям'і, не ведала ніводнай літары. Але жанчына яна была дапытлівая, цікаўная, хоць і выхоўвалася ў маўклівай пакоры, у рэлігійным чадзе, якога поўна было ў хаце дзеда Трыфана, што лічыў сябе чалавекам вышэйшага гатунку.

У тыя дарэвалюцыйныя гады ў нашых Сабалях не было ніякай школы, і калі я падрос, мяне выправілі на ўсю зіму да дзеда Трыфана ў навуку. У Бакунах быў настаўнік-«дарэктар», які саматутам вучыў дзяцей. Вучыў ён не ў школе, а ў хаце дзедавага брата Траха. Што гэта было за вучэнне, цяпер мне нават цяжка ўявіць. Але ж тым часам за зіму я наламаўся складаць літары ў словы. Навучыўся і пісаць сяк-так. Падабалася мне, што, разгарнуўшы кніжку, я мог гаварыць з ёю, як з жывым чалавекам. Дзед Трыфан падсоўваў мне розныя псалтыры ды часасловы, і я, мэкаючы і бэкаючы, чытаў.

— О, унучак, як рэпу грызе. Мо і на дзяка вывучыцца,— казаў ён.

Кастрычнік у наш палескі закутак прыйшоў ціха. Мы з бацькам паехалі чагосьці ў Брагін і ўгледзелі, як па цэнтральнай, Прабойнай, вуліцы ішоў невялічкі натоўп людзей і нёс над галовамі чырвоныя сцягі. Гэта нават не падобна было на рэвалюцыйную дэманстрацыю. Аднак жа для нашага кутка гэта быў пачатак новага жыцця.

Увосень у Сабалях адкрылася школа. За настаўніцу прыехала з Брагіна Анастасія Канстанцінаўна Паўлава. Якая там школа была: усе чатыры класы вучыла яна адна, але ж мы вучыліся. На другі год я паступіў у Брагінскую школу, у пяты клас. Штодзень хадзіў за чатыры кіламетры. Але тут мне давялося нядоўга «грызці навуку». На наступную зіму мне ўручылі паперку: унесці за правучэнне дзесяць пудоў збожжа. Як паказаў бацьку гэтую паперку, дык у яго аж патыліца засвярбела.

— Дзе я табе столькі збожжа вазьму. Мабыць, мужыку як не было дарогі ў людзі, дык і цяпер няма, хоць і кажуць, што ўлада наша, мужыцкая.

Дзед Яўстрат як пачуў, што трэба столькі збожжа плаціць, аж закалаціўся:

— Ніхто з гэтае навукі хлеба не наеўся. І ён не наесца...

Такім чынам, я зноў стаў, як казаў бацька, байбусаваць. Але ў бацькавай хаце станавілася цеснавата. Мачаха не скупілася на дзяцей. Як той казаў, што гадок, то і ядок прыбаўляўся, ды ўсё хлопцы. Бацька пачаў мяне прывучаць да работы. Я араў, баранаваў, хадзіў з сярпом і касою. І хоць у мяне сілы яшчэ не вельмі ставала, але касу я цягаў, насіў копы на сенажаці, і, калі праўду казаць, работа гэтая мне падабалася. Сабалёўцы на сенажаць выбіраліся на цэлы тыдзень, бо яна была далёка. Асабліва любіў я, калі ўвечары збіраліся на грудзе ля вогнішча. Колькі там цікавых гісторый, казак расказвалася!

Але мне карцела нешта большае. Аднаго разу, у нядзелю, сабраліся мы ўтрох — сабалёўскія хлопцы: я, Яўхім Сабаленка і Андрэй Свірыдзенка — і надумаліся пайсці ў суседняе сяло Глухавічы. Там была камсамольская ячэйка. Нас вельмі добра сустрэў сакратар яе Антон Коўш. Загулялі мы да позняй ночы: слухалі прамовы, глядзеліся ў самадзейны спектакль. З таго дня кожную нядзельку хадзілі ў Глухавічы. Потым нас прынялі

ў камсамол, і, прычапіўшы кімаўскія значкі на чырвоных каснічках, мы з'явіліся ў свае Сабалі.

Але душа мвя некуды рвалася, нечага прагла. Даведаўся я, што ў газету можна слаць допісы. Пісаў пра ўсё, што адбывалася ў вёсцы, і пасылаў у рэдакцыю сялянскай газеты «Новая деревня», якая тады выходзіла ў Гомелі на рускай мове. Зрэдку мае допісы друкаваліся. Цікавым было першае адчуванне, калі я ўгледзеў у газеце надрукаваным сваё прозвішча. Не было таго чалавека, якому б я не паказаў газету.

Пад восень 1923 года я дачуўся, што ў Суткове, на Лоеўшчыне, адкрылася школа сялянскай моладзі. Наладаваўшы добрую торбу, падаўся туды пехам за добрых семдзесят кіламетраў. Прынялі мяне адразу ў сёмы клас. Гэта, бадай, была першая школа, дзе я вучыўся па-сапраўднаму. Тут я паспрабаваў пісаць вершы на рускай мове. Але куды я іх ні пасылаў, адусюль прыходзілі адказы: «Немаведама, на якой мове вы пішаце, ва ўсякім разе не на рускай». Гомельшчына тады ўваходзіла ў склад РСФСР, і ўсе газеты выдаваліся на рускай мове. Ніяк я не мог навучыцца пісаць па-руску: не хапала слоў, хоць я ўжо нямала прачытаў рускай класічнай і сучаснай літаратуры. Мабыць, тая мова, якую ўвабраў з малаком маці, вельмі моцна сядзіць у табе.

Школа, якая рыхтавала нас да таго, каб мы потым сталі аграномамі, скончана. Мне зноў наладавалі торбу, і я паехаў паступаць у Навазыбкаўскі сельскагаспадарчы тэхнікум. Такіх, як я, наехала туды многа — чалавек па дзесяць на адно месца. Па ўсіх прадметах я здаў экзамены на выдатна, а ў рускай дыктоўцы нарабіў столькі памылак, што аж двойку зарабіў.

З гаркатою на душы вяртаўся дадому. Раніцай прыехаў у Гомель, а цягнік на Хойнікі адыходзіў увечары. Рашыў паглядзець Гомель. З вакзала пайшоў па Камсамольскай вуліцы. І раптам на Доме народнай асветы аб'ява: «Гомельскі педагагічны тэхнікум аб'яўляе дадатковы набор». Здаў дакументы, а назаўтра — і экзамены. Пашанцавала.

У нашым тэхнікуме было нямала хлопцаў, якія любілі літаратуру і самі спрабавалі пісаць. Некаторыя з іх нават друкаваліся ўжо. Я зайздросціў ім добрай чалавечай зайздрасцю. А сам колькі ні пісаў вершаў, нічога не выходзіла. І толькі, калі ў 1927 годзе Гомельшчыну далучылі да Беларусі і ў нашым тэхнікуме пачалося выкладанне на роднай мове, я адчуў, што гэта тая мова, на якой і я здолею пісаць. Беларускую літаратуру выкладала цудоўная настаўніца Парыйская. Месяцы праз два-тры я пісаў ужо без памылак. У гомельскіх газетах друкаваліся ўжо матэрыялы і на беларускай мове. У «Новой деревне» я і змясціў свой першы верш. За які год прачытаў Янку Купалу, Якуба Коласа, Змітрака Бядулю. Мне вельмі тады спадабаўся раман Цішкі Гартнага «Сокі цаліны».

Неўзабаве ў Гомель прыехаў на працу ў рэдакцыю «Палескай праўды» Паўлюк Трус. Для мяне гэта было падзеяю незвычайнай. Мы хутка пасябравалі. Паўлюк увогуле быў чалавек кампанейскі. Зблізіўся ён не толькі са мною, а з усімі студэнтамі тэхнікума. Яго там палюбілі. Пры тэхнікуме быў створаны гурток «Маладняка».

У 1929 годзе я скончыў тэхнікум і паехаў у Мінск. Паступіў працаваць у рэдакцыю газеты «Звязда». Тут я трапіў у літаратурнае асяроддзе, якое яшчэ больш умацавала маю веру ў тое, што трэба пісаць. Але ўвосень прызвалі мяне ў Чырвоную Армію, і я зноў апынуўся ў Гомелі. Дэмабілізаваўшыся з арміі, надоўга асеў у гэтым горадзе. Больш дзесяці год працаваў у рэдакцыі «Палескай праўды».

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі. Мн., 1963.

Слесарэнка Леанід Аляксеевіч нарадзіўся 18.6.1926 г. у в. Гарадзішча. Украінскі кінаакцёр. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Вучыўся ў Брагінскай СШ. У 1935 г. з бацькамі пераехаў у г. п. Любеч Чарнігаўскай вобласці. Скончыў Кіеўскае тэатральнае вучылішча (1947). Здымаўся ў шэрагу мастацкіх фільмаў. Быў адзначаны прэміяй кінастудыі імя А. Даўжэнкі за ролю нямога ў фільме «Право на любовь» (1977).

Узнагароджаны трыма медалямі «За адвагу».

Памёр у 2000 г.

Хвошчанка Іван Мікітавіч нарадзіўся ў 1921 г. у в. Шкураты. Журналіст. Скончыў брагінскую сярэднюю школу № 1 (1939), Беларускі дзяржаўны універсітэт (1954). Перад Вялікай Айчыннай вайной працаваў сакратаром брагінскай раённай газеты «Трыбуна калгасніка». У якасці партызанскага сувязнога прымаў удзел у барацьбе

І. М. Хвошчанка

супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У пасляваенны час працаваў у брагінскай раённай газеце, уласным карэспандэнтам, загадчыкам аддзела сельскай гаспадаркі «Гомельскай праўды» (1958—1970), уласным карэспандэнтам рэспубліканскай газеты «Звязда» па Гомельскай вобласці (1970—1984). Узнагароджаны медалямі «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», «За працоўную адзнаку».

Памёр у 1984 г.

Чапега Уладзімір Пятровіч нарадзіўся ў 1939 г. у в. Сялец. Беларускі перакладчык. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут замежных моў (1961), Данецкае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча інжынерных войск і войск сувязі (1973). Служыў у Савецкай Арміі. Друкуецца з 1971 г. На нямецкую мову пераклаў раман І. Мележа «Людзі на балоце» (1974, з Г. Чапегай і Г. Бярэзкам), аповесці В. Быкава «Абеліск» (1975) і «Здрада» (1978), А. Кудраўца «Раданіца» (1983, усе з Г. Чапегай і Н. Рандавым), кнігу У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» (1983), асобныя творы Цёткі, Я. Брыля, К. Крапівы, П. Галавача, М. Зарэцкага, В. Коваля, Л. Калюгі, Я. Нёманскага для анталогіі беларускага апавядання «Буслы над балотамі» (1971), кнігі для дзяцей В. Віткі «Ладачкі-ладкі» (1980, 2-е выд.— 1982), А. Якімовіча «Лісіца-хітрыца» (1980) і «Залатая яблынька» (1981), «Сядзіць мядзведзь на калодзе» (1980), «Кот Максім» (1991), «Андрэй за ўсіх мудрэй» і «Беларускія народныя казкі» (1996, з Г. Чапегай), эсэ Ш. Гэрмліна «Вячэрняе святло» (1985) і інш.

Шматаў Віктар Фёдаравіч нарадзіўся 9.5.1936 г. у г. п. Камарын. Беларускі мастацтвазнавец, мастак. Доктар мастацтвазнаўства (1990). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1995). Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча (1956), Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1962). Працаваў у Віцебскім педагагічным інстытуце. З 1969 г. у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі: навуковы супрацоўнік, загадчык аддзела старажытнабеларускай культуры.

Аўтар звыш 300 публікацый, у тым ліку манаграфій «Беларуская сатырычная графіка» (1971), «Беларуская графіка. 1917—1941» (1975), «Сучасная беларуская графіка» (1979), «Беларуская кніжная гравюра XVI—XVIII стст.» (1984), «Мастацтва кнігі Францыска Скарыны» (1990), «Мастацтва беларускіх старадрукаў XVI—XVIII стст.» (2000) і інш., адзін з аўтараў «Гісторыі беларускага мастацтва» (Т. 1—6. 1987—1994), шэрагу пейзажаў, сатырычных плакатаў, экслібрысаў, серыі жывапісных палотнаў «Чарнобыльская трагедыя». Творы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, Еўрапарламенце (карціна «Маці», 1994), Брагінскім і Нараўлянскім краязнаўчых музеях.

Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны (1993).

Пра жыццё і творчасць

З успамінаў В. Ф. Шматава

Нарадзіўся я 9 мая 1936 г. на самым поўдні Беларусі — у г. п. Камарын, што на Брагіншчыне. Размешчаны на беразе Дняпра сярод бясконцых лугоў, магутных дубнякоў, карабельных соснаў, мой родны Камарын належыць, безумоўна, да самых прыгожых мясцін на свеце. Яго першазданная прырода, каларытны этнаграфізм, адметная народная творчасць, кантрастныя фарбы поўдня Беларусі пазней не маглі не адбіцца на маім характары, тэмпераменце, асобных творах.

Старэйшыя людзі памятаюць нябачны дагэтуль голад на Палессі ў першыя пасляваенныя гады. Вось чаму маці — бацька загінуў на фронце — вымушана была на пэўны час аддаць мяне (разам з двума малодшымі братамі і сястрычкай) у Камарынскі дзіцячы дом.

У 1951 г., пасля заканчэння 7 класаў, я паехаў з Камарына паступаць у Мінскае мастацкае вучылішча — адзіную ў тыя часы навучальную мастацкую ўстанову ў рэспубліцы, і хоць меў ужо пэўныя навыкі ў малюнку (маляваць пачаў рана), на экзаменах па спецпрадметах атрымаў тройкі, і не дзіва: канкурэнтамі былі хлопчыкі і дзяўчынкі, што па некалькі год займаліся ў студыі аыяўленчага мастацтва пры Мінскім палацы піянераў.

Я ж разам з Уладзімірам Гарадзеенкам (пазней вядомым мастаком, сакратаром праўлення Саюза мастакоў) прыехаў у родную сталіцу з далёкай палескай глухамані. Хутчэй за ўсё і вярнуліся б мы назад той жа дарогай, але тагачасны дырэктар Мінскага мастацкага вучылішча Іван Рыгоравіч Краснеўскі сказаў членам экзаменацыйнай камісіі: «Гэтых хлопцаў трэба прыняць толькі за тое, што прыехалі ў Мінск з далёкага Палесся». І вось я — студэнт Мінскага мастацкага вучылішча. Было мне тады 15 год. Радасць была бязмежнай, але хутка яна зацьмілася. Справа ў тым, што вучылішча, якое размяшчалася ў сутарэннях опернага тэатра, не мела інтэрната для студэнтаў. А стыпендыя была ўсяго 140 руб. Усе прыезджыя студэнты ўладкоўваліся на прыватныя кватэры, я ж зрабіць гэтага не меў магчымасці, бо разлічваць хоць на нейкую дапамогу з дому не даводзілася. Гэта амаль неверагодна: увесь дзень праводзіў у вучылішчы, а ўвечары ішоў начаваць... на вакзал. Яшчэ часцей мы, дзетдомаўцы, пасля заняткаў заставаліся начаваць у аўдыторыях.

Пасля заканчэння першага курса я цвёрда вырашыў шукаць такое вучылішча, дзе ёсць інтэрнат. Разам з М. Сакаловым (пазней галоўны рэдактар газеты «Знамя юности») мы паехалі паступаць у Ленінградскае вышэйшае мастацка-прамысловае вучылішча. Абодва не прайшлі па конкурсу, але на гэты раз дырэкцыя не ўлічыла, што мы «прыехалі здалёк», і не пайшла нам насустрач. М. Сакалоў вырашыў вярнуцца назад у дзіцячы дом, я ж на цягніку «зайцам» паехаў шукаць праўды ў Маскву. Бо як былы дзетдомавец меў права на паступленне без конкурсу. Але, як вядома, «Масква слязам не верыць». Прама з Міністэрства культуры мяне адвезлі ў славуты тады ў СССР «Маскоўскі Данілаўскі дзіцячы прыёмнік». Нагала пастрыглі, зрабілі два фотаздымкі: у фас і ў профіль. А праз колькі дзён узброены вайсковец павёз мяне назад у Мінск: Масква дамовілася з Мінскам, каб я жыў у Мінскім дзетпрыёмніку для беспрытульных і адначасова працягваў вучобу ў Мінскім мастацкім вучылішчы.

З троечніка па малюнку і жывапісу я неўзабаве перарос у чацвёрачніка, а за дыпломны эскіз «Рэпін сярод бурлакоў» (1956) атрымаў выдатную адзнаку, што давала права паступаць у Беларускую акадэмію мастацтва (тады Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут). Добра вытрымаўшы экзамены (конкурс быў не малы, бо ў тыя часы ў БДТМІ паступалі з усяго былога Саюза), я быў залічаны на першы курс жывапіснага аддзялення. Маімі выкладчыкамі былі выдатныя беларускія мастакі: А. Мазалёў, В. Цвірка і іншыя. Малюнкам і жывапісам займаўся вельмі сур'ёзна і не без поспеху.

У адрозненне ад Мінскага мастацкага вучылішча ў БДТМІ быў інтэрнат, але жылося цяжка, бо ніякай матэрыяльнай дапамогі я па-ранейшаму не меў. Затое ўмеў ужо маляваць, нешта рабіць у мастацтве. Працаваў мастаком-афарміцелем у вайсковым клубе ва Уруччы, пазней у будаўнічым трэсце. Добра памятаю, як пасля заняткаў увечары накіроўваўся ва Уруччa ў вайсковы клуб, дзе гадзінамі бронзай фарбаваў бюсты «правадыроў і настаўнікаў» ды старанна выводзіў літары тагачасных «маральных кодэксаў». У інтэрнат вяртаўся не раней 23 гадзін.

Неўзабаве звязаўся з выдавецтвамі, маляваў загалоўкі для артыкулаў газет («Зорка», «Піянер Беларусі», «Знамя юности»). А ў 60-я гады ў «Вожыку» пачалі друкаваць мае карыкатуры. У студэнцкія гады я па-сапраўднаму захапіўся гэтым вельмі спецыфічным відам выяўленчага мастацтва.

У «Вожыку» я павучыўся маляваць аператыўна, хутка, дакладна. Выдатныя майстры беларускай графікі А. Волкаў і В. Ціхановіч патрабавалі асаблівай дакладнасці ў кампазіцыі, умення выяўленчымі сродкамі проста і даступна адлюстраваць тую ці іншую задуму. Акрамя таго, у «Вожыку», у асяроддзі вядомых пісьменнікаў (С. Дзяргая, Я. Сіпакова, У. Корбана і іншых), я пастаянна працаваў і над роднай мовай, родным словам. Бо сатырычныя малюнкі для «Вожыка» патрабавалі не толькі дакладнасці выяўленчага вобраза, але і лаканічных трапных подпісаў. І зусім невыпадковым з'яўляецца тое, што менавіта ў «Вожыку» я напісаў свой першы мастацтвазнаўчы артыкул на роднай мове.

Супрацоўніцтва з выдавецтвам міжволі штурхала да графікі. Цікавасць да яе ўзмацнілася пасля таго, як выкладчыкі графічнага аддзялення пазнаёмілі мяне з тэхнікай гравюры (пінарыт, афорт, літаграфія). Усе вечары праводзіў у эстампнай майстэрні і па прапанове П. Любамудрава — вельмі вопытнага, адданага сваёй справе педагога, што меў выдатную школу, на трэцім курсе інстытута перайшоў на графічнае аддзяленне. Дыплом — 5 аркушаў серыі «Аэрапорт» — выканаў у тэхніцы каляровай літаграфіі. Марыў пра самастойную творчую працу. Пачыналася яна няблага. Мой дыплом набыла Трацякоўская галерэя — у тыя часы такі гонар выпадаў нямногім. У 1962 г. мае працы былі паказаны на выставе ва Улан-Батары — гэта, здаецца, была першая міжнародная выстава з удзелам беларускіх мастакоў. Акрамя мяне ў ёй удзельнічалі М. Савіцкі, А. Кашкурэвіч. Аднак творчае жыццё склалася крыху інакш. У 1962 г. пасля заканчэння БДТМІ мяне накіравалі на працу выкладчыкам малюнка ў Віцебскі пединстытут імя С. М. Кірава. Па сутнасці, гэта была мая новая прафесія. Разы два-тры прыязджаў у Мінск, у Саюз мастакоў, каб далучыцца да мастацкага жыцця.

Атмасфера ў тагачасным Віцебску творчасці таксама не спрыяла — часы, калі тут працавалі М. Шагал, К. Малевіч, Э. Лісіцкі, выходзіў часопіс «Мастацтва», даўно адышлі ў мінулае. Каб уявіць сабе культурную атмасферу горада на Дзвіне, нагадаю, што літаральна за некалькі дзён да майго прыезду тут быў узарваны шэдэўр беларускага дойлідства славутая Дабравешчанская царква (XII ст.).

Я цвёрда вырашыў вярнуцца ў Мінск. Неўза-

баве і зручны момант выпаў. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі абвясціў прыём у аспірантуру па мастацтвазнаўчае аддзяленне. Давалася стыпендыя і, галоўнае, прадастаўляўся інтэрнат (а значыцца, і прапіска) — гэта было тое, што трэба. Недзе ў канцы 1963 г. я стаў аспірантам... З 1969 г. працую ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі.

Як дырэктар Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі вяду вялікую работу па зборах помнікаў культуры і мастацтва ў адселеных «чарнобыльскіх» вёсках.

Сотні помнікаў былі выратаваны супрацоўнікамі нашага музея. Яны прайшлі дэзактывацыю, і сёння наведвальнікі музея маюць магчымасць пазнаёміцца з творамі этнаграфіі і народнага мастацтва Чарнобыльскай зоны. Гэта пакуль што адзіны такі музей у СНД.

Збіраць экспанаты мы пачалі каля самых чарнобыльскіх труб па Брагіншчыне. Першая экспедыцыя адбылася з 3 па 10 чэрвеня 1991 г. Пачаўшы з Брагіншчыны, дзе працавалі ў в. Калыбань, Вязок, Пучын, мы ў наступны раз даследавалі выселеныя вёскі Камарыншчыны (в. Чыкалавічы, Чэрнеў, Капоранка, Савічы, Пасудава).

Тое, што мы ўбачылі ў час экспедыцыі, цяжка перадаць словамі. Пад стрэхамі кінутых хат (большасць іх, дарэчы, выдатныя помнікі народнай архітэктуры) мы ўбачылі магутную, амаль не кранутую часам этнаграфію, народнае мастацтва. Многія хаты былі сапраўднымі музеямі (страшэнна, праўда, зруйнаванымі). Кросны амаль у кожнай хаце, самапрадкі, дзежы і дзежачкі, ступы, жорны, грэбні, ёрмы, маляваныя дываны на сценах і посцілкі (або іх фрагменты), ручнікі на падлозе сярод жудаснага бруду — гэтыя і многія іншыя помнікі гаварылі пра яркую, багатую і самабытную культуру.

Гэта былі не лёгкія экспедыцыі. Страшэнны, да болю нежылы выгляд, высокі ўзровень радыяцыі, брудныя, запыленыя рэчы, крапіва і калючкі вышэй за чалавечы рост (пры падыходзе да хат), агульны псіхалагічны клімат — усё гэта было на кожным кроку, раніла сэрца.

Варта адзначыць, што перасяленцы скрозь сустракалі нас вельмі гасцінна і адносіліся да нашай працы з разуменнем. Было нямала выпадкаў, калі ў наш лагер (часцей за ўсё мы жылі ў палатках, якія ставілі каля Дняпра, Брагінкі, каб зручней было праводзіць першую чыстку экспанатаў) людзі самі прыносілі рыбацкія прылады і нават кросны, ступы. «Бярыце, — казалі яны, — нам гэта ўжо болей не спатрэбіцца...»

Паступова пры музеі склаўся асобны «Чарнобыльскі фонд», у якім зараз сотні высокамастацкіх твораў.

Не без гонару лічу сябе мастаком Палесся, свядома працую над велічнай рэгіянальнай тэмай. Мае жывапісныя працы лагічна ўкладваюцца ў два перыяды: «Палессе да Чарнобыля» і «Палессе пасля Чарнобыля». Бяда не закрыла мне дарогу на Бацькаўшчыну. Штогод бываю ў «зоне» не менш 2—8 разоў (Камарын знаходзіцца ў 27 км ад Чарнобыльскага атамнага рэактара). У выселеных, знявечаных радыяцыяй вёсках сабраў значны выяўленчы матэрыял. Іх дапоўнілі эцюды, зробленыя ў часе экспедыцый па зборы помнікаў этнаграфіі і народнага мастацтва Чарнобыльскай зоны. Так нарадзілася серыя «Чарнобыльская трагедыя». Непадробная праўда, натурнасць, прастата і даходлівасць формы — яе адметныя рысы..

Яскевіч Уладзімір Мікалаевіч нарадзіўся ў 1940 г. у в. Сабалі. Беларускі спявак (барытон). Заслужаны артыст Беларусі (1982). Скончыў Веймарскую кансерваторыю (ГДР, 1975). У 1970—1976 гг. з'яўляўся салістам ансамбля песні і танца Групы савецкіх войск у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, з 1976 г. — ансамбля песні і танца Беларускай ваеннай акругі. Валодае голасам прыгожага тэмбру шырокага дыяпазону. У рэпертуары спевака беларускія, рускія народныя песні, творы беларускіх кампазітараў і інш.

У складзе ансамбля Беларускай ваеннай акругі гастраліраваў у Афганістане, Францыі і іншых краінах.

Матэрыялы рубрыкі «Нарадзіліся на Брагіншчыне» падрыхтавалі *І. Ф. Ганжураў, М. З. Башлакоў, Л. Т. Калюжная, І. М. Паланейчык, М. С. Сяргееў.*

Параднёныя з Брагіншчынай

Яны, вядомыя дзеячы навукі і культуры, нарадзіліся часам далёка за межамі нашага раёна, але ў іх біяграфіі ёсць тая або іншая брагінская старонка. Адны яшчэ ў даўні даваенны час прывандравалі на Брагіншчыну з бацькамі, і тут прайшло іх дзяцінства, іншых жыццёвая дарога прывяла да нас ужо ў сталым іх веку і ў час не такі далёкі. І адных, і другіх лёс назаўсёды парадніў з нашым краем, і на ўсё жыццё яны захавалі аб ім удзячную памяць. Гэтак жа і Брагіншчына не забывае іх.

Л. І. Арцюшэўскі

І. Ф. Ганжураў

Арцюшэўскі Леанід Іванавіч нарадзіўся ў 1924 г. у в. Дарашковічы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Кандыдат медыцынскіх навук (1960), дацэнт. Выдатнік аховы здароўя. Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1954). У 30-я гг. жыў у Камарынскім раёне. У 1941 г. скончыў 9 класаў Крукаўскай школы. З 1943 г. баец партызанскага злучэння генерал-маёра М. І. Навумава. Пасля вызвалення Камарыншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працаваў інструктарам Камарынскага РК ЛКСМБ. З сакавіка 1944 г. ваяваў на 1-м Украінскім фронце. Да 1947 г. служыў у Савецкай Арміі. У 1956—1978 гг. працаваў у Мінскім медыцынскім інстытуце: выкладчыкам, затым на працягу сямі гадоў дэканам лячэбнага і стаматалагічнага факультэтаў, загадчыкам кафедры агульнай хірургіі.

Аўтар 107 навуковых прац, некалькіх рацыяналізатарскіх прапаноў па медыцынскай тэматыцы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, 9 медалямі. Адзначаны бронзавым медалём Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі.

Ганжураў Іван Феакцістаўіч нарадзіўся ў 1937 г. у в. Беседзь Веткаўскага раёна. Журналіст. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1970). Працаваў у Веткаўскай раённай газеце «Перамога Кастрычніка», на камсамольскай і партыйнай рабоце. У 1969—1989 гг. — рэдактар брагінскай раённай газеты «Маяк Палесся». Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў і медалямі. Аўтар шматлікіх матэрыялаў і ўкладальнік гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць. Брагінскі раён». Жыве ў г. Салігорск Мінскай вобласці.

Дваццаць рэдактарскіх год

З успамінаў І. Ф. Ганжурава

Калі цяпер успамінаю пачатак сваёй работы ў якасці рэдактара брагінскай райгазеты «Маяк Палесся» (1969), перш за ўсё згадваюцца нялёгкія рэдакцыйныя будні з іх паўсядзённымі клопатамі аб падрыхтоўцы газетных матэрыялаў і бяссонныя ночы, звязаныя з выпускам чарговых нумароў. З-за дрэннай укамплектаванасці рэдакцыі кадрамі, нездавальняючага стану паліграфічнай базы друкарні кожны з іх даваўся з немалымі цяжкасцямі. Таму пачынаць рэдактарскую дзейнасць давялося не толькі з клопатаў аб паляпшэнні зместу і афармлення газеты, але і, у большай меры, з пошуку кадраў газетчыкаў, з бясконцых просьбаў да зацікаўленых інстанцый аб рамонце і ўстойлівым электразабеспячэнні друкарні, якая да таго ж размяшчалася ў паўпадвальным непрыстасаваным памяшканні.

Праца рэдактара часта ўскладнялася яшчэ і адцягненнямі на выкананне разавых і кампанейскіх партыйных даручэнняў у арганізацыях, калгасах і саўгасах.

Але, нягледзячы на ўсё гэта і асабліва на частыя аварыйныя адключэнні электраэнергіі, паломкі паліграфічных машын, за дваццаць маіх рэдактарскіх гадоў ніводнага разу не быў сарваны выхад райгазеты. А за гэты ж час убачылі свет больш за тры тысячы яе нумароў.

Што б ні казалі наконт дзейнасці публікацый раённага друку, але нельга аспрэчваць станоўчага іх уплыву на свядомасць, паводзіны, грамадска-палітычную і працоўную актыўнасць чытачоў. Як арбітрам раённага сацыялістычнага спаборніцтва, нам, газетчыкам, нярэдка даводзілася пераконвацца ў гэтым на практыцы. Тым больш калі нашы ўдачы тут адзначалі зусім не шчодрыя на пахвалу райкамаўскія «куратары». Менавіта дзейнасцю і дзелавітасцю раёнкі тлумачыўся і яе немалы тыраж.

Згадваючы аб усім гэтым, з удзячнасцю адзначаю, што ў паўсядзённай рабоце адчуваў падтрымку і дапамогу з боку старэйшых супрацоўнікаў рэдакцыі: намесніка рэдактара, а затым — адказнага сакратара газеты Ц. С. Шубянка, уласнага карэспандэнта па Камарынскай зоне Г. Ф. Калініна, карэктара К. П. Старавойт і іншых. Успамінаюцца таксама загадчык аддзела пісьмаў, а затым намеснік рэдактара М. М. Анісенка, фотакарэспандэнт М. Р. Самойленка, загадчык аддзела пісьмаў А. Р. Гацка, літаратурныя супрацоўнікі В. І. Каса-

буцкі, Н. А. Злыдзенка і іншыя, хто пакінуў прыкметны след у «Маяку Палесся» — нашым друкаваным летапісе раёна.

Карпаў Уладзімір Барысавіч нарадзіўся 26.2.1912 г. у г. Хвалынск Саратаўскай вобласці. Беларускі пісьменнік. Скончыў Мінскі педагагічны інстытут (1941). З 1921 г. жыў у в. Ёлча. Працаваў на лесапільні ў Рэчыцы, настаўнічаў, у тым ліку ў Крукаўскай школе Камарынскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенны час працаваў у газетах «Советская Белоруссия», «Літаратура і мастацтва», часопісе «Полымя».

Аўтар шырокавядомых раманаў «За годам год» (1957), «Вясеннія ліўні» (1961), «Нямігі крывавыя берагі», «Сотая маладосць» і іншых кніг.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Памёр 6.8.1977 г. Імем пісьменніка названы вуліца ў Мінску і бібліятэка ў г. п. Камарын.

З аўтабіяграфіі У. Карпава

Нарадзіўся я ў сям'і земскага ўрача ў волжскім гарадку Хвалынску. Не ведаю, які ён сапраўды, але мне ўяўляецца зялёным, у садах, з недалёкімі крэйдавымі гарамі, з якіх узімку на санках можна ехаць кіламетры. Тут прайшло маё маленства, тут я бачыў рэвалюцыю, грамадзянскую вайну, тут навучыўся плаваць, чытаць.

Маці мая — самаахвярная, цярплівая жанчына — працавала выхавацельніцай у дзіцячым доме, і, можа, толькі гэтая акалічнасць выратавала нас. Голад наваліўся на спустошаны вайною гарадок адразу, як толькі завітаў у Паволжа. Як ні дзіўна, першымі пачалі паміраць сыцейшыя. Бацька пакінуў нас даўно. Апрача мяне, на матчыным гарбе сядзелі яшчэ двое — старэйшы брат і сястра. Таму, натуральна, мы не маглі быць сытымі. Дый дзіцячаму дому сёе-тое ўсё ж перападала. Калі ж стала зусім цяжка, дзіцячы дом эвакуіравалі ў Гомель. Так я трапіў у Беларусь.

У. Б. Карпаў

Нельга сказаць, каб жыццё ў прыдняпроўскай вёсцы Ёлча на Камарыншчыне было вельмі лёгкае. Дзевяцігадовым хлапчуком я каштаваў ужо хлеб падпаска — пасвіў вясковых свіней, вадзіў на начлег чужых коней. Але дабрату і спагаду ёлчанскіх кабет, сваю першую настаўніцу — самотную Марыю Ёсіпаўну Шастаковіч, Ігрышча, што распасціралася паміж вёскай і Дняпром і па вечарах звінела ад дзявочых галасоў, я заўсёды буду ўспамінаць з замілаваннем, э удзячнасцю.

Пасля я жыў і працаваў шмат у якіх вёсках Камарыншчыны, ды павага і любоў да людзей, якія прытулілі нашу сям'ю, ідуць усё-такі з Ёлчы. І тут я, у свае дзесяць год, прысягнуў аддзячыць ім, чым толькі будзе ў маіх сілах.

Пазней я вучыўся ў школе другой ступені (так называлася тады сярэдняя школа), дзе перада мной раскрыўся свет чароўных ведаў і не знаёмых раней пачуццяў, ды ўсё роўна альма-матэр для мяне асталася аднакамплектная Ёлчанская школа, дзе я пачаў разумець геаграфічную карту, адчуў асалоду ад таго, што малюю, дзе стаяла нефарбаваная драўляная шафа з кнігамі, якія з захапленнем чытаў пры цьмяным святле камінка або ў абед на Ігрышчы, калі свінні спакойна адпачывалі на беразе затокі.

Да тысяча дзевяцьсот дваццаць дзевятага года, калі я скончыў «другую ступень», брат — шчыры, працавіты хлопец — ужо рабіў канцарэзчыкам на Рэчыцкім лесапільным заводзе і абзавёўся сям'ёю. Працаваць побач з братам вырашыў і я. Не падаючы заявы ў інстытут, паехаў да брата.

Што я вынес з сярэдняй школы? Перш за ўсё прагу да работы, ружовыя мары, веру ў дабро і бязмежную адданасць часу, жыццю.

За гады работы на Рэчыцкім лесапільным заводзе кім я толькі не працаваў. Адносіў аполкі ад піларамы да канцарэзкі, адвозіў з мурла тачкай тырсу ў качагарку, быў цыркуляршчыкам, памочнікам станкавога, качагарам, сартыроўшчыкам.

Працаваў я ахвотна, многа. Тады мне было семнаццаць. Каб паступіць на завод, давялося выдаць сябе дарослым, прыпісаўшы год. Але і ў свае семнаццаць, адпрацаваўшы поўную змену, я, калі не хапала рабочых рук, грузіў вагоны лесам, прымаў удзел у штурмах, у суботніках ці завіхаўся на лесаскладзе каля штабялёў дошак. Так што пазней у мяне доўга з левага пляча, на якім я насіў аполкі і дошкі, не зыходзіла нарасць-мазоль, і левае плячо ў мяне нават цяпер асталося дужэйшым.

Я палюбіў завод, зладжанасць, што панавала ў калектыве. Было хораша, думна сярод працавітых людзей, каля станка або цыркуляркі.

Цяжка прыходзілася толькі ўзімку. Па цэху гулялі скразнякі. У шырачэзныя вароты, праз якія саматас падцягваў бярвенні, дыхаў сцюдзёны Дняпро. Жалеза абпякала рукі. Але і тады — калі пілавалі бярозу, чулася вясна, патыхала хмяльным бярозавым сокам. Усё выкуплялі кароткія хвіліны адпачынку ў цёплай пілаточцы або качагарцы. І вельмі радавала, калі над вільчыкам заводскага даху загаралася яркая чырвоная зорка — сведчанне, што завод перавыканаў план.

Не меншым маім захапленнем, як і раней, былі кнігі. Чытаў я прагна ўсё, што траплялася пад рукі, — ад Эўрыпіда да Ляонава, і паважаў кнігу вельмі. Я нават яскрава помню, дзе і як атрымліваў кнігі. Помню, як, адчыніўшы нефарбаваную скасабочаную шафу, Марыя Ёсіпаўна выдавала іх нам, віхрастай дэятве, беражліва беручы з палічкі, уважліва разглядала, каб запомніць, якія былі, і не працягвала, а ўручала іх. Помню бібліятэку ў школе другой ступені і той запаветны пакойчык з стэлажамі, куды выбіраць сабе кнігі дапускаліся толькі любімчыкі. Помню бібліятэку на лесапільным заводзе — маладую бібліятэкарку Дору Бэр, маленькі столік пры дзвярах, за якім яна сядзела, кніжныя паліцы і шафы. Я забыўся, дзе знаходзіўся заўком, назву вуліцы ў рабочым пасёлку, дзе жыў, а вось бібліятэку помню і буду помніць да апошняга дня...

У трыццаць другім памёр брат. Цяжка перажыўшы гэта, я пакінуў Рэчыцу і вярнуўся да маці ў Камарын. Зноў паўстала пытаине будучыні, і зноў я аддаў перавагу не вучобе, а працы.

Чаму? Скончыў я сярэднюю школу выдатна. У пасведчанні-атэстаце педагогі вызначылі «ўхіл» — літаратура, маляванне і чамусьці хімія. Значыць, і тут быў выбар, было, вядома, і жаданне вучыцца. У школе ўсталявалася традыцыя — кожны выпуск (а ў нас было некалькі паралельных груп) пакідаў пасля сябе вялікі партрэт У. І. Леніна, і пісаць партрэт у дваццаць дзевятым даручылі мне. Усе мае неразлучныя таварышы наогул пайшлі ў мастацкае вучылішча — перад імі замаячыла вунь што! А я не захацеў, падаўся на завод. Думалася, што вучоба нідзе не дзенецца, «паварыцца ж у рабочым катле» чалавеку заўсёды карысна. Нават неабходна — тады ты будзеш зусім іншы. Дый рабочы стаж потым сам забяспечыць табе далейшую вучобу. Але чаму я не пайшоў вучыцца, маючы ўжо гэты рабочы стаж? Цяпер мне цяжка нават сказаць. Мусіць, шукаў яшчэ сябе, у мяне не было пэўнасці ў адносінах да заўтрашняга дня, як не было пэўнасці і ў тых «ухілах», якія вызначыў мне педсавет. Больш таго, працуючы на лесапільным заводзе, я паступіў на завочнае аддзяленне Маскоўскага рэдакцыйна-выдавецкага інстытута, але, калі маё аддзяленне — рэдактарскае — закрылі, адмовіўся пераходзіць на якое-небудзь іншае і кінуў інстытут наогул. Так ці інакш, на Камарыншчыне я стаў настаўнічаць — якраз пачалі бурна расці школы і не хапала настаўнікаў.

Гэта былі слаўныя гады — гады гарэння, самаадданай працы, падрыхтоўчых і перападрыхтоўчых курсаў. Вучні, школа, грамадская работа... Штудіраваў методыку, складаў планы, даваў практычныя ўрокі, займаўся з адстаючымі.

Праўда, жыццё не заўсёды песціла мяне. Выпадалі хвіліны, калі яно паварочвалася спіной і было глыбока несправядлівым.

У трыццаць сёмым арыштавалі маіго айчыма — таксама настаўніка. Айчым і пасынак — невялікае сваяцтва (не кажучы пра тое, што сам ён быў вінаваты), але мяне выключылі з камсамола. Здзіўлены, абураны, я не мог ужо аставацца на Камарыншчыне і падаў заяву ў Наркамасветы, каб мяне перавялі куды толькі можна.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Пяцьдзесят чатыры дарогі. Мн., 1963.

Коваль Уладзімір Іванавіч нарадзіўся ў 1952 г. у в. Адзельск Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і афіцэра-пагранічніка. Доктар філалагічных навук (1999), прафесар (2000). З чатырох год жыў у Брагіне, куды пераехала сям'я на радзіму маці. Скончыў Брагінскую сярэднюю школу (1969), Гомельскі дзяржаўны універсітэт (1974).

У. І. Коваль

Працаваў выкладчыкам у Гомельскім СПТВ-34. З 1986 г. у Гомельскім дзяржаўным універсітэце, з 1990 г. загадчык кафедры рускага і славянскага мовазнаўства. Аўтар больш ста навуковых прац, у тым ліку кнігі «Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы» (1995).

Слесарэнка Аляксей Аляксеевіч нарадзіўся 7.3.1919 г. у г. Кіеў у сям'і служачага. Беларускі пісьменнік і артыст-чытальшік. Заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1960).

У 1924 г. бацькі вярнуліся на радзіму ў в. Гарадзішча Брагінскага раёна.

Скончыў пачатковую школу ў в. Сялец, затым вучыўся ў школе першай ступені ў Брагіне. Скончыў студыю кінаакцёра ў Маскве (1938), завочныя курсы мастацкага чытання Усесаюзнага Дома народнай творчасці (1949). Вучыўся ў заснавальніка рускай школы мастацкага чытання прафесара В. К. Сярожнікава.

Здымаўся ў ролі Мірона ў фільме «Палескія рабінзоны» (1934), а таксама ў фільмах «Бежин луг» (рэжысёр С. Эйзенштэйн), «Веселые ребята» (рэжысёр Р. Аляксандраў), «Аэраград» (рэжысёр А. Даўжэнка).

Працаваў дырэктарам Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў БССР (1954—1956), навуковым супрацоўнікам Літаратурнага музея Якуба Коласа (1962—1974). Выступаў як чытальнік Беларускай дзяржаўнай філармоніі. На яго рахунку больш за 10 тысяч літаратурных выступленняў у Беларусі, Расіі, Украіне.

Аўтар кніг «Дарогі і песні» (1965), «Дарагія абліччы» (1967), «Аляксандр Даўжэнка. Шлях да слова» (на ўкраінскай мове, 1974), «Жыццё ў мастацтве» (1977), «Продолжение радости» (1981), шэрагу літаратурных кампазіцый, у тым ліку «Народны паэт БССР Якуб Колас» (1956).

Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў, медалямі «За баявыя заслугі», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна».

З успамінаў Аляксея Слесарэнкі

Першы чытальніцкі дэбют

Многа год назад у глыбі беларускага Палесся, на Брагіншчыне, будучы вучнем школы першай ступені, я вывучыў на памяць надзвычай папулярны сярод вясковага люду верш «Асадзі назад». Вучыў яго пасля ўрокаў у класе ў прысутнасці дзеда Гаўрылы, які паліў грубкі і вартаваў «наша» вучылішча, як ён не без гонару любіў гаварыць.

Прыслухаўшыся да радкоў, якія я паўтараў уголас, дзед адразу назваў іх аўтара:

— Якуб Колас... Во хто гэта напісаў. Але так ён, браце ты мой, падпісвае толькі свае вершы. Для ўсяго ж іншага ў яго ёсць другое імя — Тарас Гушча... Ну дык вось, калі дзе давядзецца прачытаць таго, другога, то ведай, што ён аніякі не Гушча, а ўсё той жа Якуб Колас.

Толькі значна пазней я даведаўся, што наш вартаўнік праяўляў такі «бляск эрудыцыі», будучы амаль непісьменным чалавекам: ён даходзіў да ўсяго прыроджанай кемлівасцю і выключнай памяццю. Цяжка было зразумець, як ён мог, ніколі нідзе не вучыўшыся, чытаць на памяць сялянам, вучням і наогул першаму стрэчнаму вялікія раздзелы з «Новай зямлі». Гэты самабытны дзед якраз і быў тым першым чалавекам, які абудзіў у мяне любоў да творчасці Коласа і з'явіўся маім пастаўнікам у чытанні.

Завучваў тэксты дзед Гаўрыла дома, лежачы на печы і ўважліва слухаючы чытанне ўнука Лаўрэна, які рыхтаваў урокі. Гэта быў старанны хлопец, заўзяты чытач школьнай бібліятэкі, але нейкі бяспамятны. Не ў прыклад сваяму дзеду, ён ніколі не запамінаў вершаў. Як толькі адкладаў на якую гадзіну кніжку, завучанае адразу ж вылятала з галавы.

У такіх выпадках дзед падаваў унуку «рэплікі» з печы. З дзедавай памяці дзівілася ўсё навакольле. Дзед горача любіў тэатральнае мастацтва і шчыра яму служыў. У сельскім драмгуртку яму адводзілі незайздросную ролю суфлёра. Але дзеда гэта не засмучала — часта ён рабіў яе галоўнай. Седзячы ў будцы, дзед «падаваў тэксты» проста з галавы. Чатырох-пяці рэпетыцый было даволі, каб стары ведаў усю п'есу на памяць. Падказваючы «артысту», які заблытаўся ў словах, суфлёр настолькі ўзвышаў голас, што яго ўжо можна было пачуць і ў самым канцы залы. І тады, услед за дзедам, на ўсю моц «падавалі тэкст» ачмурэламу «артысту» ўжо і самі гледачы. А паміж дзеямі дзед пад воплескі выплаіў з будкі і чытаў якінебудзь твор любімага ім Якуба Коласа. Чытаў ён перад заслонай, і часу яму хапала, бо дэкарацыі перастаўляліся надзвычай доўга. Яго выступленняў чакалі і часта прымалі іх лепш, чым нават спектакль.

У навучаны з чужога голасу аўтарскі тэкст дзед часта ўстаўляў свой уласны, пабудаваны на мясцовым жыццёвым матэрыяле. Гэта была сакавітая імправізацыя, рыфмаваная і рытмічная.

Бясспрэчна здольны і схільны да мастацтва дзед Гаўрыла так і не здолеў за свой доўгі век выйсці на шырокія прасторы жыцця. Гаротны лёс дарэвалюцыйнага парабка не даў магчымасці яму ў свой час разгарнуць — хто ведае — можа, і вялікі самабытны талент.

У дванаццатую гадавіну Кастрычніка на традыцыйным школьным ранішніку адбыўся мой дзіцячы чытальніцкі дэбют. «Асадзі назад» Якуба Коласа якраз і з'явіўся тым вершам, праз які я перажыў першыя ў жыцці хвіліны хвалявання навідавоку ў людзей і незабыўную асалоду творчай радасці.

На ранішніку, як і заўсёды, апрача дзяцей былі і дарослыя. У першым радзе сядзеў дзед Гаўрыла і больш за ўсіх пляскаў у далоні. Ён тут жа выдаваў выканаўцам смачную «прэмію» са

свайго ўласнага саду. Пашчаслівіла і мне атрымаць ад яго пасля чытання вялікі духмяны антонаўскі яблык. Калі скончыўся ранішнік, дзед запрасіў да сябе ў госці дзяцей — удзельнікаў канцэрта — і даў нам, як кажуць, «афіцыйны прыём і абед». Падсунуўшы стол да дубовай канапы, стары пасадзіў нас на яе і на прынесены з сенцаў услон. Пасярэдзіне стала паставіў вялікую гліняную міску, поўную мёду, і збан квашаных гуркоў. Атрымаўшы ад дзеда па добрай лусце хлеба, мы вясёлым гуртам адкусвалі хрумсткія гуркі і ласаваліся пахучым мёдам.

Пасля пачастунку дзед паказваў нам усё тое, на што ён быў здатны. Перш за ўсё прачытаў нам «Дзядзьку-кухара». Часта даводзілася мне чуць, як дзед яго выконваў, і кожны раз я захапляўся па-новаму, бо і сам выканаўца, мусіць, не ведаў, колькі ў яго ёсць сваіх варыянтаў на выдатны твор народнага паэта.

Пасля чытання дзед іграў на скрыпцы, спяваў жартоўныя беларускія песні, скакаў «барыню», паказваў, «як бугай б'ецца з воўкам», прыдумваў розныя гульні і, урэшце, завёў грамафон з блішчастай трубою. Як зачараваныя слухалі мы запіс выступленняў комікаў «Бім-Бом».

Мінаў час. Пасеянае дзедам Гаўрылам зерне любові да творчасці Якуба Коласа не зарасло ў маёй душы. Дагледжанае руплівай рукою настаўніка Лукаша Піліпавіча Дуброўскага, яно дало добры плён.

Выкладчык беларускай мовы і літаратуры Брагінскай школы другой ступені Дуброўскі быў надзвычай цікавы чалавек. Два захапленні вызначалі своеасаблівасць яго характару: кнігі і дзеці. Ён быў выдатны настаўнік. Мастацкую літаратуру глыбока ведаў і па-мастацку яе выкладаў. Кожную раніцу вучні з радасным хваляваннем чакалі яго ў класе. Ён абуджаў у іх любоў да роднай мовы і літаратуры, заўсёды падкрэсліваючы, што толькі дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі і Савецкай уладзе Беларусь стала раўнапраўным членам вялікай сям'і савецкіх народаў.

У школе быў створаны літаратурны гурток. Лукаш Піліпавіч Дуброўскі горача падтрымаў нашу ініцыятыву, склаў праграму і згадзіўся быць кіраўніком. Заняткі мы пачалі з пашыранага вывучэння твораў і біяграфіі Якуба Коласа і Янкі Купалы. Метад быў такі: спачатку твор чыталі на гуртку ўголас і па чарзе, а пасля ўжо выносілі на калектыўнае абмеркаванне. Заключнае і абагульняючае слова рабіў кіраўнік.

Я быў самы малодшы ў гуртку і таму доўга не мог дачакацца сваёй чаргі на чытанне, і толькі ўжо напярэдадні зімовых канікул Лукаш Піліпавіч, прыкмеціўшы маё хваляванне, сказаў, што пасля канікул гурток пачне вывучаць паэму Коласа «Сымон-музыка» і першым буду чытаць я.

Радасна ўзрушаны ішоў я дадому. І азарыла мяне думка — так падрыхтавацца да чытання ў гуртку, каб не з кніжкі, як усе іншыя, а на памяць прачытаць «Сымона-музыку».

Як задумаў, так і зрабіў. Яшчэ не паспелі скончыцца зімовыя канікулы, як «Сымона-музыку» я ведаў з пачатку да канца. У першы дзень заняткаў гуртка сябры слухалі як зачараваныя. Лукаш Піліпавіч моўчкі хадзіў паміж партаў па класным пакоі. Час ад часу ён кідаў дапытлівы позірк у мой бок і падбадзёрваў добразычлівай усмешкай. Памяць мая вытрымала першае выпрабаванне: доўгі эпічны твор — радок у радок — прагучаў да канца.

Слухачы паціскалі мне рукі, віншавалі і дзякавалі. Лукаш Піліпавіч папрасіў паўтарыць чытанне перад настаўнікамі і вучнямі старэйшых класаў.

Вынікі майго чытальніцкага дэбюту былі зусім неспадзяванымі. Бацька, расчулены пахваламі настаўнікаў у мой адрас, прадаў на кірмашы свае адзіныя хромавыя боты і купіў мне ў Брагіне бобрыкавае паліто і картовыя, на выпуск, пад чаравікі, штаны. Гэта была мая першая, трэба сказаць, зусім неблагая тарыфікацыя.

З таго часу мне даводзілася завучваць на памяць многія творы Якуба Коласа, Янкі Купалы і іншых пісьменнікаў і чытаць іх на літаратурных вечарах і канцэртах мастацкай самадзейнасці.

Даўно мінулі дні маленства, але падзеі тых дзён звычайна ўспамінаюцца больш ярка, чым тое, што адбылося нават зусім нядаўна.

Я іграю ў «Палескіх рабінзонах»

У 1934 г. маладыя кінарэжысёры з «Белдзяржкіно» Іосіф Бахар і Павел Малчанаў, шукаючы выканаўцаў на дзіцячыя ролі ў кінафільме «Палескія рабінзоны» (па аповесці Янкі Маўра), натрапілі на мяне. Спачатку мне задалі шэраг эцюдаў, а потым папрасілі што-небудзь пачытаць. Я прачытаў раздзел «Дарэктар» з «Новай зямлі» Якуба Коласа. Чытанне было вучнёўскае, але выклікала рашэнне зняць «пробу» на кінаплёнку і ў выпадку ўдачы зацвердзіць мяне на ролю.

Беларуская кінастудыя знаходзілася тады ў Ленінградзе на славутым канале Грыбаедава. Не гаворачы ўжо аб хвалюючай перспектыве здымацца ў кіно, першае ў жыцці падарожжа ў Ленінград — горад рэвалюцыі, дзе кожны камень — гэта гісторыя, было і само па сабе найвялікшым шчасцем для мяне.

Творчыя работнікі кінастудыі сустрэлі мяне па-зямляцку ветліва і гасцінна.

У тыя дні на кінастудыі чакалі прыезду з Мінска Якуба Коласа, Янкі Купалы і Змітрака Бядулі. Меркавалася стварыць кінафільмы на матэрыяле лепшых твораў славутых беларускіх пісьменнікаў. Але прыезд усё адкладваўся, і ўрэшце прыехаў адзін Змітрок Бядуля.

Яму нехта сказаў, што на студыі ёсць «палескі Рабінзон» з сапраўднага Палесся. Гэта зацікавіла пісьменніка, ён знарок прыйшоў у павільён, каб пабачыць мяне. Я расхваляваўся, убачыўшы перад сабою «жывога» пісьменніка, творы якога вывучаў у школе і ведаў сёе-тое на памяць.

Змітрок Бядуля падрабязна распытваў пра маю вёску, пра бацькоў і школу. Пацікавіўся, каго я ведаю з беларускіх пісьменнікаў і якія

паспеў прачытаць кніжкі. У сваю чаргу я з вострай цікавасцю распытваў пісьменніка пра Якуба Коласа і Янку Купалу. А пасля нечакана для самога сябе пачаў чытаць яму без перадыху ўрывак з «Салаўя». Памятаю, Бядуля вельмі расчуліўся і, даслухаўшы ўсё да канца, знік, не сказаўшы мне ні слова. Праз нейкі час ён вярнуўся, трымаючы ў руках старанна запакаваны пачастунак. Гэта быў першы ганарар чытальніку ад удзячнага аўтара.

Доўгачаканая «проба» прайшла паспяхова, і мяне зацвердзілі на ролю. Пачаліся павільённыя кіназдымкі.

Міроп... Так зваўся па сцэнарыю хлопец, ролю якога я мусіў іграць. Гэтым імем пачалі зваць мяне і ў жыцці. Хутка яно так прыляпілася да мяне, што я пачаў забываць сваё сапраўднае імя...

Асноўнае дзеянне нашага фільма павінна было адбывацца дзесьці на ўлонні прыроды беларускага Палесся. Туды мы і накіраваліся. Абраны намі Ліпскі востраў, які знаходзіцца за 70 кіламетраў на поўнач ад Гомеля,— гэта, бадай, ці не самы маляўнічы куток не толькі на Палессі, але і ва ўсёй Беларусі.

Ліпскі востраў абмываецца з усіх бакоў Сожам і рэчкай Ліпай.

Жыхары вострава, і асабліва моладзь, пасябравалі з намі і гасцінна запрашалі на свае вечарынкі. Звычайна пасля гарачага, поўнага працоўных клопатаў дня мы разам купаліся ў Сожы перад заходам сонца, а пасля падымаліся на строму, дзе спявалі вясёлыя і сумныя народныя песні і бясконца танцавалі сялянскі вальс, якім вельмі захапляюцца на поўдні Беларусі.

Пакрысе нашы зборышчы набылі традыцыйны характар, і аблюбаванае месца атрымала назву «Клуб на строме». Душою гэтага клуба быў Павел Сцяпанавіч Малчанаў. Таленавіты, прыроджаны артыст, ён рад быў магчымасці даць выйсце сваёй творчай энергіі. Ніхто не мог спаборнічаць з ім у чытанні мастацкіх рэчаў, спевах, віртуознай ігры на мандаліне...

Увосень кіназдымкі фільма «Палескія рабінзоны» былі закончаны. Рэжысёры пачалі яго мантаваць, а я, сабраўшы свой малы куфэрачак, узяў курс на Маскву...

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Слесарэнка А. Дарагія абліччы. Мн., 1967.

Слесарэнка Анатоль Аляксеевіч нарадзіўся ў 1923 г. у г. Кіеў у сям'і служачага. Украінскі кінарэжысёр, кінадраматург, кампазітар. Заслужаны дзеяч мастацтваў Украіны. Лаўрэат прэмій імя А. Даўжэнкі і Я. Галана (тройчы), міжнародных прэмій. Абладальнік Гран-пры «Залаты голуб» XVI Міжнароднага фестывалю дакументальных і кароткаметражных фільмаў у г. Лейпцыг (1973). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

У 1924 г. бацькі вярнуліся на радзіму ў в. Гарадзішча Брагінскага раёна. Скончыў пачатковую школу ў в. Сялец, затым вучыўся ў школе першай ступені ў Брагіне. У 1935 г. пераехаў з бацькамі ў г. п. Любеч Чарнігаўскай вобласці. Скончыў Кіеўскі тэатральны інстытут (1950).

Паставіў больш як 80 мастацкіх, дакументальных і тэлевізійных фільмаў, у тым ліку мастацкія: «Гори, моя звезда» (1957), «Когда начинается юность» (1958), «Любой ценой» (1959), «Друзья-товарищи» (1960), «Ночь перед рассветом» (тэлевізійны шматсерыйны, 1976), «Право на любовь» (1977); дакументальныя: «Цветущая Украина» (1950), «Гоголь» (1952), «Гуцульская свадьба» (1967), «Роменская мадонна» (1973), «Сердце солдата» (1974), «Летите, аисты, летите в Раску» (1974), «Какая Марья без Ивана» (1981) і інш.

Аўтар кніг «Пять песен о коммунистах» (1977), «Рассказы о незыбываемом» (1979), «Уметь любить» (1985).

Узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

Памёр 27.1.1997 г.

Матэрыялы рубрыкі «Параднёныя з Брагіншчынай» падрыхтавалі *І. Ф. Ганжураў, М. З. Башлакоў, Л. Т. Калюжная.*

Загінулі ў Афганістане

Балобан Віктар Мацвеевіч нарадзіўся 3.8.1965 г. у в. Хатуча. У 1980 г. скончыў Багушоўскую васьмігадовую школу, у 1983 г.— Рудакоўскае ПТВ № 183. Працаваў трактарыстам у саўгасе «Астрагляды». У красавіку 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію і накіраваны ў Афганістан. Радавы. Загінуў 11.11.1984 г. Пахаваны ў в. Хатуча.

Кіпцік Віталь Аркадзевіч нарадзіўся 2.6.1963 г. у г. п. Брагін. У 1980 г. скончыў сярэднюю школу ў Брагіне, паступіў у Бакінскае вышэйшае агульнавайсковае камандное вучылішча, пасля сканчэння якога разам з групай афіцэраў быў накіраваны ў Афганістан. Лейтэнант. Загінуў 8.12.1984 г. Пахаваны ў г. п. Брагін. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

«Да канца выканаў свой абавязак...»

У дваццаць адзін год ён неаднойчы глядзеў смерці ў вочы. А маці пісаў свае першыя пісьмы «адтуль», нібы з Манголіі. У сардэчнай дабрыні сваёй, з адной толькі думкай аб тым, каб не парушыць душэўны спакой бацькоў, напэўна, упершыню маніў самым блізкім людзям. Напачатку нават не рашыўся зрабіць гэта сам і таму перад адпраўкай у Афганістан папрасіў свайго таварыша Ш. Ахмедава напісаць бацькам пра свой ад'езд у «Манголію».

Ад сястры ж Ірыны, якая жыла ў Ленінградзе, Віталь не хаваў праўды. «Теперь у меня к тебе будет одна большая просьба,— пісаў ён 15 кастрычніка 1984 года.— Об этом (пераводзе ў Афганістан.— *І. Г.*) никто не должен знать... Зачем маме лишние расстройства, зачем переживания? Зачем два года бессонных ночей? Лучше уж я расскажу ей обо всем этом, когда вернусь...»

Праз тыдзень зноў Ірыне «адтуль»: «Я попал в неплохой полк, который охраняет дорогу от провинции до провинции. Стреляют тут немного, так что не волнуйся, жить можно...

Домой я написал, что поехал в командировку в Монголию...»

І ўсё ж жорсткая і бязмерна балючая праўда неўзабаве адкрылася бацькам, скаланула сэрцы родных і блізкіх, зяцёмых і сяброў журботнымі словамі тэлеграмы: «Уважаемые Аркадий Антонович и Софья Кирилловна! С глубокой скорбью... сообщаем Вам, что, исполняя свой служебный интернациональный долг на территории Демократической Республики Афганистан, Ваш сын, командир мотострелкового взвода лейтенант Киптик Виталий Аркадьевич, погиб смертью храбрых в бою с мятежниками.

В. М. Балобан

В. А. Кіпцік

Мотострелковому взводу, которым командовал Ваш сын, была поставлена задача сопровождать автоколонну машин и охранять ее от возможного нападения душманов. Около одного из населенных пунктов мятежники сделали засаду, завязался тяжелый и жестокий бой. Быстро и грамотно оценив обстановку, лейтенант Киптик В. А. вместе со взводом занял удобные позиции и начал отбивать нападение. Ведя меткий и уничтожающий огонь из личного оружия, проявляя при этом мужество и отвагу, подавив несколько огневых точек противника, лейтенант Киптик В. А. дал взводу команду окружить оставшихся мятежников и уничтожить их. Но неожиданно разорвавшаяся рядом граната смертельно ранила его, и, не приходя в сознание, Виталий умер на руках у товарищей...»

Сцепаненка Віктар Аляксеевіч нарадзіўся 20.8.1960 г. у в. Залессе. У 1977 г. скончыў Залескую сярэднюю школу, потым школу ДТСААФ і пра-

В. А. Сцепаненка

цаваў шафёрам у саўгасе «Пасудава». У кастрычніку 1978 г. прызваны ў Савецкую Армію. У ліку першых савецкіх воінаў быў накіраваны ў Афганістан. Загінуў 25.12.1979 г. Пахаваны ў в. Залессе. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісьма В. А. Сцепаненкі родным

...Нас подняли по тревоге, и мы сейчас Бог знает где. Очень далеко от Белоруссии. И собираемся еще дальше. Пожалуйста, не волнуйтесь и верьте, очень верьте, что я вернусь. Валечка, очень прошу и верю тебе, что ты даже плакать не будешь. Валера, а ты смотри за этим, ты же мужчина...

Должен я ехать в отпуск 24 декабря. Вот и съездил. Но вы не волнуйтесь, пожалуйста, не волнуйтесь, как вернусь — сразу домой.

Сохраните, пожалуйста, это письмо. Очень больно расставаться с вами даже на бумаге.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

РЭКВІЕМ

З краіны афганскай вярнуліся ў цынку —
Не суджаны быў ім шчаслівы працяг.
Сівее матуля няўцешная: «Сынку!..»
І бацьку пячэ невыносна ў грудзях.

За светам забітыя іх летуценні
Навекі засыпалі родным пяском.
Блукаюць між намі іх светлыя цені
З хлапечым над верхняй губою пушком.

Іх бардамі мужнасць герояў апета,
І чуецца ў песні бравурны трубач.
А ці ж на жалобу накладзена вета? —
Аплач жа, зямля мая, хлопцаў, аплач.

Згадаюць сябры, не забудзе нявеста.
І скрозь, дзе яны дарагімі былі,
О маці-зямля! Ад Чукоткі да Брэста
Слязамі дажджоў іх магілы палі.

Хай слёзы твае нам сумленне апаляць,
Бо ці ж перад імі няма ў нас віны?
Няхай зберажэ наша горкая памяць
Абраннікаў гэткай няпашай вайны.

Мікола Кусянкоў

Загінулі пры выкананні службовых абавязкаў

АСТРАГЛЯДАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АСТРАГЛЯДЫ

ШЭЙКА Васіль Аланасавіч, н. у 1935, прызваны ў армію ў 1953, радавы, загінуў 10.7.1953, пахаваны ў г. Эберсвальдзе, Германія.

ВЁСКА ДУБРОЎНАЕ

ДАНЧАНКА Рыгор Антонавіч, н. у 1924, радавы, загінуў 8.11.1945.

ЦЯЦЕРЫЧ Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1972, прызваны ў армію ў чэрвені 1990, сяржант, загінуў 24.2.1992, пахаваны на радзіме.

ВЁСКА ХАТУЧА

РАМАНЕНКА Давыд Рыгоравіч, радавы, загінуў 8.11.1945 у г. Бендэры, Малдова.

БРАГІНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

ГАРАДСКІ ПАСЁЛАК БРАГІН

ЛОБАНЬ Мікалай Уласавіч, н. у 1951 у Плешчаніцкім р-не Мінскай вобл., прызываўся Брагінскім райваенкаматам у 1969, радавы, пагранічнік, загінуў 15.5.1970 падчас узброенага канфлікту на савецка-кітайскай граніцы, пахаваны ў г. Благавешчанск Амурскай вобл.

МАЛОЧКА Іван Іванавіч, н. у 1970, прызваны ў армію ў снежні 1988, радавы, загінуў 20.7.1990, пахаваны на радзіме.

ВЁСКА САБАЛІ

СЯРГЕЕНКА Андрэй Васільевіч, н. у 1955, прызваны ў армію ў маі 1974, радавы, загінуў 16.1.1975.

ВЁСКА ЧЫРВОНАЯ ГАРА

АСІПЕНКА Юрый Міхайлавіч, н. у 1972, прызваны ў армію ў чэрвені 1990, радавы, памёр 22.11.1990, пахаваны на радзіме.

ВУГЛОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ТАКЛІНОЎ

КРАСКОЎСКІ Міхаіл Сямёнавіч, н. у 1932, прызваны ў армію ў 1950, радавы, загінуў 4.4.1954 пры ахове савецка-турэцкай граніцы, пахаваны на гарадскіх могілках у г. Батумі, Грузія.

БЫЛЫ КРУКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КРУКІ

ПЛЯКІН Мікалай Восіпавіч, н. у 1963, прызваны ў армію ў 1981, радавы, загінуў 30.6.1981, пахаваны на радзіме.

МАЛАЖЫНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА МАЛАЖЫН

КАЛЯСАН Аляксандр Іванавіч, н. у 1962, прызваны ў армію ў чэрвені 1980, малодшы сяржант, загінуў 4.8.1981, пахаваны на радзіме.

МАЛЕЙКАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА МАЛЕЙКІ

КАЦУБА Васіль Аляксандравіч, н. у 1961, прызваны ў армію ў лістападзе 1979, радавы, загінуў 25.6.1980, пахаваны ў г. Ульянаўск, Расія.

ВЁСКА ПЕТРЫЦКАЕ

МАДЗЕЕЎ Лука Фядосавіч, н. у 1917, радавы, загінуў 5.10.1945, пахаваны ў г. Познань, Польшча.

ВЁСКА ТЭЛЬМАН

ШУМІГАЙ Мікалай Іванавіч, н. у 1957, лётчык, загінуў 9.6.1986, пахаваны ў в. Тэльман.

М. І. Шумігай

НОВАЯЛЧАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КРАСНАЕ

ВАШЧАНКА Уладзімір Іванавіч, н. у 1981, прызваны ў армію ў ліпені 2000, радавы, загінуў 13.7.2000, пахаваны на радзіме.

ВЁСКА ЛЮДЗВІНОЎ

СЦЕПАНЕНКА Барыс Іванавіч, н. у 1918, гв. радавы, загінуў 11.2.1946.

ВЁСКА НОВАЯ ЁЛЧА

ЯШЧАНКА Міхаіл Сідаравіч, н. у 1951, прызваны ў армію ў 1969, палкоўнік, загінуў 30.12.1990, пахаваны на радзіме.

СЛАБАДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЫГРАБНАЯ СЛАБАДА

ЖУРАЎСКІ Аляксандр Панцялеевіч, н. у 1964, прызваны ў армію ў лістападзе 1982, радавы, загінуў 19.5.1984, пахаваны на радзіме.

ПУГАЧ Валерый Фёдаравіч, н. у 1957, прызваны ў армію ў маі 1976, малодшы сяржант, загінуў 10.2.1978, пахаваны на радзіме.

ВЁСКА ПУЧЫН

БАЛОБАН Васіль Мікалаевіч, н. у 1936, прызваны ў армію ў 1954, гв. радавы, загінуў 3.3.1955, пахаваны ў г. Тула, Расія.

ХРАКАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ПРОСМЫЧЫ

МАЛОЧКА Сяргей Адольфавіч, н. у 1960, прызваны ў армію ў маі 1978, радавы, загінуў 29.6.1979, пахаваны на радзіме.

ВЁСКА ХРАКАВІЧЫ

ЖУКАЎ Рыгор Мікалаевіч, н. у 1933, прызваны ў армію ў маі 1951, малодшы сяржант, загінуў 8.12.1951, пахаваны на радзіме.

КУЛЕШ Мікалай Іванавіч, н. у 1930, прызваны ў армію ў 1948, радавы, загінуў 19.4.1954, пахаваны ў г. Гвардзейск Калінінградскай вобл., Расія.

РАМАНАВЕЦ Віктар Іванавіч, н. у 1937, прызваны ў армію ў 1955, старшы сяржант, загінуў 28.8.1959.

Па звестках Брагінскага райваенкамата і Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі спіс падрыхтаваў

І. Ф. Ганжураў

Пад чорным крылом Чарнобыля

26 красавіка 1986 года цудоўны куток беларускага Палесся — Брагіншчыну ахінула чорная хмара чарнобыльскай катастрофы. У мінулым засталося спакойнае, размеранае, «мірнае», як яго называлі з часу апошняй вайны, жыццё, бо пасля выбуху на ЧАЭС яно нібы перавярнулася, напоўнілася нязвычнымі для мірнага часу рэаліямі — забаронамі і абмежаваннямі. На дарогах і ўвогуле на мясцовасці з'явіліся гэтыя «чарнобыльскія» знакі: «Стой! Праезд і праход забаронены», «30-кіламетровая зона», «Небяспечна для здароўя», «Збор грыбоў і ягад забаронены!» і інш.

Аднак уся суровая праўда аб наступствах чарнобыльскай сітуацыі ў раёне не была адразу ж даведзена да ведама насельніцтва, як па аб'ектыўных (дэфіцыт у інфармаванасці аб выніках аварыі ў раёне), так і суб'ектыўных прычынах.

Раённае кіраўніцтва і адпаведныя службы не змаглі аператыўна і да канца адкрыта паведаміць людзям аб характары аварыі. Інакш на другі дзень пасля катастрофы ў непасрэднай блізкасці ад АЭС, у Камарыне, не праводзілася б масавая дзіцячая ваенізаваная гульня «Зарніца», у ходзе якой дзеці адчувалі моцнае фізічнае недамаганне ад уздзеяння радыяцыі. Не адпавядаюць сапраўднасці пазнейшыя афіцыйныя сцверджанні, што ў раёне з першага дня рабілася ўсё магчымае для змяншэння згубнага ўздзеяння радыяцыі на людзей, што максімальны ўзровень радыяцыі ў «жылых» населеных пунктах не перавышаў 0,5 мілірэнтгена ў гадзіну. Бо нават больш чым праз два з паловай гады канстатавалася: «В Брагине сейчас уровень радиации по цезию составляет 27 кюри на квадратный километр. Но там выпали радионуклиды стронция, плутония. В переводе на цезий загрязненность достигает 52 кюри»[1].

[1] Бацкалевич В. В Брагине цвели сады... Политический собеседник, 1990. № 4.

Жыхары в. Шкураты М. Я. Болбас (у першым радзе злева) і яе муж І. Р. Болбас (у другім радзе справа) прынялі ў свой дом перасяленцаў Н. Д. і П. Я. Мішчанкаў з в. Гдзень

Некаторыя з вучоных і людзей, надзеленых уладай, якія валодалі аб'ектыўнай інфармацыяй аб сапраўднай радыяцыйнай сітуацыі ў раёне, пайшлі на здзелку з сумленнем, дапусціўшы напрыканцы 1986 г. рээвакуацыю жыхароў 12 населеных пунктаў у родныя мясціны. Затым амаль усіх іх зноў давялося высяляць па прычыне немагчымасці пражывання чалавека на забруджанай радыенуклідамі тэрыторыі 30-кіламетровай зоны. Тым больш што вёска Гдзень (284 двары) знаходзілася ўсяго за 14 кіламетраў ад АЭС.

У інфармаванні насельніцтва наконт пасляаварыйнай сітуацыі шырока выкарыстоўваліся мясцовыя райгазеты і радыё, наладжваліся выезды ў працоўныя калектывы інфармацыйна-прапагандысцкіх груп, сустрэчы з вучонымі і спецыялістамі па праблемах, выкліканых чарнобыльскай катастрофай. Аднак толькі пазней высветлілася, што шырокую галоснасць атрымлівала ў асноўным сціплая паўпраўда, бо самі мясцовы штаб ГА, кіраўніцтва раёна часта атрымлівалі далёка не аб'ектыўную інфармацыю аб пасляаварыйнай сітуацыі. Інакш хіба ж хто-небудзь адважыўся б укладваць вялікія сродкі ў дэ-

зактывацыю, добраўпарадкаванне ў населеных пунктах, з якіх затым давялося назаўсёды высяляць жыхароў?

Пасля трохэтапнага адсялення насельніцтва (1986) прыкметна ўрэзаны ў людскіх і матэрыяльна-тэхнічных рэсурсах Брагінскі раён наладжваў жыццё на новы «мірны» лад. Па вахтавым метадзе з іншых раёнаў і абласцей рэспублікі прыязджалі працаваць спецыялісты розных галін народнагаспадарчага комплексу. Аказвалася матэрыяльна-тэхнічная дапамога. Паступова нармалізоўвалася работа прадпрыемстваў і арганізацый, калгасаў і саўгасаў.

Адно заставалася балючай, незагойнай раной — вымушанае «бежанства». Нязбытныя надзеі перасяленцаў на вяртанне пад родны дах, туга па малой радзіме выклікалі з'яўленне такой невядомай раней катэгорыі людзей, як самасёлы. Дзесяткі і сотні сем'яў на свой страх і рызыку вярнуліся ў родныя хаты з месцаў адсялення і перасялення. Найбольш іх было ў вёсках Сабалі, Савічы і інш.

Чарнобыльская бяда раскідала брагінцоў ледзь не па ўсёй Беларусі. Пераважная большасць маладых сем'яў з дзецьмі і пенсіянеры атрымалі бясплатнае добраўпарадкаванае жыллё ў Мінску, у шэрагу абласных і раённых цэнтрах рэспублікі. Некаторыя працоўныя калектывы (калгасы імя Калініна, імя Леніна, саўгас «Астрагляды» і інш.) ледзь не поўным саставам уліліся ў розныя гаспадаркі сваёй вобласці.

І. Ф. Ганжураў

Дзеці з Брагінскага раёна ў піянерскім лагеры «Дзвіна» Віцебскай вобл.

Горкая праўда аб выніках чарнобыльскай катастрофы

У выніку аварыі на 4-м блоку ЧАЭС у навакольнае асяроддзе была выкінута вялікая колькасць доўгажывучых радыенуклідаў. Пападанне ў навакольнае асяроддзе 50—70 млн. кюры доўгажывучых радыенуклідаў (цэзій-137, стронцый-90 і інш.) не мае аналагаў у сусветнай практыцы.

У рэактары акрамя штатнага камплекта паліўных касет (192 тон урану) у каналах вытрымкі захоўваліся касеты адпрацаванага паліва. Па ацэнках спецыялістаў, з рэактара выбухам было выкінута больш як палова ядзернага гаручага. Гэты факт пацвярджаецца тым, што да цяперашняга часу ў былым рэактары 4-га блока ЧАЭС знойдзена толькі 50 тон урану, які змешчаны ў застылай лаве сілікатнага саставу, што праплавіла два жалезабетонныя перакрыцці. Лічаць, што прыкладна 120 тон урану знаходзіцца ў развале паміж блокамі і сцяной саркафага. Менавіта туды «звальвалі» высокарадыеактыўныя матэрыялы ў працэсе ачысткі прампляцоўкі, даху трэцяга энергаблока і машыннай залы. У шахце былога рэактара і іншых памяшканнях, па ацэнках спецыялістаў, знаходзіцца да 40 тон уранаўтрымліваючага пылу.

Шырокая разнастайнасць саставу закінутых у аварыйны рэактар пры гашэнні пажару матэрыялаў, высокія тэмпературы ўнутры палаючага рэактара выклікалі фарміраванне і выпадзенне ў бліжэйшай зоне «гарачых» часціц — носьбітаў радыеактыўнасці з пераважна сілікатным саставам.

У першыя дні пасля аварыі насельніцтва Беларусі атрымала значную дозавую нагрузку ад кароткажывучых

ізатопаў (крыптону, ксенону, ёду і інш.; ёд-131 мае перыяд паўраспаду восем дзён).

Праз дзевяць гадоў пасля чарнобыльскай катастрофы жыхары пацярпелых раёнаў Беларусі ўжо атрымалі больш як 70 працэнтаў прыжыццёвай дозы апрамянення (ёд, цэзій, кароткажывучыя ізатопы і г. д.).

Цяпер, пасля адсялення каля 130 тысяч чалавек з найбольш забруджаных раёнаў, доля знешняга апрамянення невялікая, а 70–90 працэнтаў дозавай нагрузкі насельніцтва атрымлівае за кошт спажывання мясцовых прадуктаў харчавання (унутранае апрамяненне).

Пасля выпадзення на тэрыторыі Беларусі больш за 50 млн. кюры радыенуклідаў, распаду кароткажывучых ізатопаў і ўлічваючы, што вертыкальная міграцыя радыенуклідаў малая (1–2 см у год), у бліжэйшае дзесяцігоддзе не чакаецца радыкальнага паляпшэння радыяцыйнага становішча. Таму неабходна правядзенне мерапрыемстваў па мінімізацыі накаплення калектыўнай дозы апрамянення і прыняцце для гэтага неабходных ахоўных мер насельніцтва рэспублікі.

Вельмі важна аднавіць даныя аб атрыманых раней дозах апрамянення жыхарамі рэспублікі, ажыццявіць пасільную разавую кампенсацыю пацярпелым за нанесены ўрон здароўю, правільна зарыентавацца з чаканай колькасцю хворых і падрыхтавацца да іх лячэння. Зразумела, надзвычай важна лячыць людзей, якія захварэлі ад радыенуклідаў Чарнобыля, але не менш важна засцерагчы насельніцтва пацярпелых раёнаў ад радыяцыйна небяспечных прадуктаў харчавання, не спрыяць з'яўленню новых хворых, асабліва дзяцей, якія нараджаюцца пасля чарнобыльскай катастрофы.

Сёння сучасная радыяцыйная медыцына ўстанавіла няўхільную залежнасць анкалагічных і іншых захворванняў ад калектыўнай дозы апрамянення. Таму ў аснове радыяцыйнай абароны насельніцтва ва ўсім свеце прыняты прынцып мінімізацыі калектыўнай дозы апрамянення.

Прававую аснову меры радыяцыйнай абароны насельніцтва пацярпелых раёнаў Беларусі атрымалі пасля прыняцця ў 1991 годзе Вярхоўным Саветам Рэспублікі Беларусь Законаў «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» і «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС». Для захавання ўстаноўленай гэтымі законамі дозавай мяжы насельніцтва (1 мЗв/год) павінны ўстанаўлівацца дапушчальныя ўзроўні ўтрымання радыенуклідаў у прадуктах харчавання, паветры, вадзе і магутнасці дозы знешняга апрамянення. Для ўказанай дозавай мяжы Міністэрства аховы здароўя рэспублікі ўстанавіла дапушчальныя ўзроўні ўтрымання радыенуклідаў (РДУ-92) у асноўных дозаўтваральных прадуктах харчавання (малако — 111 Бк/л, бульба — 370 Бк/кг, хлеб — 185 Бк/кг, мяса — 600 Бк/кг, гародніна, садавіна, ягады — 185 Бк/кг, дзіцячае харчаванне — 37 Бк/кг). Аднак гэтага недастаткова, каб выключыць перапрамяненне асобных груп насельніцтва.

З-за эканамічнага крызісу дзяржава не ў стане забяспечыць жыхароў пацярпелых раёнаў чыстымі прадуктамі харчавання па нормах Міністэрства аховы здароўя РДУ-92. Па даных радыяцыйнага кантролю ў 1991–1992 гадах доля прадуктаў, якія не адпавядаюць РКУ-90, у грамадскім сектары вытворчасці складала: па малаку — 0,24 працэнта, па мясу — 0,29 працэнта, агародніне — 0,01 працэнта. У той жа час у асабістых дапаможных гаспадарках па даных Міністэрства аховы здароўя рэспублікі ў 1992 годзе доля проб малака, якое не адпавядала РКУ-90, склала 4,9 працэнта, мяса — 2,5 працэнта, агародніны — 0,06 працэнта.

Зыходзячы з гэтай інфармацыі,

Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь у Законе «Аб прававым рэжыме тэрыторый, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджанню ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» (артыкул 40) прадугледзеў стварэнне Дзяржкамчарнобылем у населеных пунктах, размешчаных у зонах радыеактыўнага забруджання, мясцовых цэнтраў радыяцыйнага кантролю (МЦРК) пры мясцовых Саветах, прызначаных для выканання заявак грамадзян па абследаванню прадуктаў харчавання і прадметаў хатняга ўжытку.

У верасні 1991 года Дзяржкамчарнобыль назначыў Інстытут радыяцыйнай бяспекі «Белрад» галоўнай арганізацыяй па стварэнню сеткі і арганізацыі эксплуатацыі МЦРК.

У 1994—1995 гадах недахоп фінансавых сродкаў на эксплуатацыю сеткі МЦРК, якія выдзяляюцца Дзяржкамчарнобылем, прывёў да скарачэння ў два-тры разы працуючых цэнтраў, вялікай цякучасці кадраў.

Як відаць, у рэспубліцы праводзіцца радыяцыйная абарона насельніцтва, укаранёна дзяржаўная і грамадзянская сістэма радыяцыйнага маніторынгу навакольнага асяроддзя і прадуктаў харчавання. Аднак меры радыяцыйнай абароны насельніцтва недастатковыя, атрымана вялікая калектыўная доза апрамянення. У населеных пунктах, пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы, да 15—25 працэнтаў прадуктаў мясцовай вытворчасці, якія прыносяцца жыхарамі гэтых раёнаў на кантроль, маюць утрыманне цэзію-137 вышэй РДУ-92. І гэтыя прадукты распаўсюджваюцца ў іншыя раёны рэспублікі. Таму, што дзяржава з-за цяжкіх эканамічных умоў не ў стане забяспечыць насельніцтва чыстымі прадуктамі харчавання, няспынна расце калектыўная доза апрамянення і колькасць захворванняў жыхароў.

У 1986—1992 гадах у рэспубліцы ў гаспадарках пацярпелых раёнаў была ўнесена ў глебу павышаная колькасць (супраць аграхімічных норм) угнаенняў (К, Са, Р), што значна знізіла пераход цэзію-137 і стронцыю-90 з глебы ў расліны, у сельгаспрадукцыю. Недастатковая інфармаванасць сельскага насельніцтва аб мерах радыяцыйнай абароны, прыярытэтнасць ахоўных мер для грамадскай вытворчасці, унясенне недастатковай колькасці ўгнаенняў на прысядзібных участках прывялі да таго, што ў прыватным сектары ўсе гэтыя гады сельгаспрадукты былі забруджаны радыенуклідамі ў 10—20 разоў больш, чым у грамадскай вытворчасці.

Апошнія тры гады з-за эканамічнага крызісу ў калгасах і саўгасах зніжана ўнясенне ўгнаенняў, і ў 1994 годзе пачаўся рост долі прадуктаў, забруджаных радыенуклідамі вышэй РДУ-92.

У паўднёвых раёнах рэспублікі, якія прылягаюць да ЧАЭС, у апошнія два гады з-за змяншэння маштабаў вапнавання глеб і знаходжання стронцыю-90 у растваральным і хімічна актыўным выглядзе пачала ўзрастаць доля прадуктаў, забруджаных стронцыем-90 вышэй РДУ-92.

Па даных нацыянальнага даклада Беларусі пасля аварыі на ЧАЭС у пацярпелых раёнах рэспублікі павялічылася колькасць анемій, захворванняў горла і носа, лёгачных захворванняў, гіпертаніі, язвы страўніка і дванаццаціперснай кішкі, ішэмічнай хваробы сэрца, гіперплазіі (павелічэнне) шчытападобнай залозы, цэрэбраваскулярных паталогій, астэаартрозаў, хранічных і імунных захворванняў.

Радыяцыйная абарона насельніцтва ў пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы раёнах праводзіцца з мэтай змяншэння верагоднасці развіцця аддаленых стахастычных вынікаў для цяперашняга і наступных пакаленняў. Гэта дасягаецца мінімізацыяй і зніжэннем калектыўных доз апрамянення, а таксама абмежаваннем індывідуальных доз у катэгорый насельніцтва, якія найбольш апраменьваюцца,— крытычнай групы.

Зніжэнне калектыўнай дозы апрамянення насельніцтва ажыццяўляецца мерамі радыяцыйнай абароны:

— адсялення жыхароў з тэрыторый, дзе дозавая нагрузка ў 1991 годзе была вышэй 5 мЗв/год або шчыльнасць забруджання зямель перавышала 40 кюры на квадратны кіламетр (1480 кБк/кв. м) і ўсе меры радыяцыйнай абароны не забяспечвалі вытворчасці мясцовых прадуктаў харчавання з утрыманнем радыенуклідаў ніжэй РДУ па ўтрыманню цэзію-137 і стронцыю-90;

— адчужэння забруджанай тэрыторыі або абмежавання пражывання і вытворчай дзейнасці насельніцтва на гэтай тэрыторыі;

— мясцовай дэзактывацыі асобных тэрыторый, пабудоў, асабліва школ, дзіцячых устаноў;

— увядзення радыяцыйнага кантролю і бракеражу сельскагаспадарчых і харчовых прадуктаў з далейшай перапрацоўкай, а таксама забеспячэння насельніцтва харчовымі прадуктамі, што задавальняюць прынятыя нормы;

— правядзення спецыяльных мер у цыкле сельгасвытворчасці па зніжэнню ўтрымання радыенуклідаў у мясцовай раслінай і жывёльнай харчовай прадукцыі эфектыўнымі агратэхнічнымі мерапрыемствамі, увядзеннем сарбентаў жывёле, унясеннем угнаенняў, акультураннем паш, пераспецыялізацыяй гаспадарак і інш.;

— укаранення ў практыку сацыяльных правіл паводзін жыхароў і вядзення імі прысядзібных гаспадарак, збору дароў прыроды і інш.;

— рэгламентацыі вытворчай дзейнасці і забеспячэння радыяцыйна бяспечных умоў працы;

— зніжэння ўнутранага апрамянення насельніцтва шляхам перыядычнага перагляду і ўзмацнення жорсткасці дапушчальных узроўняў радыеактыўнага забруджання харчовых прадуктаў і харчовай сыравіны.

Медыцынская абарона насельніцтва ў пацярпелых раёнах забяспечвалася стварэннем у Міністэрстве аховы здароўя рэспублікі медыцынскага рэгістра насельніцтва гэтых раёнаў, у які ўвайшло звыш двух мільёнаў чалавек, у тым ліку больш як 500 тысяч дзяцей. Гэтая абарона насельніцтва дасягаецца выкананнем спецыяльных праграм дыспансерызацыі, лячэння, уключаючы санаторна-курортнае, штогадовага аздараўлення, забеспячэння лекавымі прэпаратамі, сродкамі для павышэння агульнай і антыканцэрагеннай рэзістэнтнасці (вітамінныя комплексы з мікраэлементамі, радыепратэктары, антыаксіданты і да т. п.).

У чалавека няма органаў пачуццяў для папярэджвання аб радыяцыйнай небяспецы. Псіхалагічная насцярожанасць і імкненне да ажыццяўлення мер радыяцыйнай абароны 1986—1989 гадоў цяпер замяніліся прывыканнем і пагарджаннем мерамі радыяцыйнай абароны.

Псіхалагічная абарона насельніцтва ажыццяўляецца шляхам увядзення ў навучальных установах па ўсёй рэспубліцы курса «Асновы радыяцыйнай бяспекі», псіхалагічнай падтрымкі, арыентаванай на розныя пласты насельніцтва; забеспячэння насельніцтва дакладнай, даходлівай інфармацыяй аб радыяцыйным становішчы, радыяцыйнай рызыцы захворванняў, мерах радыяцыйнай абароны, якія прымаюцца, і чакаемых выніках для здароўя ў месцах пражывання людзей.

Галоўныя намаганні павінны быць накіраваны на прыярытэтныя меры радыяцыйнай абароны насельніцтва пацярпелых раёнаў Беларусі і такую ж накіраванасць дзяржаўнай чарнобыльскай праграмы.

В. Несцярэнка

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Прайсці праз зону. Мн., 1996. С. 485 — 497.

ВЫНІКІ ДАЗІМЕТРЫЧНАГА АБСЛЕДАВАННЯ МЯСЦОВАСЦІ Ў БРАГІНСКІМ РАЁНЕ

Измерения выполнены бригадой специалистов ИЯЭ АН БССР в период с 13 по 14 июня 1986 года с помощью приборов РУП-1 и ДРГЗ-02.

№№ п/п	Наименование населенных пунктов	Мощность дозы на 1 м от поверхности мР/ч	Загрязнение β-част./см² · мин
1.	Чернев	3,2	$1,5 \cdot 10^4$
2.	Людвинов	1,5	$3,5 \cdot 10^3$
3.	Капоренка	0,8	$1,8 \cdot 10^3$
			$9,0 \cdot 10^3$
4.	Голубоака	1,8	$2,7 \cdot 10^3$
5.	Александровка	1,4	$2,5 \cdot 10^3$
6.	Катичев	0,7	$1,9 \cdot 10^3$
7.	Старые Ляды	—	$2,0 \cdot 10^4$
8.	Новые Ляды	—	$1,5 \cdot 10^4$
9.	Карловка	1,1	$4,3 \cdot 10^3$
10.	Пасека	0,9	$2,5 \cdot 10^3$
11.	Гдень	1,0	$9,3 \cdot 10^3$
12.	Чикаловичи	1,4	$9,7 \cdot 10^2$
13.	Колыбань	1,8	$8,2 \cdot 10^3$
14.	Пристанское,	5,7	$2,6 \cdot 10^4$
	посевы (200 м от дороги)	—	$7,0 \cdot 10^3$
15.	Пирки,	1,8	—
	дом № 19, стена дома,	—	$4,9 \cdot 10^3$
	огород	—	$9,5 \cdot 10^3$
16.	Сувиды,	2,2	$5,5 \cdot 10^3$
	личные вещи,	—	$(4,0 - 6,0) \cdot 10^2$
	одежда в доме	—	$1,6 \cdot 10^3$
17.	Савичи,	—	$5,6 \cdot 10^3$
	во дворе,	—	$1,9 \cdot 10^4$
	крыльцо дома,	—	$3,6 \cdot 10^3$
	в огороде	—	$8,2 \cdot 10^3$
18.	Слободка	2,16	$1,8 \cdot 10^3$
19.	Бабчин	0,8	$2,0 \cdot 10^3$
20.	Острогляды	1,4	$3,7 \cdot 10^4$
21.	Соболи	5,4	$5,2 \cdot 10^3$
22.	Сувиды в 500 м от деревни	1,2	$9,5 \cdot 10^3$
23.	г. Брагин:		
	центр	5,4	$8,5 \cdot 10^3$
	северная окраина	2,8	$4,1 \cdot 10^4$
	южная окраина	3,2	$3,8 \cdot 10^4$
	западная окраина	2,8	$1,8 \cdot 10^3$
	восточная окраина	3,2	$4,0 \cdot 10^4$
Допустимые нормы:			
Мощность экспозиционной дозы, установленная на аварийный период			0,7 мР/ч
Мощность дозы для ограниченной части населения (категория Б) по ОСП-72/80			0,03 мР/ч
Уровни β-загрязнений поверхности помещений, личной одежды и обуви для ограниченной части населения (категория Б) по ОСП-72/80			не допускается

М. Ф. Кохонов
Г. И. Стрелков
В. П. Слизов

Друкуецца па кн.: Прайсці праз зону. Мн., 1996. С. 515 — 516.

ЗВЕСТКІ АБ РАДЫЯЦЫЙНЫМ СТАНОВІШЧЫ Ў НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАХ БРАГІНСКАГА РАЁНА НА 10.10.1986 г.

Наименование населенных пунктов	P, мР/час	Цезий-137	Стронций-90	Плутоний	Загрязненность* β-част/см² · мин
		Ки/км²			
1. Гдень	0,13/0,21	5	1,9	По данным	9300
2. Карловка	0,18/0,25	8	1,3	Института	4300
3. Пасека	0,14/0,18	3	1,8	биофизики	2500
4. Скородное	0,14/0,2	3	1,1	МЗ СССР	—
5. Людвинов	0,23/0,26	15	1,9	в этих	3500
6. Новые Ляды	0,2/0,3	5	1,1	населенных пунктах	15 000
7. Катичев	0,29/0,45	5	2,3	концентрация	1900
8. Голубовка	0,2/0,3	5	1,0	плутония	2700
9. Александровка	0,3/0,27	4	1,1	больше	2500
10. Иванки	0,18/0,25	5	1,2	0.1 Ки/км²	—
11. Осинник	0,25/0,32	16	1,9		—

*Измерения выполнены бригадой специалистов ИЯЭ АН БССР 13 — 14 июня 1986 г. с помощью прибора РУП-1.

Норма бета-загрязненности рабочих помещений составляет 2000 част/см² · мин согласно НРБ-76.

Таблица подписана *В. П. Слизовым* и *П. И. Ананичем*.

Друкуецца па кн.: Прайсці праз зону. Мн., 1986. С. 536.

З ДАКЛАДА НАЧАЛЬНІКА РАЁННАГА ШТАБА ГРАМАДЗЯНСКАЙ АБАРОНЫ А. М. ПРАКОПАВА АБ ВЫНІКАХ РАБОТЫ ПА ЛІКВІДАЦЫІ НАСТУПСТВАЎ АВАРЫІ НА ЧАЭС

снежань 1986 г.

...Сігнал аб аварыі (на Чарнобыльскай АЭС) быў атрыманы 27 красавіка, у 7.00... Радыётрансляцыйная сетка для апавяшчэння насельніцтва не выкарыстоўвалася, і толькі 30.4.1986 г. па ўказанні абласнога штаба грамадзянскай абароны (ГА) была разгорнута работа ўсіх фарміраванняў па ліквідацыі наступстваў аварыі.

У выканкам райсавета былі запрошаны ўсе кіраўнікі і сакратары партаргапізацый калгасаў і саўгасаў, старшыні сельсаветаў, начальнікі службаў, якім былі пастаўлены задачы весці растлумачальную работу сярод насельніцтва...

...Трэба адзначыць, што нашы фарміраванні дрэнна былі падрыхтаваны да работы ва ўмовах аварыі на атамнай электрастанцыі... Слаба падрыхтавана і насельніцтва да абароны ад радыяцыі...

На падставе рашэння аблвыканкама 3 і 4 мая... з 30 населеных пунктаў 30-кіламетровай зоны... эвакуіравана 6336 чал. насельніцтва, 12 240 гал. буйной рагатай жывёлы, 3200 гал. свіней, 6600 гал. авечак і 247 коней... Для аказання практычнай дапамогі нам былі накіраваны 251 аўтобус і 660 грузавых аўтамабіляў з розных аўтагаспадарак вобласці...

Адсяляемае насельніцтва і жывёла былі размешчаны ў бяспечных месцах у калгасах імя Энгельса, «Парыжская камуна», «Чырвоны Кастрычнік», «Першамайск», «Рассвет», імя Чапаева, імя Чкалава, імя Тэльмана...

За межы раёна да 10 мая вывезена ў піянерскія лагеры, санаторыі і прафілакторыі краіны 10 200 дзяцей школьнага і дашкольнага ўзростаў, 760 жанчын з дзецьмі ва ўзросце да 3-х гадоў і 273 цяжарныя жанчыны...

У сувязі з ускладненнем радыяцыйнай абстаноўкі з 3 да 9 чэрвеня 1986 г. праведзены другі этап адсялення з 18 населеных пунктаў: в. Спярыжжа, Ясяні, Глухавічы, Багушы, Хатуча і інш. Вывезена больш за 5 тыс. чалавек, 13 500 галоў жывёлы. На трэцім этапе адсялення (в. Астрагляды, Сабалі, Савічы) — эвакуіравана больш за 3 тыс. чалавек...

Медабследаванне насельніцтва (34 497 чал.) праведзена ў першыя дні пасля аварыі. На базе Брагінскай СШ быў разгорнуты шпіталь на 300 ложкаў, які абслугоўвалі медработнікі раёна, вобласці і воінскіх часцей... Паўторнае абследаванне на апараце «СНЧ» прайшлі больш за 15 тысяч чалавек...

Сіламі работнікаў СЭС раёна, санэпідспецыялістаў рэспублікі вядзецца пастаянны кантроль за якасцю харчовых прадуктаў, у т. л. атрыманых у падсобных гаспадарках грамадзян, крыніцамі пітной вады (у калодзежах і водаправоднай сетцы)...

Службай быту арганізавана работа лазняў ва ўсіх калгасах і саўгасах..., дадаткова разгорнуты 32 перасоўныя памывачныя пункты, арганізаваны прыём бялізны і адзення ў пральні і хімчыстку...

Службы гандлю і грамадскага харчавання забяспечваюць насельніцтва раёна і прыкамандзіраваных работнікаў прывазнымі (з іншых месцаў рэспублікі) прадуктамі... У месцах размяшчэння эвакуіраванага насельніцтва (в. Дублін, Рудня Жураўлёва, Хракавічы, Чамярысы і інш.) дадаткова адкрыты сталовыя...

Выкананы вялікі аб'ём работ па будаўніцтве жылля, дэзактывацыі мясцовасці і добраўпарадкаванні населеных пунктаў. У прыватнасці, у калгасах і саўгасах пабудавана 87 кватэр. У раёне пракладзена 103,5 км знадворных водаправодных сетак, устаноўлена 500 водазаборных калонак, прабураны 33 артэзіянскія свідравіны. Пабудавана 135 км дарог і 35 тыс. кв. м тратуараў з цвёрдым пакрыццём, заасфальтавана 150 тыс. кв. м дваровых тэрыторый... Прадэзактывавана 9 тыс. дамоў...

У выніку наступстваў чарнобыльскай аварыі з сельскагаспадарчай вытворчасці выбыла 57 355 гектараў зямель, 63,5 млн. рублёў асноўных фондаў, з лесагаспадарчага карыстання выведзена 13 тыс. гектараў лесу...

Зменшылася колькасць насельніцтва на 13,5 тыс. чалавек...

Пасля ажыццяўлення воінскімі часцямі, фарміраваннямі ГА і гаспадарчымі органамі мерапрыемстваў па ліквідацыі наступстваў аварыі на ЧАЭС узроўні радыяцыі ў населеных пунктах значна знізіліся. У населеных пунктах, дзе цяпер пражывае насельніцтва, максімальныя іх паказчыкі складаюць 0,5 мілірэнтгена ў гадзіну (в. Вязок) і мінімальныя — 0,05 мілірэнтгена ў гадзіну (в. Петрыцкае, Малажын, Чамярысы).

Друкуецца па газ.: Маяк Палесся, 1986. 12 снеж.

З ДАКЛАДА СТАРШЫНІ РАЙВЫКАНКАМА І. М. СМЫКОЎСКАГА НА СЕСІІ БРАГІНСКАГА РАЙСАВЕТА

1 жніўня 1990 г.

...На тэрыторыі раёна па стане на 1 студзеня 1990 г. у 93 населеных пунктах пражывалі 26,1 тыс. чалавек, сярод якіх 20,5 працэнта дзяцей. 7,5 тыс. чалавек, у тым ліку 1067 дзяцей, пражываюць у 6 населеных пунктах са шчыльнасцю забруджвання звыш 15 кюры на квадратны кіламетр. А Брагін знаходзіцца на тэрыторыі са шчыльнасцю забруджвання цэзіем звыш 22,2 кюры. Горш таго, ёсць кропкі забруджвання 67 кюры. Высокая шчыльнасць забруджвання Брагіна стронцыем-90. На тэрыторыі са шчыльнасцю забруджвання цэзіем-134 і цэзіем-137 ад 10 да 15 кюры на квадратны кіламетр пражывае 1542 чалавекі (11 населеных пунктаў), а са шчыльнасцю — 5—10 кюры — 2443 чалавекі (14 вёсак).

На 1 чэрвеня г. г. у раёне налічваецца 51,6 тыс. гектараў сельгасугоддзяў са шчыльнасцю забруджвання цэзіем звыш 15 кюры на квадратны кіламетр. Пры гэтым 45 працэнтаў сельгасугоддзяў маюць шчыльнасць забруджвання звыш 5 кюры.

Горш з забруджваннем сельгасугоддзяў стронцыем-90. У раёне налічваецца 3,8 тыс. гектараў сельгасугоддзяў, або 7,4 працэнта, са шчыльнасцю забруджвання гэтым радыенуклідам у 3 — 7 кюры, у тым ліку 1370 гектараў ворыва. У цэлым па шчыльнасці забруджвання стронцыем звыш 1 кюры на квадратны кіламетр налічваецца 29 тыс. гектараў сельгасугоддзяў, што складае 56,3 працэнта, у тым ліку ворыва — 17 тыс. гектараў. У некаторых гаспадарках раёна забруджанасць сельгасугоддзяў радыенуклідамі з'яўляецца вельмі значнай.

За перыяд пасля красавіка 1986 г. савецкімі і гаспадарчымі органамі праведзена адпаведная работа па ліквідацыі наступстваў аварыі. На гэтыя мэты выдаткавана 200 млн. рублёў.

Друкуецца па газ.: Маяк Палесся, 1990. 4 жн.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

ЫЗНАЧЫЛІСЯ ПРЫ ЛІКВІДАЦЫІ ЫНІКАЎ АВАРЫІ НА ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ЭС

ерой Чарнобыля

Ігнаценка Васіль Іванавіч нарадзіў- я 13.3.1961 г. у в. Спярыжжа. Скончыў омельскае СПТВ-81 (1978). Працаваў лектраманцёрам. У 1982 – 1986 гг. ка- андзір аддзялення пажарнай часці № 6 Прыпяць. Уначы 26 красавіка 1986 г. дзін з першых прыняў удзел у тушэнні -га рэактара Чарнобыльскай АЭС. амёр ад апраменьвання 13.5.1986 г. асмяротна ўзнагароджаны ордэнам ырвонага Сцяга, адзнакай прэзідэнта краіны «За мужнасць». Яго імем азваны вуліцы ў г. Мінск, г. Беразіно, п. Брагін. У г. п. Брагін установлены юст героя.

раз полымя — у неўміручасць

Дазвол на два выхадныя старшы сяржант наценка атрымаў за паўгадзіны да пранізлівага гнала трывогі, за тры гадзіны да канца дзя- урства. Асабовы састаў СВПЧ-6 заняў штатныя есцы на баявых пажарных машынах.

...Полымя — куродымнае ў вышыні і жоўтае ізу — асвятляла ўсю станцыю і недалёкую паў-

В. І. Ігнаценка

наводную Прыпяць. Баявы разлік — іх спачатку было 28 чалавек — кінуўся ў самае пекла. Першым на 70-метровую вышыню са ствалом пажарнага рукава ўзняўся камандзір аддзялення Ігнаценка, за ім — яго падначаленыя і таварышы па службе.

Іх было вельмі мала, у іх не было дарогі назад, не было іншага выйсця, як толькі перамагчы. Васіль паспяваў на самыя небяспечныя месцы, на дапамогу таварышам. Пасля жорсткай і смяротнай сутычкі з агнём яны раскажуць, як Ігнаценка прабіў шлях сяржанту Уладзіміру Цішуры, які задыхаўся ад з'едлівага дыму, як вынес да лесвіцы непрытомных старшага сяржанта Мікалая Ціцянка і сяржанта Мікалая Вашчука.

Ужо ў маскоўскай лякарні 28 красавіка Іван Тарасавіч спытаў у сына:

рупа курсантаў Растоў- ай спецыяльнай сярэд- ай школы падрыхтоўкі ічаставу Міністэрства утраных спраў СССР, ая нясла службу па за- снячэнні грамадскага радку ў зоне адсялення рагінскага раёна пасля тастрофы на ЧАЭС. адчас сустрэчы з баць- мі В. І. Ігнаценкі

— Хіба нельга было паасцерагчыся?

— Нельга, тата, інакш не перамаглі б, — адказаў Васіль і перавёў размову на хатнія справы...

У СВПЧ-6 Васіля Ігнаценку паважалі ўсе — камандзіры і падначаленыя. Ён быў першым ва ўсім. У баявой абстаноўцы не толькі майстар, але і выключна смелы, хуткі і ў прыняцці рашэнняў і іх рэалізацыі. У спорце — лідэр, першаразраднік па лёгкай атлетыцы і лыжах, добры футбаліст і валейбаліст. Васіль умеў усё ў пажарнай справе — універсальны баец, майстар спорту. Каманда ягонай часці, дзе ён быў капітанам, стала чэмпіёнам Кіеўскай вобласці па пажарна-прыкладным відзе, а Васіль уваходзіў у зборную каманду Украіны.

У Маскве Васіль ляжаў у асобнай палаце. Яго цікавілі справы сяброў-пажарных.

— Як там пачувае сябе Віктар? — пытаў ён медсястру пра лейтэнанта Кібянка, з якім яны апошнімі спусціліся з даху рэактара ў тую трагічную ноч.

— Нармальна, — казала медсястра. Хворы не павінен быў ведаць, каб не хвалявацца, што лейтэнанта Віктара Мікалаевіча Кібянка ўжо не было ў жывых.

Не стала Васіля Ігнаценкі трынаццатага мая 1986 года.

М. З. Дубавец

Друкуецца са скарачэннямі па газ.: Маяк Палесся, 1986. 13 чэрв.

Узнагароджаны ордэнам Леніна

Лазовік Міхаіл Лаўрэнцьевіч — трактарыст калгаса «Чырвоны Кастручнік».

Шкурко Міхаіл Васільевіч — трактарыст калгаса «Чырвоная ніва».

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

Ветчанка Пётр Цярэнцьевіч — брыгадзір саўгаса «Савічы».

Касцючэнка Раіса Восіпаўна — загадчыца магазіна Брагінскага спажывецкага таварыства (1986).

Маеўскі Васіль Васільевіч — загадчык брагінскай аптэкі № 72.

Назаранка Зінаіда Рыгораўна — дыспетчар Брагінскага раённага камбіната бытавога абслугоўвання насельніцтва.

Панькоў Георгій Мікалаевіч — першы сакратар Брагінскага райкама партыі.

Свірыдзенка Васіль Кузьміч — трактарыст калгаса імя Чкалава.

Шчука Ганна Сямёнаўна — даярка саўгаса «Савічы».

Шылец Рыгор Адамавіч — жывёлавод калгаса «Шлях да камунізму».

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў

Ганжураў Іван Феакцістаўіч — рэдактар брагінскай райгазеты «Маяк Палесся».

Новік Аляксандр Андрэевіч — рабочы саўгаса «Астрагляды».

Снежка Васіль Міхайлавіч — майстар участка водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі Брагінскага РВА ЖКГ.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны»

Асмалоўскі Мікалай Іванавіч — шафёр аўтабазы № 19.

Бельчанка Міхаіл Іларыёнавіч — загадчык майстэрні калгаса «Ніжні дняпровец».

Гуляй Мікалай Раманавіч — старшыня калгаса імя Леніна.

Давыдоўскі Міхаіл Сямёнавіч — шафёр аўтабазы № 19.

Дзівовіч Эмілія Ізраілеўна — урач Брагінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Ільін Васіль Васільевіч — старшыня праўлення Брагінскага спажывецкага таварыства.

Казлоў Іван Сцяпанавіч — жывёлавод саўгаса «Савічы».

Каляда Марыя Андрэеўна — даярка саўгаса «Камарынскі».

Каляда Міхаіл Андрэевіч — шафёр саўгаса «Камарынскі».

Калясан Рыгор Піменавіч — начальнік Брагінскага цэха Рэчыцкага ЭТУС.

Кузьмянок Пётр Пятровіч — дырэктар саўгаса «Брагінскі».

Падчапка Рыгор Рыгоравіч — старшыня выканкама Савіцкага сельсавета.

Сідарок Валянцін Паўлавіч — трактарыст саўгаса «Астрагляды».

Троцкі Рыгор Майсеевіч — начальнік Брагінскага гаспадарча-разліковага будаўнічага ўчастка.

Чарняк Рыгор Аляксеевіч — загадчык фермы калгаса «Запаветы Леніна».

Чарэднік Кацярына Мікалаеўна — сакратар парткама саўгаса «Пасудава».

Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы II ступені

Мялешка Уладзімір Уладзіміравіч — трактарыст калгаса імя Тэльмана.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы III ступені

Бараноўскі Сяргей Мікалаевіч — жывёлавод калгаса «Шлях да камунізму».

Гардзеенка Іван Дзмітрыевіч — электраманцёр міжгаспадарчага аб'яднання «Райсельэнерга».

Давыдзенка Аляксандр Аляксандравіч — загадчык фермы калгаса імя Калініна.

Коўзік Сяргей Іванавіч — трактарыст калгаса імя Энгельса.

Мардвінаў Уладзімір Пятровіч — газаэлектразваршчык райаграпрамтэхнікі.

Мацапура Віктар Міхайлавіч — трактарыст калгаса «Чырвоная Украіна».

Паўлючэнка Іван Пятровіч — аператар саўгаса «Астрагляды».

Пугач Аляксей Іванавіч — трактарыст саўгаса «Савічы».

Рудзянок Марыя Дзмітрыеўна — даярка калгаса імя Леніна.

Шкеда Васіль Фёдаравіч — сігналіст станцыі Ёлча.

Ярмоленка Міхаіл Іванавіч — шафёр саўгаса «Пасудава».

Узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць»

Беразняцкая Кацярына Іларыёнаўна — рабочая саўгаса «Савічы».

Блатун Ніна Андрэеўна — фармацэўт брагінскай аптэкі № 72.

Булгакаў Аляксандр Іванавіч — шафёр ДРБУ № 148.

Вароненка Павел Пятровіч — камбайнер калгаса імя Гагарына.

Волкаў Пётр Андрэевіч — старшыня калгаса імя Чкалава.

Даўжанок Мікалай Аляксандравіч — сігналіст станцыі Ёлча.

Ермалінская Вера Васільеўна — урач Брагінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Ігнаценка Ніна Іванаўна — памочнік санітарнага ўрача Брагінскай санэпідстанцыі.

Казлова Ганна Васільеўна — арганізатар пазакласнай і пазашкольнай работы Мікуліцкай сярэдняй школы.

Кактомава Еўдакія Ільінічна — галоўны заатэхнік калгаса «Шлях да камунізму».

Кудан Пётр Міхайлавіч — старшыня калгаса «Парыжская камуна».

Кузьмянок Мікалай Адамавіч — шафёр Брагінскага міжраённага ўпраўлення асушальна-аранальных сістэм.

Лях Галіна Міхайлаўна — загадчыца лабараторыі Брагінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Міхалёў Мікалай Цімафеевіч — начальнік Брагінскага міжраённага ўпраўлення асушальна-аранальных сістэм.

Нячоса Рыгор Іванавіч — ветэрынарны фельчар саўгаса «Камарынскі».

Пракопаў Аляксандр Міхайлавіч — старшыня выканкама Брагінскага Савета народных дэпутатаў.

Узнагароджаны медалём «За працоўную адзнаку»

Ефіменка Таццяна Іванаўна — аграном саўгаса «Брагінскі».

Ігнаценка Марыя Ульянаўна — аператар машыннага даення калгаса імя Гагарына.

Краўчанка Васіль Міхайлавіч — шафёр саўгаса «Слабадскі».

Кузняцова Святлана Мікалаеўна — галоўная медсястра Брагінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Мацапура Сцяпан Сцяпанавіч — шафёр калгаса «Чырвоная Украіна».

Мішчанка Мікалай Паўлавіч — начальнік станцыі Ёлча.

Рудзянок Людміла Анатольеўна — медсястра Брагінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Стрыбук Міхаіл Пятровіч — старшыня калгаса «Чырвоны Кастрычнік».

Стрыбук Раіса Фёдараўна — медстатыстык Брагінскай санэпідстанцыі.

Трацціякоў Уладзімір Сяргеевіч — галоўны ўрач Брагінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Фядосенка Анастасія Пятроўна — галоўны заатэхнік саўгаса «Краснае».

Шапецька Мікалай Сяргеевіч — старшыня калгаса імя Энгельса.

ПАМЯЦІ ВАСІЛЯ ІГНАЦЕНКІ

Рэчка Брагінка. Рэчка Брагінка.
Ты, вядома, не Днепр-рака,
Ды напоўніла ты адвагаю
Сэрца слаўнага юнака.
Рэчка Брагінка, бераг росны.
І салоўка пяе ў кустах.
Водар лекавы, меданосны —
Піць і жыць бы гадоў да ста.
Рэчка Брагінка. Хваля лашчыцца.
Б'ецца ў бераг снапком іскрыстым.
Не збаяўся ён вогненнай пашчы.
Каб была ты, Брагінка, чыстай.

С. Бестава

З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны

З глыбіні стагоддзяў

Вусная народная творчасць — важная і неад'емная частка нашай духоўнай культуры. Цесна звязаная з паўсядзённым жыццём чалавека, яна адлюстроўвае ўмовы яго побыту і працы, эстэтычныя погляды, мары і спадзяванні. Пры гэтым фальклорныя творы вызначаюцца жанравай разнастайнасцю. У іх шырока прадстаўлены каляндарная і сямейная абрадавая паэзія, песні, казкі, паданні і легенды, балады, прыказкі і прымаўкі, загадкі, замовы і інш.

Бадай ці не самым старажытным і масавым відам беларускага фальклору з'яўляецца каляндарна-абрадавая паэзія з яе зімовым (калядкі, шчадроўкі, пілі-паўскія і масленічныя песні), веснавым (гуканне вясны, валачобныя песні і інш.), летнім (купальскія, жніўныя песні) і асеннім цыкламі. З даўніх часоў на Брагіншчыне бытуюць творы вуснай народнай творчасці каляндарнай паэзіі — песні веснавога цыкла.

СЯДЗЕЛА РУСАЛКА НА БЕЛАЙ БЯРОЗЕ

Сядзела русалка на белай бярозе,
Ой, рана-рана, на белай бярозе,
Сядзела русалка, да й песні спявала,
Ой, рана-рана, да й песні спявала.
А я, маладая, да й лета не ўгадала,
Ой, рана-рана, да й лета не ўгадала.

(Вёска Прудавіца)

Фальклорны ансамбль Тэльманаўскага сельскага Дома культуры. 1989 г.

Асарэвіцкія вячоркі. 1980-я гг.

ОЙ, Я ЖАЛА ДЫ НЕ ЛЯЖАЛА

Ой, я жала ды не ляжала,
Ды капы жыта не нажала.
Ой, мой мілы Пракопеньку,
Ды прыедзь ка мне на копеньку,
Ды не бяры рубля з гумна,
Ды вырубай бярэзінку,
Ды на маю сярэдзінку,
Каб сярэдзінка мая ды не балела,
Каб міленькая твая дадому не хацела.

(Вёска Піркі)

З ліку сямейна-абрадавай паэзіі можна назваць вясельныя песні, адна з якіх — «Стукнула-грукнула на дварэ».

Стукнула-грукнула на дварэ.
— Паглядзі, мамачка, ці не па мяне?
— Па цябе, дачушка, па цябе.
— Гатуй, мамачка, вячэрку мне,
Стань, мая мамачка, у парозе.
Ужо тваё дзіцятка ў дарозе.
Стань, мая мамачка, блізенька,
Пакланюся табе нізенька.

Усе асноўныя этапы вясельнага абраду — сватанне, агледзіны, заручыны, зазыванне на раздачу вясельнага каравая і інш. звычайна суправаджаюцца тэатральна-гульневымі элементамі. Ад старажытных рытуалаў пайшлі так званыя вясельныя народныя гульні: патрабаванне з маладога выкупу за нявесту, маляўнічае пераапрананне ў галоўных герояў тэатралізаванага дзейства — «маладых», пры якім мужчынскую ролю выконвае жанчына, а жаночую — мужчына. Дзея адбываецца ў стылі экспромту, пры вольнай яе інтэрпрэтацыі і часам з не вельмі дасціпным гумарам.

Цікавыя па змесце, часам з непрытоеным гумарам сацыяльна-бытавыя песні.

ОЙ, САЛДАТ БРАВЫ, КУЧАРАВЫ

Ой, салдат бравы, кучаравы,
Яго кудры ў тры рады.
Ой, рашчашу я свае кудры,
Сам да дзевачкі пайду.
Ой, пайшоў бы я да дзевачкі,
Сам не знаю, дзе жыве.
Ой, папрашу я таварыша —
Няхай мяне завядзе.
Ой, а таварыш крашэ мяне,
Ён дзевачку адаб'е.
Ой, не бойсь, не бойсь, таварышу,
У мяне крашэ тваёй е.
Ой, масты мосцяць маставую
Аж да мілае двара.
Ой, той масточак праваліўся,
А мой мілы ў рэчку ўпаў.
Ой, бадай жа ты, быстра рэчка,
Куп'ем, граззю зарасла,
Ой, што ты майго міленькага
Так далёка занясла.

(Вёска Міхалёўка)

ОЙ, З-ПАД ГАРЫ, ІЗ-ПАД КРУЧЫ

Ой, з-пад гары, із-пад кручы
Да равуць валы, йдучы.
Вазы рыпяць, а юрма трашчаць,
А валы томна йдучы.
А мой мілы, мілы чарнабрывы,
Валоў падганяе, дый у дудачку грае.
— Годзя, мілы дружок, чарнабрывы, валоў паганяці,

Да бяры косы, ідзі ў росу траву касіці.
— Я ў бацюшкі век не касіў — за табой не буду.
— Годзі, міла, жынка чарнабрыва, у
палажочку ляжаці.
Бяры сярпа, ідзі ў сцяпок пшанічку жаці.
— Я ў бацюшкі век не жала, ляжала,
За табою — у пяць раз не буду.

(Вёска Залессе)

На пачатку 1980-х гадоў запісана ад 80-гадовай жыхаркі в. Крукі Наталлі Іпалітаўны Кілачыцкай народная песня «Пайду я ў садок».

Пайду я ў садок ды сарву цвяток,
Сарву я цвяток ды саўю вянок,
Ды пушчу вянок на Дунай глыбок,
Каб даплыў вянок у той край далёк,
Дзе ў чужых людзёх мілы мой дружок.
Пайду я, пайду раненька ў садок,
Там сарву цвяток ды саўю вянок...

Ведалі старажытныя народныя песні і хораша іх выконвалі жыхаркі Крукоў Параска Шубянок, Настасся Самойленка, Кацярына Навуменка, Якаў Скачок і іншыя. Асабліва прыгожа гучала ў іх выкананні песня аб душэўных пачуццях хлопца да маладой удавы і аб удовінай самоце.

КІНУЎ КАСУ НА НІВАНЬКУ

Кінуў касу на ніваньку,
А сам пайшоў да хатачкі.
Над дубовым сталом схіліўся,
Цяжка-важка зажурыўся.

— Дазволь, маці, удаву браці.
Тады буду піць-гуляці.
— Не дазволю ўдаву ўзяці,
Яна ўмее чараваці.

ПЕСНЯ ЎДАВЫ

Ой, сяду я край стала.
Павячэраю сама,
Павячэраю сама,
Бо ўжо мілага няма.

У пэўнай сувязі з каляндарнай абрадавай паэзіяй знаходзіцца сюжэтна больш змястоўная, адметная сваім ліраэпічным станам, складам і драматычнай напружанасцю мясцовая песенная балада. Скажам, такая, як «А ў нядзелю рана».

А ў нядзелю рана,
Шчэ й сонца не ўсходзіць,
Свёкарка нявестку
На работу гоніць.
— Уставай жа, Галю,
Годзе табе спаці.
Пара табе, Галю,
Пшанічаньку жаці.
Жні, Галю, пшанічку,
Жні, не разгібайся,
Як плача дзяціна,
Ты не прыслухайся.
Жне Галя пшанічку,
Жне, не разагнецца,
А Галіна сэрца,
Як гадзіна, б'ецца.
Жала яна, жала
Дый прыйшла дадому,
Пара ўжо даіці
Рабую карову.
Свякруха лютая
Ў Галі пытае:
— А дзе ж твая, Галю,
Дзяціна малая?
— Ой, божа мой мілы,
Што я нарабіла.
Я ў той даліне
Дзяціну забыла.
Да й пабегла Галя
У тую даліну,
А ўжо шэры воўкі
Шматуюць дзяціну.
Паперад у Галі
Арол вылятае,
Арол вылятае
Да й Галі пытае:
— Было табе, Галю,
Постаць не зжынаці.
Было ж табе, Галю,
Дзяціну забраці.

(Вёска Міхалёўка)

У мностве відаў апавядальных фальклорных жанраў выдзяляюцца тапанімічныя і гістарычныя паданні і легенды, якія тлумачаць паходжанне назваў населеных пунктаў, урочышчаў і інш. Вось, напрыклад, паданне аб паходжанні назвы Брагіна:

Два разбойнікі, хаваючыся ў балоце ад праследавання княскіх служак, зайшлі ў такое гіблае месца, адкуль цяжка было выбрацца. Адзін з іх трапіў у багну, і дрыгва пачала засмоктваць яго. Крычыць ён, просіць паратунку. А другі, разумеючы, што нічым не можа дапамагчы, махнуў рукой у бязвыхаднай роспачы:

— Эх, бря (брат), гіць...

Ад гэтага быццам і пайшла назва дрыгвяністага балота і прылягаўшага да яго месца — «Брягинь».

Іншы раз даўнія паданні ў пэўных сітуацыях атрымліваюць рэчавае пацвярджэнне сваёй існасці як гістарычнага факта. Напрыклад, у вёсцы Крукі і яе населеных ваколіцах ад дзядоў-прадзедаў перадавалася паданне аб нібыта меўшай месца тут калісьці бітве рускіх воінаў з крымскімі татарамі. Нават урочышча называлася Татарскі брод. Многія сумняваліся ў гістарычнай праўдзівасці гэтага наймення, пакуль у 1935 годзе ў тым урочышчы не была знойдзена крывая турэцкая шабля — ятаган. Находка перададзена ў Гомельскі абласны краязнаўчы музей.

На Брагіншчыне бытуюць прымаўкі — кароткія трапныя выразы з паўсядзённага жыцця. Напрыклад: «У зімы жывот вялікі», «Золата і ў сметніку блішчыць», «Купляй хату крытую, а адзенне — шытае», «Відаць пана па халяве», «Вышэй пупа не падскочыш» і інш.

Паводле кн.: Беларускі фальклор у сучасных запісах (Гомельская вобл.). Мн., 1989.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

З фальклорных крыніц

Так ужо атрымлівалася, што ўсё жыццё брагінскага селяніна было цесна і арганічна знітавана са шматлікімі народнымі абрадамі, звычаямі, павер'ямі.

Самае першае знаёмства чалавека з белым светам — гэта яго нараджэнне. Пасля хрышчэння ў царкве дзіця прыносілі дамоў, склікалі гасцей. Першай запрашалі бабку-павітуху. Тая прыходзіла з падарункамі, купала дзіця, спавівала яго.

За стол садзілі спачатку кума і куму, павітуху, жонку кума, а потым — астатніх гасцей. Пасля першай чаркі бабка-павітуха падавала на стол так званыя буракі — ежу, прыгатаваную з мяса, каўбас, буракоў, вострых прыпраў. Пасля буракоў на стол падаваўся гаршчок кашы. Госці вымушаны былі купляць порцыю кашы за грошы. Больш за іншых павінен быў даць кум. Заплаціўшы, той разбіваў гаршчок на стале. Госці навыперадкі хапалі кашу і крычалі: адны «горка!», другія «салодка!».

На другі дзень застолле павінна была ладзіць павітуха. Калі яна адмаўлялася весці гасцей у сваю хату, яе садзілі ў ночвы або на барану і вазілі са смехам па двары. За бабку часцей за ўсё бралі каго-небудзь з родных (цётку, сястру, маці). Яна сама выбірала куму і кума. На хрэсьбіны госці ішлі з падарункамі, каб малому заўжды добра і багата жылося.

Самыя цёплыя словы песень, якія выконваліся на такім застоллі, адрасаваліся парадзісе: «А хто к ёй прыхінецца, той розуму набярэцца, піва і віна нап'ецца». У адказ — поўныя падзякі за такія адносіны да сябе словы маладой маці: «Самыя дарагія першыя госцікі — бацька з маці, другія госцікі — братка з сястрой, а трэція госцікі — кум з кумой. Дзед і баба — уся парада». У песенных сюжэтах пра бацькоў захаваны вобраз брагінчаніна: працавітага, нешматслоўнага, скупога на ласку. У песенных куплетах, прысвечаных хрэсьбінам, гаспадар звычайна параўноўваецца з кавалём, які «малаточкам не стукаў, у ручкі не хукаў, лучынкі не паліў, сямейкі не будзіў і сыночка сабе нажыў».

Нараджэнне дачушкі ў хрэсьбінных песнях апісвалася не надта радасна, бо дзяўчына як падрасце, то пойдзе да чужых людзей «ва ўслужэнне», пакінуўшы родных, і не будзе ім ад яе ніякай дапамогі. Гаспадар, звяртаючыся да бабкі-павітухі, казаў: «Калі сына жонка нарадзіла, то я мёду здабуду, а калі дачку, то і так перабуду».

Значнае месца ў радзіннай паэзіі адводзіцца куму і куме. Роля іх вядомая — яны прысутнічалі пры хрышчэнні малога, былі яго хроснымі бацькамі. Таму і садзілі іх на самым ганаровым месцы — побач з бабуляй і гаспадарамі на покуці. І велічальныя песні ім спявалі, як і бабулі. Праўда, адрасаваліся кумам не цэлыя песні, а толькі асобныя звароты.

Хрэсьбінныя песні, як і сама радзінная ды хрэсьбінная ўрачыстасць, закліканы былі хоць на кароткі тэрмін адарваць вяскоўца ад будзённых клопатаў, забыць пра цяжкасці лёсу, з пяшчотай і ласкай паглядзець на ўласных дзяцей, пагаманіць з роднымі і блізкімі, абмеркаваць навіны, выпіць чарку-другую «віна зелянога», зацягнуць старадаўнюю песню, якую спявалі яшчэ дзяды-прадзеды.

Другім надзвычай багатым абрадам брагінскіх вяскоўцаў быў вясельны: відаць, самы непаўторны, своеасаблівы і арыгінальны. Размова пра вяселле пачыналася са сватання. У гэты час вырашалася, быць вяселлю ці не. Справа адбывалася пераважна позняй восенню, калі галоўныя гаспадарчыя работы ўжо скончаны. Ішлі ў сваты часцей за ўсё ўвечары. Ад галоўнага свата, ад ягонага ўмення «трымаць язык па ветры», залежала вельмі многае. Ён адзін мог «абкруціць» усё так, што ні жаніху, ні тым болей бацькам такое нават і не снілася. Быў тады і добры пасаг, і прыгажуня дзяўчына, і слава-пагудка пра тое, як добра ды ўмела ўсё атрымлівалася. Таму ў сваты выбіралі людзей паважаных, спрактыкаваных, такіх, каб іх не трэба было «цягнуць за язык».

У доме дзяўчыны звычайна ўжо чакалі прыезду сватоў і, канешне ж, старанна рыхтаваліся да такой адказнай падзеі. І гаспадары, і іхняя дачка апраналіся па-святочнаму і стараліся незаўважна сачыць за вуліцай, ці не едуць, ці не ідуць сваты. Пры размове сватоў дзяўчына не прысутнічала. Калі ж прасілі паказаць ім нявесту, то бацькі спачатку паказвалі не яе, а сяброўак ці малодшых дачок, але сваты дабіваліся свайго. У знак згоды на шлюб дзяўчына дарыла бацькам жаніха ручнік (для бацькі) і хустку (для маці). Бацькі і сваты ўдакладнялі час вяселля. Калі ж дзяўчына не хацела ісці замуж або жаніх не падаваўся бацькам прывабным, то яны знаходзілі варыянт ветлівай адмовы, каб не пакрыўдзіць дарма людзей.

Праз нейкі час пасля сватання ў доме нявесты гулялі запоіны. Тут дзяўчыну як бы «запівалі» да роду жаніха, і пасля гэтага яна ўжо не мела права адмовіцца ад замужжа. Звычайна запоіны прызначалі на вечар (у суботу ці нядзелю). Жаніх з бацькамі і бліжэйшымі сваякамі (чалавек да 20) ішлі да нявесты. Калі яны заходзілі ў хату, нявеста хавалася, каб яе не ўбачылі. Затое сама хацела ўбачыць жаніха першай, каб у будучым сямейным жыцці верхаводзіць мужам. Потым яна выходзіла да гасцей, віталася, але прывітанне яе было незвычайнае. Кожнаму з гасцеі падавала руку — гэтым падкрэслівала сваю згоду належаць да іх роду. Перад тым як разысціся, бацькі маладых абменьваліся хлебам. Нявеста давала бацькам жаніха бутэльку з зернем жыта: знак, што яна ўручае ім сваё жыццё, сваю долю. Маці жаніха рассыпала гэтае зерне на сваім падвор'і, каб разам з новым чалавекам у яе хату прыйшлі дабрабыт і шчасце. Ад запоін да вяселля нявеста павінна была насіць толькі заплеценую касу. Тым самым падкрэслівалася, што нявеста развітвалася з дзявочым жыццём. А вось пасля вяселля хадзіць з касой яна не мела права.

Вяселле прызначалі праз тыдзень-два пасля запоін. Залежала гэта ад таго, ці паспеюць бацькі падрыхтавацца. І пачыналася яно з заручын (яшчэ іх называлі змовінамі). Далей ішоў каравай, зборная субота, вяселле ў маладой, маладога, пярэзвы.

Сустрэча маладога ў хаце нявесты нагадвала сабою своеасаблівы торг, спрэчку. Усё з-за таго, што сяброўкі патрабавалі за нявесту выкуп у сватоў. Падчас вяселля нявесту саджалі на накрытую кажухом дзяжу: тут яна павінна была расказваць толькі праўду. Шафер расплятаў ёй касу. Потым хрышчоная маці пакрывала дзяўчыну якой-небудзь матэрыяй, працягвала праз пярсцёнак пасмачку валасоў, застрыгала іх і падсмальвала свечкай. Затым выпівала з маладой трошкі віна і садзілася побач з ёй. Тут да нявесты падыходзіла яе маці

з іконай у руках і бласлаўляла дачку на шлюб. Паступова вяселле набліжалася да кульмінацыі — развітанне маладой з роднымі, з бацькоўскім домам, з дзявоцтвам. Ад'езд да маладога — адзін з самых драматычных момантаў вяселля і, мабыць, самы старажытны. Ніхто ў гэты момант не можа стрымацца, усе плачуць і спяваюць развітальныя песні.

Каля хаты маладога насустрач жаніху і нявесце выходзяць свёкар і свякроў. Свёкар ссаджвае маладую з воза на кажух. Свякроў ставіць хлебную дзежку: калі маладая «чэсная», яна без лішняга роздуму садзілася ці станавілася на дзяжу. А не дай Бог, калі нявеста падманвала і падман яе выкрываўся, то яе чакалі вялікія непрыемнасці. Свёкар браў нявестку за руку і падводзіў да хатняга парога. Тут маладая звычайна аддавала падарункі радні маладога: свёкру дарыла пояс, свекрыві — фартух, а залоўкам — грабяні.

Раней маладая, «як замужам пабудзе», мусіла аддаваць свекрыві сваю начную кашулю. Свякроў, калі нявестка на самой справе аказалася «чэсная», выносіла тую кашулю ў двор, паказвала ўсім, загортвала ў яе бутэльку гарэлкі і аддавала прыданым, каб тыя потым перадалі гэта маці маладой. Усе, задаволеныя тым, што «маладая няславы не нарабіла», ішлі ў хату, да гасцей падыходзіла сама нявеста разам з жаніхом, і пачыналася частаванне.

Увечары прыданыя ад'язджалі дадому. Гэта заўсёды цяжкая хвіліна для маладой, бо родныя ўжо будуць ад яе далёка і не падтрымаюць. Прыданыя ад'язджалі заўсёды шумна і весела.

Пасля вяселля праз тыдзень або праз некалькі дзён (у залежнасці ад таго, як дамаўляліся бакі) адбываліся пярэзвы. Бацькі маладога запрашалі да сябе бацькоў маладой і некаторых іншых гасцей. Цесць з цешчай ехалі да зяця, каб даведацца, як жывецца «іхняй дачцэ ў чужой старане».

Пярэзвы — апошняя ступень вяселля. Далей пачыналася самастойнае жыццё маладой пары, на якое выпадала і выпрабаванне і шчасце.

Кажуць, што век чалавечы нядоўгі. За маладосцю ішлі сталасць, а потым і старасць. І таму яшчэ адзін з самых пашыраных абрадаў на Брагіншчыне — гэта пахавальны. Людзі паміралі заўсёды. Старыя і маладыя. Смерць не выбірала.

Адчуўшы набліжэнне смерці, хворы, калі быў пры памяці, прасіў паклікаць бацюшку да апошняй споведзі. Да яго прыходзілі сябры, суседзі і родныя, прасілі дараваць, калі што было не так, а ён у сваю чаргу прыгадваў нейкія свае ранейшыя грахі, каб памерці «з лёгкаю душою». Калі ж кананне было надта цяжкім, то блізкія людзі развязвалі вузлы, расшпільвалі гузікі, адмыкалі замкі. Даходзілі часам і да большага: адчынялі дзверы ў хаце, вароты ў хляве, душнікі ў коміне, вымалі верхні касяк дзвярэй, пасылалі да свяшчэнніка, каб той адкрыў у царкве царскія вароты. Давалі канаючаму ў рукі свечку: калі дым слаўся па нізе, то лічылі, што смерць ужо зусім блізка, а калі ішоў угору, то думалі, што справа пойдзе на папраўку.

Калі ж чалавек памірaў, то найперш яму шчыльна закрывалі (падвязвалі) рот і заплюшчвалі вочы, каб дарма не глядзеў і «яшчэ каго з сабою не забраў». Пасылалі каго-небудзь у царкву, каб пазванілі ў званы і паведамілі навакольлю пра смерць чалавека.

На ўсіх вясковых могілках сваякоў стараліся хаваць сем'ямі, «каб у госці адзін да аднаго хадзілі». Стаўлялі над магілаю крыж, а на ім вешалі фартушкі, ручнікі з той жа мэтай, што і ў хаце ў час жалобы. Крыж на магіле ставілі або ў галавах, або ў нагах. Часта на магілах садзілі кветкі, якія пры жыцці любіў нябожчык, ці дрэвы.

Традыцыйным завяршэннем пахавальнага абраду (за выключэннем самазабойцы) былі памінкі, куды ўсе прысутныя на пахаванні абавязаны былі з'явіцца.

Варта заўважыць, што вяскоўцы надзвычай многа адзначалі рэлігійных

свят. Яны з нецярплівасцю чакалі нядзелі, свята ці прысвятка, каб пайсці да царквы, адстаяць там службу, а заадно пабачыцца з роднымі, блізкімі, сябрамі, якія воляю лёсу павінны былі выехаць з роднай вёскі і жыць недзе непадалёку. Вядома ж, усе імкнуліся пабачыцца, пагаманіць, абмяняцца навінамі.

Да найбольш важных рэлігійных свят адносяцца: Каляды, Вялікдзень, Сёмуха (Духа), Пятро, Ушэсце, Спас.

Каляды пачынаюцца з 6 студзеня святкаваннем поснай куцці, працягваюцца шчадрухай (багатай куццёй) напярэдадні Новага года па старым стылі (13 студзеня) і заканчваюцца 19 студзеня. Агульныя калядкі паказваюць свята як адраджэнне нейкай міфічнай першакрыніцы. Яго сутнасцю і з'яўляецца вобраз язычніцкай Каляды, якая і ў хрысціянстве захавала многа першароднага. Недзе там, далёка-далёка, пачыналіся змены ў навакольным свеце, «пасярод двара едзе Каляда», садзіцца ў хаце ў «чырвоным куце».

У рэальным жыцці Каляды звязаны з пачаткам новага астранамічнага года, з «паваротам сонца з зімы на лета». Усебакова малююцца ў калядных песнях вобразы гаспадароў: яны і добрыя, і шчырыя, і спагадлівыя, у іх і багацце ёсць, і хлеба хапае, і жывёлы поўныя хлявы. Тут нават самы бедны ў вёсцы чалавек заўсёды маляваўся «багатым князем». Не, людзі да яго не падлашчваліся, каб ён ім нешта даў, проста яны жадалі гэтаму гаспадару багацейшага года, поспехаў і здароўя, а таксама ўраджаю, ды такога, якога ў яго жыцці яшчэ і не было. І хоць згадваюцца сам «пан Бог», «святыя памочнікі», усё ж адчуваецца, што менавіта сам вясковец з'яўляецца стваральнікам уласнага шчасця і дабрабыту. Менавіта гаспадару зычаць «з токам жыта», яго жонцы — «шубу да долу», а дочкам — «па вяночку руцьвяненькім», сынам жа — «па коніку вараненькім». Жадаюць усяго гэтага вясёлыя калядоўшчыкі.

Тут адчуваецца подых старадаўніх часоў, бо разам з людзьмі ходзяць па сялянскіх хатах і прататыпы культавых некалі жывёлін: каза, мядзведзь, кабыла, птушка-жораў і абавязкова механоша з кавалём. Кожны раз цэнтр святкавання пераносіцца з адной хаціны ў другую. Сярод згаданых жывёлін найбольш шанавалі і абагаўлялі казу, якая лічылася пасланніцай бога Перуна на зямлі. Менавіта яна, бегаючы па сялянскіх палях, прыносіла добры ўраджай, таму і спявалі пра яе: «Дзе каза ступою, там жыта капою, дзе каза рогам, там жыта стогам». Гаспадар, які добра частаваў калядоўшчыкаў, у падзяку ад іх атрымліваў песню, дзе зычыліся яму і ўраджай, і багацце, і здароўе на будучы год, а калі нечым не дагадзіў, пашкадаваў нечага, то і чуў у свой адрас не надта спагадлівыя словы песні. Асабліва радавалася Калядам моладзь, бо за гэтае свята можна было добра адпачыць ад цяжкай фізічнай працы і падрыхтавацца да вясенне-летняга гаспадарчага цыкла. Была магчымасць пазаляцацца да дзяўчат, пацешыцца гульнямі («пажаніць Цярэшку», згадаць старажытнага «Яшчара»), паваражыць (асабліва дзяўчатам пра свой лёс).

Мабыць, самым урачыстым было вясенняе свята Вялікдзень. Яно і не дзіўна, бо менавіта ў гэты час абуджалася прырода, прыляталі з выраю птушкі. Вясенні, ажыўляючы подых навакольля перадаваўся і сялянам. Нездарма ж спрадвеку лічылася, што вясна — пара маладосці, кіпучага жыцця, веры ў лепшае будучае. Тыя з брагінцоў, што свята верылі ў Хрыста, перад Вялікаднем ажно сем тыдняў пасцілі. І цяпер, нарэшце, яны маглі аскароміцца, наесціся ўволю, лічачы, што сваёй стрыманасцю ў час посту трохі замалілі мінулыя грахі.

Урачыстае богаслужэнне ішло ў праваслаўных храмах. У Вялікую («Чырвоную») суботу Велікодная ўсяночная пачыналася з хрэснага году. Жыхары бліжэйшых вёсак, мястэчак і хутароў неслі ў царкву свяціць булкі, мяса, паскі, яйкі, сыр і іншую ежу. Святочная

ютрань заканчвалася раніцай, прычым даволі своеасабліва — заклікам свяшчэнніка (ці свяшчэннікаў) да піру. У кожнай сялянскай хаціне да гэтага быў ужо накрыты стол і чакалі толькі тых, хто паехаў ці пайшоў на ўсяночную, каб яны прынеслі пасвячоныя стравы. На святочны, можа, толькі для гэтага дня зберажоны абрус гаспадыня ўжо паклала ў адвольным парадку засмажанае парася і каўбасы, шынку і паляндвіцу, сыры і пафарбаваныя яйкі, абавязкова свежанацёрты і прыпраўлены чырвонымі буракамі хрэн, а таксама паставіла віно і гарэлку.

Святкавалі Вялікдзень тры дні: у першы дзень дружна сядзелі за сваім сталом, стараліся нават не думаць аб працы, бо гэта быў адзін з тых дзён, калі «сама птушка гняздзечка не ўе, а дзяўчына русу касу не пляце». На другі дзень, па ранейшай дамоўленасці, да некага аднаго з родзічаў з'язджаліся ці сыходзіліся «ўсе родныя». Абавязковым, непарушным атрыбутам такіх сустрэч было хрыстосаванне і частаванне адно аднаго пафарбаванымі яйкамі, у тым ліку выразанымі з дрэва, злепленымі з гліны і г. д. На трэці дзень пачыналася ўсеагульнае гулянне, калі і старыя, і малыя «знаходзілі сабе раду». Вечарам таго ж дня вясковыя хлопцы збіраліся ў кампаніі (ад 5 да 10 чалавек) і «хадзілі валачобнікамі» па хатах. Спявалі валачобныя песні, праслаўлялі гаспадароў і іхнія сем'і, жадалі ім усяго найлепшага, а іх за гэта адорвалі пірагамі, каўбасамі, гарэлкай, а калі — і грашыма.

Пасля Вялікадня, на дзевяты дзень, наставала «свята памерлых» — Радаўніца (або Радуніца). Калі блізка была царква, то яе святар служыў на могілках паніхіду па ўсіх тут пахаваных. Калі ж не было, то людзі проста прыходзілі, засцілалі абрусам магілку, раскладвалі ўсё прынесенае з сабою і паміналі нябожчыка, які тут ляжаў. Распавядалі яму, як у іх ідуць справы, які быў летась ураджай, якімі клопатамі яны жывуць зараз, на што спадзяюцца і г. д. Перад адыходам пакідалі на магіле крыху ежы і гарэлкі ці віна ў шклянцы — «для нябожчыка».

На Сёмуху (Духа) брагінцы-вяскоўцы ўпрыгожвалі свае хаціны, падворкі і хлявы ды іншыя пабудовы «маем»: галінкамі клёна, дуба, бярозы, рабіны. Падлогу ў хаце пасыпалі свежазрэзаным аерам. Перад уваходам у жытло некаторыя гаспадары ставілі ссечаную маладую бярозку. Свята гэтае — прамы водгук вельмі даўніх язычніцкіх часоў, калі чалавек быў перакананы, што ўсё навокал мае жывую душу. А як жа іначай, калі вясною дрэвы і краскі распускаліся, а восенню яны ападалі, знікалі зноў да цёплых часоў. У хрысціянстве ад гэтага ўсеагульнага пакланення засталася Сёмуха.

А як жа не згадаць пра Купалле? Яно таксама бярэ пачатак з ранняга язычніцтва, але добра захавалася да нашага часу. Вечарам у полі, на высокім пагорку або паблізу вадаёма, збіраліся жыхары навакольных населеных пунктаў. Ноччу быў самы разгар свята: вогнішчы, песні, гульні. Цераз агонь скакалі, вакол танцавалі. У песнях часта згадвалася дачка Купалы — Купалінка. Дзяўчаты ў гэтую ноч варажылі аб будучым замужжы, пускалі вянкі па рацэ. Мясцовыя варажбіты, кожная з гаспадынь імкнуліся ў гэты час (вечарам або ноччу) назбіраць зёлак, траў, карэння, галінак кустоў і дрэў, бо менавіта Купалле было самым «гаючым» перыядам. Збіралі пераважна мяту, багаткі, буйрак, пералёт, лопух, быліцу, расходнік.

Але ўсім кветкам кветкай на Купалле лічылася папараць, якая нібыта цвіце толькі раз у год, і прыпадае цвіценне менавіта на гэтую ноч. Хто знойдзе і сарве кветку, набудзе здольнасць не толькі бачыць схаваныя глыбока пад зямлёю скарбы і стаць іх уладаром, але і разумець мову лясоў і бароў, птушак і звяроў, прадбачыць беды і пошасці. Сіла гэтай кветкі такая, што яна без цяжкасці адмыкае любыя дзверы і замкі, разбурае перашкоды, здабывае ўсё, што задумваецца, выконвае любое, нават самае нязбытнае, жаданне, зні-

шчае нагаворы-шэпты «чорных» чараўнікоў. Праўда, сцвярджалі, што, якое б вялікае ні выпадала багацце, асаблівай радасці свайму ўладару папараць-кветка не прыносіла. Такі чалавек паступова чарсцвеў душою, рабіўся злым, жорсткім, бязлітасным, імкнуўся яшчэ болей разбагацець. Ён звязваўся з нячыстай сілаю, прадаваў ёй сваю душу і ўрэшце паміраў, пакінуты жонкай і дзецьмі, бо ніхто не мог з такім сквапнікам ужыцца. Пасля яго смерці ўсе каштоўнасці ператвараліся ў лісце, друз, груду камянёў.

У гэтым пераліку свят неабходна згадаць і Спас. Іх тры: мядовы, яблычны, хлебны. Хлебны быў самы важны, бо вянчаў сабою жніво, таму і не дзіўна, што ў некаторых мясцінах ён святкаваўся як дажынкі. У гэты дзень упрыгожвалі стужкамі і кветкамі «бараду». Ахвяравалі хлеб і соль духу нівы Вялесу (або Воласу), на гэтым тэатралізаваным відовішчы ён яшчэ нагадваў сабою казла. «Воласаву бараду» жнейкі неслі гаспадару і ставілі на покуці. Зерне і каласкі з «барады» скарыстоўвалі на працягу года ў розных традыцыйных абрадах. Канец жніва сімвалізаваў сабою і хуткую змену надвор'я, таму невыпадкова гаварылі: «На трэцім Спасе трымай рукавіцы ў запасе». Не за гарамі была позняя восень, а там і піліпаўскі пост — пярэдадзень Каляд.

Вось у такім адвечным кругазвароце імклівага жыцця пастаянна знаходзіўся жыхар Брагіншчыны,— працавіты і руплівы селянін-вясковец.

А. М. Ненадавец

Брагінскі строй

Так называецца традыцыйны комплекс беларускага народнага адзення ва ўсходнім Палессі. Вылучаецца пераважна ў паўднёва-ўсходніх раёнах Гомельшчыны. Яму ўласцівы разнастайнасць форм адзення (пры адначасовым бытаванні на пачатку XX ст. форм, што ўзніклі ў розныя гістарычныя перыяды), багацце арнаментальных кампазіцый, адметныя шыйныя ўпрыгожанні. У агульным мастацкім ладзе брагінскага строю выяўляецца раўнавага маштабаў і прапорцый танальных і каляровых плям у касцюме, уражанне ўстойлівасці і статнасці фігуры.

У жаночым гарнітуры назіраюцца 3 варыянты: кашуля, 4-полкавая панёва, фартух, намітка (сярпанка); кашуля, андарак, белы фартух, гарсэт (кабат), каптур з хусткай; кашуля або блуза, крамная спадніца з прышыўным ліфам (шнуроўка). Кашуля кроілася з прамымі плечавымі ўстаўкамі, прышытымі па ўтку, мела адносна вузкі рукаў, стаячы каўнер. Арнамент натыкання і вышыўкі (чырвонымі, чорнымі і белымі баваўнянымі ніткамі — горынь белька) кампанаваўся ў палосы рознай шырыні на рукавах (звычайна ў папярочным кірунку), на плечавых устаўках, каўняры і падоле. З геаметрычных матываў пашыраны ромбы, 8-вугольныя зорачкі, зубчыкавыя паскі, з раслінных — дрэва жыцця (хвоя, размяшчалася буйным аднарапортным узорам на ўсю даўжыню рукава), 8-пялёсткавыя кветкі (размяшчаліся ў шахматным парадку па ўсім рукаве), ружы, ягады каліны. Вышыўку фартухоў часта дапаўнялі нашыўкамі з каляровага саціну, карункамі.

Андаракі гладкафарбаваныя, найчасцей чырвона-малінавыя або затканыя падоўжнымі бела-вохрыстымі, зялёнымі, сінімі, чорнымі ніткамі. Падпярэзвалі вузкім дэкаратыўным поясам; андарак, які насілі з кашуляй, аздобленай у падоле, падтыкалі пад пояс. Галаўныя ўборы жанчын — намітка, чапец (з цёмных, часта чырвоных крамных тканін, упрыгожаных аплікацыяй, брыжамі, штапам), хусткі — даматканая белая з чырвонымі прыкідкамі (парцянька) і суконная чорная з дэкаратыўнымі махрамі (апінатка), а таксама крамная стракатанабіваная, якую не завязвалі, а выкладалі на галаве і грудзях. Насілі пацеркі, шыйныя абручыкі (кружкі, пляцёнкі, лучкі, лавачкі), вышытыя рознакаляровым бісерам (у маляўнічы ўзор з ромбаў, крыжыкаў, зігзагаў).

Мужчынскія кашулі былі тунікападобнага крою; у іх багата вышывалася манішка. Нагавіцы шылі з палатна ў чорна-белыя палоскі (палатнянкі) або з шэрага ці карычневага сукна (суконнікі). Вопратку (світка, бурнос, бурка, кажух, казачына, мясцовыя назвы таксама чуйка, сканцэрка) аздаблялі нашыўкамі і аблямоўкамі з фабрычнага сукна ці саціну (чырвоны, чорны, сіні), аплікацыяй шнурам, фалдаваннем (маршчэнне), выразамі, строчкай.

М. Ф. Раманюк

Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. Мн., 1984. Т. 1. С. 462—463.

Брагінскія майстры

Хто не памятае хвалюючых радкоў М. Багдановіча з яго славутага верша «Слуцкія ткачыхі»:

...І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага узора,
Цвяток радзімы васілька.

Патрыятычныя пачуцці народа, яго ная арганічная злітнасць з роднай прыродай паэтычна ўвасоблены ў яго дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, і прыведзеныя класічныя радкі з поўнай падставай можна аднесці не толькі да слуцкіх, а і да рэчыцкіх, мазырскіх... брагінскіх ткачых і вышывальшчыц, вязальшчыц і іншых майстроў народнай творчасці.

Так, Брагіншчына багатая народнымі ўмельцамі. Дзесяткі яе жыхароў з натхненнем займаліся раней, а многія займаюцца і цяпер жывапісам, ткацтвам, мастацкім вышываннем, вязаннем, пляценнем, разьбой па дрэве і інш. Работы гэтых майстроў, што час ад часу экспануюцца на раённых, а асобныя нават трапляюць на абласныя і рэспубліканскія выстаўкі, сведчаць аб тым, што самадзейнае мастацтва жыве і развіваецца, убіраючы ў сябе ўсё лепшае з народных традыцый і разам з тым уносячы ў іх сучасны струмень. У большасці гэта сапраўдныя мастацкія творы, у якія майстры ўклалі часцінку сваёй душы.

У раёне добра ведаюць пра майстэрства Рыгора Сяргеевіча Грэся. Яго работы з саломкі ў 1975—1978 гг. экспанаваліся на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР у Маскве. Ці возьмем ткацтва і вышыванне ранейшых майстроў, пенсіянерак У. А. Лысенка, А. П. Раманенка, Г. А. Борсук, Раісы Рудзянок і іншых. Нельга адарваць вачэй ад складаных арнаментных і кветкавых кампазіцый, плаўных ліній традыцыйна-нацыянальнага вышывання з яго сакавітасцю фарбаў і выразнасцю малюнкаў. Усё гэта ўдала праяўляецца і ў работах ткачых Е. І. Чубса, М. М. Прыходзька, П. К. Добыш, М. П. Коцур, М. Р. Кур'ян, вышывальшчыц С. А. Крысенка, Т. Р. Шкурко, Ю. С. Нікалаенка і іншых.

Этнаграфічную каштоўнасць спецыялісты адзначалі ва ўзорах беларускіх касцюмаў, выкананых у нацыянальным стылі (брагінскі строй) Ганнай Падабед і Параскай Ліхашапка з вёскі Калыбань.

Здольная зачароўваць мяккая і выразная пластыка вырабаў (разьба па дрэве) самадзейных разьбяроў Рыгора Калеснічэнкі, Аляксандра Прыходзькі, пляцельшчыкаў з лазы ці шпагату Я. Р. Гацкі, А. Ц. Мартыненкі і іншых. Узорамі радасці, драўлянымі карункамі называлі ў вёсцы Астрагляды рэльефна-контурна-праразную разьбу, выкананую сталяром М. К. Доўбунам.

М. К. Доўбун

У сувязі з сумна вядомымі чарнобыльскімі падзеямі многія майстры прыкладнога народнага мастацтва былі эвакуіраваны ў іншыя раёны і вобласці Беларусі, і цяпер там людзі маюць магчымасць знаёміцца з іх работамі. Так, напрыклад, сталяр М. К. Доўбун пасля чарнобыльскай катастрофы разам з іншымі астраглядаўцамі перасяліўся ў Добрушскі раён, і там аформленыя яго рукамі аконныя ліштвы, аканіцы, ганкі, брамкі, калодзежныя навершы радуюць вока мясцовых жыхароў.

І. Ф. Ганжураў

Брагінскі народны тэатр. Сцэна са спектакля «Дальнее эхо». 1991 г.

Народны тэатр

У 1960 г. у Мінску праходзіў рэспубліканскі агляд мастацкай самадзейнасці, у якім прымалі ўдзел паўтары тысячы аматараў драматычнага, харавога, харэаграфічнага мастацтва. На аглядзе прадстаўлялі свае спектаклі сем драматычных калектываў. У ліку іх са спектаклем па п'есе А. Маўзона «Канстанцін Заслонаў» выступаў і драмкалектыў Брагінскага раённага Дома культуры. З мастацкага боку гэта была самая лепшая пастаноўка, паказаная на аглядзе. П'еса А. Маўзона складаная нават для прафесійнага тэатра. Тым не менш аматары самадзейнай сцэны з Брагіна, разам са сваім кіраўніком Я. М. Шайкевічам і акцёрам Гомельскага драматычнага тэатра Я. Галаванавым, які кансультаваў спектакль, здолелі пераканаўча ўвасобіць гэты твор і дабіцца поспеху.

Шмат у чым практычна пасадзейнічалі драматычнаму калектыву ў рабоце над спектаклем народны артыст БССР рэжысёр К. Саннікаў і выдатны выканаўца ролі К. Заслонава ў тэатры імя Я. Купалы, народны артыст СССР Б. Платонаў.

Газета «Літаратура і мастацтва» ў рэцэнзіі па выніках рэспубліканскага агляду, у прыватнасці, зазначала, «што ўвесь ансамбль выканаўцаў у спектаклі брагінцоў таксама радуе ўнутранай звязанасцю, адзінствам мэты. Тут цяжка каго-небудзь выдзеліць. І тым не менш нельга хоць бы не ўпамянуць паспяхова выкананых роляў Кроплі П. Скарахода, Крушыны — А. Русаком, правільна паказаных вобразаў ворагаў, што робіць барацьбу савецкіх людзей з імі сапраўды гераічнай. Мы маем на ўвазе выкананне роляў фашысцкіх афіцэраў Гірта — В. Лысенкам, Нейгаўза — М. Кацубам».

Крытыка прызнала спектакль драматычнага калектыву з Брагіна амаль прафесійным. На аглядзе ён заняў першае месца і быў узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, а таксама Ганаровай граматай Міністэрства культуры рэспублікі. Тады ж за дасягнутыя творчыя поспехі брагінскі драматычны калектыў атрымаў ганаровае права называцца народным тэатрам.

Асаблівы поспех у спектаклі выпаў на долю выканаўцы ролі К. Заслонава — Я. К. Сачка. Ён не быў навічком на сцэне. Да гэтага, пачынаючы з 1939 г. (спектаклі «Цудоўны сплаў» Кіршана, «Слава» Гусева і інш.), стварыў у самадзейных спектаклях каля 100 вобразаў самых розных герояў. Яраслаў Кірылавіч, як і рэжысёр-пастаноўшчык спектакля «Канстанцін Заслонаў» Я. М. Шайкевіч, быў узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Асноўна гэтага поспеху самадзейных артыстаў была закладзена ў далёкім 1947-м, калі пры раённым Доме культуры быў створаны драматычны калектыў. Першую сцэнічную работу аматараў тады ажыццявіла выпускніца Мін-

скага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута Таццяна Кандраценка па вадэвілі А. Салагуба «Бяда ад пяшчотнага сэрца».

На абласным аглядзе мастацкай самадзейнасці ў Мазыры (1948) брагінскія драмгурткоўцы занялі першае месца сярод аматарскіх драматычных калектываў. Ад таго часу і на працягу многіх гадоў кіраўніком драмгуртка, затым рэжысёрам-пастаноўшчыкам народнага тэатра з'яўляўся Яфім Міхайлавіч Шайкевіч.

У 1951 г. брагінцы зрабілі цікавую пастаноўку спектакля па п'есе К. Крапівы «Пяюць жаўранкі», з якім зноў удала выступілі (1-е месца) на абласным аглядзе. Акрамя згаданых вышэй, у рэпертуары драмкалектыву былі рускія класічныя п'есы «Лес» А. Астроўскага, «Вяселле» А. Чэхава, такія пастаноўкі расійскай, беларускай і ўкраінскай савецкай драматургіі, як «Рускія людзі» К. Сіманава, «Любоў Яравая» К. Транёва, «Дзіўны доктар» А. Сафронава, «Фараоны» А. Каламейца, «Смяротны прыгавор» А. Собалева, «Твае шаснаццаць» Т. Яна, «Прымакі» Я. Купалы, «Партызаны» К. Крапівы, «Выбачайце, калі ласка», «Лявоніха на арбіце», «Трыбунал» А. Макаёнка, «Шпачок» А. Махнача, «Першы ўрок» К. Губарэвіча, «Калі зацвітаюць сады» У. Палескага-Станкевіча, «Парог» А. Дударава, «Платон Крэчат», «У стэпах Украіны», «Макар Дубрава» А. Карнейчука і інш. — усяго больш як 30 пастановак.

Творчае ядро калектыву складалі настаўнікі мясцовых школ, рабочыя і калгаснікі, служачыя, пенсіянеры. Шмат творчай энергіі аддалі любімай справе Яраслаў Сачок, Настасся Рубаха, Леанід Каваленка, Галіна Кудзінава, Уладзімір Палянскі, Павел Скараход. Софія Цяцера, Вольга Фяськова, маладзейшыя аматары сцэны Пётр Старавойтаў, Людміла Барташэвіч, Валянцін Гардзеенка, Мікалаі Сіранькоў, Клара Снежка, Кацярына Федчанка і іншыя. Творча, з выдумкай падыходзіў да афармлення дэкарацый мастак РДК Валянцін Смаццар.

Напрыканцы 60-х — пачатку 70-х гг. быў невялікі перапынак у рабоце народнага тэатра. У 1972 г. ён аднавіў сваю творчую дзейнасць пастаноўкай па п'есе А. Макаёнка «Трыбунал». Спектакль вытрымаў дзесяткі паказаў перад гледачамі райцэнтра і вёсак, а таксама ў населеных пунктах суседніх раёнаў. У гэты перыяд работу тэатра ўзначальваў рэжысёр А. Бандарэнка. У далейшым рэжысёрам зноў быў Я. М. Шайкевіч.

У 70-я гг. пры народным тэатры працавала дзіцячая драматычная студыя, закліканая стаць рэзервам будучых творчых кадраў. Студыйцы, пераважна школьнікі, у працэсе вучобы падрыхтавалі спектаклі па п'есах В. Зуба «Незвычайная сустрэча», Я. Шварца — «Два клёны» і інш.

Калектыў народнага тэатра працаваў творча і плённа да 1993 г., калі спыніў сваё існаванне ў сувязі з выездам большасці яго артыстаў за межы раёна па прычыне наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі.

І. Ф. Ганжураў

1999 г.

Захапленне на ўсё жыццё

Па роду прафесіянальных заняткаў ураджэнец вёскі Асарэвічы В. М. Шаўчэнка — настаўнік. Навучаннем і выхаваннем дзяцей займаўся з першых пасляваенных гадоў і да выхаду на пенсію ў 1985-м. А па прызванні і захапленні душы ён — мастак.

Цягу да малявання Васіль Мінавіч адчуў яшчэ ў дзяцінстве. Нават падумваў у далейшым усур'ёз заняцца гэтай справай. Але «далейшае» аказалася вельмі няблізкім. І аддаліла яго вайна, на пачатку якой юнак прымаў удзел (у якасці члена мясцовай падпольнай арганізацыі) у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пасля арышту хлопцу давялося паспытаць ліха на катаржных работах у Германіі, у каменяломнях Нарвегіі.

Цяжкія выпрабаванні і жыццёвыя нягоды не астудзілі ў сэрцы Васіля Шаўчэнкі жадання з дапамогай пэндзля і фарбаў выказаць любоў да роднага краю, не астыўшае з дзіцячых гадоў захапленне прыгажосцю цудоўных краявідаў сваёй малой радзімы, яе працавітымі людзьмі. Менавіта гэтыя тэмы пераважаюць у большасці жывапісных твораў мастака-аматара.

Міналі гады. З-пад пэндзля Васіля Мінавіча з'яўляліся ўсё лепшыя творы. Такія, напрыклад, як «Узыход сонца». Карціна тонка і сакавіта раскрывае перад намі прыгажосць і свежасць світання над Дняпром. Або ўзяць палотны «Дарога на прыстань», «Перад навальніцай», «Поўдзень», «На досвітку добры ўлоў», «Днепр». Лірычнасць фарбаў у іх удала спалучаецца з тонкасцю і пластычнасцю малюнка.

Ёсць у В. М. Шаўчэнкі ўдалыя работы і ў жанры партрэта. Героямі яго твораў тут з'яўляюцца землякі, аднавяскоўцы, члены сям'і. У ліку такіх палотнаў і аўтапартрэтная замалёўка мастака з жонкай «На адпачынку».

Сціпласцю і строгай патрабавальнасцю самадзейнага майстра пэндзля да сваёй працы можна вытлумачыць тое, што ён не вельмі часта выстаўляе ўласныя творы на суд гледачоў. Выставы ўсё ж наладжваліся ў Брагіне, Камарыне, роднай вёсцы Асарэвічы. І заўсёды гледачы цёпла, з удзячнасцю адклікаліся аб творчасці мастака. Васілю Мінавічу, вядома, прыемна чуць добрыя ацэнкі з вуснаў землякоў. Аднак не меншае задавальненне адчувае ён, калі гледачы захапляюцца жывапіснымі работамі яго вучня-аднавяскоўца В. С. Ефіменкі. Уплыў творчага почырку настаўніка ўгадваецца ў такіх пейзажных палотнах маладзейшага самадзейнага мастака, як «Узыход месяца ля Асарэвічаў», «Прыгажун Днепр», «Залатая восень», у нацюрморце «Хлеб». Хоць Валерый Сцяпанавіч даўно ўжо стаў гараджанінам, але тэматычным стрыжнем яго работ паранейшаму з'яўляецца пейзаж — цудоўныя малюнкі родных асарэвіцкіх краявідаў. Гэта пацвердзіла і адна з персанальных выставак у Брагінскай карцінай галерэі, дзе В. С. Ефіменка выстаўляў 59 сваіх карцін.

П. І. Раманюк

Ажывае гісторыя

Музей і карцінная галерэя

Брагінскі гісторыка-краязнаўчы музей заснаваны як музей баявой і працоўнай славы ў 60-я гады. У ліпені 1988 г. пераўтвораны ў гісторыка-краязнаўчы музей, які пачаў працаваць у пераабсталяваным будынку былой сярэдняй школы № 2. Мае 6 экспазіцыйных залаў агульнай плошчай 600 квадратных метраў. Музейныя фонды налічваюць больш як 1130 экспанатаў, у т. л. асноўнага фонду — 522 і дапаможнага 607 адзінак.

Матэрыялы музея расказваюць пра гістарычнае мінулае раёна, аб падзеях Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, устанаўленні Савецкай улады, калектывізацыі, Вялікай Айчыннай вайне, аднаўленні народнай гаспадаркі на Брагіншчыне ў пасляваенны час і аб развіцці яе ў гады апошніх пяцігодак.

Экспанаты, што адносяцца да перыяду Вялікай Айчыннай вайны,— асабістыя рэчы, дакументы землякоў, якія змагаліся на розных франтах вайны і ў партызанскіх атрадах, расказваюць аб стварэнні на акупіраванай гітлераўцамі тэрыторыі раёна падпольных партыйных і камсамольскіх органаў, зараджэнні і развіцці партызанскага руху, аб суровых баях пры фарсіраванні Чырвонай Арміяй Дняпра і вызваленні Брагіншчыны і Камарыншчыны восенню 1943 г., пра Герояў Савецкага Саюза — ураджэнцаў раёна: П. С. Жукава, С. С. Мацапуру, П. І. Шпетнага, пра іншых праслаўленых землякоў.

Карцінная галерэя Брагіна ў дзень яе адкрыцця. 1988 г.

Асобныя залы ў музеі займае карцінная галерэя, у якой сабраны творы выяўленчага мастацтва 33 майстроў пэндзля. У ліку іх 118 жывапісных і 21 графічная карціна з выявамі мясцовых пейзажаў, гістарычнай і ваеннай тэматыкі, партрэты знакамітых землякоў, а таксама палотны, прысвечаныя чарнобыльскай трагедыі і яе наступствам.

У асобную экспазіцыю аформлены работы самадзейнага мастака з вёскі Асарэвічы В. М. Шаўчэнкі. Яго ж пэндзлю належыць і самае вялікае па плошчы палатно галерэі — «Штурм Дняпра».

У ліку аўтараў карцін, што захоўваюцца ў галерэі,— У. В. Алышэўскі, А. С. Гугель, А. М. Даўгяла, М. І. Ісаёнак, У. В. Кожух, В. А. Тоўсцік, В. Ф. Шматаў і іншыя.

І. Р. Раманава

Рэшткі архітэктурна-паркавых рэзідэнцый

У Брагінскім раёне да такіх нямых сведкаў старадаўнасці адносяцца два гісторыка-прыродныя аб'екты, помнікі садова-паркавага мастацтва. Першы з іх — парк у вёсцы Тэльман, на правым беразе ракі Брагінкі. Расказваюць, што першапачаткова парк быў створаны прыкладна ў XVII стагоддзі каля замка князёў Вішнявецкіх (ад яго збераглася толькі невялікая частка сцяны). Напрыканцы XVIII стагоддзя на яго месцы выпісаным з-за мяжы майстрам садова-паркавай справы быў разбіты новы парк, які часткова збярогся да нашых дзён.

Парк спланаваны па радыяльна-рэгулярнай сістэме. У ім перад княскім

Куток старажытнага парку ў в. Тэльман

замкам быў вялікі газон з валуном у цэнтры (так званым Каменем кахання, які збярогся). Паблізу газона стаяла прыгожая альтанка з бакавымі перголамі, апавітымі вінаграднай лазой. У бок Брагінкі разыходзіліся тры алеі. У планіровачную структуру парку арганічна ўключана рэчка, па беразе якой праходзіць алея. У парку растуць ліпа, клён, дуб, граб, вяз, сасна, елка, вярба і іншыя пароды дрэў.

Апошнімі з вядомых даглядчыкаў панскага, як яго называлі, парку (2-я палова XIX стагоддзя) з'яўляліся прыгонныя садоўнікі-кветкаводы Павел Казачэнка і Мацвей Рачэўскі.

Другім падобным помнікам даўніны з'яўляюцца рэшткі архітэктурна-паркавай рэзідэнцыі графа, генерал-лейтэнанта Іосіфа Юдзіцкага ў вёсцы Асарэвічы. Да нашага часу ад яго захавалася толькі частка графскага парку. Размешчаны ў маляўнічых ваколіцах, парк з'яўляецца ўлюбёным месцам адпачынку вяскоўцаў і прыезджых.

Комплекс будынкаў графскага маёнтка не збярогся.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Вуліцы Брагіна

Вуліцы гарадоў і вёсак тояць у сваіх назвах цікавую гісторыка-пазнавальную інфармацыю.

Галоўнай, стрыжнявой у Брагіне ад самага яго пачатку з'яўлялася вуліца з першапачатковай назвай Прабойная, асобныя часткі якой мелі ўласныя назначэнні: Пясочная, Вузкі Базар, Шырокі Базар. Вуліца атрымала такое найменне з прычыны сваёй гразкасці, цяжкай праезнасці. Гружаным возам у некаторых яе месцах у поўным сэнсе слова людзям даводзілася прабівацца, а не проста праязджаць.

Іншыя, больш значныя вуліцы называліся Загарадцзе — за горадам. Гэта значыць, што ў перыяд свайго ўзнікнення (прыкладна ў XI—XII стст.) яна знаходзілася за сценамі замкавага горада Брагіна. Вуліца Гаток пачыналася паблізу Загарадцзя, і раздзяляла іх намошчаная тагачаснымі брагінцамі гаць на месцы гразкага ручайка, што сцякаў з суседняга балота ў рэчку Брагінку.

Асобныя местачковыя вуліцы называліся па роду размешчаных на іх вытворчых прадпрыемстваў ці па прозвішчах іх уладальнікаў. Так, на Мясной размяшчаліся мясныя лаўкі, каля Кажэвеннай працавала саматужная вытворчасць па выдзелцы жывёльных скур. На Пасадзе сяліліся так званыя пасадскія людзі, рамеснікі. Вуліцы і завулкі Баранова, Качанова, Казіміроўскага, Шайкевіча атрымалі найменне ад прозвішчаў сваіх першых насельнікаў ці, можа, чымсьці знакамітых мясцовых мяшчан. Школьная вуліца пралягала паблізу адкрытай у 1863 годзе першай на Брагіншчыне свецкай вучэльні — земскага народнага вучылішча.

У сакавіку 1935 года выканкам Брагінскага местачковага Савета дэпутатаў працоўных прыняў пастанову аб перайменні вуліц м. Брагіна. Пясочная, Прабойная, Вузкі Базар, Шырокі Базар сталі вул. Савецкай. З таго часу Загарадцзе — гэта ўжо вуліца Кірава, Мясная, Кажэвенная — Інтэрнацыянальная, Гаток — Чырвонаармейская, Пасад — Набярэжная, Зялёная — Камсамольская, Шайкевіча — Кааператыўная, Троіцкая — Пралетарская, Качанова — Першамайская, Школьная — Сталярная, Баранова — Калгасная, завулкі Троіцкі і Казіміроўскі — завулак Садовы і г. д.

У 60—70-я гг. адбылося перайменне наступных вуліц: Новая — цяпер вуліца імя С. Я. Краўчанкі, Садовая — імя Ц. А. Манжоса, Выганная — імя П. В. Скарахода, Калгасная — імя П. Р. Зіновіча, Зялёная — імя Р. К. Сабаленкі, Інтэрнацыянальная — імя М. Ф. Махава, Другой пяцігодкі — імя Ш. У. Чалідзе, Сялянская — імя П. С. Мамкіна.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

БРАГІНУ

Сівых вякоў пагляд пахмуры,
Закуты ў лесавую ціш.
На ўскрайку ядзернай віхуры
Ты, поўны мужнасці, стаіш.

Калісь разбой ваярскіх сечаў
Размахам дзідаў і сякір
Твой люд бязлітасна калечыў,
Крывёй сцякаў па выспаў жвір.

Тут не кідалі бегла зброі,
Свабоду кроўна бераглі.
Былін харобрыя героі
Сумленна ў роднай спяць зямлі.

Над ратнай мужнасці пуцінай
Самотна трубяць журавы,
Вайны апошняе, Айчыннай
Снуецца дым парахавы.

Па-хлебадарску самавіта
Зноў шчасце працы шанаваў:
Адклаўшы меч, ты сеяў жыта,
Суседзяў брагай частаваў.

Ды неба засцілася хмарай,
Абложна ядзернай гульбой.
Пякельна спусташальным жарам
Дыхнуў Чарнобыль над табой.

Ці светам вусцішна пачута
Бяды жахотная гразьба,
Твая нясцерпная пакута,
Твая славянская журба?!

Як і заўсёды, хлебасольны,
За шчодры стол гасцей завеш.
Душою чысты, духам вольны
Ты, поўны мужнасці, жывеш.

Мікола Мятліцкі

Помнікі гісторыі і культуры Брагінскага раёна

ГАРПАСЁЛАК БРАГІН, ЦЭНТР РАЁНА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Вул. Камсамольская, на могілках. Пахаваны 33 воіны, якія былі паранены пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у лістападзе 1943 г. і памерлі ў шпіталі ў 1943—1944 гг. У 1962 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

Брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму. Вул. Савецкая. Пахаваны 224 воіны 9-га гвардзейскага і 89-га стралковага карпусоў 61-й арміі, якія загінулі пры вызваленні Брагіна і навакольных вёсак, 9 партызан, што аддалі сваё жыццё ў барацьбе супраць ворага ў 1941—1943 гг., а таксама 80 мірных жыхароў, загубленых нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Сярод пахаваных — Героі Савецкага Саюза Павел Сцяпанавіч Мамкін і Мікалай Фёдаравіч Махаў.

Каля мемарыяла «Памяць» у Брагіне

Помнік «Танк» у Брагіне. Баявая машына 114-га танкавага палка 68-й асобнай танкавай брыгады, якая прымала ўдзел у вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў восенню 1943 г.


ПОМНІКІ
ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ
БРАГІНСКАГА РАЁНА
Гарадскія пасёлкі
Цэнтры сельсаветаў
Населеныя пункты, якія перасталі існаваць у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС
Мяжа Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка
Помнікі і памятныя месцы Вялікай Айчыннай вайны (помнікі савецкіх воінаў і партызан, помнікі землякам і інш.)
Помнікі на магілах ахвяр фашызму
р.Брагінка
Вуглы
Мікулічы
Буркі
Малейкі
БРАГІН
Дублін
Крыўча
Малажын
Чамярысы
Н.Хракавічы
Асарэвічы
Краснае
КАМАРЫН
В.Жары
р.Дняпро
р.Брагінка

у 1957 г. на магіле ўстаноўлены помнік — скульптура воіна, у 1985 г. пабудаваны мемарыяльны комплекс «Памяць».

Магіла ахвяр фашызму. Вул. Пясочная, у скверы. Пахаваны 8000 мірных жыхароў, закатаваных і расстраляных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1943 гг. У 1957 г. на магіле насыпаны курган, на ім у 1980 г. установлена гранітная стэла.

Помнік у гонар танкістаў. Каля раённага Дома культуры. Устаноўлены ў 1983 г. у гонар воінаў 61-й арміі, якія прымалі ўдзел у вызваленні Брагіншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў восенню 1943 г. Гэта танк Т-34 з 2-га батальёна 114-га танкавага палка 68-й асобнай Калінкавіцкай Чырванасцяжнай танкавай брыгады.

Помнік Леніну Уладзіміру Ільічу. Скульптура ўстаноўлена 22 красавіка 1986 г. (рэстаўравана).

ВЁСКА АСАРЭВІЧЫ, ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 54 воіны 9-га гвардзейскага стралковага корпуса, якія загінулі ў верасні — кастрычніку 1943 г. пры вызваленні тэрыторыі Асарэвіцкага сельсавета ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і 2 партызаны. Сярод пахаваных — Героі Савецкага Саюза Ерамей Іванавіч Данільянц, Абдурауф Ганіевіч Даўлетаў, Уладзімір Міхайлавіч Кастрыкін, Міхаіл Максімавіч Уласаў. У 1967 г. на магіле ўстаноўлены помнік.

ВЁСКА АСТРАГЛЯДЫ*, БЫЛЫ ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 389 жыхароў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. установлены абеліск.

ВЁСКА БУРКІ, ЦЭНТР АСТРАГЛЯДАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 143 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. установлены абеліск, на якім пліты з імёнамі загінуўшых.

ВЁСКА БЯРОЗКІ НОВАЯЛЧАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 68 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. установлены абеліск.

ВЁСКА ВЕЛІМАЎ* БЫЛОГА КАЛЫБАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Магіла ахвяр фашызму. Пахаваны 21 мірны жыхар, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1968 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

ВЁСКА ВЕРХНІЯ ЖАРЫ, ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 103 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. установлены абеліск.

ВЁСКА ВУГЛЫ, ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 142 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. установлены абеліск.

ВЁСКА ВЫГРАБНАЯ СЛАБАДА*, БЫЛЫ ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 4 воіны 9-га гвардзейскага корпуса і 2 партызаны атрада імя Р. І. Катоўскага, якія загінулі восенню 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сюды ж перазахаваны астанкі лётчыкаў 165-га знішчальнага авіяпалка 286-й авіядывізіі 16-й паветранай арміі В. І. Ведзянеева і Г. Д. Чарствова, што загінулі ў кастрычніку 1943 г. У 1978 г. на магіле ўстаноўлены помнік — скульптура воіна.

ВЁСКА ГАЛКІ АСАРЭВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 295 воінаў 9-га гвардзейскага стралковага і 7-га

В. Галкі. Адкрыццё мемарыяльнага комплексу на брацкай магіле воінаў, якія загінулі восенню 1943 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

* Вёска Астрагляды і ў далейшым населеныя пункты, памечаныя зорачкай, перасталі існаваць, бо пасля катастрофы на ЧАЭС з іх выселены людзі.

гвардзейскага кавалерыйскага карпусоў, якія загінулі ў верасні — кастрычніку 1943 г. пры вызваленні вёскі і суседніх населеных пунктаў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — Героі Савецкага Саюза Канстанцін Данілавіч Грыцынін і Тафтазан Таґіравіч Міндзігулаў. У 1968 г. на магіле ўстаноўлены абеліск, а ў 1984 г.— узведзены мемарыяльны комплекс.

ВЁСКА ГДЗЕНЬ*, БЫЛЫ ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. Пахаваны 12 воінаў, якія загінулі ў верасні 1943 г. пры вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На ўшанаванне памяці воінаў, а таксама 146 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. устаноўлены абеліск.

Магіла ахвяр фашызму. Пахаваны 10 чалавек — камуністы і калгасныя актывісты, расстраляныя фашысцкімі акупантамі 14.1.1943 г. У 1960 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

ВЁСКА ГЛУХАВІЧЫ*, БЫЛЫ ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 3 воіны і 1 партызан, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. пры вызваленні тэрыторыі сельсавета ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле ўстаноўлены абеліск, а ў 1985 г. узведзены мемарыяльны комплекс.

Помнік аемлякам. На ўшанаванне памяці 288 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ПАСЁЛАК ГРОМКІ МАЛАЖЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 140 воінаў. Сярод пахаваных — воіны 356-й стралковай дывізіі 89-га і 9-га гвардзейскага стралковых карпусоў 61-й арміі, якія загінулі ў кастрычніку 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1970 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

ВЁСКА ДУБЛІН СПЯРЫЖСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік аемлякам. На ўшанаванне памяці 83 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. устаноўлены помнік — скульптура салдата з аўтаматам.

ВЁСКА ЖАЛІБОР* БЫЛОГА КРУКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Магіла савецкіх актывістаў. Пахаваны старшыня былога Савіцкага валаснога выканкама П. А. Старахатні і яго сын Т. П. Старахатні — загадчык зямельнага аддзела валаснога выканкама.

ВЁСКА ЖЫЛІЧЫ МАЛАЖЫНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Месца гібелі Героя Савецкага Саюза Махава Мікалая Фёдаравіча. У 1976 г. тут устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ЖЭРДНАЕ* БЫЛОГА СЛАБАДСКОГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 52 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1980 г. устаноўлены абеліск.

Помнік савецкаму лётчыку Чарствову Георгію Дзмітрыевічу. За 1 км на паўночны ўсход ад вёскі. У 1975 г. на месцы гібелі пілота-знішчальніка ўстаноўлена стэла.

ВЁСКА ЗАЛЕССЕ* БЫЛОГА КАЛЫБАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 142 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ІВАНКІ КАМАРЫНСКАГА ПАСЯЛКОВАГА САВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 17 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1979 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА КАВАКА БРАГІНСКАГА ПАСЯЛКОВАГА САВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 14 воінаў, якія памерлі ад ран у шпіталі ў 1943—1944 г. У 1967 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

ВЁСКА КАЛЫБАНЬ*, БЫЛЫ ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 3 воіны, якія загінулі ў кастрычніку 1943 г. пры вызваленні тэрыторыі сельсавета ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. устаноўлены надмагілле, абеліск на ўшанаванне памяці 80 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

ГАРПАСЁЛАК КАМАРЫН, КАМАРЫНСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 627 воінаў 15-га стралковага корпуса 13-й арміі, якія загінулі ў верасні 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Камарына, вёсак Новая Ёлча, Бярозкі і інш. ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, і 2 партызаны. Сярод пахаваных — Героі Савецкага Саюза Араз Апаеў, Васіль Іларыёнавіч Баяркін, Дзмітрый Фёдаравіч Грачушкін, Мікалай Данілавіч Грышчанка, Фёдар Кірылавіч Паўлоўскі, Мікалай Аляксандравіч Якаўлеў. У 1957 г. на магіле ўстаноўлены помнік — скульптура воіна.

Мемарыяльны комплекс «Памяць» у г. п. Камарын

Помнік у гонар воінаў-вызваліцеляў. У 1976 г. у гонар воінаў 15-га стралковага корпуса 13-й арміі Цэнтральнага фронту ўзведзена стэла ў выглядзе разгорнутага сцяга з барэльефнай выявай на ёй воінаў і партызан.

Помнік Леніну Уладзіміру Ілычу. Скульптура ўстаноўлена ў 1947 г.

ВЁСКА КАРЛАЎКА КАМАРЫНСКАГА ПАСЯЛКОВАГА САВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 18 воінаў, якія загінулі ў верасні — кастрычніку 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1963 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

ВЁСКА КАЦІЧАЎ КАМАРЫНСКАГА ПАСЯЛКОВАГА САВЕТА

Месца гібелі партызанскай сувязной Асядач Праскоўі Мікалаеўны.

ВЁСКА КІРАВА КАМАРЫНСКАГА ПАСЯЛКОВАГА САВЕТА

Магіла ахвяр фашызму. Пахаваны 21 мірны жыхар вёскі Кірава, якія былі загублены нямецка-фашысцкімі захопнікамі 14.1.1943 г. У 1968 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 79 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА КРАСНАЕ НОВАЯЛЧАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Магіла ст. лейтэнанта Беразенкі Цімафея Савельевіча. У 1965 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

Магіла невядомага савецкага воіна. У 1963 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 174 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1968 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА КРУКІ*, БЫЛЫ ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, помнік землякам. Пахаваны 5 воінаў і 2 партызаны, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. пры вызваленні тэрыторыі сельсавета ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на ўшанаванне памяці воінаў і партызан, а таксама 101 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, устаноўлены абеліск.

ВЁСКА КРЫЎЧА, ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. Пахаваны 22 воіны, якія загінулі пры вызваленні тэрыторыі сельсавета ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1943 г. У 1967 г. на ўшанаванне памяці воінаў, а таксама 209 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, устаноўлены помнік — скульптура воіна.

ВЁСКА ЛУБЕНІКІ ВУГЛОЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. Пахаваны 11 воінаў 89-га стралковага корпуса 61-й арміі, якія загінулі ў кастрычніку 1943 г. пры вызваленні вёскі і навакольных населеных пунктаў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1968 г. на ўшанаванне памяці воінаў і 22 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ЛЮДЗВІНОЎ НОВАЯЛЧАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 12 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА МАЛАЖЫН, ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 7 воінаў, якія загінулі ў кастрычніку 1943 г. пры вызваленні раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — Герой Савецкага Саюза А. Р. Папугаеў. У 1968 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 174 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА МАЛЕЙКІ, ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. На могілках. Пахаваны 75 воінаў, якія загінулі восенню 1943 г. пры вызваленні тэрыторыі сельсавета ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — воіны 81-й і 356-й стралковых дывізій. У 1965 г. на магіле ўстаноўлены помнік — скульптура воіна ў жалобе.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 171 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. устаноўлены помнік — скульптурная кампазіцыя.

ВЁСКА МІКУЛІЧЫ. ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Магіла Героя Савецкага Саюза Жукава Пятра Сяргеевіча. У 1973 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

Помнік ахвярам фашызму. Устаноўлены на месцы спалення гітлераўцамі мірных жыхароў в. Мікулічы ў жніўні 1942 г.

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 290 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1975 г. устаноўлены абеліск і пліты з прозвішчамі загінуўшых.

ВЁСКА НЕЖЫХАЎ• БЫЛОГА СЛАБАДСКОГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік у гонар Брагінскага падпольнага райкамв КП(б)Б і штаба асобнага партызанскага атрада імя Р. І. Катоўскага. Узведзены ў 1967 г. паблізу месца базіравання партызанскага атрада і падпольнага райкама партыі ў 1942 — 1943 гг.

ВЁСКА НОВАЯ ГРЭБЛЯ ХРАКАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 90 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА НОВАЯ ЁЛЧА, ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Магіла ахвяр фашызму. Пахаваны 17 жыхароў в. Н. Ёлча, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1942 г. У 1956 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

ВЁСКА ПЕТРЫЦКАЕ МАЛЕЙКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 36 воінаў 81-й стралковай дывізіі 89-га стралковага корпуса 61-й арміі, якія загінулі ў кастрычніку 1943 г. пры вызваленні вёскі і навакольных населеных пунктаў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

ВЁСКА ПІРКІ•, БЫЛЫ ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан. Пахаваны 123 воіны 89-га і 9-га гвардзейскага стралковых карпусоў 61-й арміі, а таксама 35 партызан атрада імя М. М. Кацюбінскага Чарнігаўскага партызанскага злучэння, якія загінулі ў верасні — кастрычніку 1943 г. пры вызваленні в. Піркі і навакольных населеных пунктаў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сярод пахаваных — Героі Савецкага Саюза Сяргей Купрыянавіч Галавашчанка і Васіль Фёдаравіч Загайнаў. У 1958 г. на магіле пастаўлены помнік — скульптура воіна.

Магіла ахвяр фашызму. Пахаваны 12 мірных жыхароў, якіх расстралялі нямецка-фашысцкія захопнікі ў маі 1943 г. У 1977 г. на магіле ўстаноўлена пліта.

ВЁСКА ПУЧЫН• БЫЛОГА СЛАБАДСКОГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 68 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1980 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА САБАЛІ БРАГІНСКАГА ПАСЯЛКОВАГА САВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 250 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА САВІЧЫ, БЫЛЫ ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў, партызан і ахвяр фашызму. Пахаваны 11 воінаў, 8 партызан атрада імя Р. І. Катоўскага, а таксама 33 мірныя жыхары, якія былі расстраляны і спалены нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941 — 1943 гг. У 1967 г. на магіле ўстаноўлены помнік — скульптура воіна ў жалобе і 3 надмагіллі.

ВЁСКА СПЯРЫЖЖА•, БЫЛЫ ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 91 земляка, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. устаноўлены помнік — скульптура жанчыны з пальмавай галінкай.

ВЁСКА СЦЕЖАРНАЕ КРЫЎЧАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 34 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1976 г. устаноўлена стэла з барэльефнай выявай воіна.

ВЁСКА СЯЛЕЦ МАЛЕЙКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 66 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1965 г. устаноўлены помнік — скульптура воіна.

ВЁСКА ТЭЛЬМАН МАЛЕЙКАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў. Пахаваны 6 воінаў, якія загінулі ў лістападзе 1943 г. пры вызваленні вёскі і навакольных населеных пунк-

таў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1967 г. на магіле ўстаноўлены абеліск.

Парк. Закладзены ў канцы XVIII стагоддзя каля замка князёў Вішнявецкіх (часткова збярогся). Помнік садова-паркавага мастацтва.

ВЁСКА ХРАКАВІЧЫ, ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Брацкая магіла савецкіх воінаў, помнік землякам. Пахаваны 40 воінаў 9-га гвардзейскага стралковага корпуса 61-й арміі, якія загінулі ў кастрычніку 1943 г. пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні вёскі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1966 г. на ўшанаванне іх памяці, а таксама 106 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ЦАЛУЙКІ• ХРАКАВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Магіла ахвяр фашызму, месца гібелі лётчыка Ведзянеева Васіля Іванавіча. Пахаваны 5 жыхароў вёскі, якіх загубілі нямецка-фашысцкія захопнікі восенню 1943 г. Тады ж загінуў лётчык 165-га знішчальнага авіяпалка В. І. Ведзянееў (перазахаваны ў в. Выграбная Слабада). У 1970 г. на ўшанаванне памяці загінуўшых устаноўлена гранітная пліта.

ВЁСКА ЧАМЯРЫСЫ, ЦЭНТР СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 152 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1967 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ЧЫКАЛАВІЧЫ• БЫЛОГА КАЛЫБАНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 89 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1966 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ШКУРАТЫ ВУГЛОЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 84 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1984 г. устаноўлены абеліск.

ВЁСКА ЯСЯНІ• СПЯРЫЖСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

Помнік землякам. На ўшанаванне памяці 42 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 г. устаноўлены помнік — на фоне абеліска скульптуры партызана і дзяўчынкі.

Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гомельская вобласць. Мн., 1985. С. 91—105.

Падрыхтаваў *І. Ф. Ганжураў*

Прырода Брагіншчыны

Тэрыторыя Брагіншчыны ўяўляе сабой слабахвалістую раўніну з невысокімі ўзгоркамі і прыдняпроўскай нізінай. Рачная сістэма раёна адносіцца да басейна Чорнага мора. У яго ўваходзіць памежны з Чарнігаўшчынай Днепр (працягласць у межах Брагіншчыны 86 км) і Брагінка, якая бярэ пачатак у Рэчыцкім раёне. Каналы, якія адводзяць ваду з Брагінкі ў Днепр і Прыпяць, дзеляць раку на 3 самастойныя водныя аб'екты:

1. Брагінка Верхняя — ад вытокаў (на поўдзень ад в. Прокісель) да выхаду Дзяржаўнай канавы і далей да ўпадзення ў Днепр. Даўжыня 74 км, плошча водазабору 1390 км^2. Сярэдні гадавы расход вады 4,44 м^3/сек;

2. Брагінка Сярэдняя — ад выхаду Дзяржаўнай канавы, за 2 км на поўдзень ад в. Гарадзішча, да выхаду канала Івераўка і далей да ўпадзення ў Днепр. Даўжыня 55 км, плошча водазабору 460 км^2. Сярэдні гадавы расход вады 1,74 м^3/сек;

3. Брагінка Ніжняя — ад выхаду канала Івераўка (в. Марозаўка) да ўпадзення ў Прыпяць (у межах Украіны). Даўжыня 50 км, плошча водазабору 928 км^2. Сярэдні гадавы расход вады 2,34 м^3/сек.

На тэрыторыі раёна 65 азёр басейна Дняпра. З іх плошчай больш за 1 га — 30 і больш за 3 га — 35 азёр. У даўнія часы асобныя з іх былі даволі значных памераў па плошчы воднай паверхні. «Из озер в Речицком уезде, более или менее заслуживающих внимания по величине,— паведамлялася ў статыстычным выданні 130-гадовай даўнасці,—

укажем на следующее: Сперижъ наибольшее: имеет в длину 4½ версты, а в ширину 2 версты; лежит в юго-восточной части уезда, близ д. Сперижь. Через него протекает р. Брагинка»[1].

На пачатку 80-х гг. пры будаўніцтве новага саўгаса «Брагінскі» на меліяраваных землях каля в. Піркі створана штучнае вадасховішча плошчай у некалькі гектараў[2]. З іншых штучных водных аб'ектаў варта назваць рэгулюючыя каналы польдэра ў зоне рэчак Брагінка і Тарасіца ў калгасе «Чырвоная Украіна» (каля в. Гдзень). У 1966 г. там былі адсыпаны дамбы і пабудавана магутная помпавая станцыя, каб не дапусціць затаплення меліяраваных зямель гаспадаркі і навакольных угоддзяў водамі Кіеўскага вадасховішча.

Брагінскія азёры з'яўляюцца рэзервуарамі пітной вады, рыбагаспадарчымі ўгоддзямі і часткова — месцамі адпачынку. Рэкі выкарыстоўваюцца як водаприёмнікі пры асушэнні балот і забалочаных зямель. У вадаёмах раёна жывуць 30 відаў рыб: акунь, гусцера, ёрш, жэрах, карась, карп, краснапёрка, лешч, лінь, мянтуз, падвусь, плотка, пячкур, сом, судак, шчупак, язь і іншыя.

Зарослыя трыснягом і чаротам узбярэжжы шматлікіх азёр, нізкія забалочаныя берагі Брагінкі і Дняпра з'яўляюцца добрымі месцамі гняздоўяў вадаплаўнай птушкі (кракавай качкі, чыркa, лысухі, шылахвосткі, шэрай качкі). Вельмі многа перавозчыкаў, краншнепаў, зуйкоў, чарназубікаў, чыбісаў, вярценнікаў. Ёсць шэрыя і чорныя чаплі.

Глебы сельгасугоддзяў дзярнова-падзолістыя (34,2 %), у т. л. аглееныя знізу (дзярнова-падзолістыя глеяватыя і глеевыя) — 12,1 %, дзярнова-глеяватыя і глеевыя (16,8 %), тарфяна-балотныя (36,0 %). Супясчаныя (40,5 %) і малапрыгодныя пясчаныя глебы (34,6 %) пераважаюць ва ўсходняй частцы раёна. У паўночна-заходняй — моцна падзолістыя суглінкавага характару. Буйныя масівы больш ураджайных суглінкавых глеб распаўсюджаны ў Астраглядаўскім, былым Глухавіцкім, Мікуліцкім, Малейкаўскім сельсаветах. Уздоўж рачных далін Дняпра размешчаны алювіяльна-нанасныя (пойменна-лугавыя) глебы.

Брагіншчына — зона інтэнсіўнага лесагаспадарання. Лясы (пераважна мяшаныя) займаюць 30 % тэрыторыі раёна. Адносяцца да падзоны хваёвых шырокалісцёвых лясоў 1-й і 2-й груп. Сярод растучых парод найбольш прадуктыўныя сасна, бяроза, дуб, вольха. У падлесках растуць чаромха, крушына, каліна, ляшчына, ядловец і інш.

Багаты і разнастайны жывёльны свет лясоў. Самыя буйныя яго прадстаўнікі — ласі, казулі, дзікі і інш. У лясах сустракаюцца барсукі, куніцы, жывуць зайцы русакі і белякі, вавёркі. Самыя распаўсюджаныя драпежнікі — лісы звычайныя, ваўкі, рысі. У 1936 г. у раён быў завезены янотападобны сабака.

Найбольш шматлікімі прадстаўнікамі жывёльнага свету лясоў з'яўляюцца на Брагіншчыне птушкі — іх 150 відаў.

У раёне шмат дзікіх жывёл, жыццё якіх звязана з вадой. Гэта — рачны бабёр, выдра, паўднёваамерыканская нутрыя, завезеная ў 30-я гг. XIX стагоддзя, прыстасаваная да паўводнага спосабу жыцця андатра, норка еўрапейская.

І. Ф. Ганжураў

Запаведнік на паўднёвым усходзе Беларускага Палесся

Пасля катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Пастановай Савета Міністраў БССР ад 18 ліпеня 1988 г. на плошчы 131,3 тыс. га на тэрыторыі Беларускага сектара 30-кіламетровай зоны Чарнобыльскай АЭС быў створаны Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны за-

[1] Труды Минского губернского статистического комитета. Вып. 1-й. Мн., 1870. С. 395.

[2] Некалькі гадоў таму вада з яго спушчана.

паведнік (ПДРЭЗ). У 1993 г. плошча запаведніка, па рашэнні Гомельскага аблвыканкама, павялічылася да 215,4 тыс. га за кошт перадачы зямель зоны эвакуацыі і адсялення разам з плошчай сумежных з ім зямель запасу і зямель ляснога фонду Камарынскага, Брагінскага, Нараўлянскага, Мазырскага, Хойніцкага лясгасаў і дарожных арганізацый.

Да катастрофы на Чарнобыльскай АЭС у 84 населеных пунктах да мая 1986 г. пражывала каля 22 тыс. чал., часткова або поўнасцю ажыццяўлялі сваю дзейнасць 7 саўгасаў і 19 калгасаў, галоўным чынам жывёлагадоўчага накірунку. У запаведніку 2 лініі дрыценой агароджы, якія абмяжоўваюць 10- і 30-кіламетровыя зоны ЧАЭС.

Запаведнік уключае паўднёвую і паўднёва-ўсходнюю часткі Нараўлянскага, паўднёвую частку Хойніцкага, заходнюю і паўднёва-заходнюю часткі Брагінскага раёнаў і падпарадкаваны Міністэрству па надзвычайных сітуацыях і абароне насельніцтва ад вынікаў катастрофы на ЧАЭС Рэспублікі Беларусь.

Працягласць тэрыторыі з поўначы на поўдзень да 38 км, з захаду на ўсход — да 65 км. У 16 км ад крайняй паўднёвай кропкі запаведніка знаходзіцца самая паўднёвая кропка Беларусі, якая размешчана на паўднёвы захад ад вёскі Ніжнія Жары Брагінскага раёна, на правым беразе Дняпра — 51°16′ паўночнай шыраты. Запаведнік займае ўсходнюю частку Мазырскага і паўднёвую — Гомельскага Палесся. Яго адміністрацыйны цэнтр знаходзіцца ў горадзе Хойнікі. Тэрыторыя запаведніка падзелена на тры ўчасткі (Камарынскі, Нараўлянскі і Хойніцкі), у склад якіх уваходзіць 16 лясніцтваў, вопытна-вытворчая база, пажарна-хімічная частка. Навуковы аддзел знаходзіцца ў былым населеным пункце Бабчын Хойніцкага раёна.

На тэрыторыі запаведніка (Брагінскі раён) праходзіць чыгунка Чарнігаў — Славуціч — Прыпяць — Вільча — Оўруч, а таксама шаша: Нароўля — Прыпяць — Чарнобыль, Хойнікі — Даўляды — Аляксандраўка — Народзічы. Рака Прыпяць на плошчы запаведніка (ніжняе цячэнне) суднаходная і ўпадае ў Кіеўскае вадасховішча на Дняпры.

У тэктанічных адносінах тэрыторыя запаведніка, як і ўсёй Беларусі, адносіцца да заходняй часткі Усходне-Еўрапейскай платформы, што ўтварылася ў дакембрыйскі перыяд. Зямная кара кантынентальнага тыпу, магутнасць якой на паўднёвым усходзе ад 30 км і меней, утварылася больш за 2,6 млрд. гадоў таму назад.

Асноўная частка тэрыторыі запаведніка (Нараўлянскі і Хойніцкі раёны) адносіцца да Прыпяцкага прагіну, які мае вельмі складаную будову складкава-блокавай тэктонікі: горсты, грабены, выступы, валы і г. д. Тоўшча асадкавых горных парод дасягае 6 км. На поўдні і паўднёвым усходзе запаведніка (Хойніцкі і Брагінскі раёны) Брагінска-Лоеўская седлавіна аддзяляе Прыпяцкі прагін ад Дняпроўска-Данецкага. На паўднёвым захадзе запаведніка (Нараўлянскі раён) паўночная ўскраіна Украінскага шчыта, крышталічны фундамент якога блізка падыходзіць да паверхні ў накірунку захад-усход (вёскі Дзяржынск — Кіраў — Ясёнак у Нараўлянскім раёне).

Карысныя выкапні на тэрыторыі запаведніка — гэта ў асноўным радовішчы торфу, глін, пяскоў, мінеральныя фарбы, балотныя жалезныя руды і інш. На Нараўлянскім участку запаведніка Майневялікія залежы балотных руд (Майдан, Бярозаўка, Ражава), Вяпроўскае радовішча пяскоў і глін, мінеральнай фарбы. У 1975 г. каля вёскі Акопы адкрыта радовішча адной з рэдкіх і каштоўных глін — бентаніту. На тэрыторыі ПДРЭЗ размешчаны часткова Паганянскі балотны масіў (міжрэчча Прыпяці і Дняпра) і Камарынскае балота, а таксама невялікія радовішчы балотных жалезных руд і пяскоў.

Сучасны рэльеф Мазырскага Палесся (паўднёва-ўсходняя частка) запавед-

ніка ўтварыўся ў эпоху Дняпроўскага зледзянення каля 320 тыс. гадоў таму назад. У Паазёрскае ледавікоўе прахадзіла фарміраванне даліны ракі Прыпяць. Абсалютная вышыня мясцовасці 120—140 м. Большая частка тэрыторыі плоскахвалістая водна-ледавіковая забалочаная раўніна з паступовым зніжэннем да даліны ракі Прыпяць. Адзнака ўрэза вады Прыпяці на мяжы з Кіеўскай вобласцю (Украіна) складае 104 м. На Нараўлянскім участку запаведніка ў Прыпяць упадаюць правыя прытокі — Славечна і Жалонь.

Паверхня Гомельскага Палесся плоскахвалістая, радзей хвалістая з нахілам на поўдзень да міжрэчча Дняпра і Прыпяці. Паверхня рачных тэрас з дзюнамі ў выглядзе невялікіх узвышшаў. На поўначы запаведніка — Юравіцкае ўзвышша, на ўсходзе ад вёскі Навасёлкі адзнакі вышыні мясцовасці складаюць 120—132 м, каля вёскі Баравічы — 149,4 м, у цэнтральнай частцы запаведніка абсалютныя вышыні — 105—115 м, на поўдні запаведніка — 107—105 м.

У далінах і па берагах Прыпяці, Дняпра і іншых рэк з даўніх часоў размяшчаліся палеалітычныя, мезалітычныя і неалітычныя стаянкі першабытнага чалавека. Уверх па Прыпяці, недалёка ад межаў запаведніка, размяшчаецца стаянка першабытнага чалавека — Юравічы, далей па берагах Прыпяці пасяленні: Ражава, Беласарока, Тур'я (Слабодка), Ломыш, Канатоп, Кажушкі, Цешкаў, Аравічы, а па берагах Жалоні — Бярозаўка, Дзернавічы, Вяпры, Ражава, Курані, Беласарока, Масаны і інш. Знойдзены таксама стаянкі па берагах Віці, Славечны, Брагінкі. Узрост стаянак — 15—26,5 тыс. гадоў.

Па кліматычных умовах тэрыторыя запаведніка адносіцца да заходняй вобласці ўмеранага кліматычнага пояса. Найбольшы вугал падзення сонечных промняў на поўдні запаведніка, які ў дзень летняга сонцастаяння (22 чэрвеня) складае 62°10′ і з'яўляецца самым найбольшым у Беларусі. У дзень зімовага сонцастаяння (22 снежня) ён роўны ўсяго толькі 15°10′, а ў дні раўнадзенстваў (21 сакавіка і 23 верасня) — 38°40′. Гадавая сонечная радыяцыя таксама самая найбольшая ў Беларусі і складае 4100 МДж/м². У ліпені яна ў 8—9 разоў большая, чым у студзені. Радыяцыйны баланс — 1750—1800 МДж/м². Атмасферны ціск у студзені — 1023 гПа, у ліпені — 1013 гПа. Зімой заходнія і паўднёва-заходнія вятры прыносяць марское паветра з Атлантыкі. Сярэдняя тэмпература студзеня — 6,5 °С, ліпеня + 18,6 °С. Максімум тэмпературы адзначаны паблізу запаведніка на станцыі Васілевічы + 38 °С у 1946 г., мінімум — 35 °С. Сяроднегадавая колькасць ападкаў — 535—570 мм, а ў засушлівыя гады — 350—460 мм і толькі адзін раз у 11 гадоў выпадае больш за 650 мм ападкаў. Сярэдняя адносная вільготнасць паветра каля 80 %. Працягласць без марознага перыяду ў паветры — 150—160 дзён, а сума актыўных тэмператур вышэй чым + 10 °С складае больш за 2400°.

Па агракліматычным раянаванні тэрыторыя запаведніка адносіцца да Паўднёвай агракліматычнай вобласці і мае найлепшыя ўмовы для вырошчвання цеплалюбівых культур.

Галоўная водная артэрыя запаведніка — рака Прыпяць перасякае яго з паўночнага захаду на паўднёвы ўсход на працягу прыкладна 120 км. Важнымі прытокамі справа з'яўляюцца Славечна і Жалонь, злева — рака Віць. Па тэрыторыі запаведніка працякаюць рака Брагінка, Несвіч — правы прыток Брагінкі, пракапаны каналы Грубчанскі, Кажушкоўскі, Паганянскі. У даліне Прыпяці больш за 300 азёр і старарэчышчаў. Найбольшыя з іх: Масцішча, Уюры, Гняздное, Нямецкае, Семяніца, Старуха, Стараселле, Смолішча, Плоскае, Белавод, Бярозавы старык, Кругавое, Панскае, Прыволле, Аблухаў і інш. Шырыня рэчышча каля вёскі Карпавічы (нежылая) — 240 м, глыбіня ра-

кі — 1,9 м, дно пясчанае. На мяжы з Украінай шырыня Прыпяці — 220 м, глыбіня — 5,7 м, урэз вады — 104 м. Максімальная шырыня рэчышча — 355 м. Пойма часткова забалочаная. Найбольшая тэмпература вады ў ліпені + 27,5 °С. Сярэднегадавы расход вады на мяжы з Украінай 403 м³/с, у вусці — 448 м³/с, найбольшы — каля 6000 м³/с. У часы разводдзя рака разліваецца ў ніжнім цячэнні на 10—15 км. Крыгаход у канцы сакавіка, а ў асобныя гады лёд не ўтвараецца.

Правы прыток Прыпяці, рака Славечна, працякае з захаду на ўсход па тэрыторыі запаведніка на працягу 23 км (усяго даўжыня ракі — 158 км). Шырыня даліны — 1—2,5 км, поймы — 0,4—0,7 км, рэчышча — 20—30 м. Да будаўніцтва шашы з'яўлялася галоўнай воднай артэрыяй па сплаве лесу. У сучасны момант населеныя пункты, якія размешчаны на берагах ракі, такія, як Цешкаў, Белы Бераг, Белабярэжная Рудня, Ліхаўня, Гамарня, Данілееўка, Вяжышча, увайшлі ў зону адчужэння, многія вёскі пахаваны на месцы існавання назаўсёды. Рэчышча вельмі звілістае, ніжэй адселенай вёскі Вяжышча пойма ракі зліваецца з поймай Прыпяці. Сярэднегадавы расход вады ў вусці — 13,7 м³/с.

Правы прыток Прыпяці, рака Жалонь, або Мухаедаўскі канал, з'яўляецца водапрыёмнікам меліярацыйных сістэм. У сярэднім цячэнні справа прымае невялікія рачулкі і каналы: Гразліва, Ханья, Храпунь, Стрэлка, Верасожка, Ражава. Працякае па лясістай забалочанай мясцовасці Славечна-Жалоньскай нізіны. На левабярэжжы Жалоні, у пойме ракі Прыпяці, шматлікія азёры і старыцы: Смержава, Татарын, Копіца, Круток і інш. Упадае ў Прыпяць праз пратоку Перакоп. Расход вады ў вусці — 2,4 м³/с. Маленькая рэчка Ражава даўжынёй усяго 22 км упадае ў раку Жалонь на тэрыторыі Нараўлянскага ўчастка запаведніка. Шырыня рэчышча — 1,5—2,5 м, часткова каналізаванае, глыбіня — 0,4—1,2 м.

З левых прытокаў Прыпяці найбольш значная Віць, якая ўпадае ў Прыпяць на поўдзень ад вёскі Тульгавічы. На ўсім працягу рэчышча каналізаванае, яго шырыня 12—20 м, глыбіня — 1,5—2,5 м, хуткасць цячэння — 0,1 м/с. Сярэднегадавы расход вады ў вусці ракі — 3,2 м³/с. Рака Несвіч, правы прыток Ніжняй Брагінкі, даўжынёй 37 км, працякае па раўніннай тэрыторыі, рэчышча мае шырыню 7—12 м, каналізаванае, пойма забалочаная. Рака Брагінка да пабудовы Кіеўскага вадасховішча ўпадала ў Прыпяць. У сучасны момант нясе свае воды ў Кіеўскае вадасховішча. Падзяляецца на тры самастойныя аб'екты: Брагінка Верхняя, Брагінка Сярэдняя, Брагінка Ніжняя. Рэжым Брагінкі вывучаўся каля вёсак Чыкалавічы, Ладыжычы. Расход вады ў вусці складае — 3 м³/с, пойма лугавая забалочаная, рэчышча каналізаванае. Акрамя рэк і рачулак значнае месца ў гідралагічнай ролі запаведніка выконваюць каналы. Найбольшыя з іх — Грубчанскі, Кажушкоўскі, Паганянскі, якія злучаюць асушальнай сеткай балоты Брагінскае, Грубча, Камарынскае, Паганянскае, Стралічава і інш.

Глебы запаведніка ў асноўным дзярнова-падзолістыя, дзярнова-падзолістыя аглееныя знізу, на водна-ледніковых і старажытна-алювіяльных пясках, палева-падзолістыя, месцамі змытыя, на лёсах і лёсападобных суглінках і супесках, у далінах ракі Прыпяць — поймавыя (алювіяльныя), на паніжэннях і балотах — тарфяна-балотныя. Каля 20 % зямель асушана. Зняцце антрапагенавай нагрузкі з 1986 г. у многіх месцах прыводзіць да паўторнага забалочвання.

Па геабатанічным раянаванні запаведнік адносіцца да Палеска-Прыдняпроўскай акругі падзоны шыракалістахваёвых лясоў. Лясістасць складае 38,2 %, пакрытая лесам плошча больш за 82 тыс. га. Асноўную плошчу займаюць хваёвыя — 56,1 %, бярозавыя — 25,72, чорнаальховыя — 12,8, дубовыя — 4,3 % лясы. Былыя сельска-

гаспадарчыя землі займаюць 36 % плошчы. Выяўлена 28 відаў дрэў, 32 віды хмызнякоў, 378 відаў травяністых мнагалетнікаў, 89 відаў адналетнікаў і г. д. У міжрэччы Віці і Брагінкі сустракаюцца чорнаальшаннікі асаковыя і крапіўныя. Часткова грабавыя дубровы замянілі кіслічна-сніткавыя беразнякі і асіннікі. У пойме Прыпяці ў асноўным асаковыя і злакавыя лугі з зараснікамі вярбы, крушыны ломкай, вольхі, рабіны і інш.

На тэрыторыі запаведніка багатая і разнастайная фауна, якая налічвае больш за 40 відаў млекакормячых, 239 — птушак, 25 — рыб. Па папярэдніх даных, больш за 40 відаў прадстаўнікоў фауны занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Пачынаючы з 1990 г. у запаведніку рэгулярна праводзіцца ўлік птушак. У лясных фармацыях знаходзяцца 62 віды, каляводных — 31, дрэвава-хмызняковых — 25, каляводных балотных — 18 відаў і г. д.

З 1991 г. у запаведніку адзначаецца рысь, а ў 1996 г. з нацыянальнага парку «Белавежская пушча» былі завезены 19 зуброў. Па даных уліку адзначана: калі ў 1996 г. было ўлічана 9 рысяў, то ў 1999 г.— 12, ласёў адпаведна 698 і 910, дзікоў — 1232 і 2200, казуляў — 947 і 1800, янотападобнай сабакі — 315 і 370, выдры — 66 і 80, баброў — 152 і 1100 і г. д. Кожны год здабываецца не менш як 70—90 ваўкоў, а таксама іншых прадстаўнікоў фауны запаведніка з мэтай іх вывучэння, а таксама прасочваецца колькасць назапашвання радыеактыўных рэчываў у арганізмах жывёл.

У залежнасці ад назапашвання цэзію-137 у глебе тэрыторыя запаведніка падзелена на 5 зон — ад 555 да 29 600 кБк/м^2, або ад 15 да 800 Ku/км^2. Найбольш забруджаныя ўчасткі знаходзяцца ў 10-кіламетровай зоне. Радыяцыйная абстаноўка на тэрыторыі запаведніка застаецца вельмі складанай і ў бліжэйшыя гады не зменіцца. Патрабуецца больш даскапалае вывучэнне праблем прыроднага комплексу запаведніка з мэтай іх захавання і вывучэння ўмоў трансфармацыі радыенуклідаў у раслінасці і жывёльным свеце. Пражыванне людзей у зоне эвакуацыі немагчыма нават у бліжэйшыя 50—100 гадоў.

Л. А. Лісоўскі

Брагінскі метэарыт

Неяк супрацоўнікі Беларускага навукова-даследчага геолагаразведачнага інстытута атрымалі пасылку. Прыйшла яна ад Сяргея Цеслянка з в. Капоранка, што на Брагіншчыне. Там былі кавалачкі пароды і запіска. Аўтар паведамляў, што знойдзены камень, падобны на метэарыт, прасіў спецыялістаў даследаваць узоры і даць тлумачэнне.

Кіраўніцтва інстытута паслала мяне ў камандзіроўку ў Капоранку. Знаходка ўсё яшчэ была ў хаце Цеслянка. У той жа дзень мы з гаспадаром выехалі на месца, дзе быў знойдзены незвычайны камень. Яно аказалася прыкладна за кіламетр ад вёскі Людзвінова. Там была пасеяна грэчка.

Перад сяўбой грэчкі Сяргей Цеслянок рабіў культывацыю поля. І раптам убачыў на раллі нейкі прадмет. Спыніў трактар, падышоў бліжэй. Няўжо камяк зямлі? Пхнуў нагой. Не, хутчэй камень. Але як ён апынуўся тут?

Паспрабаваў рукой зрушыць. Дзе там, быццам у зямлю ўрос! Тады абхапіў яго абедзвюма рукамі і ледзь падняў. Што за дзіва такое? Ён узяў малаток і пачаў ціхенька пастукваць. Разам з глебай сталі адсыпацца рыжыя ржавыя камякі, а пад імі заблішчэў метал.

Малады механізатар яшчэ не так даўно вучыўся ў школе, вывучаў астраномію. Неяк настаўнік расказваў, што на невялікай тэрыторыі ў Брагінскім раёне даўным-даўно выпаў метэарытны дождж. Першыя метэарыты былі тут знойдзены яшчэ ў 1809—1810 гадах. У школе да гэтага часу памяталі падзею, калі мясцовыя жыхары — таксама трактарыст М. К. Федасеенка і яго

дачка-школьніца — у 1968 годзе перадалі ў інстытут метэарыт. Дарэчы, ён быў знойдзены тут жа, за якія-небудзь пяцьсот метраў. А раптам і гэты? Трэба праверыць.

У канцы працоўнага дня Сяргей паклаў знаходку ў кабіну трактара і паехаў да Федасеенкі. У яго ён узяў адрас, па якім той калісьці адсылаў знойдзены метэарыт. Потым паслаў у інстытут некалькі невялікіх кавалачкаў.

У лабараторыях інстытута былі праведзены адпаведныя аналізы. Устаноўлена, што знойдзены экземпляр — несумненна метэарыт.

Агульная вага знаходкі — 24,1 кілаграма. Каркас яго ў асноўным з нікелістага жалеза. Па ўсіх прыкметах ён з'яўляецца часткай Брагінскага метэарыта. Знойдзены чарговы, дваццаты па ліку яго асколак.

Чым жа цікавы метэарыт «Брагін»? Перш за ўсё ён адносіцца да даволі рэдкага тыпу жалезакаменных метэарытаў — да паласітаў. Агульная вага яго выпадкова знойдзеных кавалкаў дасягае 242,6 кілаграма.

Вывучэнне гісторыі гэтага метэарыта паказвае, што не менш як 7 знаходак агульнай вагой 700 кілаграмаў страчаны або да гэтага часу невядомыя. Хоць першыя экземпляры былі знойдзены ў 1809 годзе, на жаль, дакладны час падзення яго не вызначаны. ...Мяркуецца, што калісьці тут выпаў грандыёзны метэарытны дождж. Але знойдзены далёка не ўсе яго асколкі. Як правіла, іх знаходзяць у час ворыва, капання равоў, калодзежаў і г. д. Не выключэнне, што знаходка Сяргея Цеслянка далёка не апошняя. Многае маглі б даць спецыяльныя пошукі з дапамогай адпаведных прыбораў. Аднак гэта справа будучага.

У зоне падзення метэарыта «Брагін» здараецца нямала загадкавых з'яў, якія нараджаюць шматлікія легенды. Так, у ваколіцах вёскі Капоранка ёсць месца, на якім даволі часта гіне ад маланак жывёла, якая пасвіцца тут. Цікава, што зямля навокал роўная, забалочаная, паблізу няма ні дрэў, ні слупоў. Словам, быццам бы адсутнічаюць знешнія прычыны для прыцягнення навальнічных разрадаў. Кажуць, што ў час вайны дзесьці тут нібыта былі прыхаваны боепрыпасы, вось маланкі і б'юць у метал. Аднак гэта думка здаецца памылковай, бо тутэйшая вёска знаходзіцца ў баку ад ажыўленых дарог, ніякіх значных баёў у гады вайны тут не здарылася. А ці не ляжыць дзесьці на глыбіні жалезакаменны метэарыт, які і прыцягвае навальнічныя разрады?

Многіх, напэўна, зацікавіць, а што ж гэта за з'ява такая, метэарытны дождж? Як паказалі даследаванні, падобныя «дажджы» выпадаюць у кожным асобным выпадку на нязначных плошчах (каля 235 квадратных кіламетраў і менш). Гэта здараецца ў выніку драблення ў зямной атмасферы буйных метэарытаў. Эліпс рассеяння метэарытнага дажджу «Брагін» складае па вялікай восі з паўднёвага ўсходу на паўночны захад 22 кіламетры, а па кароткай — каля 4-х кіламетраў.

Г. Емяльянаў,
кандыдат геолагамінералагічных навук

Голас Радзімы. 1983. 7 лют.

З гісторыі населеных пунктаў

БРАГІН, гарадскі пасёлак, цэнтр раёна. Размешчаны на р. Брагінка (прыток Дняпра), за 130 км на паўднёвы захад ад Гомеля, 28 км ад чыгуначнай станцыі Хойнікі. Аўтамабільнымі дарогамі звязаны з Камарыном, Лоевам, Рэчыцай і Хойнікамі. Назва ўтворана ад наймення ракі.

Брагін упершыню ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе ў 1147 г. як горад, які ўваходзіў у склад Кіеўскага княства. У 1189 г. горад уключаны ў склад Суздальскага княства.

У XIV ст. Брагін у складзе Вялікага княства Літоўскага, дзе спачатку з'яўляўся дзяржаўнай уласнасцю. У 1511 г. ён атрымаў ад вялікага князя грамату, якая забяспечвала правы гараджанам і давала ім розныя льготы.

У 1569 г. горад увайшоў у склад Рэчы Паспа-

літай. З канца XVI ст. ён стаў уласнасцю князёў Вішнявецкіх.

Насельніцтва Брагіна актыўна ўдзельнічала ў вызваленчай вайне ўкраінскага і беларускага народаў 1648—1654 гг. У выніку гэтай вайны брагінскі замак быў разбураны, горад заняпаў. У пачатку XVIII ст. Брагін стаў уласнасцю князёў Ракіцкіх.

У выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) далучаны да Расійскай імперыі, мястэчка, цэнтр воласці Рэчыцкага павета Мінскай губерні. У пачатку XIX ст. уласнасць памешчыкаў Ракіцкіх. На 1816 г. было 217 двароў, больш за 740 жыхароў.

У 1829 г. у мястэчку адбылося 2 кірмашы, працягласць кожнага з іх ад 3 да 4 дзён.

У 1863 г. тут адкрыта народнае вучылішча.

Паводле царкоўных звестак, у 1879 г. у Брагіне было 2 прыходскія праваслаўныя царквы: Мікалаеўская, пабудаваная ў 1743 г., і Багародзіцкая, узведзеная ў 1790 г. Большасць вернікаў абодвух прыходаў (каля 3,8 тыс. чалавек) адносілася да сялянскага саслоўя, займалася земляробствам і рознымі промысламі — ткацтвам, шорным, сталярным, шавецкім, кравецкім, кузнечным, мельніцтвам і інш.

У 1886 г. у мястэчку мелася 286 двароў, насельніцтва — 1374 чалавекі. Працавалі валасное праўленне, 3 праваслаўныя царквы, сінагога, народнае вучылішча, 3 ветраныя і 6 конных млыноў, 50 дробных крам.

Паводле перапісу 1897 г., 4,3 тыс. жыхароў. Насельніцтва Брагіна прымала ўдзел у рэвалюцыі 1905—1907 гг. К 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 387, а жыхароў было 3902. У 1913 г. тут працавалі паштова-тэлеграфнае аддзяленне, 2 народныя вучылішчы (для хлопчыкаў і дзяўчынак), царкоўнапрыходская школа.

У лістападзе 1917 г. тут устаноўлена Савецкая ўлада. У лютым — снежні 1918 г. Брагін быў акупіраваны нямецкімі войскамі. Супраць акупантаў у Брагінскай воласці дзейнічалі партызанскія атрады.

З 8.12.1926 г. цэнтр раёна Рэчыцкай акругі, з 1927 да 1930 г.— Гомельскай акругі. У пачатку 1930-х гг. працавалі: маслазавод, квасільны пункт, маслабойка, паравы і ветраны млыны, суконавалка, кравецкая і шавецкая майстэрні, сталмашня, кузня, калгас «3-ці рашаючы». З 27.9.1938 г. гарадскі пасёлак Палескай вобласці. У 1939 г. у Брагіне было 4,7 тыс. жыхароў.

У Вялікую Айчынную вайну з 28.8.1941 г. да 23.11.1943 г. акупіраваны нямецкімі фашыстамі. Супраць акупантаў дзейнічалі на тэрыторыі раёна Брагінскія падпольныя райкамы КП(б)Б і ЛКСМБ, антыфашысцкае падполле, партызаны асобных атрадаў імя Катоўскага і імя Варашылава, Лоеўскай брыгады «За Радзіму», Чарнігаўскага партызанскага злучэння і інш.

Брагін быў вызвалены ад гітлераўцаў 23.11.1943 г. 55-й стралковай дывізіяй 61-й арміі Беларускага фронту. У вызваленні райцэнтра ўдзельнічалі партызаны асобнага атрада імя Катоўскага.

З 8.1.1954 г. Брагін у складзе Гомельскай вобласці. Цяпер знаходзіцца ў зоне ўплыву катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Яго насельніцтва зменшылася з 5,6 тыс. чалавек у 1985 г. да 2 тыс. жыхароў у 1995 г.

У 2002 г. тут было 3637 жыхароў. У Брагіне працуюць: масласырзавод, хлебазавод, камбінат бытавога абслугоўвання, раённы вузел сувязі, тэлерэтранслятар, раённае аб'яднанне «Сельгастэхніка». Дзейнічаюць таксама сярэдняя школа, 2 бібліятэкі (адна дзіцячая, другая для дарослых), Дом культуры, паліклініка, бальніца, аптэка, Дом дзіцячай творчасці, гасцініца, 3 дзіцячыя сады-яслі, краязнаўчы музей і карцінная галерэя, шэраг магазінаў. Выдаецца газета «Маяк Палесся».

Радзіма беларускага вучонага В. Р. Скараход, беларускіх мастакоў А. Я. Грэся і Я. Г. Панамарэнкі.

АЛЯКСАНДРАЎКА, вёска ў Новаялчанскім сельсавеце, у саўгасе «Краснае». Назва, мабыць, ад прозвішча Аляксандраў.

У пачатку XX ст. упамінаецца як хутар у Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета. У 1909 г. у ім было 30 двароў, 146 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 35 гаспадарак, 186 жыхароў. У гэты час многія жыхары вёскі мелі прозвішчы Астапенка, Асядач, Каленчанка.

У 2002 г. 10 двароў, 15 жыхароў.

АСАРЭВІЧЫ, вёска на р. Дняпр, цэнтр сельсавета і калгаса імя Фрунзе. Назва ўтворана ад прозвішча Асарэвіч.

Па пісьмовых крыніцах вядома з канца XVIII ст. як вёска Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыка, графа Іосіфа Юдзіцкага. У 1795 г. мелася 39 гаспадарак, 113 душ мужчынскага і 114 душ жаночага полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Хракавіцкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 88 двароў, насельніцтва 608 чалавек, працавалі школа царкоўнай граматы, хлебазапасны магазін, пітная ўстанова, 2 дробныя лаўкі.

У 1909 г. у вёсцы было 85 двароў, 592 жыхары. Галоўным заняткам насельніцтва з'яўляліся земляробства і жывёлагадоўля, якія спалучаліся з рознымі традыцыйнымі промысламі — ткацтвам, прадзеннем, пляценнем кошыкаў, зборам дароў прыроды (грыбоў, ягад, арэхаў, лекавых траў), лоўляй рыбы і ракаў. Некаторыя жыхары наймаліся да памешчыкаў і прамыслоўцаў рубіць лес, траляваць яго на конях і сплаўляць па рэках. Нястача і галеча вымушалі сялян займацца гэтай цяжкай справай. Паблізу вёскі быў аднайменны маёнтак, 1 гаспадарка, 12 жыхароў.

Паводле перапісу 1926 г., Асарэвічы ўяўлялі сабой вялікае і шматлюднае сяло, у якім налічвалася 191 гаспадарка, 1024 жыхары. У гэты час шматлікія жыхары мелі прозвішчы Бельчанка, Заяц, Канцавы (Канцавая). З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. тут створаны калгас «Чырвоны

барацьбіт». Працавалі кузня, паравы і ветраны млыны. Са жніўня 1941 г. да лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі. У 1969 г. 433 двары, больш за 1,4 тыс. жыхароў.

У 2002 г. у вёсцы было 187 двароў, 411 жыхароў. Працуюць рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, Дом культуры, бібліятэка, сярэдняя школа, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін. Ёсць старадаўні парк.

Радзіма беларускага вучонага Д. І. Шыраканава.

АСІННІК, хутар у Новаялчанскім сельсавеце, у саўгасе «Краснае». Назва ўтворана ад асінавага ўрочышча, дзе ўзнікла паселішча. Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У 1991 г. перастаў існаваць.

АСТРАГЛЯДЫ, вёска, да 1986 г. былы цэнтр сельсавета і саўгаса «Астрагляды». Назва ад прозвішча Астраглядаў.

Вядома з XVIII ст. як сяло пад назвай Астраглядавічы. Уваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай. Згодна царкоўных звестак, у 1779 г. тут пабудавана Троіцкая царква з дрэва. З 1793 г. у складзе Расіі, сяло Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета Мінскай губерні. З'яўлялася вотчыннай уласнасцю князёў Вішнявецкіх.

У 1863 г. у сяле адкрыта народнае вучылішча, якое знаходзілася ў грамадскім будынку, утрымлівалася за кошт дзяржаўнай казны і мясцовай грамады.

На 1886 г. 71 двор, 403 жыхары. Працавалі праваслаўная і каталіцкая цэрквы, народнае вучылішча (46 вучняў). Паводле перапісу 1897 г., 123 двары, насельніцтва 720 чалавек, працавалі праваслаўная царква, каталіцкі касцёл, часоўня, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, ветраны млын, пітная ўстанова.

Асноўным заняткам насельніцтва з'яўляліся земляробства і жывёлагадоўля, якія спалучаліся з рознымі хатнімі промысламі — прадзівам, ткацтвам, зборам дароў прыроды і інш.

К 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 130, а насельніцтва — да 806 чалавек. Паблізу сяла знаходзіўся маёнтак Астрагляды, 2 гаспадаркі, 26 жыхароў.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі тут створаны саўгас «Астрагляды». Паводле перапісу 1926 г., 160 гаспадарак, 796 жыхароў. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета. У пачатку 1930-х гг. працавалі саўгас «Астрагляды», калгас імя Варашылава, 2 стальмашні, 2 кузні, цыркулярка, ветраны млын. У 1930-я гг. сяло пераўтворана ў вёску.

У 1969 г. у вёсцы было 400 гаспадарак, насельніцтва — 1320 чалавек. Працавалі майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, сярэдняя школа, клуб, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, дзіцячыя яслі-сад.

1.9.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы І. Д. Сіража, дзяржаўнага дзеяча і беларускага пісьменніка В. П. Станкевіча (Палескага).

БАБКА, прыстань на р. Дняпр у Малажынскім сельсавеце. Вядома з пачатку XX ст., адносілася да Дзяражыцкай воласці Рэчыцкага павета. У 1909 г. было 3 двары, 5 жыхароў.

БАГУШЫ, вёска ў саўгасе «Астрагляды» Астраглядаўскага сельсавета. Лічаць, што назва дадзена ад прозвішча Богуш.

У канцы XIX — пачатку XX стст. паселішча вядома як вёска ў складзе Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета. Паводле перапісу 1897 г., 106 двароў, 755 жыхароў, працавалі часоўня, царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін. У 1909 г. 128 двароў, 684 жыхары.

Паводле перапісу 1926 г., 127 гаспадарак, 689 жыхароў. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета. Да 1933 г. створаны калгас імя Будзённага. Працавала кузня.

Са жніўня 1941 г. да 24 лістапада 1943 г. Багушы былі акупіраваны нямецкімі фашыстамі.

6.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

БАЙДАКІ, вёска ў Мікуліцкім сельсавеце. Вядома з пачатку XIX ст. як хутар Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў Ракіцкіх. У 1816 г. было 13 гаспадарак, 53 душы мужчынскага і 41 душа жаночага полаў.

Згодна перапісу 1926 г., вёска, 31 гаспадарка, 123 жыхары. Да 1933 г. створаны калгас «Чырвоны лістапад».

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны 31 гаспадарка, насельніцтва — 123 чалавекі. У верасні 1943 г. спалена нямецкімі фашыстамі.

Пасля вайны не адноўлена.

БАЙДАКІ, хутар у Мікуліцкім сельсавеце. У 1968 г. зняты з уліку, паколькі выбылі апошнія жыхары.

БАКУНЫ, вёска ў Астраглядаўскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоная ніва». Назва дадзена ад прозвішча Бакун.

У XIX — пачатку XX стст. вёска Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыка, графа Міхаіла Ракіцкага. У 1816 г. было 17 двароў, каля 50 рэвізскіх душ абодвух полаў. Паводле перапісу 1897 г., 46 двароў, 276 жыхароў.

Да 1909 г. колькасць двароў вырасла да 118, насельніцтва — да 291 чалавека. Паводле перапісу 1926 г., 78 гаспадарак, 446 жыхароў. Матэрыялы перапісу сведчаць, што ў гэты час тут жылі Каваленкі, Каробкіны, Кулаі, Новікі, Савянкі, Смальцары і інш.

У пачатку 1930-х гг. у вёсцы створаны калгас «Чырвоны працаўнік», працавала кузня.

У 2002 г. было 69 двароў, 132 жыхары.

БЕРАСНЁЎКА, вёска ў Малажынскім сельсавеце, у калгасе «Першамайск». Назва, магчыма, ад прозвішча Бераснёў.

Вядома з канца XVIII ст. як вёска Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыка, графа Іосіфа

Юдзіцкага. У 1795 г. было 12 двароў, каля 70 рэвізскіх душ абодвух полаў. Паводле перапісу 1897 г., 57 двароў, 404 жыхары, пітны дом.

У 1909 г. вёска ў Дзяражыцкай воласці таго ж павета, 86 двароў, насельніцтва 602 чалавекі. Паводле перапісу 1926 г., 106 гаспадарак, 587 жыхароў. У гэты час найбольш распаўсюджанымі былі тут прозвішчы Корань, Новік, Плюшчай, Філон.

З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета. Да 1933 г. створаны калгасы «Бераснёўка» і «Чырвоны партызан» № 3. Працавалі 2 кузні.

У 2002 г. было 70 двароў, 138 жыхароў.

БРАЦКІ, пасёлак у Чамярыскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет». Вядомы па рукапісных крыніцах з 1920-х гг. Згодна перапісу 1926 г., пасёлак Брацкі, 18 гаспадарак, 91 жыхар.

У 1988 г. перастаў існаваць.

БУРКІ, вёска ў Астраглядаўскім сельсавеце, цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоная ніва». Расказваюць, што назва ўтворана ад прозвішча Бурко.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў Ракіцкіх. У 1816 г. было 37 гаспадарак, 124 душы абодвух полаў. Паводле перапісу 1897 г., 104 двары, насельніцтва 661 чалавек, працавалі кузня, 2 ветраныя млыны і царкоўнаприходская школа.

Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 123, а насельніцтва — да 721 чалавека. Па перапісе 1926 г., Буркі таксама ўяўлялі вялікую і шматлюдную вёску, у якой мелася 133 гаспадаркі, 687 жыхароў. У гэты час найбольш распаўсюджаны былі тут прозвішчы Раманюк і Шкурко.

З 8.12.1926 г. да 26.11.1959 г. вёска з'яўлялася цэнтрам сельсавета. У пачатку 1930-х гг. працавалі калгас «Чырвоная ніва», кузня, стальмашня, 2 вадзяныя млыны. У 1970 г. было 221 гаспадарка, 798 жыхароў. З 1986 г. — цэнтр Астраглядаўскага сельсавета.

У 2002 г. 148 двароў, 403 жыхары.

Тут дзейнічаюць ветэрынарны пункт, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, магазін, клуб, бібліятэка, сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы Т. І. Шкурко.

БЯРОЗКІ, вёска ў саўгасе «Красная» Новаялчанскага сельсавета. Расказваюць, што паселішча было заснавана ў маладым бярозавым гаі. Адсюль і такая назва.

Па рукапісных дакументах вядома з пачатку XIX ст. як вёска ў Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. было 59 гаспадарак, 126 душ мужчынскага і 113 душ жаночага полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Ялчанскага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 87 двароў, насельніцтва 618 чалавек.

На 1909 г. тут мелася 77 двароў, 635 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., 203 гаспадаркі, насельніцтва 939 чалавек. Да 1933 г. створаны калгас «Дняпроўскі араты». Працавалі ветраны млын і кузня. З 1986 г. цэнтр Астраглядаўскага сельсавета.

У 2002 г. было 99 двароў, 162 жыхары.

ВАЛАХОЎШЧЫНА, вёска ў Спярыжскім сельсавеце, у калгасе «Запаветы Леніна».

Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX стст. як вёска Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графаў Ракіцкіх. У 1816 г. 10 гаспадарак, каля 50 рэвізскіх душ абодвух полаў.

У 1909 г. 25 двароў, каля 230 жыхароў. Згодна перапісу 1926 г., 38 гаспадарак, насельніцтва 219 чалавек. Да 1933 г. тут створаны калгас імя Шаўчэнкі. Працавала кузня.

У 2002 г. было 22 двары, 36 жыхароў.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы І. Ц. Мартыненкі.

ВАРАЎШЧЫНА, пасёлак у Малажынскім сельсавеце.

Па пісьмовых крыніцах вядомы з 1920-х гг. Згодна перапісу 1926 г., пасёлак, 10 гаспадарак, 46 жыхароў.

Не існуе, жыхары пераехалі ў 1939 г. у суседнюю вёску Малажын.

ВАСХОД, вёска ў Малейкаўскім сельсавеце.

Заснавана пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі як пасёлак. Па перапісе 1926 г., 17 гаспадарак, 90 жыхароў. Пазней пасёлак пераўтвораны ў вёску.

Далучана да суседняй вёскі Малейкі і ў сувязі з гэтым 25 лістапада 1962 г. знята з уліку.

ВЕЛІМАЎ (ВЕЛЬЯМОЎ), вёска ў былым Калыбанскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях».

Упамінаецца ў пачатку XX ст. як хутар у Савіцкай воласці Рэчыцкага павета. У 1909 г. у ім было 18 двароў, 90 жыхароў. Згодна перапісу 1926 г., вёска, 29 гаспадарак, 182 жыхары. У матэрыялах перапісу часта сустракаюцца прозвішчы Багаценка, Бандарэнка, Волкаў, Уласаў (Уласава).

Перад Вялікай Айчыннай вайной мелася 46 гаспадарак, 180 жыхароў.

Са жніўня 1941 г. да 22 лістапада 1943 г. была акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія ў чэрвені 1943 г. спалілі яе і загубілі 20 вяскоўцаў.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ВЕРХНІЯ ЖАРЫ, вёска, цэнтр Верхнежараўскага сельсавета і калгаса «Ніжні дняпровец», на заходнім беразе Кіеўскага вадасховішча.

Па пісьмовых крыніцах паселішча вядома з XVIII ст. як сяло Жары ў складзе Рэчы Паспалітай. Назва паходзіць ад прозвішча Жараў. У 1744 г. пабудавана Успенская царква з дрэва.

Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Расійскай імперыі, сяло Жары ці Вышнія Жары, цэнтр праваслаўнага прыхода Ялчанскай

воласці Рэчыцкага павета, вотчыннае ўладанне памешчыкаў Горватаў. У 1844 г. у сяле было больш за 50 двароў. Побач з сялом знаходзіўся маёнтак Жары, у склад якога ўваходзіла сяло.

Паводле царкоўных звестак 1879 г., царкоўны прыход налічваў 825 душ прыхаджан мужчынскага і 849 душ жаночага полаў. Амаль усе яны адносіліся да сялянскага саслоўя, займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй, якія спалучаліся з рыбнай лоўляй, зборам дароў прыроды (ягад, грыбоў, арэхаў, лекавых траў) і іншымі хатнімі промысламі. Некаторыя сяляне займаліся да прамыслоўцаў і памешчыкаў пілаваць, траляваць лес, вязаць плыты і гнаць іх па рэках.

Згодна інвентара 1844 г., у Вышніх Жарах мелася больш за 50 двароў. У 1886 г. у сяле было 53 двары, 359 жыхароў, дзейнічалі праваслаўная царква, паркетная фабрыка, вінакурны завод, конны млын. Паводле перапісу 1897 г., 110 двароў, насельніцтва 695 чалавек, працавалі царкоўнапрыходская школа, амбар хлебазапаснога магазіна, лаўка, пітная ўстанова. Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 81, а насельніцтва — да 697 чалавек.

Паводле перапісу 1926 г., сяло Верхнія Жары, 202 гаспадаркі, каля 1 тыс. жыхароў. З 8.12.1926 г. цэнтр Верхнежараўскага сельсавета. У 1929 г. тут створаны калгас «Рухавік рэвалюцыі». Працавалі ваўначоска, ветраны млын, кузня, цагельня.

У 1970 г. 207 гаспадарак, 554 жыхары.

У 2002 г. 116 двароў, 261 жыхар. Ёсць рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, базавая школа, магазін.

ВУГЛЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса імя Энгельса, каля р. Брагінка (2 км). Назва дадзена па прыкметах мясцовасці (мела форму вугла), на якой заснавана паселішча.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыка, графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. тут было 20 двароў, 35 душ мужчынскага і 44 душы жаночага полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Сялецкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 48 двароў, 320 жыхароў, дзейнічалі царкоўнапрыходская школа, ветраны млын, хлебазапасны магазін. У 1909 г. тут было 50 двароў, 342 жыхары.

Побач з земляробствам і жывёлагадоўляй, якія з'яўляліся асноўным заняткам жыхароў, у жыцці насельніцтва вялікае значэнне мелі промыслы — збор дароў прыроды, лоўля рыбы, ракаў, ткацтва, пляценне кошыкаў, сплаў лесу і інш.

Згодна перапісу 1926 г., 85 гаспадарак, насельніцтва 452 чалавекі. Як сведчаць матэрыялы перапісу, у гэты час тут жыло шмат людзей з прозвішчамі Дзегцярэнка, Лявоненка, Федарэнка, Хадасок, Шубянок. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. створаны калгас «Чырвоная дуброва». Працавала кузня.

Са жніўня 1941 г. да 22 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія спалілі вёску і загубілі 56 яе жыхароў.

У 1970 г. было 107 двароў, 329 жыхароў.

На 2002 г. 89 двароў, насельніцтва 273 чалавекі. Тут працуюць рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, магазін.

Радзіма дзяржаўнага дзеяча М. І. Дзяльца.

ВЫГРАБНАЯ СЛАБАДА, вёска, цэнтр былога Слабадскога сельсавета і саўгаса «Слабадскі».

Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Грушнянскага праваслаўнага прыхода Савіцкай воласці Рэчыцкага павета. Паводле перапісу 1897 г., 33 двары, 168 жыхароў, дзейнічала капліца.

Паводле перапісу 1926 г., 52 гаспадаркі, насельніцтва 263 чалавекі. У 1929 г. створаны калгас «Выграбная Слабада», працавалі ветраны млын і кузня.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны было 73 двары, 274 жыхары. У маі 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 30 яе жыхароў.

Падчас вайны ў наваколлі вёскі дзейнічалі супраць акупантаў партызаны асобнага атрада імя Катоўскага Палескага партызанскага злучэння.

У 1970 г. 73 двары, 274 жыхары. Былі рамонтна-механічныя майстэрні, магазін, ветэрынарны пункт, васьмігадовая школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт.

3.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ВЯЗОК, вёска ў Астраглядаўскім сельсавеце, у саўгасе «Астрагляды».

Вядома ў канцы XIX — пачатку XX стст. як вёска ў Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета. Паводле перапісу 1897 г., 55 двароў, 361 жыхар, дзейнічалі часоўня і ветраны млын. У 1909 г. тут было 60 двароў, каля 450 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., 91 гаспадарка, 486 жыхароў. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. створаны калгас «Прабуджэнне». Працавалі кузня, конная крупадзёрка, ветраны млын.

У сакавіку 1990 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ВЯЛІКІ ЛЕС, вёска ў Мікуліцкім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». Заснавана сярод лесу, які называўся Вялікі Лес. Гэтым і тлумачыцца назва паселішча.

Па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку XIX ст. як вёска ў Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета, з'яўлялася ўласнасцю памешчыкаў Рага павета. У 1816 г. тут было 17 гаспадарак, 29 душ мужчынскага і 39 душ жаночага полаў. Адносілася да Мікуліцкага праваслаўнага прыхода.

У пачатку XX ст. 49 двароў, 144 жыхары. Да 1933 г. тут створаны калгас «Чырвонае поле». Працавалі ветраны млын і кузня.

У 2002 г. мелася 8 двароў, 12 жыхароў.

ВЯЛІКІ ЛЕС, хутар у Асарэвіцкім сельсавеце. Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Па перапісе 1926 г., 4 гаспадаркі, 17 жыхароў. У 1939 г. сселены ў суседнія вёскі.

ВЯЛЛЕ, вёска ў Асарэвіцкім сельсавеце, у калгасе імя Фрунзе.

Вядома з канца XVIII ст. як вёска Рэчыцкага павета, належала памешчыкам Юдзіцкім. У 1795 г. было 13 двароў, 25 душ мужчынскага і 27 душ жаночага полаў.

У канцы XIX — пачатку XX стст. вёска ў Ялчанскай воласці і праваслаўным прыходзе Рэчыцкага павета. На пачатку XX ст. 26 двароў, 132 жыхары. Да 1926 г. колькасць двароў павялічылася да 50, а насельніцтва — да 254 чалавек. У гэты час тут жыло шмат жыхароў, якія мелі прозвішчы Даўжанок і Катлубай.

У 2002 г. мелася 41 двор, 66 жыхароў.

ВЯРХОВАЯ СЛАБАДА, вёска ў былым Слабадскім сельсавеце, у саўгасе «Слабадскі».

Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Грушнянскага праваслаўнага прыхода Савіцкай воласці Рэчыцкага павета. Паводле перапісу 1926 г., 55 гаспадарак, 317 жыхароў.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны 65 гаспадарак, насельніцтва 265 чалавек. У маі 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і загубілі 29 яе жыхароў.

3.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ГАЛКІ, вёска ў Асарэвіцкім сельсавеце, у калгасе імя Фрунзе, пры Дняпры.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графаў Ракіцкіх. У 1816 г. 26 гаспадарак, 126 душ абодвух полаў.

Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Ялчанскага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 35 двароў, 250 жыхароў, працаваў пітны двор. У 1909 г. тут было 50 двароў, 234 жыхары.

Асноўным заняткам насельніцтва з'яўляліся земляробства і жывёлагадоўля. Для вёскі ўласцівы былі таксама промыслы — збор дароў прыроды, лоўля рыбы і ракаў, дрэваапрацоўчыя, кавальскія. Некаторыя жыхары сплаўлялі лес па рэках па найме памешчыкаў і прамыслоўцаў.

Паводле перапісу 1926 г., 87 гаспадарак, насельніцтва складала 437 чалавек. Як сведчаць матэрыялы перапісу, шмат жыхароў мелі прозвішчы Даўжанок, Дзмітрэнка, Пархамец.

Перад Вялікай Айчыннай вайной тут мелася 106 гаспадарак, 318 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 18 яе жыхароў.

У 2002 г. было 62 двары, 118 жыхароў. Працуе магазін.

ГАЛУБОЎКА, вёска ў Новаялчанскім сельсавеце, у саўгасе «Краснае». Вядома з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., 20 гаспадарак, 85 жыхароў.

4.5.1986 г. вёска часткова адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

У 2002 г. 57 двароў, 94 жыхары.

ГАРАДЗІШЧА, вёска ў калгасе імя Тэльмана Малейкаўскага сельсавета.

Па рукапісных крыніцах Гарадзішча вядома з пачатку XIX ст. як вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, якая з'яўлялася ўласнасцю графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. тут было 50 двароў. Паводле перапісу 1897 г., 28 двароў, 145 жыхароў, працавала лаўка; каля вёскі быў маёнтак Гарадзішча, 9 гаспадарак, 90 жыхароў, дзейнічалі вінакурны завод і ветраны млын.

У 1909 г. у вёсцы мелася 26 двароў, каля 230 жыхароў. Згодна перапісу 1926 г., 35 гаспадарак, насельніцтва — 142 чалавекі. У 1929 г. арганізаваны калгас «Чырвонае гарадзішча», працавала кузня.

У 2002 г. 31 двор, 94 жыхары.

Радзіма кавалера ордэна Працоўнай Славы трох ступеней С. У. Гермеля.

ГАРАДОК, вёска ў Крыўчанскім сельсавеце, у калгасе «Сцяг Леніна».

Вядома з 1920-х гг. як пасёлак. У 1926 г. у ім было 8 двароў, 44 жыхары. На 1933 г. вёска, працавалі калгас «Гарадок», кузня.

Зараз не існуе.

ГДЗЕНЬ, вёска, цэнтр былога сельсавета і калгаса «Чырвоная Украіна», на р. Брагінка і аўтамабільнай дарозе Камарын — Чарнобыль (Украіна). Верагодна, назва ўтворана ад тэрміна «гбен», які азначае паварот, выгіб ракі (паселішча каля выгібу ракі).

У XVI ст. вядома як вёска ў Вялікім княстве Літоўскім, царкоўная ўласнасць. З 1569 г. у складзе Рэчы Паспалітай. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) далучана да Расійскай імперыі, сяло ці вёска ў Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета. У 1844 г. было 52 гаспадаркі.

На 1886 г. сяло, 50 двароў, 381 жыхар, дзейнічала царква, якая была прыпісана да Жараўскага праваслаўнага прыхода. Бытавалі сплаўны, рыбалоўны, кавальскі і іншыя промыслы. Паводле перапісу 1897 г., таксама сяло, 70 двароў, насельніцтва 530 чалавек, дзейнічалі праваслаўная прыходская царква, школа царкоўнай граматы, лаўка, пітная ўстанова. Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 84, а насельніцтва — да 548 чалавек.

Паводле перапісу 1926 г., вялікая і шматлюдная вёска, у якой мелася 202 гаспадаркі, 1126 жыхароў. У гэты час тут жыло шмат людзей, якія мелі прозвішчы Атрошчанка, Мацапура, Шпетны (Шпетная), Шульга. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. створаны калгас «Чырвоная Украіна», працавалі кузня і паравы млын.

Са жніўня 1941 г. да лістапада 1943 г. вёска была акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія 14.1.1943 г. загубілі 10 чалавек.

У 1970 г. было 368 гаспадарак, больш за 1 тыс. жыхароў.

Тут былі рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, аўтаматычная тэлефонная станцыя. Дом культуры, бібліятэка, сярэдняя школа, 3 магазіны, майстэрня бытавога абслугоўвання.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

Радзіма Герояў Савецкага Саюза С. С. Мацапуры і П. І. Шпетнага.

ГЛУХАВІЧЫ, вёска, цэнтр былога Глухавіцкага сельсавета і калгаса імя Калініна, каля шашы Брагін — Камарын. Паводле легенды, калі паселішчу давалася назва, тут была глухая мясцовасць, аддаленая ад дарог, грамадскіх і культурных цэнтраў. Гэтым і тлумачыцца назва.

У XIX — пачатку XX стст. сяло, цэнтр праваслаўнага прыхода Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, вотчынная ўласнасць графаў Ракіцкіх. У 1816 г. 87 гаспадарак, 177 душ мужчынскага і 187 душ жаночага полаў.

Пераважная большасць насельніцтва адносілася да сялянскага саслоўя, займалася земляробствам, якое спалучалася з промысламі ткацтвам, зборам ягад, грыбоў, арэхаў, лекавых траў і інш.

У 1886 г. 89 двароў, 504 жыхары, працавалі царква і вінакурны завод. Паводле перапісу 1897 г., у сяле было 124 двары, насельніцтва 827 чалавек, дзейнічалі праваслаўная прыходская царква, царкоўнапрыходская школа, ветраны млын.

На 1909 г. Глухавічы ўяўлялі сабой вялікае і шматлюднае сяло, у якім быў 151 двор, 909 жыхароў. Паблізу сяла знаходзіўся аднайменны фальварак, 1 гаспадарка, 13 жыхароў. К 1926 г. колькасць двароў павялічылася да 173, а насельніцтва — да 952 чалавек. У гэты час тут жыло шмат людзей з прозвішчамі Петрушэнка. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. тут створаны калгасы «Узыходзячая зара» і імя Калініна. Працавалі 2 кузні, цыркулярка, паравы і ветраны млыны, конная крупадзёрка, цеставарачны завод (вырабляў яблычнае цеста). З 1938 г. — вёска.

Са жніўня 1941 г. да лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі.

У 1970 г. 268 гаспадарак, насельніцтва 906 чалавек.

Да кастрычніка 1986 г. працавалі рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, васьмігадовая школа, Дом культуры, бібліятэка, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, майстэрня бытавога абслугоўвання.

10.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

Радзіма беларускага вучонага М. М. Паўлючэнкі.

ГРОМКІ, пасёлак у Малажынскім сельсавеце, у калгасе «Першамайск».

Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Паводле перапісу 1926 г., хутар, 1 гаспадарка, 7 жыхароў. Перад Вялікай Айчыннай вайной пасёлак, 27 двароў, 121 жыхар. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі пасёлак і загубілі двух яго жыхароў.

У 2002 г. было 7 двароў, 12 жыхароў.

ГРУШНАЕ, вёска пры р. Брагінка ў Хракавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева.

Вядома з канца XVIII ст. У 1792 г. тут пабудавана Пакроўская праваслаўная царква з дрэва на каменным фундаменце. У XIX — пачатку XX стст. сяло, цэнтр праваслаўнага прыхода Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, належала графам Ракіцкім. У 1816 г. 24 гаспадаркі, 144 душы абодвух полаў. У асноўным жыхары адносіліся да сялянскага саслоўя, займаліся земляробствам, а таксама лоўляй рыбы, сплавам лесу і некаторымі іншымі промысламі.

У 1886 г. у сяле было 28 двароў, 189 жыхароў. Працавалі праваслаўная царква, конны млын. Паводле перапісу 1897 г., у сяле было 39 двароў, 256 жыхароў, працавалі праваслаўная прыходская царква і школа царкоўнай граматы. Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 58, а насельніцтва — да 376 чалавек.

Паводле перапісу 1926 г., Грушнае таксама ўяўляла сабой сяло, у якім мелася 109 двароў, 557 жыхароў. Шмат жыхароў мелі прозвішча Анапрэенка. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. створаны калгас «Вольны шлях». Працавалі ветраны млын і кузня.

У 2002 г. было 92 двары, 182 жыхары. Працуе магазін.

ДАБРАГОШЧА, пасёлак у Малажынскім сельсавеце, у калгасе «Першамайск».

Вядомы з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., у пасёлку было 20 гаспадарак, 127 жыхароў.

У 2002 г. 5 двароў, 11 жыхароў.

ДВОР-АСТРАГЛЯДЫ, вёска ў Астраглядаўскім сельсавеце. Далучана да суседняй вёскі Астрагляды і ў сувязі з гэтым 29.11.1962 г. знята з уліку.

ДВОР-ГАРАДЗІШЧА, вёска ў Малейкаўскім сельсавеце. 25.10.1934 г. перайменавана ў Тэльман.

ДВОР-ГЛУХАВІЧЫ, вёска ў Глухавіцкім сельсавеце. Далучана да суседняй вёскі Глухавічы і ў сувязі з гэтым 29.11.1962 г. была знята з уліку.

ДВОР-САВІЧЫ, вёска ў Хракавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева (з 1986 г.).

У канцы XIX — пачатку XX стст. паселішча ўяўляла сабой сядзібны маёнтак Савіцкай воласці Рэчыцкага павета. Паводле перапісу 1897 г. 3 двары, 41 жыхар, працаваў вінакурны завод. У 1909 г. тут быў 1 двор, 11 жыхароў. Пасля рэвалюцыі маёнтак перайтвораны ў вёску.

У 2002 г. было 37 двароў, 77 жыхароў.

ДЗЯМЕЕЎКА, пасёлак у Крыўчанскім сельсавеце, у калгасе «XVIII партз'езд».

Па пісьмовых крыніцах вядомы з 1930-х гг.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны тут было 24 гаспадаркі, 79 жыхароў. Падчас вайны ў верасні 1943 г. спалены нямецкімі фашыстамі.

Цяпер не існуе.

ДУБЛІН, вёска ў Спярыжскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Гагарына.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў Ракіцкіх. У 1816 г. 25 двароў, каля 130 душ абодвух полаў.

Паводле перапісу 1897 г., 71 двор, 477 жыхароў, працавалі часоўня, царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін, кузня.

У 1909 г. было 90 двароў, 583 жыхары. Паводле перапісу 1926 г., 127 гаспадарак, 727 жыхароў. Шмат хто з іх мелі прозвішча Кур'ян. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. тут арганізаваны калгас «Добраахвотнік». Працавалі кузня і ветраны млын.

Са жніўня 1941 г. да 23 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі.

У 1971 г. 165 гаспадарак, насельніцтва — 511 чалавек.

У 2002 г. было 129 двароў, 359 жыхароў. Тут ёсць ветэрынарны пункт, рамонтна-механічныя майстэрні, Дом культуры, бібліятэка, аддзяленне сувязі, базавая школа, магазін, фельчарска-акушэрскі пункт.

ДУБРАЎКА, пасёлак у Крыўчанскім сельсавеце, у калгасе «XVIII партз'езд».

У пачатку XX ст. вядомы як урочышча ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, 1 гаспадарка, 5 жыхароў. Пасля рэвалюцыі ўрочышча пераўтворана ў пасёлак.

Цяпер не існуе.

ДУБРОЎНАЕ, вёска ў Астраглядаўскім сельсавеце, у саўгасе «Астрагляды». Назва ад аднайменнага ляснога ўрочышча, у якім было шмат дубоў і было заснавана паселішча.

Вядома ў канцы XIX — пачатку XX стст. як вёска ў Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета. Паводле перапісу 1897 г., 49 двароў, 316 жыхароў, дзейнічалі часоўня і ветраны млын. У 1909 г. было 60 двароў, 402 жыхары. Па перапісе 1926 г., 107 гаспадарак, насельніцтва — 526 чалавек. Як сведчаць матэрыялы перапісу, у гэты час тут жыло шмат людзей, якія мелі прозвішча Данчанка. Да 1933 г. створаны калгас імя Леніна. Працавалі кузня і ваўначоска.

У 2002 г. было 21 двор, 34 жыхары.

ЖАЛІБОР, вёска ў былым Крукаўскім сельсавеце, у калгасе імя Леніна.

У пачатку XX ст. упамінаецца як хутар у Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, 20 двароў, каля 150 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., таксама хутар, 37 гаспадарак, 195 жыхароў. У матэрыялах перапісу сустракаюцца прозвішчы Лойка, Цалуйка.

Пазней хутар пераўтвораны ў вёску. У 1929 г. тут створаны калгас «12-ты Кастрычнік». Працавалі ваўначоска, ветраны млын, кузня.

Перад Вялікай Айчыннай вайной было 42 двары, 248 жыхароў. У маі 1943 г. нямецка-фашысцкія захопнікі спалілі вёску і загубілі 9 яе жыхароў.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ЖЫЛІЧЫ, вёска ў Малажынскім сельсавеце, у калгасе «Першамайск», пры р. Пясчанка. Назва, магчыма, паходзіць ад прозвішча Жыліч.

Вядома з канца XVIII ст. як вёска ў Рэчыцкім павеце, уласнасць графа, генерал-лейтэнанта Іосіфа Юдзіцкага. У 1795 г. тут было 15 гаспадарак, 45 душ мужчынскага, 49 душ жаночага полаў. Адносілася да Хракавіцкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., вёска ў Дзяражыцкай воласці Рэчыцкага павета, 50 двароў, 284 жыхары, дзейнічалі хлебазапасны магазін і школа царкоўнай граматы.

На 1909 г. мелася 70 двароў, 514 жыхароў. Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, якія спалучаліся з рыбнай лоўляй, сплавам лесу, зборам дароў прыроды (ягад, грыбоў, арэхаў) і іншымі хатнімі промысламі, якія давалі магчымасць выжыць сялянам.

Паводле перапісу 1926 г., у вёсцы налічвалася 118 гаспадарак, насельніцтва складала 665 чалавек. У дакументах перапісу часта сустракаецца прозвішча Назаранка. З 8.12.1926 г. Жылічы з'яўляліся цэнтрам сельсавета.

Да 1933 г. тут быў створаны калгас «Дняпровец» № 1. Працавалі кузня, конная крупадзёрка і млын, маслабойня.

У 2002 г. 57 двароў, 111 жыхароў. Ёсць магазін.

ЖЭРДНАЕ, вёска ў былым Слабадскім сельсавеце, у саўгасе «Слабадскі». Назва ад угоддзевага ўрочышча (участак ворыва ці сенакосу, абнесены жэрдкамі), у якім было заснавана паселішча.

Вядома з пачатку XX ст. як вёска ў Савіцкай воласці Рэчыцкага павета. У 1909 г. тут было 65 двароў, 284 жыхары. Паводле перапісу 1926 г., 101 гаспадарка, насельніцтва — 501 чалавек.

У 1929 г. тут створаны калгас «Жэрднае», працавалі кузня і конная крупадзёрка. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны мелася 108 гаспадарак, насельніцтва складала 378 чалавек.

Са жніўня 1941 г. да 23 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія ў маі 1943 г. спалілі 86 двароў, загубілі 38 жыхароў вёскі.

У чэрвені 1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ЗАЛЕССЕ, вёска ў былым Калыбанскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Пасудава». У назве адлюстраваны прыкметы мясцовасці, дзе быў заснаваны населены пункт (паселішча за лесам, каля лесу).

Вядома па рукапісных крыніцах з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., хутар, 18 гаспадарак, насельніцтва — 90 чалавек.

Перад Вялікай Айчыннай вайной вёска, 130 гаспадарак, 580 жыхароў. Са жніўня 1941 г. да

17 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія ў верасні 1943 г. спалілі 110 двароў і загубілі двух жыхароў вёскі.

У 1971 г. 231 гаспадарка, насельніцтва — 672 чалавекі. Працавалі рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, 2 магазіны, васьмігадовая школа, бібліятэка, клуб, аддзяленне сувязі.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ЗАРЭЧЧА, вёска ў Крыўчанскім сельсавеце. У назве адлюстраваны прыкметы мясцовасці, у якой заснавана паселішча (населены пункт за ракой, каля ракі).

У канцы XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета. Паводле перапісу 1897 г., 23 двары, 182 жыхары. У 1909 г. было 36 двароў, 202 жыхары.

Паводле перапісу 1926 г., 306 жыхароў. З матэрыялаў перапісу бачна, што шмат вяскоўцаў у гэты час мелі прозвішча Протчанка. Да 1933 г. тут створаны калгас «Сцяг Леніна». Працавала кузня.

У 1971 г. у вёсцы мелася 133 гаспадаркі, насельніцтва складала 401 чалавек. Ёсць рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, базавая школа, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

У 2002 г. было 79 двароў, 200 жыхароў.

Радзіма беларускага вучонага В. У. Протчанкі.

ІВАНКІ, вёска ў Камарынскім пасялковым Савеце, у саўгасе «Камарынскі».

Вядома з рукапісных крыніц 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., хутар, 1 гаспадарка, 6 жыхароў. Пазней хутар пераўтвораны ў вёску.

Са жніўня 1941 г. да 13 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі.

4.5.1986 г. вёска часткова адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

У 2002 г. было 45 двароў, 82 жыхары.

ІЛЫЧЫ, вёска ў былым Глухавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Калініна. Назва, магчыма, паходзіць ад прозвішча Ілычоў ці яму падобнага.

Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку XIX ст. як вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, з'яўлялася ўласнасцю памешчыка, графа Міхаіла Ракіцкага. У 1816 г. тут было 36 гаспадарак, 59 душ мужчынскага і 69 душ жаночага полаў.

Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Глухавіцкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 43 двары, 351 жыхар, працавалі часоўня, ветраны млын, кузня. У 1909 г. было 60 двароў, 398 жыхароў.

Паводле перапісу 1926 г., 85 гаспадарак, насельніцтва — 505 чалавек. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета. У 1929 г. створаны калгас «Ілыч», працавалі кузня, ветраны млын і ваўначоска.

10.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

КАВАКА, вёска ў Брагінскім пасялковым Савеце, у калгасе «Шлях да камунізму».

Вядома ў канцы XIX — пачатку XX стст. як вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета. Паводле перапісу 1897 г., 51 двор, насельніцтва 356 чалавек, працавалі царкоўнапрыходская школа і 2 ветраныя млыны. У 1909 г. было 52 двары, 385 жыхароў. Згодна перапісу 1926 г., мелася 99 гаспадарак, насельніцтва — 509 чалавек. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. вёска з'яўлялася цэнтрам сельсавета.

Да 1933 г. створаны калгас «Запаветы Леніна», працавала кузня.

У 2002 г. 67 двароў, 176 жыхароў.

Радзіма беларускага паэта С. Ц. Блатуна.

КАВАЛІ, вёска ў Астраглядаўскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоная ніва». Лічаць, што назва паходзіць ад прозвішча Кавалёў.

Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку XIX ст. як вёска ў Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета, з'яўлялася вотчыннай уласнасцю памешчыка Міхаіла Ракіцкага. У 1816 г. было 15 гаспадарак, 35 душ мужчынскага і 45 душ жаночага полаў.

Паводле перапісу 1926 г., пасёлак, 43 гаспадаркі, 243 жыхары.

У 2002 г. 61 двор, 148 жыхароў.

Радзіма беларускага мастака і этнографа М. Ф. Раманюка.

КАЗЯЛУЖЦЫ, вёска ў былым Глухавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Калініна. Назва ад мясцовасці, у якой узнікла паселішча.

У XIX — пачатку XX стст. вядома як вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графаў Ракіцкіх. У 1816 г. 15 гаспадарак, 60 душ абодвух полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Глухавіцкага праваслаўнага прыхода.

У 1909 г. было 32 двары, насельніцтва — 272 чалавекі. Паводле перапісу 1926 г., 48 гаспадарак, 255 жыхароў. У гэты час шмат тутэйшых жыхароў мелі прозвішча Шылец. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. тут створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік» № 2, працавала кузня.

У чэрвені 1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

КАЛІНІНСКІ, пасёлак у Хракавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева.

Вядомы па рукапісных крыніцах з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., пасёлак, 29 гаспадарак, 168 жыхароў.

У 2002 г. 6 двароў, 10 жыхароў.

КАЛЫБАНЬ, вёска каля р. Брагінка (1 км), цэнтр былога сельсавета і калгаса «Ленінскі шлях».

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў Месцераў. Упамінаецца ў інвентары 1844 г. і ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Чыкалавіцкага праваслаўнага прыхода.

На 1886 г. тут лічылася 102 двары, 549 жыхароў, працаваў конны млын. Бытавалі кавальскі, сплаўны, рыбалоўны, шорны промыслы, збор дароў прыроды, якія з'яўляліся дадатковым да земляробства і жывёлагадоўлі заняткам насельніцтва. Паводле перапісу 1897 г., 136 двароў, насельніцтва 828 чалавек, працавалі хлебазапасны магазін і пітная ўстанова.

Да 1909 г. колькасць двароў у вёсцы павялічылася да 170, а насельніцтва — да 928 чалавек. Паводле перапісу 1926 г., вялізная і шматлюдная вёска, у якой было 284 двары, каля 1,4 тыс. жыхароў. У гэты час тут жылі Лявоненкі, Пугачы, Скіданы, Чырыкі і іншыя. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. створаны калгас «Чырвоны араты». Працавалі ваўначоска, шорная майстэрня, 3 ветраныя млыны, кузня, 2 конныя крупадзёркі, алейня.

Са жніўня 1941 г. да 17 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія ў 1943 г. спалілі вёску.

У 1971 г. было 300 гаспадарак, насельніцтва — 741 чалавек.

Працавалі рамонтна-механічная майстэрня, ветэрынарны пункт, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, 2 магазіны, майстэрня бытавога абслугоўвання.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

КАМАНОЎ, вёска ў Вуглоўскім сельсавеце, у калгасе імя Чкалава, на р. Брагінка.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў, графаў Ракіцкіх. Адносілася да Сялецкага праваслаўнага прыхода. У 1816 г. тут было 14 гаспадарак, 36 душ мужчынскага і 37 душ жаночага полаў. Паводле перапісу 1897 г., 43 двары, 295 жыхароў, працавалі школа царкоўнай граматы, хлебазапасны магазін, 2 млыны.

Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 48, а насельніцтва — да 359 чалавек. Бытавалі промыслы — сплаў лесу, лоўля рыбы і іншыя. Па перапісе 1926 г., 84 гаспадаркі, 426 жыхароў. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны было 95 гаспадарак, насельніцтва — 390 чалавек. У красавіку 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 16 яе жыхароў.

У 2002 г. было 30 двароў, 72 жыхары.

КАМАРЫН, гарадскі пасёлак на Дняпры, цэнтр пасялковага Савета і саўгаса «Камарынскі». Знаходзіцца за 52 км на паўднёвы ўсход ад Брагіна, 9 км ад чыгуначнай станцыі Ёлча на лініі Чарнігаў — Оўруч (Украіна), за 182 км ад Гомеля. Прыстань на правым беразе Дняпра. Аўтамабільнымі дарогамі злучана з Брагінам і Чарнігавам.

Вядомы як мястэчка ў Рэчы Паспалітай. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Расіі, мястэчка ў Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графаў Ракіцкіх.

На 1886 г. 26 двароў, 126 жыхароў. Працавалі царква, прыпісаная да Ялчанскага праваслаўнага прыхода, ветраны млын, 6 крам. Па перапісе 1897 г., 108 двароў, 680 жыхароў, дзейнічалі праваслаўная царква, 2 гарбарныя заводы, 12 лавак, на год было 3 кірмашы. Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 104, а насельніцтва — да 614 чалавек. Дзейнічалі параходная прыстань на Дняпры, паштовае аддзяленне.

Паводле перапісу 1926 г., мястэчка, 216 гаспадарак, 967 жыхароў. З 8.12.1926 г. цэнтр Камарынскага раёна (да 9.6.1927 г. Рэчыцкай акругі, потым да 26.7.1930 г. Гомельскай акругі).

Да 1933 г. створаны калгас «Серп і молат». Працавалі 2 кузні, ваўначоска, маслазавод, цагельна-ганчарны завод, шавецкая і кравецкая майстэрні, хлебапякарня, салатопка, ветраны млын.

З 20.2.1938 г. вёска Камарын Палескай вобл. З 28.8.1941 г. да 23.11.1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія знішчылі тут 98 мірных жыхароў. У наваколлі Камарына на камунікацыях ворага дзейнічалі партызаны асобнага атрада імя Варашылава і Чарнігаўскага партызанскага злучэння.

У ноч на 22 верасня 1943 г. войскі 15-га стралковага корпуса (камандуючы — генерал І. І. Людніка ў) 13-й арміі Цэнтральнага фронту фарсіравалі Днепр, прарвалі абарону праціўніка і захапілі плацдарм. 23—24 верасня пасля жорсткіх баёў былі вызвалены Камарын і вёскі Новая Ёлча і Бярозкі.

17.11.1959 г. вёска Камарын пераўтворана ў гарадскі пасёлак. З 25.12.1962 г. у складзе Брагінскага раёна.

У 1971 г. было 1,6 тыс. жыхароў. У 2002 г. — 2274 жыхары. Тут працуюць: лясгас, бальніца, аптэка, дзіцячы сад-яслі, сярэдняя школа, Дом культуры, дзіцяча-юнацкая спартыўная і музычная школы, 2 бібліятэкі (адна дзіцячая, другая для дарослых), аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, гасцініца, шэраг магазінаў і гандлёвых кропак, Дом дзіцячай творчасці, пажарная часць, РВА ЖКГ, ветлячэбніца, будаўнічы ўчастак, РКБА, райаб'яднанне «Сельгасхімія», ашчадкаса, пасялковы Савет, саўгас «Камарынскі».

Радзіма беларускага мастака В. Ф. Шматава.

КАПОРАНКА, вёска ў Новаялчанскім сельсавеце, у саўгасе «Краснае».

Вядома з пачатку XIX ст. як вёска ў Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета, належала памешчыкам Ракіцкім. У 1816 г. было 27 гаспадарак, 77 душ мужчынскага і 75 душ жаночага полаў. Адносілася да Ялчанскага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 53 двары, 350 жыхароў, быў амбар хлебазапаснога магазіна.

У пачатку XX ст. у вёсцы налічвалася 60 двароў, насельніцтва — каля 280 чалавек. Да 1926 г. колькасць двароў павялічылася да 100, а жыхароў — да 530 чалавек.

Са жніўня 1941 г. да 15 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

КАПОРАНСКІЯ ЛЯДЫ, хутар у Новаялчанскім сельсавеце, у саўгасе «Краснае». Паводле перапісу 1926 г., пасёлак, 12 двароў, 64 жыхары.

Цяпер не існуе.

КАРЛАЎКА, вёска ў Камарынскім пасялковым Савеце, у саўгасе «Камарынскі».

У пачатку XX ст. вёска ў Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета, 34 двары, каля 200 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., 76 гаспадарак, насельніцтва 441 чалавек. У матэрыялах перапісу часта сустракаецца прозвішча Петрусевіч.

4.5.1986 г. вёска часткова адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

У 2002 г. было 75 двароў, 143 жыхары.

КАСАЧОЎ, пасёлак у Брагінскім пасялковым Савеце, у калгасе «Шлях да камунізму».

Вядомы з 1920-х гг. У 1933 г. у пасёлку працавалі калгас «Новы свет», кузня і цыркулярка.

Цяпер у складзе г. п. Брагін.

КАТЛОВІЦА, вёска ў Малейкаўскім сельсавеце, у калгасе «Пераможнік».

Па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку XIX ст. як вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, з'яўлялася ўласнасцю памешчыкаў, графаў Ракіцкіх. У 1816 г. тут было 14 гаспадарак, 27 душ мужчынскага і 25 душ жаночага полаў. Адносілася да Сялецкага праваслаўнага прыхода.

На 1909 г. 33 двары, 274 жыхары. Да 1926 г. колькасць двароў у вёсцы павялічылася да 61, а насельніцтва — да 365 чалавек.

Да 1933 г. тут арганізаваны калгас «Новы шлях». Працавала кузня.

У 2002 г. было 54 двары, 98 жыхароў.

КАЦІЧАЎ, вёска ў Камарынскім пасялковым Савеце, у саўгасе «Краснае».

Вядома па рукапісных дакументах з пачатку XIX ст. як вёска ў Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. было 10 гаспадарак, 24 душы мужчынскага і 30 душ жаночага полаў.

У 1909 г. 31 двор, 243 жыхары. Паводле перапісу 1926 г., сумежна знаходзіліся 2 вёскі: Новы Кацічаў (22 гаспадаркі, 103 жыхары) і Стары Кацічаў (21 гаспадарка, 109 жыхароў). Пазней яны былі пераўтвораны ў адну вёску Кацічаў.

У 1933 г. створаны калгас «Чырвоны квіт», працавалі конны млын і кузня.

4.5.1986 г. вёска часткова адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

У 2002 г. 14 двароў, 19 жыхароў.

КІРАВА (был. **ЛУКАЕДЫ**), вёска ў Камарынскім пасялковым Савеце, у саўгасе «Камарынскі», паблізу Дняпра (5 км). Да 20 красавіка 1939 г. мела назву Лукаеды.

Паводле інвентара 1844 г., вёска ў Рэчыцкім павеце, уласнасць памешчыка Аляксандра Горвата. Уваходзіла ў склад яго маёнтка Жары.

У 1879 г. упамінаецца ў царкоўных дакументах пры пераліку населеных пунктаў Жараўскага праваслаўнага прыхода. Насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, рыбнай лоўляй, сплавам лесу. У пачатку XX ст. у Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета побач знаходзіліся вёскі: Новыя Лукаеды і Старыя Лукаеды, у якіх разам налічвалася 70 двароў, каля 730 жыхароў, працавала земскае народнае вучылішча (Старыя Лукаеды). Пазней яны былі пераўтвораны ў адну вёску Лукаеды.

У матэрыялах перапісу 1926 г. упамінаецца ўжо пад назвай Лукаеды, 182 гаспадаркі, насельніцтва больш за 1 тыс. чалавек. У гэты час тут найбольш характэрны былі прозвішчы Леўчанка, Лявоненка. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

У 1929 г. тут быў створаны калгас імя Чарвякова. Працавалі кузня, конная крупадзёрка, 4 ветраныя млыны.

Перад Вялікай Айчыннай вайной 194 гаспадаркі, 563 жыхары. У 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты часткова спалілі вёску і загубілі 26 аднавяскоўцаў.

У 1971 г. 235 гаспадарак, 702 жыхары. У 2002 г. мелася 153 двары, 312 жыхароў. Ёсць ветэрынарны ўчастак і магазін.

КОНАНАЎШЧЫНА, вёска ў Мікуліцкім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». Назва дадзена, напэўна, ад прозвішча Конанаў. У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета, належала графам Ракіцкім. У 1816 г. 10 гаспадарак, каля 50 душ абодвух полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Мікуліцкага праваслаўнага прыхода. На 1909 г. мелася 37 двароў, 235 жыхароў.

Згодна перапісу 1926 г., 61 гаспадарка, 323 жыхары. З 8.12.1926 г. з'яўлялася цэнтрам сельсавета. Да 1933 г. створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік». Працавала кузня.

Перад Вялікай Айчыннай вайной было 70 гаспадарак, насельніцтва — 310 чалавек. У 1943 г. гітлераўскія акупанты спалілі вёску і загубілі 9 яе жыхароў.

У 2002 г. 70 двароў, 198 жыхароў.

КРАСНАГОРСК, пасёлак Мікуліцкага сельсавета.

Па пісьмовых крыніцах вядомы з канца 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., 12 двароў, 67 жыхароў.

У 1938 г. зняты з уліку ў сувязі з тым, што жыхары пераехалі ў суседнюю вёску Мікулічы.

КРАСНАЕ, вёска ў Новаялчанскім сельсавеце, цэнтр саўгаса «Краснае», паблізу Дняпра (4 км).

Вядома з 1920-х гг. як пасёлак. Паводле перапісу 1926 г., 24 гаспадаркі, 89 жыхароў. Да 1933 г. у пасёлку створаны калгас «Інтэрнацыянал», працавалі кузня і паравы млын.

Са жніўня 1941 г. да 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі.

У 1972 г. было 99 гаспадарак, 273 жыхары. У 2002 г. 145 двароў, 404 жыхары. Працуюць рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, сярэдняя школа, клуб, бібліятэка, бальніца, майстэрня бытавога абслугоўвання, 2 магазіны.

КРАСНАЕ, пасёлак у Мікуліцкім сельсавеце. Вядомы з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., 2 двароў, 76 жыхароў.

У 1938 г. жыхары пераехалі ў вёску Мікулічы і пасёлак быў зняты з уліку.

КРАСНАЯ ГАРА, вёска ў Брагінскім пасяловым Савеце, у калгасе «Шлях да камунізму». Вядома па рукапісных крыніцах з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., пасёлак, 36 гаспадарак, 126 жыхароў. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоная гара», працавала кузня. Пазней пасёлак ператворацы ў вёску.

У 2002 г. 7 двароў, 12 жыхароў.

КРАСНАЯ ГОРКА, пасёлак у Мікуліцкім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». Вядомы з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., хутар, 11 двароў, 90 жыхароў. Пазней хутар пераўтвораны ў пасёлак.

Цяпер не існуе.

КРАСНАЯ ПАЛЯНА, пасёлак у Малажынкім сельсавеце. Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Па перапісе 1926 г., у пасёлку было 25 гаспадарак, 133 жыхары.

Цяпер не існуе.

КРУТ-РУДКА, пасёлак у былым Глухавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Калініна. Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на свабодных землях дзяржаўнага фонду. Паводле перапісу 1926 г., 22 двары, 112 жыхароў.

10.5.1986 г. пасёлак адселены ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

КРУКІ, вёска, цэнтр былога сельсавета і калгаса імя Леніна, каля р. Несвіч (0,5 км). Лічаць, што назва паходзіць ад прозвішча Крук.

У XIX — пачатку XX стст. вядома як вёска і сяло ў складзе Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў Ракіцкіх. У 1816 г. у дакументах называецца сялом, 42 гаспадаркі, 206 душ мужчынскага, 104 душы жаночага полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Грушмянскага праваслаўнага прыхода.

На 1886 г. сяло, 42 двары, 214 жыхароў, працавала прыпісная праваслаўная царква. Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, лавіла рыбу, збірала шмат ягад, грыбоў. Некаторыя сяляне наймаліся да прамыслоўцаў і памешчыкаў сплаўляць лес па рэках.

Паводле перапісу 1897 г., сяло, 98 двароў, насельніцтва 525 чалавек, працавалі праваслаўная царква, яўрэйскі малітоўны дом, царкоўная школа граматы, 2 лаўкі, пітная ўстанова, хлебазапасны магазін.

У 1909 г. упамінаецца як вёска, у якой налічвалася 129 двароў, 711 жыхароў. Згодна перапісу 1926 г., Крукі ўяўлялі сабой вялікае і шматлюднае сяло, дзе было 168 гаспадарак, насельніцтва — 836 чалавек. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета.

У 1933 г. тут працавалі калгас «Парыжская камуна», ветраны млын, ваўначоска і кузня.

Перад Вялікай Айчыннай вайной вёска, 280 гаспадарак, насельніцтва — 818 чалавек. Са жніўня 1941 г. да 23 лістапада 1943 г. Крукі былі акупіраваны нямецкімі фашыстамі, якія ў маі 1943 г. спалілі вёску і загубілі 95 яе жыхароў. У навакольлі вёскі дзейнічалі супраць акупантаў партызаны асобнага атрада імя Катоўскага.

У 1972 г. 222 двары, 676 жыхароў. Дзейнічалі рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, магазін, лясніцтва, Дом быту, бібліятэка, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, сярэдняя школа.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

КРЫЎЧА, вёска ў Крыўчанскім сельсавеце, цэнтр калгаса «XVIII партз'езд». У назве адлюстраваны асаблівасці планіроўкі паселішча (крывая вёска).

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, з'яўлялася ўласнасцю памешчыкаў Ракіцкіх. У 1816 г. 17 гаспадарак, каля 70 рэвізскіх душ абодвух полаў. Упамінаецца ў 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Сялецкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 45 двароў, 348 жыхароў, працавалі хлебазапасны магазін і ветраны млын.

У 1909 г. было 47 двароў, 416 жыхароў. Побач з вёскай знаходзіўся фальварак Крыўча, 1 гаспадарка, 12 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., 41 гаспадарка, 208 жыхароў. З 8.12.1926 г. да 10.7.1939 г. цэнтр сельсавета.

У 1929 г. створаны калгас «Крыўча», працавала кузня. Перад Вялікай Айчыннай вайной было 116 гаспадарак, 402 жыхары. У верасні 1943 г. гітлераўскія карнікі спалілі вёску і загубілі 11 яе жыхароў. На 1972 г. 64 двары, насельніцтва — 180 чалавек.

У 2002 г. мелася 46 двароў, 117 жыхароў. Ёсць ветэрынарны пункт, рамонтна-механічныя майстэрні, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, бальніца, яслі-сад, сярэдняя школа, 2 магазіны.

Радзіма генерал-лейтэнанта С. А. Ціханчука.

КУЛАЖЫН, вёска ў былым Крукаўскім сельсавеце, у калгасе імя Леніна. Лічыцца, што назва дадзена ад прозвішча Кулага.

Вядома па пісьмовых крыніцах XIX — пачатку XX стст. як вёска ў Савіцкай воласці Рэчыцкага павета. Уласнасць графаў Ракіцкіх. У 1816 г. 15 гаспадарак, каля 90 душ абодвух полаў. Адносілася да Грушнянскага праваслаўнага прыхода.

У 1909 г. было 65 двароў, насельніцтва — 333 чалавекі. Паводле перапісу 1926 г., 102 гаспадаркі, 484 жыхары. У гэты час найбольш пашыраны прозвішчы Іваненка, Касцючэнка, Гардзеенка.

Перад Вялікай Айчыннай вайной тут было

132 гаспадаркі, 573 жыхары. Са жніўня 1941 г. да 23 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія ў маі 1943 г. спалілі вёску і загубілі 33 яе жыхары.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

КУЛАКОВІК, вёска ў былым Савіцкім сельсавеце.

Вядома па рукапісных крыніцах з 1920-х гг. Згодна перапісу 1926 г., хутар, 15 гаспадарак, 88 жыхароў. У гэты час тут жылі Баброўнікі, Зароўныя, Карташы і іншыя.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны вёска, 23 гаспадаркі, 97 жыхароў. У маі 1943 г. фашысты спалілі вёску і загубілі 11 яе жыхароў.

Пасля вайны не адноўлена.

ЛЕНІНЕЦ (да 1937 г. **ЯСЯНІ**), пасёлак у Спярыжскім сельсавеце, у калгасе «Запаветы Леніна».

Заснаваны ў перыяд калгаснага будаўніцтва на свабодных дзяржаўных землях. На 1933 г. тут працавалі калгас «Ленінец» і кузня.

У кастрычніку 1986 г. пасёлак часткова адселены ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

У 2002 г. было 13 двароў, 25 жыхароў.

ЛЕНІНСК, пасёлак у Малажынскім сельсавеце, у калгасе «Першамайск».

Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Паводле перапісу 1926 г., пасёлак, 13 двароў, 65 жыхароў. У пачатку 1930-х гг. тут быў створаны калгас «Чырвоная гаспадарка», працавалі ветраны млын і кузня.

У 2002 г. было 28 двароў, 58 жыхароў.

ЛЕНІНСКІ, пасёлак у Хракавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева.

Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі на свабодных дзяржаўных землях. Па перапісе 1926 г., 51 гаспадарка, 323 жыхары. Да 1933 г. тут створаны калгас «Шлях да сацыялізма». Працавалі 2 ветраныя млыны і кузня.

Са жніўня 1941 г. да 22 лістапада 1943 г. акупіраваны гітлераўцамі.

У 2002 г. 26 двароў, 46 жыхароў.

ЛІПКІ, пасёлак у Малейкаўскім сельсавеце. Сама назва тлумачыць сваё паходжанне. Заснаваны ў савецкі час. З 8 кастрычніка 1970 г. у мяжы г. п. Брагін.

ЛУБЕНІКІ, вёска ў Вуглоўскім сельсавеце, у калгасе імя Чкалава.

У 2-й палове XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета. Адносілася да Сялецкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 49 двароў, 335 жыхароў, працавалі часоўня, царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін і ветраны млын. У 1909 г. 53 двары, 403 жыхары. Паводле перапісу 1926 г., 63 двары, 376 жыхароў.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны было 120 гаспадарак, насельніцтва складала 630 чалавек. Са жніўня 1941 г. да кастрычніка 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія спалілі вёску і загубілі 11 яе жыхароў.

У 2002 г. 72 двары, 171 жыхар.

ЛЮДЗВІНОЎ, вёска ў Новаялчанскім сельсавеце, у саўгасе «Краснае».

У пачатку XX ст. вядома як фальварак у Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета, 1 гаспадарка, 24 жыхары. Пасля рэвалюцыі фальварак пераўтвораны ў пасёлак, а затым пасёлак – у вёску. Паводле перапісу 1926 г., пасёлак, 21 двор, 77 жыхароў.

У 1991 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ЛЯДЫ, вёска ў былым Піркаўскім сельсавеце, у складзе саўгаса «Брагінскі». Назва ад тэрміна ляда (участак зямлі з-пад выкарчаванага лесу).

Вядома з пачатку XX ст. У 1909 г. вёска ў Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, 32 двары, 172 жыхары. Паводле перапісу 1926 г., 85 гаспадарак, 509 жыхароў.

Да 1933 г. створаны калгас «Герой працы», працавалі кузня, ветраны млын, цагельня.

У чэрвені 1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

МАЖЫМАЎКА, пасёлак у Камарынскім пасялковым Савеце.

Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Паводле перапісу 1926 г., 10 гаспадарак, 61 жыхар.

Сселены ў 1939 г.

МАЙСКІ, пасёлак у Вуглоўскім сельсавеце, у калгасе імя Чкалава.

Вядомы па рукапісных крыніцах з 1920-х гг. У 1926 г. пасёлак, 14 гаспадарак, 90 жыхароў.

Перад Вялікай Айчыннай вайной было 18 двароў, 65 жыхароў. У красавіку 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі пасёлак і загубілі 7 жыхароў.

У 2002 г. 17 двароў, 36 жыхароў.

МАЛАЖЫН, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Першамайск».

Вядома з канца XVIII ст. як вёска ў Рэчыцкім павеце, уласнасць генерал-лейтэнанта, графа Іосіфа Юдзіцкага. У 1795 г. тут было 30 гаспадарак, 70 душ мужчынскага і 69 душ жаночага полаў. Паводле перапісу 1897 г., у вёсцы мелася 125 двароў, 892 жыхары, працавалі школа царкоўнай граматы, хлебазапасны магазін, лаўка, пітны дом (карчма).

У 1909 г. Малажын уяўляў сабой вялізную і шматлюдную вёску ў Дзяражыцкай воласці Рэчыцкага павета, у якой налічвалася 188 двароў, 1162 жыхары. Да 1913 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча. Сумежна з вёскай знаходзіўся маёнтак Малажын (у 1909 г. 1 гаспадарка, 3 жыхары).

Паводле перапісу 1926 г., таксама вялікая вёска, дзе мелася 185 гаспадарак, 912 жыхароў. У гэты час, як сведчаць дакументы перапісу, тут жылі Давыдоўскія, Новікі, Чарнянкі, Шчучэнкі, Янчанкі і іншыя. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета.

У 1929 г. тут створаны калгас «Першамайск», працавалі ветраны і нафтавы млыны, крупадзёрка, кузня, маслабойня.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны 142 гаспадаркі, насельніцтва 493 чалавекі. У верасні 1943 г. гітлераўскія карнікі амаль поўнасцю спалілі вёску і загубілі трох яе жыхароў.

У 2002 г. было 210 двароў, 601 жыхар. Тут ёсць майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, ветэрынарны пункт, магазін, сярэдняя школа, аддзяленне сувязі, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт.

МАЛЕЙКІ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Пераможнік». Назва, верагодна, ад прозвішча Малейка.

У 2-й палове XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета. Упамінаецца ў царкоўных дакументах пры пераліку населеных пунктаў Сялецкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 55 двароў, насельніцтва 354 чалавекі, працаваў хлебазапасны магазін. У 1909 г. 56 двароў, насельніцтва — 383 чалавекі.

Паводле перапісу 1926 г., 50 гаспадарак, 282 жыхары. Як бачна з матэрыялаў перапісу, тут жылі пераважна Дзяльцы, Краўчанкі, Новікі, Пугачы, Шкуты, Ярмоленкі. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета.

У 1930-я гг. працаваў крухмальны завод. Са жніўня 1941 г. да 23 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі.

У 2002 г. было 145 двароў, 390 жыхароў. Дзейнічаюць рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, аддзяленне сувязі, магазін.

МАРЫТОН, вёска ў Астраглядаўскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоная ніва».

У пачатку XX ст. вядома як ваколіца ў Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета, 34 двары, 98 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 48 двароў, 206 жыхароў. У матэрыялах перапісу часта сустракаецца прозвішча Цішкевіч.

Да 1933 г. створаны калгас імя Дзяржынскага. Працавалі кузня і ваўначоска.

У 2002 г. 17 двароў, 34 жыхары.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы І. Ф. Зелянкоўскага.

МІКУЛІЧЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Чырвоны Кастрычнік», каля аўтамабільнай дарогі Хойнікі — Паселішчы — Браґін. Назва ўтворана ад прозвішча Мікуліч.

У XIX — пачатку XX стст. Мікулічы ўяўлялі сабой сяло, былі цэнтрам воласці і праваслаўнага прыхода Рэчыцкага павета. Вотчынная ўласнасць памешчыкаў Ракіцкіх. У 1816 г. тут было 60 гаспадарак, 144 душы мужчынскага і 180 душ жаночага полаў.

Як сведчаць царкоўныя дакументы, каля 1840 г. на сродкі вотчыннага ўладальніка, графа Міхаіла Ракіцкага тут была пабудавана новая Богаяўленская прыходская праваслаўная царква з дрэва.

Паводле царкоўных звестак 1879 г., амаль усе прыхаджане адносіліся да сялянскага саслоўя, займаліся земляробствам, а таксама традыцыйнымі промысламі (ткацтвам, прадзеннем, зборам дароў прыроды і інш.).

У 1886 г. у сяле было 66 двароў, 376 жыхароў, дзейнічалі адкрытае ў 1863 г. земскае народнае вучылішча, праваслаўная царква, валасное праўленне. У канцы XIX ст. старшынёй і пісарам валаснога праўлення былі (адпаведна) Пётр Міхаленка і Фёдар Маркаў, настаяцелем царквы — Пётр Каэлякоўскі. Паводле перапісу 1897 г., у сяле было 96 двароў, 631 жыхар, працавалі праваслаўная царква, часоўня, валасное праўленне, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, лавачка, конны млын, 2 ветраныя млыны, пітная ўстанова.

Паводле перапісу 1926 г., 113 гаспадарак, 614 жыхароў. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета. У 1930-я гг. сяло пераўтворана ў вёску. Да 1933 г. створаны калгас «Чырвоны Кастрычнік». Працавалі 3 ветраныя млыны, кузня і стальмашня.

Са жніўня 1941 г. да лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы і яе наваколлі дзейнічалі супраць акупантаў партызаны асобнага атрада імя Катоўскага, якія разграмілі тутэйшы гарнізон паліцыянта. За перыяд акупацыі гітлераўскія карнікі загубілі 23 мірныя жыхары, у тым ліку 14.8.1942 г. спалілі жывымі 14 жыхароў вёскі.

У 2002 г. у Мікулічах налічвалася 94 двары, 265 жыхароў. Тут працавалі лесапільня, рамонтна-механічныя майстэрні, млын, ветэрынарны ўчастак, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, амбулаторыя, 2 магазіны.

МІХАЛЁЎКА, вёска ў былым Крукаўскім сельсавеце, у калгасе імя Леніна. Назва дадзена, верагодна, ад прозвішча Міхалёў.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў, графаў Ракіцкіх. Адносілася да Грушыянскага праваслаўнага прыхода. У 1816 г. было 21 двор, каля 100 душ мужчынскага і жаночага полаў.

Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 55, а насельніцтва — да 232 чалавек. Па перапісе 1926 г., 110 гаспадарак, 558 жыхароў. У матэрыялах перапісу сустракаецца шмат прозвішчаў Рабянок, Самойленка і Скачок.

Перад Вялікай Айчыннай вайной мелася 82 гаспадаркі, 213 жыхароў. У 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі большую частку вёскі (52 двары) і загубілі некалькі яе жыхароў.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

МІХАЛОЎ, вёска ў Спярыжскім сельсавеце, у калгасе «Запаветы Леніна». Назва дадзена ад прозвішча, утворанага ад імя Міхал (Міхаіл).

У пачатку XX ст. вядома як хутар у Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, 17 двароў, 129 жыхароў.

Паводле перапісу 1926 г., вёска, 20 гаспадарак, 117 жыхароў.

Цяпер не існуе.

МІХНАЎКА, вёска ў калгасе «Парыжская камуна» Вуглоўскага сельсавета.

У пачатку XX ст. вёска Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, 25 двароў, 232 жыхары.

Паводле перапісу 1926 г., 57 гаспадарак, 305 жыхароў. У гэты час шмат мясцовых жыхароў мелі прозвішчы Камок і Шубянок. У 1929 г. арганізаваны калгас «Міхнаўка», працавалі кузня і ваўначоска.

Са жніўня 1941 г. да 23 лістапада 1943 г. вёска была акупіравана нямецкімі фашыстамі.

У 2002 г. 26 двароў, 43 жыхары.

МЛЫНОК, пасёлак у Брагінскім пасялковым Савеце, у калгасе «Шлях да камунізму». Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У 1990 г. пасёлак адселены ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

НАРАГІ, вёска ў Крукаўскім сельсавеце.

Вядома з 1920-х гг. як пасёлак. Паводле перапісу 1926 г., 35 двароў, 176 жыхароў. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны вёска, 32 гаспадаркі, насельніцтва — 102 чалавекі. У маі 1943 г. спалена нямецкімі фашыстамі.

25 кастрычніка 1962 г. знята з уліку ў сувязі з тым, што аб'яднана з суседняй вёскай Крукі.

НЕЖЫХАЎ, вёска ў былым Слабадскім сельсавеце, у саўгасе «Слабадскі».

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў складзе Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыка, графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. было 14 гаспадарак, 26 душ мужчынскага і 34 душы жаночага полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Грушнянскага праваслаўнага прыхода.

У пачатку XX ст. мелася 47 двароў, 322 жыхары. Паводле перапісу 1926 г., 60 гаспадарак, насельніцтва — 341 чалавек. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны было 120 гаспадарак, 630 жыхароў. У красавіку 1943 г. гітлераўскія карнікі спалілі вёску, загубілі 11 яе жыхароў. Падчас вайны непадалёку ад вёскі, у лесе базіраваліся Брагінскі падпольны райкам КП(б)Б і штаб асобнага партызанскага атрада імя Катоўскага Палескага злучэння.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

Радзіма беларускага вучонага М. Ф. Піліпенкі, беларускага пісьменніка В. П. Давыдзенкі.

НІЖНІЯ ЖАРЫ, вёска на заходнім беразе Кіеўскага вадасховішча, у калгасе «Ніжні дняпровец» Верхнежараўскага сельсавета. Асноўная частка назвы паходзіць ад прозвішча Жараў. З такім прозвішчам людзі тут жылі здаўна.

У XIX — пачатку XX стст. вёска Жары і Ніжнія Жары ў Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета. Адносілася да Верхнежараўскага праваслаўнага прыхода, вотчынная ўласнасць памешчыкаў Горватаў. У 1844 г. каля 60 гаспадарак. Уваходзіла ў склад маёнтка Жары, які знаходзіўся паблізу вёскі. Паводле перапісу 1897 г., 107 двароў, насельніцтва 660 жыхароў, амбар хлебазапаснога магазіна, недалёка ад вёскі, у маёнтку Жары працавалі вінакурны і цагляны заводы.

На 1909 г. было 110 двароў, 677 жыхароў, працавала прыстань на Дняпры. Да 1913 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча. Паводле перапісу 1926 г., 213 гаспадарак, насельніцтва — 1125 чалавек. Як паказваюць матэрыялы перапісу, у гэты час тут жыло шмат людзей з прозвішчамі Жараў (Жарава), Клімянок, Сукач. У 1926—1927 гг. цэнтр сельсавета.

У 1929 г. створаны калгас «Новадняпровец», працавалі 2 ветраныя млыны, 2 ваўначоскі і кузня.

У 2002 г. было 59 двароў, 112 жыхароў. Працуюць ветэрынарны ўчастак і магазін.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы М. А. Клімянка.

НІЎКІ, хутар у Новаялчанскім сельсавеце, у саўгасе «Краснае».

Назва ўзнікла ад участка апрацаванай зямлі — нівы (ворыва ці павева), на якой было заснавана паселішча. У пісьмовых крыніцах упамінаецца з 1920-х гг. Згодна перапісу 1926 г., 18 гаспадарак, 95 жыхароў.

У 2002 г. 1 двор, 1 жыхар.

НОВАЯ АЛЯКСЕЕЎКА, вёска, цэнтр Крыўчанскага сельсавета, у калгасе «XVIII партз'езд». Сама назва тлумачыць сваё паходжанне.

У XIX — пачатку XX стст. вядома як вёска Цюцькі ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, належала памешчыкам, графам Ракіцкім. У 1816 г. тут было 14 гаспадарак, 29 душ мужчынскага і 30 душ жаночага полаў. Адносілася да Сялецкага праваслаўнага прыхода.

Паводле перапісу 1897 г., 40 двароў, 308 жыхароў, працавалі ветраны млын, пітная ўстанова.

На 1909 г. 56 двароў, насельніцтва — 390 чалавек. У 1913 г. Цюцькі былі перайменаваны ў Новую Аляксееўку. З 10.7.1939 г. цэнтр сельсавета.

У 2002 г. мелася 117 двароў, 271 жыхар. Дзейнічаюць ветэрынарны пункт, клуб, бібліятэка, аўтаматычная тэлефонная станцыя, аддзяленне сувязі, сярэдняя школа, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

НОВАЯ ВЁСКА, вёска ў Мікуліцкім сельсавеце. Асноўная частка назвы ўтворана ад тыпу паселішча.

Па пісьмовых крыніцах вядома з 1920-х гг. Згодна перапісу 1926 г., пасёлак, 14 гаспадарак, 78 жыхароў. Побач з пасёлкам знаходзіўся аднайменны хутар, 3 двары, 15 жыхароў. Пазней пасёлак і хутар былі аб'яднаны ў вёску.

У 1938 г. жыхары пераехалі ў вёску Мікулічы і Новая Вёска была знята з уліку.

НОВАЯ ГРЭБЛЯ, вёска ў Хракавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. Расказваюць, што вёска заснавана каля грэблі (дарога праз балота, гібкае месца, вымашчанае галлём, паленнем, пяском). Гэтым і тлумачыцца паходжанне асноўнай часткі назвы. Прыметнік Новая азначае, што паселішча ўзнікла нядаўна.

Вядома па рукапісных крыніцах 1920-х гг.

У 1929 г. створаны калгас «Новая Грэбля», працавала кузня.

У 2002 г. 19 двароў, 53 жыхары. Ёсць ветэрынарны пункт, магазін, клуб.

НОВАЯ ЁЛЧА, вёска, цэнтр Новаялчанскага сельсавета, у саўгасе «Краснае», паблізу р. Днепр, каля чыгуначнай станцыі Ёлча (1 км) і на аўтамабільнай дарозе Брагін — Камарын.

У XIX — пачатку XX стст. вёска, цэнтр Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета. Адносілася да Ялчанскага праваслаўнага прыхода.

У 1863 г. адкрыта земскае народнае вучылішча. У 1886 г. у вёсцы было 44 двары, насельніцтва — 333 чалавекі, працавалі валасное праўленне, земскае народнае вучылішча. Жыхары хадзілі маліцца ў царкву Старой Ёлчы.

У канцы XIX ст. працавалі старшынёй валаснога праўлення Міна Лявоненка, пісарам — Канстанцін Радзіванавіч, настаўнікам земскага народнага вучылішча — Васіль Дубіна.

Паводле перапісу 1897 г., 85 двароў, насельніцтва 526 чалавек, працавалі валасное праўленне, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, лаўка, пітная ўстанова, у сядзібе Ёлча — вінакурны завод.

У 1909 г. у вёсцы мелася 79 двароў, насельніцтва — 549 чалавек. К 1926 г. колькасць двароў павялічылася да 133, жыхароў — да 640. З 8.12.1926 г. цэнтр Ялчанскага, з 29.10.1964 г. — Новаялчанскага сельсавета. У тым жа годзе побач з вёскай знаходзілася аднайменная садова-агародніцкая арцель, 7 гаспадарак, 30 жыхароў.

У 1929 г. створаны калгас «Серп і молат», працаваў ветраны млын.

Са жніўня 1941 г. да 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія ў 1942 г. загубілі 17 мясцовых жыхароў, а 27.9.1943 г. часткова спалілі вёску.

У 2002 г. было 81 двор, 135 жыхароў. Працуюць лясніцтва, рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, аддзяленне сувязі, пачатковая школа, аўтаматычная тэлефонная станцыя, клуб, бібліятэка, майстэрня бытавога абслугоўвання, магазін.

НОВЫ МАКРЭЦ, вёска ў Малейкаўскім сельсавеце, у калгасе «Пераможнік».

Паводле перапісу 1897 г., вёска ў Ручаёўскай воласці Рэчыцкага павета, 126 двароў, 807 жыхароў, працавала школа граматы сялянскага таварыства.

Паводле перапісу 1926 г., 203 гаспадаркі, насельніцтва каля 1,1 тыс. чалавек.

У 2002 г. было 24 двары, 38 жыхароў.

НОВЫ СЦЕПАНОЎ, вёска ў былым Савіцкім сельсавеце, у саўгасе «Савічы». Назва ад прозвішча Сцяпанаў і азначэння Новы.

Вядома з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 68 гаспадарак, 337 жыхароў. З 30.12.1927 г. да 1931 г. цэнтр сельсавета.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны было 53 двары, 230 жыхароў. У маі 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 41 жыхара.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

НОВЫ ШЛЯХ, пасёлак у Вуглоўскім сельсавеце, у калгасе «Парыжская камуна».

Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Згодна перапісу 1926 г., 25 двароў, 145 жыхароў. Са жніўня 1941 г. да 23 лістапада 1943 г. акупіраваны нямецкімі фашыстамі.

У 2002 г. было 36 двароў, 96 жыхароў.

НОВЫЯ ХРАКАВІЧЫ, вёска ў Хракавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. Лічаць, што назва ўтворана ад прозвішча Хракавіч, да якога дабаўлена азначэнне Новыя.

Вядома з 2-й паловы XIX ст. як вёска ў Савіцкай воласці Рэчыцкага павета. Адносілася да Хракавіцкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 63 двары, 347 жыхароў. У 1909 г. мелася 58 двароў, 382 жыхары.

Паводле перапісу 1926 г., 87 гаспадарак, насельніцтва — 506 чалавек. Да 1933 г. тут створаны калгас «Дняпровец» № 2. Працавалі ветраны млын і кузня.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў наваколлі вёскі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў дзейнічалі партызаны асобнага партызанскага атрада імя Катоўскага.

На 2002 г. было 45 двароў, 69 жыхароў.

НУДЗІЧЫ, вёска ў былым Глухавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Калініна.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графаў Ракіцкіх. У 1816 г. было 35 гаспадарак, 66 душ мужчынскага і 80 душ жаночага полаў. У 1909 г. 52 двары, 355 жыхароў. Паводле перапісу 1897 г., 42 двары, 295 жыхароў, працавалі часоўня, ветраны млын.

Па перапісе 1926 г., 76 гаспадарак, 428 жыхароў. У матэрыялах перапісу часта сустракаюцца прозвішчы Дэядзенка, Ярмоленка, Сабаленка, Санько. Да 1933 г. створаны калгас імя К. Маркса. Працавалі ветраны млын і кузня.

10.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ПАЖАРКІ, вёска ў Брагінскім пасялковым Савеце, у калгасе «Шлях да камунізму». Згодна легенды, паселішча заснавана на пажарышчы ў лесе, на лясным выгары, чым і тлумачыцца яго назва.

Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Мікуліцкага праваслаўнага прыхода. У 1909 г. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, 29 двароў, 247 жыхароў. Згодна перапісу 1926 г., 53 гаспадаркі, насельніцтва — 270 чалавек.

У 2002 г. было 5 двароў, 8 жыхароў.

ПАПАРАТНАЕ, пасёлак у Астраглядаўскім сельсавеце. Назва ад наймення ўгоддзевага ўрочышча (расло шмат папаратніку), дзе было заснавана паселішча.

Па пісьмовых крыніцах вядомы з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., 17 двароў, 84 жыхары.

Аб'яднаны з сумежнай вёскай Астрагляды і па гэтай прычыне 29 лістапада 1962 г. зняты з ліку.

ПАСЕКА, вёска ў Камарынскім пасялковым Савеце, у саўгасе «Камарынскі». Заснавана на былой лясной вырубцы (пасека), таму і атрымала такую назву.

Вядома з рукапісных дакументаў 1920-х гг. Згодна перапісу 1926 г., пасёлак, 30 гаспадарак, 140 жыхароў. Пасля пасёлак пераўтвораны ў вёску. Цяпер не існуе.

ПАСУДАВА, вёска ў былым Калыбанскім сельсавеце, у саўгасе «Пасудава».

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Рэчыцкім павеце, уласнасць графаў Ракіцкіх. У 1816 г. было 22 двары. У 1879 г. упамінаецца ў царкоўных дакументах пры пераліку населеных пунктаў Чыкалавіцкага праваслаўнага прыхода. У 1909 г. 79 двароў, насельніцтва — 421 чалавек.

Паводле перапісу 1926 г., 110 гаспадарак, 515 жыхароў. Як сведчаць матэрыялы перапісу, многія жыхары мелі прозвішчы Асадчы (Асадчая), Груда, Касцючэнка, Раманенка, Самойленка. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. тут створаны калгас «Дзень калектывізацыі». Працавалі 2 ветраныя млыны і кузня.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ПАЦЬКАЎ, хутар у Малейкаўскім сельсавеце, у калгасе імя Тэльмана.

Вядомы з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., тут было 9 гаспадарак, 52 жыхары.

Цяпер не існуе.

ПЕРАНОСЫ, вёска ў Крыўчанскім сельсавеце, у калгасе «XVIII партэ'езд». Легенда расказвае, што паселішча па нейкіх прычынах перанесена на гэтае месца з іншага. Адсюль і назва.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, належала памешчыкам, графам Ракіцкім. У 1816 г. было 12 гаспадарак, 34 душы мужчынскага і 41 душа жаночага полаў. Паводле перапісу 1897 г., 41 двор, 300 жыхароў, працаваў хлебазапасны магазін. Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 54, а насельніцтва — да 376 чалавек. Жыхары хадзілі маліцца ў царкву вёскі Сялец.

Паводле перапісу 1926 г., 82 гаспадаркі, насельніцтва — 452 чалавекі. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. вёска з'яўлялася цэнтрам сельсавета.

Да 1933 г. тут створаны калгас «Чырвоны партызан». Працавалі кузня і ветраны млын.

У 2002 г. 44 двары, 105 жыхароў.

ПЕРАСЯЦІНЕЦ, вёска ў былым Савіцкім сельсавеце, у саўгасе «Савічы».

Паводле перапісу 1926 г., 51 гаспадарка, 293 жыхары. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета. Да 1933 г. тут арганізаваны калгас імя Леніна. Працавалі ваўначоска і кузня.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны 60 двароў, 240 жыхароў. У маі 1943 г. гітлераўскія карнікі знішчылі вёску, загубілі чатырох яе жыхароў.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы Г. С. Сарокінай.

ПЕТРЫЦКАЕ, вёска пры р. Брагінка ў Малейкаўскім сельсавеце, у калгасе імя Тэльмана. Назва паходзіць ад прозвішча, якое ўтворана ад імя Пётр.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Ручаёўскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў Ракіцкіх. У 1816 г. тут быў 41 двор, 105 душ мужчынскага і 115 душ жаночага полаў. Паводле перапісу 1897 г., 106 двароў, насельніцтва 366 чалавек, працавалі царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін, пітны дом.

Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 115, а насельніцтва — да 749 чалавек. Бытавалі рыбалоўны і сплаўны промыслы. У 1926 г. Петрыцкае таксама ўяўляла вялікую і шматлюдную вёску, у якой налічвалася 158 гаспадарак, каля 900 жыхароў. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета. Да 1933 г. створаны калгас імя Чарвякова. Тут працавалі ваўначоска, ветраны і паравы млыны, кузня.

Перад Вялікай Айчыннай вайной у вёсцы мелася 176 гаспадарак, 570 жыхароў. Са жніўня 1941 г. да 16 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія ў чэрвені 1943 г. спалілі амаль усю вёску і загубілі 6 яе жыхароў.

У 2002 г. было 74 двары, 125 жыхароў.

Радзіма беларускіх пісьменнікаў У. М. Верамейчыка і М. І. Новікава (Ракітнага).

ПЕЦЬКАЎШЧЫНА, вёска ў Спярыжскім сельсавеце, у калгасе «Запаветы Леніна». Назва, відавочна, дадзена ад ласкавай формы імя Пётр (Пецька).

Вядома з пачатку XX ст. як хутар у Брагінскай воласці Рэчыцкага павета. На 1909 г. было 14 двароў, 108 жыхароў. К 1926 г. колькасць двароў павялічылася да 23, а насельніцтва — да 114 чалавек. У гэты час шмат жыхароў мелі прозвішчы Буйневіч, Каваленка, Масюкевіч, Тышкевіч.

У 1929 г. створаны калгас «Пецькаўшчына», працавала кузня.

Перад Вялікай Айчыннай вайной вёска, мелася 27 гаспадарак, 143 жыхары. Са жніўня 1941 г. да 23 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія ў маі 1943 г. спалілі амаль усю вёску.

8.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ПЕЧЫ, пасёлак у Астраглядаўскім сельсавеце, у саўгасе «Астрагляды». Назва ад аднайменнага ўрочышча, дзе ўзнікла паселішча.

Заснаваны на свабодных землях дзяржаўнага фонду пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

6.6.1986 г. пасёлак адселены ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ПІРКІ, вёска, цэнтр сельсавета і саўгаса «Брагінскі», каля аўтамабільнай дарогі Брагін — Камарын. Назва ад прозвішча Пірко.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў, графаў Ракіцкіх. У 1816 г. было 49 гаспадарак. Адносілася да Грушнянскага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 79 двароў, насельніцтва 496 чалавек, працавалі хлебазапасны магазін і царкоўная школа граматы.

У 1909 г. мелася 120 двароў, 703 жыхары. Паводле перапісу 1926 г., Піркі таксама ўяўлялі сабой вялікую і шматлюдную вёску, у якой налічвалася 156 гаспадарак, 853 жыхары. У матэрыялах перапісу вельмі часта сустракаюцца такія прозвішчы, як Верабей, Пугач, Рудзянок, Самойленка, Шубянок. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. тут створаны калгас «Чырвоны будаўнік». Працавалі кузня і ветраны млын.

Са жніўня 1941 г. да 22 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі. Супраць акупантаў у наваколлі вёскі на камунікацыях ворага дзейнічалі партызаны асобнага партызанскага атрада імя Варашылава і Чарнігаўскага партызанскага злучэння.

Тут дзейнічалі рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, сярэдняя школа, Дом культуры, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін, аддзяленне сувязі.

Па суседстве з вёскай вялося будаўніцтва новага саўгаса «Брагінскі» на асушаных тарфянніках і пасёлка Сонечны з дамамі рознай павярховасці.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ПРОСМЫЧЫ, вёска ў Хракавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. Вядома з канца XVIII ст., уласнасць памешчыка, графа Іосіфа Юдзіцкага, 33 гаспадаркі, 78 душ мужчынскага і 77 душ жаночага полаў.

Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Хракавіцкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., вёска Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, 64 двары, 360 жыхароў, працавала школа царкоўнай граматы. У 1909 г. тут было 85 двароў, насельніцтва — 551 чалавек. Паводле перапісу 1926 г., 110 гаспадарак, насельніцтва — 655 чалавек. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

У 2002 г. 79 двароў, 125 жыхароў.

ПРУДАВІЦА, вёска ў Новаялчанскім сельсавеце. Калі паселішчу давалася назва, тут была сажалка (руская назва пруд), чым яна і тлумачыцца.

Вядома з рукапісных крыніц 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., 20 гаспадарак, 85 жыхароў.

Злілася з сумежнай вёскай Старая Ёлча і ў сувязі з гэтым знята з уліку.

ПУЦІЛАВІК, пасёлак у Брагінскім пасялковым Савеце.

У пачатку XX ст. уяўляў сабой фальварак у Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, 1 гаспадарка, 14 жыхароў. Пасля рэвалюцыі фальварак пераўтвораны ў пасёлак. Паводле перапісу 1926 г., 10 гаспадарак, 65 жыхароў.

Далучаны да суседняй вёскі Сабалі і зняты з уліку 29 лістапада 1962 г.

ПУЧЫН, вёска ў былым Слабадскім сельсавеце, у саўгасе «Слабадскі».

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыка, графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. было 30 двароў, 70 душ мужчынскага і 81 душа жаночага полаў.

Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 113, а насельніцтва — да 536 чалавек. Паводле перапісу 1926 г., 135 гаспадарак, 717 жыхароў. У матэрыялах часта сустракаюцца прозвішчы Балобан, Галуза, Гаўрыленка. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

У 1929 г. тут створаны калгас «Чырвоны сцяг», працавалі ветраны млын і кузня. Быў магазін, Дом культуры, бібліятэка.

6.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

РАГАЗІН, пасёлак у Вуглоўскім сельсавеце.

Заснаваны ў 1920-я гг. як хутар. Пазней хутар пераўтвораны ў пасёлак. У 1929 г. створаны калгас «Рагазін», працавалі кузня і ветраны млын.

Перад Вялікай Айчыннай вайной было 22 двары, 150 жыхароў. У красавіку 1943 г. гітлераўскія карнікі спалілі пасёлак і загубілі некалькі яго жыхароў.

26.9.1974 г. зняты з уліку, паколькі жыхары перасяліліся ў суседнюю вёску Каманоў.

РАФАЛАЎ, вёска ў былым Глухавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Калініна. Назва, магчыма, далзена ад прозвішча Рафалаў.

Вядома з рукапісных дакументаў 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., 20 гаспадарак, 113 жыхароў. Да 1933 г. тут створаны калгас «Пралетарскі шлях». Працавалі ветраны млын і кузня.

10.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

Радзіма беларускага вучонага У. М. Белага.

РАФАЛАЎ, пасёлак у Глухавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Калініна. Паходжанне назвы такое ж самае, як у папярэдняй вёскі.

Заснаваны ў 1920-я гг. на свабодных дзяржаўных землях як пасёлак. Паводле перапісу 1926 г., тут было 19 гаспадарак, 114 жыхароў.

10.6.1986 г. пасёлак адселены ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

РЫЖКАЎ, вёска ў Мікуліцкім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік». Верагодна, назва паходзіць ад прозвішча Рыжкоў.

Па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку XIX ст. як вёска ў Мікуліцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыка, графа Міхаіла Ракіцкага. У 1816 г. было 35 душ мужчынскага і 36 душ жаночага полаў.

Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Мікуліцкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 39 двароў, 263 жыхары, працавалі царкоўнапры-

ходская школа, часоўня, ветраны млын. У 1909 г. мелася 81 двор, 431 жыхар.

На 2002 г. 83 двары, 186 жыхароў.

РЫТАЎ, пасёлак у Малажынскім сельсавеце, калгасе «Першамайск».

Вядомы з рукапісных дакументаў 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., 43 гаспадаркі, 206 жыхароў.

Перад Вялікай Айчыннай вайной 46 двароў, 169 жыхароў. У верасні 1943 г. спалены гітлераўскімі акупантамі.

У 2002 г. 36 двароў, 94 жыхары.

РУДНЯ-ЖУРАЎЛЁВА, вёска ў Вуглоўскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Чкалава, на р. Брагінка.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Ручаёўскай воласці Рэчыцкага павета, належала графу Міхаілу Ракіцкаму. У 1816 г. 17 двароў, 41 душа мужчынскага і 50 душ жаночага полаў.

Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Сялецкага праваслаўнага прыхода. У 1909 г. было 40 двароў, 241 жыхар.

Згодна перапісу 1926 г., 60 гаспадарак, насельніцтва – 351 чалавек. Падчас Вялікай Айчыннай вайны нямецкія фашысты спалілі вёску і загубілі 19 мірных жыхароў (чэрвень 1942 г.).

У 2002 г. было 73 двары, 183 жыхары. Працуюць ветэрынарны пункт, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, аддзяленне сувязі, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

САБАЛІ, вёска ў падпарадкаванні Брагінскага пасялковага Савета, цэнтр калгаса «Шлях да камунізму». Назва, магчыма, ад прозвішча Собаль.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графаў Ракіцкіх. У 1816 г. 29 гаспадарак, 54 душы мужчынскага і 65 душ жаночага полаў. Жыхары маліліся ў цэрквах Брагіна.

Паводле перапісу 1897 г., 60 двароў, 410 жыхароў, працавалі царкоўнапрыходская школа, 2 ветраныя млыны, кузня, пітная ўстанова.

На 1909 г. мелася 77 двароў, 483 жыхары. Паводле перапісу 1926 г., 112 гаспадарак, 560 жыхароў. З матэрыялаў перапісу бачна, што ў гэты час тут жылі Зелянкоўскія, Іваненкі, Кузьмянкі, Сабаленкі, Стрыбукі, Шкурко і іншыя.

З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета. Да 1933 г. створаны калгас «Кастрычнік». Працавала кузня, цагельня, 2 ветраныя млыны.

Са жніўня 1941 г. да 23 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі.

У ліпені 1986 г. вёска часткова адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

Да 1990 г. тут працавалі лесапільня, млын, рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, Дом культуры, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, бібліятэка, сярэдняя школа, дзіцячы сад-яслі, 2 магазіны.

У 2002 г. было 51 двор, 98 жыхароў.

Радзіма беларускага пісьменніка Р. К. Сабаленкі і беларускага спевака У. М. Яскевіча.

САВІЧЫ, вёска, цэнтр былога сельсавета і саўгаса «Савічы», каля р. Брагінка (3 км), на аўтамабільнай дарозе Брагін – Камарын. Назва, напэўна, дадзена ад імя Сава ці ўтворанага ад яго прозвішча.

Па пісьмовых крыніцах вядома як сяло з сярэдзіны XVI ст., калі ўваходзіла ў склад Вялікага княства Літоўскага, а з 1569 г.– Рэчы Паспалітай. З'яўлялася ўласнасцю праваслаўнай царквы.

Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) апынулася ў складзе Расіі, вёска, цэнтр воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыка, графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. 82 двары, 176 душ мужчынскага і 168 душ жаночага полаў.

У 1872 г. адкрыта земскае народнае вучылішча, якое размяшчалася ў грамадскім будынку.

На 1886 г. 94 двары, 580 жыхароў, дзейнічалі земскае народнае вучылішча, часоўня (прыписана да Грушнянскага праваслаўнага прыхода), ветраны і конны млыны, 2 крамы. Паблізу вёскі (1 вярста) знаходзілася сядзіба Савічы, дзе працаваў вінакурны завод.

У канцы XIX — пачатку XX стст. старшынёй валаснога праўлення тут працаваў Мартын Анапрыенка, пісарам – Сафон Макаранка. Паводле перапісу 1897 г., 127 двароў, 812 жыхароў, працавалі валаснае праўленне, хлебазапасны магазін, малітоўны яўрэйскі дом, капліца, народнае вучылішча, 2 лаўкі, пітная ўстаноўка; у сядзібе Савічы 3 двары, 41 жыхар, дзейнічаў вінакурны завод.

У 1909 г. 175 двароў, 875 жыхароў. Сумежна з вёскай быў маёнтак Савічы, 1 гаспадарка, 11 жыхароў.

Паводле перапісу 1926 г., Савічы ўяўлялі сабой вялікую і шматлюдную вёску, у якой налічвалася 279 гаспадарак, а насельніцтва складала больш за 1,5 тыс. чалавек. Матэрыялы перапісу сведчаць, што ў гэты час тут жылі Беразнянкія, Бегуны, Голікі, Кірпічэнкі, Сялецкія, Фурсы, Шрубы, Шчукі і іншыя. З 8.12.1926 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. створаны калгас «Савічы» і «Інтэрнацыянал», працавалі 2 кузні, ваўначоска, 2 ветраныя млыны.

Са жніўня 1941 г. да лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія за перыяд акупацыі загубілі 60 мірных жыхароў, у 1942 г. частка спалілі вёску. Супраць акупантаў тут дзейнічала падпольная група С. І. і Ф. І. Філіпенкаў (19 чалавек), пазней – асобныя партызанскія атрады імя Катоўскага і імя Варашылава, якія знішчылі ў Савічах гарнізон і склад боепрыпасаў.

Да 1986 г. працавалі лясніцтва, рамонтна-механічныя майстэрні, лесапільня, млын, ветэрынарны пункт, сярэдняя школа, аддзяленне сувязі, аўтаматычная тэлефонная станцыя, Дом культуры, бібліятэка, амбулаторыя, 3 магазіны.

У верасні 1986 г. вёска часткова адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

У 2002 г. было 51 двор, 91 жыхар.

САДОВЫ, пасёлак у Чамярыскім сельсавеце, у калгасе «Рассвет».

Заснаваны ў 1920-я гг. Паводле перапісу 1926 г., 19 гаспадарак, 124 жыхары. На 1933 г. быў калгас «Садовы», працавала кузня.

У 2002 г. 14 двароў, 24 жыхары.

СКАРОДНАЕ, хутар у Гдзенскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоная Украіна», у 2002 г. не існаваў.

СПЯРЫЖЖА, вёска, цэнтр сельсавета, у калгасе «Запаветы Леніна», на р. Брагінка і аўтамабільнай дарозе Брагін — Камарын.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета.

Адносілася да Брагінскага праваслаўнага прыхода, з'яўлялася ўласнасцю графаў Ракіцкіх. У 1816 г. 29 гаспадарак, 79 душ мужчынскага і 84 душы жаночага полаў. Паводле перапісу 1897 г., 73 двары, 483 жыхары, працавалі часоўня, царкоўнапрыходская школа, 2 ветраныя млыны, лавачка.

У 1909 г. было 88 двароў, 570 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., 124 гаспадаркі, насельніцтва — 669 чалавек. З 8.12.1925 г. цэнтр сельсавета. У 1929 г. створаны калгас «Спярыжжа». Працавалі ваўначоска, ветраны млын і кузня.

Да чэрвеня 1986 г. працавалі рамонтна-механічныя майстэрні, лесапільня, ветэрынарны пункт, магазін, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, васьмігадовая школа.

8.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

СТАРАЯ ЁЛЧА, вёска на р. Днепр у Новаялчанскім сельсавеце, у саўгасе «Краснае».

У XIX — пачатку XX стст. сяло, цэнтр праваслаўнага прыхода Ялчанскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. 85 гаспадарак, 193 душы мужчынскага і 196 душ жаночага полаў.

Паводле царкоўных звестак, у 1879 г. дзейнічала праваслаўная Міхайлаўская царква. Прыхаджан лічылася 900 мужчынскага і каля 930 жаночага полаў. Пераважная большасць іх былі сялянскага саслоўя, займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй, якія спалучаліся з пчалярствам, лоўляй рыбы і ракаў, сплавам лесу, ткацтвам і іншымі хатнімі промысламі.

У 1886 г. у сяле было 32 двары, 130 жыхароў, працавала праваслаўная прыходская царква. Паводле перапісу 1897 г., 54 двары, 218 жыхароў, працавалі праваслаўная царква, царкоўнапрыходская школа. У 1909 г. 52 двары, насельніцтва — 369 чалавек. Паблізу сяла дзейнічала паромная пераправа і прыстань на Дняпры.

Паводле перапісу 1926 г., у сяле 75 гаспадарак, 367 жыхароў. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета. У 1930-я гг. сяло пераўтворана ў вёску.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны 150 гаспадарак, 610 жыхароў. Са жніўня 1941 г. да верасня 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія ў верасні 1943 г. спалілі тут 50 двароў і загубілі 18 жыхароў.

У 2002 г. 99 двароў, 191 жыхар. Ёсць магазін.

СТАРЫ МАКРЭЦ, вёска ў Малейкаўскім сельсавеце, у калгасе «Пераможнік».

Па пісьмовых крыніцах вядома з пачатку XIX ст. пад назвай Макрэц, адносілася да Брагінскай воласці Рэчыцкага павета. Уласнасць памешчыка, графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. тут было 14 гаспадарак, 35 душ мужчынскага і 42 душы жаночага полаў.

Згодна перапісу 1926 г., 62 гаспадаркі, насельніцтва — 347 чалавек.

У 2002 г. 10 двароў, 16 жыхароў.

СТАРЫ СЦЕПАНОЎ, вёска ў былым Савіцкім сельсавеце, у саўгасе «Савічы».

У пачатку XX ст. вёска вядома пад назвай Сцепаноў (назва паходзіць ад прозвішча Сцяпанаў). Уваходзіла ў склад Савіцкай воласці Рэчыцкага павета. У 1909 г. тут было 105 двароў, насельніцтва — 726 чалавек.

Паводле перапісу 1926 г., вёска Стары Сцепаноў, 46 гаспадарак, 259 жыхароў. У дакументах перапісу сярод іншых найчасцей сустракаецца прозвішча Драбышэўскі (Драбышэўская). З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. створаны калгас «Камінтэрн». Працавала кузня.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы налічвалася 57 гаспадарак, 237 жыхароў. У маі 1943 г. гітлераўскія карнікі спалілі вёску, загубілі 16 яе жыхароў.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

СТАРЫЯ ХРАКАВІЧЫ, вёска ў Чамярыскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Чапаева, пры р. Брагінка і Днепр. Назва ўтворана ад прозвішча Хракавіч, да якога дабаўлена азначэнне Старыя.

Па пісьмовых крыніцах Хракавічы вядомы з XVIII ст. як сяло ў складзе Рэчы Паспалітай, вотчынная ўласнасць памешчыкаў, графаў Юдзіцкіх. У 1776 г. тут пабудавана на сродкі прыхаджан драўляная Мікалаеўская царква на каменным фундаменце і з жалезным дахам.

Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Расіі. Сяло Хракавічы цэнтр праваслаўнага прыхода Савіцкай воласці Рэчыцкага павета. У 1795 г. 48 двароў, каля 310 душ мужчынскага і жаночага полаў. У гэты час належала графу, генерал-лейтэнанту Іосіфу Юдзіцкаму.

У 1863 г. тут адкрыта земскае народнае вучылішча.

У Хракавіцкім праваслаўным прыходзе, паводле звестак 1879 г., налічвалася вернікаў мужчынскага полу каля 970, а жаночага — каля 1 тыс. душ.

Як бачна з царкоўных дакументаў, амаль усе прыхаджане адносіліся да сялянскага саслоўя, займаліся земляробствам, якое спалучалася з рознымі промысламі — ткацтвам, прадзівам, рыбнай лоўляй, сплаўным, зборам ягад і грыбоў і інш.

У 1886 г. у сяле мелася 79 двароў, 507 жыхароў, працавалі праваслаўная царква, народнае вучылішча, царкоўнапрыходская школа і папярочыцельства, ветраны і конны млыны. Паводле перапісу 1897 г., 125 двароў, 513 жыхароў, дзейнічалі

царква, народнае вучылішча, хлебазапасны магазін, пітны дом.

У 1909 г. тут было 164 двары, 949 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., сяло па-ранейшаму называлася Хракавічы, 148 гаспадарак, 867 жыхароў. З 8.12.1926 г. да 15.8.1974 г. цэнтр сельсавета. З пачатку 1930-х гг. упамінаецца як вёска Старыя Хракавічы, працавалі калгас імя Сталіна, кузня, цагельня.

Са жніўня 1941 г. да восені 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі. Супраць акупантаў тут дзейнічалі партызаны асобнага атрада імя Катоўскага, якія летам 1943 г. разграмілі мясцовы паліцэйскі ўчастак праціўніка.

У 2002 г. 219 двароў, 512 жыхароў. Працуюць рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны пункт, фельчарска-акушэрскі пункт, Дом культуры, бібліятэка, сярэдняя школа, аддзяленне сувязі, магазін.

СТАРЫЯ ЮРКАВІЧЫ, вёска ў Спярыжскім сельсавеце, у калгасе імя Гагарына. Асноўная частка назвы дадзена ад прозвішча Юркевіч ці падобнага да яго. Прыметнік Старыя тлумачыць даўнасць паселішча.

У XIX — пачатку XX стст. вядома як сяло ці вёска пад назвай Юркавічы ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, належала графам Ракіцкім. У 1816 г. вёска, 19 гаспадарак, каля 70 рэвізскіх душ абодвух полаў.

На 1886 г. сяло, 28 двароў, 142 жыхары, дзейнічала праваслаўная царква. У 1909 г. вёска, 57 двароў, насельніцтва — 376 чалавек. Паводле перапісу 1926 г., таксама вёска Юркавічы, 50 гаспадарак, насельніцтва — 304 чалавекі. Пазней да назвы было дабаўлена азначэнне Старыя.

У 2002 г. 30 двароў, 47 жыхароў.

СУВІДЫ, вёска ў былым Піркаўскім сельсавеце, у саўгасе «Брагінскі».

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў Ракіцкіх. У 1816 г. 30 двароў, каля 170 жыхароў. Упамінаецца ў царкоўных крыніцах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Грушнянскага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 68 двароў, насельніцтва 382 чалавекі, працавалі хлебазапасны магазін і пітная ўстанова. У 1909 г. быў 91 двор, 549 жыхароў.

Паводле перапісу 1926 г., 109 гаспадарак, 504 жыхары. У матэрыялах перапісу часта сустракаюцца прозвішчы Яфіменка і Самойленка. Да 1933 г. створаны калгас «Чырвоная Беларусь». Працавалі 2 ветраныя млыны і кузня.

Са жніўня 1941 г. да 22 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

СЦЕЖАРНАЕ, вёска ў Малейкаўскім сельсавеце.

Вядома па пісьмовых крыніцах з пачатку XIX ст. як вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, з'яўлялася ўласнасцю памешчыкаў, графаў Ракіцкіх. У 1816 г. тут было 33 гаспадаркі, каля 100 душ мужчынскага і жаночага полаў. Адносілася да Сялецкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 58 двароў, насельніцтва 438 чалавек, працавалі кузня, царкоўнапрыходская школа, хлебазапасны магазін.

К 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 74, а насельніцтва — да 540 чалавек. Згодна перапісу 1926 г., вялікая і шматлюдная вёска, у якой лічылася 133 гаспадаркі, насельніцтва — каля 700 чалавек. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. вёска з'яўлялася цэнтрам сельсавета.

Да 1933 г. створаны калгас «Чырвоны рассвет». Працавалі ветраны млын, ваўначоска і кузня.

У 2002 г. 101 двор, 250 жыхароў.

Радзіма генерал-лейтэнанта І. І. Карпенкі.

СЦЕЖАРЭНСКІ, пасёлак у Крыўчанскім сельсавеце, у калгасе «Сцяг Леніна». Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Цяпер не існуе.

СЯЛЕЦ, вёска пры р. Брагінка, у Малейкаўскім сельсавеце, цэнтр калгаса імя Тэльмана. Назва ўтворана ад тыпу паселішча, сяло.

Вядома з сярэдзіны XVI ст. як сяло ў складзе Вялікага княства Літоўскага, а з 1569 г. — у Рэчы Паспалітай. З'яўлялася ўласнасцю праваслаўнай царквы. У 1609 г. паблізу сяла былі заснаваны 2 праваслаўныя манастыры — мужчынскі Прэабражэнскі і жаночы Благавешчанскі. Іх заснавальнікамі былі князь Адам Вішнявецкі і яго жонка Аляксандра (урадж. Хадкевіч). Пры манастырах дзейнічалі 2 царквы. У 1726 г. абодва манастыры былі пераўтвораны ва уніяцкія.

У выніку 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) Сялец далучаны да Расіі, сяло, цэнтр праваслаўнага прыхода Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. у сяле было 48 гаспадарак, 85 душ мужчынскага і 80 душ жаночага полаў.

Пасля далучэння да Расіі абодва манастыры былі зноў вернуты праваслаўным. У 1844 г. яны ліквідаваны.

Паводле царкоўных дакументаў 1879 г., у Сялецкім праваслаўным прыходзе налічвалася за 1 тыс. вернікаў мужчынскага і каля 1,1 тыс. жаночага полаў. Амаль усе яны адносіліся да сялянскага саслоўя, займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй, якія спалучаліся з лоўляй рыбы, зборам ягад і грыбоў, сплавам лесу і іншымі промыслами.

У 1886 г. было 33 двары, 195 жыхароў, працавалі праваслаўная царква і часоўня. Паводле перапісу 1897 г., 44 двары, насельніцтва 283 чалавекі, працавалі праваслаўная царква, часоўня, царкоўнапрыходская школа і ветраны млын. У 1909 г. 57 двароў, 340 жыхароў. К 1926 г. колькасць двароў у сяле павялічылася да 95, а насельніцтва да 500 чалавек. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. Сялец з'яўляўся цэнтрам сельсавета.

Да 1933 г. тут створаны калгас «Новы беларус». Працавалі 2 кузні, ваўначоска, 2 ветраныя млыны, конная крупадзёрка.

У 2002 г. 107 двароў, 245 жыхароў. Ёсць рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны

пункт, магазін, аддзяленне сувязі, клуб, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт.

Радзіма генерал-лейтэнанта М. А. Журава, беларускага перакладчыка У. П. Чапегі.

ТАКЛІНОЎ, вёска ў Вуглоўскім сельсавеце, у калгасе імя Энгельса.

У пачатку XX ст. вядома як хутар у Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, 31 двор, 116 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., вёска, 75 гаспадарак, 304 жыхары. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета. Да 1933 г. створаны калгас імя Ланцуцкага, працавала кузня.

У 2002 г. было 38 двароў, 87 жыхароў.

ТЭЛЬМАН, вёска на правым беразе р. Брагінка ў Малейкаўскім сельсавеце, у калгасе імя Тэльмана, на аўтамабільнай дарозе Брагін — Хойнеч.

Спачатку паселішча называлася Гарадзішча ці Двор-Гарадзішча. Па пісьмовых крыніцах вядома з XVIII ст. як сядзіба князёў Вішнявецкіх. Тут быў замак (не захаваўся), знаходзіўся княжацкі двор. У канцы XVIII ст. на правым беразе р. Брагінка, каля замка быў закладзены парк, які меў радыяльную планіроўку. Перад замкам быў вялікі газон з валуном.

У XIX — пачатку XX стст. у складзе Брагінскай воласці Рэчыцкага павета. У 1886 г. працавалі вінакурны завод і млын на р. Брагінка. У савецкі час былая панская сядзіба пераўтворана ў вёску. У 1929 г. створаны калгас «Надзея» (у далейшым імя Тэльмана). Працавала кузня.

25.10.1934 г. вёска перайменавана, ёй было дадзена прозвішча вядомага нямецкага палітычнага дзеяча Э. Тэльмана.

У 1941 г. нямецка-фашысцкія акупанты загубілі 13 мірных жыхароў.

У 2002 г. было 58 двароў, 165 жыхароў.

УЛАДЗІМІРСКІ, пасёлак у Мікуліцкім сельсавеце.

Заснаваны ў савецкі час.

Перад Вялікай Айчыннай вайной 14 двароў, 70 жыхароў. У верасні 1942 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі пасёлак, загубілі 1 жыхара.

Пасля вайны не адноўлены.

УЛЬЯНАЎКА, пасёлак у Мікуліцкім сельсавеце.

Вядомы з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., 20 двароў, 92 жыхары.

З 1938 г. не існуе, паколькі жыхары пераехалі ў вёску Мікулічы.

УСОХІ, хутар у Асарэвіцкім сельсавеце.

Заснаваны ў 1920-я гг. Паводле перапісу 1926 г., 8 гаспадарак, 41 жыхар.

Перад Вялікай Айчыннай вайной было 10 двароў, 43 жыхары. У жніўні 1943 г. нямецка-фашысцкія карнікі спалілі хутар і загубілі 7 яго жыхароў.

Пасля вайны не адноўлены.

ХАТУЧА, вёска ў Астраглядаўскім сельсавеце, у саўгасе «Астрагляды».

У XIX — пачатку XX стст. вядома як вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыка, графа Міхаіла Ракіцкага. У 1826 г. тут была 41 гаспадарка, 81 душа мужчынскага і 97 душ жаночага полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Глухавіцкага праваслаўнага прыхода. Паводле перапісу 1897 г., 53 двары, 351 жыхар, працавалі часоўня, ветраны млын і кузня.

К 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 61, а насельніцтва — да 439 чалавек. Паводле перапісу 1926 г., 98 гаспадарак, 538 жыхароў. З матэрыялаў перапісу бачна, што ў гэты час тут жылі Барысенкі, Дземідзенкі, Дзенісенкі і іншыя. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. Хатуча з'яўлялася цэнтрам сельсавета.

У 1929 г. створаны калгас «Чырвоная зорка», працавалі ваўпачоска, ветраны млын і кузня.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны 92 гаспадаркі, насельніцтва — 369 чалавек. У маі 1943 г. вёска была амаль поўнасцю спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі, якія таксама знішчылі 13 яе жыхароў.

6.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ЦАЛУЙКІ, вёска ў Хракавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Чапаева. Назва ад прозвішча Цалуйка, якія здаўна тут жылі і жывуць цяпер.

Вядома з рукапісных крыніц канца XVIII ст. як вёска ў Рэчыцкім павеце, уласнасць памешчыкаў Ракіцкіх. У 1795 г. было 6 гаспадарак, 35 душ абодвух полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пад назвай Цалуйкі пры пераліку населеных пунктаў Грушнянскага праваслаўнага прыхода.

У 1909 г. вёска ў Савіцкай воласці, 33 двары, 238 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., 57 гаспадарак, насельніцтва складала 315 чалавек. Як бачна з матэрыялаў перапісу, у гэты час тут жылі амаль адны Цалуйкі (толькі 4 сям'і мелі прозвішчы Даўжанок).

У 1929 г. створаны калгас «Цалуйкі», працавалі кузня і ветраны млын.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны восенню 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты расстралялі 5 жыхароў вёскі.

Цяпер не існуе.

Радзіма аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху ў Вілейскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну В. Ф. Цалуйкі.

ЧАМЯРЫСЫ, вёска, цэнтр сельсавета і калгаса «Рассвет», на р. Брагінка і аўтамабільнай дарозе Брагін — Любеч (Украіна).

Вядома з канца XVIII ст. як вёска ў Рэчыцкім павеце, уласнасць памешчыка, графа Іосіфа Юдзіцкага. У 1795 г. было 60 гаспадарак, 179 душ мужчынскага і 166 душ жаночага полаў. У 1879 г. упамінаецца ў царкоўных дакументах пры пераліку населеных пунктаў Хракавіцкага праваслаўнага прыхода.

У 1886 г. вёска Дзяражыцкай воласці Рэчыцкага павета, 205 двароў, насельніцтва больш за 1 тыс. чалавек. Паводле перапісу 1897 г., 155 двароў, 884 жыхары, працавалі школа царкоўнай граматы і пітны дом (карчма). Паводле

перапісу 1926 г., з назвай Чамярысы сумежна знаходзіліся 2 вёскі, у якіх разам было 300 гаспадарак і каля 1,5 тыс. жыхароў. Пазней яны былі аб'яднаны ў адну вёску. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. і з 15.8.1974 г. цэнтр сельсавета.

У пачатку 1930-х гг. тут працавалі калгасы «Ударнік» і «Чырвоная Беларусь», 2 кузні, 2 ветраныя млыны, цагельня.

Са жніўня 1941 г. да 17 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі, якія ў кастрычніку 1943 г. спалілі вёску. Супраць акупантаў у навакольлі вёскі дзейнічалі партызаны асобнага атрада імя Катоўскага Палескай вобласці.

У 2002 г. было 219 двароў, 512 жыхароў. Працуюць рамонтна-механічныя майстэрні, ветэрынарны ўчастак. Дом культуры, бібліятэка, сярэдняя школа, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт, магазін.

ЧЫКАЛАВІЧЫ, вёска ў былым Калыбанскім сельсавеце, у калгасе «Ленінскі шлях», на р. Несвіч. Назва, напэўна, ад прозвішча Чыкалаў.

У XIX — пачатку XX стст. сяло, цэнтр праваслаўнага прыхода Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў Месцераў.

У 1879 г., згодна царкоўных дакументаў, у вёсцы налічвалася 800 душ мужчынскага і 900 душ жаночага полаў. Пераважная большасць іх адносілася да сялянскага саслоўя, займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, а ў вольны ад сельскагаспадарчых работ час — рознымі промысламі: лоўляй рыбы, зборам ягад, грыбоў і інш.

У 1886 г. у сяле 63 двары, 370 жыхароў, працавалі праваслаўная царква, вадзяны млын. Паводле перапісу 1897 г., у сяле было 87 двароў, 400 жыхароў, працавалі праваслаўная царква і царкоўная школа граматы. Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 198, а насельніцтва — да 433 чалавек.

Паводле перапісу 1926 г., вёска, 174 гаспадаркі, насельніцтва — 762 чалавекі. З матэрыялаў перапісу відаць, што ў гэты час тут жылі Ільенкі, Каляды, Мацацуры, Мельнікі, Прысяжныя, Ціцянкі і іншыя. З 8.12.1926 г. да 15.7.1961 г. цэнтр сельсавета.

Да 1933 г. арганізаваны калгас «Ленінскі шлях». Працавалі 2 ветраныя млыны і кузня.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ЧЫРВОНАЯ ДУБРОВА, вёска ў Крыўчанскім сельсавеце, у калгасе «XVIII партз'езд».

Вядома з 1920-х гг. Паводле перапісу 1926 г., пасёлак, 16 двароў, 103 жыхары. У 1933 г. быў калгас «Чырвоны рог», працавала кузня.

ЧЫРВОНАЯ НІВА, пасёлак у Крыўчанскім сельсавеце, у калгасе «XVIII партз'езд».

Вядомы з 1920-х гг. Згодна перапісу 1926 г., 31 гаспадарка, 179 жыхароў.

У 2002 г. было 34 двары, 71 жыхар.

ЧЫРВОНАЕ ПОЛЕ, вёска ў Мікуліцкім сельсавеце, у калгасе «Чырвоны Кастрычнік».

У пачатку 1930-х гг. тут быў калгас «Чырвонае поле», ад якога названа вёска, працавала кузня.

У 2002 г. было 9 двароў, 18 жыхароў.

ЧЫРВОНАЯ ПАЛЯНА, пасёлак у Малажынскім сельсавеце, у калгасе «Першамайск».

Заснаваны пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Згодна перапісу 1926 г., 25 гаспадарак, 133 жыхары. У 1929 г. створаны калгас «Чырвоная паляна», працавалі ветраны млын і кузня.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны было 18 двароў, 105 жыхароў. У верасні 1943 г. нямецка-фашысцкія акупанты спалілі пасёлак.

У 2002 г. было 9 двароў, 15 жыхароў.

ЧЭРНЕЎ, вёска ў былым Пяркаўскім сельсавеце, у саўгасе «Брагінскі», на р. Брагінка. Назва, магчыма, утворана ад прозвішча Чэрнеў.

Вядома з пачатку XIX ст. як хутар у Савіцкай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыка, графа Людвіка Ракіцкага. У 1816 г. на хутары было 8 гаспадарак, 58 душ абодвух полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. як вёска Ялчанскага праваслаўнага прыхода.

У 1909 г. у вёсцы мелася 24 двары, 209 жыхароў. Існавалі сплаўны, рыбнай лоўлі і іншыя традыцыйныя промыслы. Да 1926 г. колькасць двароў павялічылася на 29, а насельніцтва — да 232 чалавек. Матэрыялы перапісу паведамляюць, што ў гэты час тут жылі амаль адны Шубянкі.

4.5.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ЦЮЦЬКІ, вёска ў Крыўчанскім сельсавеце, да 1913 г., потым — Новая Аляксееўка.

ШКУРАТЫ, вёска ў Вуглоўскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Парыжская камуна». Лічаць, што назва паходзіць ад прозвішча Шкурат.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць графаў Ракіцкіх. У 1816 г. 32 гаспадаркі, каля 120 душ абодвух полаў. Жыхары маліліся ў цэрквах мястэчка Брагін. Па перапісу 1897 г., 59 двароў, 356 жыхароў, працавалі капліца, школа царкоўнай граматы, ветраны млын, шітны дом.

У 1909 г. было 65 двароў, 311 жыхароў. Паблізу вёскі знаходзіўся фальварак Шкураты, 1 гаспадарка, 11 жыхароў.

Паводле перапісу 1926 г., 68 гаспадарак, 391 жыхар. З 8.12.1926 г. да 16.7.1954 г. цэнтр сельсавета. Да 1933 г. створаны калгас «Парыжская камуна». Працавалі кузня, сталь машня, ваўпачоска.

Са жніўня 1941 г. да 23 лістапада 1943 г. акупіравана нямецкімі фашыстамі. Падчас вайны супраць акупантаў у вёсцы і яе наваколлі дзейнічалі партызаны асобнага партызанскага атрада імя Катоўскага, якія разгромілі летам 1943 г. мясцовы паліцэйскі ўчастак гітлераўцаў.

У 2002 г. у вёсцы было 81 двор, 211 жыхароў. Дзейнічаюць ветэрынарны пункт, майстэрні па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі, клуб, бібліятэка, аддзяленне сувязі, фельчарска-акушэрскі пункт і магазін.

Радзіма генерал-маёра У. А. Гацкі.

ШЧАРБІНЫ, вёска ў Астраглядаўскім сельсавеце, у калгасе «Чырвоная ніва». Назва, верагодна, ад прозвішча Шчарбіна.

Паводле перапісу 1926 г., 46 гаспадарак, 265 жыхароў.

У 1991 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

ЯЛЧАНСКІЯ ЛЯДЫ, вёска ў Новаялчанскім сельсавеце, у саўгасе «Краснае».

Вядома з 1920-х гг. як пасёлак Старыя Ляды. Паводле перапісу 1926 г., у пасёлку было 12 гаспадарак, 64 жыхары.

Перад Вялікай Айчыннай вайной вёска, 29 гаспадарак, 130 жыхароў. У верасні 1943 г. спалена нямецкімі фашыстамі.

Цяпер не існуе.

ЯСМЕНЦЫ, вёска ў былым Глухавіцкім сельсавеце, у калгасе імя Калініна.

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў складзе Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў, графаў Ракіцкіх. У 1916 г. 12 двароў, 26 душ мужчынскага і 28 душ жаночага полаў. Упамінаецца ў царкоўных дакументах 1879 г. пры пераліку населеных пунктаў Глухавіцкага праваслаўнага прыхода. У 1897 г. 30 двароў, 195 жыхароў, працавалі ветраны млын, часоўня і кузня.

У пачатку XX ст. у вёсцы было 45 двароў, 227 жыхароў. Паводле перапісу 1926 г., 42 гаспадаркі, 195 жыхароў. У матэрыялах перапісу часта сустракаюцца прозвішчы Садчанка і Шылец.

У 1930 г. створаны калгас «Краіна Саветаў» № 2, працавалі ветраны млын і кузня.

10.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

Радзіма Героя Сацыялістычнай Працы Б. В. Шыльца.

ЯСЯНІ, вёска ў Спярыжскім сельсавеце, цэнтр калгаса «Запаветы Леніна», каля р. Брагінка (1 км) і аўтамабільнай дарогі Брагін — Камарын. Назва дадзена па прыкметах мясцовасці таго часу, калі паселішчу было дадзена найменне (расло шмат дрэў ясеняў).

У XIX — пачатку XX стст. вёска ў Брагінскай воласці Рэчыцкага павета, уласнасць памешчыкаў, графаў Ракіцкіх. У 1816 г. тут было 25 гаспадарак, каля 100 душ абодвух полаў. Паводле перапісу 1897 г., 49 двароў, 355 жыхароў, працавалі царкоўнапрыходская школа і ветраны млын. Да 1909 г. колькасць двароў павялічылася да 59, а насельніцтва — да 335 чалавек. Жыхары вёскі маліліся ў цэрквах Брагіна. З 8.12.1926 г. да 30.12.1927 г. цэнтр сельсавета.

У пачатку 1930-х гг. працавалі калгас «Ленінец», конная крупадзёрка, цагельня, кузня.

Да чэрвеня 1986 г. тут дзейнічалі рамонтна-механічныя майстэрні, млын, ветэрынарны пункт, магазін, Дом культуры, аддзяленне сувязі, бібліятэка, фельчарска-акушэрскі пункт.

8.6.1986 г. вёска адселена ў сувязі з аварыяй на ЧАЭС.

Падрыхтавалі
Г. І. Дулеба, Г. М. Новікава

ЗМЕСТ

Да чытачоў 17

Зямля нашых продкаў 21

Водгалас далёкай мінуўшчыны 21
Першабытны чалавек на Брагіншчыне 21
Тапаніміка родных мясцін 26
Археалагічныя даследаванні на Брагіншчыне 29
Даследчык помнікаў старажытнасці 31
Археалагічныя помнікі Брагіншчыны 32
У складзе Кіеўскай Русі 35
У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай 37
Княскі род Вішнявецкіх 43
Тут Ілжэдзмітрый баляваў 46
Брагін у антыфеадальнай вайне 1648–1654 гг. 47
У складзе Расійскай імперыі 50
Брагіншчына ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле дзяржаў, у якія яна ўваходзіла ў канцы IX–пачатку XIX стст. 56
Адмена прыгону на Брагіншчыне 56
Бунт ашуканых рэформай 58
Гарадзішча — маёнтак Патонаў 61
Царкоўны звон над краем 62
Праваслаўныя прыходы Брагіншчыны (па архіўных матэрыялах XVII–XIX стст.) 63
Першыя школы, вучылішчы 64
Падзеі 1905–1907 гг. на Брагіншчыне 66
Пражыў свабодна, ярка 71
Паўстоўскі на Брагіншчыне 75
У гады першай сусветнай 81
Ад лютага да кастрычніка 81

На крутым павароце гісторыі 87

За ўладу Саветаў 87
Пасля Кастрычніка 87
Актыўныя ўдзельнікі першай расійскай (1905–1907), Лютаўскай, Кастрычніцкай рэвалюцый (1917) і грамадзянскай вайны (1918–1920) 96
Барацьба з бандытызмам 103
Ваявалі і ў мірныя дні 106
Удзельнікі партызанскага руху, барацьбы з контррэвалюцыяй і бандытызмам у 1918–1922 гг. 107
Жыхары Брагінскага і Камарынскага раёнаў, якія загінулі ў гады нямецкай і польскай акупацыі, грамадзянскай вайны і бандыцкага тэрору (1918–1934) 109
Брагіншчына ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле рэгіёна ў савецкі перыяд 111
20-я гады: па шляху аднаўлення 112
На мірныя рэйкі 112
Ішла ў рэвалюцыю моладзь 115
Першыя сялянскія аб'яднанні 117
Пачыналася з «Надзеі» 118

З таварыства — у калгас.... 118
Адзін доктар, адна бальніца 119
30-я гады: час заваёў і страт 125
Калектывізацыя 125
Той незабыўны час 131
Першы аграном 135
У ліку дваццаціпяцітысячнікаў 135
Незабыўнае 135
Удзельнікі Усебеларускай нарады выдатнікаў сельскай гаспадаркі 1936 г. ад Брагінскага раёна 140
Адступала непісьменнасць... 141
З маладым запалам 146
Загадчык гаспадаркі «Чэлюскіна» 148
Брагінскі раён у 30-я гады 150
Камарынскі раён у 30-я гады 151
На зыходзе 30-х.... 152
Вернутыя імёны 153
Бязвінныя ахвяры палітычных рэпрэсій 153
За рэспубліканскую Іспанію 159
Спіс воінаў-землякоў, якія загінулі падчас савецка-японскага ўзброенага канфлікту на возеры Хасан (1938), у раёне ракі Халхін-Гол (1939), пры вызваленні Заходняй Беларусі (1939) і ў савецка-фінляндскую вайну (1939—1940) 159

У гады Вялікай Айчыннай 161

Так пачыналася вайна 161
Гналі жывёлу на ўсход... 168
Акупацыйны рэжым 169
Крывавы «новы парадак» 173
Со знаменем на грудн 178
Той жудасны дзень 179
Адны чорныя галавешкі... 181
Няволя не зламала 181
Лісты з палоиу 182
Здзекі з ваеннапалонных 182
Нязломны дух падполля 184
Змагаўся ў падполлі камсамол 194
Як рыхтаваўся штурм 198
Партызанскі фронт 200
Не давалі ворагу спакою 206
Партызанскія «сюрпрызы» 209
Шпіталь у зямлянцы 210
Баявы рахунак атрада 212
«Ніводнага таварыша не выдаў...» 213
Пакуль білася сэрца.... 214
Знявечаны, але не зламаны... 215
Майскім днём сорак трэцяга... 216
«Прытулак украінскіх партызан...» 218
Рабілі смелыя налёты 220
Партызанскія фарміраваині, якія дзейнічалі на тэрыторыі Брагінскага і Камарынскага раёнаў у перыяд 1941—1943 гг. 220

Ваявалі ў іншых партызанскіх фарміраваннях . . . 221
Гарнізон быў знішчаны . . . 221
З групы вырас атрад . . . 222
Яе звалі Ніна . . . 223
Вызваленне . . . 225
Штурмавалі «дняпроўскі вал» . . . 225
Пад прыкрыццем туману . . . 238
Тут героямі сталі . . . 239
Ішлі ў варожы тыл... . . . 241
Рота герояў . . . 242
55-я стралковая... . . . 243
Конногвардейцы . . . 243
Бой на улицах Брагина . . . 244
Баявы шлях адной гарматы . . . 245
Воіны Чырвонай Арміі, удастоеныя звання Героя Савецкага Саюза за подзвігі, праяўленыя пры вызваленні Брагіншчыны і Камарыншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у верасні—лістападзе 1943 г. . . . 247
Раён вызвалены, вайна працягваецца . . . 282
Пісьмы з фронту . . . 286
История «семейного» миномета . . . 287
Нашы землякі — Героі Савецкага Саюза . . . 289
Імя героя не забыта . . . 292
Адстаялі ў баях Радзіму . . . 292
«За мной, наперад!» . . . 292
Праз усю вайну . . . 293
У няпоўныя семнаццаць... . . . 295
Абаранялі Ленінград . . . 295
Жанчыны на вайне . . . 296
Прамой наводкай . . . 299
Вярнуліся пераможцамі . . . 299
Асабліва вызначыліся . . . 316
Загартаваныя вайной . . . 317
Напомніў фотаздымак . . . 317
Ад Курскай дугі да Берліна . . . 318
Камандзір дывізіёна «кацюш» . . . 318
Афіцэры . . . 319
На пярэднім краі . . . 320
Воіны Чырвонай Арміі і партызаны, якія загінулі пры абароне і вызваленні Брагінскага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі . . . 322
Воіны Чырвонай Арміі — землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны . . . 393
Воіны Чырвонай Арміі, прызваныя Брагінскім і Камарынскім РВК і загінуўшыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, былое месцажыхарства якіх невядома . . . 551
Падпольшчыкі, партызаны, асобы, якія актыўна садзейнічалі партызанскаму руху і падполлю, члены іх сем'яў, жыхары партызанскіх зон — ахвяры фашысцкага тэрору . . . 553
З руін і папялішчаў . . . 613
Час аднаўлення . . . 613

У мірнай працы 616
Дзесяцігоддзі — прыступкі росту 616
Сельская гаспадарка 616
След на зямлі 626
Подзвіг на збожжавым полі 627
Калгасы, дзяржгасы, падсобныя гаспадаркі Брагінскага раёна на 1.1.2002 г. 628
Землеўладальнікі і землекарыстальнікі Брагінскага раёна на 1.1.2002 г. 628
Прамысловасць 628
Капітальнае будаўніцтва 630
Лясная гаспадарка 631
Адукацыя 632
Ахова здароўя 636
Сакрэт іх даўгалецця 637
Культура 637
Брагіншчына спартыўная 639
Ушанаваныя Радзімай 643
Героі Сацыялістычнай Працы 643
Ганаровыя грамадзяне 645
Заслужаныя работнікі Беларусі 647
Адзначаныя ўрадавымі ўзнагародамі 648
Нарадзіліся на Брагіншчыне 658
Военачальнікі 658
Вучоныя 659
Дзяржаўныя дзеячы 663
Творцы 664
Параднёныя з Брагіншчынай 675
Загінулі ў Афганістане 682
Загінулі пры выкананні службовых абавязкаў 683
Пад чорным крылом Чарнобыля 685
Горкая праўда аб выніках чарнобыльскай катастрофы 686
Вызначыліся пры ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС 693
З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны 696
З глыбіні стагоддзяў 696
З фальклорных крыніц 699
Брагінскі строй 704
Брагінскія майстры 705
Народны тэатр 706
Захапленне на ўсё жыццё 707
Ажывае гісторыя 708
Музей і карцінная галерэя 708
Рэшткі архітэктурна-паркавых рэзідэнцый 709
Вуліцы Брагіна 710
Помнікі гісторыі і культуры Брагінскага раёна 711
Прырода Брагіншчыны 717
Запаведнік на паўднёвым усходзе Беларускага Палесся 718
Брагінскі метэарыт 722
З гісторыі населеных пунктаў 723

Памяць: Брагін. р-н: Гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў
П 15 Беларусі / Уклад. І. Ф. Ганжураў; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн.: Маст. літ., 2003. — 750 с.: іл.
ISBN 985-02-0521-0.

Гэта кніга — гісторыка-дакументальная хроніка, у якой на падставе архіўных дакументаў і матэрыялаў, артыкулаў, біяграфічных нарысаў, успамінаў непасрэдных удзельнікаў падзей расказваецца аб гісторыі Брагінскага раёна ад старажытных часоў да нашых дзён, аб вядомых нашых земляках — героях ратных і працоўных спраў. Асаблівая ўвага ўдзяляецца расказу аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны — аб партызанскім руху на тэрыторыі раёна, баях за вызваленне яго ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прыводзяцца спісы воінаў, якія загінулі пры вызваленні горада і раёна, а таксама спісы воінаў-землякоў, што не вярнуліся з франтоў Вялікай Айчыннай вайны, спісы мірных жыхароў, якія сталі ахвярамі фашысцкага тэрору. У кнізе расказваецца і пра трагічныя падзеі канца 30-х — пачатку 40-х гадоў, калі многія жыхары Брагіншчыны былі беспадстаўна рэпрэсіраваны.

Выданне зацікавіць усіх, хто неабыякавы да гісторыі нашай Бацькаўшчыны.

УДК 94(476.2)
ББК 63.3(4Бен)